Бібліятэка Бацькаўшчыны

# КАХАНЫ горад



Зборнік эміграцыйнае ваеннае прозы

**Бібліятэка Бацькаўшчыны**
Міжнароднае грамадскае аб'яднанне
«Згуртаванне беларусаў свету «Бацькаўшчына»

**Кніга 9**

# Каханы горад

*Зборнік эміграцыйнае*
*ваеннае прозы*

Мінск
«Беларускі кнігазбор»
2006

УДК 821.161.3-3
ББК 64 (4 Беи)
К 30

*Сэрыя заснавана ў 2004 годзе*

Укладаньне
Лявона Юрэвіча

**Каханы горад:** зборнік эміграцыйнае ваеннае прозы / Укл.
К 30 Л. Юрэвіч. — Мн., Бел. кнігазбор, 2006. — 372 с. — (Бібліятэка Бацькаўшчыны: кн. 9)
ISBN 985-504-038-4.

У зборнік ўвайшлі творы трох пісьменьнікаў эміграцыі Антона Адамовіча, Лявона Савёнка і Янкі Юхнаўца. У іхных рознажанравых творах, ад філязофіі да сатыры, – жыцьцё пад акупацыяй у Менску. Гэта новае невядомае нам раней адлюстраваньне Другой Сусьветнай вайны.

«Каханы горад» – дзявятая кніга ў сэрыі «Бібліятэка Бацькаўшчыны», заснаванай МГА «ЗБС «Бацькаўшчына» ў 2004 г.

**УДК 821.161.3-3**
**ББК 64 (4 Беи)**

© Юрэвіч Л., укладаньне, 2006
© Кіпель В., уступнае слова, 2006
© МГА «ЗБС «Бацькаўшчына», 2006
© Афармленьне, МГА «Беларускі кнігазбор», 2006

**ISBN 985-504-038-4**

## ГОРАД ЧЫТАЕ

Калі б мне давялося раіцца-размаўляць з геральдыстамі, то я запрапанаваў бы ім у герб гораду Менску ўлучыць кнігу, зачыненую ці разгорнутую — ня так важна, але кнігу як сымбаль чытаньня. На мой погляд (а ў маім выпадку — напэўна, суб'ектыўны, бо я родам зь Менску), мне здаецца, што менчукі чытаюць больш за іншых землякоў. Каб устанавіць дакладна ўзровень чытаньня, ясна, трэба аналізаваць статыстыку-колькасьць бібліятэкаў, колькасьць абанэмэнтаў, пазычаных кніжок, г.д. Я гэта разумею, працаваў у тым каля 30 гадоў у Нью-Ёркаўскай публічнай бібліятэцы, што на рагу Пятай авэню й Сорак Другой вуліцы. Я ж выводжу чытальнасьць сэнтымэнтальна, базуюся на такіх штрышкох-успамінах.

У перадваенным Менску на Горным завулку было адзіннаццаць дамкоў (крытых бляхай было толькі два, а рэшта гонтамі), у сямі зь іх былі свае бібліятэчкі. Мне гэта запамяталася як выдатны факт. Каб купіць «Палескіх рабінзонаў» Янкі Маўра, мы з маці прастаялі ў чарзе каля трох гадзінаў (было гэта ў сярэдзіне 30-х гадоў!). Памятаю таксама, як міліцыянты ганялі са сходкаў на вуліцы К. Маркса пераходзячых у бок гарадзкога саду чытаючых дзяцей і дарослых — маўляў, сходы для хады, а не для сядзеньня-чытаньня.

Факт, што чыталася ў мірны час, можа, ня так ужо й паказальны, але што чыталі і ў вайну, калі ў галаве сядзела адна думка: як паесьці і як выжыць, то аддаваньне чытаньню я ўважаю вельмі паказальна. Вось мае ўспаміны-мамэнты з гадоў вайны, гадоў змрочных, жудасных, якіх не забыць да канца жыцьця.

Летам 1942 году сапраўдным цудам лёсу нашай сям'і пашанцавала вярнуцца ў Менск. Ідучы паўзь Сьвіслач у бок Камароўкі — Залатой Горкі, можна было бачыць такі абраз: соткі а соткі пагарэлішчаў, як чорныя магільныя насыпы, з комінамі-помнікамі, пазарасталымі рэдкай лебядой і крапівой ды бур'янам. Але там-сям віднелася й жыцьцё: пасьвіліся козы, рэдчас каровы, ды сядзелі пастушкі, дзяўчынкі, хлопчыкі, часта з кніжкамі ў руках ці на худзенькіх каленках. Пастушкі чыталі, іх канцэнтрацыя была ў кнізе, яны не зьвярталі ўвагі на прахожых, на акаляючае асяродзьдзе.

Калі мы нарэшце дабраліся да Горнага завулку, дзе наша хата згарэла, але нас прыюцілі суседзі, дык паказваючы нам месца, дзе мы будзем спаць, гаспадыня сказала: «А ў сенцах кнігі. Чытайце. Мы іх нацягалі ў часе пажару». І пры невялічкай газавічцы-фіцілю тыя кнігі чыталіся.

Калі апынуліся ўлетку 1942 году ў Менску, жыцьцё прывяло мяне хутка на рынак: картак у нас не было, і трэба было нешта «ўтаргаваць», каб купіць бохан (кірпічык) хлебу. З рынкам я хутка азнаёміўся і ўбачыў, што на кожным рынку — Камароўскім, Старажоўскім, Чэрвеньскім — быў кніжны стэнд, а на рынку Суражскім быў сапраўдны кніжны магазын (ну, хутчэй вялікі ларок), дзе, даўшы залог у пяць марак (толькі маркі!), можна было кнігу пазычыць. Прадаваліся кнігі і ў камісіёнках на Нямізе, і ў вялікім мастацкім магазыне на былой Камсамольскай.

Наагул падкрэслю, што кніга ў Менску ў гады вайны была ў пашане: немцы рабавалі бібліятэкі, але на складох, дзе яны рыхтавалі кнігі да вывазу, дазвалялі мінакам «корпацца». Прыкладам, у адным з корпусаў БДУ ў раёне Чырвонага касьцёлу быў такі склад, і людзі кнігі забіралі сабе.

Паколькі я вучыўся ў школе (будынак Музэю прыроды на Траецкім прадмесьці), ведаю, што была й літаратурная праграма. Найчасьцей настаўнікі пазычалі вучням свае кнігі. Праўда, аднойчы дырэктар школы раздаў вучням 7-е клясы хрэстаматыю па беларускай літаратуры (называлася, здаецца, «Родны Край»), а таксама фізычную карту БССР.

Аб чытаньні ў Менску ў часе вайны запомніўся мне й такі выпадак. Ідучы аднойчы пасьля заняткаў на Старажоўскі рынак, недзе ў прамежку паміж могілкамі й рынкам — там найчасьцей стаялі вазы — каля аднаго з вазоў пабачыў 8-10 «мужыкоў», якія моцна рагаталі. Я падышоў бліжэй. На возе сядзеў селянін, трымаў разгорнутую «Беларускую газэту» й нешта чытаў. Услухаўшыся, я зразумеў, што чытаў той чалавек «Дзёньнік Чужанінава», а таварышы ягоныя слухалі. Які тады чытаўся эпізод, не скажу, бо не даслухаў, сьпяшаўся на рынак, але рогат быў вялікі. Аб «Дзёньніку Чужанінава» я пачуў пазьней на аднэй зь вечарынак. Асабліва сьмяяліся з Чужанінава, як той прапаноўваў, як хутчэй стацца «нацыяналістам».

Бясспрэчна, у Менску й па-за Менскам Чужанінава чыталі.

Прыпамінаю і такую дэтальку. Значна, значна пазьней, калі Зора — сяброўка ў Менску — стала маёй жонкай, мы былі адна сям'я-каманда, а праз яе я быў і сябрам аўтара Чужанінава — Лявона Савёнка, — Зора сказала мне, што ў 1941 годзе, калі менчукі ўцякалі ў «бежанства», былі такія сярод іх, што згіналіся пад цяжарам клункаў праз плячо, несьлі свой скарб — кнігі. А гэта, як кажуць на радзіме, «здорава»!

Пра цяперашні час скажу такое: калі бываю ў Менску (штогоду, а то й часьцей), дык выяжджаю з багажом — толькі кнігі.

З прыемнасьцю і ўпэўненасьцю сьцьвярджаю: Менск — кніжны горад.

Хацеў бы сказаць колькі словаў пра аўтараў зьмешчаных тут твораў.

Антон Адамовіч як літаратар выступаў пад дзясяткам псэўдонімаў. Карэнны мянчук. Вельмі пільна зьбіраў усё сваё друкаванае. Меў выдатную бібліятэку — літаратурнае беларускае амаль усё. Кнігі ахвотна пазычаў і часта кнігі «зачытвалі». Мяне ведаў ад часоў высылкі ў Вятку й ці раз казаў: «А ты спытай у таго ці таго, ці ня мае такое (ягонае) кнігі».

Лявон Савёнак (Крывічанін, Свэн). Нарадзіўся ў Вяльцы. Укараніўся, усынавіўся Менску. Стала натаваў жыцьцё і асабліва праявы беларускасьці, і любы напад, насьмешку над беларускасьцю глыбака перажываў, але не падаваў віду. Надзвычай аптымістычна верыў, што Беларусь пераможа чорныя гадзіны. У сямейным коле мой цесьць — выдатны гумарыст, вясёлы субёседнік, за кубкам піва прадыскутавалі мы зь ім ці адну сусьветную праблему. Але заўсёдная наша тэма была — жыцьцё беларускае. Выдатная ягоная бібліятэка згарэла з хатай ягонага цесьця на Першамайскай у 1941 годзе.

Зь Янкам Юхнаўцом зь Лепельшчыны знаёмы ад 1945 году. Вельмі шмат хадзілі па кнігарнях. Бадай, не было тэмы, якую б мы не прадыскутавалі, але грамадзкую беларускую тэматыку — маю ўлюбёную тэму — ён дыскутаваць не любіў.

*Вітаўт Кіпель*

*Антон Адамовіч*

# ТУТ НЕ МАСКВА
## (Да ўсяго, што сягоньня і ўчора)

# МЕНСКУ
## (На ўгодкі вялікае пажогі)

# ЧОРНАЯ БЕЛЬ

# КАХАНЫ ГОРАД
## (Завязка раману)

Беларусы — не расейцы!

*В. К.*

Ішлі гады, паблісквалі вёснамі імклівымі, зіхацелі летамі навальнічнымі, асыпаліся ліставейнымі восенямі, залягалі сьнежна-іскрыстымі зімамі...

Ішлі гады...

Шчасьлівейшыя — мералі вёснамі гады. Маладосьцю мералі ўсё жыцьцё, як адзін вялікі дзень.

Ды ці бывае-ткі яна, вечная маладосьць?

І ці шмат шчасьлівых на сьвеце?

Шчасьлівыя прашчуры толькі — на леты лічылі век. Залаты іхны век — заўсёды ў мінуўшчыне...

«Лета Божага тысяча чатырыста дванаццатага ад нараджэньня Хрыста...»

І палеглі ў дамавіны прашчуры, шчасьлівыя, бестурботныя — занадта бестурботныя...

І пакінулі нашчадкам працу ў поце аблічча свайго, пакінулі вялікі, непазбыўны сум.

Сум вялікі, ой! узрос бясконца:
Дзе ж ты і лета, дзе й месяц ліпень?
Пашчапаліся вусны ад сонца
І да плеч кашулі зрэбныя прыліплі...

...І пакінулі нашчадкам, нам — на восені мераць, лічыць гады...

І гады ішлі, цяклі гады, як адна даўгазвонная восень.

Ішлі гады...

* * *

Восень!

Перад новаю зданьню тваёй у экстазе ўкленчыў юнак, і песьня — на вуснах натхнёных.

...А песьня расла, сітавала душу,
Нурцавала ў вяршаліны сосен,

Казала: прыйдзі, так цябе я прашу,
Прыйдзі, пурпуровая восень!
І восень прыйшла, восень — ці здань?

І дарыла дары ўсім, усім, і здалося ўсім — залатая восень. Залаты век — прашчураў век — мільгануў па-за пурпурам здані.

Кароткі век, восеньскі, матыліны век...

І ўгледзелі ўсе: не залатая — пурпуровая восень. І ўгледзелі ўсе — на пурпуры кроў. Кроў, прагная новай крыві. І сваю кроў угледзелі ўсе на пурпуры тым. І ўцямілі ўраз — што позна. Што пярэйдзе на пурпур уся жывая, гарачая кроў — крывічанская кроў краіны...

І чулі, як вецер нагвалт зазваніў,
Бражджаў ува ўсе аканіцы.
Гарэла каліна ў сьцюдзёным агні,
Лісьцё пачало мітусіцца...
І пурпур гарэў, чырванеў, напіваўся, чарнеў...

Чорная восень — вось яна! Чорна, чорна ўсё навокал. І чорных воронаў — раптам — адкуль? — чорных варонаў грудкі й груды, і навалы чорных-чарнюшчых варон.

Чорныя вароны над бязьлістым садам
Узьвіваюцца ўгору ды зноў асядуць...
На гальлі кашлатым сум сябе павесіў...
Як ляцець варонам к радасьці бязь песьняў?

А на песьню ж — якга — прыляцелі сюды. Ухапіць яе ў дзюбы, песьню жывую, ірваць, шкуматаць — і каб капала кроў, крывічанская кроў краіны — пад карканьня крык:

— Мас-ква! Мас-ква! Мас-ква!

З гэтым трыюмфам — да радасьці гэнай ляцець.

Крывавая восень у Крывіі...

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Крывавая восень!

Торбы надзела, пугі зьвіла і — туды, дзе заўсёды зіма, дзе —
Сьнягі, ляды,
Абрус жуды,
Назаўсягды,
На вечны час
Ляглі...

Пагнала перад сабою, а тэй там — няма, не было б канца...

І адзадзя, дзе быў бацькаў кут, —
З вараньнячым крыкам узьнімаюць лопат,
Круцяцца над ежай мітусьлівым лётам...
— Мас-ква! Мас-ква! Мас-ква!

Ненажэрная.
Тая, што сьлязам ня верыць...

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Пазьлятаюць пялёсткі з шыпшыны —
У дзіды ўпартасьць кладзе яна.
Ах вы, сьцежкі роднай краіны,
Пасьля восені — будзе вясна.

Вясны не было. Навальніцай адразу ўдарыла лета. Навальніца ламала, крышыла, бушавала, навальніца — такое ня бачылі шчэ! І аціхла калі — недалёка вакол пачысьцеў далягляд.

Ды нячутна, ціхутка зь лета — зноў выйшла восень.

Зноў, але — новая. Жоўтая восень.

Залатая восень?

Сьцежкамі роднай краіны паходжвае восень, і ўпартыя дзіды шыпшыніны салютуюць ёй — жыве!

О Беларусь, мая шыпшына,
Зялёны ліст, чырвоны цьвет!
У ветры дзікім не загінеш,
Чарнобылем не зарасьцеш!

Не зарасла, і чорныя крылы варон ня ўскрылі. Бо падрэзаны крылы ўжо,

Даляцець да песьні не хапае сілы,
Анямелі ўзмахі ў варон крыклівых...
Абыходзяць людзі, каб ня чуць іх крыку,
Да таго ён дзікі й да таго ён прыкры...

Няхай пакрычаць. Няхай папрабуюць узьлётваць нават, махаючы даўгімі чорнымі крысамі — там, дзе крылы былі... Няхай. Бо шырока дыхае прасьцяг, новым звонам восені далёка зьвініць:

— Тут не Масква! Тут не Масква!

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Будзе яшчэ й зіма. Можа, лютая, можа, суворая, можа, даўгая-даўгая ляжа яшчэ зіма. Будзе ўсё.

Але й вясна нарэшце — будзе?

Будзе, стане, бо ўсё мацней і размашысьцей гудзе звон восені, усё гразьней цяжкімі ўдарамі падае медзь:

Тут не Масква.

## МЕНСКУ
*(На ўгодкі вялікае пажогі)*

Менск, многацерпялівы, многапакутны Менск!

Ці памятаеш ты, ак калісьці, даўно-даўно, на Нямізе тваёй «снапы слалі галовамі»? Ці памятаеш ты злых Яраславічаў, Менск? Ці ўспамінаеш і Ўсяслава свайго, таго Чарадзея, ваўкалака? «Скочы ваўком да Нямігі з Дудутак»...

Забыўся, стары... Забылася й Няміга твая, забылася, звузела, здрабнела, пад мост загналі... Не «дабром пасеяныя» берагі, не «касьцьмі сыноў» — брудам і поскудзьдзю зацягнула, заплыло...

Манамаха ці ўспомніш, Менск? Крывавы рогат: ха-ха, «ізьехахом горад і не оставіхом ні чалядзіна ні скаціны», ха-ха-ха... Тройчы набег Манамахаў ці памятаеш, Менск?

А маскоўскіх татараў, калмыкаў? А Махмэт-Гірэеў ясыр?

І пажары, пажары, пажары...

А Вялікага маленькага Карсыканца, гэтага, на белым кані, — гэтага хіба што мусіш успомніць?

То ж на бруку тваім першы раз спатыкнуўся ваеньніцкі конь... Памятаеш?

... 26-ты чэрвень 1812 год...

Сусьвет пад нагамі, а на бруку тваім першы раз спатыкнуўся ваеньніцкі конь...

Не, лепш не ўспамінай, лепш забудзься на ўсё, стары, родны, любы Менск! Бо не забыцца табе на адное ніколі.

Не забыцца, як мора агню залівала, плыло і гуло, рагатала старым манамахавым рогатам, трашчэла і пырхала дробным, зларадным сьмяшком.

Не забыцца і не даравацъ. Ні таму, ні другому. Ніколі.

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Чулі мы ня раз: «Вільня мае сваю душу». Дзе твая душа, Менск? У чым яна?

Ці ня ў імі тваім схаваны сьлед душы твае, Менск?

Горад менны, ты заўсёды мяняў, Менск. Куны, лісы, попел, смалу і соль... Рагвалодавічаў на Яраславічаў, Глебавічаў на Манамахавічаў, польскіх ваяводаў на маскоўскіх — гаспадароў, валадароў сваіх ты мяняў, Менск.

Нават імя сваё — хоць траха, а зьмяняў, Менск. Зносіў, як Мінскам дражнілі цябе.

І забылася Няміга твая, на Ўсяслававу крыўду забылася, а душою тваёй прагавіта жыла...

Імкненьні, імкненьні —
Аўто — і тое памалу,
Нямізе ж мала каменьня —
Сьцены патынкавала
І памаленьку, паволі —
На концы.
Імкненьне яе малое —
Даляры, чырвонцы...

Гэтую конку, гэтую Нямігу, пэўна, добра памятаеш, Менск.

Удзень — Нізкі Рынак, увечар — Брахалка*...

Зьнікла яна, а ўспамінаецца часта:

Як пыл падкалёсны,
У шчыліне кожнай
З усьмешкаю злоснай
Нам зычыць варожасьць:
Вы пашырайце культуру,
Стварайце паэмы, пішэце карціны...
Мы вам з музыкай справім хаўтуры,
Мы вам вянкі ўзложым на дамавіны...
Вы разьбівайце сабе галовы
Ў жалю і крыўдзе за міліёны —
«Дурань заўсёды ходзіць голы,
А разумнага ногі кормяць»...

Зьнікла — ці ж бы? Можа, толькі ў новай скуры — і шчэ горш, бо як бы ў сваёй — мяняе зноў — на Сураскім, Камароўскім, Чэрвеньскім... І — «як пыл падкалёсны»:

— Белорускoй (!) буржуазіі не дают развіваться...

. . . . .. . . . . . . . . . . . . . . . .

Старога дудара свайго ці памятаеш, Менск?
Няма, як Менск наш! — дзетачкі міленькі!
Прыгожы, відны, кругом весяленькі...
А гэтага, замілаванага ў цябе трубадура:

---

* Брахалка — так у Менску здаўна называюць бульварчык насупраць цяперашняга Генэральнага Камісарыяту. (Заўв. аўтара.)

Цераз даліны і палі ішоў
Ад бору ў Менск паволі вечар,
І калыхаўся за плячыма шоўк,
Лілёвасьцю аздобіў плечы.
Можа, гэта ня вечар, а дух іхны — дух узыходу і ўзвышша —
Над Менскам лёг на стрэхі камяніц,
Усьпёршы галаву на локаць.
А Менск шуміць, а Менск шуміць,
Пакуль ня прыйдзе ноч здалёку...
А памятаеш, Менск, быў ты — Беларускі Дом.
Вежа твая — маяком. Старая вежа з гадзіньнікам.
І натхнёна трубіў трубадур:
Летуценьні многіх міліёнаў
І змаганьне ўпартае вякоў —
Менск акрэсьліў і краінай вольнай
Беларусь да росквіту павёў.
Ды ўроджаны твой Максім — хоць калі яшчэ — а напарокваў:
Мы к сьветлу з табой узьляцелі
І шкло ўкруг напаткалі...
І далей болей вёў —
...Матыль дрыжыць ад болю,
Прываблены жывым агнём,
Ён рынуўся туды бяз волі
І сьмерць сваю спаткаў у ём...
Колькі такіх матылёў спаліў ты, Менск! А колькі нас апаліла тады сваё крыльле...
Ты і тады, ты і тады мяняў. Мяняў, разьменьваў сьвятое, страшнае:
Б е л а р у с ь.
Адкупіцца хацеў ад іх?
Дык жа вось і застаўся цяпер пры рэшце.
. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .
Ты абураны, ты гневаесься на мяне, Менск? Ня гэта твая душа? «Усё цячэ, усё мяняецца» — ты прэтэндуеш на душу самога жыцьця? Можа...
А можа — «дзьве душы»?
Прабач, родны.
— Дзе п'юць, там і льлюць.
І я, і ты.
. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .
Рана вуліцамі тваймі на працу іду.
Не, ня вуліцамі — руінамі.

Руіны стаяць. Руіны ляжаць — друзам.

Возяць друзы старыя коні твае — ламавікі. Цягнуць цягніцы, пружацца з апошняй, цягнуць. Менскія ламавікі — худыя, згаладалыя вайною коні.

Падысьці, упрагчыся, цягнуць разам, бедныя, любыя!

А ці ж ня так ёсьць?

Так жа і цягнеш адзін штодня...

...І некалі так — пайсьці па вуліцах гэтых, расьцягнуцца зьнясіленым ламавіком тваім — Менск, Беларусь!

Так і сканаць. Пад сыкі з «шчыліны кожнай». Пад посьвісты пугі, пад лаянку, гікі.

Шчасьцем такім — родны — не абмінеш?

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Расставаліся калісьці, думалася — навек.

І нечакана — спатканьне...

Дык ці ж можна цяпер ня ймець веры?

Веру! Верым. У цябе, Менск.

І Ён калісьці з горычай, а верыў:

Менск, Менск! Твае заводы —
Больш да карыкатураў падобны.
Але ты расьцьвіцеш,
Ты станеш сапраўдным горадам.
Менск, Менск!
Тады будуць заводы другія,
Не для сэльтэрскай вады ці піва.
Мы можа раней загінем,
Але будзем імкнуцца да мэты
Напорна, цярпліва.

## ЧОРНАЯ БЕЛЬ

Ти чого так нервово трепещеш?
Ждеш від мене признаня того?
Я страждаю, та ба! Не признаюсь.
Ти — чужа, не з народу мого!
***Кримський***

Беларус павінен вышэй трымаць галаву і, калі выбірае сабе таварышку жыцьця, дык такой можа быць толькі свая нацыянальная сяброўка, аднае думкі, аднае ідэі, аднае крыві.

*Зь перадавіцаў Ул. Казлоўскага*

Чорныя па белым рояцца думкі, шукаюць, як чорнае зь белым зьліць, выліцца ў словы, радкамі — чорным на белым — застыгнуць.

Белыя на чорным кладуцца стыглінкі — белы цярушыць сьнег на чорныя грудзі маці-зямлі.

Першы сьнег.

Першы верш.

Белая пуховая шапачка — як сам першы сьнег. Белая, чыстая — так? — уся сама, і — сьцюдзёная, можа, у белі сваёй — як сам першы сьнег.

А ў самога — чорна так на душы — учарнела даўно, закурэла.

— Ці праўда, што ў Вас усе пішуць вершы?

І дробна, як нейкі верш, выбівае на белым сьлядок чорны маленькі абцас. За ім — большы сьлед — ня ў рыфму... І ня ў рыфму — хрусь — тонкі нейкі лядок.

— Беларусы ўсе пішуць вершы. Хоць раз у жыцьці.

— А каб не пісалі?

— Можа й лепш бы. Ды, пэўна, — горш. Хто ведае. Як каму.
— Перавярнулі б сьвет?
— Можа й добра кажаце самі.
Сьнег — хутчэй, і хутчэй — як шкода! — хада.
— А Ваш «раз» — быў? «Хоць раз у жыцьці»?
— Не было йшчэ — жыцьця... Так усё — нейкі сьнег, і ўсё — нейкі першы... Хоць, кажуць, жыцьцё — яшчэ горш: адвечны, усё леташні сьнег...
— Дык што гэта — здрада народу? Бязь вершаў — і без жыцьця?
Строга нават і ўрачыста:
— Чорныя думкі аб здрадзе, белая ўся наша Беларусь?
Белая ўся, так — як Вы...
А ў самога — чорна так на душы: гэта — ня здрада? І ўжо ў яе пад абцасам таксама хрусьціць лядок.
— Я — не. Не така-ая! А цікава было б зірнуць...
— Як пішуцца вершы?
— На Беларусь. І — як пішуць, таксама.
— Адно — лёгка паказаць.
— А другое? І каторае?
— Хіба што — верш.
Сьнег — і калі? — перасьціх. А сьлядоў на ім ужо — і калі? — як багата! Ці ня ўплёўшыся ў іх — прыцялася й хада.
— Вось мой дом. І трэба дадому.
Так, ён — і ён між белага чорны. Чорнымі вокнамі — мёртвы, сьляпы. А сьляды — чые — і так багата?
— Ведаю, ваш. Ведаю, трэба. Не першыня.
— А можа — часінку?
— Сёньня — не. Дык — да заўтра?
— Можа...
— Ня можа — напэўна! «Не першыня»!
Паўадваротам:
— І каб быў верш!
А маленькім чорным абцасам — нецярпліва й наравіста — загад? — два разы: празь белае — дзьве чорныя ранкі зямлі.
— Да заўтра!
Весьнічкі — раз, і адмахам — два. Дзьве чорныя ранкі. Па дошках па ганку — дробненькі тупат абцасаў.
Так і бяруць «пад абцас»?
Бразгат завалы. І закладаюць ізноў.
Думай цяпер. Здрада. Што здрада? Гэтак хадзіць? Верш напісаць? Не пісаць? Не хадзіць?
Белае — так: Беларусь. Наша. Наша — і «ваша» ў яе...
Чорнае: здрада. І здрада — верш.

Дык верш?
Першы верш.
Першы сьнег.

Можа, калісьці ў сьне
Гэтак было, як цяпер:
Першы бялюткі сьнег,
Я кахаю цябе.
Ты кахаеш мяне
(Гэта — толькі ў сьне)
Ў гэткай прыгожай мане
Першы бялюткі сьнег...
Дружна ўдваіх ідзём,
І рука ў руцэ,
Вось ужо хутка і дом,
Вораг маіх уцех.
Вось ужо хутка і дом —
Колькі навокал сьлядоў!
— Вось ужо хутка ідзём! —
Жаліцца нават лядок.
Сьцішма крыху хаду:
Ростань пасьпее прыйсьці...
Заўтра прыйду — не прыйду —
Іншы мо' будзе прыцін...

Іншы мо' будзе ход дум,
Сьцішма крыху хаду...
Заўтра прыйду — не прыйду,
Заўжды з табою мой дух!
Ведаю, будзе так
І на яве, ня ў сьне:
Сыдзе ўся слата
Некалі па вясьне.
Сыдзе апошні сьнег
Некалі па вясьне...
Бразнуць завалы сяней
На яве, ня ў сьне.
Вось калі конча прыйду,
Бо не змагу не прыйсьці,
Вось калі знойдзе ход дум
Свой немінучы прыцін.
Вось калі нашых сьлядоў
Не дакранецца слата,
Вось калі струшчым лядок,
Што паміж намі паўстаў.

Гэта лёгка зусім — верш.

І таму стопудова наваліцца, цісьне пасьля.

Ужо — той абцас? Маленькі такі ж — хіба мог прыгнеціць гэтак?

А ён ткі, ён. Маленькі — дарма, а проста на сэрца, у сэрца. Маленькае й сэрца — пружкі й трапяткі камячок...

— І баліць таму, дык і «рвецца, рвецца на кавалкі за цябе, сябе й за другую»...

За другую, што — хай і нязнанкай яшчэ — адтуль, з-за тысячаў даляў, зь немым дакорам глядзіць: якім правам?

Якім правам — пад абцас, пад той усё пад чужацкі бот — самахоць?

Чакай, не сьпяшай, строгая ты: прававацца — будзем!

Так, ішлі самахоць. І зваблёныя — ішлі. Славу несьлі, палеглі ў вяках — усё ім, і ўсё для іх — для чужых і варожых.

Дык і даруецца так? Словамі толькі адплата сплыве?

Не — адрабіць! І цяпер якраз — адрабіць! Перавабіць, перавабіць сабе на свой бок — іхных лепшых, найлепшых — сарваць!

За нашых за тых, што забралі сабе, што ад нас — адарвалі.

І зь яе, з гэтай белай зусім — беларуску зрабіць! Цяжка? — Нашай будзе і ёй, як параніць прадоньнем блакіту вачэй і тугі — Беларусь!

Будзе!

Зьнікла зь немым з дакорам — зусім, а чаму ж так шчыміць, і шчыміць, і шчыміць?

І адкуль гэта — гукі? Жалейка? Скрыпка? А як працінае-шчыміць!...

З цэлага хору — адна.

Зраньня сьнег.

Сьнег — цэлы дзень.

І пад вечар — мяцеліца — сьнег.

Дык — сьпяшайся хутчэй: гэта ж сяньня — учарайшае заўтра, і сяньня — учарайшы верш — аддаць...

Белае з чорным ізноў. Чорны прастор. І белы вар'юецца, скача ў ім — сьнегавей. Мяцеліца.

Стой — ці ня гэтак было?

Па сьняжыстай дарожцы мчыцца ў зброі хтось да вёскі.

А пад буркаю нешта хавае...

Леташні, пазалеташні — ой, як даўны сьнег! Іх, трох Будрысаў, — ці ня тыя ж сьняжыстыя сьцежкі насілі? І чацьвёртым між імі, а першым над імі — сам ён, забраны Адам. Колькі сьцежак — а ўсё ў адну. У адну — у гэту.

Адвечным тропам.

Пад абцас.

Забыўся? «Адрабіць»! «Адрабіць» — толькі рэзкі мяцелічын рогат.

Не — назад! Як крутчэй! Як хутчэй!

Назад і — назаўсёды.

...І ўрачыста, скрозь рогат завеі — скрыпка грыміць.

Чуеш, з цэлага хору — адна.

Назад! Назад!

Ціха. Цёпла. Сьветла. — Дома.

Па ўцёках — ах, як ціха! Хай жа: гукі сусьвету рынуць мацней — разьбіць цішыню. І чорная розьверць — рупар — белай мяцеліцай гукаў — сыпле ад сьценкі — проста з двара?

...Як па вуліцы мяцеліца мяце...

Мяце — не мяце? Здрада — ня здрада? Ці аднэй, ці другой — а чорная. А яны ж — ці адна, ці другая — а белая.

Чорная бель.

І назад — ужо было, і ня можна ізноў ад яго — назад!

Не, не, не!
... Як па вуліцы мяцеліца мяце...
Толькі адно — верш:

Запяваюць ізноў галасы:
«Як па вуліцы мяцеліца мяце».
Запылелі палёў абрусы,
Засьняжыла часьцей і часьцей.
Мітусеньнямі такой часьціні,
Пераплётамі завейных галасоў
Завіруюць і ночы, і дні,
Не пазнаеш, дзе ява, дзе сон.
За мяцеліцай хістаюся — іду,
Не п'яны, а цьвярдосьці не стае.
Як дарожку да мілае знайду,
Як патраплю на заклік яе?
Рэжа вочы мне мяцелічын дым,
Напушчаюцца віхры чарадой,
Замятае адзадзя сьляды,
І наперадзе — жадных сьлядоў.
Хоць вазьмі — на ўзьвей-вецер гукай:
«Пачакай-пастой, дзяўчыненька мая!»
Ды ня дасца й сьлядка адшукаць,
Ды ня выблісьне зь цемры маяк.
Хоць вазьмі — сярод поля стань:
«Загубіла ты малойчыка мяне».
Ды ўсходзіцца болей хвастаць.
Ды ўзьюшыцца, злая, мацней.
Ды зьмяёй-папаўзухай каля ног
Засіпіць, каб як джалам працяць.
Абвіла б, задушыла б даўно,
Каб спыніўся на момант хаця.
Добра, нехта напявае: «Не зважай,
Не зважай на перагасы ўсе:
Гэта толькі імжа, гэта толькі імжа,
Ёю вецер, як хоча, трасе.
За імжою — нічога, ані:
Нават небу няма дзе сінець,
Ты і мілую таксама прысьніў,
І мяцеліцай трызьніш у сьне.
А захочаш прачнуцца — разамжы
Свае вейкі і спробуй здышаць:
Як даўно на апошняй мяжы,
На крыжы балянсуе душа...
І ці дзіва, што гэта ў ёй
І мяцеліцы зьвілі гняздо,
І сумётаў, і гурбаў — а-ёй!
І наперадзе — жадных сьлядоў!..»

Апошні верш.
Назаўтра была адлега.

## КАХАНЫ ГОРАД
*(Завязка раману)*

*АД АЎТАРА*

«Каханы горад» напісаны ў 1943 г. Найпершай нагодай да напісаньня яго былі ўражаньні ад дэманстрацыйнага, «сьвяточнага», але барбарска бязьлітаснага бамбардаваньня безбароннага й пазбаўленага ўсялякіх ваенных аб'ектаў Менску саветамі ў ноч на 1 траўня 1943 г. Туга па каханым горадзе на прымусовым выгнаньні ў Нямеччыне дала апошнюю нагоду, штуршок. Аднак «Каханы горад» нараджаўся, відаць, пад не шчасьліваю зоркаю. Менская «Беларуская газэта», куды ён найперш быў пасланы ў канцы 1943 г., ніяк не магла адважыцца надрукаваць яго. Прапанаваліся аўтару розныя зьмены з гледзішча на цэнзуру ці, праўдзівей і дакладней, на страх магчымае цэнзуры. Зьмены былі для аўтара непрымальныя, бо зусім вылаўлялі рэч. У марудным ліставаньні Нямеччына — Менск, ліставаньні-таргаваньні сплываў час, і, нарэшце, пры пасьпешным эвакуяваньні зь Менску перад савецкім наступам большую частку рукапісу рэдактары зусім згубілі. Аўтар, аднак, не ўтаймоўваўся, аднавіў усё зноў з шчасьлівым выпадкам захаваных чарнавікоў ды пачаў нанова стукацца ў рэдакцыйныя дзьверы, гэтым разам ужо да бэрлінскае «Раніцы». Але й тут удалося прымайстраваць рукапіс толькі ў «Беларускім Работніку», адмысловай газэце для остаў, прыбудоўцы да «Раніцы». Там быццам бы з цэнзурай было лягчэй. Тут «Каханы горад» і быў надрукаваны ўпершыню ўвосень 1944 г.

«Каханы горад» спачатку быў задуманы й выкананы як апрычонае закончанае апавяданьне-навэля. Аднак пры аднаўленьні яго другі раз паўстала думка разглядаць рэч як завязку раману, што й было выказана ў зацемцы ў канцы друкаванага ў «Беларускім Работніку» тэксту. Думкі гэтае аўтар ня кідае й цяпер, чаму ў цяперашнім выданьні «Каханы горад» мае падзагаловак «Завязка раману». Тэкст гэтага выданьня, дарэчы, апрача дроб-

ных стылістычных паправак і аднаўленьня некаторых невялічкіх пропускаў паходжаньня чыста друкарскага (а мо' й прымітыўнага, казаў той, прэвэнцыйна-цэнзурнага, «на ўсякі выпадак»), нічым істотна ня розьніцца ад тэксту 1943 г.

Яшчэ, разгаварыўшыся, аўтар хоча сказаць, што ў гэтай, як і ў ранейшых сваіх спробах («Усяночная», «Трывога»), ён карыстаўся, між іншага, адным з найулюбёнейшых мэтадаў нябожчыка З. Бядулі, якім напісаныя ягоныя «Салавей» і «Язэп Крушынскі» і які ўзвышэнскі крытык Адам Бабарэка сваім часам вельмі трапна назваў быў «мэтадам натураграфічнага зашыфроўваньня». Мэтад гэты, вынайдзены ў абставінах савецкага гвалту над свабодаю друку, быў вельмі зручны й пад зусім такім самым, у прынцыпе таталітарным, ціскам нямецка-гітлераўскім. Лёгка было зашыфроўваць сьпісваных проста з натуры герояў «герэнфольку» пад зусім ідэнтычных ім псыхалягічна камуністых, актывістых, камісараў (у «Каханым горадзе», між іншага, такая эпізадычная фігура Макрыцы, пад якой зашыфраваны як натуршчык ведамы сваім часам у Менску ляйтар усяе «культуры й асьветы» ў Генэральным Камісарыяце Беларусі, зьнямчэлы паляк Сівіца). Натуршчыкамі аўтаравымі былі й некаторыя прэтэндэнты на нашых нацыянальных дзеячоў (у «Каханым горадзе» такі Качка, а таксама, крыху больш толькі зборны, Віктар Лабуніч). Нельга сказаць, аднак, каб усе пэрсанажы былі пісаныя з натуршчыкаў (прыкладам, жанчына ў чорным у «Каханым горадзе»). Бальшыня натуршчыкаў аўтаравых жыве і цяпер, аўтар нават мог бы прысьвяціць ім сваю гэтую пісаніну як невялічкае, ды мо' не такое ўжо крывое (хіба што — крывіцкае) люстэрка.

*01.04.1948, Баварыя*

Таварыш, пройдзе ўсе баі і войны
Бяз кроплі сну, бяз званьня цішыні.
Каханы горад можа спаць спакойна
І роіць сны, і зелянець сярод вясны.

*З папулярнай савецкай песьні*

## I

— Эскадрыльля, таварышы, атрымала хоць і нескладанае, але вельмі пачэснае заданьне. Кажу «нескладанае», бо ў тых пунктах, якія вы мусіце пакрыць сяньня, няма, шчыра кажучы, ніякіх паважных ваенных аб'ектаў. Няма таму й ніякай варожа-

вай абароны, аб гэтым у нас пэўныя весткі. Але, мушу падчыркнуць яшчэ раз, заданьне надзвычай пачэснае, бо вы павінны будзеце напярэдадні нашага вялікага травеньскага сьвята і недалёкага яшчэ большага, велізманага наступу прадэманстраваць узрост моцы й магутнасьці сталінскай авіяцыі, і гэта — у закінутых кутках абшараў, часова занятых ворагам. Думаю, усё ясна? Камандзеры зьвязаў атрымаюць «пуцёўкі».

Камандзеры зьвязаў, ня хочучы, але падаліся ўжо былі да камэскадрыльлі, які праказаў сваю невялічкую прамову без асаблівага энтузіязму й ахвоты нават. Усе яны — і камандзер і каманда — маніліся яшчэ гэтага вечару, паводле іхнага тэхнічнага выразу, «даць старт у сьвята». Дык вымушаная адмена гэнага не магла іх цешыць. Заданьні ж, і «пачэсныя» і непачэсныя, і «складаныя» і «нескладаныя», абрыдлі ўжо аж надта, як і сама вайна.

Але раздаваньне «пуцёвак» яшчэ прыпыніў камісар эскадрыльлі, маленькі, вяртлясты таварыш Цэнцыпэр, які вырас як з-пад зямлі каля камандзера, шапянуў яму пару слоўцаў і загадным гэстам рукі прапанаваў усім ізноў сесьці. Відаць, не задаволіла яго камандзерава «ўсё ясна», і ён уважаў за канечнае яшчэ раз «разьясьніць», фактычна ж — распляскаць, размазаць і распэцкаць агульнаведамыя ўсім рэчы. Усе селі зь яшчэ большым расчараваньнем, бо кажны добра знаў наперад, што скажа і што можа наагул сказаць камісар, і ведаў, што ў кароткім часе гэтая казань аніяк не ўкладзецца...

Абрыджэньне павялічвалася яшчэ й тым, што таварыша Цэнцыпэра ўсе страшэнна не любілі, зрэшты, пры ўзаемнасьці зь ягонага боку. Першы рызыкант і вастраслоў эскадрыльлі, пракідкі й спрытны Юрка Галушка, знайшоў для яго трапную прыкладку — Макрыца. Хоць і вынайдзеная, сказаць бы, філялягічным шляхам (Юрка ў камісаравым «імі-войчасьцьве» Марка Ісакавіч замяніў Ісака на больш аўтэнтычнага Іцу, а з Маркі Іцавіча ўжо, як казаў ён, «чыста-матэматычным спосабам перастаўленьня й скарачэньня» атрымалася Макрыца), мянушка гэтая як нельга лепш прылягала да такога, сапраўды, як бы наскрозь мокрага, слізкога, наагул страшэнна плюгавага стварэньня, з абліччам спрэс у чырвоных плямах, таксама наводля нейкіх мокрых лішаёў. Дык сьціха й міжсобку камісара інакш і ня звалі.

— Мы, слаўныя сталінскія сакалы, звыклі не баяцца ніякіх высачыняў і далячыняў, — здалёку, урачыста-ўзьнёсла пачаў сваю рацэю таварыш Цэнцыпэр. Хто слухаў, ня мог адразу, хоць сам сабе, нутрана не ўсьміхнуцца ўсёй міжвольнай самагіроніі

гэтага «мы». Бо агульнаведама было, што сам Макрыца аніразу ў жыцьці не адважыўся ўзьняцца на якую-небудзь «высачыню» ў паветра, уважаючы, відаць, за бесьпячнейшае перасоўвацца па цьвёрдай зямлі. Колькі ні прапаноўваў яму той жа Юрка «павазіць па эмпірэях», — праўда, не без патаёмнага намеру добра пабоўтаць камісаравы вантробы ў розных паветраных бочках і іншых фокусах, на якія быў мэт, — «слаўны сакол» заўсёды строга адгаворваўся недапушчальнасьцяй выдаткаваць ваенна важныя матар'ялы, бэнзыну й іншае, «дзеля асабістае прыемнасьці адзінкі, хоць бы сабе й камісара», як казаў ён. «Паказаў бы я табе «асабістую прыемнасьць», — зазначыў быў тады сяброў Юрка, завяршаючы свой асуд горкаўскім «роджаны поўзаць — лётаць ня можа». — «Пэўна ж, макрыца», — згаджаліся тыя.

Але цяпер бадай усе былі занятыя ня слуханьнем знаёмае наперад нуднае прамовы, а назіраньнем даволі камічнага здарэньня. Сваім звычаем, «безупынна выдзяляючы мокрадзь адкуль толькі можна», паводле Юркавага азначэньня, Макрыца адразу апляваў бліжэйшых да сябе слухачоў. І найбольшы пырск сьліны прыпаў якраз на нос камандзеру першага зьвязу, Юркаваму земляку й беспасярэдняму начальніку Віктару Лабунічу. Той сядзеў насупраць камісара, як заўсёды, мёртва ўталопіўшыся ў яго сваймі круглымі вачыма. Гэта быў Макрыцавы ўлюбёнец, які разам зь ім падзяляў усіхную нялюбасьць і непрыхільнасьць ды зусім заслужана (праўда, за вочы) абзываўся і кар'ерыстым, і самасуем, і вылупенцам. Цяпер усе сачылі, як Лабуніч удае, быццам ён так пранікла й захоплена слухае прамову, што зусім не спасьцерагае нечага там у сябе на носе, хоць усім добра відаць, як ён змагаецца з тым, каб не скрывіцца, а то й ці ня чхнуць. Абцерці ж плюваціньне Віктар ня важыцца. Праўда, адразу ён быў і памкнуўся ў кішэню па насатку, але тут жа адумаўся, баючыся, каб як мо' не абразіць гэтым свайго патрона. Назіраньне такіх «перажываньняў публічна аплёванага», як схарактарызаваў пасьля Юрка, узьняло крыху агульны настрой, які дасягнуў нарэшце свайго кульмінацыйнага пункту, калі геройскі Галушка ціхенька на пальчыках падкаціўся да Лабуніча й асьцярожна, але спраўна махнуўшы хустачкай, зьбіў зь ягонага носу камісаравы пырскі, чаго апырсканы зноў жа быццам бы не спасьцярог. «Зарабіў толькі ад Макрыцы тры грошы за дэманстрацыю, але што ён мне — на хвост солі насыпе?» — шапнуў на вуха сябру рызыкант, зьвярнуўшыся на месца. На гэтым, аднак, прыемная забава гледачоў мусіла спыніцца, і хоцькі-ня-хоцькі давялося прыслухацца да прамовы.

А прамоўца тым часам разьвіваў якраз сваю ўлюбёную тэму «бязжаласнасьці — гэтай неадымнай якасьці кажнага партыйнага й непартыйнага бальшавіка».

— Гэта, таварышы, факт, — выпырскваў ён, — што сяньня вы павінны будзеце й такі зьнішчыце шмат звычайнага, так званага «мірнага» жыхарства. Ці можа тут мець месца якая-колечы «жаласьць»? Безумоўна, таварышы, не. Не забывайцеся, што гэта тое жыхарства, якое не захацела ісьці з намі, гэта значыць, здраднікі, прадаўцы, ворагі народу. Хто зь іх адумаўся й цяпер шчыра перакінуўся на наш бок, той ужо ў партызанах, у лесе, і значыцца, яго вашыя бомбы не крануць. Апрача таго, памятайце, што гэтае жыхарства — рэзэрвуар працоўнае сілы для нямецка-гітлераўскага ворага і, зьнішчаючы яго, вы гэтым самым падрываеце ворагаву моц...

— І вось тут, — урачыста ўзвышаючы голас і прыціскаючы на асобных словах, прымусіў ужо ўсіх прыслухацца камісар, — перад некаторымі з вас паўстане сяньня вялікае выпрабаваньне, сапраўдны экзамэн на баёвага летуна бальшавіка. Я маю на ўвеце нашых сакалятаў першага, я мушу сказаць, і лепшага зьвязу, пад камандай таварыша Лабуніча. Яны лятуць сяньня ня толькі на сваю радзіму, але й на свой родны і, пэўна ж, каханы горад, які ўзгадаваў іх, таварышы, і даў нам. Факт, што ў іх там могуць і павінны быць бацькі, і сваякі, і сябры, мо' яшчэ хтонебудзь, і мілыя ўспаміны. Але я пэўны, што яны з гонарам управяцца з гэтым выпрабаваньнем.

Тут камісар пачаў хваліць свайго ўлюбёнца Лабуніча, праехаўся крыху, што ў некаторых іншых із зьвязу, — пэўна ж, у Юркі — «бываюць недахопы й дахопы», як сказаў ён, зараз жа, зрэшты, папраівіўшыся: «дасягненьні й недасягненьні»... Але ўжо ніводзін бадай з хваленых і ганеных ня слухаў больш яго, апанаваны навалай раптоўных успамінаў і хваляваньня ад блізкай — але якой? — сустрэчы зь любым, родным, так даўно ўжо, здаецца, пакінутым горадам... Нават сам сталёва-вытрыманы камандзер Лабуніч схамянуўся ад гэтае навалы пачуцьцяў толькі тады, калі трэ было браць «пуцёўку».

— Ардэнок як прышпілены, — шапянуў яму пры гэтым ягоны дабрадзей, і Віктар адказаў на гэта сваёй заўсёднай, падхалімска-халуйскай усьмешкай — тэй самай непаўторнай усьмешкай, якую ў цэлай Эўропе найлепш можна бачыць на вуснах ці малога ліку грамадзянаў ейнае шостае, усходняе часткі.

— Старт 20.30. Ёсьць час разабраць заданьне, адпачыць і падрыхтавацца, — закончыў зборку камандзер эскадрыльлі.

II

— Папаліся, землячкі! — падышоў адразу да трох, абдараваных «пачэсным заданьнем» бурыць радзімае гняздо, камандзер трэцяга зьвязу, здаравенна-медзьведзяваты й таксама медзьведзявата-настырлівы тамбовец Жарабцоў.

— Трох танкістых, трох вясёлых сябраў, —
Экіпаж машыны баявой, —

загундосіў ён сваім, як казаў Юрка, «жараббасам» дый, наверх, страшэнна фальшывячы. — Дадому, сяброчкі, усё-ткі дадому! — і, аблапіўшы трэцяга пілёта зьвязу, дзявоча-кволага Валіка Сьнягурскага, да якога пачуваў адмысловую сымпатыю й таму найбольш дакучаў, загуў яму на вуха, стараючыся ўдаць асаблівую задушэўнасьць, але яшчэ больш неміласэрна дзеручы ўпоперак:

— Каханы горад сябру ўсьміхнецца,
Знаёмы дом, зялёны сад і той пагляд...

— Адкасьніся хоць сяньня, — з дакукаю адпіхаў яго Валік, якому ўвага й пяшчоты Жарабцова заўсёды праўлялі вялікую прыкрасьць, а то й проста мучылі.

— А што — сяньня? — не ўтаймоўваўся Жарабцоў. — Падумаеш! Каб мне так зараз сказалі ляцець калупаць мой Тамбоў — я б адразу, калі ласка, з усім-усенькім...

— Дык хто табе не дае? — абарваў яго ўжо Юрка. — Завярніся кругом, ляж курсам назад і трамбуй свае тамбоўскія самавары.

— Самавары — гэта ў Туле, а Тамбоў, браце, слаўны...

— Ведаю, цётка там павінна быць нейкая, яшчэ ў Чэхава пісана... Але цяпер, браце, кілбасься хоць да тае цёткі, калі не да ўсіх мамак, — бачыш сам, не да цябе тут і не да Тамбова.

— Ну, ну няхай, — цісkануўшы яшчэ раз небараку Валіка, здаўся-ткі Жарабцоў, бо ў глыбі душы пабойваўся спрытнага і на язык і на так які фокус Юрку. — Эх, Тамбоў, Тамбоў, — каб адхапіць хоць зь дзянёк водпуску! — уздыхнуў толькі ён і адышоў зусім, усё гундосячы:

— Знаёмы дом, зялёны сад і той пагляд...

— Жывёліна! — папусьціў шэптам яму наўздагон Валік, папраўляючы парушаны жарабцоўскімі пяшчотамі парадак у вопратцы.

— Дык вось, таварышы, — зьвярнуўся строга афіцыйна да сваіх падначаленых, Юркі й Валіка, камандзер зьвязу. Дарма што ўсе тры былі землякамі й нават школьнымі сябрамі ды зналіся добра ад сама адмалку, Віктар, вылупіўшыся ў камандзеры, заўсёды трымаўся падчыркненай афіцыйнасьці пры службовых дачыненьнях. — Я ўжо разьмеркаваў, — і ён пачаў паказваць на пляне, далучаным да «пуцёўкі»: — Вы, таварыш Галушка, адразу ж пакрыеце поўнач гораду, па гэтую вось прыблізна лінію, я сам урэжуся ў сярэднюю паласу так, а вам, таварыш Сьнягурскі, — паўдзённая частка...

— Гэта ты... знарок, Віктар? — углядаючыся ў плян і адразу мяняючыся з твару ды хрыпнучы нек у голасе, спытаўся Валік.

— Што — знарок? Што Вы хочаце сказаць? — як не разумеючы, але ўвесь напружыўшыся, перапытаў Віктар.

— Ты ж ведаеш, тут жыў я... і цяпер, пэўна, мае старыя... на тым самым месцы... — паказваў на пляне Валік. — А вось жа слабодка. Верын дом на рагу...

— Ага, вось яно што, — прыкра засьмяяўся сваім сухім, бразгатлівым сьмехам Віктар, — дык значыцца, нездарма пяяў тут Жарабцоў: «Знаёмы дом, зялёны сад»... Знарок ці не знарок, таварыш Сьнягурскі, але, аказваецца, якраз добра выйшла. Ні ў каго бадай з цэлай эскадрыльлі не засталося яшчэ гэтулькі сэнтымэнтальшчыны й паненскасьці, тэй жаласьлівасьці, як у Вас. А чулі, што так добра казаў сяньня таварыш камісар? Вось якраз вам найлепшая нагода — давядзеце адно з двух: што вы — ці сапраўды цьвёрда мужны лятун-бальшавік, ці, прынамсі, — спрытны й асьцярожны пілёт-баявік. Я, ужо ж напэўна знарок, узяў сам сабе той раён, дзе нашая школа, у якой мы ўсе трох гэтулькі год вучыліся й пражылі так багата прыгожага... Цяпер там — ворагаў штаб, і я мушу даконча зьнішчыць яго, і здрузгачу не здрыгануўшыся. А тут жа што? І я ж пакінуў тут сваю маці і цяпер павінен таксама, дарма што чырвоны крыжык... Зразумела?

— Мяняймася, — запрапанаваў Валіку Юрка, — бо ў маім жа раёне з важных ваенных аб'ектаў — хіба што царква на могілках...

— Ніякіх менак, — сурова абарваў камандзер, — застанецца, як вызначана.

— Так... Дык дзякую за асаблівы давер... — выцадзіў Валік, пераходзячы на тую ж афіцыйнасьць. — Дазволіце ісьці?

— Калі ласка. Старт 20.30, не забудзьцеся, таварыш Сьнягурскі!

Валік пайшоў, крутка павярнуўшыся ды нат не адказыраўшы, толькі нэрвова-падчыркнена адбіваючы абцасамі.

— А праўда, дарма ты даў гэтай румзе такую частку — натаўчэць яшчэ кашы, празь нюні не разгледзеўшыся, — зазначыў па ягоным адыходзе Юрка.

— Колькі разоў прасіў не вучыць мяне — маю-ткі сваю галаву, — асадзіў яго начальнік. — Што, і табе яшчэ Верачка баліць?

— А табе — дык хіба ўжо не?

— Так ці не, але якраз я пэўны, што ўжо куды-куды, а на ейны дом, «знаёмы дом», сяньня й зерне макава не ўпадзе. І праўда, я ткі падумаў, падбіраючы адпаведную кандыдатуру, і ягонае «знарок» было не бяз рацыі.

— Маеш сваю галаву, — працягнуў у раздуме Юрка, але раптам якраз у ягонай галаве мільганула шалёная, вар'яцкая, як здалося было яму адразу, думка. І ажыўлены зноў раптоўным хваляваньнем, ён пасьпешна кінуў: — Дык цяпер адпачыць, падрыхтавацца...

І, адказыраўшы, адышоў, мала не бягучы.

Усе ўжо былі паразыходзіўшыся па сваіх палатках.

## III

Гісторыя трох сяброў, калі можна было цяпер сапраўды назваць іх сябрамі ў поўным сэньсе, нагадвала крыху гісторыю тых «трох танкістых, трох вясёлых сябраў» з моднае савецкае песьні, якую таму й гундосіў ім бадай заўсёды Жарабцоў. Віктар, Юрка й Валік на самай рэчы ўтварылі свой зьвяз паводле моднага сваім часам у савецкай арміі прынцыпу «экіпажаў братоў, сяброў, землякоў». Але ўвесь іхны шлях да гэтага зьвязу быў даволі своеасаблівым і цікавым.

Ад самае першае, у адной клясе й аднае школы вучыліся Віктар і Валік. У пятай далучыўся да іх і тадышні гадунец дзіцячага дому, кагадзешні герой вуліцы — беспрытульнік Юрка Галушка. Усе тры ў вучэньні аднолькава йшлі ў першым радзе. Кажны меў, кажучы тымі камісаравымі словамі, свае «недахопы й дахопы», але нек яны ўзаемна зраўнаважваліся, і выходзіла так, што ўсе тры ішлі роўна, і ўсе тры — наперадзе.

Найменш здольным быў, бясспрэчна, Віктар Лабуніч, але браў ён выседжваньнем, напорнасьцяй, а што да настаўніцкіх ацэнаў — і падлізьніцтвам ды даношчыцтвам, сваім яму ўжо змалку. І ў школе яго за гэта не любілі, дражнілі «сьмердзюхом», бо ў Віктара, апрача ўсяго, страшэнна і ўжо на вялікай воддалі тхнула ад ног, якія вечна ў яго неміласэрна прэлі. Таму

за партай ён заўсёды сядзеў адзін. Заўсёды потныя, непрыемна-сьцюдзёныя й да таго ж нек незгінальныя ў даланёх, як дошчачкі, былі ў Віктара й рукі, і пасьля Юрка бачыў ува ўсім гэтым таямніцу цеснага кантакту сябра з камісарам Макрыцам: «Бо таксама паўмакрыцы й цэлы сьмярдзюх», — казаў ён.

Самому Юрку пры ягоных вялікіх здольнасьцях, пракідкосьці й дасьціпносьці не ставала якраз сталасьці таго выседжаваньня, і таму ён часта, што называецца, пападаўся. І ў школе гэта быў ужо рызыкант, як пасьля ў паветры, — рыса, зрэшты, узгадаваная яшчэ беспрытульніцкай мінуўшчынай. І гэтае рызыканцтва давалася-ткі ў знакі некаторым настаўнікам, уплываючы на Юркаву рэпутацыю ў іх і перашкаджаючы яму выбіцца на сама першае месца. Зрэшты, да гэтага ён і не імкнуўся, як Віктар.

Валік Сьнягурскі меў і здольнасьці ня менш, як у Юркі, і ўседлівасьць ды, наўсуперак яму, быў зусім «ціхім цацам», як казаў той. Але якраз апошняе, даходзячы да скрайнае сарамяжнасьці, нясьмеласьці, не давала як трэба выявіцца Валікавым ведам. Заўсёды ж ведаў ён і паўней, і глыбей за ўсіх, нават за тых двух напэўна, але пры адказах раптоўна чырванеў, бянтэжыўся, часам нават блытаўся, і гэта зьбівала й яму адзнакі. Наагул, усім сваім вонкавым і нутраным складам Валік нагадваў барджджэй дзяўчыну, як хлапца. Ён і сябраваў найбольш зь дзяўчатамі, і тыя проста мелі яго не за хлапца, а як бы за сваю сястру, дзелячыся зь ім усімі, заўсёды так багатымі ў дзяўчатаў, сакрэтамі. За гэта хлапцы дражнілі яго «наша Валя» й «Сьнягурачка», а часам і «Авечка» — агульнай мянушкай для ўсіх дзяўчатаў клясы, склад якіх, сапраўды, падабраўся быў нек наўзьдзіў шэра, не адзначаючыся нічым выдатным зь ніякага боку.

Але ў сёмай клясе прыйшла да іх новенькая, як неўзабаве выявілася, зусім не «Авечка». Праўда, з выгляду й яна выдалася адразу вельмі сьціплай, асабліва сваймі даўгімі косамі — гэтым «паненскім архаізмам», як здавалася ўсім — і хлапцом, і стрыжаным пад хлапцоў дзяўчатам. Ды ўжо першымі тыднямі выявілася, што ў ейнай асобе прыйшоў моцны канкурэнт тром «перадавіком». Яна проста зьдзіўляла і настаўнікаў, і вучняў заўсёднай грунтоўнасьцяй і глыбінёй сваіх ведаў, сталасьцяй і спакоем пры адказах, наагул вытрыманасьцяй і ўзгадаванасьцяй. Пры ўсёй сваёй сьціпласьці яна зусім не была ціхуткаю — умела ўзяць удзел і ўв агульных забавах, і нават у хлапецкіх штуках, і пасьмяяцца, і пажартаваць. І пры ўсім тым ад яе, асабліва ад погляду ейных шэрых вачэй, як бы бруілася нейкая нябачная, незьясьнёная, але спакаральная сіла. Нават хлапцы

толькі першы тыдзень спрабавалі торгаць яе за косы й борзда мусілі адмовіцца ад, хоць і вялікай такой, спакусы. Нек само сабой злажылася, што ўсе пачалі заўсёды і ўва ўсім слухацца Веры Рынейскае, і пад канец году яна ўжо была за старасту клясы, застаўшыся нязьменна на гэтай пачэснай пасадзе аж да канца школы. Гэтак заваяваўшы ўсіхныя сэрцы, яна сталася ўлюбёнкаю і хлапцоў, і дзяўчатаў, а калі ў восьмай клясе пад вясну пачала бушаваць кроў у моладзі і таго і таго роду, у цэнтры гэтага бушаваньня стала зноў Вера.

Дзяўчаты першыя выявілі, што ўсе хлапцы — але ж усе без вынятку — закахаўшыся ў гэтай Верачцы. Насьпявалі ўжо звадкі й канфлікты сярод хлапцоў, пачыналі крывіцца й дзяўчаты, бо ні адзін з абраньнікаў іхнага сэрца ці густу — ані вокам ня вёў ні на адну зь іх. Але Вера зноў умела паставіць сябе так, што ўсё гэта ня выбілася наўзьверх і не прывяло да ніякіх «грамадзкіх забурэньняў» у клясе. З усімі роўная, яна нікога не падпушчала бліжэй, але разам з гэтым кажнаму ўпаасобку як бы давала нейкую надзею й тым самым трымала каля сябе ўсіх чыста. Яна нават ахвяроўвалася часам пасядзець якую гадзінку на «пошаснай» парце із «сьмердзюхом» Віктарам Лабунічам, і той у глыбі свае самазакаханае й самапэўнае душы мо' найбольш з усіх займеў надзею стацца адзіным Верыным абраньнікам. Але такія ж надзеі пацiху таілі і Юрка, і Валік, зь якім Вера, як і рэшта дзяўчатаў, добра тайкавала, а таксама ўсе іншыя хлапцы клясы.

Калі ўжо былі ў дзявятай клясе, нек на пачатку зімы Юрка аднойчы прыйшоў на заняткі наўсуперак свайму звычаю страшэнна панурым і маўклівым. Адмаўчаўшыся гэтак ваўком колькі гадзінаў, пад канец дня ён усё ж ня вытрываў і ў клясе адразу разьнеслася вестка, што Юрка бачыў учора ў кіно Веру зь нейкім маладым прыгожым вайсковым у форме авіяшколы, і Вера была да яго дужа-дужа прыхільнаю, куды больш, як да каго-небудзь із «сваіх» хлапцоў.

Пасьля заняткаў, як разыходзіліся дадому, Веру «выклікалі на тлумачэньні». Яна спакойна, як і заўсёды, сказала, што гэта быў ейны зродны брат, які прыяжджаў да іх на пару дзён у гасьціну.

— Зродны браток ці родны сяброк? — ня вытрываў Юрка, каб ня ўставіць шпількі, хоць тут жа, адчуўшы, што выйшла яна затупой і задурной, нават густа пачырванеў.

— Калі хочаш, дык толькі з такім, як ён, і можна было б сябраваць па-сапраўднаму, — спакойна зноў адказала Вера, прыцiскаючы толькі на апошнім слове.

— І выйсьці замуж? — не ўтаймоўваўся Юрка, чуючы, што зусім ужо ляпае дурніну.

— Але, і выйсьці замуж. Калі апошняя падзея здарыцца неяк у маім жыцьці, дык маім абраньнікам будзе напэўна толькі такі мужны, бясстрашны капітан паветра — даконча капітан паветра, — закончыла Вера, неяк ці то летуценна, ці то насьмешліва, хоць ніхто з усхваляваных зайздроствам ейных рыцараў апошняга адценьня не зразумеў і нават не спасьцярог.

На гэтым усе гаворкі пра «падзею» ў кіно спыніліся й не аднаўляліся, бо, зрэшты, больш «нічога такога» за Верай ніхто ня здолеў спасьцерагчы, як ні пільна сачылі цяпер усе, асабліва на першым часе. Але пакрысе сярод хлапцоў клясы пачала раптам выяўляцца надзвычайная цікавасьць да лётнае справы. Ажывілася праца школьнага авіягуртка, які датуль існаваў бадай толькі на паперы, а калі ўвесну быў абвешчаны авіянабор у школу — дзевяціклясьнікі, усе як адзін, пападавалі туды заявы.

Што Віктар і Юрка пройдуць камісію — у гэтым для нікога не было найменшага дзіва, але што трэцім між іх будзе зноўткі Валік — сталася для ўсіх поўнай неспадзеўкаю. Праўда, у навуцы ён заўсёды ішоў у адной тройцы з тымі, але ж тут не ў навуцы штука, а ў фізычным стане і здароўя, і сілы, і спрыту. Дзе гэта ўсё ў паненскае нашае Валі, кволае Сьнягурачкі? У самым факце, што й Валік падаў заяву, бачылі толькі меру ягонае закаханасьці ў Веры, ня меншую, як у іншых. Хлапцы сьмяяліся й дражніліся, што лепш бы падацца яму ў школу мэдычных сёстраў, бо тут для яго рэч безнадзейная ды зусім неадпаведная. І дзяўчаты таксама шкадавалі беднага ды наперад рыхтаваліся спачуваць і суцяшаць яго пры забясьпечанай няўдачы. Але Валік, хоць нязьменна чырванеў на ўсё гэта, ды станоўка, проста «не па-свойму», як казалі, дамагаўся свайго й дамогся, адшыўшы цэлы рад прэтэндэнтаў, якія фізычна выглядалі куды мацнейшымі за яго й былі зусім пэўныя, што ўжо хто-хто, а Валік тут ім ніякі не канкурэнт.

Неўзабаве й наладзілі праводзіны будучых «капітанаў паветра». Адгулялі іх у Верынай гасподзе, на што ня толькі згадзілася, але нават сама запрапанавала Верына маці — вельмі сымпатычная жанчына, сама настаўніца. Вера была, як заўсёды, роўна вытрыманай і спакойнай, але ўсё ж крышку можна было спасьцерагчы, што ёй ня можа не імпанаваць гэты вычын ейных рыцараў, бо дзяўчына напэўна добра разумела, што гэта тыя колішнія словы, сказаныя ёю зайдросьнікам, так вы-

значальна ўплылі на выбар імі свае жыцьцёвае кар'еры, гэтак прынадна рамантычнай, але разам з тым і такой цяжкой ды небясьпечнай.

Праводжаныя найлепшымі пажаданьнямі й патаёмнай зайздрасьцяй ці аднога зь незадачлівых канкурэнтаў-аднаклясьнікаў, адбылі трох у Маскву, дзе неўзабаве ў чэрвені таго самага году засьпеў іх выбух вайны зь немцамі. Курс авіяшколы быў прысьпешаны як мага, і, добра папрацаваўшы ды, папраўдзе, адмучыўшыся, новасьпечаныя пілёты апынуліся ўжо ля самога фронту, у N-скай эскадрыльлі лёгкіх бамбавікоў, дзе, змушаныя ня так школьным сяброўствам, як тым Верыным бласлаўленьнем і змаганьнем за яе, папрасіліся ўв асобны, свой «зямляцкі» зьвяз, на чало якога выпрабаваныя падхалімскія здольнасьці вынесьлі Віктара Лабуніча.

IV

Юрка бег у сваю скрайнюю, найдалейшую за ўсіх палатку, як бы старт меўся быць ужо, зараз во, і ён ня ўхопіць падрыхтавацца. Гнала яго тая шалёная думка, што раптам выбліснула пад канец гаворкі зь Віктарам.

— Але, дадому — хоць раз добра вырзаў дурны Жарабец, — праказаў ён сам сабе ўжо ля самое свае палаткі і тут жа палахліва азірнуўся, ці не пачуў хто. Блізка не відаць было нікога...

Толькі як гэта зрабіць — трэба абдумаць зараз канкрэтна, грунтоўна, а галоўна — бяз панікі, спакойна. Каб і назад як зьвярнуцца? Не, як скочыш далоў — назад ужо дудкі... Дый навошта? Там жа Вера, дык якраз будзе зь ёй і — адзін... А гэтыя два тут застануцца — яшчэ лепш. Але як сама Вера гэта прыме? Не, хіба ж не «патрыятычна» — чаму ж сама засталася пад акупацыяй, калі Віктар прыйшоў сюды (ня хлусіць жа хіба). І якраз гэтым цяпер можна й заваяваць яе канчальна, што для яе ж скочыў. А вайны гэтае й лётаньня ён мае ўжо аж за самае годзе, хай іншыя даваёўваюць, хто хоча, усё роўна, перамога — віламі па вадзе, дзе... А так — яны будуць разам зь Верай, што б там ні было. І якое ўва ўсім гэтым вар'яцтва, шаленства, як здалося было адразу?

І Юрка супакоіўся канчальна на цьвёрдай, непахіснай пастанове: сяньня ён пакіне і гэтую эскадрыльлю, і Віктара з Валікам, і Макрыцу, і ўсю гэтую «доблесную, непераможную». І назаўсёды. З парашутам — далоў, у «каханы горад», дадому, хоць і няма яго ў беспрытульнага Юркі, але — да Веры... Дык рыхтавацца, бо старт — незвычайны будзе старт...

Ды вось адразу — першая закавыка: як жа зь ім, з гэтым штурманам-радыстым Гадэнкам? Бо, дазволіўшы на ўтварэньне сяброўска-зямляцкага, ледзь не нацыянальна беларускага зьвязу, пабаяліся ж пакінуць яго чыста такім, дадаўшы на ўсякі выпадак штурманамі чужых. Што праўда, сваіх і не было пад рукамі.

Добра, хоць цяпер гэтага Гадэнкі тут, у палатцы, няма...

— Трэба пачысьціць рэвальвэр, — ізноў праказаў уголас Юрка. Ён не любіў свайго штурмана й без таго. Не падабалася яму нават і тое, што прозьвішча ў гэтага палтаўца — гатовая мянушка, перарабляць ня трэба. І здавалася, што штурман добра й апраўдвае гэнае прозьвішча-мянушку. Усюды, гад, мяшаецца, крытыкуе, устаўляе свае тры грошы, а сам — доўбнядоўбняю. Падазравалася нават, што ён сочыць Юрку, ды ці ня зь Віктаравага даручэньня — «сачком» у «сачкома»... Дык гаду хай і будзе гадава... Ні здагадацца, ні зварухнуцца ня ўхопіць — гэткі цяльпук...

Толькі — не: пакуль яго няма, трэба перш з вопраткай які парадак даць — ня будзеш жа там франтаваць у гэтым «сакалівым», сваё цывільнае трэба падніз, каб гэта пасьля — скінуў і пайшоў сабе...

Юрка борзьдзенька распрануўся, дастаў з куфэрка свой адзіны й сьвяточны дагэтуль, людзкі, як называў ён, цывільны гарнітур. Так, цяпер на гэта адразу — камбінэзон... І ані ня знаць толькі, што мо' зараньня яшчэ гэтак выстраіўся... Ды хто там спасьцеражэ, і што ў гэтым незвычайнага? Ага, вось і грошы тут — добра, што не распусьціў. Хоць, зрэшты, не было й на што. Плацяць, што праўда, добра — за добрую й рызыку, толькі цяпер — нават паўлітра ня купіш звыш таго, што «ў прафэсіі для запраўкі» належыць... Ага, і гэтага рэшткі трэба зьнішчыць, «каб і люлька не дасталася ўражаму ляху»... Але пасьля лепш, перад самым адлётам, якраз — для настрою... А грошы — прыдадуцца, пэўна прыдадуцца...

І Юрка ўзяўся чысьціць сваю зброю, якая мелася сяньня выканаць не зусім прыемную ўсё ж рэч, але бяз гэтага ня выйдзе нічога... Не, ужо каго-каго, а Гадэнкі не шкадаваць... Ня йдзе вось — хай адгуляе сваё апошняе на гэтым сьвеце, і — марш...

Няўзнак, сам сабою накруціўся той матыў, які нядаўна гундосіў ім Жарабцоў. Добрая мэлёдыя, хоць ужо й цяпер для Юркі яна павінна быць «іхнаю», але ўсёдна — добрая. Упраўляючыся з рэвальвэрам, Юрка сьціху насьпёўваў сам сабе тое:

Каханы горад сябру ўсьміхнецца,
Знаёмы дом, зялёны сад і той пагляд...

Апошняя думка спыніла яго яшчэ на мамэнт: хіба гэта ён — адзіны з трох — найразумнейшы, што ягоную галаву наведала раптам такая геніяльная ідэя? Што, калі й з гэных двух каторы падобна разважыў і — наважыў? Віктар — дык напэўна не: ён нізашто ня кіне свае, так бліскучае, кар'еры тут, ордэнаў, якія ўжо перад ім маячаць... Быў жа ўжо апынуўся на тым баку, і зь Вераю бачыўся нават — назад усё ж прыгнала. Але — Валік? Бедны Валік, якую сьвіньню падлажыў яму сяньня гэты сьмярдзюх. Аднак, бадай, мае рацыю: Верын дом сяньня будзе ў поўнай бясьпецы, гэтага Сьнягурачка дапільнуе, як свайго вока. А дадумацца да такой ідэі, як у Юркі, ды адважыцца пагатоў — ці ж стане на гэта Авечкі?

І зноў, супакойваючы й абнадзейваючы, выплыла слаўная, задушэўная мэлёдыя на тых самых словах:

Знаёмы дом, зялёны сад
І той пагляд...

## V

Валік ляжаў нерухома на сваім паходным ложку, уталопіўшыся ўв адзін пункт перад сабою распаленымі вачыма. Гэтым пунктам выпадкам сталася маленькая, акуратненькая кругленькая дзірачка ў палатне палаткі, прабітая куляю. Праз яе відаць было чыстае, ужо цёмна-сіняе неба. Дзірачку нядаўна зрабіў Юрка, як быў у Валіка ў палатцы і, п'яному, заманулася яму застрэліць з рэвальвэра муху, што сядзела была на тым месцы. «Куля прабіла маленькае вакенца ў неба», — падумаў, прыгадаўшы гэта, Валік. Але гэтая думка не спыніла на сабе тым часам ягонае ўвагі, сьлізгануўшы й зьнікшы, як і ўсе іншыя, ды варочаючы ўсё назад да таго аднаго — што за подласьць зрабіў яму Віктар, і што наагул будзе сяньня, за гадзіну-другую, зараз во... Гэта мучыла й пякло, і кавалачак неба ня мог ані супакоіць, ані ўціхамірыць сваёй чыстаю сіняй. Можа, замалы быў ён на гэта. І Валік, хоць увесь час глядзеў на яго, не заўсёды й бачыў, апанаваны цяпер сваёй невымоўнай пакутаю.

...А гэтая скаціна, Жарабцоў, іржэ й лезе з агідным сваім лапаньнем. Можа й праўда, такому — і на свой родны горад, як любяць яны казаць, — напляваць, і ўсё роўна, што напляваць — сыпаць у яго бомбы, сеючы пажары, руіны, сьмерць. Можа, у

іх ува ўсіх і праўда няма Бацькаўшчыны, ці бо ёсьць, але толькі «сацыялістычная», і зьнікае тады, як воляю лёсу стаецца «абшарамі», хоць і «часова», але «акупаванымі ворагам». Ды што там — пэўна ж, на Валікавай Бацькаўшчыне ўсім ім няма бацькаўшчыны, ня можа быць дый быць не павінна.

А Віктар, Юрка? Віктар — зусім такі, як усе яны, мо' яшчэ й больш, а ў подласьці — дык пэўна. Юрка ж із школы знаны сваёй «незвычайнай лёгкасьцяй у думках». Будзе сабе бестурботна раскідваць направа й налева, абы куды, Галушка — галушкі... Не, ня сьмешна. Яму, Валіку, аднаму баліць гэта і за сябе, і за іх, і за...

...А песьня гэная — які зьдзек, хоць бы сабе й не Жарабцоў сьпяваў. Што за чортава, пякельная гіронія:

Каханы горад можа спаць спакойна
І роіць сны, і зелянець сярод вясны...

Хай жа паспрабуе заснуць спакойна сяньня, хай паспрабуе сьніць і зелянець, калі прылятуць адудзячыцца яму за ўсё родныя сыны, гадунцы, пестуны...

Каханы горад сябру ўсьміхнецца...
Усьміхнецца — вышчарбамі руінаў, дымам пажараў...
Знаёмы дом, зялёны сад і той пагляд...

А тады ж, як праводзілі іх у школу, у Веры, сьпявалі ўсе гэта за патэфонам, і не спасьцерагалася гэнага нічога, і так хораша, слаўна ўсё было тады...

І навошта, навошта было ляцець у гэтае «лятунства»? Ніколі ж, ніколі не ляжала да яго душа, ні да вайны... Нат малым не любіў гуляць у вайну, у салдаты...

Перш думаў — для яе, Веры. А тады, на праводзінах, як апынуліся нек зь ёй удваіх у садку («зялёны сад»...), — сказала яму як бы з дакорам: «А ты, Валік, ты ж чаго? Ты ж мастак, і гэта ж — не для цябе зусім»... І насьмеліўся (пэўна, пачырванеў, ды цёмна было, не відаць), і пачаў: «А ты ж сама казала калісь»... — «Бедненькі, дурненькі! І ты таксама ўзяў за праўду?» І палажыла яму руку на плячо. — «Ды дармо цяпер, запозна... Ідзі, Валік... Трэба быць і такім, трэба будзе й такіх»... І раптам — пацалавала моцна-моцна ў вусны... Аж цяпер, як успомніць, узгараецца ўсё ад таго адзінага, першага й апошняга — але, хіба й апошняга — пацалунку. А тады — ачмурэў зусім, і як да прытомнасьці зноў дайшоў — яна ўжо зьнікла... Так праводзіла яго. Толькі яго аднаго, ці й тых таксама, кажнага мо'

паасобку? Загадка, заўсёды была й засталася загадкай яна, гэтая Вера...

Валік устаў з ложка, адамкнуў свой куфэрак і дастаў, руплівва загорнуты ў тонкую паперу, аркушок, выдзерты калісь із «сшытка на маляваньне», на якім — яна. Сам маляваў алоўкам на лекцыях, і выйшла — як улітая ўся, нездарма ж быў Валік — першы ў клясе мастак, і мастаком летуцеў стацца, пакуль тыя словы... Рупліва, рыска па рысцы, наносіў на паперу тады, хаваючыся ад іншых — і ад настаўнікаў, і ад сяброў. А яна спасьцерагла нешта й прыслала пісульку: «Я ж — можа не абраз, што ўсё так узіраесься ў мяне»... Бо й праўда — глядзеў, усё глядзеў... Папрасіў прабачэньня, па-дзіцячаму дакляраваў, што «болей ня будзе»... Дый усё, бадай што, было ўжо гатова, і цяпер — глядзіць на яго — жывая!...

...І той пагляд...

Пагляд шэрых вачэй, пільны, праніклы, і разам з тым — жывы, зь іскрачкамі, агеньчыкамі дзесь у глыбі. І пагляд — загадка... Пасярод галавы — прадзел, ад яго імкнуцца цёмна-русыя валасы ў дзьве даўгія касы за плячыма. І вусны — тыя вусны... Раз — толькі раз — апалілі яго, і тое — мо' сьнілася хіба... А як усьміхнецца — агеньчыкі ў вачох выб'юцца, выкрасяцца наўзьверх, і за вуснамі — буйныя, белыя зубы-пэрлы, і на шчоках — дзьве ямінкі, тут... «І той пагляд», і той пагляд... Хай бы сказаў цяпер, навучыў, што рабіць, што рабіць? Не, маўчыць і пагляд, і пагляд — усё тая ж загадка, той жа сьфінкс, Джакондава загадка...

Валік схаваў партрэт свайго рысунку за ўлоньне — мусіць быць сягоньня зь ім — кінуўся ніцма на ложак, на яго... Што рабіць, што рабіць? Хацелася плакаць, наўзрыг, заходзіцца ад плачу... Ды сьлёзаў не было, хоць, здаецца, так нядаўна яшчэ плакаў употай ад іншых... А цяпер — ужо сталасьць, і сьлёзаў няма, і далёка маленства адзадзя... А й сталасьці тэй — таксама няма, каб стала разважыць, няма, як і дзіцячых сьлёзаў... Няма, нічога няма, і ўсё, што будзе, — адно нічога...

Ён перакінуўся зноў наўзнак, і зноў трапіў зрок на кавалачак тае нябёснае сіні — «ваконца ў неба».

Сінь сьцямнела яшчэ, і цёмна рабілася ўжо навакол, а яшчэ цямней — у душы, у думках...

Толькі адзін Віктар рыхтаваўся да «апэрацыі» стала, сыстэматычна й мэтадычна, як прапісана ўсімі статутамі й «слаўнымі» традыцыямі. Ён глынуў — незамала й незашмат, у меру, не п'янюга ж які. Ён пачуваў усё нутраное здавальненьне ад таго, як

«удружыў» Валіку... «Валіку прывітаньне», — сказала яна, як бачыліся апошні раз, на тым баку. Пэўна ж, ён не перадаў і дасюль, бо так даткнула балюча... Але ж, будзеш мець цяпер ад яго прывітаньне... Ды не, не дапусьціцца Валік, каб як хоць блізка што ўпала — Віктар сказаў гэтак Юрку, і цяпер зусім пэўны ў гэтым. І наагул, можа здрэйфіць, баючыся, каб Веры не закрануць, можа падсадзіць сябе сам, а цяпер жа — вайна, раз-два — і выбыў із строю... Застанецца адзін Юрка, а той ужо пэўна — не цяпер, дык у чацьвер за нешта ды зачэпіцца. Вось і сяньня з гэтай хустачкай каля яго — камісар жа бачыў, пры выпадку не забудзецца прыплюсаваць да іншых штукаў. Тады — тады некалі будзе перамога, і ён, Віктар, што значыць «перамо-жац»...

Праўда, адно крыху пякло Віктара часам. За колькі дзён перад вайной яго выклікалі былі тэлеграмай дадому — цяжка зьлегла маці. Там залавіла вайна, і такі нечаканы маланкавасьцяй сваёй гітлераўскі наступ... Уцякаючы з гораду ад бомбаў, апынуўся ўсё ж на нямецкім баку. І там, на сяле, спаткаўся тады зь Верай, таксама ўцякачкай. Першым рухам было — застацца цяпер пры ёй, балазе якраз адзін... А Вера станоўка наважыла заставацца пад немцамі. І прызналася нават раптам, што тады, як прыйшла вучыцца ў іхную школу, яны з маткаю прыехалі ў гэты горад, бо бацьку — расстралялі... Дык хіба ўцякаць ёй далей з тымі забойцамі бацькі? Ды як Віктар сказаў, што й ён застанецца мо' тут, запярэчыла катэгарычна: «Не, табе трэба туды, як барджджэй туды, тут табе няма й ня будзе чаго рабіць». Тады не прызнаўся й ён, як нікому не прызнаваўся (а ёй — ужо хацеў быў), што й ягоны бацька — не «бязь вестак загінуў», як казалася ўсім, а таксама, тэй самай дарогай, што ў яе, толькі куды раней, на самым пачатку...

І тады — пайшоў зараз жа, не турбуючыся больш аб матцы, цяжка хворай ды такім часам... Разышліся зь Верай у розныя бакі — яна вярталася ў горад, і ён таксама вяртаўся — у авіяшколу, у Маскву. Ды сыдуцца некалі зноў, вернуцца зноў адно да аднаго...

І дабраўся-ткі да школы. І добра, што пайшоў, што дабраўся — праўда, тут, толькі тут ягонае месца, толькі адсюль прыйдзе змалку жаданая, чаканая слава...

«Ардэнок — як прышпілены», — успомнілася, як сяньня шапнуў камісар.

Але ад тых усіх успамінаў было ўсё ж і неяк мулка. Бацьку свайго Віктар памятаў мала, дый баяўся ўспамінаць, баяўся, каб ня выплыла нек, каб не даведаліся, каб не... І часам бадай —

ненавідзеў. Ненавідзеў за тое, што празь нешта, што бацька зрабіў ці не зрабіў, ён, Віктар, мусіць цяпер усьцяж калаціцца ад страху быць выкрытым, злоўленым на «схаваньні сацпаходжаньня», ды яшчэ — «ад контррэвалюцыйнага элемэнту»...

Зрэшты, любіў Віктар толькі сябе, і Веру — хіба. Не, не любіў, а хацеў толькі для сябе... Па-дурному быў пэўны: дасца й гэта, як даецца дасюль усё, што хацеў. Гэта дарма што цяпер яна — на тым баку, і што бацька, і што тады казала так...

Перад стартам усмак храпануў гадзінкі зь дзьве.

## VI

«Каханы горад» пераняў сваіх нечаканых гасьцей яшчэ па дарозе.

Калі Валік, злучаны таксама слухальнікам з радыёапаратам, незнарок прыслухаўся да тых хваляў, што лавіў, седзячы адзадзя за ім ягоны памагаты, слаўны хлопец, штурман-радысты Ахмет Шырахметаў, прыслухаўся барджджэй дзеля таго, каб адарвацца ад усё тых жа думак — безвыніковых шуканьняў выйсьця, што рабіць, — якія падмяняліся праваламі ў поўную пусьціню, у нейкае «абсалютнае нічога», — яму пачуліся раптам гукі, якія сваёй знаёмасьцяй і роднасьцяй глыбака кранулі за сэрца. Ён даў Ахмету знак, і той пакінуў сваё падарожжа па хвалях этэру, навёўшы злоўленае на большую чутнасьць. Цяпер гукі пачалі апранацца ўв аддаўна знаёмыя, квола-далікатныя словы, якія толькі знае простая ды шчырая народная нашая песьня:

Мае босенькія ножкі,
Сьцюдзёна стаяць...

Але ж, яна, шырака знаная і на бацькаўшчыне, і далёка за ёй, засмучона-пяшчотная наша «Ў полі вярба». І яшчэ раз рэфрэнам:

Мае босенькія ножкі,
Сьцюдзёна стаяць...

Валік адразу занурыўся, патануў увесь у даўно ўжо ня чутых, а блізка сваіх гуках, і можа, нейкую часіну апарат ішоў сам, сапраўды насьлепа, занядбаны рукою й воляй пілёта. Усё. Як шкада! Але вось — за няўхопным зь непрывычкі голасам чужога дыктара ў мала зразумелай мове — гаворыць... родны горад, каханы горад! І на тэй самай хвалі, як калісьці гаварыў! Сьпявае, гаворыць у тэй самай мове, якую, казалі там, у іх, за-

баранілі тут зусім, перасьледуюць... Казалі — пэўна ж хлусілі, як і хлусяць усё, а хаценьні такія, хаценьні забараніць і сьцерці зусім — самі мелі заўсёды, ды ці мала ўжо чаго пасьціралі...

Мае босенькія ножкі,
Сьцюдзёна стаяць... —

адбілося водгульлем, паўтарылася яшчэ раз дзесь глыбака там, у душы. Так, значыцца, блізка ўжо дзесь сам ён, каханы горад. Зараз, зараз ужо

...сябру ўсьміхнецца
Знаёмы дом, зялёны сад...

І, можа, там, на Слабодцы, у тым «зялёным садзе», дзе й апошняе тое было, стаіць, залетуцеўшыся, без спадзяваньня нават якіх-колечы там трывогаў — Яна, і стыгнуць ейныя босенькія ножкі ў прахаладзі вясьнянага вечару... Успомнілася — бачыў раз нек, — босая, несла вядро вады і, згледзеўшы яго здалёку, махала другой, вольнай рукой... Вера. І верыў заўсёды ў яе, а дзе вера цяпер? Вера — «Вярба»...

...Дзіва — тады здавалася ім, бадай усім, гэтая «Вярба» такой абрыджонай ужо, зацяганай, зьбітай песьняй, што як завядзе хто незнарок — і падцягваць, і слухаць нават ніхто не хацеў. Інакшым зусім выглядаў гэты «Таварыш» — «далёка ў сьвет таварыш адлятае»... А як апынуўся «далёка ў сьвеце», за сьветам, як пачуў ізноў пра вярбу й ваду — і адчулася зразу ўсё прадоньне між гэтай і гэным. Тут — простасьць і шчырасьць, якую няпраўда, не зацягаць і ня зьбіць нікому й ніколі, бо прасякнуты ёю гукі, словы наскрозь. Там — пад вонкавай задушэўнасьцяй — адна фальш, хлусьня, гіронія, зьдзек — асабліва цяпер, калі за мамэнт-другі разбудзяць сьмерцяносныя гукі каханы горад, не дадуць яму «спаць спакойна і роіць сны», хіба што — ці аднаго вечным сном супакояць...

— Падрыхтавацца... — пакрыў усё, і думкі, бразгатлівы Віктараў голас у слухальніках, аж здрыганула ад яго. Валік глянуў уніз — там, далавах, добра бачны ў віднай, зорнай, хоць і бязьмесячнай маладой начы, памалу падплываў родны горад, ніколі ня бачаны з такое высакосьці, а ўсёдна знаёмы, да болю знаёмы. Вунь, на ўзвышшы, гатыцкія вежы былога касьцёлу, што заўсёды здалёку відаць, адкуль ні падыходзь, ні пад'яжджай. Валік зьнізіў яшчэ вышыню й лёгка знаходзіў прыдзеленую яму часьціну. Толькі тут пачыналася ўжо й незнаёмае, ня-

знанае перш, калісь — выразна тырчэлі ўгару голыя коміны й руіны ўжо на прадмесьці. Як бы выскаляліся, вытыкалі дакорам, дакорам і яму, што зараз павінен памножыць іхны сьцяг магільных касьцякоў-шкілетаў.

З правага боку дзесь бліснула, і зьнізу данёсься выбух. Гэта пэўна сусед — Віктар пачаў. І збоку зыркае сьвятло — вісіць у небе сьвечка-ракета, разьлівым сваім відном сягаючы аж дасюль. Валік даў знак, і за часінку асьвятліла таксама пад ім усё павешаная Ахметам іхная сьвечка. Ён зьнізіў апарат яшчэ, пайшоў укруга, і... Божа мой! Пад сьвечкай мокрадзяй вячорнае расы блішчэла так знаёмая іржавая бляха як пераламанае пасярэдзіне хрыбніцы даху... Ягоны дом, ён, толькі ён! Усьцешаны — а чаго? — закрычэў Валік у слухальнік Ахмету: «Пад сьвечкай... увагнуты дах... я жыў, і бацькі там жывуць пэўна й цяпер...» Так, і бацька здаволены можа цяпер — бацька, які ў іхным цесным сямейным коле, як ня мог ніхто пачуць, ці раз выказваў сваё пажаданьне, «каб прыйшоў ужо на іх хоць які «хай-гітлер». А як жа не хацелі старыя, каб ён у гэтыя «сакалы» ляцеў, як адгаворвалі, плакала маці, і не разумелі ніяк, што сталася зь ім, чаму раптам такое... Не сказаў жа ім, ня мог сказаць праўды, не паслухаў, ня здаўся на адгаворы, і вось цяпер...

Выбух пачуўся, як нейкі трэск, але нешта ня зьнізу, а дзесь як бы збоку й вышэй... Яшчэ — перш зьнізу, а тады — як над галавою. Што? Артылерыя? А казалі ж — «абароны няма, пэўныя весткі»... І тут — як заўсёды — «казалі»... Дык што — трэба вышэй, ці ніжэй? І што далей?

Усё гарэла яшчэ над бацькавым дахам сьвечка. І Валік скіраваўся імкліва прост на яе.

— Начальнік, што задумаў? Лепш як далей адсюль... — пачуў ён зараз жа ў слухальніках устрывожаны голас Ахмета. Што здалося яму? Не, ніколі, хіба вырадак які Валік... І нек супакойваючы, успомніўся часта чуты й ці раз бясьсьведама ўжываны самым, асабліва малым, такі «нацыянальны» праклён — «каб адсохла рука»... Але ж, адсохла б... Ды трэба ж, трэба нешта рабіць! Сьвечка ўжо згасла, а ён яшчэ не пачаў «работы». Зьнізу стралялі цяпер там і сям, праўда, яшчэ слабавата. «Аб'ектаў» у ягоным раёне таксама няма, Віктар усе бадай сабе забраў — пэўна ж, дзеля славы. Дык можна спусьціць дзе пападзя? Толькі трэба знайсьці перш той «знаёмы дом», каб ня трапіць хаця...

Ён узяў курс туды, дзе, здавалася яму, павінна была быць Слабодка. Загарэлася новая сьвечка... Кіруючыся, мабыць, ужо

на яе, дужэць пачала й страляніна зьнізу. Рабілася крыху цёпла, як казалі ў іх. Летучы як мага павальней, пільна ўзорыўшыся ўніз, шукаў Валік знаёмай, ах, як знаёмай калісь вуліцы й дому. Толькі тут усё было зусім, зусім незнаёмым. То коміны, то нешта такое, чаго ніколі зусім не было. Хіба — зблудзіў? Недзе зусім блізка глуха покнула «шклянка» — эге! А Слабодкі й дому — як не было.

— Начальнік!

— Чакай, Ахмет, чакай, зараз...

Хіба пакідаць куды ў руіны, каб нікому шкоды не было — будзе ж гук, «дэманстрацыя» будзе, каменьня, друзу крыху разьнясе на бакі... Не, і ў руінах жа могуць жыць, ці адмыслова цяпер хавацца людзі... — Згасла й гэтая сьвечка...

— Начальнік! Паслухай, Ахмет скажа...

— Зараз, Ахметка, — сьвечку!

Божа! Ізноў над самым домам бацькоўскім павісла, ізноў зьвярнуўся, значыць, туды — ізноў, як знарок...

І ён рынуўся прочкі адтуль, наганяючы ўжо хутчыню. Страляніна часьцела, дужэла, збоку далятаді выбухі й зь зямлі, далей на поўнач, відаць было, заняліся пажары...

Валік кідаўся па сваім «раёне» туды й сюды, паліў «сьвечкі», усё шукаў і знаходзіў — каторы раз — толькі бацькаў дом і ня мог у адчаі адважыцца на што-небудзь. Толькі Ахмет не чакаў. Хай начальнік паслухае: ён, Ахмет, ня выдасьць ніколі. Адляцецца куды за лясок і ў балота «згрузіць» усё. Хто там пазнае — праверыць? А што — біць бязьвінных людзей, навошта, каму гэта трэба? Ахмет жа — магіла, каб толькі начальнік паслухаў Ахмета...

Валік вагаўся... Ахметаў разьвязак — геніяльны ў сваёй прасьціні, як не прыйшло гэта ўдум яму самому — сама прасьціня Ахметавымі вуснамі прамаўляе, але...

— Канчай! — забражджэў нарэшце ў апараце Віктар. Так, слаўны Ахмет, няхай будзе так! Той лясок, напэўна, — Папоў лес. Валік памкнуў на яго, бадай «голячы». Вось прагаліна — паляна, балотца? Дык — сюды! Раз, і раз за разам — усё. Бліснула, яшчэ, і страшэнны пякельны выбух — гук, і яшчэ, і яшчэ, і, здаецца, аж машыну шыбнула ўгару, ці, можа, палягчэўшы, узмыла сама вольнай птушкай. Так, будзь, што будзе! «Канчалі», Ахметка, «канчалі»!

І аж радасна палягчэла ў самога ўсё, палягчэла й прасьвятлела. Праўда, чаму было так не здаўмецца адразу?

Толькі, як адляцеўшыся ўжо, азірнуўся назад — сэрца зайшлося. Чырвона-чорная заслона вісела над горадам, каханым горадам... Што ж, толькі і ўцехі — ня ён... Бывай, родны горад, каханы, бывай, да лепшага мо' спатканьня, твой верны сын ня ўзьняў сяньня на цябе рукі. Ня ўзьняў і ня ўзьніме ніколі — «каб адсохла»...

...Каханы горад сіняй смугай тае...

Не, ня сіняй смугай — крывава-чырвоным водбліскам пажараў, чорнай жудой адплывае адзадзя родны горад...

VII

Здавалася, усё так грунтоўна наперад абдумаў Юрка яшчэ ўдома, а вось тут, на мясцовасьці, нек ня йшло адразу. Не, зьліквідаваць перш-наперш Гадэнку, як было надумана, — і зручнасьць пакуль не падкручваецца, і мо', наагул, нядобра. Лепш стварыць хоць уражаньне, што пачаў быў «работу», а пасьля — нешта выйшла, і загінулі ўсе з машынай разам. Гэтак і на тым баку будуць спакойныя. Пэўна ж, спакойныя, бо Віктар жа ня будзе клапаціцца па Юрку, а барждэй сьвечку паставіць, хоць сабе ў думках. Яшчэ й прыемней нават — справяць памінкі як па ахвяры; а не — і героі, разьдзьмухаюць кадзіла, нахваляць, нашкадуюць хоць публічна, дзеля прыліку, а ты тут сабе — цалюсенькі і — каля Веры... Каб пасьля й даведаліся (але дзе там!), дык — такое бяды: вымушана, з парашутам — дый, наагул, больш жа зь імі — «дзяцей не хрысьціць».

Ага, вунь там — якраз пад нагамі — могілкі, той «адзіны ваенны аб'ект», як жартаваў сяньня Юрка. Вось тут і пахрысьцім, хоць сабе нябожчыкаў, пэўна ж, ёсьць сярод іх і няхрышчаныя...

Сьвечка, спушчаная Гадэнкам на Юркаў загад, якраз добра асьвятліла царкву сярод гайка. Да ўстановаў гэтага роду Юркава ўзгадаваньне прышчапіла яму звычайныя для гадунца савецкае школы і нялюбасьць, і кплівасьць. Дык вось жа ён яе зараз! Пэўна, цяпер паднавілі, падчысьцілі, папы разгарнулі сваю работу па-сапраўднаму, ня так, як на гэтым баку, на паказ — дый тое ж як не падабалася і Юрку, і іншым. Праўда, там, на другім баку, давядзецца мо' й прывыкаць цярпець, але гэта — хай будзе апошняя даніна ягонай «старой веры» бязьвер'я й бязбожжа. Раз, і — блісь, гух! Яшчэ разок дзерганучь — так яе! Цяпер — паверсе «пасаліць» запальнымі — дзервяная ж, стане, як сьвечка! Вось «работа» й пачалася як слаўна!

Пасьля трэску й гулу ўнізе сьвечка згасла, і Юрка з апошняга кругу хацеў ужо «прагуляцца» па ўсім раёне, як у выбухлым раптам зыркім полымі, мусіць, ад «солі» ягоных запальных бомбаў — згледзеў крыж царквы зусім збоку, ані не закранутым. Значыцца, улялёшыў гэтулькі матар'ялу і ў зусім іншае нешта...

Юрка ўскіпеў. Ён заўсёды разьюшваўся адразу ад найменшае няўдачы, а тут жа — дагэтуль быў лепшым цалком у эскадрыльлі і — раптам табе! Дый наважанае, а пачатае пагатоў, Юрка звык даводзіць да канца. І ён павярнуўся назад, на той «пракудны крыжык». Першыя стрэлы супрацьпаветранай абароны, спаткаўшы яго тут, ня выдаліся яму ніякім дзівам. Юрка й забыўся зусім, што, «паводле пэўных вестак», ніякай абароны тут не павінна было быць. Ён толькі адзначыў сабе, што крышку «пралыпалі», «праспалі», відаць, не чакаючы сяньня гасьцей, — толькі цяперака бяруцца... Дык жа — пільнасьць, і акуратней, каб ізноў ня схібіць!

Бязь сьвечкі, бо пажар разгарэўся шырака — гнаў яго, мусіць, вецер, і цяпер усё было дужа добра відаць, як ясным днём — Юрка асьцярожна й спакойна выцаляваў у царкву яшчэ парачку выбуховых і запальных. Ну, цяпер напэўна ўзяло! Ды, як улягглося ўсё зноў, падлятаючы, каб пераканацца яшчэ, Юрка пабачыў усё тое ж: у магутнейшым яшчэ водбліску полымя — крыж на царкве аж зіхацеў і мяняўся!

Зрабілася нек аж крышку нядобра. Няўжо запраўды — «нешта ёсьць» і ахоўвае сваю сьвятыню, ці дае нейкі знак, перасьцярогу... Дурніна! Зараз дасца!

Юрка зьнізіў, як толькі льга было, вышыню і хуткасьць ды стараўся прымерыцца як спакайней яшчэ раз...

— Дарма займаесься, таварыш начальнік, гэтым крыжыкам, — пачуўся раптам у слухальніках нейкі ці то падлізьніцкі, ці то кпліва-насьмешлівы голас штурмана Гадэнкі, цяпер удвая прыкры й праціўны. Юрку аж здрыганула. «Чакай, будзе зараз і табе крыжык», — падумаў толькі ён і ўголас рэзка кінуў у мікрафон: «Ня вучаць! Яйцы курыцу...». Тут жа, праўда, мільганула, што й «курыца» ад «яец» ня вельмі адышлася, — Юрку звычайна адразу ж накручваліся думкі, як ён называў, «супраць сябе» — і, можа, гадзіч мае рацыю. Але ж трэба канчаць і з гэтым, і зь ім. Толькі яшчэ — апошнюю «порцыю»...

Юрка скінуў яе, не разглядаючыся больш і не чакаючы на выніку, ды ўзяў кірунак адтуль. Скончыць з Гадэнкам, асабліва пасьля ягонае рэплікі, здавалася яму цяпер асабліва безадкладнай патрэбаю. Дый наагул, досыць гуляць, пара рабіць справу...

Ён пачаў спушчаць рэштку бомбаў абы-як, «на маны», пільна сочачы ў люстэрка перад сабою захоўваньне свайго штурмана. А той — якраз добра! — прыгнуўшыся, сам сачыў кірунак бомбаў і выбухі. Юркава рука ўжо моцна сьціскала ў кішэні сьцюдзёную сталь рэвальвэру. Круткі паварот назад — і проста ў цемя, раз за разам... Раскірэчыўся ніцма, як бы адбіваючы земны паклон. Гатоў — гэта ня бомбай у крыжык...

Зьнізу, пад самым самалётам, які ўсё яшчэ йшоў вельмі нізка, кэрхнулі залпам гарматы. «Разьвітальны салют па бясцэнным таварышу Гадэнку. Паў, не — раскірэчыўся геройскай сьмерцяй. Дадзём і мы ад сябе», удаючы ўрачысты тон савецкіх мітынговых прамоўцаў, праказаў Юрка ўголас, хоць за гудам матору сам сябе й не расчуў, ды скінуў рэштку бомбаў, што яшчэ засталіся. Але раптам зрабілася зноў крыху нядобра, так, як там, над царквою... Як бы з гэтым Гадэнкам адарвалася ўсярэдзіне нешта, ды адарвалася ня так, каб аблегчыць, як гэтыя во бомбы, летучы далоў, а каб наадварот — прыцiснуць, прыгнесьці да зямлі. Гадэнка — гад, а ўсё ж — чалавек. «У постаці чалавека». Гэта — «постаць чалавека», гэтая — раскірэчана-распластаная? Усё ж — Юрка сяньня забіў чалавека. Ды ці аднаго ўжо забіў за сваю лятунскую службу, хоць бы сабе мо' й сягоньня? Але каб так проста — з рукі — у галаву...

Юрка глядзеў на сваю ахвяру, і было нек і цяжка, і гадка, і вусьцішна, і мо' крыху нават — шкада... Самалёт хістанула на бок, і Юрка кінуўся да стырна. Але ж, за гэтай дурной псыхалёгіяй гатоў і кіраваньне згубіць, і галавой налажыць сам. Ды яму лёгка ўдалося выправіць машыну, і ён пачаў зноў набіраць вышыню. Азірнуўся яшчэ раз на Гадэнку. Скінуць хіба далоў? Не, хай ляціць з самалётам — сваёй дамавінай. Скідацца пара самому. Парашут — у парадку. Курс самалёту — насьлепа, вышэй і — на захад, як далей ад «дому».

Юрка зарыентаваўся ў мясцовасьці. Ад свайго «раёну» ён адляцеўся ладна. На паўдня. Якраз добра — скочыць тут дзе ў лясок, і — бліжэй да Веры, барджджэй дойдзецца...

Паветра рванула ўв адчынены люк. Перераймай, зямля, бывай, паветра! Юрка Галушка апошняй сяньня «галушкай» вытрасаецца на зямлю.

Жывая яшчэ сэрцам матору машына зь нежывым пасажырам паляцела далей няведамаю дарогай да няведамага канца.

VIII

Прызямліўся, як казалі ў іх, «на зэкс» — акурат пры дарозе, у мокрай ад ночнае расы прыдорожнай траве. Паабапал цёмнымі сьценкамі бег, прысядаючы, негусты, здаецца, лясок. Дзе ж бы гэта? Усёдна, пакуль не разьвідняе — не зарыентуесься. Пераседзець тым часам у ляску зь беражку.

Вызваліўшыся ад парашуту, Юрка адчуў як бы вызваленьне ад усяго, што засталося там. Мільганулі яшчэ ў памяці Віктар, Валік, Макрыца, раскірэчаны сьмерцяй зь ягонай рукі Гадэнка, ды цяпер ужо не кранала нічога, — хай прамільгаюць і застаюцца там, не вяртаючыся ніколі нават і ў думках. Думкі цяпер — наперад, да Веры, да блізкой сустрэчы. Як гэта будзе? Сказаць ёй адразу?

Ды і ў гэтым кірунку думкі штось ня йшлі, не хацелася й падганяць іх штучна, адчулася ў іх раптам нейкая ўтома, млявасьць. Дык няхай — будзе яшчэ час, а цяпер — адпачыць і ад думак, і ад усяго. Даволі было сягоньня «работы»...

Прабіраючыся ўскрайкам лесу, спаткнуўся на пяньчук. Тут і прысесьці, побач, да дрэва можна й прыхінуцца. Добра! Можна было б і прымгнуць, задрамаць хоць крыху, ня шкодзіла б дзеля адпачынку, дзеля сьвежасьці...

Але сон, як і думкі, ня йшоў. Няхай і так! Усё ж было добра, і гэтае «добра» абапіралася, можа, на адным адчуваньні: на зямлі, на «гэтым» баку, недалёка ад мэты. Так з гэтым ці на гэтым і праседзелася нейкі час, заўсёды ў такіх разох бязь меры — нядоўга й некаротка, як у тых казках. Толькі крыха-па-крысе пачынаў прабіраць начавы халадок. Гэтыя ночы, хоць ужо й перад саменькім летам, бываюць-ткі залкаватыя. І гэта ж у лесе, а што, каб на полі? Падацца хіба крышку яшчэ больш у лес, павінна быць зацішней.

Юрка ўстаў з свайго пеньчука і пачаў прабірацца далей у лес, пасьвечваючы сабе прадбачліва ўзятым з сабой кішэнным ліхтарыкам. Пад нагамі пачынала крыху мякчэць і макрэць — каб ня ўбіцца ў якое балота? Ён зьмяніў кірунак, узяўшы крыху ўбок наўскаса, як здавалася, на сушэйшае. І раптам, узьняўшы нек галаву і глянуўшы перад сабою, прыстояў. Наперадзе, праўда, далекавата яшчэ адсюль, па вершалінах дрэваў гулялі нейкія слабыя водбліскі. Хіба ад ягонага ліхтарыка? Згасіў, не — тое самае. Мусіць, вогнішча недзе. Дык лепш ня рыпацца далей — мала на што й на каго можна яшчэ напароцца. Сьвежы ж яшчэ тут зусім чалавек, хто іх ведае, што тут у іх і як, якія парадкі...

Аднак усё ж брала цікавасьць. Юрка стаяў, напружана ўслухваючыся і ўглядаючыся перад сабою. Пакрысе расчулася — не, хіба ж не здавалася — трэск полымя і — ці не галасы?.. Эге, дык назад...

Ды цікавасьць брала ўсё ж сваё — падцікацца бліжэй, падгледзець хоць. «Можна, толькі асьцярожна», — часам любіў гаварыць сабе Юрка. І кіруючыся гэтым правілам, ён памалу пачаў прадзірацца далей, на тое трымценьне водбліскаў. Неўзабаве не было ўжо няпэўнасьці — вогнішча й галасы, здаецца, дзіцячыя. Дзеці ўначы ў лесе? Начлег? Але ж, здаецца, скрозь лес. Вось раптам адтуль проста на Юрку затупаў нехта, неяк медзьведзявата. Юрка застыг, прытуліўшыся да дрэва. Тупат спыніўся недалёка ад яго, і пачуўся трэск — нехта ламаў, мусіць, сухастоінку на цяпло. Ламаў доўга, відаць, што нейкі малы. Юрка мусіў чакаць, не варушачыся. Вось павалок па зямлі, барануючы галінамі. Юрка памалу пачаў пасоўвацца сьледам тых гукаў. Далей трэ было ўжо падыходзіць, хаваючыся за дрэвамі. І нарэшце ткі вачом адкрылася, як і меркаваў: невялічкая, мусіць, балацяная, палянка сярод лесу, вогнішча ды пры ім — чатыры хлапчукі. Адзін, зусім малы, — мусіць, той, што ламаў і валок сухастоіну, падкладае ў цяпло. Другі стаіць так, і двух яшчэ, расьцягнуўшыся на зямлі, узлокціўшыся, тварамі да цяпла. Падысьці хіба няма асаблівае небясьпекі, і цікава, дый зарыентавацца, пэўна, памогуць. Толькі — скінуць хіба гэты камбінэзон, здраджвае ж адразу? Але «кавалерчыкам» ці ня будзе больш падазрона? Дый прадрыжысься да раньня ад холаду, хіба што каля вогнішча... Ды што там — малых баяцца? Барджджэй якраз іх напалохаць можна.

І Юрка, не хаваючыся больш, запраставаў да вогнішча. Тыя пачулі ўжо, начыпурыліся, павярнулі галовы ў ягоным кірунку, углядаючыся ў цемру, але больш ніяк не зьмянілі паставаў — нат два, што ляжалі, ня ўсталі зь зямлі. Сполаху, значыцца, ня выйшла.

— Здаровы, мужчыны! — вясёла прывітаўся Юрка, падышоўшы.

— Здрастуйця, — адказаў за ўсіх малы, і ўсе прыглядаліся далей, больш зь цікавасьцяй, чымся із спалохам, або можа ўмелі ўжо схаваць яго.

— Начлег? — спытаўся Юрка.

Усе маўчалі. Толькі пачакаўшы, адзін з тых, што ляжалі, працягнуў ціха, нек няўпэўнена:

— Начлег...

— А самі адкуль будзеце? — бітка пачаў допыт ізноў малы, адразу паставіўшы Юрку да шуканьня належнага адказу.

— Што ты, Мечык, бязвокі? — кінуў яму ціха той, што стаяў.

— Да хлопцаў? — не ўтаймоўваўся малы.

— Да якіх хлопцаў?

— Ды да Юзік... — ён зацяўся і дадаў цішэй, з асьцярогаю: — да парцізантаў.

«Вось табе й штука — недзе й гэтыя тут... Дрэнь, і не падумалася зусім. Так блізка ад гораду?» — занепакоіўся Юрка. Ды нельга было цягнуць з адказам.

— Не, ня знаю ніякіх такіх.

— А-а? — недаверліва працягнуў малы. — А чаму ж па-рашуцісты? — вымавіў ён, расьцягваючы толькі першыя склады, не такое ўжо, відаць, нязвыклая слова.

— А ты што... бачыў такіх?

— Іга, колькі хочаце, — борзьдзенька адказаў, ня даўшы й разявіцца малому, другі зь зямлі, што маўчаў дагэтуль, — як пачне сыпаць — як гарохам...

— Сам ты гарохам сыплеш, — стала абарваў яго малы, трапна характаразуючы пры гэтым спосаб гаворкі сябрука.

— Ты ўжо вельмі, Мечык...

— Ого, дык вы, бачу, пісьменныя ўсе! — вясёла праказаў Юрка, пастанавіўшы падсесьці да хлапчукоў, да цяпла. Побач зь ім зараз жа ўсадавіўся й той пракідкі малы.

— Але ты, Мечык, — зьвярнуўся да яго Юрка, — хоць і ўсякіх бачыў, а такіх як я, — пэўна, што не...

— Во... а чаму вы ведаеце, што я — Мечык? — ускінуўся той адразу.

— Цябе ж, браце, па ўсім сьвеце ведаюць, — адказаў за Юрку той, што ўсё яшчэ стаяў, і цяпер, поркаючы палкаю, папраўляў цяпло. Ды тут жа й растлумачыў: — Дзядзя ж чуў, як мы на цябе казалі.

— А-а, — крыху расчаравана працягнуў Мечык, але зараз жа падсунуўся бліжэй да Юркі і нават, лопнуўшы яго ўжо панібрацка па калене ды хітра-таямніча падміргнуўшы, паўшэптам пралапатаў: — А мы ведаем, дзе цяпер хлопцы...

— Не патрэбныя мне зусім вашыя хлопцы, Мечык, — адказаў Юрка.

— І нам яны не патрэбныя, — зусім як стары, ажно нейкім басам праказаў Мечык. — Ні яны, ні... хто...

Гаворка спынілася. Хлапчукі, відаць, думалі сабе нешта, гледзячы на вагонь, нешта такое, што ня раз ім думалася й думаецца, ды ня выдумаецца нічога.

— Эх, каб закурыць! — ізноў парушыў маўчанку Мечык.

— Ты курыш? — зьдзівіўся Юрка, зрэшты, прыгадаўшы, што й сам пачаў курыць мала большым.

— Яшчэ й як смаліць, — адказаў за Мечыка той, што «як гарохам сыпаў», — бацька ўжо дзяжыў-дзяжыў, дый рукой махнуў: няхай курыць, усёдна вайна...

Юрка дастаў з кішэні папяросы й працягнуў Мечыку.

— Закуры, Мечык!

Той узяў важна, як выраслы, і тут жа, пры сьвятле вогнішча, прачытаў: «Дукат».

— А вы, хлопцы, таксама курыце?

Узялі яшчэ двух, толькі той, што ўсё поркаўся ў вогнішчы, адмовіўся: «Яшчэ ня вучаны»...

— Эх, салодкая папяросіна! — пахваліў Мечык, сплёўваючы аднак.

— Чаго ж плюеш, калі соладка? — зацеміў на гэта «нявучаны», — ку-урэц!

«Перакурка» памалу зблізіла Юрку з хлапчукамі. Мо' яшчэ й таму, што недалёка й сам ён пачуваў сябе ад такіх ды ўмеў гаварыць зь імі. Дык неўзабаве даведаўся ўсё: і што малыя жывуць тут, у лесе, як і бацькі іхныя там, далей, у зямлянках, і што на сяле не даюць жыць цяпер «Юзікавы хлопцы» — партызаны, і што такая цяпер вайна — ці выжыве чалавек... Пахваліліся хлопцы, што чулі, як сяньня «савет даваў на горад — усё гух ды гух», цьвердзілі, што было нават чуваць, як Юрка спушчаўся з парашутам: «Высака ішоў самалёт, а пасьля так — ш-ш-ш...» Але нек далі Юрку веры, ці, прынамсі, удалі, што вераць, быццам ён нічога супольнага ні зь «Юзікавымі», ні з «саветам» ня мае, і нават Мечык больш не даходзіў нічога. Высьветлілася з гаворкі й дарога на горад — была яна знаёмая і зусім недалёка — якраз, як меркаваў сам, пакідаючы самалёт.

Пакрупова гаворка вычарпалася. Скурылі яшчэ па папяросіне. Малых браў сон, і нават Мечык скруціўся ў клубок плячыма да вогнішча, а галавою — ледзь ня ў самы жар, ды сьцішыўся. Юрка глядзеў на малых, апанаваны раптам успамінамі свайго собскага беспрытульнага маленства... «Пуга, торбачка, гразь па калены, адпачынак на балоце, ля вагня...» — успомніліся нейкія ці то чытаныя, ці то нават вучаныя на памяць некалі радкі.

Разьбіраў і яго сон, але погляд, кінуты на вершаліны дрэваў, казаў, што пачынае ўжо залачэць. Юрка ціхенька, каб не пабудзіць малых, устаў. Тыя спалі моцна-салодка й не паварушыліся, хоць, здаецца, адно Мечыкава вока адплюшчылася, прапушчаючы яго. Юрка агледзеў яшчэ раз гэты маленькі камячок, у зімовай аблавухай шапцы, даўгім, да пятаў, пад пахамі разлупленым кажушку, у страшэнна вялікіх, бацькавых, мусіць, валёнках — імі й тупаў тады, як мядзьведзь, па лесе...

Крыху адышоўшыся, Юрка скінуў свой камбінэзон і схаваў яго тут жа пад кустом, стаўшыся зусім «цывільным кавалерчыкам», як прызнаў ён, агледзеўшы сябе. Азірнуўся апошні раз на вогнішча. Яно ўжо бадай даходзіла. «Пуга, торбачка, гразь па калены»... — выплыла зноў... Пуга — а пасьвіць няма чаго, усё спасьвілі і Юзікавы, і Адолевы-нядолевы... Хіба што на пасту выганяй тую сваю нядолю... А з торбачкай, з торбай — пойдуць мо' заўтра... Ды што там — заўтра. Сяньня, цяпер... Дый Юрку — таксама цяпер — годзе, пара і ў дарогу, ня час на разважаньні... Бывай, Мечык, бывайце, лясныя хлапчаняты...

Безь цяпла ад вогнішча й без камбінэзону Юрку праймала золь досьвіткаў. Ён засягаў шпарчэй у іхнай сівой імгле.

## IX

Пачыналіся ўжо добра знаёмыя мясьціны. Вось Папоў лес, хадзіў сюды ці раз у грыбы, у ягады, проста так, пасьлей — на маёўкі. Блізка ўжо, блізка зусім ён, каханы горад, зараз во «сябру ўсьміхнецца знаёмы дом»... Што ні ступні, то віднела ўсё больш, і здавалася — ня толькі ў лесе, а і ў душы, і ўжо шчабяталі й пераліваліся й там ранішнія галасы абуджэньня, што даўно ўзьняў навакол шумлівы птушыны народ. Слаўна, лёгка было й бяз думак, не хацелася думаць нават аб тым, куды йшоў, што й як будзе. Так жа й лепш — неспадзеўкі і самому, і там...

Перад самым канцом лесу Юрка мусіў прыстояць. Зьлева, паўз дарогу зусім, за невялічкай палянкай, на ладным кавалку — як бы прайшлася вялікая навальніца. Выкарчаваныя, пашчапаныя дрэвы, некаторыя абсмаленыя, вывернутыя кучы чорнае балотнае зямлі над ямінамі-лейкамі, адна пры аднэй, з гэтага ўскраю — курыць яшчэ нешта на зямлі. Вось яно — ці не ўчарайшае пачынаецца ўжо гэта? Чакай, гэта ж якраз пры Валікавым раёне. Хіба, не пазнаўшы, куды, гаціў і гаціў у лес і ў балота? А мо' ад страху, каб ня ўрэзаць у «знаёмы дом»? Але ж, відаць, меў рацыю Віктар у сваіх меркаваньнях, і Веру ўчора нічога не патурбавала.

Юрка рушыў далей, але раптам агарнуў яго нейкі непакой, незьясьнёны, незразумелы — і адкуль, і чаго. Не, гэта не перад блізкай сустрэчай — нешта як бы зноў абарвалася ўсярэдзіне, як учора, калі Гадэнку... Бр-р, аж здрыганула. Не, ня трэба нічога таго, наперад, думкі, і хада — наперад!

Але непакой не зьнікаў, а ўзрастаў усё больш, чым больш набліжаўся горад. У ранейшым сваім жыцьці, беспрытульным, але й бестурботным тады і пасьля, што й выпрацавала-такі характар, Юрка ніколі ня знаў ніякіх, як гэта завуць, прадчуваньняў. І цяпер яму і ўдум не прыйшло расцаніць так гэты свой раптоўны, незьясьнёны такі непакой. Ды, як пачаўся самы горад, аблягала як быццам і гэта памалу.

Каханы горад! Вось ён, ён яшчэ «сьпіць спакойна», не прачынаўся яшчэ. Хіба з учарайшага, перанэрваваўшыся, змогшыся ад перажываньняў, адпачывае даўжэй, як звычайна. Праўда, сьлядоў іхнае ўчарайшае «дэманстрацыі» яшчэ не відаць. Мусіць-ткі Валік і праўда пашкадаваў ды вытрас усё на бедны той Папоў лес. І добра зрабіў!

Зараз за паваротам — Слабодка і Верына вуліца. І зноў ажыў той, нядаўна аблеглы, непакой, ужо — напэўна, ад таго, што вось-вось...

Але за паваротам Юрка мусіў спыніцца. Толькі пара дамоў стаяла яшчэ спачатку, а далей — скрозь гола з абодвух бакоў, коміны й печы — рэшткі былых тутэйшых будынкаў. Але на тым рагу быў і ён, «знаёмы дом», — і там нічога цяпер не відаць. Скрозь — адна выгара...

Юрка стаяў, і здалося яму, што толькі ўжо й застаецца адно — стаяць тут, стаяць так, бо йсьці ўжо — куды... Вось яно й абарвалася... Няўжо гэта Валік так неспадзявана зрабіў зусім наадварот? Не, ды гэта ж — не з учарайшага — каля комінаў нарасла ладная ўжо трава, вунь — каноплі хістаюцца нават. Гэта — тады яшчэ, як бушавала навала вайны тут, імкнучы шалёна на ўсход, і зыходзіліся, хапаліся ўзагрудкі дзьве сьценкі полымя — з захаду й з усходу. Ён ня бачыў гэтага йшчэ — вось як яно выглядае...

Памалу, маласлухмянымі нек раптам нагамі, сунуўся мёртваю вуліцай Юрка. Тут. Ад «знаёмага дому» — толькі пабяляныя калісьці, цяпер закураныя над дзірамі вокнаў, сьценкі сутарэньня — драўляны верх, дзе жыла яна, пайшоў, значыцца, з дымам... «Пайшоў у расход» і «зялёны сад» — вунь толькі нізка, ля самае зямлі, адпілаваныя пеньчукі — відаць, недагарэлыя, абвугленыя яблыні й ігрушы людзі папілавалі сабе на дровы...

Юрка падышоў бліжэй да рэштак сутарэньня. Ага! Моцна затыхала сэрца. Яна ёсьць, ёсьць! «Эўрыка»! На пабеле — вугалем вялікімі друкаванымі літарамі, крыху ўжо змытымі дажджом, з абцёкамі — напіс: «Галічы й Рынейскія — Падгайная 21-1». І Рынейскія! Так, значыць, ёсьць і жывуць там, на Падгайнай — Юрка добра памятае гэную вуліцу — там жа жыў хлопец зь іхнае клясы, Юшка Кіпець, на мянушку Качка, дурнаваты крыху. Значыцца, дзесьці там — а тут пакінулі адрас, як будзе шукаць хто, і вось яму, Юрку, прыдалося якраз. Гура, віват, — барждзжэй туды!

Ён імчаў пад нясьціханае ад таго мамэнту тыханьне сэрца, якое цяпер ад бягні як не выскоквала з грудзей. Нават бачыў зусім блага ад поту, што заліваў вочы. Дарогу знаходзіў больш наманы, самі ногі несьлі. Дый бачачы добра, пазнаць усё адразу было б цяжкавата — гэтак зыначыла тут вайна родны горад. Трапляліся ўжо й сьляды сьвежыя, учарайшыя: вунь, на пагарэлішчы, што яшчэ курыць, поркаюцца ўдваіх стары й старая — шукаюць, мусіць, нешта, чаго не ўхапілі ўчора, пры раптоўнай такой навале, уратаваць. Вось і любая, родная школа — але ж Віктар датрымаў абяцанку: руіны... Іх усё ж вартуе нямецкі жаўнер — Юрка нек інстынктыўна перайшоў на другі бок... Усе гэтыя абразкі, нават руіны любае школы, нек яшчэ не праймалі яго — уваччу, у сьведамасьці яны проста адзначаліся, толькі канстатаваліся, можа, рэгістраваліся. Бо барждзжэй трэ было туды, туды!

І раптам, ужо зусім недалёка, ён стаў ізноў, як ураджаны перуном: Падгайная — гэта ж якраз ля могілак. Ну, але, учарайшы ягоны раён. Што, калі? Не, не, не!

Юрка паймчаў ізноў подбегам. Перабягаючы праз вуліцу, ледзь ня ўскочыў у сьвежую лейку ад бомбы. Мусіць, свая. Ну, гэта добра — сярод дарогі, безь ніякае шкоды, ён жа й сыпаў больш так — і там не павінна быць нічога.

Падгайная з гэтага канца аказалася даўгою вуліцай з рэдкімі дамамі. Нумары? Але, 21 — будзе пад той канец, далёка. Мамачка, якраз пад могілкі... Юрка зноў спыніўся. Раптам як бы ня стала зноў сілаў рухацца далей. «Глупства, дурніна», — падбадзёрваў нехта — розум? — Наперад, наперад, нічога няма...

Але, нічога й не было. 21 — аказаўся якраз каля могілак. Захаваліся толькі вароты — жалезная брама з гэтым, і то пакарэжаным, нумарам. Ад самога дому — гэта была двухпавярховая камянічка на панадворку — толькі кучы друзу, рэшткі сьценаў... Але ж, ягоная собская работа — гэта сюды, сюды садзіў

учора, як шалёны, хацеўшы вунь у тую, у царкву... Сам сабе зрабіў...

Каля руінаў былі людзі, некаторыя нешта вазёкаліся ў іх і ля іх, падыходзілі яшчэ. Юрка ня важыўся зблізіцца. Пазнаюць яшчэ, што ён... Забойца... Той — раскірэчаны Гадэнка — гэта што, няхай бы, але тут, тут...

Зьняможаны, прыбіты ўшчэнт, ён мэханічна падаўся пад могілкі. Царква стаяла цалюсенькая. Тая царква, у якую гэтак учора цаляў, а пацэліў... Крыж, здавалася, зіхацеў, мяняўся зноў — у праменьні ранішняга сонца яшчэ ўрачысьцей, як учора ў водбліску чорна-крывавых ягоных, Юркавых, справаў... Юрка патрос на яго кулаком. Ступіў яшчэ колькі разоў і асеў на нейкую чорную надмагільную пліту, адчуўшы аж праз вопратку ейны каменны холад.

## X

Ізноў час мінуў бязь меры й бяз думак, але й без забыцьця, адно ўв атупелым адраньцьвеньні. Юрка ўзьняў галаву толькі мэханічна, як нехта, праходзячы паўз самога яго, аж зачапіў валасы сваёй шастучай вопраткай. Ён зірнуў наўздагон гэнаму шастаньню — нейкая жанчына, уся ў чорным. Ну і няхай сабе... Што — няхай сабе? Няхай сабе ў чорным. Увесь сьвет жа яму, Юрку, цяпер у чорным. Завязаны сьвет...

Ён цяжка ўзьняўся з магільнае пліты, на якой сядзеў, — вельмі скурчыла, седзячы так нямаведама колькі часу, само сабой прасілася выпрастацца. Зірк ягоны ўпаў на надпіс на пліце. «Хведар Паляжай». Ха, Паляжай — палёг ужо, палёг касьцьмі. Усе паляжам, кажуць людзі. Мо' й лепш было б ужо нават ляжаць гэткім во Паляжаем, чым цяпер вось так... Лепш бы душою быць на нейкім «тым сьвеце», дзе ўжо яна — спаткацца хоць там, бо гэты сьвет — завязаны сьвет... Ха, ізноў «той сьвет», учарайшае «нешта ёсьць» — сьмех! Паляжай, Паляжаюхна, бедненькі, а мо' так толькі, паляжаць прылёг, крышачку?

Улюбёная Юркам гульня словаў, нанізваньне іх, выкручваньне з аднаго другога, здавалася, вяртала яго пакрысе да ягонага нармальнага, кпліва-гіранічнага, але й бестурботнага настрою, штачасіны гатовага да вастраслоўя, хоць сабе й пустота часам. Ён нават усьміхнуўся сам сабе — як гэта з такога Паляжая розную дурніну можна выкруціць. І тут спасьцераглося, што сонца высака, травеньскае сонца, і хараша так на дварэ, асабліва на магільным гайку. Ды разам з тым — ізноў і тут кінулася ў вочы: вывернутая зямля, лейка... Ізноў ягоная ўчарайшая работа.

Выкапаў ямінку на могілках — магілу? Каму? Мо' сабе? Не, гэта ж ёй, Веры...

Але ці нейкі, часовы мо', паварот у настроі, ці гэтае сонца й травень кінулі раптам ізноў зыркую яснасьць. Чакай, чаму так канечна мусіла яна загінуць? Магла ж выскачыць, уратавацца, магла проста ня быць удому... Падумаў жа ўжо быў там, на Слабодцы, што ўсяму канцы, ажно — гэты адрас на сьцяне... не, і цяпер яшчэ ня ўсё страчана, ня ўся надзея — і як гэта ён так адразу: згледзеў руіны й распусьціў нюні, што «сам сабе нарабіў»... Трэба ж было ўпэўніцца, пераканацца канчальна, і хіба ўжо тады...

Надзея, ажыўшы, адразу зьвярнула бадзёрасьць. Юрка засягаў назад, адкуль прыйшоў сюды, да таго № 21. Ён установіць, пераверыцца — пэўна ж, ёсьць там людзі, поркаюцца яшчэ, трэба толькі распытацца...

Але людзей, як на гэта, якраз ужо й не было. Як падмяло іх. Дый пэўна ж — нямаведама колькі праседзеў крукам на тэй магіле, на тым Паляжаю — ня век жа стаяць людзям тым ды чакаць на Юрку. Заставалася яшчэ агледзець руіны бліжэй, як там, на Слабодцы, хоць тут, пэўна, і ня можа быць такое знахадкі... Дом не згарэў, але быў зруйнаваны дашчэнту — сюды ўгрукаў ён, відаць, ці адну выбуховую. Усё ў кучы — друзы, пакручаныя жалязякі ложкаў... Сям-там ужо крыху параскопвана, мо' й вылавілі што людзі, сваё ці чужое. Ды не, яшчэ зусім нельга сказаць, што яна загінула, пахаваная тут, у друзах. Толькі як цяпер даведацца? Суседзі? Побач курэла пагарэлішча, і — нікога... Насупраць — таксама сьвежае вялізарнае папялішча і наагул дамоў няма. Хіба там, далей вунь, здаецца, як бы стаіць яшчэ цэлы дом...

Юрка падаўся ўжо ўніз па Падгайнай у тым кірунку. Але тут, з-за наступнае паваро́ткі, за квартал, выйшаў, ідучы на яго, нейкі чалавечак з хлопчыкам за руку. У хлопчыка ў другой руцэ — сьцяжок. Чалавечак у сінім гарнітуры, у сінім жа капелюшы, дзівацкім нейкім, абведзеным шэрым пакручастым шнурком, зь нейкім выгнутым пяром адзадзя. І хада сьмяхотная, урозваль, як качка. Але, качка — гэта ж і есьць ён, Качка на мянушку — той Юркаў школьны сябрук Юшка Кіпець, ён жа й раней жыў на гэтай Падгайнай, па той бок могілак. Юрка ўспомніў жа быў на яго ўжо сяньня, а тады нек забыўся. Ну але, ён, і тая ж знаёмая хада, і звычай да дзівацкага выгляду — усе заўсёды мелі яго за дурнаватага. Але цяпер Юрка ўзрадаваўся гэтаму Качцы, як нейкаму свайму роднаму, даўно нябачанаму, можа, нават ужо самому таму, каго й шукаў якраз.

А пэўна ж, ён жа павінен ведаць, і гэта — на аднэй жа вуліцы, ці хоць паможа барждджэй даведацца. І Юрка шпарка пайшоў напярэймы.

— Чалавек зь цябе, — угаворваў нешта Качка малому, які быў зусім, што называецца, скуксіўшыся.

— І зь цябе ж чалавечына! — гукнуў яму, падыходзячы, Юрка. Той прыстояў, глянуў сваймі бясколернымі нейкімі вачыма, разявіўся, і Юрка мусіў усьміхнуцца міжволі, успомніўшы яшчэ й гэтую ягоную сьмяхотную звычку.

— Галушка-а? Юрка? Ты гэта ці ня ты? — усьцешыўся быццам бы й Качка.

— Таксама, як гэта — ты...

— А братачка, дай жа пацалуемся, ці што... Гэтак даўно цябе ня бачыў, — і яны шчыра тройчы перацалаваліся.

— Дзе ж ты цяпер, адкуль? — ізноў загаманіў Качка, зрэшты, тут жа ня даўшы сябру адказаць, з чаго той быў вельмі здаволены, не гатовы адразу адказваць на гэткія пытаньні. — Ну, і добра, тут страх як патрэбныя людзі, наскія людзі, разгортваем такое — такое, што й ня сьнілася раней. — І ён змоўк, аглядаючы Юрку, як і той яго, далучыўшы ўжо да дзівацкіх падрабязнасьцяў Качкавага ўбраньня сіні мятлік пад каўнерыкам, як насіў калісьці адзін зь іхных настаўнікаў, чалавек старамодны, і маленькі пярэсты нейкі мятлічак на штрыфлі марынаркі. Той малы, што трымаўся ўсё за Качкаву руку, таксама разглядаў Юрку, уторкнуўшы тым часам у губу палачку свайго сьцяжка, чырвонага, зь белым кругам пасярэдзіне, у якім — чорная свастыка. Юрку аж крыху здрыганула ад гэтых фашыстаўскіх эмблемаў, як сяньня раніцой, калі пабачыў быў упершыню нямецкага жаўнера на варце ля руінаў іхнае школы — усё непрывычка яшчэ...

— Куды ўвабраў у рот, усякае... — засварыўся Качка на малога, зацяўшыся, аднак, перад дакладнейшым азначэньнем да «ўсякага» і дадаўшы толькі: — Смактун! Бягай сам дадому, скажы маме — зараз іду. — Малы пабег. — Вадзіў глядзець на дэманстрацыю, — растлумачыў Качка, і Юрка ўспомніў, што й на гэтым жа баку таксама ўрачыста абходзіцца травеньскае сьвята. — Га, ты ж ня ведаеш яшчэ — узяў сабе жонку, праўда, з гэтым во «пасагам». Ды дармо, хоць не свае, а ўсё ж даваеннае вытворчасьці. Дурнаваты яшчэ малы.

«Цікава, ці паразумнеў жа большы?» — міжволі падумалася Юрку, але ўголас ён, як і трэ было, як умеў і мог, ветла й вясёла сказаў:

— Дык жа віншую шчыра з такой падзеяй.

— Можна, — згадзіўся Качка, — баба ёмкая, добрая, слаўная баба... А ты як — «ледзіх»? — спытаўся ён нейкім незразумелым Юрку, пэўна, нямецкім словам, ды адразу зарагатаў: — А памятаеш, як усе, цэлая кляса, былі ўкляпаўшыся ў гэтую Верку? Ну, і я, пэўна ж... Але вы ўтрох — дык найбольш, — і тут жа спахмурнеў: — Бедная! Ты ж учора ня быў? Вунь што нарабілі, свалачуны! — казаў ён, паказваючы на руіны й папялішчы вакол. — Вера ж жыла цяпер з маткаю тут, вунь гэнам. Толькі выскачылі з дому, а ён якраз туды пачаў клеіць, і ці адну — узапар... Дык усіх — на кавалкі... Сягоньня рана зьбіралі, складалі... Заўтра хавацьмем усе ахвяры разам...

Як ён гаварыў, усё зноў, толькі цяпер ужо нек пакрысе, паступова абрывалася ў Юрку. І ня верылася яшчэ, бо не хацелася верыць пасьля кагадзешніх такіх надзеяў, і балюча-ясна было: усе яны канчальна цяпер страчаныя. Можна, пэўна, паглядзець на складзеную з кавалкаў? Не, лепш ня трэба, ні сяньня, ні заўтра, на пахаваньні...

— Так, браце, — сумна цягнуў Качка, спасьцярогшы, пэўна, Юркаў стан, хоць і без таго, ведама, каб праняцца ўсёй глыбінёй ягонага болю, а расцэньваючы па-свойму, — разумею. Ну, я вылечыўся ад таго, дый мне шкада — вучыліся ж разам. Ды ці адную яе — колькі людзей накрышылі, гады! Жартачкі — самалётаў з трыццаць, як машкара, на гэткі то горад...

«Значыцца, кажны з нас у іхным сполаху ў дзесяць вырас», — невясёла думалася Юрку. Зрэшты, ён, Юрка, ня толькі за дзесяць — за сто, за тысячу нарабіў адзін, бо — такое ж, зусім непапраўнае... За тысячу «гадаў», «свалачуноў»...

Качка маўчаў, а за часіну станоўка заявіў:

— Ну, пайду, бывай здароў. Як адыдзеш ад гэтага, заходзься як падвечар, пагаворым. Ведаеш жа дзе — там, дзе й жыў, — і Качка паказаў яшчэ рукой у тым кірунку. Але Юрку здалося цяпер найстрашнейшым застацца зноў самому аднаму. Ён узяў Юшкаву руку, пададзеную на разьвітаньне, і затрымаў яе. У яго зьявілася раптам думка пашукаць хоць якога, на часінку, адхланьня.

— Ці няма тут, каб дзе выпіць?

— Уга, чаму не, гэтага цяпер у нас усюды, — ажывіўся тут і Качка. — Вось, якраз недалёка, за рогам кнайпа.

Ізноў было незразумелае слова, але лёгка можна было здагадацца — пэўна ж, карчма.

— Дык можа пайшлі б разам? Адзначым нашае спатканьне і твой законны ці незаконны, ня ведаю, як там у вас, — запра-

панаваў Юрка, спрабуючы жартаваць сваім звычаем, ды цяпер нават у голасе была адна нацягнутасьць і штучнасьць...

— І за Верачкінае душачкі вечны супакой... Дый сьвята якраз — шмат прычынаў складаецца, дык хіба — можна! — згадзіўся Юшка. Ён зусім не спасьцярог дурное нетактоўнасьці таго свайго ўспамінаньня пра Веру, а Юрку гэта адразу абурыла так, што ён ледзь не размахнуўся ўжо, каб згарачага «качануць» гэтага, плюгавага яму раптам, Качку. Якое ён мае права кпіць з гэтага так, якое меў і мае права наагул да Яе — да Веры — кранацца сваім дурным, каччыным тупаслоўем? Але ж сам ён, Юрка, ці ня меншае яшчэ права мае цяпер? Забойца... І, ня ўзьняўшыся, мусіла апусьціцца рука, хоць жаданьне даць усё ж у мызу гэтаму ідыёту, проста так, залегла недзе ў глыбі.

Як праходзілі паўз могілкі, Юшка зноў загаманіў.

— А на могілкі колькі ўсадзілі — і чаго? Нябожчыкам ужо быту не даюць, ня тое, каб жывым. І ведаеш, якая здарылася праява? Памятаеш жа, атруціўся калісьці наш хэмік, а мы злажыліся й паставілі яму на магілцы помнік з чырвонаю зоркаю? Дык бомба якраз акуратненька адбіла да ліха гэную зорку. Значыцца, вось які знак! Праява, цуд, Божы цуд!

«Цаляў у крыжык, а лучыў у савецкую зорку — таксама знак?» — і Юрку прыкра прыгадалася ягонае ўчарайшае дарэмнае паляваньне на крыжык, і як нядобра зрабілася раптам тады...

— А ты што, верыш у цуды? — спытаўся ён, успомніўшы, што ў школе ж гэты Качка быў упаўнаважаным «Бязбожніка». Праўда што ўся ягоная «работа» палягала вылучна бадай на зьбіраньні сяброўскіх складак...

— А як жа, што ты, увяраю. Мае бацькі заўсёды былі рэгіліёзныя...

«Скончыў дзесяцігодку, а й такога слова правільна ня вымавіць», — мільганула ў Юркі.

— ...і мяне, хоць крыючыся, а так гадавалі. Дый, падумаўшы-ткі, нешта ёсьць...

«Нешта ёсьць», — прыгадалася зноў учарайшае Юрку.

— Нешта й тут знойдзем, ня можа быць, — ня даў далей думаць Качка, адчыняючы дзьверы ў нейкі цёмны калідорчык. — Форзыхт, прыступкі! Налева!

Яны ўвайшлі ў поўную людзей, дыму, чаду й п'яное гаманы «кнайпу».

## XI

Юрка адразу выпіў адным духам поўную шклянку нейкае, мусіць, самагонкі, даволі-ткі гадкае на смак. Качка, хоць і вельмі хваліў яе перад гэтым і, відаць, надта хацеў дараўнавацца ў выпівацкім геройстве Юрку, адужаў усяго ледзь палавіну. Закусілі кіслай капустай, ужо, праўда, вельмі смачной, як умеюць яе квасіць хіба што толькі ў нас у Беларусі.

Гарэлка ані не ўзяла Юрку, і ён моўчкі, панура разглядаўся па «кнайпе» і ейных гасьцёх, хоць за густым, ядучым дымам разнастайнага тытуну ваеннае прадукцыі й цяжка было каго ці што разгледзець. Паўтарылі яшчэ. Качка, падплятаючы ўжо крыху языком, пачаў раскрываць сваю душу перад Юркам. Цяпер ён канчальна стаецца вынаходнікам — ягонае яшчэ школьнае летуценьне, хоць якраз фізыка давалася яму ў школе туга, і як сьлед «вынаходнік», пэўна, і цяпер яе ня ведаў ды ня мог бы даць рады з прасьценькім разьлікам. Ды дармо — у яго ўжо разьлічаны й зусім распрацаваны такі вынахад, такі вынахад... Поўны пераварот у сьвеце, а найперш — у гэтай вайне. Борздая перамога новай Эўропы над бальшавізмам, над плютакратамі, а адкуль? Зь Беларусі, якая тым самым заваюе сабе першае месца ў гэтай новай Эўропе. А патэнт у каго? У Беларусі, у Юшкі Кіпця ў руках. «У кіпцях», — панура мільганула ў Юркі, барджджэй ад прывычкі да гульні словаў, і ён таксама паглядзеў на Качкавы кіпці з густой чорна-сіняй «жалобай» пад імі... Але ж жалоба — гэта ў яго, у Юркі, сапраўдная жалоба, чорна-чорная...

А «вынаходнік» хваліўся далей, што пачаў ужо будаваць мадэль свайго незвычайнага вынаходу. Праўда, тугавата з гэтым — вайна, правінцыя, няма патрэбных частак, матар'ялаў, майстроў... Юрка слухаў яго зусім безуважна, горка думаючы пра тую сваю жалобу, і Качка мусіў нагнуцца да яго блізенька, узяць за штрыфлі марынаркі й адкрыць яму ўжо сакрэт, калі таму так ужо цікава, хоць цікавасьць гэтая анічым яшчэ ня выявілася, а барджджэй наадварот, пачынала паказвацца абрыджонасьць. І Юрка моўчкі, але станоўка, адчапіў Юшкавы пальцы-кіпці ад сваіх штрыфляў. Ну, калі Юрка ўжо так хоча, дык яму скажацца: гэта мае быць — груба кажучы, толькі груба, як ляіку — вялізарны магнэс, які мамэнтальна прыцягвае да сябе, скідае далоў на зямлю самалёты. Га, што за штучка? Адразу перамога на тым баку, які будзе мець гэткую машыну: варагавая авіяцыя спаралізаваная, свая дзее бесьперашкодна, і ўсё ў шапцы. А тады Юшка возьмецца за другі, яшчэ большы вына-

хад, які ў ідэі ў яго зусім гатовы й прынясе шчасьце ўжо цэламу чалавецтву, ды зноў жа — з рук Беларусі, зь ягоных, Юшкавых, рук... Гэта няпраўда, што вечны рухавік — «пэрпэтуй мабіль», сказаў Качка, — немагчымы. Ён давёў адваротнае, усё выходзіць... А тады — ого, тады! Тады Юшку даецца ўся ўлада ў рукі — ну, значыцца, пішацца паперка, што ўся ўлада — Юшку, і ён уладжвае ўсё па-свойму. Трэба мець толькі ўладу, ну, паперку, і ўся маса пойдзе за табою. Калі адразу й ня надта захоча йсьці — можна крышку й падашукаць, як бальшавікі ў сямнаццатым годзе...

Юрка ўсё роўна ня слухаў, і Качка крыху перасьціх. Але неўзабаве, выснаваўшы, мабыць, з свайго разумаваньня над прычынаю Юркавае безуважнасьці да такіх цікавых пытаньняў, ён выпаліў:

— Начхні ты на гэтую Верку, браце. І яна зусім спэцкалася была апошнім часам, з паліцыянтамі круціць пачала, і гэта не з адным, а з двума адразу...

— Вера? — пракруціў ацяжэлым, яму здавалася — толькі цяпер, языком Юрка. У яго зноў уздымалася аднекуль з глыбі залеглае там яшчэ раней жаданьне таксама цяжка аплявушыць гэтага болбатня.

— Ну але. Вунь, адзін зь іх ці не сядзіць у тэй кумпаніі, — Качка паказаў галавой у кут. Юрка зірнуў туды. Там сядзелі й гаманілі ўсе адразу, мусіць, добра ўжо пацягнуўшы, нейкія маладыя хлапцы ў чорнай, вайсковага тыпу ўніформе. «Дык гэта такія ў іх паліцыянты, — падумалася Юрку, — добра ведаць!» — хоць ён і ня мог бы вытлумачыць, чаму гэта яму «добра ведаць». І раптам Юрка прыцягнуў ужо Качку за штрыфлі, як той Юрку перад тым, толькі мацней, і пачаў, і сам ня ведаючы наперад, што скажа й што так — і перад кім? — прагаворыцца:

— А ты... ведаеш, адкуль я й чаго?

— Ну-у? — аж спалохаўся і, так і застаўшыся разяўленым, працягнуў Качка. Ён успомніў, што праўда, пытаўся аб гэтым Юрку, але ці не дачакаўся адказу, ці забыўся...

І Юрка, не зусім гладка ўжо і зь перапынкамі, зь пераскокамі, проста ў Юшкаву разяўленую губу — як бы той мусіў слухаць і чуць ёй, а не вушыма, вылажыў усю праўду аб сваіх учарайшых і сяньняшніх прыгодах.

— Ідзі ты! — толькі працягнуў, усё яшчэ ня верачы, Качка.

— То ж бо й то, што няма цяпер, зусім няма куды йсьці, — працадзіў Юрка й змоўк. Абодва нейкі час маўчалі. Качка, відаць, стараўся ператравіць такую неспадзяваную й адразу

неверагодную, а разам з тым — чаму не праўдападобную? — Юркаву гісторыю.

— Дык кажаш, з парашутам — дальбог? — працягнуў ён нарэшце. Юрка толькі моўчкі і ўжо зусім па-п'яному целяпнуў галавой. Ізноў маўчалі. Тады Качка раптам пачаў ёрзаць на сваім месцы, а далей устаў і ўзяўся за капялюш.

— Дык я... тут зараз... нешта капуста пушыць. Ты пачакай, — ён панёс капялюш да галавы, але, не данёсшы, — відаць, раздумаўшыся, — апусьціў і паклаў на свой услон. — Хай гэта тут... будзе занята, як хто — скажаш: «Бэзэц!» Я — вомірг! — Юрка зноў целяпнуў галавой, і Качка, з павялічанай яшчэ больш цяпер амплітудай свае валюхатае хады, паплыў да выйсьця, манэўруючы між п'янымі й яшчэ цьвярозымі.

Юрка выпіў яшчэ шклянку і ці ад яе, ці ад рэзкае кісьліні закускі капустаю пачаў нейк ізноў цьверазець. Чорт пацягнуў яго за язык перад гэтым боўдзілам! «Пайшоў даносіць, няйначай, — мільганула ў яго. — Зараз прывядзе гэтых паліцаяў ці так як... Мо' заробіць што для свайго магнэсавага «пэрпэтуя». — Ну і няхай, — ізноў апанавала безуважнасьць, — няхай бяруць, калі так. Пачакаем!» — І ён выпрастаўся на сваім месцы, скіраваўшы пагляд туды, куды адплыў Качка. Але рука ўсё ж сьціснула, і моцна — дармо што п'яны — рэвальвэр у кішэні.

«...А Вера, кажа, з паліцыянтамі... Па руках пайшла... Значыцца, сапраўды дрэнь, і ці варта»... — цяжка варочаліся думкі. Але тут жа абурaўся сам на сябе за такое думаньне: «Як важысься так, забойца?!» І няхай бы сабе была, хоць бы сабе й з паліцыянтамі гуляла, няхай... А цяпер якраз бы ён, Юрка, шась — і, пэўна, яна тых паліцыянтаў — вон, па баку, адстаўка! Пэўна ж, ён — лепшы... «Лепшы» — забойца...

Дзе ж той «пэрпэтуй», чаму ня йдзе, не вядзе?

Ніхто ня йшоў. А мо' надарма ўся гэтая трывога? Можа, той — проста... Казаў жа — капуста пушыць... Ну, і няхай...

Юрка зноў нахінуўся над сталом, узлокціўшы цяжкую такую цяпер галаву. Здаецца, пачынала развозіць, цягнуць на сон...

XII

— Выбачайце!...

Што, ужо прыйшлі, прывёў? Неслухмяная рука не трапляла адразу ў кішэню па рэвальвэр. Дый навошта? Няхай... Юрка пакінуў гэтыя дарэмныя намаганьні. Дый сьмех — аказалася толькі жанчына, маладая, прыгожая жанчына, уся ў чорным. Уся ў чорным?

— Гэтае месца занятае?

— Занятае... — Юрка намагаўся ўспомніць тое нейкае, нямецкае пэўна, слова, якое сказаў быў тады Качка, думаючы, што, мусіць, яго трэба цяпер дадаць.

— Ну але, я бачу — капялюш. Але — гэта? — яна паказала на трэці, вольны ўслон пры тым самым століку, справа ад Юркі.

— Гэта? Здаецца, не.

Жанчына села, шаснуўшы спадніцаю. Юрка агледзеў яе. Чорныя вочы, чорныя валасы, бездакорна правільныя рысы маладога жаноцкага, напэўна, не дзявоцкага ўжо твару. Вусны падмаляваныя зьлёгку, мала знаць, таксама й бровы. У вопратцы — чорнай (дзе гэта бачыў такую, і сяньня?) — поўная строгасьць. Толькі чаго ёй тут, у гэтай кнайпе? Хіба ж ня з гэтых... з прастытутак. Тыя ж павінны быць размаляваныя, разьвязныя, паўголыя... А тут жа яны могуць, павінны нават быць. Што ж, можа, незнаёмка — з таго вершу, што так любіць чытаць Валік, як троху чарку возьме (і Юрка любіць вершы, ды толькі непамкі заўсёды, чые яны — забываецца). Якраз там нешта пра чорны шоўк, які шастае. І дзе ён чуў гэтае шастаньне?

— Дазвольце аганьку? — зьвярнулася незнаёмка.

Ну, калі курыць — дык напэўна ўжо з гэтых, яны ж, кажуць, усе кураць. А вонкавасьць, строгасьць часам знарок на сябе напушчаюць, каб прынадзіць лягчэй, Юрка чытаў недзе гэтак. Але ён усё ж, як мог, па-кавалерску дастаў з кішэні сярнічкі, не даючы прыкурыць ад ягонае папяросы, што, праўда, да таго ж і згасла ўжо няма ведама калі. Жанчына закурыла й кіўнула галавой, дзякуючы.

Мабыць, ад суседзтва незнаёмкі за адным сталом хмель ізноў пачаў біць у галаву Юрку. Суседка выдавалася што раз больш павабнай і прыгожай. Нават тое, што яна курыць, было ёй нейк асабліва да твару, прыгожа й асабліва ўзбуджала. І Юрка зусім бесцырымонна ўзорыўся ў гэтую незнаёмку, як бы хацеў яе выпіць вачыма, яшчэ больш ахмяліцца ёю. Але тая на яго, як быццам бы ані зважала, прымружанымі крыху вачыма пільна выглядаючы некага сярод кнайпавае публікі. Каго яна шукае?

Ды раптам чорная незнаёмка павярнулася да Юркі і з павабнай ці завабнай усьмешкай, гледзячы проста ў вочы, сказала:

— Дык гэта вы — той парашутысты? Ня бойцеся, я — так званая (яна прыціснула на гэтым слове) жонка гаспадара гэнага дзівацкага капелюша, — яна кіўнула на Качкаву аздобу на ўслоне.

Юрка адразу нейк нічога не зразумеў. Жанчына моцна зацягнулася папяросай і, нахінуўшыся да Юркі бліжэй, не зьмя-

няючы тае ж усьмешкі, але цяпер паўшэптам, нейкім пасьпешным і, здавалася, гарачым, пачала яму тлумачыць. Ён мала разумеў і цяпер, больш любуючыся, як разам із словамі выскокваў у яе дым, то гусьцейшы, то зусім далікатна-сіvenькі, і так доўга, як бы гэта не ад папяросы, а загарэлася ў яе што ўнутры, і адтуль — і гэты дым, і гарачы такі шэпт. Юрка ня бачыў яшчэ ніколі, каб гэтак курылі жанчыны, ды такія маладыя, такія прыгожыя. І ён куды больш глядзеў на гэткую дымную вопратку словаў, як услухваўся і ўдумваўся ў іхны сэнс. Усё ж, нарэшце, збольшага да яго дайшло: Качка і сапраўды пабег даносіць, а яе, сваю «жонку», прыслаў сюды пільнаваць. Толькі Юрка можа быць зусім спакойным. Адно што той нікога цяпер ня знойдзе — сьвята, усе такія во, як і тут, а каб і знайшоў, дык нічога ня будзе: ня будуць і слухаць такога, таксама ж п'янога, дый наагул, яны такія ж няпільныя, такія наіўныя, што да даверу людзям, і зусім ня цэняць даносаў і даношчыкаў. Ці раз ужо праштырвалі з гэтым і Качку... А нарэшце, і галоўнае — на тое й яна тут. Праўда, страшэннай неасьцярогай было зь Юркавага боку давярацца гэтаму, хоць сабе й свайму школьнаму сябру, але такому, хай Юрка прабачыць, дурню (апошняе Юрка моўчкі пацьвердзіў, целяпнуўшы галавой). Ейны праўдзівы муж — таксама тут, недалёка, працуе з «нашымі» ў лесе й таксама нядаўна з парашутам... А гэты так — часовая шырма. Як з мужа — зь яго невялікае што. Садзіць усе грошы на нейкі ідыёцкі вынаход — пэўна ж, хваліўся Юрку? І каб па ім — даўно трэ было б сям'і дацца з голаду. Загрувазьдзіў усю хату дзівацкімі сваймі прычындаламі, мусіла выкінуць іх у хлеўчык. Ды зь ім лёгка даць рады. А яна зараз можа скіраваць Юрку куды трэба. Не? Значыцца, ведае сам... Ён яшчэ пабудзе тут? Толькі ж — асьцярожнасьць, гарэлка — заўсёды благое апраўданьне. Ну, яна яшчэ, можа, наведаецца сюды... — і, загасіўшы аб стол недакурак, бо попелкі не было, жанчына адышла з усё тэю ж усьмешкаю й шастаньнем шоўку.

Ага, цяпер Юрку ўспомнілася. Гэта ці не яна прашастала каля яго там, на могілках, абудзіўшы з таго адраньцьвеньня? Уся ў чорным, але, гэта яна. Хто — яна?

У добра п'яной ужо галаве ўсё блыталася. Раптам выйшла нейк, што яна — гэта Вера, хоць на самай рэчы між іх ні ў чым не было ні макулінкі падабенства. Вера! «Пайшла па руках», з паліцыянтамі, і курыць, як прастыт... Не, але ж якая — яшчэ прыгажэйшая! І няхай бы была, хоць якая, абы была. А так — уся ў чорным... Усё чорнае зацягвае, засьцілае ўсё... нячорнае.

І ў дыме чорнай цемры — вогнішча толькі, і Мечык, хлопчык Мечык...

Мечык — меч... Якая дурніна: Мечык — меч, — гэта ж усё — толькі гульня словаў. І толькі сьніцца, трызьніцца, ды сп'яну. А меч у Юркавых руках — як зіхаціць! Не, гэта крыж, той учарайшы крыж зіхаціць, мяняецца. «Меч і крыж» — здаецца, кіно такое было калісьці...

Але ж, меч і крыж. І зь мячом, зь Мечыкам — гэта ж ён вырас у меч — зь мячом, на каго? На крыж? Не, накрыж... Накрыж яго перачыркнулі. Хто? «Нашыя», пэўна... «Працуе з «нашымі» ў лесе». Хто «нашыя»? «Юзікавы хлопцы»?

А сам Юзік — сам Іо-сіф Ві-са-ры-са... і ў мазгох не пракруціш, яшчэ як п'яны... Юрка ж бачыў яго самога, «вялікага правадыра», а тут ён — як маленькі: Юзік... Дый маленькі ж — добра бачыў яго, як быў выпуск іхнае школы. Не, зусім не «вялікі», а малы, касалапы, і твар у восьпінах — адно малююць гэткім прыгажуном. Адно малююць, а так — усё няпраўда, усё ў іх няпраўда, ён ведае даўно... «Маняць, як малююць». І мана, няпраўда, што Сталін: сталь — вось на гэтым мячы. Дык зь ім — на яго, на іх, на «нашых»? А хто ж — «нашыя», дзе «нашыя», дзе «вашыя»? «Нашы вашых падвязуць»...

Як жа зіхаціць меч — аж глядзець баляць вочы... Прыплюшчыць вочы... Прыплюшчаным вокам — нехта глядзіць, пільна глядзіць. Гадэнка — ажыў і глядзіць? Не, гэта Мечык прапушчаў ад вогнішча прыплюшчаным вокам. І гэтая — у чорным — плюшчыла вочы, выглядала кагось у дыме. Вера? «І той пагляд»... Пагляд прыплюшчанага вока... Будзе гэтак глядзець цэлы век, і трэ будзе нешта рабіць, каб заплюшчыць яго, ці засыпаць — пяском. Не, завязаць — чорным, чорныя бываюць павязкі на воку. Уся ў чорным — і яна ад Юзіка, яны ўсе — чорныя, ад чорных, чорненькія — дробненькія Юзікі. Чорнае — агністым мячом — расьсячы! А вока ўсё роўна будзе прыплюшчанае век, з тым самым дакорам, вялікае вока, як у кіно, людзкое вока, як у казках... Казкі там, у лесе... «Пуга, торбачка, гразь па калены, адпачынак на балоце, ля вагню»...

Нехта моцна трос за плячо. Кнайпа пустая ўжо, толькі дым, і дым у галаве, у душы, халодны дым. Ага, трэба ўжо зачыняць? Плаціць? Калі ласка, калі ла-асачка, колькі хочаце, ня лічачы нават. А шапка, дзе шапка? Не было ж шапкі, праўда. Быў дзівацкі капялюш — Юшкаў, Качкаў, з загнутым пяром адзадзя. Дзе ж ён? І яго ўжо няма. А так бы ёмка цяпер зафутболіць у той вунь кут — капялюш. І Юшку — па капялюшку — заю-

шыць. Што, данёс? Качка — толькі гадкія «качкі» пушчаць. «Беларусь», «зь Беларусі», «для Беларусі». Для Веры. У што веры? Няма Веры, няма веры, а Беларусь ёсьць, ёсьць Мечык...

Што? Ужо, ужо...

Цяжкімі, неслухмянымі нагамі выбраўся Юрка з кнайпы. Нехта памагаў? Дурніна, с-сам.

Вясьняны цёплы брызок далікатна пырскаў на твар. А як жа цёмна, чорна-цёмна, ані ясачкі...

Перастаўляў ногі, кіруючыся наманы, праз тую чорную цемру — да нейкага вогнішча, хоць ніякага не было нідзе. Кіравала, усплыўшы, зноў тое: «Пуга, торбачка, гразь па калены, адпачынак на балоце, ля вагню»...

XIII

На Юрку яшчэ доўга чакалі на лётавішчы, хоць ужо ясна было: ня вернецца... Не вярнуўся ж і тамбоўскі герой Жарабцоў, і сябры зь ягонага зьвязу самі бачылі, як, загарэўшыся, кулём рынула далоў ягоная падстрэленая машына. Гэтак загінулі два найбольшыя рызыканты эскадрыльлі. Не далічыліся й яшчэ сяго-таго, двух не зьвярнулася з паветранага бою, да якога яны былі змушаныя ворагавымі зьнішчальнікамі, што перанялі іх па дарозе назад. Хоць, праўда, і згаджаліся ўсе, што налёты былі неспадзяванымі для ворага, і абарона ўсюды ўваходзіла ў справу не адразу, праспаўшы, але ўсё ж гэтая абарона была, і «пэўныя весткі», што яе быццам няма, толькі абуралі ўсіх.

На Юрку чакалі даўжэй за ўсіх, бо ніхто ня бачыў ягонае катастрофы. Праўда, Віктар ужо пад канец чуў страшэнныя выбухі, гул ад якіх проста зьліваўся — можа, Юрка «сеў на свае»? Але гэта як бы было зусім не ў ягоным баку... Валік здагадваўся добра аб сапраўднай прычыне чутага Віктарам ды, пэўна ж, маўчаў...

Усё ж адправу па ахвярах дзеля пэўнасьці пастанавілі зрабіць па сьвяце — мо' яшчэ й вернецца хто пехатой на самалёце, як любіў казаць — нябожчык? — Юрка.

Настрой у бальшыні «сакалоў» ад усяго гэтага быў ня вельмі каб «сакаліны». Толькі якраз першы зьвяз, Юркавы сябры, дармо што й безь яго, а пачувалі сябе няблага. Віктар, бядуючы дзеля прыліку па такой цяжкой для зьвязу страце, як бясстрашны, запраўдны пілёт (цяпер ужо, а раней — рызыкант, нават хуліган) Юрка, душою быў у падвойным задавальненьні: Юрка скруціўся яшчэ барджджэй і раней, як ён спадзяваўся. Адзін ужо напэўна саступіў зь ягонае дарогі. Але й гэты другі нейкі па-

дазрона спакойны, усьміхаецца нейкай летуценнай, нябёснай усьмешкай, як сьвяты. Ці ня Веру пабачыў мо' з высакосьці? Не, мусіць, проста рады, што абмінуў шчасьліва «знаёмы дом» — гэтак зрабіў, як меркаваў наперад Віктар. Але як канкрэтна (Віктар дужа любіў гэтае слова, як любяць яго ўсе тыя, што сапраўды «канкрэтна» ні гаварыць, ні рабіць ня звыклі)? Ня можа быць, каб выйшаў сухім з вады. Гэны гук — якраз у ягоным баку, не, гэта ня Юрка, а мусіць, што гэты «аблягчыўся». Трэ будзе, канечна трэба «прамацаць».

Валік і праўда быў у спакойным, бадай радасным нават настроі. Пэўна, шкада было Юркі й нават Жарабцова, але затое была поўная — мо' эгаістычная? — задаволенасьць сабой, што сам выйшаў чыстым і перад «каханым горадам», і перад Ёю. Ці адчувала хоць яна тады, што ён тут, зусім блізка быў, думаў аб ёй і зрабіў усё, каб абмінула яе тая навала?.. І яшчэ крыху нядобра — трэба хавацца з гэтым усім, як злодзею. І што Віктар чуў, пэўна ж, як ён «згружаў» у балота, хоць і ня ведае праўды, — таксама не зусім добра... Але ўсё гэта дармо, спачатку толькі трэ будзе крыху патрымацца. Галоўнае — каб не чырванець, гэтым можна выдаць сябе, хоць і тое, зрэшты, праўда, — усе прывыклі, што ён чырванее заўсёды. А там абляжацца ўсё, забудзецца, і будзе ўсё добра. Гэта ж не з благой, злой справай хавацца трэба, а з добрай якраз, — толькі ў іх заўсёды добрае перакручваецца благім і злачынным, і наадварот...

Начны халадок крыху праймаў на лётавішчы, але й гэта нейк прыемна вязалася з тым, што пачуў і адчуў там:

Мае босенькія ножкі,
Сьцюдзёна стаяць...

І да Віктара нат не было цяпер жалю, як перад стартам. Можа, нават і лепш, што ён Валіку тую сьвіньню падлажыў. Будзь жа ў тым раёне які Юрка — мала чаго нарабіць мог із сваім дурным рызыканцтвам — вось жа няма й дагэтуль. І калі Віктар запрапанаваў пачакаць яшчэ крыху ў чырвоным кутку, у будынку дзяжуркі, бо на дварэ ўжо крыху зябка, — Валік ахвоча згадзіўся, не падазраючы нічога благога й не спадзяваючыся цяпер новае сьвіньні ад Віктара.

— Так вось і няма нашага Юрачкі, нашага Галушачкі, — пачаў ізноў бедаваць Віктар, але выходзіла гэта ў яго так штучна, так драўляна й прыкра-штучна, асабліва ў гэтых зьмяншальна-ласкальных, што Валіка ўсяго аж пакарэжыла неяк. — Ды мне ўсё здаецца — завітае яшчэ вось-вось сакалок, — хлусіў

Віктар далей, будучы сам у душы цьвёрда пэўным у зусім адваротным, прынамсі, хочучы быць пэўным.

— Баюся, што ўжо не, такі рызыкант, — пэўна, загінуў...

— Бадай, маеш рацыю што да рызыканцтва. Зусім што іншае тут — чыстая работа! — пачынаў адразу сваім заўсёдным самасуйскім звычаем хваліць сам сябе Віктар. — Штаб — нашая школа — адразу, не здрыгануўшыся, трапнымі лучаньнямі — да ўсіх чартоў сабачых! Чыгуначнае дэпо — хто зраўнаваў? Больніца — паводле вестак, зь іхнымі раненымі — уся, як сьвечка!

«Паводле вестак» — «пэўныя весткі», — падумаў Валік і жахнуўся: раненыя як раненыя, але ж у гэтай больніцы за старажыху была й тут жа жыла Віктарава маці... Вось дзе сапраўдная «бальшавіцкая бязжаласнасьць», бязьлітасная драўлянасьць — ня дзіва, што й Валіка туды, дзе бацькі, пасылаў — якая тут сьвіньня...

— А як нашыя ўдачы, Валечка? — цягнуў далей, відаць, аж надта гэтым разам задаволены сабой Віктар, у знак асаблівай пяшчоты ці што, паклаўшы руку Валіку на калена. — Праўда, у цябе не было паважных аб'ектаў... Вось ты зразу скуксіўся быў на мяне, кусьліва дзякаваў «за давер». А падумай цяпер сам — не даваць жа было мне гэтаму, кажаш сам, рызыканту Юрку, і ня браць сабе — бачыш, які я... («драўляны», — падумаў ізноў Валік), — нічога не пашкадаваў... і я, праўда, знарок, сьведама даручыў табе той раён, дзе нашая Вера, — ён прыціснуў на слове «нашая», і Валіку гэта здалося асабліва прыкрым, як гук ад жалеза па шкле, — ведаючы, што ты будзеш шанаваць, як вока... Я нат сказаў гэта Юрку — можаш спытацца ў яго, калі вернецца, можа. Так што й быў давер, без усякае гэтае тваё гіроніі, найбольшы давер. Ну, а што й бацькі твае ў гэтым самым раёне — гэта ўжо трудна... Пэўна ж, добра й з гэтым абышлося?

— Ня ведаю, як там... — выкруціўся Валік, пачуваючы, што ўжо чырванее пад аляістым, ды ўсё ж мёртва-драўляным паглядам круглых Віктаравых вачэй.

— Ну, што там — «ня ведаю»! Папраўдзе кажучы, каб я быў на тваім месцы... Аб'ектаў жа там не было, значыцца, задача адна: дэманстрацыя магутнасьці, моцы. І калі, адлятаючы ўжо, я пачуў той гук — а быў ён якраз з твайго, з твайго, — падчыркнуў ён аж двойчы, — боку, і я ня мог яшчэ аніяк гадаць, што мо' гэта гіне бедны наш Юрачка (шчасьце, каб гэта было ня так) — дык тут жа падумаў: гэта, мусіць, маніфэстуе наша Валя, і няблага маніфэстуе... Дык як?

— Так... — ціха, неазначана яшчэ, але разам з тым неяк прыбіта адказаў Валік, выразна пачуўшы сябе ўжо злоўленым. Ён ня мог больш адарвацца ад гэтых, як пугачовых нейкіх, вачэй — не схавацца ад іх, усё бачаць, як пачулі й гэтыя гадкія, адторклыя вушы той гук...

— У руіны пакідаў, ці ў рэчку, ці так? — не даючы адхланьня, біў далей у тую самую кропку і ўжо дабіваў, здаецца, Віктар...

— Так... — ізноў гэтаксама ды яшчэ цішэй азваўся Валік, адчуваючы, як сапраўды нейк пачынае таяць, бы тая самая сьнягурка. Хоць ізноў маўчалі крыху, але добра ведаў ужо Валік — ня зьвернуць кірунку гаворкі гэтыя моўчкі, трэ будзе нешта сказаць, і мусіць...

— Куды? — раптам грозна крыкнуў, моцна стукнуўшы кулаком па стале, Віктар. Аляістасьць зьнікла ў момант з вачэй, засталася зноў адна драўлянасьць, мёртвая ўжо зусім і бязжаласная, «па-бальшавіцку» бязжаласная. І Віктар вельмі добра разьлічыў гэты свой рэзкі зварот у гаворцы, ад якога іншы хто, вытрыманы ці спрактыкаваны «злачынец», лёгка мог бы перайсьці якраз у контратаку, ув абурэньне. Іншы хто, але толькі ня Валік, у якога адразу ціха, быццам само, як выпала:

— У балота...

— Усе?

— Усе...

Ізноў змоўклі, і цяпер ужо маўчалі даўжэй. Віктар мусіў перажыць, не паказваючы, радасьць ад гэтае свае, і другое, і падвойнае зноў удачы: і так лёгка зыходзіў з дарогі другі — зусім, зусім бадай так, як было спадзявана (Віктар нават падумаў: уплянавана), і так лёгка, яшчэ лягчэй выкрыць яго ўдалося. І яму можна, нат трэба даць пярэдых — усёдна, дзе дзенецца цяпер?

— Так, — абарвала нарэшце маўчанку, ды ўжо ня Валікава ціхое-неазначанае, а станоўка мёртвае Віктарава «так», як кропка, як пункт над усім. — Спадзяюся, што заўтра прачытаю аб гэтым усім падрабязна ўв адмысловым дакладзе, таварыш Сьнягурскі, — якія матывы й гэтак далей...

Валік маўчаў. Гэны рэзкі зварот, на які так папаўся адразу, гэты тон і «таварыш Сьнягурскі» — гаварылі ўсё. І як подла падвёў! А ён баяўся толькі, каб не пачырванець, а на большае й ня ўздумаў — такі вось спрытны, спрактыкаваны круцель... Не, не яму было спадзявацца на свае сілы ў такой гульні, не яму... Ды што? Усёдна — як іначай было? Толькі дарма сам ашукваў сябе тым спакоем... Хоць і тут — ці шкадаваць? Нечага, меней сябе пагрыз, а крыху адпачыў...

— І Вы ж (так, і «Вы» цяпер на месцы зусім, як і «таварыш Сьнягурскі»), і Вы, — цягнуў Віктар, не дачакаўшыся адказу, — добра ўсьведамлялі сабе й павінны ўсьведамляць цяпер, што так груба «выкарысталі», груба, супрацьзаконна права «абляг-чэньня» ў крытычным выпадку, калі такога выпадку зусім не было. І да чаго можа павесьці гэткае «выкананьне заданьня», такая інтэлігенцкая маладушнасьць, такая...

Што? Валік яшчэ не зразумеў, хоць увесь ход быў такі лягічны. Няўжо, хіба — яшчэ большая подласьць?

— Ты ж сам, Віктар, кагадзе казаў, што каб быў на маім месцы... абы — дэманстрацыя... — нек ні то просячы, ні то спадзеючыся яшчэ, што ня так зразумеў, што жарт можа ўсё, што ня будзе ж так подла падводзіць — прыкра жаласьліва аж для самога сябе, як ня выенчыў Валік.

— Так, казаў «каб» і казаў «на тваім», але ж сам — сам што зрабіў, бяз «каб», на сваім месцы — ці не расказваў табе перад гэтым? Нішто сабе «дэманстрацыя» — груз бомбаў, дэфіцытны, каштоўны матар'ял, сьмерць сотняў ворагаў, народныя, працоўныя грошы — у балота? — аж да патасу пачаў ужо ўзносіцца Віктар.

«Падлюга» — раптам устаўшы, хацеў крыкнуць яму, ды ня мог ад раптоўнае навалы агіды Валік. І адразу ж астыг: на сябе, на сябе толькі трэ абурацца было, як мог думаць інакшай, нават нейкія добрыя намеры ў «сьмердзюху» гэтым дапушчаць. Не, вон адсюль, на чыстае паветра — баржджэй!

— Справа паважная, — пераходзячы тым часам ізноў на разважна-навучальны тон, цягнуў Віктар, — вельмі, вельмі паважная, але пры шчырым тваім прызнаньні, хоць і ведаеш сам абставіны часу, — можа й возьмецца што на ўвагу... Хочаш ужо йсьці?

З радыёдзяжуркі раптам прыўсчыніліся дзьверы.

— Слухайце, хлопцы, улучаю! — вясёла чамусьці гукнуў дзяжурны радысты, разанец Бліноў, якога Юрка перайменаваў быў у «Бліндаж», бо бліны, казаў, цяперашнім ваенным часам — страва не сэзонная.

Віктар кінуўся да радыёрэпрадуктара, які стаяў на століку ў кутку, і пачаў услухоўвацца. О, як прагавіта ўчуваюцца ўва ўсё і як востра чуюць зусюль гэтыя подлыя, адторклыя вушы!

— ...на ворагавыя аэрадромы, чыгуначныя вузлы, зграмаджаньні войскаў і ваенных матар'ялаў. Напярэдадні сьвята працоўных яшчэ раз прадэманстраваная была баёвая магутнасьць сталінскай авіяцыі. Усе машыны зьвярнуліся на свае базы...

— Гэта — пра нас, — самаздаволена ўсьміхаючыся, сказаў Віктар.

— Пра нас? — адарваны ад свае бяды больш Віктаравай заўвагай, як самым радыёпаведамленьнем, зьдзіўлена перапытаў Валік. — Як жа гэта — усе зьвярнуліся? А Юрка, Жарабцоў? А якія аэрадромы, вузлы, зграмаджаньні? Больніца, найвышэй — штаб...

— І балота? — прыкусьліва закончыў Віктар. — Бясспрэчна, пра нас. Ня ўсё тое кажацца, што робіцца, і ня ўсё тое робіцца, што кажацца...

— Гэта ж хлусьня, Віктар, ашуканства!

— Не хлусьня, а палітыка. І правільная палітыка, разьлічаная на карысьць нашага народу, а можа й на сусьветную грамадзкую думку, на думку нашых хаўрусьнікаў. Хлусьня, ашуканства было б сказаць гэтак у справаздачы свайму камандваньню, зрабіўшы аэрадром з балота... Ашуканства для бальшавіка ёсьць адно тады, калі спрабуюць ашукваць ягоную партыю і ўрад — бессаромна, не зьміргнуўшы нат, бо, зрэшты, наагул, здаецца, ня ўмеў зусім моргаць, — спакойна выбіваў словы Віктар.

Так, няма больш чаго рабіць, гаварыць, толькі адно — на паветра!

— Бывай!

— Ідзеш? Дык — да заўтра.

Як агідная, гадкая ўдвая-ўтрая гэтая склізкая рука, незгінальная дошчачка і нават гэтае «заўтра», якое Віктар заўсёды стараўся пераламаць на перадавое «зафтра», бо за ягонае занадта выразнае кароткае «ў» расейцы дражнілі. Але ці ад нэлястычнасьці органаў вымовы, ці ад залішняга стараньня выходзіў у яго пасярод слова такі прыкры гук — нейкі ні то порскат, ні то рохкат...

— Пайду й я, не дачакацца-ткі, мусіць, праўда. Хадзем, хіба, за адным скрыпам.

Яшчэ раз — дошчачка, яшчэ раз — порскат «зафтра» — гадкае таўро, якім пакарала хіба Бацькаўшчына свайго вырадка, адшчапенца... Мэханічна адбіваючы крок, сягаў Валік у сваю палатку. Раптам недалёка шпокнула ў неба ракета, зырка асьвятляючы ўсё на момант. І, здаецца, такім жа зыркім, бязьлітасна-зыркім сьвятлом праясьніліся адразу й думкі. Ці ёсьць ужо для яго, Валіка, сэнс у якім-небудзь «заўтра»? «Можа», «можа» — падчыркнуў і гэты правакатар аж двойчы, а калі ня «можа», а «напэўна» — адно, і такое яснае, гулкае, як гэтая во

ракета: расстрэл... А пакуль да яго — допыты, «шчырыя прызнаньні», «самавыкрываньні» й «самабічаваньні», «адмежаваньні», нудныя павучаньні... І гэта ўсё пачнецца ўжо заўтра — «зафтра»...

Дык — ці варта?... Ці ня лепш самому, выперадзіўшы іх...

А Вера? Толькі ж — Вера, не, лепш — вера, што пабачыць Яе хоць некалі, магла б утрымаць пры жыцьці... Але ж, каб верыць гэтак, трэба ўзьверыцца перш, што можна будзе неяк, дзівам нейкім, такі канец абмінуць. Не, не абмінуць яго ніяк, бо — канец жа, пусты канец, і гэты ж падлей ужо зробіць усё, каб ніякае «можа» ня выварaжыла надвая...

А — «каханы горад»? — «Можа спаць спакойна»... Можа, ізноў — «можа»...

Спакойна спаў у палатцы, салодка хроп ужо Ахмет. Слаўны хлопец... А можа — «можа»! Можа зь Віктаравае сакрэтнай падвучкі раду такую добрую Валіку падаткнуў? «Слаўны хлопец» — ці ж не здаваўся ўжо такім сяньня й Віктар, як алеем увесь сплываў, і пра «давер», а не агідны мералом падумалася й самому...

Калі ж не, калі сапраўды «слаўны хлопец» — дык і перад ім, перад Ахметам, расчыніцца заўтра тое ж «можа» — «можа»... Чаму не перасьцярог начальніка, не спыніў, урэшце — не данёс адразу? Суўдзельнік...

...Дзірачка ад кулі ў палатне палаткі — маленькае вакенца ў неба... Юрка... Дзе Юрка, што Юрка... Вакенца ў неба... Неба... Вера ў неба... Вера...

Так, «вакенца ў неба» — ізноў падказвае такі просты шлях. Шлях разьвітаньня зь зямлёй, паратунку ад нудна-пакутнага «зафтра»... Шлях ад Веры ці — да Веры? Шлях веры...

Так, наважана.

І ўжо цьвёрдая, наважаная, як ніколі, як не свая — бязвольная рука. «Ты тчэш, бязвольная рука». Адкуль гэта? Ці ня ўсё роўна цяпер...

Рука — у сэрца. Дзе яно, сэрца? Гулка калоціць б'е нешта ў грудзёх, як не рассадзіць іх, запаўняе біцьцём сваім грудзі ўсе, не пазнаць, не знайсьці яго, дзе яно, што павінна быць — маленькі, трапяткі камячок-сэрца, што павінна зараз — сьціхнуць навекі.

Грудзі поўныя сэрцам, жывым яшчэ, несьціханым...

Ды не здрыгнулася рука — першы й апошні раз у жыцьці, бязвольная рука, хоць стрэл кіравала проста ў сэрца, сабе са-

мому ў сэрца, дзе й цяпер яшчэ — і ўжо толькі там — поўна было ўсё аднэй Верай...

Віктар прыбег адразу, яшчэ добра ня ўцяміўшы, чаго хоча запыханы Ахмет. Так, усё як найлепш, ізноў больш як спадзявана. Насьмерць? Усё роўна... Трохі толькі крывёю запырсканы партрэт, зь яе партрэт — як жывая — сам, мусіць, маляваў, а не хваліўся ж, не паказваў ніколі й нікому. Цяпер гэта — ягоная, Віктарава собскасьць. Цяпер — толькі гэта, а пасьля — пасьля і жывая зусім сама.

Што — не насьмерць? Усё роўна, усё роўна... Ахмет — па лекара... Ды дармо, усё роўна, усё роўна. Каб сабе і выжыў нават — толькі адцяжачка, адтэрмінаваньне пэўнага, наканаванага, і нат — самым...

Але ж двух, можна лічыць, усё роўна як саступілі. Застаецца адзін, ён — Віктар — «пераможац». Яму — перамога й слава, слава й перамога, gloria-victoria.

Яму, толькі яму аднаму
ўсьміхнецца
знаёмы дом, зялёны сад і той пагляд...

*Лявон Савёнак*

# ЗАПІСКІ ЭМІГРАНТА

*АД РЭДАКЦЫІ*

«Запіскі эмігранта», якія мы пачынаем друкаваць, дасланыя да рэдакцыі празь ветлівасьць аднаго з нашых сымпатыкаў. У прыкладзенай да «Запісак» нататцы зацемлена, што запіскі знойдзены выпадкам пасьля расьцярушаньня аднаго зь лягероў, так званых ДП. Імя аўтара й ягонае цяперашняе месца пражываньня не ўстаноўленыя. Наш сымпатык прыпушчае, што аўтар «Запісак» — бяздомны, расейскага паходжаньня чалавек, блізка знаёмы з жыцьцём беларусаў, і магчыма, што цяпер яшчэ жыве ўв адным зь лягероў ДП. Мы схіляемся на ягоную думку, але station сьцьвярджаць гэтага ня важымся. Тое, што «Запіскі» напісаны ў расейскай мове, не дае яшчэ права сьцьвярджаць, што аўтар іх — чалавек расейскага паходжаньня, бо і ў беларускім асяродзішчы часам сустракаюцца людзі, якія карыстаюць з расейскай мовы. Але ўсё ж некаторыя паасобныя заўвагі аўтара выразна выяўляюць псыхалёгію чужынца, што дае ўжо некаторае права не вызнаваць яго за беларуса.

Дасланыя «Запіскі» ў форме дзёньніка досыць расьцярушаныя. Першыя лісткі аж да 25 сакавіка 1942 году зусім выцертыя й малачытэльныя. Зь вялікім высілкам нам усё ж удалося ўстанавіць, што свой дзёньнік аўтар пачаў натаваць ад першых дзён вайны, жыў на Беларусі, прыпушчальна ў Менску. З паасобных невялічкіх урыўкаў малачытэльных лісткоў і з аналізу далейшага зьместу «Запісак» можна толькі прыблізна схарактарызаваць аўтара. Гэта чалавек найперш апалітычны, сангвінічнага характару, грамадзкі, які мала дзе зьбянтэжыцца. Ува ўсім іншым — гэта звычайны сярэдні чалавек ваеннага часу, які ратуе сваё жыцьцё ад зьнішчальнае сілы вайны й карыстае для гэтага з кажнае сытуацыі.

Надрукаваньне гэтых «Запісак» рэдакцыя ўважае за карыснае з двух гледзішчаў. Першае, у «Запісках» ёсьць шмат цікавых назіраньняў зь беларускага жыцьця староньняга нам чалавека, і таму гэтыя назіраньні могуць прыслужыцца як матэры-

ял для аб'ектыўнае крытыкі нашага грамадзтва й для самааналізу паасобных сяброў яго. Другое, «Запіскі» часта рысуюць драбніцы штодзённага жыцьця, а з драбніцаў гэтых фактычна й складваецца само жыцьцё. Калі ж узяць на ўвагу, што гэтыя драбніцы натаваліся беспасярэдне з самога жыцьця ў часох ваеннае завірухі, калі кажны чалавек найчасьцей бывае без цывілізаванае маскі, дык яны могуць больш праўдзіва схарактарызаваць чалавечую натуру і адлюстраваць сапраўднага чалавека не ў сьвяточным гарнітуры, а ў ягонай штодзённай вопратцы.

Запіскі няведамага аўтара мы назвалі «Запіскамі эмігранта», уважаючы, што такі тэрмін будзе найбольш адпавядаць праўдзе. Аўтар запісак мог бы быць якой-небудзь перамешчанай асобай, сілком перасяленай, прымусова вывезенай, выгнанай, загнанай, запраторанай, расьцярушанай і г. д., мог быць уцекачом, старым расейскім або новым, мог быць, нарэшце, так званым «калябарантам», але ў кожным разе — гэтая асоба ў выніку вайны апынулася на чужыне й ня хоча скарыстаць зручнае нагоды, як канец вайны, каб вярнуцца на сваю радзіму. А ў такім разе праўдзівей за ўсё назваць гэтую асобу эмігрантам.

«Запіскі» падаем у перакладзе і ў рэдакцыі Лявона Крывічаніна.

*АД ПЕРАКЛАДНІКА*

Рэдактар перакладу намагаўся найперш захаваць стыль запісак аўтара, дзеля чаго найбліжэй трымаўся аўтарскага тэксту. Прашу прабачэньня ў шаноўных чытачоў, што ў сувязі з гэтым паасобныя мясьціны запісак могуць здавацца занадта падрабязнымі й цікавымі хіба толькі для гісторыкаў.

## Л. КРЫВІЧАНІН. ЗЬ ДЗЁНЬНІКА І. І. ЧУЖАНІНАВА

*28 чэрвеня.* Вярнуўся ў Менск. Пабегаў, пабегаў ды назад. Хай будзе што будзе. Як кажуць, што міру, то й бабінаму сыну. Вайна мне не спадабалася. Па-першае, на вайне бывае, што й заб'юць, а па-другое, клопату шмат: наступаюць — бяжы, адступаюць — бяжы, ды часам і ня ведаеш, у які бок. Не! Дома лепей! Хай іншыя бегаюць, а мая хата з краю.

Хата, дзякаваць Богу, засталася цэлая, не згарэла. А Рыгорава (гэта мой сусед зь левага боку), дык тая — ушчэнт! Як каро-

ва языком зьлізала! Толькі комін тырчыць. Вось будзе сьмеху, як Рыгор вернецца!

*30 чэрвеня.* Жывы пра жывое й думае. Гэтыя два дні рабіў сякі-такі запас. Прыдбаў, дзякаваць Богу, нямала. Ёсьць хлеба, ёсьць і да хлеба. Калі на добрае пойдзе, дык і на гадкоў пару хопіць. Трэба сказаць — не ленаваўся.

*31 чэрвеня.* Ізноў рабіў запас. Сяньня мяне страшэнна абурыў нейкі выкапень. Мы ўсе грамадою стараемся ля складу, што мурашкі, кажны валачэ — хто што здужае, а ён стаіць, як слуп. Хоць бы пальцам крануў дабрынё. «Рабаваць, — кажа, — несумленна». А які ж гэта, дазвольце, рабунак!? Час пераходны, дабро нічыйнае — валачы, калі сіла. А ён — «несумленна»! Пагледзімо, што ты празь месяц скажаш, старая порхаўка! Эх, і жывуць жа людзі на сьвеце! Як такіх зямля носіць?

*1 ліпеня.* Назапашваньне трывае далей. Сяньня прывалок з жонкаю два вядры патакі й вядро нейкага малясу. Навошта ён — ня ведаю, але людзі валакуць, і я не астаюся. Мо' на што й прыдасца.

*2 ліпеня.* Зноў прыцяг два вядры й мех соды. Крухмалу падчапіць не пасьпеў. Пайду заўтра.

*10 ліпеня.* Восем дзён адпачываў на курорце. Абставіны былі не зусім спрыяльныя для пісаньня дзёньніка, а таму нічога й не пісаў. У памяці засталіся спрэчкі аднаго дня. Гаварылі пра вайну: што такое вайна, чаму яна, як яно ўрэшце будзе. Тут кажны бараніў сваё. Адзін, прыкладам, выступіў і сказаў, што вайна гэта ёсьць вайна, і хоць яна рэч непажаданая, але ваяваць усё ж трэба. Другі хваліўся, што ён таксама ваяваў бы, але яму бараніць няма чаго. Трэці, наадварот, націскаў на тое, што вайна — рэч надта патрэбная, але ваяваць ня трэба. Некаторыя казалі, што пасьля вайны будзе толькі так, а іншыя, наадварот, што будзе толькі гэтак. Разнабою было шмат. Але ўрэшце бальшыня пагадзілася на тым, што можа быць і так, а можа быць і гэтак. Асабліва ўпорыста выступаў супроць вайны адзін нейкі ні то прафэсар, ні то рахункавод — за пылам не разьбярэш. Ён на абарону свае тэорыі выцяг і Талстога, і Дыягена, і яшчэ тузін іншых філёзафаў. Тут ня вытрываў і я.

— Выбачайце, грамадзянін пацыфісты, вайна — рэч конча патрэбная, без вайны нельга, бо яна асьвяжае, яна ачышчае чалавецтва. Вайна — гэта сьмерць, а сьмерць родзіць жыцьцё. Вось! — (Гэта я таксама ўспомніў словы нейкага філёзафа). Але ўпорысты не здаваўся.

— Што яна ачышчае, гэта сьвятая праўда, бо мяне яна ачысьціла да ніткі, але што яна асьвяжае, то гэта, даруйце, — нонсэнс! Выбачайце.

І ён дэманстратыўна адвярнуўся ў бок.

Гэта я ўспомніў, калі змываў у балеі курортавы пыл. Целу было так хораша ў цёплай вадзе, а на стале стаяла паўфляжкі «маскоўскай», а на кухні жонка бразгала патэльнямі, а на работу ня трэба ні заўтра, ні пасьлязаўтра, ні яшчэ праз тыдзень. Не! Што ні кажэце, а вайна — цудоўная рэч.

*11 ліпеня.* Ізноў цягаў патаку. Нестае тары. Дастаў крухмалу й газы.

*12 ліпеня.* Вярнуўся Рыгор. Глядзіць, а хаты няма. Вось тут, здаецца, стаяла, а няма. Крыху пасьмяяліся. Праўда, Рыгор мала сьмяяўся, больш я рагатаў. Яму, відаць, не да жартаў было. Але такога чалавека, як Рыгор, ня надта з капытоў саб'еш.

— Дармо, — кажа, — разьбілі адну, другую паставім. Нас гэтым не запалохаеш.

І паставіць. Можаце не сумнявацца. Тым больш — лясны склад недалёчка, і гаспадара няма.

*13 ліпеня.* Сяньня сустрэў былога прафэсара. Ідзе былою вуліцаю, задуменны.

— Дзень добры, — кажу, — пане прафэсару! Як маецеся, пане прафэсару?

— А? Што? Ах, выбачайце, — схамянуўся ён, — я й не заўважыў... задумаўся...

— Пра што цяпер думаць, пане прафэсару? Хай лепш конь думае, ці дадуць яму сяньня аўса. Хэ-хэ-хэ.

— Вы ўсё жартуеце, а я паважнай справай заняты. Вось ужо трэці дзень падлічваю, колькі вайна каштуе.

— А хіба можна падлічыць, колькі вайна каштуе?

— А чаму ж не! Для навукі нічога немагчымага няма. Прыкладам, колькі куля каштуе — ведама, колькі жаўнераў ваюе — збольшага можна ведаць, колькі кажны куляў выпушчае штодня — таксама можна збольшага ведаць. А тут на дапамогу сярэдняе арытмэтычнае, тэорыя верагоднасьці... Вось і выходзіць — штодня дваццаць мільярдаў. Ну, ведама, недакладна. Мільён больш — мільён менш, гэта для навукі ня мае значэньня.

— Дваццаць мільярдаў, — зьдзівіўся я. — А даруйце, пане прафэсару, навошта вам гэта ведаць? Вам жа працэнтаў з гэтых мільярдаў, напэўна, не дадуць.

— Як навошта? Для навукі. Навука, даражэнькі, усім цікавіцца. Ну, бывайце! Пабягу. Там дзесьці на Пушкінскай бібліятэку выкінулі, можа, што прыдасца.

Націснуў брыль на вочы і засігаў. «Вось дзівак, — думаў я, — мільярды лічыць, а ў самога гузікаў у паліце няма. «Мільён больш — мільён менш, гэта для навукі ня мае значэньня». Нябось, каб гэты лішні мільён ды яму ў кішэню, дык не сказаў бы, што ня мае значэньня. Дзівак. Увечары сьмяяўся пра гэта Сымону (мой сусед з правага боку). Той хоць і мала адукаваны, але галаву мае добрую.

— Прафэсары, — кажа, — усе дзівакі. Знаў я аднаго такога, які пры акадэміі вартаваў. Той усё на нейкі Марс зьбіраўся ляцець. «Не даляціш, — кажу яму, — Сямён Іванавіч, да неба далёка». А ён сваё: «Не я, дык другі, а ляцець будзем». І паляцеў. Загналі яго бальшавікі аж на ўскрай сьвету, на нейкую Калыму. Вось табе й Марс! А я, дзякаваць Богу, нікуды ня лётаў, дык вось жыву, і ў сваёй хаце.

Ведама, Сымон разважае прымітыўна, але й ён мае рацыю.

*14 ліпеня.* Сёньня бачыў сон. Быццам ізноў вайна. Навокал пажары, самалёты, бомбы, як гарох, сыплюцца, а я валаку скрыню махоркі. Раптам перада мной бомба — трэсь... І расчынілася напал, а зь яе выскачыў якісь гіцаль — і да мяне: «Кідай скрыню — мая махорка!» «Брэшаш, — кажу, — мая!». Ну, слова за слова. Я паставіў скрыню ды размахнуўся. Ён — таксама. Тут і пачалася дыскусія. Прачнуўся, аж мяне жонка пад бакі таўчэ: «Ты што? Звар'яцеў? Ноч, добрыя людзі сьпяць, а ён — біцца!» «Маўчы, — кажу, — дурная. Гэта я нейкага рабаўніка біў, у цябе рыкашэтам папала». А тым часам жонцы сінца пад вокам набіў.

*15 ліпеня.* Заняў кватэру як пагарэлец. Кватэра нішто сабе: ёсьць два паліто, тры шуфляды зь бялізнаю, жаночае паліто, ну, дый іншае лахардзе, а таксама й мэбля. Перавалок у сваю хату, якая й ня думала гарэць. А Рыгор, дык той заняў аж дзьве кватэры: адну на жонку, другую на сябе. Вось ашуканец!

*16 ліпеня.* Быў на біржы, гэтай, што на Камсамольскай. Ну й прадстаўленьне! Не раўнуючы, у цырку. Людзей натоўпілася самых разнастайных. Ёсьць і надта дзіўныя. Дзе яны толькі дагэтуль зашываліся? Капелюшастыя, у сурдутах, ёсьць нават і пры мэдалях. Адзін, відаць, мікалаеўскі палкоўнік, дык той начапіў на грудзі сем мэдалёў і тры крыжы. Я сумысьля палічыў. Дыбае, як індык, і ні на каго не глядзіць. А каб ён у гэткі фасон

ды месяц перад гэтым выфранціўся, вось бы прычапіла яму энкавэдэ мэдалю — да скону памятаў бы!

Наагул народ самы, як кажуць, адборны: кульгавыя, падсьлепаватыя, абамшэлыя — гэта ўсё, відаць, аскалёпкі разьбітага ўшчэнт. Праўда, ёсьць і людзі новай фармацыі: маладыя, задзёрыстыя, трымаюцца як гаспадары, і гамонка ў іх нейкая невыразная, але такіх няшмат — лічаныя.

Пакуль я так дзівіўся на старых людзей новага сьвету, гляджу — ажна тут трэцца мой добры знаёмы, Ванаў. Быў ён за дырэктара, парцейны, хадзіў заўсягды ў «кіраўнічым гарнітуры» (сінія порткі-галіфэ й зялёны фрэнч), а тут у пінжаку, пры гальштуку, пад капелюшом.

— Зь якой гэта, — пытаюся, — аказіі пераапрануўся? На маскарад ці што?

— Ды так, — кажа, — надвор'е зьмянілася, пацяплела крыху.

— Так, так, — кажу, — гэта зьмена надвор'я шмат каго перафарбавала.

— Вы што гэта, часам не на мяне ківаеце? То гэта дарэмна, бо я заўсягды быў патрэбнага колеру.

— Ну але ж, і я пра гэта, і ваша вонкавае афармленьне...

— Ну гэта, — перапыніў мяне Ванаў, — глупства, узьлёт фантазіі, а нутраны колер у мяне станоўкі: я заўсёды быў супраць.

Ведаю я гэтую станоўкасьць, але мне што? Даносіць на яго я ня буду, хай сігае пад капелюшом.

Тут жа пабачыў і другога актывістага. Той таксама пераапрануўся ў нейкі стары сурдут, а заміж капелюша насунуў якуюсьці накрыўку: ні то камілаўку, ні то брыль.

Падзяліўся сваімі ўражаньнямі з Рыгорам і Сымонам.

— Парцейныя, — казаў Сымон, — ну, гэтыя ўсе такія — ён хоць штодня пераапранацца будзе, абы яму скварку даваў. Быў у нас пры акадэміі якісьці Мікалаеў. Дык вось, заклікалі яго неяк у гапаву дый кажуць: «Выдавай, — кажуць, — усю сваю контру, хто супроць...». Ну, ён і нагаварыў: пяцёх сваіх лепшых прыяцеляў пасадзіў. А сам у іх чарку піў і часьцяком іхных баб гладзіў. Такі, браток, ня тое што вопратку — бацьку роднага зьменіць. Знаю іх добра.

Я з Сымонам ня згодзен, але Рыгор тое ж думкі: «Той, што пнецца ўгару, той ня здольны на нізе», — кажа.

*17 ліпеня.* Намацаў соль. Хоць у мяне й ёсьць невялікі запас, але ў вайну, кажуць, перасолу не бывае. Прывалок два мяшкі —

каштавала паўпляшкі «маскоўскай». Крыху дарагавата, але нічога ня зробіш.

*18 ліпеня.* Сымон набыў адначасна каня й панарад. Якім парадкам — ня ведаю, кажа, што безгаспадарныя, на пагарэльлі блукалі. Ну, добра, скажам, блукаў конь, а як мог панарад блукаць? Але мне што? Хай сабе й блукаў. А Сымон, можа, калі й палку дроў прывязе.

*19 ліпеня.* Закінеш назад — наперадзе знойдзеш. Даведаўся, што з малясу выходзіць першагатункавы самагон. Вось шчасьце падваліла! Шкада — мала назапасіў. Каб жа гэта ведаць! Адмераў два вядры Віцьку Фамёнку. Той наладзіў сталую самакурную фабрыку, але сырцу няма. Кажа, што зь вядра выходзіць дзесяць пляшак. Пагледзімо!

*20 ліпеня.* Зноў быў на біржы. Народ крыху зьмяніўся. Падваліла былых савецкіх. Пачалося выразнае ажыўленьне. Некаторыя цэляцца на працу, але мала, бальшыня стаіць нэўтральнай сьцяной: усе чакаюць, пакуль зусім праясьніцца. Больш цікавяцца ваеннымі падзеямі: хто каго сьцігуе.

Сымон з гэтага поваду казаў, што людзі, відаць, яшчэ не галодныя.

— Нідзе яны ня дзенуцца, — кажа, — як у жываце завурчыць, дык і на працу закарціць. Пойдуць. Знаў я аднаго чалавечка, як я пры анатомцы трупаў варыў. Кволы такі, спакойны. Паглядзіць, бывала, як я трупаў у катле мяшаю, дый кажа: «Цяжкая твая праца, Сымон. Я, прыкладам, з голаду памёр бы, а цяжкой працы не рабіў бы. Не магу». А як загналі яго, небараку, за Котлас ды ўпрэглі ў пілу, то праз цэлую зіму лес пілаваў. Голад усяго навучыць!

*21 ліпеня.* Прывезьлі з Сымонам па два вазы дроў. Вартаўнік ля складу ё, але дровы вазіць можна. Вартаўнік нават спрыяе: «Вазі, хлопцы, зіма будзе». Навошта тады варта, калі яна не вартуе. Сымон з гэтага казаў, што ў жыцьці такія праявы часьцяком здараюцца, калі чалавек працуе, але нічога ня робіць.

— Быў і ў нас пры акадэміі фрухт такі, нейкім прадстаўніком лічыўся. Што ён рабіў — ніхто ня ведаў, але грошы браў нядрэнныя. Агледзеліся праз пяць гадоў, што ён нічога ня робіць, ды нават і пасады такой няма. Але звольніць не маглі, бо ўжо стаж вялікі меў. Так і заставаўся на працы ды нічога не рабіў. Каб акадэмія не расьцярушылася, то й да гэтае пары працаваў бы. Так вось і гэты вартаўнік.

*22 ліпеня.* Пацешныя бываюць людзі. Сустрэў сяньня Ваську Байцова. Толькі што вярнуўся з уцёку. Ну, натуральна, ні хаты,

ні ў хаце. Голы, як бізун. Кінуўся туды, кінуўся сюды — пуста: скрозь ужо разьмеркавалі. Як у тэй песьні пяецца, «усё разьмяло магутнай навальніцай».

— Як жыць, — пытаецца, — дзе дастаць спажыву?

— А чаго цябе, — кажу, — нялёгкая насіла да гэтай пары? Ты ж бы раней прыйшоў, калі спажыва да падноскаў ліпла?

— Уцякаў, — кажа, — прабіваўся да сваіх. Я ўсё ж патрыёта сваёй радзімы.

Ці не дзівак? Калі ты такі патрыёта, то ўзяў бы гармату ды пуляў зь яе, а не ўцякаў. Можа, я таксама патрыёта, ды яшчэ мацнейшы за яго, але ж на ражон ня пру, бо трэба ўмець арыентавацца й за пагодай даць нырца, а як хвалі сыдуць ды адстаіцца — ізноў выплывай.

*23 ліпеня.* Сяньня жонка павесіла на куце абраз (здаецца, у музэі дастала), а былых жа правадыроў хацела спаліць, а я запярэчыў. Паўстаў невялікі канфлікт, але да бойкі не дайшло. Перамог, ведама, я. Правадыроў завалок на гару й там замаскаваў. Хай ляжаць, яны есьці ня просяць, а мо' калі й спатрэбяцца. Вось жа, скажам, маляс — ня ведаў, калі цягаў, а цяпер вунь як прыдаўся!

*24 ліпеня.* Нешта на мяне Мар'я Іванаўна лагодна пазірае. Сустрэліся сяньня, так ветліва размаўляе, руку цісьне: «Заходзьце, — кажа, — калі-небудзь, мне аднэй сумна». Гм... Чаму не зайсьціся? На свайго лейтэнанта, відаць, надзею пакрысе губляе. А кабетка нішто сабе... Правільная... І вага нядрэнная... Наведаю, абы жонка не пранюхала.

*25 ліпеня.* Цяперашняму сьвету нельга верыць ні на грош. Ну, хоць бы, скажам, Віцька — свой чалавек, нават прыяцель, а як ашукаў! Прынёс сяньня самагону... пяць пляшак.

— Атрымай, — кажа, — прадукцыю.

— Гэта што, — пытаюся, — усё? Ты ж абяцаў дваццаць пляшак!

— Аварыя, — кажа, — здарылася, прадукцыя падгарэла.

— Дзівіцеся! Мой самагон падгарэў, а ён ледзь на нагах трымаецца! Дзе ж, — крычу, — справядлівасьць? Гэта ж ашуканства!

— Ніякае не ашуканства, — кажа, — а стыхійнае няшчасьце... мабыць, дроў перадаў.

Вось і вер людзям пасьля гэткага!

*26 ліпеня.* Рыгор шукае працы. «Нешта, — кажа, — марудна будаўніцтва йдзе». Раіўся са мной і з Сымонам, куды лепш падацца: па разьмеркаваньню пайсьці або ў жыльлёвы аддзел.

Я раіў у жыльлёвы аддзел. «Усё ж, — кажу, — справы жыльлёвыя бліжэй да будаўніцтва: там юшку выдзераш, там цьвікоў намацаеш, а там і ручку ад дзьвярэй выкруціш». Але Сымон іншай думкі.

— Усё гэта, — кажа, — драбніца. Вось паслухайце, што я скажу. Як працаваў я ў трэсьце, быў там адзін замусола. Агентам лічыўся. Чалавек зусім нікудышны. Ледзь ногі цягаў. Нарэшце кідае ён усё ды йдзе ў будку ваду прадаваць. І што б вы думалі? Не пацадзіў ён і паўгода гэтай вады з сыропам, як ужо трэці дом на Лагойскім тракце паставіў. Ды які! На дванаццаць тысячаў. Вось табе й сыроп! У гэтай працы — гандлёвай — магнэса такая ёсьць: ты грошы хоць адпіхай ад сябе, а яны ўсё ж да цябе плывуць.

Апошні довад даканаў Рыгора. Мабыць, пойдзе па разьмеркаваньню.

*27 ліпеня.* Сяньня чыталі газэту. Цікава было. Сабраліся мы гэта ўсёй вуліцай, прыдыбаў і прафэсар, Наязноў Васіль Мікалаевіч. Ну, цешымся мы: паслухаем, што на сьвеце дзеецца. Я вазьмі ды падсунь газэціну прафэсару:

— Прачытайце, — прашу, — калі ласка, Вы, паважаны прафэсару. Вы ўсё ж больш пісьменны за ўсіх нас.

Усадзіў гэта ён на нос акуляры, нацэліўся на газэціну й толькі прачытаў «Менская газэта», як аж пазелянеў:

— Вы што гэта мне, найшаноўныя, падсунулі? — і аж закалаціўся. — Выбачайце, я па-такоўскаму не чытаю й чытаць не жадаю. Абраза! — Тут жа ўзьняўся й пашкандыбаў ад нас. Вось было сьмеху! Давялося газэціну сьлібізаваць Сымону. Той, хоць і не прафэсар, але па складох чытае.

Прагледзелі мы ваенныя зьвесткі. Ну, там усё як сьлед: адны ўцякаюць, другія сьцігаюць. Прачыталі нават усе аб'явы. Асабліва зацікавіла ўсіх аб'ява пра новыя грошы. Зразумела, кожнаму хочацца ведаць, якія грошы прытрымліваць, а якія хутчэй спушчаць. Што да аб'явы аб крымінальных, каб іх выдаваць, то мы тут зьбянтэжыліся: каго ж выдаваць? Бо як ты цяперашнім сьветам адрозьніш, хто крымінальны, а хто не? Сымон казаў, каб пачаў валіць усіх-усіх адразу, то памыліўся б мала. Ну, ведама, із Сымонам ніхто ня згодны, бо хто ж сам сабе вораг?

Прачытаўшы газэту, доўга яшчэ сьмяяліся з прафэсара, асабліва рагатаў Сымон:

— Вось узяло яго за самае нутро. Але гэта яшчэ глупства. У 18-м годзе са мной здарылася ня гэткая рэч. Тады была «Вольная Беларусь». Ну, я й прадаваў яе. А быў у нас на пошце чыноўнік, такі ўжо люты да газэты — штодня браў. Вось я разгар-

нуў і падсунуў яму гэту газэту. «Самая сьвежая, — крычу, — самая праўдзівая!» Грошы ўзяў дый далей. Дык што б вы думалі? Тры месяцы за мной ганяўся гэты чыноўнік. Як толькі згледзіць, дык за мной з палкаю. «Я табе пакажу, — крычыць, — як людзей ашукваць, хамства падсоўваць». Я яго за вярсту абягаў. Але што вы скажаце? У 35-м годзе гэтага чыноўніка ГПУ бярэ ў канвэрт і высылае на дзесяць гадоў як беларускага нацдэма. І як ён ні бараніўся, як ён, бядак, ні даводзіў, што ён ёсьцьісьцінны расеец, — не паверылі. Можа, памылкова яго выслалі, але ўсё ж чалавек сваё знайшоў. Так вось будзе й тут. Свайго лёсу, браток, не міне ніхто.

Сымон, вядома, перасольвае, але зрэшты, хто яго ведае, што будзе... Хто, прыкладам, спадзяваўся, што на шостым дні вайны немцы ў Менску будуць, аджа здарылася. Трэба на ўсякі выпадак навязаць сувязь з беларусамі.

*29 ліпеня.* Віцьку даў адстаўку. Знайшоў новага самагоннага фабрыканта. Добрага майстра відаць адразу.

— Ты, — кажа, — ля апарату ў мяне можаш не стаяць. Сваю порцыю ты атрымаеш апрача тае, што я вып'ю. Трымай дзьве пляшкі авансу!

І даў. Вось гэта майстра, а ня пэцкаль які. А я тым часам і пахмяліўся.

*30 ліпеня.* У Апанаса Дзюркі скралі сьвінчо. Дзюрка страшэнна абурыўся й спачатку кінуўся да службы парадку, але там адмовілі: «Каб ты, — кажуць, — прывёў злодзея да нас, то мы б яго тут адразу пад пазногаць і адпаліравалі як сьлед, а так, сам бачыш, горад вялікі, злодзеяў многа, каго хапаць?»

Апанасу ня так абыходзіць сьвінчо, як хоча ведаць, хто мог зрабіць такое сьвінства.

— Каб толькі даведацца, — кажа, — хто гэта зрабіў, то я сам бы ўжо паказаў і службу й парадак. Век памятаў бы.

Рыгор раіць зьвярнуцца да варажбіткі.

— Ёсьць такая, — кажа, — на пагарэлай вуліцы, хераматкай завецца. Як паглядзіць табе на руку — усё як на далані вылажа. Як быццам сама бачыла. Я, калі мяне з трэсту звольнілі, таксама падаваўся да яе. «Скажы, — пытаюся, — хто на маёй дарозе стаіць, хто мой злосьнік?» Паглядзела яна на руку дый кажа: «Вось бачыш, тут твая службовая лінія, завілістая такая. А вось тут упоперак яе стаіць руды мужчына, без барады. Гэта й ёсьць твой злосны вораг».

І што ж вы думаеце? Як пальцам уцэліла ў ворага: быў такі ў трэсьце — руды й без барады ды зь якім я два разы лаяўся.

Апанас пайшоў да варажбіткі.

*31 ліпеня.* Адна бяда ня ходзіць. Сяньня правяраў муку, тую, што закапаў у яму. Тры мяхі струхнелі, а два зусім ушчэнт падмачыла. Сымон суцяшае, што нічагуткі — самагонны фабрыкант дасьць ёй рады. Але ж страты! Тады на малясе Віцька нагрэў. Цяпер — мука! Калі так далей пойдзе, то неўзабаве і ў комін выляціш.

*1 жніўня.* Быў у Мар'і Іванаўны. Зноў скардзілася на сваю самотнасьць. Успамінала лейтэнанта й частавала гарбатай, але бяз цукру.

— Вярнулася я, — кажа, — пазнавата, калі ўжо галоўнае разьмеркавалі. Ну вось і засталася так: безь нічога й безь нікога, — і ўздыхнула.

Ну, ведама, брэша: сёе-тое й яна пад сябе падскрэбла, але, відаць, неспажыўное.

Пагутарылі крыху, папаласкалі рот гарбатай і разышліся ні з чым. Мне штосьці не падабаецца такая адцяжка. Няйначай трэба падысьці зь іншага боку. Паабяцаў прынесьці цукру й масла, можа, справа пойдзе сьлізчэй.

*2 жніўня.* Пільнасьць і асьцярожнасьць! Вось два нашыя галоўныя прыяцелі. Падвоіць пільнасьць, патроіць асьцярожнасьць! Бо сяньня пачуў вельмі прыкрую рэч. Раскулачылі Антку Загржэмбіцкага. Ды як раскулачылі! Да ніткі! Ня толькі ваенны здабытак, а й сваё крэўнае падгарнулі. А хто ўтапіў? Уласная жонка. Вярнулася гэта яна з уцёкаў, а ў сужэнца ўжо красуня сядзіць, і дабра поўная хата. Ну, баба, натуральна, на дыбкі, а з дурной галавы ўзяла ды бухнула куды ня сьлед: так вось і гэтак, у такога вось ды гэтакага дабра поўная хата, нарабаванага. Прыехалі, ведама, пацікавіцца дый вывезьлі аж дзьве машыны. Ды якога дабра! Сэрца млела, як людзі глядзелі. А цяпер абое Загржэмбіцкія сядзяць ды плачуць. А красуня, ведама, уцякла.

Рыгор кажа, што гэтаму Загржэмбіцкаму так і трэба: надта ж многа нагроб лішняга. А я так мяркую, што чалавеку ніколі залішне не бывае. А што нагроб — дык навошта ж тады й рукі чалавеку? Хіба толькі для таго, каб вітацца? Не, я на справу гляджу інакш: гарні пад сябе кажны, бо толькі курыца ад сябе горне, дык на тое ж яна курыца, а не арол.

Але тым часам натую: пільнасьць і асьцярожнасьць, бо і ў мяне жонка ёсьць і красуня прадугледжана.

*3 жніўня.* Сустрэў Байцова. Гляджу й не пазнаю: ні то ён, ні то новы эўрапэец. І гарнітур, і паліто, і чаравікі — усё ад Люкса.

— Што гэта, — пытаюся, — з табою здарылася? Ці ня ў Гамбург ты часам зазірнуў?

— Навошта мне, — кажа, — туды ехаць, калі тут свой Гамбург: што хачу, тое й маю.

— Чараўнік ты, — пытаюся, — ці што?

— Не, я не чараўнік, а праца ў мяне, браток, такая, быццам чароўная: і абутак, і адзетак, і напітак, і наедак — усё, як на далоні.

Во як людзі ўмайстроўваюцца. А яшчэ нядаўна шукаў якой-колечы спажывы. А тут раптам усё. Трэба гэта на ўсякі выпадак занатаваць, бо такі чалавек заўжды прыдасца. Абяцаў дастаць новую швейную машыну. Праўда, у жонкі яшчэ машына спраўная, але ўжо трохі размалолася.

*4 жніўня.* Палітыка мяне ня надта цікавіць, але ўсё ж такі нейкую лінію трэба мець. Сяньня адзін тып мяне проста да сьцяны прыпёр. Давай яму сваё крэда. Трэмся гэта мы на біржы, рэгіструемся (я за разумовага рэгістраваўся), гляджу — ажна тут і Паліханаў у хвасьце матаецца (ён калісь за інжынера працаваў). Ну, прывіталіся, сёе-тое, а пасьля ён мне й шэпча:

— Чуў? Нашыя б'юць, а іхныя бягуць.

Дайце рады! Хто гэта нашыя, а хто іхныя? Таму я ў адказ мармытнуў нешта невыразнае. Але Паліханаў прыстаў, як ліст.

— Ды ты, — пытаецца, — куды арыентуесься, на Ўсход ці на Захад?

А куды мне арыентавацца? Ведама, мяне больш цягнула б на Ўсход, але, ізноў жа, цяпер і там не мяды, а ў выпадку чаго, дык зусім проста, што й спытаюцца: а ну, Іван Іванавіч, раскажэце нам, будзьце ласкавы, як гэта вы чужой зямлі ня бралі дый пядзю свае зямлі не аддавалі? А што на гэта скажаш пры маёй сытуацыі, калі я ад фронту такога драпака даваў, што ня пядзі, а цэлыя кілямэтры з-пад абцасаў сыпаліся.

— Ды я пакуль больш на кілішак арыентуюся, — адказваю я Паліханаву, — а пра іншае яшчэ ня думаў.

— Ну, то заходзь да мяне, у мяне рознай ёсьць: і шнапс, і «маскоўская». Заходзь, вып'ем, паталкуем.

Гм... зайсьці, вядома, можна. Чаму ж не паталкаваць? Але што калі ён зноў насядзе на арыентацыю? А Паліханаў, трэба сказаць, чалавек ненадзейны: ён здольны на ўсе бакі арыентавацца.

Увечары пытаўся пра гэта ў Сымона: «Ты, — кажу, — у палітыцы куды арыентуесься: на Ўсход ці на Захад?»

— Я, — кажа, — ні туды ні сюды, я — тутэйшы. Дый навошта мне кіравацца? Хай на мяне кіруюцца, каму трэба, а я ў сваёй хаце й на сваёй зямлі. Дзякаваць Богу, ніколі нікуды ня езьдзіў, і мне нікога ня трэба.

— Але ўсё ж, — кажу, — нейкую палітычную лінію ты мусіш мець, бо цяпер кажны якую-небудзь лінію гне.

— А я, — кажа Сымон, — ніякай лініі ня гбаю. Ведаю я гэтыя лініі. Пачні гбаць, то будзе якраз тое, што зь серабранскім Хвэськам было. Той гэтую лінію ад сямнаццатага году пачаў гбаць. Ну, гбаў яе, гбаў, аж да трыццатага году, а тут яго ГПУ як хапанула, дый самога ў дугу сагбала. Кажуць, дзесь на Сібіру зусім загнуўся. Вось табе й лінія. А мне, браток, абы ціха. Жонка ё, хата ё, дзеці будуць. Вось і ўвесь мой кірунак.

Бясспрэчна, Сымон чалавек зусім апалітычны. Мне, як культурнаму, так разважаць не выпадае... Але зноў жа й з палітыкаю адны турботы. Вось тут і круціся, пакуль трапіш на сваю лінію. Паспрабую тым часам арыентавацца на абодва бакі, але так, каб было ледзь значна.

*5 жніўня.* Ізноў чытаю газэту. Сымону асабліва спадабалася паведамленьне пад назовам «Бамбавозы Герынга над горадам Сталіна».

— Аддаў бы, — кажа, — і каня й панарад, абы толькі паглядзець, як нашыя былыя правадыры ды з Крамля драпануць. То было б пацехі. Ня дзіва, калі й нагавіцы памяняюць. Ведаю я гэтыя бамбавозы з практыкі.

Яська Разак выказаў думку, што нядрэнна было б цяпер апынуцца ў Маскве:

— Во дзе дабра падгарнуў бы, — кажа, — тым болей што ўжо й практыка.

Думка Разакова, відаць, шмат каму прыйшлася да густу, бо ўсе неяк разам прыціхлі ў чароўных мроях, некаторыя ўздыхнулі, а Рыгор, дык той нават аблізнуўся.

Аб'явы ў газэце выклікалі сьмеху. Пішуць, каб паадносілі прадпрыемствам рэчы, якія парасьцягнулі падчас вайны. Ну хіба ж вернуць? Ды ніколі! Сымон, дык той адразу сказаў:

— Дарэмныя турботы. Не аднясуць. Дзе вы бачылі, каб чалавек чужое зьвярнуў? Будзе якраз тое, што ў нас у камбінаце было. Зрабілі гэта ў нас нейкую касу, казалі, што ўзаемадапамогі. Ну, як звычайна было. Спачатку гэта пакрычэлі на сходзе, паагітавалі, а нарэшце й кажуць: «А цяпер, грамадзяне, давайце добраахвотныя ўзносы ў абавязковым парадку».

Што будзеш рабіць? Мы, ведама, склалі гэтую складчыну, па рублі, па другім, адзін месяц, другі. А калі ўжо ў скарбонцы грошай троха наскрэблася, мы й шуганулі па дапамогу: хто на дзіцё просіць, хто на хворую жонку, што здаровая, як сьвежы сыр, а хто на цешчу вымагае, якую хаваць трэба, а яна тым часам паміраць ня хоча. Зразумела, кажны браў матыву самую далікатную й важкую. Толькі гэта мы да касы, ажна — тпру, грошай няма. Дзе, пытаемся, нашыя рублі? А той член, што скарбонку гэтую трымаў (ні то прафсаюзны, ні то парцейны, цяпер ня памятаю), такі быў хвацкі — зь пяску мог вяроўку зьвіць ды ёю ж цябе й задушыць. Дык вось ён і кажа:

— Грошай няма й ня будзе. Я іх усіх рашыў дашчэнту.

І што ж вы думаеце? Колькі яго ні прасілі, колькі ні сарамацілі, нават пагражалі — нічога.

— Што ў мяне, — крычыць, — варштат, каб грошы рабіць? Няма дый годзе. Адкасьніцеся!

Так і адкаснуліся. І скончылася нашая ўзаемадапамога — сабедапамогай. Так вось будзе й тут. Бо хто, прыкладам, аднясе малочнаму заводу, скажам, бідон, калі чалавек ужо ў бідон алею нацадзіў ці шпэку націскаў? Ніхто не панясе. Я народ ведаю.

Із Сымонам нельга не згадзіцца.

*6 жніўня.* Бачыў нейкі дзіўны сон. Нібы я ў Маскве. Толькі, здаецца, скончыўся налёт, а я чамусьці ў ювэлірнай краме стаю. І вось, быццам, кладу я гэта ўва ўсе кішэні гадзіньнікі, пярсьцёнкі, ды ўсё залатыя, з дыямэнтамі. Золата й яшчэ золата. Толькі гэта я набраў поўныя кішэні й наважыў выйсьці, як пачуў нейкі гул, нібы гром. Я ў дзьверы, а перад самай крамай велічэзны натоўп. Сьцягі навокал, музыка, тысячы людзей. Я ўжо быў нацэліўся пад прылавак сігануць, ажна чую, мяне нехта бярэ пад рукі й выводзіць з крамы. Напалохаўся я страшэнна, ажна нядобрае зрабілася (пра гэта я пазьней даведаўся, як прачнуўся). І вось з натоўпу выходзяць трое, набліжаюцца да мяне, схіляюцца нізка-нізка дый кажуць:

— Ты, Іван Іванавіч, — цар Чужанінаў. Садзіся, цару, у Крамлі, кіруй намі, кіруй замест Сталіна! Просім цябе. Просім! Ура! Аркестра! Музыкі, грай камарынскую!

Толькі гэта я расчыніў рот, каб згадзіцца, ажна раптам нешта як грымне! Я прачнуўся (відаць, жонка няўдала павярнулася). Расказаў пра гэты сон Рыгору й Сымону. Рыгор кажа, гэты сон глупства.

— Каб ты, —кажа, — ня золата бачыў, а наадварот, то гэта было б к прыбытку, а так — дрэнь.

Сымон, наадварот, даводзіць, што сон нешта значыць:

— Што, — кажа, — азначае — добрае ці дрэннае — ня ведаю, але нешта азначае.

Ці не схадзіць толькі да варажбіткі? Надта ўжо дзіўны сон. Раіўся пра гэта з тым прафэсарам, што падлічваў, колькі вайна каштуе. Але гэты дзівак сказаў, што хоць навука разьвязала ўжо ўсе пытаньні, але, што такое сон, яшчэ ня ведае, а таму ён і ня можа параіць, ісьці да варажбіткі ці не. Давядзецца, мабыць, схадзіць.

*7 жніўня.* Рыгор нечакана зрабіў выбрык. Не пайшоў ні па разьмеркаваньні, ні па жыльлёвых справах, а падаўся на нейкі склад. Там ён нешта прымае й штосьці выдае. Праца, відаць, плённая, бо дом пачаў расьці, як грыб пасьля дажджу. Хутка будзем спраўляць улазіны. Сымон з гэтага поваду жартуе, што тэмпы ў Рыгоравым прыватным будаўніцтве лепшыя за бальшавіцкія стаханаўскія.

— Відаць, — кажа ён, — што Рыгор на гэтым складзе больш прымае, чымся выдае, бо відавочна, намнажаюцца нейкія рэштткі, што ня месьцяцца на складзе.

Рыгору гэтыя жарты не падабаюцца, а жонка Рыгорава, дык тая проста казала, што Сымон зайздросьціць. Так, відаць, Рыгору можна пазайздросьціць, калі чалавек ня будзе дурным ды не прасыпецца.

*8 жніўня.* Варажбітка наваражыла Апанасу, што сьвіньню скраў свой блізкі. Дзюрка цяпер ходзіць па ўсіх суседзях ды ўсё прынюхваецца, ці ня пахне адкуль сьвежанінай. Дзівак! Ведама, што скраў свой, але хіба ж ён дурны, каб табе сьвежанінным пахам у нос пушчаць? Ён, браток, на Пярэсьпе зварыць, а на Камароўцы зьесьць. Зладві тады пах, калі ты такі майстра. Але што казаць? Дзюрка й ёсьць дзюрка.

*9 жніўня.* Мар'і Іванаўне занёс паўкілі цукру й пляшку алею. Трохі паморшчылася, але ўзяла. Расказала пра тры ведамыя ёй выпадкі, што мужы пакінулі сваіх жонак і перабраліся з усім сваім скарбам да іншых.

Ці не пад мяне яна пад'яжджае? Калі так, то гэта, даражэнькая, дарэмныя турботы. Мая Ніна Паўлаўна да гэткае катастрофы не дапусьціць, каб аддаць сваё дабро перавалачы ў чужую хату, яна дабра з-пад сябе ня выпусьціць, хоць з гарматы страляй. Дый мне такая камбінацыя не да густу. Я мяркую на два франты дзеяць, па ўсіх лініях...

*10 жніўня.* Байцоў прынёс швачную машынку. Частаваліся. Ён хоць і хваліўся, што ўсякія мадэры мае, а тым часам маля-

соўку смактаў ня горш за Яську. Выцадзілі два літры. Ён ужо ледзь пальцамі варушыў, а ўсё яшчэ ківаў на пляшку:

— Нацадзі яшчэ... па малой...

Добра, што жонка скеміла вады ў пляшку наліць, інакш ня ведаю, чым бы гэта частаваньне скончылася.

*11 жніўня.* Здарылася канфузьлівая рэч. Учора пайшоў праводзіць Байцова (у яго ўжо ногі не цыркулявалі) ды па дарозе назад трапіў нейкім парадкам не да хаты, а да Мар'і Іванаўны. Прачнуўся сяньня не ў сваёй хаце ды лыпаю вачыма, як дурны: дзе ж гэта я? Чую, за пераборкай голас Мар'і Іванаўны — з прыяцелькай сакочуць. Відаць, знарок паклікала — на сьведку. Ну й бабы! Да чаго ж шкоднае стварэньне! Хацеў гэта я, затоіўшыся, ляжаць хоць да вечара, — можа, пашэнціць, думаю, цішком высьлізнуць праз вакно, аж не — не дала, сьцерва.

— Іван Іванавіч, — крычыць, — чай гарачы. Хуценька піць!

Каб ты смалы гарачай напілася. Прыяцелька сяньня ж усім раззвоніць, а там і да жонкі дойдзе. Галоўнае, нічога ня памятаю: было што ці не. Каб было, то яшчэ не такая крыўда. А калі на халастую праспаў? Сорам! Канфузія!

Але нічога ня зробіш, мусіў выйсьці. Як прывітаўся, як піў чай, — лепш не ўспамінаць. Да хаты йшоў як мыла зьеўшы. Жонцы сказаў, што начаваў у Байцова, бо ўжо позна было.

Трэба Байцова папярэдзіць. А ўсё ж гарэлка — паганая рэч. Мабыць, трэба кінуць.

*12 жніўня.* У прафэсара Вадзянецкага пазнаёміўся з беларусамі. Хлопцы як хлопцы — нічога страшнага. І гарэлку куляюць нядрэнна. Але адзін зь іх, зь нейкім дзіўным прозьвішчам, Янка Шчыры, надта ўжо заўзяты. Як выпілі па чарцы, то й пачаў крычэць:

— Мы зробім, мы возьмем! Мы ад Пскова да Чарнігава, мы ад Беластоку да Мажайску.

Крычыць і рукамі махае. Як дайшла справа да Мажайску, я не сьцярпеў:

— Дазвольце, найшаноўны, спытаць, а хто гэта вам дасьць так шырака размахнуцца?

— Як, хто? Самі! Уласнымі рукамі!

— А калі дадуць па руках?

— Хто пасьмее? За наша крэўнае!

— Ага, так. Ну, то... (у гэтым месцы дзёньніка, паводле нейкіх меркаваньняў, Чужанінаў выкрасьліў пяць радкоў — *Л. К.*).

Умяшаўся ў гутарку й другі хлапец — Арыентацкі.

— Бачыце, — кажа ён, — вы абодва памыляецеся. Але ж даруйце, я маю рацыю. Бо калі ўзяць межы ў гістарычным акрэсьленьні, то ёсьць шмат спрэчнага, і тыя вучоныя, з працы якіх я карыстаю, таксама не пагаджаліся ў пытаньні станаўленьня сілы як адзінага вырашэньня межавых спрэчак.

— Даруйце, шаноўны, і Вы, — кажу я, — сіла ўсё робіць. А сіла там, дзе бальшыня, знацца, і бальшыня там, дзе сіла. Вось гэта й будзе справядліва й па закону.

Тут Янка Шчыры ажно падскочыў.

— Вы, — крычыць, — вялікадзяржаўнік, вы маскоўскі імпэрыялісты, вы драпежнік! Усіх скруцім у казіны рог!

Яго падтрымаў трэці хлапец, які дасюль маўчаў, Авечка Ахрэм.

— Так, — кажа, — мы гэта зробім, абы толькі дазволілі. А як будзе дазвол, то ўжо й пачнем скручваць. Абавязкова. І межы таксама, калі дадуць, то возьмем, а не дадуць, то не. А скручваць будзем.

Я ўжо й ня рады быў, што сашчапіўся зь імі. Чаго добрага й мяне пачнуць скручваць. Добра, што пакуль прышпілілі толькі маскоўскі імпэрыялізм, а маглі б і чырвоны прышпіліць. А тады ўжо, Іване, давай нырца на самае дно й не вытыркайся.

Гэтых трэба высьцерагацца. Калі дачуўся пра гэтую спрэчку Сымон, то казаў, што гэта справа самая звычайная:

— У спрэчках за межы так бывае заўсёды. Калі яшчэ на вёсцы жыў і ў нас аднаго разу гаспадары захацелі зямлю перадзяліць, то за гэтыя межы колькі калоў паламалі, колькі насоў паўгіналі ды сківіц папсулі. Процьму! А Міколу Кульгаваму, дык таму шчэ й рабрыну зламалі. Урэшце ўсяго лепшыя шнуры прысвоілі дужэйшыя. Гэта праўда, што межы дзяліць — трэба сілу мець і хахла не шкадаваць.

Мяне іхныя межы ня надта цікавяць. Але як утрымаесься, калі чалавек гэтак шырака хоча размахнуцца.

*13 жніўня.* Пілі. Быў выпадак.

*14 жніўня.* Зноў пілі. Бяз выпадку.

*15 жніўня.* Бачыў, як сяньня Рыгор валок з працы мяшок нейкага дабра, ажна ўгінаўся. Сымон, які таксама гэта згледзеў, казаў, што гэта добра.

— Калі чалавек сваёй парай арудуе, то гэта шчэ дармо: добры склад і за дзесяць год на сабе не перавалачэш. А Рыгор і за год не адзін раз на рагатку наткнецца, знацца, яшчэ й другім дабра застанецца. На сабе няхай цягае. Ня дай Бог, калі чалавек пачне ўжо з транспарту карыстаць, ну, тады ўжо пішы — пра-

паў. Будзе якраз тое, што з Міхасём Уловічам было. Пакуль той цягаў на сабе, усё добра было, а як ужыў мэханізацыю — прапаў. Не пасьпеў ён і двух рэйсаў, як казаў, скамбінаваць, ажна й накрылі яго з шапкаю. Праўда, той не любіў анучы ў вадзе сушыць — хутка выскрабаўся, але ўжо голы, як бізун. Мэханізацыя — рэч ненадзейная!

А ўсё ж Рыгорава праца зайздросная. Ці не падацца мне па такой лініі? Раіўся з Рыгорам.

— Табе, — кажа Рыгор, — як спэцыялісту просты ход на ўправу.

— Але ж там, — кажу, — мова, а я ня ведаю па-іхнаму.

— Якая мова? Дзівак! Калі ведаеш «выбачайце» й «будзьце ласкавы», то й усё ў парадку. Там такіх, як ты, хоць грэблю насьцілай.

Трэба гэтую справу памацаць, бо надта ж ужо зайздросна на Рыгора глядзець.

*16 жніўня.* Быў у прафэсара Ванава. Нічога. Трымае сябе як сьлед. Пра старое — ані гуку. Раіўся зь ім наконт працы.

— Што ж, — кажа, — гэта можна. Сваіх людзей заўжды падтрымаюць.

А жыве ён, відаць, нядрэнна, і харчоў мае. Як частаваў, то й масла паставіў, і цукру, і каўбасы, нават і віна бутэльку адшкадаваў. Нічога! Нашыя не прападуць! Дармо што той крычыць: хай дадуць! хай дазволяць! Пакуль ты будзеш «хай» ды «хай», а мы тым часам і апануем... Жыць трэба ўмеючы.

*17 жніўня.* Проста дзіва, які чалавек жывучы. Сяньня зь Яськам Разаком сустрэў тую старую порхаўку, што нам назаляла, як склад парадкавалі, ды сарамаціла нас. Я ўжо думаў, што ён даўно душой загавеўся, ажна не — шкандыбае па вуліцы, праўда, абшарпаны, але жыве.

— Ну, як у вас, — пытаюся, — жывот із сумленьнем ня надта спрачаецца? Да бойкі яшчэ не дайшло?

— А ў чым рэч? — пытаецца.

— Ды як жа, Вы ж крычэлі, што рабаваць несумленна. А цяпер што скажаце?

— І цяпер тое скажу: дрэнна рабілі, несумленна.

Сказаў і зноў пашкандыбаў. Во дзе ўпартая порхаўка! Ну, хоць бы пашкадаваў, што ня выкарыстаў моманту. А можа й шкадуе, ды сорам прызнацца. Напэўна так, бо ня можа быць, каб гэткіх дзівакоў зямля на сабе трымала.

Калі мы ўвечары расказалі пра гэта Сымону, дык ён ані не зьдзівіўся.

— Чорт яго, браткі, ведае, можа й не шкадуе. У жыцьці здараецца, што на чалавека хвароба такая находзіць — малахолія завецца. Быў у мяне адзін знаёмы, які жыць ня мог, каб не цягнуць. А калі які дзень ня сьцягне, то хварэе. А цягаў усё, што пападзе. Ды такі ўжо быў люты — роднага бацьку мог з кашаю зьесьці. І вось раптам яму заняло: ня цягне ды ўсё. Хоць ты яму ў кішэню кладзі — не бярэ. Зарвала зусім. Знацца, найшла на яго гэтая малахолія. І тут ніякія лекі не памогуць, і чалавек прапаў.

Бадай так яно й будзе. Выходзіць, што ў кажнага чалавека ёсьць пункт, што із сваёй дарогі яго зьбівае. І ўсё ж чалавек жыве. Дзіўна.

*18 жніўня.* Сымон прывёз аднекуль бочку газы. Кажа, што на нейчым пагарэлым двары качалася, там ён і сустрэўся зь ёю — лоб у лоб.

— Але як гэта здарылася, дзівіліся мы, скрозь усё згарэла, а бочка з газай — не.

— Нічога дзіўнага, — адказаў Сымон,— не згарэла, бо шпунтам заткнёная была.

— Але ўсё ж, — кажам, — газа? Калі камень і той гарыць.

— А чэрці яго, зрэшты, ведаюць, я ня хэмік, каб усё ведаць. Брэша! Хэмік зь яго адмысловы, бо мы так і не дазналіся, скуль прывалок газу. Цяпер мяняе газу на самагон і маляс. Разак даваў за літру газы паўлітры самагону — не бярэ.

— Ну то каб ты лепшага ніколі й ня піў, як тая газа, — раззлаваўся Разак, — дарма не вазьму ў такога зьдзірцы.

— А я такому злыдню й за тышчы літры не аддам. Жлукці сваю самагонную полiўку ўпацёмках — больш разьлiеш.

*19 жніўня.* Прафэсар Фэцкі нарэшце дакладна вызначыў, колькі вайна каштуе: выходзяць штодня два мільярды сто восем рублёў пяцьдзясят сем і пяць дзясятых капейкі.

— Калі б, — кажа, — адзін дзень не паваявалі, то ўсе людзі, што з усіх бакоў абляпілі гэтую гліняную галушку, якую завуць зямлёй, маглі б увесь дзень ляжаць барадою да сонца й нічога не рабіць, а харчоў было б кажнаму на залатога рубля, ды яшчэ эканоміі засталося б на сто восем рублёў і пяцьдзесят сем з паловаю капеек. А як вайна ўжо йдзе пяцьдзясят дзён, то вось і лічыце, даражэнькія, колькі чалавецтва на гэтым страціла.

Калі даведаўся пра гэта Апанас Дзюрка, дык аж абурыўся:

— Брэша! Можа, чалавецтва й страціла, а я то не. Бо калі вайны не было, то я рабіў, а харчоў і на залатоўку ня меў, а

цяпер пальцам не варушу, а ўжо, дзякаваць Богу, трэці месяц ем пшэнныя бліны з макам. Не! Штосьці ягоная навука нейкая кульгавая.

Тае ж думкі трымаецца й наш вінакур, Яська Разак.

— Твой прафэсар, — кажа, — зусім дзівак. Шкада, ты мяне не спусьціў з гэтым тваім вучоным, я паказаў бы яму матэматыку. Вайна — страта для чалавека! Чулі? А ці ведае ён, кіслая брага, што вайна шмат каго на ногі паставіла? Другога раней і чалавекам саромеліся назваць, ды ён зусім і не чалавек быў, а так — мроя нейкая. А вайною так акрыяў, што яму й фігаю носа не дастанеш. А ён кажа — страты. «Барадою да сонца ляжаць»... Узяў бы цябе за рыжую бараду ды патрос як сьлед за такія словы. Каб мая воля, то я ўсе такія навукі пакасаваў бы ўшчэнт — хай ня брэшуць і не ачмучваюць людзей.

Але Сымон дык той ня згодзен зь імі:

— Хоць я заўжды кажу, што ўсе прафэсары дзівакі, але здараецца, што й яны маюць рацыю. Быў у нас пры акадэміі адзін такі дзівак. Ён таксама ўсё лічыў. Ліча й ліча. Бывае, і на сьнеданьне забудзецца. І вось аднаго разу ён вылічыў, што каб усіх людзей з усяе зямлі прывалок ув адно месца ды паклаў адзін на аднаго, то выйшла б куча ўсяго толькі кілямэтар ушыркі, кілямэтар удоўжкі, кілямэтар увышкі. Вось я тады падумаў: каб з гэтай кучы адтрэсьці хоць дзясятую часьціну зладзеяў ды навесьці на іх гармату, то глядзь, што аднэй бомбай усіх і прышчаміў бы на месцы. Бачыце, як проста па навуцы выходзіць. А служба парадку іх і за дзесяць год не пераловіць. Не! Супраць навукі не кажэце — часам і яна трапляе ў самы пункт.

*20 жніўня.* Быў на рынку. Адна назва што рынак, а гандлю ніякага. Бачыў, як адзін дурань збываў калгасьніку мадэльныя туфлі за баханку хлеба. Яшчэ і ўгаворвае:

— Купі, дзядзька, жонцы: гной трэсьці — першы сорт.

А хіба ў такіх туфлях гной трэсьці? У іх факстроты выдрэнчваць і то шкада. Дзядзька паўзіраўся на іх, пастукаў пальцам пад падэшвай дый памяняў.

— Навошта гной, — кажа, — мая дачка ў іх лявоніху паскача. Цяпер, — кажа, — можам і мы сабе такое ласунства дазволіць.

Нацягаў, мабыць, калгаснае мукі, як і той мадэльнік туфляў, вось і дазваляюць сабе. Я больш ня мог глядзець на такую несправядлівасьць ды ўцёк з рынку.

*21 жніўня.* Хадзіў да ўправы. Нічога страшнага. Дарэмна палохаўся. Скрозь усе свае, і язык наш, чысты адэскі. Праўда,

сям-там і іхны сьлізгане, нават і мову пачуеш, але так нячаста, што можна й не лічыць. Малайцы нашыя — мух ня ловяць.

Мацаў адносна якога-небудзь пасаду. Можна. Але я ўсё яшчэ палохаюся. А калі часам вернуцца? Лепш крыху ўстрымацца. Каля аднаго пакою наткнуўся на Арыентацкага. Жартуе:

— Што, вялікадзяржаўнік, і вы да нас?

— Выбачайце, — кажу, — калі ласка, я ніколі...

— А, то добра, добра... Пачынаеце й вы крыху беларусізавацца. Добра, добра...

Дзівак! Я табе шчэ ня так зьбеларусізую. Дай толькі ўмацуемся.

*22 жніўня.* Вярнуўся Буркун. На чалавека страшна глядзець — скура ды косьці. Быў да гэтай пары ў бальшавікох ды нейкім парадкам сьлізгануў з фронту.

— Чаго ж цябе, — кажу, — нялёгкая паперла аж на фронт? Хіба ня мог раней драпануць?

— Не кажы. Добра, што жывы вярнуўся. А больш мяне на фронт і гвалтам не зацягнеш. Ды хто ж мог спадзявацца...

Нічога! Гэты выхадзіцца. Нездарма ў кандыдатах лічыўся.

*24 жніўня.* Усе ўзяліся паліць кнігі. Разак спаліў блізу ўсё, што меў, толькі падручнікі не пасьпеў, бо сын недзе схаваў. Сымон паліць усю палітыку.

— Я, — кажа, — гэтую палітыку скрозь бы пусьціў з дымам, на ўсёй зямлі: ад яе людзям адзін ачмут, а больш нічога.

Рыгор таксама кажны дзень пэўную порцыю ў печ кладзе. А з суседняй вуліцы нейкі бухгальтар, дык той так асатанеў, што абы згледзеў якую паперыну, то адразу ў печ.

— Не магу, — кажа, — глядзець на кнігу, ад яе ў мяне хвор нейкая пачынаецца...

Ня паляць кніг толькі Апанас Дзюрка й прафэсар Наязноў. Першы, таму што ў яго праз усё жыцьцё ніякае кнігі ў хаце не было, а Наязноў кажа, што ён пакуль устрымліваецца.

А я зрабіў хітрэй. Сёе-тое, ведама, спаліў, а Леніна й Сталіна ды гісторыю ВКП на ўсякі выпадак закапаў. Хай ляжаць — у зямлі яны есьці ня просяць. Згніюць — страта не вялікая, а калі часам спатрэбяцца? Вось я тут іх і выкладу: «Бачыце, які я свой, ды яшчэ й падкаваны». Вось тое ж! А дурні заўсёды па-дурному.

*25 жніўня.* Сяньня мірылі Апанаса Дзюрку зь ягоным шваграм. Пасварыліся, як цьвікі дзялілі. Цьвікі яны цягалі супольна, а сяньня раскладалі на душы. А швагра ягоны вельмі ўжо спрытны чалавек: калі захоча, дык можа сам сабе ў вочы плю-

нуць. Вось ён і аб'ехаў Дзюрку на цэлую скрыню. Неяк вельмі спрытна перасморгнуў, як раскладалі цьвікі на кучы. Апанас, хоць і варона, а гэты фокус згледзеў.

— Ты што, — крычыць, — фальшуеш? Хіба сумленныя людзі так робяць?

Пачалося пералічэньне, сварка, а пасьля й за чубы ўзяліся. Мы ледзь іх разьвялі й самі расклалі цьвікі на роўныя кучкі. Хай у згодзе спажываюць.

*26 жніўня.* Жонка штосьці надзьмулася й паглядае падазрона. Ці не ўвялі ёй у вушы пра Мар'ю Іванаўну. Шкада, калі так, бо адносіны з Мар'яй Іванаўнай увайшлі ўжо ў пажаданую плынь, і аскоміны яшчэ не набіў. Трэба зноў падвоіць асьцярожнасьць. Ох, цяжка спраўляцца на два франты.

*27 жніўня.* Сяньня меў неспадзяваную цікавую сустрэчу. Бачыў свайго старога знаёмага — Выпівоніч-Ецкага. Ведаў яго шчэ за царом. Быў ён тады абшарнікам, меў ладны маёнтак, ну і жыў нядрэнна: скварку й чарку меў штодня. У сямнаццатым годзе ён чагось не пагадзіў з бальшавікамі, а біцца зь імі ня меў ахвоты й з гэтае аказіі паціснуў на захад. А цяпер вярнуўся. Гляджу й дзіўлюся: чалавек амаль не зьмяніўся, толькі пагрубеў трохі, а такі ж здаровы, чырвоны, як рыжык.

— Відаць, — кажу яму, — на эміграцыі Вам нядрэнна паводзілася?

— А так, так, — кажа, — хоць маёнтку там і ня меў, але пасад нядрэнны давалі. Ды я нідзе не прападу — натура ў мяне такая... зачэпістая.

Відаць, што не прападзе. Цяпер езьдзіў у былы маёнтак, мабыць, там таксама нейкія меркаваньні мае. Але наўдачу, каб з гэтага што выйшла.

Калі ішоў дахаты, то ўсю дарогу думаў пра тое, чаму так дзіўна збудаваны белы сьвет. Адзін, бывае, і чалавек не дурны, а праз усё жыцьцё, як белка ў калясе, матаецца за скарынку хлеба, а другі — так сабе чалавечак, звычайны, а ўсё жыцьцё на правах госьця: пірог ды яешня. Увечары ў нашай парафіі на гэтую тэму быў дыспут. На гэтую справу кажны глядзіць па-свойму. Апанас, напрыклад, казаў, што як толькі чалавек радзіўся ў кашулі, то ўжо так і ведай, што яму праз усё жыцьцё будзе Вялікдзень. Разак даводзіў, што ў кажнага чалавека свой лёс — як каму пашанцуе. Рыгор націскаў на тое, што ўсё залежыць ад розуму:

— Калі чалавек мае галаву, дык не прападзе.

— А з галавою не прападаюць? — пытаемся.

— Калі й прападаюць, то, мабыць, галава ў патрэбны момант ня здолела варыць, а то не прапаў бы.

Сымон моўчкі слухаў усе гэтыя разважаньні, не перашкаджаў, а нарэшце й кажа:

— Глупства вы ўсё гэта гаворыце: і лёс, і розум — усё гэта дрэнь, і галава дрэнь. Галоўнае ў чалавека — жывот. Калі я шчэ ў анатомцы працаваў, то быў у нас адзін доктар, дзівак страшэнны. Іх там у нас шмат было, і кажны зь іх рабіў як трэба: сяньня ногі рэжа, заўтра ў мазгох калупаецца, а той дзівак дык заўсёды жываты паласаваў. Крэмзае іх ува ўсе бакі ды ўсё чагось углядаецца. А што ў жываце ўбачыш, апрача дрэні? Вось я аднойчы й пытаюся: чаму гэта Вы, Сямён Мікалаевіч, жываты ўсё шастаеце? Вы б у галаве пакалупалі. Можа, там цікавей?

— А што ў галаве калупаць? Мазгі, — кажа, — гэта дрэнь, густы кісель і больш нічога. І галава, — кажа, — патрэбна чалавеку хіба як покрыўка для тулава, каб у жывот лішняя вада не зацякала. Бо сам бачыш, што кажны чалавек жыватом наперад ходзе, а не наадварот, а значыцца, і ўсё чалавецтва жыватом наперад рушыць...

— Я тады пасьмяяўся зь ягоных словаў. Але неяк пазьней давялося мне тры дні ня есьці. Дык што вы думаеце? У галаве ніякае думкі, апрача тое, пра што кажа жывот. Вось тады й паверыў таму дзіваку-доктару. Знацца, калі чалавек не прападае, у яго спраўны жывот, а галава тут зусім лішняя.

Сымон сказаў гэта так пераканаўча, што блізу ўсе згадзіліся.

*28 жніўня.* Але ж да чаго цяпер спрытны народ пайшоў! Толькі пазірай ды дзівіся. Стаімо гэта мы сяньня на біржы, разглядаемся. А тут каля нас і Круглоў трэцца. Асоба такая імклівая й досыць размаітая. Працаваў ён за саветамі й нейкім тэхнікам, і транспартнікам, і асьветнікам, наагул спэцыяльнасьцяў мае шмат, а тым часам ніводнае. Пакуль гэта мы паволі прыслухоўваліся, што, дзе й як, а тым часам зь біржы выходзіць дзядзька з барадою ды кажа:

— А хто, — крычыць, — ёсьць крысаловы? Добрыя ўмовы. Пацукоў, знацца, лавіць. На «Заготзярно».

Ну, ведама, мышалоўная спэцыяльнасьць цяпер даволі рэдкая, і таму ніхто надта й не адгукнуўся на гэты заклік. Пракрычэў гэта ён некалькі разоў ды змоўк. І вось, калі ўжо здавалася, што мышы цалкам апануюць гэтым «Заготзярном» з прычыны адсутнасьці належнага спэцыяліста, у гэты, як кажуць, крытычны момант на сцэну вырываецца Круглоў:

— Я, — крычыць, — магу мышэй лавіць! Курсы на гэта канчаў! Дыплёмы маю!

І панёсься за барадою. А праз часін дзесяць вяртаецца й паперкаю з накіраваньнем махае:

— Ну, — крычыць, — трымайся, мышы! Круглоў ідзе.

— А як ты, — пытаемся, — лавіцьмеш гэтых мышоў? Ты ж ня спэц.

— Даражэнькія, нешта злаўлю. Калі не мыша, то хоць збажыны якой. Гэта ж «Заготзярно».

І пайшоў мышэй лавіць. А я ведаю, што ён ніколі нічога, апрача мух, не лавіў. Вось гэта спрыт! Такі чалавек нідзе не загіне.

*29 жніўня.* Мар'і Іванаўне зноў занёс пшанічнае мукі й цукру. Нічога ня зробіш — трэба падкормліваць. Казала, што хутка вернецца лейтэнант. «Ад пэўнага чалавека чула». Можа, гэта яна мяне палохае, а можа, і сапраўды ёсьць такія чуткі? Трэба папытацца ў Наязнова: ён на гэтыя рэчы знаўца.

*30 жніўня.* Рыгор спраўляў улазіны. Ну, трэба сказаць, што такога баляваньня я шчэ ня бачыў. Было літаральна ўсё. А гарэлкі — Божачка мой! Хоць анучы палашчы. Усе мы стараліся каля яе досыць дружна. Пасьля пачаліся прамовы. Рыгора віталі, хвалілі ягоны спрыт і розум, ягоную вытрываласьць. Дый як не хваліць, калі чалавека нават агонь не бярэ. Згарэў ушчэнт, а праз пару месяцаў зноў у сваёй хаце, дый абсталяванай лепш за ранейшую. Не, такі чалавек варты пашаны. Нават і Сымон у сваёй, хоць і кароткай, але гарачай прамове адзначыў гэта:

— Што ж, — казаў Сымон, — што Рыгор выгляду ня мае? Што, пытаюся ў вас, з таго, калі наш паважаны сусед з выгляду як бы й дурань які? Выгляд гэта, кажа, дрэнь, глупства. Другі бывае й выглядам паважны й гэтым за разумнага сябе ўдае, а загадай паміж трох сьвіней зацірку падзяліць — не патрапіць! А Рыгор падзеліць! Ды так падзеліць, што яшчэ й сабе застанецца. Вось у чым сэнс! Вось у чым, кажу, уся навука. Хай жыве Рыгор!

Мы дружна выпілі за Рыгора, таксама й за ягоную жонку, але ў канцы ўсяе справы нашае лагоднае частаваньне ледзь не сапсуў Апанас Дзюрка. Сярод іншых пачастункаў ён неяк згледзеў на стале сьвежаніну і ўспомніў, што ў яго калісь укралі кабана, і што варажбітка паказала на свайго. Гэта ў яго сфармавалася ў пэўную думку, якая й выклікала рэальныя чыны. Ён падняўся, грымнуў кулаком па стале і, хоць не зусім выразна, але досыць станоўка, загадаў:

— Пакіньце жэрці! Мая сьвежаніна! Украў! — і яшчэ раз грымнуў.

Але мы яго хутка супакоілі: нацадзілі ў ягонае чэрава літровую конаўку «ярша», пасьля чаго ён зусім астаўпеў і забыўся ўжо пра ўсё на сьвеце.

Так мы лагодна й скончылі баляваньне.

— Дай Божа так кажнаму пагарэць, як Рыгор, — казаў Загржэмбіцкі, калі мы ўжо разыходзіліся.

*31 жніўня.* Сяньня жонка сьцягала ў царкву. «Ідзі, кажа, грахі адмольваць, распусьнік». Мабыць, ёй нешта сплялі. Няйначай. Таму я надта й не ўпіраўся. Узяла гэта яна трохі натураю (грошы, кажа, Богу не патрэбныя). Ну й пайшлі. Хто моліцца, а хто й так. Пастаяў гэта я трохі і, як толькі жонка адхінулася спрадкаваць прынесеную натуру, я й сігануў за дзьверы.

Ля царквы народу шчэ больш. Тут я назіраў адну цікавую зьяву, якая мяне пераканала ў тым, што ні ў якой справе нельга быць надта заўзятым. Нейкі былы актыўны бязбожнік у сувязі са зьменаю агульнага кірунку зьмяніў і свае пераканаьні й паціснуў зь бязбожнай ячэйкі ды ў панамары. А якаясь цётка расшыфравала ягоны манэр і, згледзеўшы былога бязбожніка каля царквы, счапілася зь ім:

— Прэч, — крычыць, — бязбожнік, прэч адсюль! Не пагань сьвятога месца.

Тут народ зграмадзіўся, цікава ўсім.

— Завошта яго, цётка, гоніш? Што ўкраў?

— Гад, — крычыць, — нядаўна ячэйкай кіраваў, нас цягнуў у бязбожнікі, а цяпер у сьвятое месца лезе. Прэч!

— Няхай лезе, — кажуць людзі, — што табе, цётка, сьвятога месца ня хопіць? Шкада? Можа, чалавек пакаяўся?

Рыжы бязбожнік, якога цётка так упорыста гнала ад царквы, трохі зьбянтэжыўся, але шчэ трымаўся з гонарам:

— А можа я, — кажа, — маскаваўся, калі быў бязбожнікам? І я заўсягды ў Бога ўвяраў!

Справа скончылася тым, што ўпорыстая цётка прагнала-ткі рыжага бязбожніка. І варта: ня трэ быць такім упартым.

*1 верасьня.* Любоўная праблема ўсё больш хвалюе нашую ваколіцу. На суседняй вуліцы, Берасьцейскай, сяньня муж разыходзіўся з жонкаю, зь якой жыў два гады. Прыйшоў гэта ён забіраць свае рэчы, а жончына сямейка, дасканальна ўзброеная, атакавала яго пры самых дзьвярох. Жонка зь вілкамі, цешча зь мяшалкаю абышлі з флянгаў, а цесьць зь нейкім адмысловым уруччам зайшоў з тылу — узялі, як кажуць, у мяшок ды

так пачалі пыл выбіваць, што небарака-наважон ледзь выратаваўся. Прыходзіць ён да новае жонкі ўвесь у сіньцох. Ажна й тут пры самых дзьвярох ваенная застава — не прымае й новая.

— Дзе рэчы? — пытае. — Няма! Ну, то й мяне няма! Мне галадранцаў ня трэба!

Не прыняла. Цяпер мужык ходзіць па суседзях, скардзіцца, асабліва на тое, што новая жонка так празаічна паставіла любоўнае пытаньне:

— Ды я ж, — кажа, — даводзіў, што шчасьце ня ў рэчах, а ў каханьні, а яна й слухаць ня хоча. Ты мне, — кажа, — вады не муці! Прыйдзі з усёй маёмасьцяй, тады й каханьне будзе на ўсе сто дваццаць адсоткаў, а бяз гэтага — вэк! цурык! І дзьвярыма бразгае. Гэта мяне горш за ўсё крыўдзіць, што яна цвыркае. І скуль яна гэтага навучылася?

І апынуўся цяпер чалавек пры дзьвюх жонках і бяз хаты. Вось палажэньне!

*2 верасьня.* Рэзалі — дваццаць адно. Рыгор прайграў дзьве тысячы, Дзюрка з паўтысячы. Выйгралі я й Разак.

*3 верасьня.* Быў у гасьцёх у інжынера Паліханава. Шкадаваў, што пайшоў. Праўда, пачастунак быў адмысловы, але гаспадар мне ледзь душу ня выматаў. Прысукваўся, як з нажом да горла:

— Ну, што будзеш рабіць, як вернуцца? Куды дзенесься?

І так гэта націскае, што быццам ужо й вярнуліся.

— Ды шчэ ж, кажу, не вярнуліся, чаго мне загадзя думаць... А тады нешта скамбіную.

— Не, ты цяпер скажы!

Я хоць і п'яны быў, але патрапіў сплесьці нешта такое двойчы дубальтовае, што й сам не зразумеў.

— Хітры ты, — кажа, — чалавек, — але ўжо больш не прысукваўся. Ад мяне, браток, і ад соннага нічога ня выцягнеш. Дарэмна!

*4 верасьня.* Ізноў быў на біржы. Дзівакі! Прапануюць ехаць на торф. А навошта мне іхны торф, калі я дроў назапасіў? А тарфянога заработку мне яшчэ ня трэба.

*5 верасьня.* Прафэсар Наязноў дастаў працу. Хоць і не па спэцыяльнасьці, але тым часам гнуць можна. Хай гне на здароўе. Нашы сілы ўмацоўваюцца!

*6 верасьня*. Сустрэў Ахрэма Авечку:

— Ну, як, — пытаюся, — жыцьцё?

— А нічога, — кажа, — добра. Ворага сьцігуем памысна.

— А як межы?

— Ну, межы цяпер нашыя напэўна. З захаду нашых падваліла. І хлопцы ўсе — адзін у адзін. Сіла!

Трэ будзе бліжэй падысьці да гэтай сілы ды прыгледзецца да яе. Можа, на што й прыдасца.

*7 верасьня.* Сымон працуе ўжо. Прымайстраваўся возьнікам да нейкай ці то ўстановы, ці то фабрыкі — не разьбярэш.

— Я й сам добра ня ведаю, што шчэ з гэтага выйдзе. Нешта калупаюцца. Аднаўляць, кажуць, будзем. Хай аднаўляюць. Мне клопат не вялікі: дзьве гадзіны на дзень — і ўся работа, а малясу каню даюць. Знацца, самагонку ў мяне цяпер конь дастае. Наагул добра, бо дырэктар — боўтка. Як толькі расшыфраваў яго, то цяпер раблю што хачу. Прыйду гэта да яго, шапку скіну й грымну: «Гаспадзін Піпікаў!» (яго Піпікам завуць), то што ні прасі — зробіць. Надта любіць, каб гаспадзінам звалі. А мне што, шкада? Ды я цябе хоць чортам, — кажа, — назаву, абы рабіў, што мне трэба. Яму, былому парцейнаму, гэта, можа, і цікава, а мне — пляваць, мне языка не шкада, абы малясу даваў.

Наагул, кажу, каб не было дурных, то разумнаму надта цяжка было б жыць.

*8 верасьня.* Хадзілі з Сымонам аглядаць гароды. Сымон кажа, што кажную справу трэба пачынаць загадзя, каб пасьля не было мітусьні й хапаніны. Намацалі два ладныя гароды. Былыя гаспадары недзе зьніклі, а бульбы тым часам шмат.

— На булён хопіць, — сказаў Сымон, — абы скварка.

Хутка пачнем капаць.

*9 верасьня.* А Фэцкі зноў лічыць. Гэтым разам вылічае, калі скончыцца вайна. Паводле ягоных табліцаў выходзіць, што вайна скончыцца, а калі — шчэ не падрахаваў. Нешта ў яго ў інтэгралах заела: атрымліваюцца велічыні то бясконца малыя, то бясконца вялікія, так ён і ня можа схапіць за хвост канца вайны. Сымон раіў, каб ён лавіў гэны канец на дарозе, бо ад вялікага да малога ня так многа.

— Тады ўцэліце ў самы пункт, бо найлепш пераймаць у дарозе. Толькі, — кажа, — лічэце ня надта па-вучонаму, дзе сотня менш, сотня больш — ня мае значэньня. Бо для жывога чалавека часам і год нешта значыць. Я ведаў аднаго чалавека, на Пярэсьпе жыў, які дваццаць год чакаў на спадчыну ад багатага дзеда й не дачакаў аднаго году: дзед пераажыў яго на адзінаццаць месяцаў і дваццаць восем дзён. Хіба ж гэта ня крыўда? Вось вы так і лічэце, даражэнькі, каб людзі не пакрыўдзіліся.

А па мне, то хай лічыць, як хоча. Калі скончыцца — для мяне ня мае значэньня.

*10 верасьня.* Ці то час такі, ці то людзі цяпер такія. Адно — злодзей на злодзеі. Тую бульбу, што мы нагледзелі, — ужо капаюць. Прыходжу сяньня на гарод, а там два дзецюкі шастаюць бульбоўнікам ува ўсе бакі.

— Што гэта, — кажу, — робіце? Хіба прыватную ўласнасьць ужо скасавалі?

— А даўно, — кажуць, — скасавалі. Цяпер усё агульнае. Няма, — кажуць, — ні свайго, ні чужога.

Вось і гавары з такімі! Ледзь прагнаў. Напалохаў урэшце, што жаўнераў паклічу.

Раіліся з Сымонам, што рабіць. Сымон тае думкі, што цяперашнім часам лепш міска дранікаў на стале, чымся асьміна бульбы на гародзе. Трэба заўтра капаць.

*12 верасьня.* Два дні капалі бульбу, а пад канец неспадзявана зьявіўся гаспадар. Абурыўся — страшэнна. А чаго, каб хто спытаўся?

— Рабаўнікі! — крычыць. — Хто дазволіў!? Зладзейства! — і панес...

Сымон ледзь яго супакоіў.

— Ты чаго, — кажа, — крычыш, чалавеча? Якое зладзейства, калі мы толькі ўсяго таго, што ашукаліся. Тут недзе мае цешчы хаціна стаяла й бульба ейная расла. А калі ўсе нумары пагарэлі, то як можна распазнаць, што цешчына, а што тваё. Сам бачыш, што скрозь толькі коміны стырчаць... А нам чужога ня трэба, — скончыў Сымон. — Забірай сваю бульбу.

Мяшкі два бульбы яму аддалі, бо рэшту мы ўжо перавезьлі дахаты. Страта, ведама, невялікая.

*13 верасьня.* У беларусаў нічога ня будзе, бо надта ўжо вялікі ў іх разнабой. Сяньня быў у Ахрэма Авечкі. Прыйшлі таксама Арыентацкі й Шчыры ды яшчэ нейкі новы, толькі што з Заходняй зьявіўся, зь дзіўным прозьвішчам — Кіндзюк Банадысь. І вось, як толькі зышліся, то адразу й пайшло: хто ў лес, хто па дровы. На адну й тую самую справу кажны глядзіць із сваёй званьніцы. Гутарка йшла пра тое, што ўправу апанавалі чужыя людзі (мяне яны ўважаюць за свайго), а свае па кутох, і якая гэтаму ёсьць прычына. Шчыры вельмі горача насядаў на тое, што яны самі вінаватыя:

— Мы, — крычыць, — стаімо на месцы! Мы сьпімо! Там, дзе трэба дзеяць дружна, мы гуляем у выперадкі! Мы... і г.д. Наогул даводзіў, што яны замала актыўныя.

Авечка на гэта адказаў яму, што ўсё гэта так і ўсё трэба рабіць абавязкова, але як будзе на гэта дазвол.

— Як толькі дазволяць, — скончыў ён, — то мы адразу ўсіх прагонім і пачнем апаноўваць. Абы дазволілі.

Арыентацкі, наадварот, тармазіў абодвух. Ён даводзіў, што трэба рабіць і так, і гэтак.

— Бачыце, — казаў Арыентацкі, — калі на справу кінуць позірк з аднаго боку, то яно выходзіць нібы й так, калі глянуць з другога, то выходзіць якраз наадварот. Значыцца, беручы на ўвагу вышэйпаданыя акалічнасьці, трэба рабіць і так, і гэтак або лепш ні так, ні гэтак, а зусім наадварот.

Дыскусія трывала дзьве гадзіны, але ні да чаго не дамовіліся. Так яно ў іх, відаць, і надалей будзе: як кажуць, што шапка, то й розум.

Сьвежы чалавек, што прыехаў з Заходняй, у гутарцы ўдзелу ня браў. Ці то ён яшчэ слаба арыентуецца, ці яго іншыя пытаньні цікавяць, бо ў часе прамовы Шчырага ў самым гарачым месцы ён у мяне спытаўся:

— А дзе можна ў Менску дастаць дрожджаў?

Гэты, відаць, не тэарэтык, а больш практык.

*14 верасьня.* Рынак ажывае, але шчэ слабая прапанова, попыт большы. Прапануюць дрожджы й шчоткі, а попыт узрастае на спажыву.

Выменяў на кілё цукру нядрэнныя чаравікі. Хай будуць у запасак. Вайною скура сьцягваецца. Адно дрэнна — няма шчэ ўсталяваных цэнаў. Але дарма — наладзім і гэта, абы не перашкаджалі прыватнай ініцыятыве.

*15 верасьня.* У Байцова здарылася аварыя. Папаўся на нейкай надзвычайна шыбельнай камбінацыі. Хацеў пабіць сусьветны рэкорд і за тры дні зрабіцца мільянэрам. Але пад канец гэтай амэрыканскай хуткасьці ў машыне штосьці заела, Сымон казаў, што падшыпнікі згарэлі, бо слаба мазаў... Цяпер сядзіць у «бацькавай хаце» й чакае канца справы. А канец, відаць, будзе незайздросны.

*16 верасьня.* Жывы чалавек нешта выдумае. Загржэмбіцкі зноў акрыяў. Праўда, цяжка было, але выкруціўся. А пачаў зь іголкі, якую зьмяняў на яйка. Пасьля яйка выменяў на махорку, махорку — на гарох, гарох — на нагавіцы і г. д. Прарабіў штосьці да дваццацёх апэрацыяў, пакуль узьбіўся на тры пуды мукі. А з гэтага ўжо справа пайшла сьлізчэй. Цяпер жыве як сьлед і гора ня мае.

— Мне, — кажа, — цяпер толькі разгон давай ды не затрымлівай, то я, — кажа, — так пайду ўгору, што й ня згледзіш.

І пойдзе. Бо гэта такі чалавек, які ня будзе друшляком зацірку чэрпаць.

*17 верасьня.* Разак трапіў у канфузнае палажэньне. Пацеха. Пайшоў да свае красуні, а жонка асачыла ды назіркам. Толькі гэта ён у хату да красуні, ажна тут і жонка ў дзьверы бразгае. Мусіў уцячы на гару, а стуль празь нейкае вузенькае ваконца выкінуўся на гарод. Парваў пінжак і зьвіхнуў руку, як праз платы сігаў. Але прыджгаў да хаты раней за жонку. Шчэ пасьля й на яе сварыўся, як дахаты вярнулася, чаму гэта яна немаведама дзе поўзае.

Жонка, мабыць, здагадалася, але жывога доваду ня мае, а таму й маўчыць.

— Мяне, — хваліцца Разак, — жыўцом ня возьмеш.

Спрытны хлапец, што й казаць. Такі і ў вагні не згарыць.

*18 верасьня.* Сяньня нечакана трапіў на нейкую нібы літаратурную зборку. Паліханаў завёў. «Хадзем, — кажа, — пазабавіся. Часам бывае надта пацешна». Пайшлі. Людзей сабралася шмат. Тут былі і артысты, і паэты, і музыкі, і аматары, і неаматары. Ну, сьпявалі, гралі, дэклямавалі — хто што мог. Чыталі таксама й свае вершы, як кажуць, собскага вырабу. Мяне гэта найбольш пацешыла, бо гэтага я шчэ ніколі ня чуў. Колькі радкоў з гэных вершаў я нават пасьпеў занатаваць. Прыкладам, адзін верш пачынаўся так:

**Скок у будучыню**

Засінелі васількамі далі.
Чорнай п'яўкай уецца на балоце гаць.
Як нас капцюрылі, як нас каталі,
Гэтага пяром не апісаць.

А канчаўся верш наступнымі радкамі:

Салавейка адсьпяваў за гаем,
Срэбны месяц вісьне на сасьне.
Ну а мы — чакаем і чакаем:
Можа, будзе што, а можа, не...

Другі паэта-аматар паморшчыўся на верш першага паэты і, страсянуўшы даўгім валосьсем, пачаў свой:

**Нырца ў сусьвет**

Усё абсьпявана: ад рэдзькі да выраю.
Што ж цяпер возьмеш, паэт?

Грукну цымбаламі, бразну я ліраю
І закілзаю сусьвет.

І як пачаў кілзаць, як панёс, дык толькі іскры сыпаліся. Урэшце да таго дасьпяваўся, што не відаць было: ці ўсіх нас трэба аддубасіць, ці яму спусьціць порткі ды ўсыпаць так, каб больш ніколі не даваў нырца.

Вось гэта, думаў я, паэзія, вось гэта — хараство! Што б сказаў Пушкін, каб пачуў такое? А Паліханаву вершы спадабаліся.

— Добра, — кажа, — галоўнае — бойкія.

Не, сучасная паэзія мне не даспадобы.

*19 верасьня.* Сьвет мяняецца, і людзі мяняюцца. Сяньня наглядаў на вуліцы, як два былыя за нешта счапіліся. Насядаюць адзін на аднаго й крычаць:

— Гэта вам ужо мінулася! Годзе! Цяпер новыя парадкі.

І аднаму мінулася й другому мінулася. Цікава, хто зь іх мае рацыю, а хто зь іх адгуляў? Бо, калі абое адгулялі сваё, то чаго цяпер спрачацца? Мабыць, зьбіраюцца гуляць на новы лад абое.

*20 верасьня.* Што мае пачатак, тое мае й канчатак. Маляс выйшаў. У вытворчасьць мусіў рушыць сапрэлую муку. Разак і гэтым разам пад'яжджаў адносна заказу, але дарма — нічога ня выйграў. Пацячэ міма ягонага носу. Склаў суполку: «Вытворчасьць і разьмеркаваньне». Сымону ня надта спадабалася такая апэрацыя:

— Не ляжыць, — кажа, — у мяне душа да гэтых суполак. Тут немінуча нехта некага ашукае: або ты суполку, або яна цябе. Бо дзе ты цяперашнім сьветам знойдзеш чалавека, каб ён ротам мух лавіў, падумай!

Што праўда, то праўда. Ну, але й я не пакульлем падбіты. Тым больш што й супольнікі ў ашуканстве шчэ ня надта адукаваныя. Дзюрка, хоць бы й хацеў, дык ня ўмее, а Наязноў — той ужо зусім тэарэтык. Адзін назоў што прафэсар, а спрыту нікага.

*21 верасьня.* На фронце дзеецца нешта дзіўнае. Петраград абкружаны, Будзённы абкружаны, а разам зь ім абкружаны яшчэ тры арміі. Суцэльнае акружэньне, а генэрал Чыстоў — той яшчэ лепш — трапіў у палон на самай перадавой лініі. Прызнаўся, што ня ведаў, дзе фронт, думаў, што да немца далёка, ды сунуўся ў самыя рукі разам з машынаю. Што ж гэта робіцца, дзе ж нашая магутнасьць? І чаму генэралы ня ведаюць, дзе фронт?

Мы доўга дыскутавалі на гэтую тэму. Наязноў тае думкі, што пра Чыстова, мабыць, няпраўда, больш для агітацыі пушчана. Але Сымон сьцьвярджаў, што тут нічога дзіўнага няма.

— Усё гэта можа быць, — казаў Сымон. — Калі я шчэ за царом служыў у войску, то ў нашым батальёне быў адзін палкоўнік, які сам сябе на гаўптвахту пасадзіў. Дальбог! Выпусьціў загад: «Палкоўніка Яхрэмава заарыштаваць на трое сутак». І падпісаўся: палкоўнік Яхрэмаў. Можа, пісар пажартаваў, а можа, і сам палкоўнік з п'яных вачэй выдаў такую цыдулку. Мы гэтага ня ведаем, але як чыталі загад — слухалі ўсе. Дык то ж было за царом, а цяпер, то ўжо дзівіцца няма чаго. Якое дрэва, такі й сук.

Я не хацеў бы служыць салдатам у такога генэрала.

*22 верасьня.* Рыгору пашанцавала. Забаронена будавацца, а ў яго на хаце ўжо й нумар блішчыць. Раіліся сяньня наконт хатняга абсталяваньня. Ёсьць загад, каб здавалі перасьцягнутую мэблю. Будзем варочаць ці не? Рыгор тае думкі, што варочаць ня трэба. Хто там дакапаецца — ці перасьцяганая, ці мазалём нажытая?

Сымон таксама не раіць:

— Пакуль, — кажа, — гаспадар вернецца, дык і мэбля струхлее. Я, кажа, шчэ ў васямнаццатым годзе ў такі ж самы спосаб прыдбаў бочку. То гаспадара й дагэтуль няма, а бочка шчэ трывалая.

Пастанавілі: не варочаць і адзін аднаго не выдаваць.

*23 верасьня.* Хутка пойдзе трамвай. Загржэмбіцкі надта цешыцца: ці гэта сур'ёзна, пытае, ці так сабе пішуць? Добра было б, каб на сур'ёзна, бо на даным этапе транспарт вырашае ўсё.

І праўда. Калі штодня даваць рэйсам ад Сураскага да Камароўскага ды назад, то бяз тэхнікі не пасігаеш. Добра, калі з сахарынаю, а калі дрожджы ці ёміна якая? Тут нехаця тэхніку вітаць будзеш.

*24 верасьня.* Меў выпадак бліжэй прыгледзецца да заходняе сілы, пра якую хваліўся Авечка. Сустрэлі ў Арыентацкага. Сапраўды, дзецюкі нішто сабе — гладкія, ёмкія — відаць, што гадаваліся не на дрэнных харчах. Але асабліва страшнага нічога няма. Ведама, канкурэнцыя будзе, бо шмат у каго зь іх рукі даўжэйшыя за бацькавы. Адзін зь іх мне нават спадабаўся. Мы зь ім мелі цікавую гутарку на розныя гаспадарскія тэмы. Відаць, чалавек добра арыентуецца ў каньюнктуры цэнаў і рынкаў.

— А наконт машыны, — скончыў паважаны Пралазэвіч нашую размову, — то вы не клапаціцеся, мы гэта ўраз абсталюем... Транспартныя сродкі будуць.

Добра! З такою сілаю шчэ жыць можна. Праўда, іншыя прадстаўнікі гэтае заходняе моцы не паказалі такое жыцьцяздольнасьці. Яны таксама, як Шчыры, больш гаваруны, чымся дзейнікі. Усё крычаць: трэба! гэта трэба! гэта трэба! а гэта ня трэба! Яно й лепей: пакуль тэарэтык дыскутуе, то спраўны на практыцы сьмела можа павыварочваць яму ўсе кішэні.

*25 верасьня.* Сьвет стаў дыба. У ангельскіх цэрквах наігрываюць інтэрнацыянал, а жыды патрабуюць свае арміі й жыдоўскае дзяржавы ў Палестыне.

Сымон кажа, што нічога з гэтага ня будзе.

— Калі ўжо, — кажа, — і зьбярэцца жыдоўскае войска, то я, хоць і ня бравы ваяка, а пайду адзін супроць усёй іхнай арміі. Абы толькі кала добрага ў рукі. Ведаю я гэтых ваякаў. Калі я шчэ за Мікалаем у войску служыў, то быў у нашай роце адзін жыдок, за барабаншчыка хадзіў. Дык вось, як пойдзем, бывала, на стрэльбішча ды як пачнем з гарматаў бухаць, то яго адразу бы трасца на зямлю кідае — барабанам накрыецца й енчыць:

— Вой, — крычыць, — калі яшчэ адзін раз, то мяне ўжо ня будзе, вой!

А ты кажаш — армія. З такою арміяй толькі хіба курэй душыць.

Сымон штосьці адмоўна ставіцца да жыдоўскае ваяўнічасьці. А мне здаецца, што калі й зайца пачаць біць, то й ён будзе запалкі паліць.

*26 верасьня.* І сьмех і грэх. Сяньня да Мар'і Іванаўны заскочыла нейкая верхалазка, ейная прыяцелька.

— Вітай, — кажа, — з абноўкаю!

І круць-верць па хаце ў новай сукенцы.

— Глядзі, які фасон цудоўны! Вось тут, наперадку — Сталін, па клубох — Молатаў і Калінін, а пазаду Кагановіча пусьціла... З чатырох палотнішчаў. А матар'ял? Не, ты толькі глянь. Мроя, а не матар'ял!

Што б вы думалі? Гэта фарсуха наскочыла недзе на партрэты былых правадыроў, і як цяпер яны без ужытку, а матар'ял каштоўны, то й скамбінавала: абліччы іхныя змыла, а з палатна змайстравала сукню.

— А што я, — кажа, — мела рабіць, калі ўсё пагарэла і ўсё расхапалі, а засталіся толькі правадыры.

Сьмех, кажу, і грэх. А баба ўсё ж бяз розуму — хоць бы маўчала, а яна скрозь звоніць. Глядзі, каб за гэтыя справы шчэ пад твайго Кагановіча ня ўсыпалі. Бо шчэ невядома, чым усё гэта скончыцца.

А Мар'я Іванаўна страшэнна абурылася й з гэтаю прыяцелькай пасварылася насьмерць. Ейнае кволае сэрца не магло сьцярпець такое зьнявагі, хоць і былых, а ўсё ж правадыроў.

*27 верасьня.* Прыемныя навіны з культурнага фронту. Неўзабаве адчыняецца гарадзкі тэатар. Усё гэта добра, але ёсьць сур'ёзная затрымка: нестае адзеньня. Неарганізаваныя масы расьцярушылі ня толькі ўсю тэатральную рэквізыту, але парасьцягалі й вопратку. Меркавалі адыграць Аўгена Анегіна, але на двух артыстых знайшліся толькі адны штаны, дый тыя ні ў два ні ў паўтара. А як на грэх, то і артысты знайшліся — адзін маленькі, а другі, што вярста. Калі прымяралі порткі, то чысты сьмех: аднаму па калені, а другому — па пяты. Як разьвяжуць гэтую праблему — ня ведаю, бо які ж Аўген бязь белых штаноў? А ягоныя порткі, мабыць, ужо даўно перакроены на станік, а мо' й на анучы пайшлі.

*28 верасьня.* Круглоў аканфузіўся ўшчэнт. Мышы вытурылі яго із складу «Заготзярна». Такую сілу іх разьвёў, што давялося ўцякаць самому.

— Я, — кажа, — не вінаваты, што ўвесь парашок згарэў, а я ўмею толькі парашком змагацца.

Цяпер шкадуе, што трохі не дацягнуў:

— Калі б яшчэ, — кажа, — хоць пудоў дзясятак, то праграму змаганьня з мышамі можна было б уважаць за выкананую.

Чалавеку не пашанцавала.

*29 верасьня.* Наязноў ходзіць як хмара. Прачытаў адозву, у якой гаворыцца, што беларусы будуць жыць «без расейска-азіяцка-бальшавіцкага ўціску й чужанацыянальнага панаваньня».

— Сэрца, — кажа, — баліць, калі чытаеш такія рэчы. Хіба тутэйшыя не такія рускія, як і мы? А гэта ж проста пра нас і сказана: «чужанацыянальныя».

Дзівак! Пра што непакоіцца. А зрэшты, хто яго ведае, можа й мяне залічаць у чужанацыянальныя. Трэба на ўсякі выпадак забясьпечыць сябе ад магчымае фармулёўкі.

*30 верасьня.* Пачынаю беларусізавацца. Купіў беларускі правапіс нейкага Тарашкевіча. Два рублі ня грошы, а ў спрытных руках ды з галавою яго можна абярнуць у капітал. Але Наязнову пра гэта — ні гуку. Бо ён можа зрабіць з гэтага «вывады».

*1 кастрычніка.* Дзюрка й ягоны швагра згубілі пашпарты. Дзіўная рэч, што абое разам. Тут штосьці падазронае. Трэба разьнюхаць. Можа, ёсьць рацыя й мне згубіць.

*2 кастрычніка.* Фэцкі ўжо вылез з інтэгральнае блытаніны й дакладна вылічыў, калі скончыцца вайна, але трымае ў сакрэ-

це. Каб чалавек быў з галавою, то й на гэтай справе мог бы нядрэнна зарабіць. Ці ня купіць мне ягоны сакрэт? Трэба зрабіць спробу.

*27 кастрычніка.* Блізу месяца я не разгортваў гэтых мёртвых балонак, якім даручаў сваю жывую душу... Не да мёртвых балонак было, калі сам ледзь жывы астаўся... А хто вінаваты? Паліханаў, які запрасіў на сямейную вячорку? Жонка, якая пабаялася ўпоцемках дахаты йсьці? Ці я сам, што лішне чарку перакуліў? Усе пакрысе. А калі ўсе, то, знацца, ніхто, апрача злодзея. Але каб яго вінаваціць, трэба знайсьці. А як знойдзеш? Дзьве хутры, тры гарнітуры, два жаноцкія палітоны, мяшок цукру, невядомая колькасьць хусьця, скрыня махоркі, бідон тлушчу, мяшок рысу й шмат-шмат дробных рэчаў — зьніклі бязь сьледу...

Так здарылася катастрофа. Назаўтрае Панас прывёў варажбітку.

— Яна, — кажа, — табе ўсё выкладзе, як на далані.

Варажбітка гадала на карты, пушчала нейкі парашок на ваду, таўкла яйка ў хусьцінцы й нарэшце выклала:

— Злодзеяў было трое: адзін — рыжы, другі — чарнявы, трэці — касавокі. А пакрадзенае трэба шукаць тут, паблізу. Далёка не пайшло.

Як на талерцы! А тым часам, калі пайшла, то зь ёю пайшоў і жаночы гадзіньнік. Вось і знайшоўся злодзей! А Дзюрка шчэ і аблаяў яе: «Гэта, — кажа, — дармо што сьцягнула. У іх языкі доўгія, але затое й рукі доўгія — сачыць трэба. А праўду выкладзе».

Хадзіў я й на рынак, па сьляпой кнізе варажыць. Але варажбітка, таксама сьляпая, мабыць, узяла мяне за вайскоўца й намалола, што быццам я нядаўна з-за кроплі крыві ледзь не згубіў свайго маладога жыцьця, але што неўзабаве, не пазьней як празь месяц, я зноў вярнуся пад роднае скрыло, якое мяне абагрэе, як прамень сонца. Цьфу! Толькі дваццаць рублёў зьбяёдаў!

Рыгор параіў зьвярнуцца да службы парадку. Добра, скажам, зьвярнуўся б, але які толк?

— Знайсьці, — кажа Рыгор, — ня знойдуць, а так, для ачышчэньня грамадзкага сумленьня.

Дзякую! Каб мяне ўшчэнт пачысьцілі, тады яшчэ іншая рэч. А то яшчэ нейкія крошкі пазасыпаліся. А тут могуць так пачысьціць, што ня толькі сумленьня — нічога не застанецца. Горш за ўсё, што спачуваньня ні ад каго ня бачыў. Усе толькі раюць, а Сымон, той проста сьмяецца: «Рабуй нарабаванае» ды рагоча. А чаго рагатаць?

— Не па-суседзку, Сымон, — кажу, — тут плакаць трэба, а не рагатаць.

— Дармо, — кажа, — па гэтым дзеці будуць. Чалавек толькі сам сябе не перажыве, а так — усё здолее! Калі я быў у трэсьце, то ў нас адзін скарбнік усю скарбонку вытрас сабе ў партфэлю — дваццаць тысячаў натрос. Але не пасьпеў бядак да хаты дайсьці, як дарогаю ў яго перакралі гэтыя тысячы. Думаеш, павесіўся? Ані Божа барані. Праз год ужо ў другім трэсьце краў. Так вось і тут.

Недарэчнае параўнаньне, але ён мае рацыю, што чалавек усё перажыве. Перажыў і я гэтую катастрофу.

*28 кастрычніка.* Дзеля свайго калецтва тры тыдні не чытаў газэтаў. А Рыгор казаў, што шмат было цікавага. Пісалі, што вораг ужо зламаны, арміі Цімашэнкавыя зьнішчаныя, ён сам звольнены, а Будзённы ўжо на Лубянцы вусамі шаволіць. Даскакаўся «брацішка наш Будзённы на кані сваім». Сяньня сам прачытаў. Праўда. Усё гэта ёсьць. Але Наязноў штось пэсымістычна ставіцца да ваенных падзеяў: «За летам яшчэ зіма будзе, а там — ізноў лета. Хто яго, — кажа, — ведае». Хітры чалавек гэты Наязноў. Ніколі не дакапаесься, што ён думае. Але зь нейкімі крыніцамі ён зьвязаны. Гэта — напэўна. Дакапаюся!

*29 кастрычніка.* Хамовіч (ёсьць такі музыка на нашай вуліцы) пайшоў рэгістраваць духовую аркестру, бо ёсьць загад, каб грамадзяне рэгістравалі музычныя інструманты, якія ім не належалі. Мы яму не раілі.

— Дзівак, — казалі, — хто яго ведае, што гэтыя трубкі не твае?

А ён іх вайною падхапіў недзе поўнаю капэляю.

— Не, я хачу ўсё паводле формы, бо маю клясычныя канцэрты выдаваць — вось толькі барабана нестае.

І за што толькі людзі не хапаюцца!

*30 кастрычніка.* Хто я такі? Дзіўна. Такога пытаньня я сабе шчэ ніколі ня ставіў. А сяньня ў Арыентацкага адзін нейкі тып (клічуць яго Юрэц Бладук) прычапіўся да мяне:

— Хто Вы такі? — пытаецца.

Як хто? Чалавек.

— Чалавек? Гэта на сяньня ніяк не гучыць. Мы ўсе людзі. І чалавек на сяньня — дрэнь, пустое месца, словам — міт і больш нічога.

— Але ж выбачайце...

— Нічога ня выбачу. Я ў Вас пытаюся — хто Вы паводле нацыі?

Дзівак. А што мне да нацыі?

— Ну, сяньня я, скажам, беларус.

— А заўтра?

— Скуль жа я ведаю, што заўтра будзе? Я не прарок, я — дыялектык.

— Ах так? То Вы, — крычыць, — балота, Вы гнільлё, Вы не патрэбны для нас тып! Вы...

І панёс. Я ўжо ўзяўся быў за шапку, каб уцякаць, але Арыентацкі заспакоіў:

— Плюй, — кажа, — ён толькі гаворыць, а зрабіць нічога ня можа. У іхнай хэўры ўсе такія, але народ спакойны.

Усё ж мяне гэта не заспакоіла. Калі пачынаюць ставіць такія пытаньні, то недзе нешта ёсьць. Мабыць, я штосьці прагледзеў.

*1 лістапада.* Усе рынуліся браць патэнты. Хто — на піўніцу, хто — на шаўца, хто на дробны гандаль. Раілі й мне не зацягваць справы, але я шчэ не наважыў, на якую спэцыяльнасьць падацца.

— А ці табе ня ўсё роўна, — кажа Сымон, — на сяньня або паперка. Бяры хоць на музычнага майстра, а пасьля ўжо расчаўпемся, хто ты ёсьць.

А швагра Апанаса Дзюркі, дык той выбраў патэнт і нават шыльду павесіў. На белай габляванай дошцы нарысаваў дзёгцем: «Раблю сталы, шафы, крыжы, труну ды іншую мэблю, а таксама прыймаю розныя заказы. Мікіта Гузак». А ніжэй дробнымі літарамі напісаў: «Тут купляем цьвікі негарэлыя». Але дарма — заказаў ніхто не нясе, і шыльда ў яго целяпаецца так, для собскага задавальненьня.

Такое ж палажэньне і ў іншых патэнтшчыкаў. Мабыць, таму што наш куток глухі, далёка ад цэнтралі.

*2 лістапада.* Быў дыспут пра вайну. Сяньня зноў усёй парафіяй чыталі газэту. Ужо нямецкае войска ўвайшло ў Крым, прасякнула ў цэнтар Данецкага басэйну й наблізілася да Масквы.

Сымон пра гэта сказаў, што яго Данбас не цікавіць:

— Мне вугольля ня трэба. Я дроў назапасіў, дзякаваць Богу. А вось што Крым агортваюць — гэта добра, бо колькі там дармаедаў пуза на сонцы грэла ды ў вадзе паласкалася, колькі хлеба марнатравілі. Не давядзі Бог!

На гэтыя словы абурыўся Наязноў:

— Вы, даражэнькі, ня тое кажаце. Не адны там дармаеды, былі й трудзяшчыя.

— А я, — узьняўся Сымон, — не трудзяшчы? А ці паласкаў я хоць што-колечы ў гэнай цёплай вадзе? Га? Што Вы на гэта, пане прафэсару?

Наязноў на гэта нічога не адказаў, і дыспут зноў набыў канкрэтныя формы. Дзюрка разважыў, што калі на фронце так справа стаіць, то хутка й вайна скончыцца. Зь ім шмат хто згадзіўся, і пачалі нават падлічваць — калі? Але Сымон зноў адцягнуў увагу ўсіх у іншы бок.

— Цяпер, — кажа, — нельга варажыць, калі скончыцца вайна, бо якая ж гэта вайна? Вось даўней ваявалі... Чытаў я недзе, як старабытныя цары біліся... Выйдуць гэта ворагі ў чыстае поле, стане адно войска супраць другога й пачалі:

— У вашага начальніка, — кажуць адны, — маці кульгавая.

— А ў вашага, — кажуць другія, — дзед быў на адно вока крывы.

— А вы вяроўкаю хлеб кроіце.

— А ў вас дзеўкі ўсе рабыя.

*4 лістапада.* Суполка «Вытворчасьць і разьмеркаваньне» лопнула. Дзюрка злавіў Наязнова на жывой справе, як той цадзіў супольны пяршак у сваю бутэлечку з-пад парфумы «Тэжэ» «Чырвоная Ружа». Апанас так зьдзівіўся, што ледзь не пашкодзіў бутлю з самагонам аб Наязнову галаву.

— Каб не пяршак, — казаў, — дальбог, нешта покнула б — ці бутля, ці ягоны чэрап. Першаку пашкадаваў.

І хто б мог спадзявацца, што Наязноў здольны на такія ўчынкі? Такая адукаваная, разумная асоба.

А Сымон здаволены:

— Я табе казаў, што тут зладзейства не мінеш. У суполцы хоць сьвяты — і той красьці будзе. Такая ўжо ўрода ўсіх гэтых суполак, каб зь іх цягнуць.

Асноўны капітал і прадукцыю падзялілі паміж былымі сябрамі ў роўных часьцінах, а інвэнтар пусьцілі на жэрабя. Зьмеявік усё ж застаўся ў мяне.

*5 лістапада.* На гаспадарска-палітычным адцінку нейкая актывізацыя. Кіндзюк Банадысь зрабіў на захад ажно тры рэйсы, Арыентацкі — два. Туды машыну — назад машыну. Нешта адвозяць, нешта прывозяць. Рыхтуюцца ў падарожжа і іншыя прадстаўнікі. Авечка гаворыць, што ўлагоджваюць грамадзкія справы. Магчыма. А тым часам заўважаецца ажыўленьне й на мясцовым рынку. Дрожджы ўскочылі ў цане, зьявілася сахарына, кімсьці выкінутая на рынак, вялікія партыі гарадзенскай махоркі. Загржэмбіцкі, як шалёны, гайсае ад рынку да рынку. Ажыўленьне відавочнае.

*6 лістапада.* Разак апярэдзіў: купіў Фэцкага сакрэт пра канец вайны і ўсе ягоныя, як ён казаў, аўтарскія правы. Ну, ад

гэтага нічога не даведаесься. Усё толькі прыглядаемся, што ён пачне рабіць. Сымонісе ўдалося прасачыць, як сяньня раніцою зь Яськавага двара вывозілі нечага цэлы воз — ці на схоў, ці на продаж — не дагледзела. Гэтая навіна ўзрушыла ўсю вуліцу. Дзюрка ўжо з усімі раіўся, што рабіць зь цьвікамі — ці хутчэй збываць, ці хаваць у яму. Але што можна параіць, калі самі ўсе, як упоцемках.

За Разаком устаноўлены ўзмоцнены нагляд.

*7 лістапада.* Пацеха! З маймі знаёмымі беларусамі здарылася аварыя. Хацелі яны ў нейкі аддзел прапхнуць свайго чалавека, але выйшла асечка. Другі іхны, таксама беларус, ткнуў на гэтае месца якогась свайго знаёмага палячка. Колькі ні крычэлі, колькі рукамі ні махалі — дарэмна: палячок неяк вельмі хутка ўкараніўся, і яго ўжо ня выдзераш цэлай грамадой. Спрытны чалавек — асечкі ня зробіць.

*8 лістапада.* Іншага чалавека дык і гора не навучыць. Сяньня сустрэў гэнага Дзівака (прозьвішча ня ведаю, але, мабыць, так яно й будзе), што нам вайною на складах назаляўся. Я нават зьдзівіўся, што ён шчэ жывы. Худы, абшастаны, а жывот падцягнула пад самыя рэбры. Цяпер недзе за настаўніка працуе.

— Вы, — кажу яму, — даражэнькі, хоць і настаўнік, а памылку ўрэзалі.

Уздыхнуў, але на словах не прызнаецца.

— Я, — кажа, — не шкадую, але жонка насядае, штодня пілуе. А што я меў рабіць, калі маё пераконаньне не дазваляе рабаваць?

Сапраўды — дзівак! Пераконаньні... Іх, браток, у гаршчок ня ўсыплеш — навар ня той. Праўду кажуць, што гарбатага магіла паправіць.

*9 лістапада.* Круглова не задавальняе сытуацыя на сучасным рынку.

— На рынках, — скардзіўся, — пануе страшэнны хаос. На Чэрвеньскім за картовы пінжак далі лапатку бараніны й пяць кілё мукі, а на Камароўцы такі самы пінжак ідзе за дзьве лапаткі. Такая каньюнктура, сьцьвярджае, не заахвочвае да разьвіцьця прыватнага капіталу й не спрыяе цэнтралізацыі мясцовага капіталу.

У сувязі з гэтым ён наважыў падаць да ўправы распрацаваную ім шкалу сталых цэнаў на зацьверджаньне. Рыгор ня раіў падаваць такую цыдулку, бо што да цэнаў, казаў ён, то на гэны конт яшчэ ня спушчана ніякіх дырэктываў, і пытаньне тым часам вісьне ў паветры.

Сымон даў больш практычную параду:

— Ты, — кажа, — сяньня на рынак выкідай ватоўкі й душагрэйкі, бо цяпер на іх самы сэзон, а картовыя пінжакі й нагавіцы прытрымай да вясны. Увесну пойдуць як вада, і цэны тады будзеш сам дыктаваць. Гандляваць, браток, трэба ўмеючы. Бальшавікі дваццаць год крычэлі: «Вучыцеся гандляваць» — і то не наўчыліся, а ты хочаш за адзін год усіх пераплюнуць.

Гэта супакоіла Круглова.

*10 лістапада.* Пакуль што выбраў патэнт на майстру музычных інструмантаў. Чаму? Я й сам ня ведаю. У Рыгора ўзяў паламаную гітару, павесіў на цьвік, купіў францускі ключ і малаточак. Такім парадкам майстроўня абсталявана цалкам. А заказчыкі мне не патрэбныя. Я тым часам і бязь іх пражыву.

*11 лістапада.* Яшчэ раз пераканаўся, што культура — непатрэбная рэч. Язэп Супрынайц (працуе недзе каля ўправы) зацягнуў у сваю сталоўку на полудзень.

— Хадзем, — кажа, — у мяне лішнія талёны ёсьць. Паглядзіш, як мы харчуемся.

Пайшлі. Далі на пачатак буракоў па талерцы, а пасьля — каму курыцы кавалак, каму рыбіну — на выбар. Пасёрбалі гэта мы буракоў, а тады ўзяліся рыбіну калупаць — хто дзераўлянай лыжкай, а хто пальцамі, бо відэльцаў не далі. Толькі гэта я дакалупаўся да хрыбеціны, як пры суседнім стале падняўся вэрхал. Якісь хлапец, чыста апрануты, запатрабаваў, каб яму далі відэлец.

— Які гэта, — крычыць, — парадак? Есьці рыбу-карася мне далі дзераўляную лыжку! Я, можа, да заходнеэўрапэйскай культуры далучыўся, а вы што падсунулі? Хамства!

Але афіцыянтка, да якое адрасаваўся гэты хлапец, відаць, была моцнага марксісцкага ўзгадаваньня. Яна нават і не зірнула ў ягоны бок, бразнула лыжкамі аб стол і толькі мімаходзь кінула:

— Нічаво, жраць захочаш, дык зжарэш.

Чалавека, які пасьпеў далучыцца да Эўропы, супакоіў ягоны сусед:

— Дарэмна, даражэнькі, порах трацiце. Відэльцаў не дадуць, бо іх няма. А вы лепш так рабеце, як я: з сабой прыносьце ўвесь інвэнтар.

Другі сусед таксама параіў:

— А то можаце яшчэ й так зрабіць, як мы робім: узяць карася-рыбіну дахаты і ўжо там яе, падлу, раскалупаць па-культурнаму, з дапамогаю відэльца.

Не пасьпеў усьцішыцца эўрапэец, як на другім канцы сталоўкі ўзьняла лямант мясцовая кабеціна:

— Дзе, — крычыць, — навар ад курыцы? Чаму, — крычыць, — курыца вараная, а буракі тым часам нішчымныя? Хто схлёбвае навар?

Тут і ўсе агледзеліся. Праўда. Буракі абсалют посныя, а курыца тым часам недзе варылася. То дзе ж падзеўся курыны навар? Народ пачаў хвалявацца. Больш актыўныя рынуліся да загадчыка, але той, як гэта заўсёды бывае ў такіх выпадках, недзе зьнік. Рушылі на кухню, да галоўнае кухаркі.

— Ты што, — крычаць, — зараза, без навару даеш? Дзе навар ад твае курыцы?

Наперад высунуўся кухар, ейны памагач.

— Я шчэ не навары́ў, — рагоча, — таму й навару няма.

Сунуліся да яго бліжэй, але кухар, здаравенны дзяцюк, з бліскучым чырвоным тварам, падхапіў нейкі велічэзны зялезны палонік.

— Асадзі, — кажа, — бо як дакрануся да каторага гэтым начыньнем, адразу звару. Вось вам і навар будзе.

Актывістыя асадзілі. Тут пасьмялела кухарка.

— Што я, — кажа, — разьмеркавальнік які ці што? Вы чаго прыліплі? Нашая справа дробная — нам што даюць, тое й кідаем у кацёл.

— Нам хоць і ката падсунь, — падтрымаў кухар, — мы й таго шурханем. Мы, кажа, усё роўна з вашага катла не ямо.

Гэтыя цьвярозыя словы супакоілі народ. «Сапраўды, — кажуць, — кухары маюць рацыю. Ім што ні дай — усё закалбоцяць. Ізноў жа, не ад усякай курыцы навар будзе». Актывістыя разышліся.

Калі мы ўжо дакалупалі рыбіну й меліся адыходзіць, ля парогу, дзе стаяла бочка зь півам, пачалі адыгрываць новы нумар. Цяпер кон павёў нейкі мастак.

— Дзе загадчык? — крычыць. — Давай загадчыка! Бясчынства!

Гэтым разам зьявіўся й загадчык.

— Вы што, — пытаецца, — грамадзянін, у сталоўку прыйшлі бузу церці ці сваю порцыю зьесьці? Аб чым лямант?

Тут мастак вельмі вобразна й маляўніча пачаў выкладаць, што ў сталоўцы няма парадку, што ён стаў пры хвасьце дваццатым, а як дайшоў да бочкі, то ўсё піва «па блату» выпілі. «А мне, — крычыць, — у конаўку засіпела адна пена. Чаму так, калі я мастак і хачу конаўку піва?»

Загадчык зноў жа досыць талкова растлумачыў, што назіраньне за правільным ходам чарады — справа самых працоўных, спажыўцоў, а ягоная адказная справа — забесьпячэньне паводле формы.

Тут і народ падтрымаў загадчыка ды насеў на мастака:

— Слушна! Які ён мастак, калі няздатны без чаргі піва сербануць?

— Дрэнь ты, — кажуць, — а не мастак!

— А яшчэ й культурны!

— Пінская варона!

Зьбянтэжаны мастак сігануў із сталоўкі. Відаць, пабег із скаргаю да вышэйшых інстанцыяў. Сьледам выйшлі й мы:

— Ну, як, — пытаецца Супрынайц, — спадабалася табе? Як харчы?

— Што ж, — кажу, — харч? Дармо. Ведама, па такіх харчох жыць будзеш, але... Ну а сталоўка — таксама акурат ранейшае грамадзкае харчаваньне: і людзі тыя, і парадкі тыя. Адно, — кажу, — добра — вясёла, бы ў цырку.

Калі мы разьвіталіся і я пайшоў дахаты, то праз усю дарогу думаў пра культуру. Сяньняшнія назіраньні ў сталоўцы мне далі, што культура — зусім лішняя нагрузка, бо безь яе шмат весялей.

*12 лістапада.* Зноў пішуць — хутка пойдуць трамваі. Цікавая рэч — чалавечая натура. Як прачытаў першы раз — паверыў, прачытаў другі раз — ужо вера ўдвая паменшылася. А што будзе, як трэці раз прачытаю?

*13 лістапада.* Нагляд устанавіў, што Разак шукае пакупніка на крамніну. Сяньня прасачылі, што зь ягонага двара зноў выехала хурманка. Цяпер няма сумліву — Яська збывае лішкі. На нашай вуліцы агульны спалох. Што рабіць зь лішкамі?

*14 лістапада.* Ад сацыялізму да сьпірытызму — адзін крок. Учора я ў гэтым сам пераканаўся. Наязноў прычапіўся, каб пайсьці зь ім да нейкай Ніны Васільеўны, што сьпірытычныя сэансы выдае.

— Хоць ты, — кажа, — ні ў якое таямніцтва ня верыш, але ў Ніны Васільеўны твой нігілізм разьляціцца ў друзачкі.

Пайшлі. Дарогаю Наязноў апавядаў, хто такая Ніна Васільеўна. За бальшавікамі яна лічылася недзе «па асьветніцкай лініі», выступала на ўсіх сходах і ўсё крычэла: «Камунізм! Сацыялізм! Мы — бальшавікі!». А была яна беспартыйнай бальшавічкай, мужык жа ейны быў парцейны бальшавік. Цяпер ён у ролі бравага камісара недзе люта змагаецца на ўсіх франтох, ну, а бабе,

натуральна, карціць даведацца, ці хутка ён вернецца дзеля пакаёвага змаганьня. Вось яна й рынулася ў сьпірытызму, каб хоць дух які дарадзіў ёй у гэтай самотнай справе.

Мы прыйшлі якраз у пару. Выклікалі духа Аляксея, але дух нешта зацяло — ён чамусьці не адгукаўся на выклік: ці то ён дзе па малой справе адхінуўся, ці можа яму кумпанія не спадабалася. Бо кумпанія, трэба сказаць, была несамавітая: сама Ніна Васільеўна, асоба ўжо ладна пацёртая, ейная прыяцелька, нейкая абскубаная істота, адзін былы камуніст з абвіслым чэравам і яшчэ нейкі стары хрэн. Калі не лічыць мяне й Наязнова, дык зусім зразумела, што ад такой кумпаніі які хочаш дух нос адверне. З гэтае, мабыць, прычыны й другі й трэці духі не адгукаліся. Нарэшце выклікалі нейкага духа Макса. Той, праўда, адразу пачаў круціць сподачкам. Напачатку ён настукаў, што мужык Ніны Васільеўны вернецца праз два тыдні сам, бязь ейных клопатаў. Пасьля адказаў, што вайна скончыцца праз тры тыдні. А якая ж улада будзе, запыталіся ў яго ўсе, наша ці не? Ты, дух, скажы толькі адно слова — так ці не. І дух адказаў «так». Тут жанкі запляскалі ў далоні, а былы камуніст пагладзіў сваё чэрава.

Я, ведама, ня даў гэтаму веры, але на ўсялякі выпадак занатаваў у дзёньніку: вайна скончыцца трэцяга сьнежня.

Калі варочаліся з Наязновым дахаты, то я спытаўся: ці можна гэта з навуковага гледзішча пагадзіць такія дзьве рэчы, як марксізм і сьпірытызм. Ён адказаў, што калі ўжыць дыялектычны мэтад, дык, безумоўна, можна пагадзіць якія хочаш рэчы. Хоць ён і прафэсар, але тут, як мне здаецца, збрахаў.

*17 лістапада.* Назіраньні апэрацыяў Разака пакуль што не далі ніякіх станоўкіх вынікаў. Зноў вывезены машына мэблі й воз мяхоў. Што ў мяхох — не ўстаноўлена.

*19 лістапада.* А ў беларусаў няма адзінага фронту. Сяньня чытаў у газэце пра заходнікаў і ўсходнікаў. Вынікае, што яны паміжсобку не зусім у згодзе. У чым разыходжаньні, я з артыкулу так нічога й не зразумеў, але разыходжаньні ёсьць. Трэ будзе даведацца пра гэта ў Арыентацкага.

*25 лістапада.* Меў сустрэчу з прадстаўніком аграрыяў. Да Рыгора прышкандыбала аж з-пад Чэрвеня ягоная цётка. Ну, ведама, мы ўсе сабраліся да Рыгора, бо кажнаму цікава даведацца, што на сьвеце дзеецца. Седзімо й слухаем, як цётка лепартуе:

— А дзетачкі мае, — казала яна, — ня бачыла я гораду два гады, каб яго й век ня бачыць. Ледзь не здурэла. Прывезьлі гэта

мяне тыя хлопцы, што на тракце пасадзілі ў машыну, ды ссунулі прост у руіны.

— Ну, — кажуць, — цётка, табе направа, а нам налева. Дыбай да свайго Рыгора.

Сказалі гэтак і паехалі. А я стаю, як дурная. Зірнула направа — пустка. Зірнула налева — пустка. Зірнула сьпераду — дзірка. А гораду няма. Села гэта я на каменьне дый плачу. Ажна тут нейкі добры чалавек трапіўся:

— Чаго, — кажа, — цётка, вільгаць пушчаеш? Паводле якога здарэньня?

Ну я яму й выклала як сьлед: ехала, маўляў, у Менск, да Рыгора, а трапіла сама ня ведаю куды.

— Дык, — кажа, — гэта ж і ёсьць Менск, а сядзіш ты, цётка, на самай Ляхаўцы.

І скіраваў мяне, дзякаваць, куды трэба.

Мы ўсе надта сьмяяліся, як гэта цётка гораду не пазнала? Але Сымон давёў, што такія здарэньні могуць быць:

— Гэта, — казаў, — ня дзіва, што цётка гораду не пазнала. Мой прыяцель Юрэц Бладук, дык той аднойчы хаты роднае не пазнаў, а й выпіўшы быў ня надта. Прыйшоў гэта ён аднойчы ўвечары дахаты й пытае: «А венікі сьвежыя ё?» І пачаў распранацца. Скінуў гэта ён, выбачайце, усё й палез на сьцяну з гальнём, які яму добры сынок падсунуў. «Ну, — кажа, — і напаруся сяньня». Ускочыла жонка ў хату, а ён, выбачайце, зусім голы лезе на сьцяну ды гальнём сябе па бакох хвошча. «Паддай, — крычыць, — пары». Дзецям, ведама, пацеха, а жонка абурылася: «Ты гэта што? Звар'яцеў? Сорам згубіў?» А ён сваё: «Дырэктар, — крычыць, — давай сюды дырэктара! Гэта што за непарадкі! Чаму, — крычыць, — бабы ў мужчынскай лазьні?» Ледзь яго ўгаманілі, што гэта ня лазьня, а свая хата. Дык вось якія здарэньні бываюць. А гораду не пазнаць — гэта глупства, заўсёды можна.

Пакуль мы слухалі апавяданьне Сымона, Згржэмбіцкі меў інтэрвію з чэрвеньскай цёткай у пытаньні тамтэйшых коштаў. Выявілася, што яйкі — 30, сала — 40, а попыт ёсьць на дрожджы й соль.

*29 лістапада.* Нешта недзе дзеецца, а што — невядома. І чуткі пайшлі нейкія, надта сакрэтныя. Рыгорава жонка прысягалася, што сама на рынку чула, як казалі пра тры самалёты і адну бомбу. Дзюркаў знаёмы пад сакрэтам паведаміў, што на фронце заламаліся, але хто — яшчэ не даведаўся. Аднак казаў, трэба чакаць вялікіх падзеяў. Наязноў таксама ходзіць вельмі

таямніча й нічога не гаворыць. Відаць, нешта й ён чуў. Каб мяне гэта надта турбавала, дык не, але ўсё ж цікава ведаць, зь якога боку вецер дзьме.

*2 сьнежня.* Апанас Дзюрка набыў капялюш. «Годзе, — казаў, — у носе калупаць, пара й з новай Эўропай вітацца». Праўда, капялюш несамавіты, нібы стары грыб сядзіць на ім. Але Дзюрка надта ганарыцца.

— Цяпер я сьмела, — кажа, — магу да Эўропы далучацца, і ніхто мяне не затрымае. А йзноў жа, — кажа, — годзі нам памыі на галаву лілі, пара й рот разявіць.

А Сымону не падабаецца такое пераабсталяваньне Дзюркі.

— Ат, — кажа, — дармо, хоць ты й пад капелюшом ходзіш, а ўсё роўна дурань. Хіба твая галава пад капялюх выструганая? Ёю палі забіваць і то вялікі гонар.

Сымон, ведама, як кансэрватар, уважае, што на ўсякую галаву павінна быць свая пакрыўка.

*5 сьнежня.* Ёсьць подлыя людзі на сьвеце. Сяньня зьявіўся Хамовіч (той, што цэлую капэлю захапіў) і прынёс рапараваць нейкую басэтлю.

— Вы ж, — кажа, — шаноўны, музычны майстра. Патэнту выбралі. Дык, будзьце ласкавы, адрамантуйце гэты музычны струмант. Прашу.

І нагою шмарганууў. Зараза! Хіба ён ня ведае, што зь мяне такі ж музычны майстра, як зь цеста куля. Я яго, ведама, пагнаў зь ягонай басэтляй, а ён пагражаў данесьці, што я не музычны майстра, а сымулянты. І данясе. Такая паскуда гэта зробіць. А данясе — могуць быць непрыемнасьці. Трэба, няйначай, ліквідаваць прадпрыемства ды мяняць кірунак.

*7 сьнежня.* Загржэмбіцкі ў выніку нядаўняе размовы з чэрвеньскай цёткаю набыў каня й тэрмінова скіраваўся ў Чэрвеньшчыну.

*10 сьнежня.* Хадзіў ва ўправу. Там сустрэў былых актывістых. Разам за бальшавікамі працавалі. Нічога! І цяпер ня крэкчуць: адзін ва ўправе на аржаным месцы, другі недзе на базе, а трэці — так, каля базы. Дармо, не прападуць!

— Як жывяце? — пытаюся.

— Ды так, — кажуць, — нічагуткі — пракідаемся патрошкі. А вы?

А што я? Ім пракідвацца добра, калі яны на службе, а мне, саматужніку з патэнтам? Тут як ні пракідвайся, а Хамовіч цябе ўраз расшыфруе. Не, трэба нешта рабіць.

*14 сьнежня.* Фэцкі кінуў голую тэорыю й перакінуўся на практычную матэматыку. Цяпер лічыць, што гэта, скажам, было б, каб у Менску наладаваў машыну дрожджаў, шугануў іх у Заходнюю, а там абмяняў бы на сала, яго — у Менск і тут бы рэалізаваў гэтае сала на вольным рынку на грашовыя знакі. Як бы гэта ўсё выглядала? Папярэдняе інтэграваньне дае нешта такое жудаснае, што нават на звыклай да лікаў лысіне Фэцкага валасы дуба сталі. Фэцкі лічыць на два варыянты апэрацыяў: адзін — калі дрожджы на рынку й машына чужая, другі — калі машына службовая й дрожджы службовыя. У апошнім выпадку выходзяць такія астранамічныя лікі, што калі аб іх прачуў Загржэмбіцкі, дык у бедака ад перапуду раптам аслабеў жывот.

*18 сьнежня.* Вайна скрышыла ўсе спэцыяльнасьці. Круглоў і той занядбаў сваю мышыную спэцыяльнасьць ды скіраваўся на купца. Праўда, ён больш прадае, чымся купляе, але гэта ня шкодзіць яму мець пэўную, як ён кажа, дывідэнту. Учора меў ад нейкай апэрацыі такі гешэфт, што ад лікаў млосна робіцца.

— Каб гэта, — казаў ён, — на мірную пару такая дывідэнта, дык жонку сваю ўшыў бы ў каракулі ды ў саболі, а сам бы малясоўку смактаў із залатое конаўкі.

Вось тут і кажы пра адукацыю. Недавука, мышыны спэцыялісты, а галава — міністэрская.

*20 сьнежня.* А ўсё ж у паветры нечым пахне. Бо Мар'я Іванаўна й тая зьмяніла тон. Сяньня ў яе засьпеў нейкага невядомага з падазроным абліччам. Казала, што гэта ейны знаёмы шофер, нават далёкі родзіч. Прывіталася са мной надта скупа, як з чужым. І трымаецца неяк больш бадзёра й незалежна.

— Сядайце, — кажа, — таварыш Чужанінаў.

Цікава: учора быў Ванечка, а сяньня — таварыш Чужанінаў. Не, тут штосьці ня так. Ці тут гэты шофер прычынаю, ці то іншыя справы, больш сакрэтныя. У кажным разе трэба давядацца, які тут вецер пад бабін хвост дзьме.

*21 сьнежня.* Купляў цацкі на ёлку. Дзіўная рэч: вайна, скрозь галеча, а людзі ёлку ладзяць. Разам са мной купляў цацкі нейкі тып.

— Дайце мне, — кажа, — якіх-небудзь вясёленькіх цацак.

— Вясёленькіх? — кажа крамніца.— Калі ласка.

І шусь на прылавак гармату, гранату, самалёт ды яшчэ якіхсь пушак.

— Не, — кажа тып, — дзякую за такую вясёласьць. Я ўжо гэтага наглытаўся досыць.

— Дык якога ж, — пытае, — храна вам трэба?

— Дайце мне якуюсь цацачку, якая б клікала да жыцьця, а не да сьмерці.

— Тады бярыце барабан або трубу.

— Не, ня тое! Мне б вось такую мірную цацачку, каб, скажам, певунка або птушачку, бо ў мяне ўжо гэтая чырвань вочы выела.

— Ну, дык наце вам коніка.

І паднесла да яго носу валавянага коніка.

Той аж напалохаўся.

— Вы, — кажа, — даражэнькая, што гэта мне сунеце?

— А што? — пытае.

— У гэтага каня хвост уніз вісіць, а мне трэба, каб угару стаяў.

Тут ужо й крамніца раззлавалася:

— Вы, — кажа, — грамадзянін, не выдумляйце тут! Што вы хочаце, каб я за вашыя за тры маркі ды хвост угару падымала? Сорам вам!

Публіка, што ў краме была, падтрымала крамніцу:

— Сапраўды, — кажуць, — грамадзянін, нічога не выдумляйце. Якое вам яшчэ трасцы нестае? Бярэце, што даюць, дый годзе. Не зазірайце пад хвасты.

Так і пайшоў гэны грамадзянін нічога не купіўшы. А й сапраўды дзівак. Хіба яму ня ўсё роўна, куды хвост вісьне — уніз ці ўгару? Я купіў барабан, дырыжабаль СССР, дзьве гарматы, пяць бліскучак, дзясятак пшыкавак. Жонка была задаволена.

*24 сьнежня.* Калі ўжо не пашанцуе, дык і дзеўцы ветрам надзьмуе. Гэта праўда. Небараку Загржэмбіцкага, якога колькі разоў ужо калечылі, зноў паклалі на лапаткі. Вярнуўся з падарожжа голы, як бізун. Сустрэла яго ў лесе пад Чэрвенем нейкая вясёлая кумпанія й кажуць: усё ваша — будзе наша, а вы, пане, — вэк! Яшчэ й усыпалі троху на дарогу, каб не замёрз часам. Ні каня, ні саней, ні солі. Кідаецца цяпер ува ўсе бакі, як вар’ят. А што з гэтага кіданьня будзе — невядома.

*28 сьнежня.* Куцьцю спраўляў дома, але дзе гэтыя тры дні калядаваў — нічога ня ведаю. Адно толькі памятаю, што пілі, але дзе й колькі — хоць зарэж, ня ўспомню.

Недарэчная рэч, гэтыя старамодныя сьвяты.

*29 сьнежня.* Чуў я калісь аднаго разумнага чалавека, які казаў: «Трымай чалавека голадам, дык ён будзе мець толькі адно жаданьне, а накармі яго, дык жаданьняў у яго зьявіцца безьліч».

Гэта, мабыць, праўда. Сяньня спаткаў свайго даваеннага, яшчэ з-за царскіх часоў, прыяцеля. Быў ён трохі афіцэрам, да Ўрангеля падаўся, там нешта рабіў, а цяпер нейкім парадкам ізноў тут апынуўся.

— Якім, — пытаюся, — ветрам зноў сюды закінула?

— Ня ветрам, — кажа, — а самаходам. Радзіма пацягнула.

— Ого, — кажу, — дык васпан ізноў угару пайшоў. На самаходзе.

— Эт, якая тут гара, — кажа, — мышыная. Хіба ты ня ведаеш, кім я раней быў? Дзеншчыка меў! А цяпер сам за халуя ў гэтага дзеншчыка. Дык па-твойму гэта парадак?

— Ну, ведама, — кажу, — у вашым стане дык парадак незайздросны. Але ж выгляд у вас, тым часам, гладкі.

— Што выглёнд? Гэта глупства. Бо не аб адзіным хлебе жывы чалавек бывае.

— Праўда, — кажу, — да хлеба патрэбна й скварка.

— Ды я не аб скварцы! Пакуль даволі й гэтага. Надоечы вось дваццаць кілё масла загарнуў. Пакуль шчэ сяк-так самадапамагаемся.

— Ну й памагай Бог, — кажу, — абы ціха.

— Дзякаваць. З гэтага боку ўсё ў парадку, ніхто не падкалупне. Але не аб гэта ходзіць. Дзе духовая страва, я пытаюся? Улада дзе? Гонар? Вось аб што ходзіць! Вось чаго нестае!

— Але ж, — кажу, — вайна! Цяпер абы жывот.

— Ну ты, даражэнькі, дробна плаваеш. Адным жыватом доўга ёрзаць ня будзеш. Захочацца й на ногі стаць. Вось гэтага я й хачу!

Разьвіталіся мы, і ён бадзёра закрочыў з узьнятай галавой, быццам трымаючы на версе брыля тую славу, да якой чалавек імкнецца.

Вось тут і зразумей чалавечую натуру. Пакуль з чужых талерак кавалкі зьбіраў, усё было добра, а як ужо нажэрся чужога хлеба — на вышыню славы палез. Улады захацеў!

Праўда, што чалавеку ніколі нестае, і жаданьням ягоным няма канца.

*2 студзеня.* Новы год сустракалі ў Рыгора. Банкет наладзілі ў складку, натурай — каму што Бог паслаў. Больш налягалі ў кірунку пітва, бо гэты прадукт у нашай парафіі шануюць перад усім. Гасьцей было шмат: і сваіх, і чужых. Банкет пачаў Рыгор. У сваёй уступнай прамове ён адзначыў, што гэты новы год — першы такі ўдалы год, і хаця й ня з нашае віны, але ён вольны.

— Я, — кажа, — у вайну пагарэў ушчэнт. Але што вы бачыце ў мяне сяньня? Дзе вынікі вагню? Няма іх! Вось жа я й кажу: дай Бог кажнаму так пагарэць. Дык жадаю ўсім вам такога шчасьця, якое мне паслаў Малох вайны, — так скончыў Рыгор сваю прамову й перакуліў чарку.

Мы зрабілі тое самае, а пасьля пачалі падвойваць і патройваць. Рыгоравы госьці, ягонае начальства з управы, больш налягалі на закусь. Відаць, ня надта сытыя.

— Яно й зразумела, — казаў Апанас, — бо яны ж на працы, а мы не працуем. А хто не працуе, той і ня есьць. Вось чаму нашыя менш ядуць, а больш налягаюць на пітво.

Як ужо трохі замарылі чарвяка, зноў паліліся прамовы. Але цікавага было мала. Усе гаварылі пра шчасьце, пра лепшую будучыню, пра йшчэ лепшае жыцьцё на новы год. Езуіты! Шмат каму зь іх ня сьнілася такое жыцьцё, як цяпер жывуць, а гавораць аб лепшым.

Калі ўжо добра падсілкаваліся, паэта Цымбальскі задэкламаваў свой навагодні верш. Я ня памятаю, што ён напачатку крычэў, але пасьля, як грымнуў кулаком па стале й залямантаваў:

Сваю душу пераніцую!
Душу варожую скрышу!
Відэльцам сэрца пракалю я!
Усіх ушчэнт перадушу!!!

І як пахопіць крэсла, як бразьне аб падлогу — ажна ёлка пахіснулася й цацкі сыпнуліся долу. Усе напалохаліся — жах! Асабліва жанчыны. Рынуліся хто куды. Рыгор пачаў супакойваць:

— Дарэмная трывога, — кажа, — ня бойцеся. Гэта яму натхненьне падпёрла. Апарожніцца, і ўсё будзе ў парадку.

І праўда, нацадзілі Цымбальскаму конаўку, ён высмактаў і змоўк.

Калі мы ўжо залілі гэты спалох, слова забраў Сымон:

— Вось тут я чуў, што гаварылі пра новае шчасьце. А на які мне хрэн гэтае вашае шчасьце? Мне што трэба на гэты год? Марцыпаны? Мне патрэбна спакойная праца, а ў выніку яе — скварка й чарка. І каб ніякі чорт не мяшаўся ў маё жыцьцё. Вось і ўся мая палітычная крэйда[1]. Дык ці многа я хачу на новы год?

[1] Мабыць, трэба разумець: credo. *Л. К.*

Хто скажа, што я хапіў лішняга? Ніхто! Дык чаго ж вы тады лезеце да мяне з усіх бакоў? Вы хочаце, каб я на вас працаваў? Дык не! Скулу вам у бок! Гэтага ня будзе!

Тут усе загаманілі:

— Выбачайце, Сымоне, мы гэтага ня хочам. Наадварот, мы вельмі вас паважаем.

— Не! — крычэў Сымон, — вы хочаце[2]...

Нарэшце Сымон змогся і, калі выпілі яшчэ па чарцы, сказаў:

— А чорт яго дзяры! Няхай будзе, як хочаце. А я вам не кумпанія.

Як скончылі банкет — ня памятаю.

*8 студзеня.* Паэт Цымбальскі бегае па ўсім горадзе, як вар'ят, і крычыць:

— Загінула ўсё! Канец усяму й пагібель!

А што загінула? Можна ўважаць — глупства. Жонка ягоная прадавала стары цэбар ды разам з цэбрам аддала зь вядро старое паперы, што там завалялася. Паленавалася вытрасьці. А гэтая папера, як на той грэх, якраз і былі самыя таленавітыя вершы Цымбальскага. Ну, ня згледзела баба, што гэта была мастацкая прадукцыя, а не ўжытковая папера. Можна было б бабе й даравацъ. Але Цымбальскі проста звар'яцеў:

— Век не дарую, — крычыць, — загубіла! зарэзала! Самыя актуальныя вершы. Яшчэ на выгнаньні пісаныя ў тысяча дзевяцьсот зацёртым годзе.

Людзі яму раяць, каб новыя напісаў:

— Што табе, — кажуць, — паперы шкада? Пішы нанова.

— Што людзі разумеюць? — сумуе Цымбальскі. — Я туды душу сваю ўкладаю, кроплямі ўласнай крыві паліваў гэныя радкі! Я, — кажа, — сваё сэрца напароў на дзіды, а яны пра паперу... Мяшчане, — кажа, — вы ўсе. Абываталі.

Чым скончыцца гэтае вар'яцтва — цяжка прадбачыць. Зусім проста, што чалавек загіне. Вось што значыць, калі бацькі змалку ня білі.

*10 студзеня.* Мікіту Гузака доктар пасадзіў на дыету: забараніў піць і загадаў тры разы на дзень есьці толькі рэдкую страву. Бо ў Мікіты, як казаў доктар, ад ненармальнага ўжываньня

---

[2] У гэтым месцы зь нейкае прычыны І. І. пяць радкоў вычыркнуў. — *Л. К.*

алкагольнага пітва зусім пераблыталіся сэрца й печанцы, і цяпер ніяк не намацаеце — дзе адно, а дзе другое.

Мікіта паслухаўся, пабіў усе шклянкі й сеў на дыету. Мы з Сымонам знарок хадзілі глядзець, як Гузак гэную дыету глытае. Прыйшлі сьнеданьнем. Жонка сядзіць, скварны булён сёрбае, а Мікіта выцадзіў у міску паўлітра, накрышыў хлеба й цыбулі ды чэрпае лыжкай быццам зацірку.

— Ліха яго матары, — кажа, — з гэтым пітвом. Калі доктар загадаў — нельга, знацца, нельга. Я магу й ня піць, бо я ня вораг сваймy здароўю.

Мы спыталіся, ці дапамагаюць яму гэтыя лекі.

— Ці дасьцё веры, — кажа, — лягчэй стала. Як высербаеш міску гэтае дыеты, дык адразу ад сэрца й адлягло. Адцягвае. Доктар таксама казаў, што я ўжо палепшаў. Надоечы хадзіў да яго на кантролю.

— Ну як, — пытае, — кінулі піць?

— Ані кроплі, кажу.

— Ну, то й добра.

Выстукаў гэта ён мяне малаточкам, праз трубку паслухаў ды кажа:

— Ну, вось цяпер чуваць, што ў вас і сэрца ёсьць. І ведаеце, шаноўны пацыента, нават большае, чымсь трэба.

Вось што значаць навуковыя лекі.

Толькі жонка Мікітава бедавала, што надта ўжо дарагія цяпер лекі пайшлі:

— Жартачкі, — кажа, — тры паўлітроўкі на дзень. Вельмі дарагія лекі.

— А ты чаго хочаш, — крычыць Мікіта, — каб у мяне ўсе ворганы зблыталіся ў кучу? Мне здароўе даражэй. Чула ж, што доктар казаў. А супроць навукі ня пойдзеш, бо доктар ведае, каму якія кроплі загадаць.

Не такі чалавек Мікіта, каб яго доктар ашукаў.

*12 студзеня.* Апанас Дзюрка аднекуль прывалок піяніну. Кажа, што ягоны прыяцель Мімікрыйскі спрэзэнтаваў. Брэша! Дзе гэта ёсьць цяпер такія прыяцелі, каб піянінамі кідаліся? Недзе зблатаваў. А ў хаце цэлы гармідар. Апанасавы дзеці праз увесь дзень на гэтай музыцы дубасяць, а жонка лаецца:

— Заняў, — кажа, — усю хату гэтай гаргарынай — няма дзе й сьвінчаці замяшаць.

— Дармо, баба, — суцішае Апанас, — хутка й ты будзеш на гэтай штуковіне выцілінгваць.

— А каб цябе немач цілінгала, — злуецца Апанасіха. — Мне дзяцей няма калі дагледзець, а ён з музыкаю.

Такія тэатры ў Апанаса цяпер цалюткі дзень.

*15 студзеня*. Піліп Дручок апынуўся на казённых харчох. А з-за чаго? З-за свае дурноты. Ад нейкае пары на яго пачала насядаць жонка. Пілуе й пілуе штодня.

— Усе людзі як людзі, а ты нейкая недарэка — ні сабе, ні жане. Або ты, — кажа, — будзь сапраўдны муж і сутрымвай жану, або кіну ўсё да ліхай матары. Бо я такіх, — кажа, — як ты, хоць дзесяць знайду, калі падамся па вайсковай лініі.

Праўда, пэнсія Дручка як бухгальтара на сяньня нічога ня вартая, можна сказаць, адзін міт, і на яе, ведама, жыць нельга. Але Піліп не ўлічыў ваеннае сытуацыі ды ўважаў, што калі ён сяньня працуе, знацца, павінен і жыць.

— Ты, — казаў ён жонцы, — не агітуй. Мне ўжо й самому гэтае жыцьцё падпёрла пад самыя рэбры. Але дзе мне выйсьце?

— А мне, — крычыць баба, — якая да гэтага справа? Ты, — кажа, — галава, ты й думай. А ня можаш — дык злазь з даху й ня псуй гонтаў.

Каб на іншага чалавека, то пасьля такіх слоў ён бы так усыпаў бабе й па даху й па фундамэнту, што век бы памятала. Але Дручок — чалавек просты, і яго нарэшце дапілавала баба да таго, што мусіў ужыць дадатковую прафэсію — пайшоў красьці сьвіней.

Першыя дзьве апэрацыі правёў удала. Збалянсаваў на Пярэсьпе двух кабаноў на пудоў сем. Але на трэцяй — балянс не сышоўся — злавілі Дручка на самай гарачай справе. Цяпер сядзіць і плача, а суседзі сьмяюцца. Не за сваю справу, браток, не бярыся: сьвіней красьці — не паперай шастаць, тут навука патрэбна!

А Сымон казаў, што і ў гэтай справе, як і ў кажнай, апрача навукі патрэбен спрыт:

— Быў, — кажа, — у нас у трэсьце адзін бухгальтар. Той, здаецца, і чалавек быў зусім нікудышны. Калі звонку глянуць, дык толькі назоў той, што чалавек. Але, каб вы ведалі, якія ўнутры гэтага недарэкі сядзелі спрыт і розум. Ён праз чатыры гады скрабаў нажом бухгальтарскую кнігу, і ў яго заўсёды, як казаў, балянсаваліся ўсе капейкі, а лішнія рублі, што ён адтуль выскрэбваў, клаў сабе ў кішэню. Так і не злавілі, а касіў тышчамі. Вось гэта быў бухгальтар! А Піліп — дрэнь! Такі й кнігу пра-

скрабаў бы і ніводнага рубля сабе не наскрабаў бы. Спрыту ў руках няма.

*17 студзеня.* Бачыў, як упяцёх білі аднаго. Відовішча было надта цікавае. Я вельмі рагатаў, як яны яго з усіх бакоў абкладалі. Але, шчыра кажучы, я б не хацеў быць на месцы гэтага аднаго.

Сымон, які таксама наглядаў бойку, не падзяляў майго вясёлага настрою.

— Я, — кажа, — такога не хвалю. Бойка — гэта мастацтва. І мастацтва высокага гатунку. Толькі трэба сам-насам. Калі ж пяцёра ды на аднаго, ды, як гэта часам бывае, із зброяй, то гэта ўжо не мастацтва, а даруйце...

— Дык вясёла, — кажу.

— Дурань і на паховінах сьмяецца, — раззлаваўся Сымон. — І гэты сьмех дурны. Гэта ўсё роўна, як бы казалі мне: Сымон, вось табе стрэльба й страляй дзіця. То хіба я на гэта здольны? Хіба я пошасьць якая? Не!

Сымон такога мастацтва не вызнае. Я із Сымонам ня згодны. Мне, калі б'юцца, дык і сьмешна, абы мяне ня білі.

*20 студзеня.* Сяньня пазнаёміўся з Рурыкавічам. Зайшліся гэта мы з Рыгорам у закусачную па дзьвесьце грамаў зрабіць, ажна бачым, тут нейкі здаравяка на сьцяну лезе:

— Я, — крычыць, — дваранін! Я Рурыкавіч! Мой дзед, — кажа, — за адну ноч дзесяць тысяч дзесяцін прапіў, а ты мне, гад, дзьвесьце грамаў паверыць ня можаш. Эх ты, — кажа, — беларус!

Але гаспадар закусачнай трапіўся чалавек досыць вытрывалы.

— Я, — кажа, — з тваім дзедам гарэлкі ня піў, хоць, можа, ён і Рурыкавіч быў. А мне — грошы на бочку, і ніякіх князёў!

Як мы даведаліся, гэты аскалопак княскага роду прасадзіў у закусачнай свой паўмесячны інжынерскі заробак, а да поўнай формы не дапяў — не хапіла грамаў дзьвесьце. Мы з Рыгорам паставілі яму па сто грамаў і пазнаёміліся. Абяцаў нават дакумэнты паказаць, што ён Рурыкавіч. Можа й так? У кажным разе з такім чалавекам пазнацца нядрэнна. Калі й ня Рурыкавіч, то ўсё ж чалавек свой.

*23 студзеня.* На нашай вуліцы асяліўся заходні чалавек і адразу пачаў заводзіць свае парадкі. Пахадзіў гэта ён па хатах, пазнаёміўся з суседзямі, а пасьля хваліўся:

— Я, — кажа, — не магу так проста жыць, як вы. Я не магу так, як вы, у хату сунуцца, я павінен увайсьці па-культурнаму.

З гэтае, відаць, прычыны ён заказаў візытоўкі. Але ягоныя культурныя намеры адразу ж сустрэліся зь непераможнымі цяжкасьцямі. Пайшоў гэта ён да Мікіты Гузака купіць самагонку, і толькі яму Мікіціха адчыніла дзьверы, ён адразу — шусь ёй візытоўку ў рукі. Тая ажна прысела зь перапуду: думала, што агент які прыйшоў апарату заарыштаваць. Добра — у хаце быў Мікіта, які толькі што прыняў чарговую порцыю дыеты. Той не зьбянтэжыўся. Ён узяў у рукі візытоўку, прачытаў: «Мікола Сямёнавіч Дурмідаў, такі й такі асьветны чын» і вярнуў візытоўку назад.

— А ты мне, — кажа, — усякіх паперак ня тыкай. Ты мне, шаноўны, грошы гані наяўнымі знакамі, або фэнікамі, або іншай валютай, мне гэта ўсё роўна.

Мусіў Дурмідаў пакласьці візытоўку сваю назад у кішэню.

Другая асечка здарылася ў Загржэмбіцкай. Пайшоў да яе Мікола Сямёнавіч прыдбаць якога тлушчу кавалак і таксама пачаў гандлёвыя дачыненьні зь візытоўкі. А баба Загржэмбіцкага (тутэйшая) ня надта спакушаная ў культуры — яна таксама гэную візытоўку ўзяла за ордэр на спэкулянцкі арышт:

— Вы, — кажа, — пане, памыліліся. Мы людзі бедныя, і самі не штодзень сала купляем.

Так і не паказала яму свайго сала. Здарыліся яшчэ дзьве такія няўдалыя спробы зь візытоўкамі, і Дурмідаў мусіў выкінуць іх на сьметнік.

Значыцца, кажны зачын, апрача добрае волі, павінен мець яшчэ й пэўную глебу.

*25 студзеня.* Калі шчасьце, дык і зь мяшка вылезеш. Байцоў выплыў на паверхню. Мы ўсе ўважалі, што чалавек так і загінуў, ажна не — вылузаўся.

— Хоць, — казаў, — гэтым разам я ўжо застаўся зусім голы, горш як Адам, але дармо — на жывой костцы мяса нарасьце.

За агента працаваць ужо ня хоча, а мяркуе адчыніць, як ён кажа, рэстаўрацыю.

— З чым, — пытаюся, — гэтую справу разьвінеш? Тут капітал патрэбен, а ў цябе вунь сораму няма чым прыкрыць.

— А навошта капітал, — кажа. — У гэтай справе абы рукі зачапіць, а там ракою паліецца. Глядзі, як у Сьвідрыцкага. А з чаго той пачынаў? Таксама зь нічога. А цяпер грошы мяхамі носіць.

Нічога дзіўнага, калі і адчыніць. Бо, як гаворыць Сымон, калі чалавеку шанцуе, то і ў лапцёх танцуе. А Байцову шанцуе, калі сам зь мяха вылез.

*28 студзеня.* Калі не пашанцуе, дык і на печы катар схопіш. Усе нашы дроваў на зіму запасілі, бо ведалі, што зіма то ня лета, хоць і вайною. А вось прафэсар Вадзянецкі й рахункавод Супрынайц, дарма што высокаадукаваныя, гэтае простае рэчы не прадугледзелі — засталіся на зіму бяз палкі дроваў. А цяпер сядзяць у халоднай хаце і ў кулакі дзьмуць. З гэтага, ведама, пацеха малая, бо як казаў ім Разак, ці ты хукай, ці ты дзьмухай — усё роўна будзе халодна. Хукам не нагрээсься. А нагрэцца трэба. І вось вымушаныя гэтыя небаракі праблему паліва разьвязаць на штодзень. На тым тыдні сьпілавалі ў парку дэкарацыйнае дрэва, пасьля звалілі радыёвы слуп, а ўчора пайшлі платы ламаць. Супрынайц, хоць таксама адукаваны, але трохі спрыту мае: ён спакваля пачаў дошкі адцінаць. А Вадзянецкі — той зусім голы тэарэтык — урэпіўся ў слупок і давай яго трэсьці. Пацеў, ажна пакуль ня грымнуўся разам із слупком. Нарабіў трэску й грукату. Вартавы, які стаяў паблізу, думаў, што гэта зладзеі лезуць, і стрэліў. Натуральна, хлопцы рванулі зь месца. Можна ўявіць, якую хутчыню яны разьвінулі.

— Пакуль дабеглі да ўкрыцьця, — прызнаўся Супрынайц, — то зрабілася надта горача.

Ня дзіва! А тым часам Вадзянецкі згубіў акуляры й з правае нагі калёшу, а Супрынайц пакінуў на плоце рукавіцы з аўчыны. Вось табе й нагрэліся!

— Не, — казаў на гэта Гузак Мікіта, — навука супраць спрыту ніколі ня ўстоіць. Двое вучоных, а зрабілі горш, чымся адзін невучоны. Бо, скажам, я, хоць і не прафэсар, а такая справа, як плот расьцярушыць, мне раз плюнуць, а яны ня здолелі.

— Знацца, не з таго канца вучыліся, — не згадзіўся зь імі Сымон. — Бо калі б гэта на сапраўднага вучонага, той бы так ня хібіў. Быў у мяне прыяцель, вучоны прафэсар, акадэмік, той ня тое што плот — хату мог над табой разабраць, а ты б нічога і ня чуў бы ў ложку лежачы. Вось гэта навука! Чыстае пароды. А Вадзянецкі й Супрынайц, відаць, мяшанцы.

А як мне здаецца, дык проста людзям не шанцуе.

*30 студзеня.* Няма сумлеву, што Мар'я Іванаўна хоча разарваць са мною сувязь. Стрэў сяньня на вуліцы, прывітаўся, а яна нат не спынілася: віль хвастом і пайшла ў другі бок. Ці сачыць яе, ці даць адстаўку? Пакінуць — шкада, бо такое вагі бабу ня хутка знойдзеш.

*1 лютага.* Яську Разака расшыфравалі. Выявілася, што сваё дабро ён сплаўляе ў Заходнюю. Зь якой мэтай — яшчэ не ўста-

навілі. Зноў пад’яжджалі да яго ў справе Фэцкага сакрэту аб канцы вайны. Дарэмна! Яська толькі ўсьміхаецца:

— Не для таго, — кажа, — я купіў гэты сакрэт, каб яго ўсе ведалі.

На нашай вуліцы зноў запанаваў непакой.

*3 лютага.* У Арыентацкага нічога толкам не даведаўся. Што такое заходнікі й што такое ўсходнікі — так яшчэ й вісьне ў паветры.

— Бачыце, — казаў Арыентацкі, — тут ёсьць дзьве такія плыні, і хоць іх мэты розныя й шляхі розныя, але яны ўсё роўна як бы адно. Разумееце?

Я зразумеў мала.

Шчыры нешта жаліўся на іхную мляўкасьць і адсутнасьць нейкай жывой крыніцы.

— Бо хто, прыкладам, у Менску гаворыць па-расейску? Русафілы й русацяпы. А тым часам Заходняя — Эўропа й новае жыцьцё. Яшчэ аб русафілах ды расейскай мове!

Тут я зразумеў яшчэ менш. Трохі сьвятла працадзіў на гэтае пытаньне Авечка Ахрэм.

— Можна, — казаў ён, — і на месяцы сядзець, а тым часам на зямлі гарох сеяць.

Усёй глыбіні гэтага філязофскага выснаву я ня здолеў асягнуць, але перакананы, што тут крыецца пэўны сэнс.

Усё ж я ў кумпаніі Арыентацкага заўважыў, што пытаньне аб заходніках і ўсходніках іх мала турбуе, а больш займаюць праблемы службовых выпадкаў. Бо мала ня дзьве гадзіны яны горача абмяркоўвалі службовую аварыю свайго саратніка Мімікрыйскага. Як я зразумеў, дык гэты спрытны хлапец хацеў сігануць без чаргі па службовай драбіне ажна праз чатыры ступні. Але на самым версе сарваўся й бразнуўся вобзем. І так бразнуўся, што толькі мокрае месца засталося. Ён ужо заносіў нагу на верхнюю ступню службовае драбіны, калі нейкі ягоны злосьнік — чырк на яго ў пэўнае месца цыдулку: «няпэўны чалавек, а ў мінулым — яшчэ больш няпэўны». І чалавек паляцеў долу.

Калі мы вечарам у сваёй кумпаніі абмяркоўвалі гэную аварыю Мімікрыйскага, то бальшыня схілялася на тое, што чалавеку не пашчасьціла. Толькі Сымон не згадзіўся й давёў, што ў службовай кар'еры галоўнае адыгрывае выпадак.

— Ці ведаеце вы Грака Язэпа? Ды пэўна ведаеце! Ён на Савецкай вуліцы ходнікі падмятаў, дворнікам служыў. Дык калі хто бачыў Грака, то бачыў і ягоную бараду, бо яна ў Язэпа, што

мятла, якою ходнікі тыя падмятаў. І вось аднойчы, а было гэта ў 27-м годзе, угледзеў Язэпаву бараду нейкі савецкі чын. І надта яму спадабалася гэтая барада, акурат рабоча-хрэсьцянская барада: тады ўважалася, што была ўлада рабочых і хрэсьцян, а знацца, трэба было трохі і іхных прадстаўнікоў да ўлады. Ну, справа нядоўгая. Туды-сюды — выбралі Грака ў дэлегаты ад Менскіх хрэсьцян і пасунулі яго ў Маскву, каб там да вышэйшае ўлады абраць.

Пачаставаліся дэлегаты зьезду на банкеце, селі на цягнік і папхнуліся ў Маскву. І вось толькі ад'ехалі за Антонава, Язэпу прыціснула пільніца. А трэба сказаць, што Язэп на цягніку блізу ня езьдзіў, а тым больш у мяккіх вагонах, і ня ведаў усіх парадкаў. Кінуўся ён туды-сюды — няма рады. Выскачыў у калідорчык, зірнуў навокал — нагвалт пад кусты трэба, а як ты зьбегаеш, калі тыя кусты толькі перад вачыма мільгаюць. Ня ведаў ужо, што й рабіць. А тут два нейкія гіцлі падсунуліся.

— Што ты, дзядзька, топчашся тут, быццам ушкодзіўшы.

— Шчэ не, але неўзабаве так яно й будзе.

— Дык у чым справа? Гэта зусім проста.

Падвялі яны Грака да нейкае штуковіны ды й кажуць:

— Таргані за гэтую снасьць і... кропка.

Грак тарганул, бо думаць ужо не было калі. І праўда — цягнік стаў. Саскочыў Язэп ды, выбачайце, у кусты. Цягнік пастаяў трохі, сьвіснуў ды зноў пайшоў. Выбег Язэп з-за кустоў, «пачакай» крычыць. Але дзе там! Паехалі.

Мусіў Язэп вярнуцца дахаты пехатой. А назаўтра зноў пайшоў вуліцу падмятаць. Так і скончылася ягоная кальера. А шанц быў найлепшы, бо бараду меў хрэсьцянскую.

Вось тут і кажы, што не выпадак. За малою драбніцаю чалавек ня трапіў у вышэйшыя члены.

*7 лютага.* Сяньня зьявіўся на нашую вуліцу нейкі паўнамоцны чын, каб зьбіраць складку на дапамогу.

— Ёсьць, — казаў, — такое таварыства сабедапамогі, якое ня мае сродкаў, а тым часам у горадзе шмат нэндзы, дык трэба ж і ёй трохі дапамагчы.

Добра. Галечы ў горадзе хапае, бо шмат хто ў пераходны час бадзяўся немаведама дзе й не парупіўся сам сабе дапамагчы. Трэба ж людзям паспагадаць. Таму мы ня надта й спрачаліся: скінулі — хто рублёўку, хто дзьве, а хто й жменю круп. Толькі як дайшла чарга да Сымона, той упёрся як вол:

— Ня дам ні фэніка й годзе. Калі я ў сваёй хаце дам жабраку бульбіну, дык ведаю, што ён яе сам зьесьць. А тут я не гарантаваны.

— Як гэта?

— А так! Можа, вы мой фэнік прап'яцё?

Паўнамоцны член надта абурыўся на гэтыя словы і пачаў ужо гразіць, але Сымона нялёгка зьбіць з капылоў:

— Вы, — кажа, — даражэнькі, у бутэльку ня лезьце, бо я тыя складкі добра ведаю — у мяне такі ж выпадак быў. А вось паслухайце. У трыццатым годзе, калі із скваркаю было вельмі туга, мы аднаго разу скlаліся ўпяцёх аж на дзьве тысячы й скіравалі Юрчанку Аўхіма ў Смалявічы. Купі, кажам, сала або кабана (там было таньней), пасьля падзелім складанае. Добра. Паехаў Юрчанка, а мы чакаем і аблізваемся. Чакаем дзень, два чакаем, тыдзень — няма пасланца. Рушылі да яго ў хату. І што ж мы бачым? Ляжыць ён, гад, што брук, ды песьні сьпявае. Дзе, пытаемся, складанае, а ён рагоча: «За граніцу, — кажа, — адправіў вашае сала, на золата абмяняў».

І зноў рагоча, і сьпявае: «Ах, эти чёрныя глаза». Ну, пастаялі мы, паглядзелі, плюнулі ды й пайшлі. Што ўжо тут возьмеш? Дык вось вам, даражэнькі, і складанае. Мы грошы давалі, а ён прапіў, зжэр і песьні сьпявае. Дык што вы на гэта скажаце?

Паўнамоцны член нічога не адказаў, толькі рукой махнуў. Так Сымон і ня даў складкі.

— Мне, — казаў, — гэтай капейкі не шкада, але дзе йдзець аб супольным або таварыстве, там мяне быццам сярпом па... шыі. Не магу трываць.

*8 лютага.* Сусьветнае палітычнае расклінаваньне дапяла нарэшце й да нас. Дзюрка й Мікіта (швагры) на глебе гэтага расклінаваньня такую разьвялі дыскусію, што давялося іх разьнімаць. Зьмяніўшы кепку на капялюш, Апанас зьмяніў і свае палітычныя перакананьні. І цяпер кажа ўсё наадварот таму, што казаў раней. Ходзіць па хатах ды выхваляецца:

— Гэта было ня так, а тое было ня гэтак. А вы дваццаць год мадзелі ў цемры. Мы гэта пераробім, а тое зьнішчым. Мы вас навучым, бо новая палітыка — гэта вам ня жарты. І трэба змагацца.

Мікіта нарэшце ня вытрымаў:

— Ты мне пра палітыку ня боўтай, бо я гэтага ня ведаю. Дый табе яна патрэбна, як покрыўка ад гультайства. Ты мне адно скажы: чаго ты мяне, пень яловы, навучыць можаш? Ці не навучыш ты мяне, як хутчэй дамавіны габляваць? А мо' ты маю жонку навучыш, як голыя крупы зварыць, каб яны былі зь мясным адварам? Эх ты, малпа абскубаная! Пень пад капелюхом!

Не здаваўся й Апанас:

— А ты, — кажа, — бутэлька піўная! Ты цёмны й некультурны тыпус!

— Што? — узарваўся Мікіта, — я тыпус? Ды я табе, сукін ты сын, за такія словы...

І бац па капелюшы.

Капялюх пакаціўся, а яны ў загрудкі. Ледзь расьцягнулі. Цяпер, калі сустрэнуцца, дык інакш не вітаюцца, як толькі «Здароў, малпа!» ды «Вітаньне бутэльцы». А былі дружнымі швагрāмі.

Сымон, гэты злосьнік усялякае палітыкі, цяпер ходзіць із задавальненьнем:

— Ну, што? Не казаў я пра гэтае ашуканства? Бачыце, што яна робіць: кліны забіваюць з бакоў, а яны шчэпяць зьнізу. Так яна, гэтая палітыка, скрозь.

*10 лютага.* Калі падумаць, колькі людзей пакалечыла сябе за так званыя палітычныя пераканаьні, дык ажна страх бярэ. Іншы мяняў іх за гэтыя дваццаць пяць гадоў па дзесяць разоў і не заўсёды без аварыі. Быў у мяне да сямнаццатага году добры знаёмы, Кручкоў Сяргей. Ён меў пасад прысяжнага даверанага, перакананьні сацыялістага дэмакрата й зарабляў добрыя грошы. У сямнаццатым годзе ён хадзіў па вуліцах пад сьцягам, сьпяваў песьні, а пасьля неяк раптам так высока сігануў, што я страціў яго з вачэй. А сяньня — вось навіна: гляджу на Сураскім рынку, а ён сядзіць пад яткаю, сьпераду расставіў розныя статуйкі, шмацьцё расклаў і наагул розныя дарэвалюцыйныя дрындушкі. Прадае. Схуднеў, аброс — зусім сапсеў.

— А даражэнькі, — кажу, — колькі год ня бачыліся! Ну, як жыцьцё?

Зірнуў ён на мяне з-пад ілба і пытае:

— А хіба гэтае, што мы сяньня робім, можна назваць жыцьцём?

— Ну, ведама, — кажу, — цяжка. Але ж вайна. Чаго добрага хацець?

— А я цяпер, — кажа, — нічога не хачу: ні вайны, ні рэвалюцыі. Хачу, каб ізноў быў Мікалай!

— Але ж даруйце. Вы ж самі ў сямнаццатым годзе крычэлі: «Далоў крывавага Мікалая! Далоў вампіра!» І шчэ, памятаю, песьню сьпявалі «Адракнёмся ад старага міру».

— Ну, што ж? Сьпяваў, бо дурны быў. І ўсе былі дурні. Бо каб не сьпявалі, дык гэтага не было б. Спусьцілі сабаку з лан-

цуга, а сабака, ведама, сабака: кідаецца на ўсіх, а таго ня ведае, што калі гаспадар не пакорміць, дык здохне.

Вось табе й на! То крычэў «Далоў Мікалая!», а цяпер кажа «Давай Мікалая». Знацца, і сапраўды быў дурань, калі сьпяваў «Адракнёмся», бо тым часам яшчэ й сяньня прадае рэчы, якія набыў пры гэным «крывасмоку»...

Ідучы з рынку, я думаў, колькі ж мусіў гэты чалавек за свае паўвека перапэцкаць і зьмяніць гэтых палітычных кашулек, каб дайсьці ад сацыялістага дэмакрата да чарнасотніка? І колькі ён перасьпяваў песьняў? І на колькі матываў? І што яму гэта каштавала здароўя?

Тут я зноў згадзіўся з Сымонам, што лепш не вызнаваць ніякае палітыкі, чымся мець ад яе адну згрызоту.

*12 лютага.* Прафэсар хэмік Адбітоўскі перакінуўся на мылавара. Ён неяк ужо даўна жаліўся Вадзянецкаму, што ягоны цяперашні інжынерскі пасад не задавальняе ўсіх патрэбаў.

— Мушу, — казаў, — мець дадатковы прыбытак. Навуковыя веды ў мяне ёсьць, а таксама й каўстычнай соды дастаў.

Праўда, не зважаючы на свае навуковыя веды, ён дзьве першыя зваркі сапсуў: нечага не дадаў, а нечага перадаў. Каб на іншага, дык бы ўжо кінуў гэтую брудную справу, але Адбітоўскі — чалавек упорысты.

— Ды хіба ж я, — кажа, — трасца яго матары, не звару гэтае пошасьці? Які ж я тады хэмік-прафэсар? Дыплём, — кажа, — парву, калі не звару!

І напэўна парваў бы. Але на ягонае шчасьце й на шчасьце ўсяго закарэлага грамадзянства, трэцяя зварка ўдалася адмыслова.

— Такое мыла, — хваліўся Адбітоўскі, — што само без вады мыліць. «Тэжэ» — невыразны колер.

Адно, што не спрыяе разгарнуцца як сьлед Адбітоўскага прадпрыемству — гэта брак сыравіны. Сабак пастралялі, катоў лавіць цяжка, а пошасьці цяпер ніхто іншай не выкідае.

— Дармо, — кажа Сымон, — Адбітоўскі не Заблоцкі, гэты на мыле заробіць, бо ён вучоны, а вучоныя, трэба сказаць, усе ўпорыстыя. Быў у нас калісь пры акадэміі таксама вучоны. Дык што б вы думалі? Гэты Камель (яго Камялём звалі) хацеў зрабіць нейкае кола, каб само круцілася. І як мы пазьней даведаліся, дык ён ажна пяць гадоў употайкі ад усіх майстраваў гэнае кола. Апошнюю капейчыну заганяў у гэныя сьпіцы. Во да чаго быў упорысты! Ня ведаю, ці закруцілася ў яго нарэшце гэнае кола, ці не, бо ён нечакана недзе зьнік разам із сваім колам. Адно

пераканаиы, што калі ён яшчэ жывы, дык і цяпер майструе, бо ўпорыстасьць у вучонага, што нораў у майго каня — нічым не пераставіш. Або лоб паб'е, або свайго дапне.

*14 лютага.* Юзік Загржэмбіцкі працерабіў шлях у Заходнюю. На першы раз сам ехаць пабаяўся — скіраваў жонку. Тая, набраўшы ў кошык рознае драбніцы, прывезла адтуль воз дабрыні.

— Там, — казала, — усякага дабра ў гаспадароў больш, як у нас на складах.

Яно й зразумела: гэныя людзі яшчэ не паспыталі калгаснага хлеба, а таму й свой маюць. Юзік наладаваў повен воз тавару й спадзяецца прывезьці вялікі воз дабра.

— Я, — хваліўся, — не люблю драбніцаю займацца. Мне адразу або пан, або прапаў.

Такі чалавек, калі не памрэ, свайго дапне, бо кіпцюры мае надта войстрыя.

*17 лютага.* І жыць цяжка, і памерці нялёгка. Учора ў садзе культуры й адпачынку знайшлі нежывую бабульку. Ну, ведама, пацікавіліся, чыя гэта бабулька і як яна там апынулася. Намацалі й сваячкоў. Якое такое здарэньне з бабулькай, пытаюць. Ну, прыціснулі трохі — яны й сазналіся.

— А ніякага, — кажуць, — здарэньня. Звычайна. Памерла бабулька, а мы яе пахавалі.

— Дык хіба ж так хаваюць? Хто вас такога навучыў?

— А мы ўсё чын-чынам, — кажуць, — і дамавіну зрабілі, і хаўтуры справілі. А што дол прамёрз на два мэтры, дык мы тут не вінаватыя, бо паставілі мы ў садзе дачасу, пакуль не адтае дол.

Можа, яно так і было. Можа б, яны й пахавалі бабку, але тым часам іншыя спажыўцы нагледзелі, што дамавіна стаіць без ужытку, бо на паверхні зямлі. Ну й выкарысталі яе для свайго пацыента, а бабку вытрасьлі на сьнег.

Гэтае здарэньне нарабіла шмат гутарак на нашай вуліцы. І ніхто тых сваякоў не пахваліў. Толькі Наязноў спрабаваў даводзіць, што навуцы ведамыя такія спосабы паховінаў і што бываюць яшчэ й горшыя, але Сымон перапыніў ягоную лекцыю ў самым пачатку:

— Вы, даражэнькі, із сваёй навукай жывеце, як хочаце, хоць на галаве хадзеце. Бо жыць можна ўсяк, але памерці мне, браток, дайце па-чалавечаму, бо гэта ў жыцьці здараецца толькі адзін раз.

*19 лютага.* Учора нечакана трапіў на пажагнальную гарбатку. Арыентацкі паспрыяў. Што такое пажагнальная гарбатка, я даведаўся пазьней. Шчыра кажучы, ніякай гарбаты не было: быў разьведзены сьпірытус і закусь. Але сэнс ня ў гэтым, сэнс у самай існасьці справы. А існасьць была ў тым, што праводзілі адну надта слынную асобу на яшчэ няведамы пасад.

Пацеха! Чаго толькі я не наслухаўся. Выступалі блізу ўсе, і кажны хваліў слынную асобу. І чаго толькі не плялі! Здавалася, што гэная слынная асоба ўвабрала ў сваё, дарэчы сказаць, досыць сьціплае тулава ўсе чалавечыя годнасьці. Арыентацкі прамаўляў, што такіх людзей, як гэная асоба, рэдка зямля носіць. Авечка Ахрэм — той жывымі сьлязьмі цадзіў у кілішак — ня мог паўстрымацца ад разьвітальнага жалю. Шчыры выступаў ажна тры разы. Праўда, ягоныя прамовы не зусім былі шчырымі, бо ён, хоць і хваліў, але разы два калупнуў-такі гэтую асобу й досыць балюча. Тая ажна заёрзала. Калі не лічыць гэтага выпадку ды яшчэ прамовы аднаго здаравеннага дзецюка з чырвоным тварам, дык усё было надта прыстойна. Быў ужо й я разагнаўся на прамову, але тут неяк усе загаварылі разам, ня слухаючы адзін аднаго. Колькі я ня бразгаў відэльцам па кілішку, голасу не атрымаў.

Дахаты пайшлі разам з Авечкам і Арыентацкім. Авечка яшчэ не суняў свайго жалю і ўсё чмыхаў носам:

— Такая, — казаў, — страта... такая страта...

Арыентацкі, наадварот, выглядаў надта вясёлым.

— Я, — казаў, — хоць бы штодня ладзіў такія гарбаткі.

— Але ж у такім разе, — кажу, — вы рызыкавалі б за які месяц разьвітацца з усімі слыннымі людзьмі гораду.

— А, такой бяды! Не былі б яны, былі б іншыя. Хіба ня ўсё роўна?

Я, ведама, цалкам зь ім згодны, што для мяне гэта не было б стратай, але ўголас пра такое не сказаў. Хто яго ведае, што за чалавек Арыентацкі.

*21 лютага.* На суседняй вуліцы асяліўся пагарэлец. Пацярпеў ён, бядак, ад няшчаснага выпадку з вайсковай неасьцярожнасьці. Ледзь з душой выскачыў. А цяпер усунуўся ў голую хату з голай сям'ёй.

— Ну, як ты цяпер жыць будзеш? — спачуваюць суседзі. — У цябе ж нават вяроўкі няма, каб на крук пачапіць.

— А дармо, — кажа, — неяк пражыву. Дыяген і гэтага ня меў.

Нараілі яму сходзіць да сабедапамогі.

— Мы ж складаліся, дык вось табе й будзе.

Пайшоў, адважылі там тры кілё мукі й паўкілё солі.

— Ну, — кажуць, — папраўляйся, чалавеча, не сумуй.

А чаго яму сумаваць, калі памагаюць? «Моцны выжыве, а нямоцных жыцьцё кусае». Так казаў пра гэты выпадак Наязноў. Але, здаецца, ён і сам ня быў перакананы, што гэты выснаў можа хоць трохі задаволіць пагарэльца.

*25 лютага.* Мар'ю Іванаўну прасачыў з шофэрам. Усё зразумела! Здрада! Ашуканства! Безадкладна ўжыць станоўкія захады! Гэта чорт ведае што такое[3]!

*28 лютага.* «Любоўная лодка разьбілася аб быт», як пісаў той паэта. У мяне яна разьбілася ўдрузачкі. З Мар'яй Іванаўнай — квіты. Перамовы ні да чаго не прывялі. «Разыдземся, — кажа, — Іван Іванавіч, добрымі сябрамі». Нічога! Я шчэ табе пакажу добрых сяброў. Будзеш памятаць...

*2 сакавіка.* Фэцкі ў выніку лічэньня дайшоў да выснаву, што ў навуцы ўжо няма чаго рабіць: усё вынайдзена. І цяпер конча перакінуўся на практычную справу.

— Гандаль, — кажа, — асноўнае, што цяпер трэба чалавеку, бо гандаль — гэта рухавік усяе культуры.

Ухапіўся й ён за гэты рухавік, але першыя ягоныя крокі былі не зусім моцнымі. Купіў на інкубатарнай станцыі 30 піскляў па рублю галаву й меркаваў прадаваць па 10 рублёў. Такім парадкам ад гэтага рухавіка мусіла атрымацца пэўная культурная астача. Але, як кажуць, рыба ў рацэ, ды не ў руцэ. Пакуль ён валок у сетцы гэтых 30 піскляў із станцыі, пяцёх па дарозе ўдалося задушыць, рэшту пасадзіў на авёс. Піскляты адмовіліся ад аўсу. Ведама, які пісклячы розум, скуль ім ведаць, што паводле навукі ім належыць ужываць толькі гэтае зерне? Але Фэцкі конча пастанавіў прымусіць іх падпарадкавацца вымаганьням навукі й безадкладна дзюбаць авёс. Пачалося ўпорыстае змаганьне. Пісклятаы вымагалі дробна пасечанага тугога яечка ды дробных крупак, але Фэцкі яйка й крупы еў сам, а піскляў засыпаў градам аўсу. У выніку трохдзённага змаганьня, праводжанага зь несьціханай жорсткасьцяй з абодвух бакоў, яшчэ 10 змагароў выбыла з варожага стану, а колькі атрымала цяжкія пашкоджаньні. Толькі тады Фэцкі змогся й рэшту недабіткаў выкінуў на рынак. Але тут яго чакала канчальная аварыя: піскляў ня толькі ніхто не купляў, але нават і дарма ня браў.

[3] Тут колькі радкоў зацёрта. — *Л. К.*

Ізноў навука падвяла.

— Усё было б добра,— казаў пра гэтую аварыю Сымон, — каб піскляты былі натуральныя. Тыя дык і авёс бы жэрлі. А тут — зробленыя электрыкай.

Зь ім згадзіўся й Мікіта:

— Ды хіба электрыкай можна жывое зрабіць? Піскле — гэта, браток, не чалавек: у яго арганізма кволая. Дый чалавека, бадай, ці зробіш электрыкай? — скончыў ён у задуменьні.

*5 сакавіка.* Трэба падаваць дэклярацыю аб прыбытку, ведама, каб падаткі плаціць. Дайце рады, якія ў мяне прыбыткі, калі я нічога не раблю! Але патэнту маю, знацца, павінен быць і прыбытак. Раіўся з Рыгорам і Наязновым. Наязноў ня даў ніякае парады. Гэта, кажа, не па маёй лініі. А спытайся што па ягонай лініі — таксама ня скажа. Вось табе й прафэсар!

Рыгор параіў проста:

— Накруці ім якую хочаш лічбіну, абы не зусім мізэрную, і падавай. Хто цябе спраўджваць будзе?

Давядзецца так і зрабіць. А Мікіта Гузак, хоць і шыльду мае, але дэклярацыі падаваць ня думае.

— Ніякага прадпрыемства ў мяне, — кажа, — нямашка. А калі й сталярка, дык я з гэтага саматугам хлеб зарабляю й лішніх прыбыткаў у кішэню не кладу, бо мне лячыцца трэба.

Хто тут сушэйшым з вады выйдзе — ня ведаю.

*8 сакавіка.* Мірылі Апанаса Дзюрку і Мікіту Гусака. Зьвялі гэта мы іх у Рыгора й кажам:

— Ну й што гэта, хлопцы? Вы ж, тым часам, швагры... Трэба жыць дружна, як суродзічы, а вы вунь што... за чубы...

Дзюрка здаўся хутка:

— Я, — кажа, — што ж? Я гэта ўсё разумею... І гатовы ад свайго боку...

Цяжэй было зь Мікітам. Той ніяк не хацеў пагадзіцца на тое, што ён вінаваты.

— Я чалавек спакойны, — кажа, — курчанё не пакрыўджу, а тым больш такую сьвіньню.

І гэтым ледзь не сапсуў усёй справы. Бо Апанас пасьля такое пігулкі таксама стаў дуба. Добра Рыгор скеміў нацадзіць ім па шклянцы. Тыя пальпалі вачыма й... выпілі. Зрабілася лягчэй. Згоду конча замацавалі яшчэ трыма пляшкамі. І калі швагры пасунуліся ў абдымку дахаты, дык на галаве Мікіты ражном стырчэў Апанасаў капялюш — гэты галоўны стрыжань нязгоды, а да Дзюркавай галавы прыліпла Мікітава кепка. Знацца, згода была поўная.

*9 сакавіка.* Сяньня малоў рыс на муку — жонка паслала. Пілавала мяне ўжо даўно:

— Што гэта, каша ды каша. Зьмялі рыс на муку, дык каржоў сьпяком.

Прыходжу ў млын, а там людзей, як на рынку. Хто пуд, хто пяць меле, а хто й дзесяць пудоў пытлюе. Ведама, як каму Бог спасобіў. Прыглядаюся я гэта да ўсіх скрозь аржаны пыл, ажна глянуў... Божухна! Пачаканцаў Юрка сядзіць ля латка й рот разявіў. А Пачаканцава я ведаю добра, бо мы зь ім калісь на савецкай «хаўтурцы» рублі касілі.

— А, даражэнькі, — кажу, — што ж ты тут робіш і чаго рот разявіў?

— Жыўлюся, — кажа.

— А каб ты спух, — кажу, — якое ж гэта жыўленьне, калі тут адзін пыл.

— А вось жа ў гэтым і сэнс. Мне адзін прафэсар параіў: «Калі падыхаць, — казаў, — восем гадзінаў гэтым аржаным пылам, дык ня менш за 200 грамаў хлеба глынеш. Бо, — кажа, — у Бавар‌ыі быў адзін млынар, важыў 4 пуды, падымаў 80 пудоў». Вось што значыць гэты пыл.

— Ну й што ж?

— А вось нічога. Глытаю.

— А працуеш дзе?

— Дзівак! Якая ж праца, калі я тут восем гадзін сяджу й глытаю свае 200 грамаў без усялякае працы. Зразумей, дзе выйгранка. Не, на працу я шчэ пачакаю.

Я, ведама, зразумеў, дзе выйгранка, але на гэтую працу не пайшоў бы.

*10 сакавіка.* Жыхары з цэнтру чагосьці сігаюць па ваколіцы. Да Рыгора прыйшла сваячніца, да Наязнова — швагерка. Да іншых таксама. Іх там, здаецца, паветрам трохі напалохалі. А Сымон зь іх жартуе:

— Дарэмныя турботы, — кажа, — жыві там, куды цаляць хочуць — будзеш цэлы. Бо паветра, яно таксама рух мае — зганяе.

А ў нашай ваколіцы палахлівых няма. Толькі Разак напалохаўся, як пачуў трывогу, бо ў гэты час якраз скончыў брагу калбаціць. Пасьля казаў, што ўсё іншае глупства, але на выпадак чаго — брагі шкада было б.

*11 сакавіка.* У кажнага свой закон. Юрэц Бладук трохі павучыў сваю жонку. Каб сказаць моцна, дык не, так, зьлёгку. А ба-

бе чамусь не спадабалася. Выбегла на вуліцу і ў лямант. Забіў, крычыць, пакалечыў! гвалт! Як на тое ліха, вайскоўцы ехалі. Натуральна, пацікавіліся, аб чым лямант. А ў выніку — павучылі Бладука па свайму закону. Зьезьдзілі яму тры аплявухі, ды шчэ і ў паліцыю патрабавалі. Ня бі, кажуць, бабу, ды шануй. Баба ўжо й ня радая, а мужчыны сьмяюцца.

— Завошта ён цябе гладзіў, Бладучыха?

— Каб жа было за што, а то за глупства. Засьпеў ён нас з Байцовым у гарызантальным палажэньні, ну й азьвярэў.

Дзіва што азьвярэў.

— Але гэта толькі на жарт было, — апраўдвалася Бладучыха. — Мы так жартавалі.

— Добры жарт, — рагатаў Сымон, — ад такога жарту бывае, што бацька потым свайго дзіцяці не пазнае.

Толькі жонкі спачувалі.

— А якое ж каханьне ў іх было, любачкі, проста даваеннай якасьці. А ён, гад, біцца!

Але хутка Юрэц вярнуўся без аварыі, і ўсе супакоіліся. Назаўтра Бладук пайшоў упрочкі, але хутка вярнуўся. Бо ўсё ж, як той казаў, жонка не балалайка — пайграўшы, на сьценку не павесіш.

*12 сакавіка.* Хадзілі з Сымонам у тэатар слухаць пра новы зямельны закон.

— Хвалю такія парадкі, — цешыўся Сымон. — Свая зямля — гэта ўсё. Шчэ мой дзед казаў: лепш свае тры аршыны, чымся чужая валока. І гэта сьвятая праўда. Калі мой швагра жыў на сваіх трох дзесяцінах, дык ня тое што хлеба на пяць душ хапала, а й скварка не выводзілася, а як загналі дабравольна ў калгас, дык ажна з Лагойшчыны ў Менск дыбаў па кілю хлеба. Зямлі ў калгасе было па тры дзесяціны на душу, хлеб жа, што калгасьнікі рабілі, улада забірала на рублі, а ім прадавала па рублю за кілю.

А мне гэты закон абы-што, бо зямлю рабіць мне не да твару, і хлеба на мой век хопіць.

*14 сакавіка.* Што на сьвеце дзеецца — чысты сьмех. Настаўнік Дзівак разжаніўся з жонкаю. А жылі разам 45 год. Ці-то надвор'е на іх паўплывала, ці вайна — невядома. Толькі старыя не захацелі жыць супольна. Падзялілі свой пакой напалам, перацягнулі ў куты кажны свае рэчы, а пасьля ўзяліся агульнае дабро дзяліць. Праўда, дабра гэтага ў іх небагата — усяго адна бочка агуркоў. Як яны перахаваліся ў старых — невядома. Але гэты скарб старыя, як людзі старой загартоўкі, мусілі падзяліць

сумесна. Толькі нешта ня выйшла ў іх сумленна — пасварыліся ў час дзяльбы. Ці то старая хацела старога на агурочках аб'ехаць, ці можа й стары перасморгнуў агурком — пра гэта не хваліліся. Паклікалі на дапамогу суседзяў. Людзей прыйшло шмат. Ведама, кажнаму хочацца на такую рэч паглядзець. Ну, стоўпіліся суседзі й раяцца, як такую справу найлепей абстругаць. Адны раілі расьпілаваць бочку напал, але іншыя запярэчылі, бо гуркі папілуеш, дый расол выцьлецца. Хацелі расклясьці гуркі па штуках: табе, бабка, табе, дзедка, але зноў бяда: другое судзіны ў старых няма. Нарэшце наважылі на месцы агледзець справу й там памеркаваць. Рушылі да бочкі з гуркамі, адчынілі яе, дзівяцца. Ну й гуркі!

Узяў адзін сусед агурок на зуб — хрумшчыць. Другі таксама паспытаў — добра. Трэйці — таксама. Старыя толькі вачыма лыпаюць. І пайшла спроба, як іхныя гуркі хрумшчаць.

— Эх, — кажа нарэшце адзін знаўца на агурках, — грэх такую закусь усухамятку хрумстаць, сьмяротны грэх.

І неўзабаве джгануў за дзьверы. Праз колькі часінаў вярнуўся з паўлітрам, якое тут жа й разьмеркавалі. Вядома, не абмінулі й старых. Пасьля сігануў другі сусед, трэці. І пачалося. Як скончылася гэтая спроба — старыя ня памяталі. Але калі назаўтра зірнулі ў бочку, дык дзяліць ужо не было чаго. Толькі на дне нейкім цудам захавалася колькі шаптуноў. Вось табе й параілі суседзі. І сядзяць цяпер старыя ў розных кутках ды пазіраюць ваўкамі адзін на аднаго.

Ну, ці ня грэх? А хто ў гэтым вінаваты? Хіба ж не старыя?

*18 сакавіка.* У Фэцкага зноў няўдача. Быў апёкся на пісклях, а цяпер на трыбухох скруціла. Купіў ён іх ля бойні ажна мяшок, прывалок дахаты й пачаў вылічваць, колькі на іх заробіць. Але пакуль ён калькуляваў ды вылічваў найвышэйшы прыбытак, трыбухі не марудзілі, узялі дый скрасіліся. Дух ад іх пайшоў па ўсёй кватэры такі цяжкі, што ня толькі на рынак, але й на сьметнік выкінуць небясьпечна. Мусіў збыць за бясцэньне. Каб не зусім страціцца, завалок гэты злаякасны прадукт Адбіткоўскаму на мыла, па марцы ад трыбуха. Але ашукаўся й Адбіткоўскі. Варыў ён гэтую квашаніну паўдня, але, не ўважаючы на ўжытую ім розную хэмію, мыла з трыбухой ня выйшла, а толькі адна пена.

Цяпер прафэсар ды інжынер, як кажуць, на нажах, бо паміж іхным старым сяброўствам грозным сьценем сталі квашаныя трыбухі. Так, бывае, дробная рэч псуе вялікія дачыненьні вялікіх людзей.

*19 сакавіка.* Сяньня на зборцы ў Рыгора быў вялікі палітычны дыспут. Справа йшла пра ўладу, чаму яна й навошта. Напачатку населі ўсе на прафэсара Наязнова.

— Вось Вы, — кажам, — прафэсару, акуляры носіце, можна сказаць, зубы зьелі на розных пытаньнях, дык скажэце нам на ласку, што такое ўлада.

— І чаму яна, — дадаў Мікіта Гузак, — не такая, як хачу я, а наадварот?

Наязноў нешта пачаў мармытаць, але такое невыразнае, што Сымон яго перапыніў:

— Ня ведаеце, шаноўны? Скідайце акуляры!

Гэтае каведнае пытаньне ўзяўся разьвязаць Мікіта Гузак.

— Я скажу, чаму такое дзеецца на сьвеце. Вось, скажам, так: адзін чалавек хоча туды, а другі хоча сюды. А каб людзі былі ні туды, ні сюды, дык усё было б добра, і нічога гэтага не было б.

— Правільна, — падтрымаў яго Сымон, — людзі ёсьць розныя: адны далікатныя, другія працавітыя, а паміж імі йдзе несупыннае змаганьне. І вось, знацца, якія людзі перасіляць, такая і ўлада будзе. Быў у мяне за саветамі знаёмы. Чалавек так сабе — недалуга. Меў ён невялічкую пасаду, быў ціхі, сарамлівы й заўжды выглядаў такім прыбітым, нібы ў яго за каўняром паліцыянт сядзеў. Так. Але аднойчы фракцыя ягонага начальніка перамагае, бярэ, знацца, верх, і той трапляе ў вялікія чыны. Натуральна й гэты недалуга за хвастом чына таксама прыціснуўся да ўлады. І што вы скажаце? Чалавек раптам зьмяніўся: ня той, а зусім новы, ну проста — арол. Толькі адно й не зьмянілася: як быў гультай, так ім і застаўся. Дык вось што такое ўлада.

Такі нечаканы выснаў нас усіх вельмі зьдзівіў, але як мы ведалі, што Сымон — філёзаф, дык і не спрачаліся. А што ж такое, урэшце, улада, так і не даведаліся.

— Дыспут наш, — як урэзюмаваў Апанас Дзюрка, — быў угрунтаваны на пяску, а таму й вынікаў ня даў.

Можа так, а можа й не...

*21 сакавіка.* Ловяць безаўсвайсных. Пахапілі на рынку Гузачыху й Загржэмбіцкую — тыя ледзь выцерабіліся. Трапіў у паліцыйныя абыймы й Разак Яська — з самагонам залавілі. Але хоць ён і на мокрай справе пасьлізнуўся, а падняўся сухім, бо Яська добра ведае, што ў такіх выпадках рабіць.

— Я, — казаў, — усё роўна сваё наганю.

Пасьля гэтага ўвесь наш мурашнік заварушыўся й пачаў перакоўвацца. Мусіў і я перагледзець свае грамадзкія пагляды й

падаўся здабываць аўсвайс. Зразумела, можна было б і так жыць, бо матэрыяльная база яшчэ ёсьць, але палітычныя крыгавіды штораз звужаюцца. Пасьля нядоўгіх меркаваньняў падаўся да ўправы. Бо як ні кажэце, а ўсё ж праўда, што толькі на дзяржаўнай пасадзе пазнаеш ісьціну.

*22 сакавіка.* Неспадзявана сустрэў Мар'ю Іванаўну. Трапіў у адну вясёлую кумпанію, ажна гляджу — і яна там. Я й вокам не міргнуў, што мы знаёмыя. Яна таксама трымалася тактоўна. Але, як пасьля ўсяго пачалі гуляць у «Флірт кветак», я ткі разы тры добра калупнуў яе.

А з гэтай гульнёй выйшла чыстая камэдыя. «Флірт» быў стары, яшчэ Мікалаеўскі. Зразумела, што ў гэтым дарэжымным «Флірце» было толькі пра кволае й палкае каханьне, а такія простыя рэчы, як сахарына, панчохі, баханка, закусон ды іншыя не былі прадугледжаныя. Натуральна, мы пачалі выпраўляць недагляд мінулага й мусілі дапісваць. Ну і панапісвалі на тэму дню.

Гіяцынт: Ці ёсьць у вас скураныя падэшвы?

Фіялка: А фігу вы ня хочаце? — Скураныя! Шаруйце гумай.

Нарцыс: Колькі вы просіце за свае кумпякі?

Лілея: Сьвіньня вы й больш нічога.

Такім парадкам мы скрэмзалі ўвесь гэны «Кветкавы флірт», і ён атрымаў зусім сучасную афарбоўку. Але пасьля гульні гаспадыня агледзелася, што ўсе карткі паскрэмзаныя, і ўзьняла вэрхал:

— Анцілігенты, — крычыць, — у шляхетную гульню гуляюць, а карткі звэдзгалі, як сьвіньні.

Ледзь мы яе супакоілі складчынай, але ўсё ж выйшаў канфуз.

*23 сакавіка.* Загржэмбіцкі вярнуўся з экспэдыцыі ў «Западную». Ён такі нездарма хваліўся, што ня любіць займацца драбніцай: прывёз із сабою вялікі абоз ёміны. Калі ўсё гэта ўдала рэалізуе, дык адразу выскачыць у першыя рады менскіх фінансавых колаў.

А пра «Западную» апавядае цуды: як там людзі жывуць, як п'юць і гуляюць — проста дзіву дацца. Адно дрэнна, што там усе лютыя нацыяналістыя. Нават і гарэлку, і тую п'юць не як усе людзі, шклянкамі, а па-свойму, па-нацыяналістычнаму. Выставіць, — кажа, — на стол тры чаркі: адну белай, другую чырвонай, а трэцюю зноў белай, ды хвошча ўсе запар, а пасьля выгуквае «Хай жыве!». А іншыя, мабыць, ужо зусім шавіністыя, дык тыя выстаўляюць аж па дзевяць чарак: тры белай, тры чыр-

вонай, зноў тры белай. І «Хай жыве!» выгукваюць ужо тры разы. Гэта ўсіх нашых вельмі зьдзівіла. Толькі Яську Разаку такі звычай надта спадабаўся.

— Каб мне туды, крый Божа, дарвацца, — мроіў ён, — дык «Хай жыве!» я там крычэў бы хоць дваццаць разоў, пакуль бы не залажыла.

Кажнаму сваё, а мне такая палітыка не падабаецца.

*24 сакавіка.* Набліжаецца, як казаў Апанас, першы вольны Вялікдзень на першай вольнай зямлі. Усе з уздымам калбоцяць самагон. У гэтай справе і я не захацеў астацца атэістым і закалбаціў 30 фунтаў аржанухі.

*25 сакавіка.* Бачыў нейкі дзіўны сон. Сьнілася мне, што нібы йду па галоўнай вуліцы й назіраю звыклы малюнак: машыны, салдаты, грузавікі снуюць узад і ўперад, зьбянтэжаныя цывільныя па бакох туляцца. Грукат, галас, безупынныя гудкі машынаў, адным словам, вайна. Раптам сталася ціха, да таго ціха, што ажна страшна зрабілася. Стаў я й дзіўлюся — што такое? Нібы тое самае, а тым часам зусім іншае. Вось прафэсар Фэцкі (той, што вылічаў канец вайны) ідзе, нібы й ранейшы, але ўжо зашпілены на ўсе гузікі й з партфэлем пад пахай. Ветліва вітаецца. Вось інжынер Адбіткоўскі, які мыла з падлаў варыць, на аўтамабілі праімчаў. Гузачыха з кашолкай у руках прашкандыбала. А вось і Сымон на сваім кані едзе. Пад'ехаў да мяне й спыніўся.

— Ты чаго, — крычыць, — рот разявіў? Зачыняй хутчэй, а то й з табою будзе тое, што з адным Халімончыкам было. Той таксама вось, як і ты, з канём сустрэўся, а пасьля тры месяцы з абвязаным рылам хадзіў і ўсім жаліўся: «Ішоў, — кажа, — ціха па вуліцы, а нейкая разіня ехала і проста мне аглабінай у рот». Вось як бывае. Ну, дык што чуваць?

— Ды вось стаю ды дзіўлюся, што робіцца.

— Ды чаго тут дзівіцца? Нічога новага няма, усё як было, так і ё.

І Сымон крануў каня. Паехаў. Няўжо ж ніхто нічога не заўважае? Цуд! Іду далей па Пагарэлай вуліцы, а тут ужо новыя хаты, як грыбы, павырасталі, нібы ў казцы якой, або, не раўнуючы, як у справаздачы ўраду. Крамы скрозь паадчыняныя, а ў крамах дабра ўсякага гарамі навалена. Вось ідуць салдаты, песьні пра вайну сьпяваюць, а кулямёты й бомбы па вуліцы раскідаюць. І нікога гэта не палохае, а наадварот, цешыць, бо дзеці падбіраюць бомбы і, як у мячыкі, зь імі гуляюць. Дзіва! Падышоў да плошчы былой Свабоды, а тут радыёвяшчальнікі на ўсе

лады грымяць: «Вайна скончана! Арміі ўсіх народаў распушчаныя! Усе кардоны зьнятыя, а заслоны паднятыя! Мір і супакой! Ура! Няхай жыве супакой!».

У гэты час з-за рогу Танкавай вуліцы на плошчу ракой наплылі грамады людзей, якія павольна спыніліся ля помніка невядомаму герою. Наперадзе падраўнялася аркестра барабаншчыкаў, а за ёй мора сьцягоў і натоўп. Вось на помнік ускочыў нейкі жвавы чалавечак і пачаў крычэць: «Вызваленыя свабодныя людзі! Вайна скончаная! На ўсім сьвеце запанавала ціша й сугучнасьць. Няма аніякіх спрэчак паміж народамі! Спалучаны ўрад вялікіх нацыяў абвесьціў для кажнае нацыі поўную не...»

Што абвесьціў спалучаны ўрад, дачуць не ўдалося, бо раптам як разане барабанная аркестра, як загрукочуць гарматы, як загудуць самалёты, ажна, здаецца, зямля здрыганулася.

Тут я падхапіўся ад сну, але грукат не спыняўся. Я саскочыў з ложка й рынуўся да дзьвярэй, бо ў мае дзьверы барабанілі так, што ажна ўся хата хадыром хадзіла. Калі адчыніў дзьверы, даведаўся, што прыйшла нямецкая жандармэрыя правяраць жыхароў і аўсвайсы. За тое, што я замарудзіў, адчыняючы дзьверы, мне жандар напачатку паказаў пісталет, а пасьля адмерыў нядрэнную плюху. На гэтым скончыўся мой дзіўны сон, бо толькі пасьля жандармаўскае навукі я прыйшоў да цяму й зразумеў, што ўжо ня сон, а рэчаіснасьць.

Суседзі з поваду майго сну кажуць, што хоць ён скончыўся й не зусім удала, але гэты сон — вяшчун, і ён прадракае канец вайны. Адзін Сымон не падзяляе агульнае думкі. Ён кажа, што сны трэба разумець якраз наадварот.

— Калі ты сьніў, — кажа, — што гэтая вайна скончылася ў такі нечаканы спосаб, то тут, браток, рыхтуйся да новае вайны. Так гэты сон трэба разумець.

Верыць Сымону ніхто ня хоча.

*26 сакавіка*. Учора ў беларусаў было сьвята. Спраўлялі гадавіну сваёй колішняй незалежнасьці. З гэтае прычыны наладзілі ў тэатры вялікі сход і пачалі гаварыць. Гаварылі шмат пра тое, як калісь змагаліся, як былі незалежныя, як усё ў іх было й што цяпер таксама...

Мне ўвесь час сьвярбела выступіць і спытацца, чаму цяпер нічога няма й хто канкрэтна вінавайца гэтага? Але выступіць пабаяўся й добра зрабіў, бо калі пасьля сходу загаварыў пра гэта зь Янкам Шчырым, дык той мяне ледзь не залічыў у ворагі.

— Вы, — кажа, — не разумееце гэтага, бо Вы шчэ ня наш, Вам яшчэ, — кажа, — адзіная недзялімая адрыгаецца, а як Ва-

шае нутро зусім ачысьціцца ад гэтае дрэні, тады ў Вас і ў галаве прасьвятлее.

Што я меў на гэта адказаць? Зразумела — нічога. А тут яшчэ й Ахрэм Авечка падцягнуў:

— Мы, — кажа, — змагаліся, змагаемся й заўсёды будзем змагацца, аж пакуль нам не дадуць. А калі ўжо дадуць што трэба, тады й змагацца кінем. Мы — упартыя.

Дзіўны чалавек гэты Ахрэм. Усё яшчэ спадзяецца, што дадуць. А тым часам вось і сяньня не далі. Хацелі яны ўв адзнаку свайго сьвята наладзіць дэманстрацыю, значыць, паказаць свае сілы, а немцы ім і не дазволілі. Вось табе й незалежнасьць!

Увечары пасьля сходу ладзілі «гарбатку», куды я, на жаль, ня трапіў. А шкада, бо сяньня Арыентацкі хваліўся, што «гарбатка» прайшла надзвычай удала: нікога ня вынесьлі, а нават ня вывелі, а тым часам усім хапіла. Гутарылі таксама шмат, але куды весялей, чымся на «акадэміі». Напачатку ўсе адзін аднаго хвалілі, а пасьля, калі выпілі па трэцяй чарцы, пачалі сварыцца: і таго не зрабілі, і гэтага не дарабілі, і той вінаваты, і гэты не дагледзеў, і наагул ніхто нічога ня робіць. А як падлілі яшчэ, стала зусім весела, бо загаманілі ўсе разам.

Мікіта Гузак, які слухаў нашую размову, сказаў, што гэта зьява зусім натуральная.

— Кажная вільгаць, — казаў ён, — язык размывае, і ён тады ходзе вальней. Мне доктар, калі я заікаўся, таксама кроплі раіў, і я тады гэтых кропляў выпіваў па шэсьць шклянак на дзень. І памагло, бо цяпер ужо заікацца пачынаю толькі пасьля восьмае шклянкі.

*27 сакавіка.* На нашай вуліцы асяліўся новы чалавек, у якім Сымон апазнаў таго вучонага, што калісь майстраваў нейкае цудоўнае кола-самакрутку, а пасьля раптоўна зьнік. Завуць яго Камель, а прыехаў ён із занятых усходніх земляў.

*28 сакавіка.* Сымон зьбіраецца на вёску — зямлю дзяліць. Мне, казаў, таксама, як і іншым, чужой зямлі ня трэба ані пядзі, а калі ўжо сваю, нашую дзеляць, дык тут, даруйце, і я маю поўныя правы хоць на чацьвярціну.

Мабыць, самалётаў напалохаўся, бо сяньня ўначы бальшавікі на літоўскія казармы наляцелі й шмат каго напалохалі. Праўда, шкоду зрабілі невялікую: разьбілі прыбіральню ў суседняга гаспадара. Але за другім разам, калі пашанцуе, могуць і галаву пашчапаць. А Сымон хоць і кажа, што галоўнае ў чалавека жывот, але галаву таксама беражэ.

*29 сакавіка.* Зьнік Мімікрыйскі. Адны кажуць, што пайшоў на працу й не вярнуўся, а другія сьцьвярджаюць, што наагул нікуды не хадзіў, а з хаты зьнік. Як там было — невядома, а толькі ўсё ягонае майно немцы вывезьлі, а ў кватэру пасадзілі сваіх.

Шмат каму такая рэч не спадабалася.

*30 сакавіка.* Зноў быў у мастакоў ды пісьменьнікаў. Гэтым разам дэманстрацыя собскіх мастацкіх вырабаў была слабая, але затое дыскусія разгарнулася лютая. У адным кутку прыціснулі да сьцяны нейкага паджылага плячыстага аўтара й вымагалі ад яго адказу, чаму ўсе ягоныя героі ў канцы вешаюцца. Той бараніўся як мог.

— Гэта, — казаў, — ня я вінаваты. Так псыхалягічны канец вымагае.

— Дык хіба ў цябе канец заўжды на вяроўцы падвешаны? — насядалі на яго. — Чым ты працуеш?

Плячысты толькі адно й цьвердзіў:

— Інакш не магу — псыхалёгія такая.

А хтось ззаду падліваў атруты ў гэты дыспут. Ён то бараніў псыхалёгію, то крычаў, што аўтара самога трэба павесіць за ягоны псыхалягічны канец. У другім кутку два маладзякі спрачаліся аб тым, хто зь іх больш сьпісвае.

— У цябе няма гістарычнага падыходу, — крычэў вышэйшы, — і ты ня можаш напісаць на гістарычную тэму.

— Не магу, — згаджаўся ніжэйшы, — бо ў мяне ўсе падручнікі зь гісторыі пагарэлі.

— Ці ня ў мой гэта гарод каменьчык?

— Не, гэта каменьчык ня ў Ваш гарод, але ў мяне кніжкі пагарэлі, а ня ў Вас.

Я ўжо хацеў быў паспачуваць ніжэйшаму, якога стыхійнае няшчасьце ссадзіла з гістарычнага сядла, высушыўшы ўсе ягоныя крыніцы, так што цяпер няма адкуль зачэрпнуць літаратурнае вадзіцы, але тым часам падскочыў Арыентацкі, торкнуў мне пальцам у жывот і паказаў:

— А вунь і ваш сваяк.

Гляджу я: моцны дзяцюк, з вусікамі, незнаёмы. Штось не пазнаю. Ён таксама і апавяданьні піша, і падноскамі гандлюе.

— Але ж, выбачайце, я гэтым не займаюся. Я...

Але Арыентацкі ня даў мне часу выказаць сваё абурэньне й паімчаўся да іншай групы. На сярэдзіне пакою грымеў паэта Цымбальскі і ўсё намагаўся прачытаць свае новыя вершы, але яго ніхто ня слухаў. Толькі нейкі пасалавелы музыка дзюбаў

носам у ягонае плячо, відаць, нешта хацеў сказаць, ды ня мог. Да мяне падышоў нейкі маладзяк у вышыванай кашулі й з даўгім валосьсем.

— Вы хто? Прадстаўнік ад масаў? — пытаецца.

— Але ж, кажу, ад масаў.

— Ну, як маса ўспрыняла мой апошні верш?

— Але ж даруйце... З кім маю гонар?

— Алег Верабей — паэта чыстай ліры.

— А прозай вы не спрабавалі? Я прозу больш...

— Прозай? — перапыніў мяне Верабей, — не, не спрабаваў, бо не хачу. А каб захацеў, дык ого! Я так бы прозай чухвосьціў, нібы Дзюма-айцец.

— Так, — кажу, — усё гэта вельмі прыемна, але, на жаль, ня меў гонару чуць Вас.

— Што?! Ня чулі Алега Вераб'я? Што Вы гэтым хочаце сказаць, шаноўны? Можа, Вы хочаце намякнуць, што мяне масы не вызнаюць? Дык я Вам зараз давяду...

І страсянуўшы даўгім валосьсем, ён сьціснуў кулакі й пасунуўся да мяне бліжэй. Трэба праўду сказаць, я спалохаўся. А што дзіўнага, думаю сабе, можа так давесьці, што пасьля й собская жонка не пазнае.

— Даруйце, — кажу, — я маса, але, выбачайце, не зусім маса... я... і... я...

— Стаўце кропку над «і», — загрымеў паэт яшчэ больш узрушана.

— Я... я...

Чым бы скончылася гэтая размова, ня ведаю. Але, на шчасьце, падскочыў Арыентацкі. Ён неяк так спрытна скіраваў гутарку на апошні верш Вераб'я пад назовам «Пляту лапці» й выказаў такое захапленьне ад масаў, што Верабей трохі заспакоіўся. Калі адышоў ад нас, Арыентацкі мяне перасьцярог:

— З гэтым будзь асьцярожны, бо калі не патрапіш у ягоны тон, то можа, браце, і ліхтара паставіць. Ён такі...

Пасьля гэтае размовы я неўзаметку сьлізгануў за дзьверы і ўцёк дахаты. Цікава пабыць у культурнай кумпаніі, але часам бывае й небясьпечна.

*31 сакавіка.* Па нашай парафіі пайшлі чуткі, што новы наш асяленец Камель нешта круціць. Суседка ягоная Азарэіха казала, што нейкую парпяту моблю выдумляе, якая сама будзе круціцца. Гузачыха бажылася, што на свае вочы бачыла, як Камель круціў нейкае кола.

— Затоілася я, — кажа, — пад сьцяной ягонага сьвінушніка й пазіраю ў шчэлку, што ён будзе рабіць. А ён скінуў сьпінжак, закасаў рукавы й пачаў круціць нейкае кола. Крутне й пусьціць, крутне й пусьціць. А пасьля пачаў гаварыць да кола: «Я табе кажу, што само закруцісься». Мяне ажно ў пот кінула. Ну што, думаю, як само закруціцца? Што рабіць? Ці ўцякаць, ці крычэць гвалт? І страшна, і цікава. Але перасіліла сябе й стаю. А ён спацеў, як хорт, а ўсё пакручвае. «Закруцісься, — кажа, — няпраўда». Але, ведама, калясо дурное, само ня круціцца. Паківаецца трохі дый стане. Тут ён як закрычыць: «Круціся! такую ды гэткую, загадваю!» Тут я ўжо ня вытрывала, спудзілася ды ўцякла.

Відаць, баба трохі збрахала, але, у кажным разе, Камлёва таямніца зацікавіла ўсіх, і ягоны хляўчук цяпер сочаць усе людзі.

*1 красавіка.* Цікавая рэч, што сяньня ніхто не ашукваў.

— Навошта ашукваць, — казаў з гэтае прычыны Сымон, — калі сяньня дзяржавы толькі на ашуканстве й трымаюцца. Гэтым сяньня нікога ня зьдзівіш.

Не пашанцавала толькі Апанасу Дзюрцы. Ён ашукаўся й досыць моцна. Яшчэ зранку прыйшоў да Апанаса Яська Разак і паклікаў у кнайпу:

— Сяньня, — кажа, — ты ня маеш адмовіцца, бо сяньня ў мяне вялікая сямейная ўрачыстасьць.

Натуральна, Дзюрка пайшоў, бо хто адмовіцца ад дармаўшчыны. Прыйшлі ў піўніцу, Разак і кажа:

— Ну, браток, замаўляй усё, што хочаш, — усё дадуць.

Дзюрка й пачаў замаўляць: і «маскоўскай», і закусь розную, нават па кавалку пражанага парасяці замовіў. Падсілкаваліся добра. На заканчэньне ўвесь гэты ёмінна-пітны асартымэнт яшчэ й піўком падгладзілі. Цудоўна!

— Ну, плаці ды хадзем, — кажа нарэшце Яська Разак, — мне пара.

І ён устаў ад стала. Дзюрка аслупянеў.

— Як гэта, плаці? Ты ж запрашаў!

— Правільна. Запрашаў я, — кажа Яська, — а замаўляў ты. Гэта я цябе ашукаў — сяньня ж першага красавіка.

І мусіў Апанас выкласьці на стол 980 рублёў. Хацеў ён за такі жарт Яську бутэлькай пагладзіць, але Разака не ашукаеш — ён быў ужо за дзьвярыма.

*3 красавіка.* Надыходзіць сьвята. Усе горача ўзяліся за падрыхтоўку. Юрэц пайшоў на сяло старацца самагону, Рыгор выменяў задок цяляціны за паўпуда солі. Мікіта Гузак і Апанас

Дзюрка ўвесь час перабываюць на рынку, але гешэфт ідзе слабы, бо пераважае гамбурскі тавар, а ёміны бракуе. Горш за ўсё зь яйкамі — 170 рублёў за дзясятак, а ў паёк далі да сьвята толькі па адным яйку. Гэты факт асабліва абурыў Апанаса:

— Ну што я, — кажа, — буду рабіць з адным яйкам? У мяне ж сям'я.

Прафэсар Фэцкі на гэтую справу заглядаецца зь іншага боку:

— Адным больш, адным менш — справа невялікая, — кажа, — але Вы, шаноўны, зьвярніце ўвагу на лік — адно! Чаму адно? Што гэта значыць? Ці ня сымбаль які? А калі сымбаль, дык што ён сымбалізуе? Вось куды трэба ўглядацца. У корань глядзець!

*Янка Юхнавец*

# ЯНО

## ЧАСТКА ПЕРШАЯ

### 1

Ягоная сяліба была крыху далекавата ад вёскі. Дзед Цярэм апрануў вышытую кашулю і падперазаў па ёй белы ўтканы чырвонымі лукаткамі пояс, а тады, узяўшы чачотавы кіёк з качарэжніку, выйшаў на двор. Старажытны зык завесаў у дзьвярох сенцаў каротка хліпнуў на прасьцягу сялібы. На прывязі просьбна заскуголіў калматы сабака-вадаплаў. Цярэм не адразу адвязаў яго: узіраўся праз знаёмыя прагаліны соснаў на дарогу зь Менску. У прагалінах дрэў заўсёды быў відзён далекаваты пачатак дарогі ад ускрайку сталіцы.

Восеньскай парой, у сонечныя дні, Цярэм любіў назіраць за гэтым ушчалопкам дарогі. Яна прасьцінalася па роўнадзі ўзгорку і аб'яўляла, быццам на далоні, кожны рух цялегі, аўтамашыны і чалавека. Восеняй якраз найпрыгажэй атаяўляўся жывы малюнак паміж рамамі з калыхлівых хвояў, што ахвотна ды ўзьнімісta, у шыраце свайго росту пакратваліся пад подзьмухам рэдкага, сьцюдзенаватага ветру.

У канцох дзён верасьня ўздоўж дарогі на вельмі разьбежыстым поплаве дымілася туманістая куравень. Ейную цьвялістасьць не высушваў і не разьдзьмухваў восеньскі сухавей, наадварот, апоўдзені яна да зоркіх Цярэмавых вачэй даносіла зіхаценьне павуцінак, а заходам сонца разлогі паплавоў наўпраткі пад ускраіны Менску залаціліся. У гэткую пару Цярэм жыў сумнай уявай незразумелага жыцьця. Старыя, але яшчэ здаровыя грудзі захопна ўдыхвалі паветра, памагалі сэрцу ўзьнімаць ды апускаць палову цела. Тую палову, якая да самай сьмерці аддадзеная хваляваньню, нянавісьці, любові і спакою, тую, усяляк асягнутую суладзь шорханьня чалавека ў жыцьці.

Чалавечымі вачмі дзед Цярэм глядзеў на заўсёднае і ўторнае, і яно аддавалася яму толькі выпадкам падасьпеласьці зда-

ры. Бо прынукваць сябе знайсьці прыгожыя часіны выключна дзеля чароўнасьці не жадаў. Ён ведаў, што калі прыйдуць гэтыя часіны, і ён апынецца перад імі няўхільна і пажадана, будзе іх любіць, дасягаць, прынамсі, як назіраньне прасьцінку дарогі ў сонечныя дні восеняй. А сумныя ўявы незразумелага жыцьця дзед Цярэм усяляў у думкі адно для прыемнасьці перабраць гады свайго жыцьця, і яно зрабілася ягоным прызвычаем. Бадай, як у кожнага, у яго была глухая скрабіна асталапеньня, ды ён, што не бывае ў кожным, разумеў яе ўсякую пагожасьць — стомны ад яе апыноўваўся з аголенай душой. Але ўсё-такі жадаў і глядзеў на гэтую цьмяна асьвечаную сьцяжыну душы, як на прыгажосьць пасьля выйсьця з падзямельляў, і як на быццам упершыню, незнарокам спатканую ў часе блуканьня…

У зіхаценьні сонечным, на імжыстай істужцы дарогі паказалася зь невялікай будкай брычка. Цярэм зірнуў на яе. Борзда падышоў да сабакі, паказытаў яго каля вушэй, адвязаў з прывязі.

— Хадзем, пара ўжо… хлеб аддадзім, — гаварыў Цярэм сабаку. І ён маўляў разумеў гаспадарову гутарку, падскокваў радасна, зусім нязлоўна, хваціста спраўляўся ў падскоку аблізваць Цярэмаву бараду і шчокі. Вочы сабакі праныруста адгадвалі Цярэмаў наўмер.

— Утаймуйся, стары звадыяш! Не стамляй мяне! — папрасіў Цярэм і пакрочыў хутчэй да селавога пляцу.

Сабака супакоіўся, марудным бегам раўняўся з хадой Цярэма. За гусьцінёй хвояў яшчэ не віднеліся стрэхі сяла, але ў моўкнасьць сьценяў хвой, і на жвірыстую, зьежджаную калёсамі дарогу, па якой сяляне езьдзілі да лесу, і на ўтаптаную ім жа, Цярэмам, за колькі дзясяткаў год на ўзбочыне сьцяжынку даносіліся ўскрыкі дзяцей і глухі сьмех дарослых. Сяльчане ўжо даўно сабраліся на сьцяж каля старой сьвятыні. Сьвятыні там не было, але памяць пра сьвятое месца казаў дубовы пачарнелы крыж… Маладзейшыя апранутыя ледзь-ледзь па-сьвяточнаму, а старэйшыя жанкі й мужчыны зышліся ў звычайным будным апраньні. Яны, усе апаленыя летнім сонцам, жартавалі паміж сабой, расказвалі што-небудзь якраз адпаведнае да выпадку дня. Сонца над імі яшчэ заставалася ў сваёй здаровай прамяністасьці й цеплыні. Дзяўчаты, як быццам «пошчак гэтых прамянёў», бесклапотна адклікаліся кожнаму хлапцу. Яны, маладыя, не разумелі добра, дзеля чаго іх неспакмечана стрымоўваюць у гурме пажылыя аднасяльчане. Калі б усё задуманае зьявілася ў іхных галовах, яны б, напэўна, не зрабілі гэтага,

а калі б і зрабілі, дык сонечная пусьціня нябёсаў і сам сьцяж, дзе яны стаяць, папаўзьлі б, зьліліся б у адну песьню сэрцаў, выкрутлівых знакаў на зямлі ад абцасаў ці нават ад босых пяткаў — ускіпела б яно цепрасьцяй танцу.

Дзед Цярэм выйшаў зь ляснога прамежку і яшчэ раз, уторна, зірнуў на дарогу. Кагадзе на палове адлегласьці шляху да сяла ён добра бачыў брычку і вазара з круціста падціснутымі пад сябе нагамі. Белы і чорны коні імкнулі ў суладнай наўзавадзе. Бялясты пыл расьсьцілаўся за брычкай, як скамечаная ветрам хмара перад навальніцай, і ў чыстай бяздоннасьці небасхілу, здаецца, рос рухлівай жменяй імкненьня, падтакваў існаваньню ўшчалопку адносінаў да тых, хто сабраўся на плячы селавым і чакаў іх на спатканьне.

Дзед Цярэм прыплюснуў вочы, але яснае надвор'е не выдала затуленых у брычцы. Адзадзя вазара вісела рудаватая коўдра і завешвала ўваход да сярэдзіны.

— Пачакай, Мурза, хай едуць, — папярэдзіў ён сабаку і сеў на абочыне дарогі. Мурза расьцягнуўся каля ягоных ног і пазіраў убок грукату брычкі.

— Мы потым падыдзем, калі пачнецца, — зноў зьвярнуўся Цярэм да сабакі й пагладзіў яго каля вушэй.

Неўзабаве аблепленая, чорная ад усялячыны, зь няроўнымі калёсамі праімкнула наводдалі брычка. Цярэм памалу з сабакам пайшоў усьлед ёй. На вярбінах і таполях паўзбоч вуліцы несуцішна крычэлі шпакі перад адлётам у вырай, і званіста вуркалі індыкі на дзядзінцах.

Цярэм незнарокам падумаў пра гэтае вольнае жыцьцё істоты. Думкі гаратліва круціліся ў галаве без тлумачэньня, запальвалі ягоную самалюбасьць.

Ён прыпыніўся на першых кроках прыціхлага сьцяжу. Бы зь цікавасьці, глянуў на постаці гасьцей, што некалькі часінаў даўчасу прыехалі і вылезьлі з брычкі. Іх было трое... Цярэм не пайшоў да астатніх. Думка, што была зь ім неразлучна ад пачатку вайны, падмовіла не далучацца да аднасяльчанаў. І ён, не ўважаючы на завіхныя маханьні рук сялян із скрайку гурмы, пайшоў адтуль...

На сьцяжы, пасьля спатканьня былога палкоўніка з хлебам і соляй і калі мінула ўрэплівае напружаньне гасьціннасьці ды цікавага агляданьня іх, сяльчане заварушыліся. Наступнай чарадоўкай пашаноты была прамова старшыні мясцовае воласьці. Старшыня ў прывітаньні пажадаў адчуць шчасьлівае будучае. Саракапяцігадовы палкоўнік падзякаваў сяльчанам трыма

разьдзеленымі словамі звычайнай падзякі: «Шчыра… дзякую… вам».

Цісkануў руку старшыні воласьці й палез ізноў да залапленай, вельмі апраўдна збудаванай будкі на брычцы. На ім была паўвайсковая вопратка на польскі лад. І калі б ён гутарыў нядобра па-беларуску, яго, напэўна, б залічылі да палякаў, хоць гэтакі намер у некаторых ужо зьяўляўся і моўк у скабках грудзей.

Палкоўнікавае захаваньне было асаблівае — збытліва выхаванае. Вочы стрыгалі празорыста па кожным, і ў іх сьвяцілася дацятлівасьць: што яно значыць? Гэтыя дзьве павярхоўныя якасьці не выдавалі й не акурацілі яго перад панурым позіркам сялян. Але палкоўнік найбольш губляў норму суладнасьці ў хадзе: ступаў, бадай, балючымі ранамі на ступнях — мэханічна-цудоўна не дазваляў злавіць адным зіркам ягоны поступ. Ён бы палохаўся стаць на зямлю цьвярдзістай хадзьбой, усё неяк вывертліва даторкваўся яе, як на сталёвых спругах.

А дзьвюх жанчынаў, што разам зь ім прыехалі, сяльчане прылучылі за ягоных дачок. Адна была высокая, поўная і на схоп вока каля дваццаці двух год. Яе сьціснутыя вусны чамусьці пазнаваліся азначэньнем знаходжаньня ў сэрцы моўкнай пакуты, і не пераажытай, а нясёнай далей у посапе дзён. Не было і ятранасьці ў яе вялікіх вачох — яны, мабыць, зжыліся з часам, пакідаючы толькі працьвень сіне-азяровых зрэнак. Другая была, як называюць у Беларусі, дзяўчаро і адно ведала насуплена, безраздумна пазіраць на ўсіх і на ўсё аднолькава.

Жанчыны таксама ўлезьлі да будкі. Яны адзначыліся, як і палкоўнік, сьціпласьцяй, адмовілі старшыні воласьці падсадзіць іх на брычку. Вазар асьцярожна сеў на сваё мізэрнае, бы гняздо, месца, стрымна прытрымаў ногі, што ледзь не ўпіраліся хвастоў коняў, сьцебануў паўразмашыста па самых іхных сярэдзінах, паехаў паўз расступіўшыхся сялян і, як толькі абмінуў натоўп, зноў падагнуў пад сябе стомленыя ад напругі ногі, яшчэ раз ямчэй размахнуўся пугай, папрастаў коней прысадай на другі канец сяла да сялібы сярод старых ліпаў. Дарогу туды ён не забыўся, ведаў яе даўно. Ён вяртаўся туды, бы да свайго роднага кутка.

2

Цярэм чуўся задаволеным. Ён вельмі часта падчас бяды й суму любіў выказацца свайму махнатаму сябру Мурзу, і той тады пад гуд Цярэмавых слоў драмаў каля ягоных ног. Але зімою Цярэм ня гутарыў з сабакам, запальваў агонь на каптурку, са-

дзіўся на ўслоне і перачытваў старыя нямецкія выданьні па прыродазнаўстве, выпадкам чытаў балонкі й з францускіх выданьняў па мэтэаралёгіі, аднак, паколькі францускую мову ведаў горай, дык уся намога правесьці свае вячоркі лажылася на зьмест беларускіх і расейскіх кніжак. Усялякія здабыткі веды, укладзеныя ў гэтыя выданьні, былі тысячу разоў знаёмыя дзеду, але яму хацелася перачытваць іх зноў, як толькі ахінала ненадзвычайная часіна — часіна ўражаньня сьмерці. І яны дапамагалі яму вызваліцца ад надаедлівай загадкі адыходу чалавека ў іншы сьвет.

— Я стары ўжо, — чутна адчыняў ён таемнасьць свайго сэрца Мурзу і клаў кніжку на паліцу. Сабака лагодна віляў хвастом і, не падымаючы галавы з-паміж лап, абводзіў кароткім зіркам Цярэма. І, дазваляючы агню на каптурку пагаснуць самому, ішлі абое спаць: адзін на ляжанку, а другі пад стол. Узімку дзед не пакідаў Мурзу на дварэ.

— Красьці ў нас няма чаго. Будзем спаць і сьніць рай, — жартаваў Цярэм, і ў хаце хутка рабілася стульна, гострая да неспакою зацягвалася ціхінь.

Вяртаючыся дахаты зь селавога пляцу, Цярэму ўспомніўся зімовы вечар перад Калядамі, не ў сваёй хаце, а ў старшыні саўгасу. Успомніліся ўсе рухі й стравы і нават спрэчка з Міхасём і старшынём пра цярпеньні жывёлаў ды чалавека. Упершыню за ўвесь час жыцьця дарослага чалавека сьціснуў плачна вусны, сьлёзы сплылі нястрымна.

— Мой родны любы Міхась!.. Хоць бы раз яшчэ ўбачыцца перад сьмерцяй… Памру, Мурза… штосьці часьцей мроіцца пра сьмерць… а Міхася няма. Хто пахавае, мой ты безьязыкі, а?..

Цярэм завярнуўся і ўзьлескам пайшоў да прагаліны, празь якую да расстаньня зь Міхасём любіў пазіраць на дарогу зь Менску. Сеў там на пень. Вельмі прынукна азіраў дарогу. Ейны прасьцяг не парушаў аніхто вандроўны. Цярэм жадаў цярпець ейную паражнечу. Яму было прыемна-стомна глядзець на выпадковыя ўзьлёты пылу ад подзьмуху мацнейшага ветру.

— Бадай, вянчаецца ім, — прагаманіў ён навакольнай моўкнасьці сваю турботу, а тады, не азіраючыся больш на дарогу, устаў з пня, накіраваўся да сваёй палоскі, пасеянай палеткам ячменю і некалькімі даўгімі базорнамі бульбы. У канцы палоскі, пазірней да хаты, ён паставіў тры калоды дзікіх пчол, што прывёз зь лесу. Пчолы перад надыходам ночы ў густой мітусьні лёталі блізка каля дуплістых каранёў. Цярэм паслухаў іхнае жудзеньне, якое нават з адлегласьці чыста далятала да ягоных ву-

шэй. Зь цяжкім прадчуваньнем чагосьці, быццам благога, ён хацеў стаяць тут, недалёка ад іх, і ўтаймоўвацца сваім шорахным пачуцьцём. Яно ніколі не прыходзіла яму раней, але кадзе сьціскала яго, як мора скалыненьні собскіх хваляў. Сонца, параўняўшыся зь небакраем, і закрэпшыя ад падкапцелай сінявы некалькі хмурынак рабілі зь дзедавай паляны, абкружанай лесам, уяву казкавай калыскі. Ад уражаньня Цярэм расставіў ногі, усклікнуў:

— Калыхніся! Калыхніся, мая калыска!

Мурза насьцярожліва загаўкаў у бок сялібы.

— Сьціхні…

Мурза, наадварот, не перастаў, а, гаўкаючы, пабег наўпрасткі да хаты, але Цярэм крыкнуў на яго, прымусіў вярнуцца.

— Напэўна, дакарыць прыйшлі… Знайшлі пругло, бессаромныя. Хлеб і соль зарабляюць, а ня доруць…

Цярэм не пабарзьдзіў дахаты. У ім у той вечар, і толькі ў той адзіна-адзіны, жыла абыякавасьць. Яна, прынукная і неспадзеўная, блыталася ў чымсьці зусім апрычоным ад усяго мінулага.

Мурза зноў загаўкаў. Цярэм усьміхнуўся яму… Няведамка, ускалыхнуўшыся ўсёй постацяй, зірнуў на медзяністую бляскату хмурынак у сьцюдзёным спакоі неба.

— Чаго азіраесься, мой дарагі?

— Міха-а-ась!

І на часіну яны абое замоўклі. Без аднаго шораху стаялі адзін перад другім. Ахамянуўся Цярэм і, падганяны ўсё тым надумленым намерам, падышоў да Міхася. Яны абое заплакалі, доўга не разыходзіліся з абдымак спатканьня.

Упобач селі на ганку.

— Жывем яшчэ — мацуемся, — загаварыў Міхась і шчасьлівымі, іскрыстымі ад сьлёз вачыма агледзеў Цярэма.

— Змарнеў, Міхаська. Твар зрабіўся як васковы і бы макам пасыпаны… Барада адрасла, як у мяне…

Цярэм дрыготнай рукой пахлопаў па Міхасёвым усплеччы й да канца гутаркі трымаў яе на тым самым месцы, увесь час перабіраючы пальцамі жорсткую тканіну бруднага шыняля з адпоранымі прышыўкамі вайсковага лекара.

— Цяпер буду клікаць цябе сынам… толькі сынам.

— Дзякую, мой заўсёды родны, — радасна адказаў Міхась.

— Кадзе што каля таго пня быў. Я абкарыў яго, і ён асмалелы сядзіць, не гніе. Але навошта ўторваць вядомае, усёдна ня будзем ведаць, хто бацькі твае…

Цярэм шчыльней прысунуўся да Міхася.

— Мой родны Міхась, каб ты не вярнуўся гэтак зналуску, мабыць, болей я ня жыў бы. Я зрабіўся, Міхась, дзіваком. Плаклівай жанчынай зрабіўся…

Цярэмаў твар ахваціўся застыглымі маршчакамі й блядым колерам.

— Міхась, я сяньня гадзін колькі даўчасу жыў думкай самагубца… самай сапраўднай, а ня ўяўнай.

Прымоўк, як быццам яго душыла задуха. Міхась карціва шмаргануў брудным рукавом па сваім успацелым чале.

— Сын, я мушу сказаць усё… усё, каб не пакутаваць потым ад гэтага неспадзеўнага… Але павер, думка самагубства зьявілася ў мяне не як туманісты морак уявы, а як прысутнасьць нечага жывога, аднак, без жаданьня жыць. Штосьці зь перапынкамі ціха ўваходзіла ў думкі й прыпамятоўвала аб патрэбным ды няўхільным, а тады адыходзіла, дазваляла ўсяму гэтаму спусьціцца ў развой развагі. А развага торыла згоду карыснасьці такой дзеі: забі сябе! Ты непатрэбны. Ты перашкаджаеш жыць таму, пра каго клапаціўся. І гэтак бесьперастанку, пакуль не спаткаўся з табой. Як ты ў пару, мой дарагі! Не таму, што астануся жыць, а таму, што спаткаў цябе жывога!.. Буду жыць дзеля цябе!

— Будзем — як заўсёды! — адказаў Міхась, прыціскаючы да сябе Цярэма.

— Я, напэўна, ад радасьці прызнаўся табе... Уставай — хадзем у хату… Ах, жыцьцё. Жыцьцё!

Цярэм устаў з ганку. Пачатая ім гутарка больш узрушала яго самога. Ён у сапраўднасьці, у часіны спатканьня, яшчэ адчуваў зьнібу ўяваў самагубства. Яны пераканалі яго ў іхнай неабходнасьці ў жыцьці, і нічога бакаватага для іх тлумачэньня ён шукаць ня думаў.

Памог Міхасю распрануць шынель. Ад задавальненьня спатканьнем Цярэм міжволі адчуваў у ім поўную россвіць жыцьця.

— Я ледзь не сказаў па старым прызвычаі: будзь госьцем!..

Гаманіў няспынна Цярэм, а Міхась ад ласкі, як хлапчук, толькі шчыра ды згодна ўсьміхаўся ў адказ.

— Я пачынаю дзяцініцца, Міхась, — мабыць, час на гэта, — за якіх два гады мне восемдзесят год будзе.

— Ты не зьмяніўся ад часу нашага растаньня. Выглядаеш яшчэ хваткім і здаровым, — паспрабаваў Міхась зьбянтэжыць Цярэмаву пэўнасьць.

— Сын, не хлусі!.. Апрача дзяцінства пакрыху шкодным семеруком раблюся, — не адыходзячы ад вешалкі, размаўляў

Цярэм. — Надысь кацянят утапіў у возеры, бо ня мог глядзець і слухаць, як яны пішчэлі ў кутку, недарэчлівыя, сьляпыя, корпаліся, цягнуліся ссаць кошку. Так із скарсьцяй і балтыхнуў усіх на дно. Мне здавалася, яны зьдзекуюцца з майго жыцьця, нада мной старым, і то хто? Кацянё!.. Ты, Міхась, сядай, ня слухай маю гамазьню. Трэба есьці табе, а ня гутаркі… Мабыць, ад радасьці нацёўп табе… Сядай, Міхасю.

Міхась сеў на старэнькае, рыплівае, абцягнутае аўчынкай хатняга вырабу крэсла, перад якім быў расьсьцелены кілімчык з рысевай шкуры. Цярэм пачаў гаспадараваць каля прыпечку.

— Ты нават па-сьвяточнаму апрануты. Што, гадавое сьвята сяньня? — спытаў Міхась.

— О не. Гэта, мабыць, і ёсьць здара, што прымусіла мяне перад тваім зваротам звар'яцела думаць… Мне старшыня воласьці ўрочыў паднесьці хлеб і соль сыну Сконтавай, ён з Польшчы вярнуўся, а я йшоў і не дайшоў, завярнуўся з самага пляцу дахаты, бо ўсё выдуманае ўявілася мне гэткім брудлівым і невыносным: спатыкай смаргача нейкага, ды яшчэ мне, старому чалавеку…

Цярэм махнуў рукой.

— Міхась, ты лепш пра сябе скажы: скуль і як да нашае хаты вярнуўся?

— Бадай што даплёўся, а не вярнуўся. Зусім недалёка, у Васюкоўшчыне, у палоне быў. Калі ўдалося ўцячы адтуль, дык тыдзень туляняўся ў наўкольных барох — усё здавалася, пад кожным кустом немец вартуе і вось-вось зловіць мяне. Кожны мізэрны трэск, нават пад сваёй нагой зломленая зналуска патарчака, палохаў. І тады я ўцякаў ад таго месца абы куды. Стамляўся — валіўся на зямлю. Прыслухваесься: дзяцел стукае на сухастоіне, ды больш мучае спрага і голад. Замест нашага сяла блізку да самага Барысава дайшоў. А потым прызвычаіўся, і сполах трымаўся, як перасьцярога.

Цярэм засьмяяўся, схапіўшы слова «перасьцярога». Ён некаторы прамежак часу, пакуль засьцілаў абрус, падносіў міскі са стравай, торыў гэтае слова.

— Перасьцярога… Сядай, Міхась, паеж.

Міхась сеў за стол, а побач яго на канцы ўслона — Цярэм.

— Гэта Боская перасьцярога, а ня страху, сын.

Міхась маўчаў. У худых грудзёх чулася біцьцё сэрца, якое нібы п'янела ад асабістага неспакою, рабіла ўсю постаць адсутнасьцяй. Пачаў есьці.

— Перасьцярога, сын! Каб не яна, — і дзед Цярэм пасьля гэтага сказу сербануў страву, — я можа б спалымнеў у сваёй хаце.

Рука Цярэмава затраслася, ён апусьціў лыжку ў міску і малымі, зіхрыстымі ад зусім іншых пяклівых сьлёз вачыма глянуў на Міхася.

— Я жадаў зьнішчыць сябе: падпаліць хату, выгнаць сабаку, а тады сесьці і гарэць разам з хатай. Мне адчувалася гэтак патрэбным яно і добрым, што я не знаходзіў іншага выйсьця… Парупіла мяне да гэтага і загад сустракаць сына Сконтавай… Ах, Міхась, ня слухай мяне.

— А я думаю, самагубства — самая найлепшая зьява ў чалавеку: ён апыноўваецца сярод яе з душой парываньня настрою. Настрою сутнасьці жыцьця, што раптам зьявіўся зь неадоленым супрацівам, бо, па-мойму, чалавек ад прыроды вельмі няўмелы, лянівы да супраціву злу…

— А ўсё-такі, — умяшаўся маркотна Цярэм, — гэта ёсьць банкруцтва апяянай душы, у чым вось пераканаўся назаўсёды.

— Можа, я не дарэшты ўявіў страшную вартасьць загубленага жыцьця собскім жаданьнем, але яно ўва ўсе надары — ахвярны пратэст супраць немагчымага…

— Па-мойму, Міхась, яно — ступень да сваёй немагчымасьці, чымсьці да грамадзтва. Я мяркую: яно — санлівасьць, лядайкасьць чалавечага розуму.

— О не! Наперакор твайму перакананьню мне здаецца, што самагубства ёсьць намога ўкараніць памяцяй для іншых значэньне нястворанага раю ў жыцьці...

— Ты хочаш сказаць: стварыць мінуўшчыну? Але мінулае адклікаецца ў чалавеку, блізкога да таго часу, а не ў далёкіх нашчадкаў, бо нашчадкі любяць узяць ад мінулага толькі досьвед, а не дарыць спачуваньні.

— Тады вы, родны, пераменіліся. Гэта зусім ня тое, што калісьці казалі мне пра інстынкты. Вы даводзілі цьвярдую існасьць пераходу інстынкту не ў заўсёднае дзеяньне, а ў зразуменьне.

— Сёрбай страву — астыне, — прапанаваў, усьміхнуўшыся, Цярэм. — Мы, гутарачы, запаўзьлі не туды, куды трэба… Але вельмі добра, што сяньняшняя дурная нагода сьмерці перамянілася тваёй перасьцярогай.

Цярэм яшчэ раз, нясьцерпна, балазе ў радасьці, пахлопаў па Міхасёвым плячы. У аднаго і ў другога яна была нібы адвечная. Замоўклі — пачалі есьці.

Міхася пачатая незнарок на першым кроку спатканьня Цярэмава гутарка хвалявала, і ён падрыхтавана паглядзеў ізноў на яго сьсівелую, схіленую над міскай галаву.

— А як мой родны глядзіць на гэтакі выпадак жыцьця? Папаўшыся ў палон, я апынуўся там сьведкам аднэй зьявы. Перад гэтым мушу сказаць, што там нас некалькі чалавек абсуджвала нагоду ўцёку, але ў кожнага, хто жадаў уцякаць, скаліся розныя меркаваньні: кожны даводзіў хітрасьць і выхаднасьць сваёй дзеі. Так цягнулася доўга, і яно, нарэшце, надаела мне, і я вырашыў дзейнічаць сам…

— Яно крыху маладушна, але ў некаторых выпадках, калі няма агульнага меркаваньня, дзейнічай сам на сваю ўмеласьць, і гэта вельмі, бязь ліку прыносіць карысьць як для сябе, таксама і іншым, — умяшаўся ў гутарку Цярэм, бы з канцылярскім, бы з судовым азначэньнем.

— Але ня ў гэтым сутнасьць, — працягваў Міхась, — якраз мая адлука не прынесла мне перамогі, а надзвычайны выпадак, у якім — іх шмат такіх — усьцьвітвае ўся суровасьць і лагоднасьць становішча людзей у вякох… Аднойчы, позна ўвечары, тыдзень даўчасу, я быў заведзены вартавым на прыбіраньне гасподы камэнданта лягеру. Перад тым як я кончыў усю загаданую работу і чакаў ізноў на вартавога ў кутку пачакальні, барзьлівым крокам уваходзіць мой знаёмы змоўшчык, лейтэнант Ганевіч. Ён, убачыўшы мяне, спытаўся: «Камэндант тут?» Адказваю: «Але». У ягоным пытаньні, як заўсёды ад часу знаёмства, чуўся той самы неадолены спакой празірнага і сьцюдзёнага афіцэра. «Адамчык, пакуль ня позна, ідзеце самі да бараку, бо ці ня вашага вартавога кадзе што задушыў паміж баракаў». Я моўк перад ім, як ёлап, і трымаў, няведама навошта, працягнуўшы да яго руку. «Ідзеце, Адамчык, дзеля чаго вам гінуць?» І прайшоў некалькі крокаў да выхаду, перад тым калі адчыніліся дзьверы камэндантавае гасподы. Я азірнуўся, стаў і глядзеў не на Ганевіча, а на задымлены цыгаркай прастор гасподы, скуль па-ранейшаму праз радыё гучэла музыка Бэтховэна. На парогу стаяў сам немец; ён, мабыць, пачуўшы нашу гутарку, пацікавіўся паглядзець. Зьбянтэжаны неспадзеўнасьцяй, нават без папярэджаньня да гэтага, я падняў угару рукі. Ягоныя вочы і ўзмашны позірк Ганевіча азірнулі мяне. Ганевіч зацеміў: «Гэты палонны не пры чым. Ён не разумее па-нямецку. Кіньце яго тут або адашлеце да барака». «За ім прыйдзе вартавы», — крыху асягнуўшым голасам тлумачыць камэндант. «Перад тым як забіць вас, я жадаў бы спытацца ў вас… — і Ганевіч, магчы-

ма, зразумеўшы сваю неасьцярогу, пабарзьдзіў абвясьціць мне: «Зашчапеце ўваходныя дзьверы… Камэндант, скажэце, я ў поўным праве адказаць вам тым самым учынкам, які вы кожны дзень творыце над намі, ці не?»

Камэндант маўчаў, але па руху маршчакоў на твары заўважалася: ён штосьці жадаў адказаць. Аднак Ганевіч пачакаў, урывіста працягваў гутар надалей:

— Гэта ня ёсьць мая помста вам, а мера перасьцярогі, і то не для собскага жыцьця і шчасьця, а дзеля асьцярогі і пашаны жыцьця іншых… Я не кажу да вас, ушчэмлены словамі, падасьпелымі адно цяпер. Скажэце, ці ёсьць злачынства нацыі, калі яна абараняецца ад злачынства іншае нацыі?

— Нямеччына абараняецца ад захопу, і мы робім гэтак, як вы сказалі, — адказаў камэндант Ганевічу, махнуўшы празьмерным схінам галавы. Неспакметна ўслухваўся ў гукі на знадворку, пачаў мацнавата стукаць абцасамі аб пярэчыны парогу, часьцей абапірацца ўсплеччам то на адзін, то на другі вушак дзьвярэй.

Ганевіч назіраў і чакаў ягонае гутаркі, але камэндант моўк, ці не ад незразумеласьці Ганевічавага стаўленьня, або, можа, прыкідваўся. Моўкнуў і я, бо мне што?

— Усё? — пытліва глянуў Ганевіч і паскрабаў пальцам бакавіну пісталета. — Вы любіце пашаноту да абароны айчыннай улады? Абараняецеся ад ворагаў захопамі?

Камэндант загаманіў ахватней:

— А дзе ж вы здабылі пісталет?.. Хаця, даруйце, не адказвайце на гэта… Я шаную вас як патрыёта і нават малю вас шанаваць мяне такім самым. Мы вось гэтай часінай жывем адзіным адчуваньнем… Вы можаце застрэліць мяне, але што прынясе вам мая сьмерць?

— А што прыносіць вам забойства нас?

— Я прымушаны быць гэткім.

— Вы апраўдваецеся, што цяперака вайна, і жаўнер забываецца пра ўладу, што паслала яго на сьмерць, а ведае толькі: дзесьці наўперадзе сьмерць ад чужацкіх жаўнераў, ён рупіцца ўхіліцца яе не сваёй сьмерцяй?

— Я сказаў: прымушаны… Аднак наводлесьць учынкаў робіць людзей нікчэмнымі — будзе мой адказ на ваша.

— Каб забіць вас, я паміж парожніх баракаў задушыў вашага жаўнера…

— А калі б я задушыў вас?

— Нічога! Сьмерць!.. Але мне шкада, — загаварыў Ганевіч больш упэўнена, — астатніх палонных, якія могуць загінуць за

вашу сьмерць. Я пакідаю вам жыцьцё із зарукаў, што дазволіце мне справідлова абараніцца ад усіх назолаў мае Айчыны не як патрыёту, а як чалавеку, каторы ведае змаганьне ў звычайным, сьціплым значэньні: перасьцярога жыцьця іншых…

— Добра, — адказаў камэндант, — я абяцаю вывесьці вас за вароты лягеру. Сьведкам няхай будзе сябра па палоне, і ён хай таксама ідзе на волю. Задавальняецеся маёй шчырасьцяй ці не?

— Згодзен.

— Калі не давяраеце маёй прапанове, забярэце і мой пісталет, я падпераджу толькі дзягу з кабурой, як патрабуе ўніформа.

— Згодзен.

Неяк п’яна згаджаўся Ганевіч. І да самага выйсьця, заплеценых дратамі варот зь лягеру, яны ня гутарылі. Камэндант ішоў наўперадзе, а за ім я, Ганевіч адзадзя. Бадай кожную часіну ўсьцяж загародаў цемень ночы прарэзвалі рэфлектары. Подзьмух ветру журыў паміж дратамі й прамежкамі баракаў. Чуць гэтае журэньне было горш, чымсьці бачыць нейкую прывідзь з чартамі. Я жадаў папярэдзіць Ганевіча асьцярожнасьцяй, але не знаходзіў слоў — ішоў, бы на расстрэл. Некалькі крокаў ад вартавой праходкі ў лягер Ганевіч зьвярнуўся да камэнданта:

— Скажэце, гэр, калі б усе палонныя, прынамсі, і за дратамі жылі, маглі б яны знайсьці сабе тутака волю, непрынуку і шчасьце людзей ці не?

— Маглі б, — адказаў камэндант зь нехаванай уражлівай дрыготкай у голасе.

Мяне пачала цьвяліць гэтая непрынятлівая, змрочная зваротка «скажэце». У мяне потым ажно ўціхамірылася перакананьне, што ён, Ганевіч, звычайны выскачань і дурань. Ад блізасьці прастору за дратамі я ледзь ня крыкнуў яму: «Сьціхні, асталапень!».

— … і ты даверыўся немцу, як дурасьлівае ягня ваўку, — зазначыў усхваляваны Цярэм. Але Міхась гаварыў, не звярачаючы на Цярэмавы словы. Ён уцэльваў зусім нядаўна ўбачаную скразьніцу ў цемрадзі жыцьця.

— Вы, можа, палохаецеся за зьдзяйсьненьне абяцанага? Я магу адвесьці вас за лягер, далей ад вартавых, — зьвярнуўся камэндант да Ганевіча.

Ганевіч упершыню ператлумачыў мне ягоную гутарку, хоць я і сам дакладна ўсё разумеў, але ў няволі не прызнаваўся веданьнем нямецкай мовы. Я адказаў удзячна і вывучальна, што мне ўсёедна. Аднак у душы жадаў, каб камэндант правёў нас на

адлегласьць ад лягеру. Мне хацелася жыць. Толькі адна думка пра гэта лялела ў маёй галаве.

За неадлеглым узгоркам каля лягеру камэндант спытаўся ў Ганевіча:

— А цяпер застрэліце мяне ці не?

Я адышоўся ад іх. Азірнуўся. Агарнуў сорам трусьлівасьці. Прыпыніўся.

— Не, гэр камэндант, — пачулася шчыплівае Ганевічава абяцаньне. — Я, можа, спаткаюся з вамі ў будучыні на чэсных гонях ходаньня…

— Я люблю вас за гэта. Да будучага спатканьня… Але прашу аддаць мой пісталет… і запамятайце яшчэ раз: наводлесьць учынкаў чалавека супраць чалавека робіць яго нікчэмным. І гэтак: будзем сябрамі й людзьмі… Палажэце мой пісталет, бо ён зараджаны, а самі ідзеце.

— Але, гэр камэндант, — сказаў насьмешліва Ганевіч і выняў столку набояў зь пісталета. — Можаце ўзяць з маіх рук, дзеля чаго брудзіць зямлёй?

— Пацісьнем яму руку — ды прэч ад яго, — прапанаваў я Ганевічу зводальку. Ён згадзіўся і працягнуў першым руку на разьвітаньне. Камэндант усё яшчэ ўкладаў пісталет.

— Ах, гэты пісталет. Ня ўлазіць, мабыць, пабольшаў у вашых руках. — І ў прокмець, не прыпынены анікім з нас, прыклаў да скроні рульку. Я злавіў з гуку стрэлу шчымок стрымгка ў пісталеце. Камэндант недарэчліва асунуўся на зямлю. Ён застрэліўся. Напэўна, у рульцы быў набой. Я пабег. Мяне гнала адчуваньне жыцьця і свабоды. Ганевіч аставаўся стаяць каля камэнданта. Уторны стрэл. Я зразумеў, што здарылася. Ганевіч таксама кончыў самагубствам, ці не з таго, каб за камэнданта не расстралялі іншых палонных. Па цёмным навакольлі густа зацыўкалі асьвячальныя кулі.

…Міхась замоўк. Позіркна азірнуў Цярэма. Да балонак вакон, перакрыжаваных зеленаватымі рамамі, ужо даўно прыліпла ноч. Па сьцяне назнадворку зашкрабала кошка і, падлезшы да падваконьніка, высунуўшы ў сьвятло пярэстую пыску, вымяўквала ўлезьці ў хату. Міхась адчыніў створку акна, упусьціў яе. Неахвотна загаўкаў Мурза, рассыплівым перазванам адклікнуўся яму ланцуг. Цярэм сядзеў занураны ў задуменнасьць і нячутна крэсьліў пазногцем па стале.

— Я думаю, Міхась, што гэта імгненьне жыцьця нічога табе не падкажа… Ды ці патрэбна параўноўваць яго да размаху жыцьця? Тут усё пераплялося: калючы дрот навокал лягеру з

тваім маладушшам, а зь іхным велікадушшам, а палымністасьць характараў із скорсьцяй імкненьня зьдзейсьніць, што пераконвала вас усіх… А карацей: вы ўсе трое асьвялыя рыцары-рыцарчыкі, — нібы незадаволена, нібы толькі каб спыніць дражлівую гутарку, узважна сказаў Цярэм і пайшоў засьцілаць ляжанку й ложак.

— Лажыся спаць, Міхась, адпачывай.

3

Небасхон на ўсходзе нават не ірдзеўся лёгкімі накідамі золаку раніцы, але Цярэм ужо ня спаў. Ён ціхенька ўстаў, каб не разбудзіць Міхася, і пачаў падрыхтоўваць паляўнічыя рэчы: сеткі, пасткі і розныя зьвязаныя ўвочкі-вяровачкі. Таемнасьць Цярэмавага паляваньня аставалася пры ім, ён не клапаціўся навучаць ёй хоць бы Міхася. Ён крыху злаваўся на сваіх бацькоў за тое, што калісьці навучылі разумець замежныя мовы і розныя ўмеласьці паляваньня, але нічому іншаму не прынуквалі. У сапраўднасьці ім не было абходным прыладжваць Цярэма да чагосьці іншага, бо былі людзі заможныя і карцілі толькі карысьцяй з гаспадаркі ды навінамі за мяжой і ў сваёй краіне. Зь цягам часу іхная праглівая адданасьць роднаму месцу і асабістаму спакою сярод паўнотасьці ўсялякіх рашучасьцяў і неспакояў у сьвеце перадалася яму. І яно нават перавярнулася ў большую, чымсьці ў бацькоў, патрэбу і палахлівасьць ледзь не ад кожнага здарэньня: ці яно было змушаным, ці яно было налапам у жыцьці…

Папраўдзе, Цярэму жадалася разбудзіць Міхася й павесьці разам з сабой да лесу й стаўкоў, але, глянуўшы на яго худы, стомлены твар, ухіліўся свайго намеру. І толькі, каб Міхась ведаў, дзе ён дзеўся, паклаў на крэсьле ліст паперы, у якім напісаў: «З усходам сонца вярнуся. На паляваньне пайшоў».

Цярэм затушыў маленькую капцілку, выйшаў з хаты. Паклапаціўся, каб дзьверы сеняў ня скрыпнулі — прычыніў іх, узьнімаючы вышэй на завесах. Гэтак быў дораг спакой Міхася. І ён, як быццам ад нейкай вялікай удачы, паглядзеў шчасьліва на зачыненыя бяз скрыпу дзьверы.

Мурза пачуў яго — ланцужная прывязь абсыпалася глухім дзіньканьнем. Выскачыў з будкі, выгнуў пацяжна сярэдзіну, прыветліва замахаў хвастом.

— Ці-і-ш-ш, — папярэдзіў Цярэм і адчапіў яго.

Найперш Цярэм папрастаў да стаўкоў. Рэдкія восеньскія зоры сьвяціліся, як праз галіны лесу ці праз дзіравую страху

будоўлі. Высокае трысьцё ад стаўкоў льсьціла даўгаватымі ўрэзамі ажно ў пусталесьсе ўзьбярэжжа. На самым прастору найбольшага стаўка чарнеліся закрэмсіны абточкаў чароту. Цярэм адамкнуў човен ад дубовага пня, упусьціў у яго сабаку, бяз плёханьня, з дапамогай вясла сапхнуўся зь мелі на паўнаводзь. Хутка каля абточкаў у стаўку ціхінь адклікнулася ўскрыкам і хлопаньнем крыл дзікай качкі. Ёй адклікнуліся крыкі з суседніх расплываў стаўка. Над галавой прашамацела некалькі ўзьляцеўшых качак і чаранак. Чаранкі рэзьліва цыўгалі й на ўзьбярэжжы ў трысьці. Але каля абточкаў у цемнаце ўсё яшчэ працягвалася плёханьне вады. Там Цярэм нанач пасадзіў калісьці злоўленага качанём дзікага качара і неглыбока, пад самай зьверхняй вады, парасьцягваў сеткі, у якія заблытваліся качкі, падплываючы ці сядаючы зь лёту. Іх прыманьваў туды падсаджаны качар. Сеткі былі вынайдзены самім Цярэмам, і таемнасьць іхная аставалася неразгаданай, хоць часта, у іншыя ночы, іх падглядвалі аднасяльчане.

Злоўленыя качкі рваліся зь сеткі, але стуль ні адна ўжо не вылятала жывой: дзед кожнай адкруціў галаву й кінуў да Мурзы, які тых, хто яшчэ хлопаў крыламі, падціскаў пад свае моцныя лапы.

У тую ноч Цярэм злавіў ажно шэсьць качак. Забраў качара да клеткі, зьвязаў мокрыя сеткі, павеславаў да берага. Задушаных качак ён паклаў у мяшок і падвязаў да Мурзы — перавешваючы празь ягоную сярэдзіну. Замкнуў човен і пайшоў да лесу. Там таксама ён трымаў пасткі з прынадамі, але часта яны былі парожнія. Некалькі агледжаных зь іх былі парожнімі і ў тое надраньне. Цярэм ведаў, што прыйшоў да іх прадчасна, таму і не клапаціўся абыходзіць кожную — пайшоў да раскіданай сярод поля капы грэчкі, дзе паклаў грудкамі намочаны ў гарэлцы гарох. Схаваўся з Мурзам пад кустом палявое лазы і пачаў чакаць. У полі, як заўсёды перад раньнем, вадрыў моцным і прычэплівым пахам жнеўнік. Ён перамешваўся з вогкасьцяй восеньскай пары. На ўсходнім скрайку неба сталі памалу цьвіцецца шызасьцяй плоймы хмараў. Вершаліны лесу аддзельваліся ад узвысяў. Надыходзіў сьвітанак, і ён, здаецца, яшчэ больш распаўсюджваў моўкнасьць прастору зямлі й неба. У гэткія часіны Цярэм апыноўваўся ў людзкой бязьмежнасьці: ён думаў пра ўсё і пра ўсіх, але ніколі пра сябе.

З глыбакаватых выймаў, абсыпаных вынесеным вадой пяском, падымалася віхрыстая сырыца. Ейныя сівыя разьдзеленыя пылінкі Цярэм дакладна бачыў, калі яны падляталі да яго...

Дзесьці ў канцы палос, каля лесу, захлопалі памашыста крылы птушкі — і зноў па-восеньску панура й смутна аставалася навокал.

Ужо зусім абкрэпла сьветлая сінь, але журавоў, хоць бы іхнага курлыканьня ў паднябёсах, не было. Цярэм не чакаў болей, бо ў пісульцы абяцаў Міхасю вярнуцца дамоў з усходам сонца. Склаў раскіданую грэчку ў капу й пашкадаваў намочаныя ў гарэлцы насёны.

Палявая дарога знаходзілася ня вельмі далёка ад месца паляваньня, таму яму надумалася вяртацца па ёй дахаты. Запоны абвіслых хмар, што былі ўночы, зьнікалі клубістым дымам, і далёка адбеглыя паміж сабой, вельмі шпарка ляцелі на небакрай, адрываючы выцягнутыя ўскрайкі. Палявая дарога праходзіла паўзбоч двору палкоўніка Сконтаўта. І па ёй, ня гледзячы, што было рана, гэтаксама, як і Цярэм, але вярхом на кані ехаў чалавек. На белым кані. Цярэм адразу адгадаў, што гэта едзе палкоўнік.

— Дабрыслаў Бог! — прывітаўся ён, як толькі параўняўся з палкоўнікам. Але той не адказаў на прывітаньне. Спыніў каня й спытаўся ў яго сьведчаньня асабістасьці.

— Няма пры сабе… Я з паляваньня, спадару… Я мясцовы чалавек — зь сяла гэтага…

— На лбе ня бачу!.. Што падвесіў на сабаку?

— Качкі дзікія, — растлумачыў шчыра дзед і яшчэ раз прыветліва ўсьміхнуўся. Палкоўнік асочна азіраў Цярэма.

— Што, настраляў? А дзе ж зброя?

— Я лаўлю іх жывымі…

— Яны ж лётаюць — што пляцеш, старэча?

Цярэм не сказаў, якім спосабам налавіў дзікіх качак. «Свая таемнасьць — моц перад іншымі», — трымаўся ў яго асабісты выснавак.

— Расьцягні мяшок — пакажы…

Цярэм паказаў пальцам на высунутыя зь мяшка лапкі качак.

— А зь імі што?

— Нічо-ога.

— А дзе злавілі іх?

— Тут недалёка стаўкі ёсьць. Калісьці ў вашай мамы адкупіў іх адзін лесавод, ён там жадаў зрабіць, як быццам, пералётны прытулак для вадаплаўных птушак, але не падсьпеў, іншыя часы настталі…

Палкоўнік спыніў Цярэма ня словам, а сьціганьнем бізуна.

— Завошта, спадару?.. Я ж ня зьвер!? — непарушна зь месца і непахілены ад болю, спытаўся Цярэм. У вачох ясьнілася

крыўда, чамусьці напагатаваная адчуваць сваю прызьнібу без супраціву, ажно да самага канца, пакуль ягонаму ворагу надаесьць зло. А палкоўнік яшчэ горш ачуніў сваю злосьць. Ён толькі адзін ведаў, чаму яна прыйшла да яго падчас спатканьня зь Цярэмам. Ён ня спаў цэлую ноч пасьля спрэчкі з жанчынай, зь якой прыехаў. А калі надышла раніца, наўмерыў расьцярушыцца праездкай па дарозе ад двара ў поле. Едучы ў ахалодзе раніцы, ён шмат думаў пра тое, што яна сказала яму. Паміж імі жыла скрыпаная доля дзён...

— Абарванец стары! Чаго ходзіш рана? Чаго?.. Адвыкні!.. — сквірліва скрыкнуў палкоўнік ды зноў сьцегануў Цярэма па ўсплеччы.

— Я ня ведаў... — нарэшце папрасіўся Цярэм. — Калі гэтак — забярэце качак... Забярэце!..

Тады Сконтаўт глянуў зусім па-іншаму. Ён, як быццам артыст на сцэне, перамяніў сваю ролю. Саскочыў з каня, борзда падышоў абняць Цярэма. Але Мурза ятра, із спрытнасьцяй аддандай жывёлы, рынуўся на палкоўніка і зьбіў яго з ног. Ён разарваў палкоўнікаў шанаваны паўвайсковы мундур. Конь падкінуў зад і, адбегшы ад непаладу, пацерушыў да двара. Цярэм адцягнуў сабаку ад крыўдніка.

— Даруйце мне! Я вас не за гэта... Ах, памяць гадоў — старэча, прабач напасьніку!..

— Бог з табой! — адразу адыходзячы, ня зьдзіўлена сказаў Цярэм.

Над лукаткамі верхалін лесу, што блізка дабягалі да сяла, падняўся, ня сьлепячы, паўкруг сонца. Міхась ня спаў. Спакмеціў дзедаву запіску, прачытаў яе і палажыў на скрай стала. Хутка вярнуўся і Цярэм. Ранішняе прывітаньне зь Міхасём было як слова з прасоньня. Цярэм не сказаў яму пра неспадзеўнае спатканьне каля сялібы палкоўніка. Ён вырашыў не запальваць злосьцяй маладое сэрца гадаванца — палохаўся помсты. Ён пачаў гутарку пра зусім іншае.

— Міхась, мой любы Міхась. Мы ўчора гаманілі пра непатрэбнае... а самае дарагое прапусьцілі... Сорамна мне: не спытаўся пра тваю жонку, пра сынка твайго.

— Жыла каля Віцебску... Хто іх ведае, як цяпер зь імі. Супакоіцца крыху — пачну шукаць... Найперш трэба здабыць дакумэнты асабістасьці...

— Дакумэнты? — перапытаў Цярэм і зараз жа палез у шуфляду па свой пашпарт і паклаў да кішэні. А мяшок з качкамі шпурнуў пад прыпечак.

— Нeяк агадаем усё. Дабудзем тысячы справак і пашпартаў.

— Дзякую. Зь лягеру мяне ня будуць шукаць, бо я няволіўся там бяз запісаў — на колькасьць пальцаў спраўджваўся.

Цярэм распрануў зарасьнелую вопратку і, скручаную абы-як, камком, кінуў пад лаву каля сьцяны. Гэтак ніколі не рабілася раней. Падышоў да сплеценай з саломы скрыначкі й выняў старое, прысланае Міхасём пісьмо.

— Не магу сабе дараваць за тое, што ўчора не спытаўся пра сына й жонку тваю. Гэта ж вялікі грэх, ды яшчэ каму — старому чалавеку…

Цярэм сеў у мяккае, скрыпучае крэсла з разасланым прад ім рысявым кілімам. Ён хваляваўся. «Дарагі дзед!..» Прыпыніўся. Голас задрыжэў. Яму жадалася плакаць. Глынуў сьліну й агля-нуўся на Міхася, ён прымошчваўся каля рукамытніка галіцца. Міхась азірнуўся, але дзедаву прайменную часіну не спакмеціў.

«Дарагі дзед!.. — уторыў зноў Цярэм. — Найперш паведамляю маё няшчасьце: на дыплёмных экзаменах згарэў, і то на якім спакмяне, каб ты ведаў? На звычайных чарвякох, што ядуць нас. Сьмешна, дзед, праўда? Але астатнія здаў на вельмі добра. А на «пагарах» дазволілі восеняй зрабіць паўторныя экзамены й абараніць адначасова дыплём. Я пакажу ім, хто я… Ды, мабыць, ва ўсім вінаватая дзяўчына з-пад Віцебску. Яна таксама вучыцца тут. Справядлівей, дзед, яна «трускае на раялі», а вечарам, апрача гэтага, нават пакручваецца пяткамі на сцэне… І вось я ехаў і не даехаў да цябе — яна «зацягнула» да сваіх. Бо казала: «Навошта турбаваць дзеда? Лепш да мяне паедзем, там мой тата з працоўнага дырэктарам лесапілкі выскачыў, дык паглядзім ягоную важнасьць…» І я паехаў».

— Не чытай, мой родны! — папрасіў Міхась. І, жадаючы ўхіліцца слухаць далей, дабавіў: — Бадай, ад гэтага шарсьціньне на твары вырасла…

Зь ёканьнем павёў брытвай па густа зрослай барадзе.

…У Цярэма дзіўна злучвалася гордасьць і пакора перад атрыманай зьнявагай ад палкоўніка. Ён не зусім поўнай сьведамасьцяй захаваньня шукаў узьдзеяньня на сябе, каб барджджэй прагнаць згнібу. Яна імкнула яго давесьці праз чытаньне ліста да іншага хараства ў непрыемнасьці. Ён думаў прачытаць увесь ліст, аднак, пачуўшы супярэчлівую просьбу Міхася, папрасіў дачытаць толькі канец ліста.

«...Надысь памагаў маёй паважанай цешчы купіць на нядзельным кірмашы пеўніка. Купілі досыць сытага, але не пашанцавала. Пеўнік быў вашывы. Пакуль цешча несла яго да

гасподы, добрая жменя вашанкоў перапаўзла да яе. Няшчасная душа доўга пацярэблівала кожнае месца ў сябе… І не сьцярпеў — выявіў турботу, безумоўна, сказаў праз дачку, што няхай, маўляў, маці добра памыецца і пераапранецца, пакуль пойдзе спаць. Вось як сьцегануў! Яна, напэўна, падумала, што я ўжо сапраўдны лекар і, задаволеная тым, «падаравала» мне ейную дачку… Дзед, я ажаніўся… Я ўжо гаспадар сям'і, праўда, дзед? Праўда! Цалую дзеда. Твой Міхась».

Цярэм кончыў чытаць. Міхась маўчаў. Яго кволіла мінулае шчасьце. Нават пашкадаваў, што не дазволіў прачытаць дзеду ўвесь ліст. У сардэчнай волі зьяўляўся да яго спакой зыркай уявы: незагойная рана мінулых перажываньняў.

4

Пасьля сьнеданьня Цярэм прапанаваў Міхасю пайсьці да царквы. Пра гэта ён падумаў ужо, яшчэ будучы на паляваньні, і цяперака, калі на панадворку ў дрымотным настроі ціхаці раньня паляцеў зь сяла зманлівы звой званістасьці званоў, Цярэм пабарзьдзіў Міхася.

Царква была ў селавым клюбе, на скрайку сяла, якраз па вуліцы да палкоўнікавага двара. Чыста выгабляваны крыж высіўся над ейным уваходам. Ганак быў шырокі і з абгародкай, пафарбаванай на зялёны колер. Наводшыбе ад яго, з нарсьцівым размахам сучча, вышэзныя, пасаджаныя блізка міжсобку расьлі дзьве ліпіны. На прыбітай да іх накрыж планцы віселі абрэзаныя гарматныя гільзы — гэта была званіца. Людзі чамусьці гурмой стаялі перад царквою і глядзелі на адол. Некаторыя адзаднія журна азірнулі Міхася й Цярэма ды зноў выцягнулі шыі да позірку на ранейшае месца. Зварот Міхася дадому, відаць, ня вельмі цікавіў аднасяльчанаў. Сярод гурмы замкнулася напружнасьць, толькі час-часам парушаная ўздыханьнем жанок і ўрывістай гамонкай мужчынаў. Адзін зь іх, ужо стараваты, што стаяў крыху наводдалі ад усіх, махам галавы прывітаўся зь Цярэмам і сказаў навіну:

— Нехта ўначы нябожчыка падставіў…

— Нябожчыка? — упэўніўся Цярэм і адначасна такім самым пахінам перамяніўся прывітаньнем з тым чалавекам.

З зысуненым на палавіну векам каля ганку стаяла дамавіна. У ёй на палатнянай, вышытай па краёх падушцы бялеўся нябожчыкаў твар. Хто ён, ніхто ня ведаў, і аб тым, хто яго прынёс сюды ўночы, таксама не было як меркаваць ці дадумоўвацца на каго.

Тады выйшаў з царквы сьвятар, апрануты на набажэнства. Міхась пазнаў старога сьвятара, што калісьці, пасьля разбурэньня сьвятыні на селавым сыцяжы, прыкідваўся прыдуркаватым, каб упасьціся высылкі зь Беларусі. У ягонай злунелай постаці й выглядзе цяпер нельга было пазнаць ранейшага, зь церпнасьцяй ношанага захаваньня. Толькі ягоная хада ўжо спакволілася непажаданай стомай і няпэўнасьцяй, а адчышчаны да зіхценьня золата крыж дрыгацеў у рукох, што, складзеныя наўперадзе, азначваліся, як вылепліны з воску.

— Нясеце ўсярэдзіну, — сказаў ён хмурліва ды зноў пахінена пайшоў да сьвятыні. — …і Сьвятога Духа… Амін.

Быццам стрэсены з вуснаў «амін» уразіў Міхася. Штосьці ў значэньні сьвятога слова было парожняе, як і ў імю гэтага няведамага чалавека.

Неадразу між гурмы знайшліся ахвотныя падняць дамавіну і занесьці ў сьвятыню. Людзі глумяна пераглядаліся. Тады Цярэм зьвярнуўся да Міхася, але ён якраз сам зьбіраўся падысьці да дамавіны — прасіў расступіцца. Усе пакінулі гаманіць і з патаемным, зрэшты, сумлеўным пераканаsucceeded: хто наступны? — глядзелі на Міхася й Цярэма. Тая прокмець супакою была, бы прызвычаеная журнасьць восені ў садзе, які можа толькі ўчора абтрэсьлі ад позьняга ўраджаю, але шмат яшчэ лісьця на дрэвах, яно гэтаксама, як улетку, нячутна выхапляе з прастору шумлівасьць свае песьні — лёгкае ад пладзіні, ня хоча супярэчыць подзьмуху ветру… ды наадварот ўсяму спадзяваньню: пажоўклае, ляціць на зямлю і шасьціць па ейным прасьцягу.

Праз расчыненыя дзьверы царквы плыў водар ладану й воску. Ніводзін з малельнікаў не ўваходзіў туды. Усе моўкна дазвалялі ўвайсьці найпершым невядомаму, у дамавіне.

Нарэшце, наўперад дамавіны, да ўзгалоўку падышла жанчына. Яна, маладая, і быццам ужо ведала пра спатканьне смутку, была апранутая ў паўхаўтурны гарнітур. Гэта была, хто яе ведае, дачка ці палкоўнікава жонка.

— Хто паможа мне? — спыталася яна ў бліжэйшых.

— Чаго цябе… туды-ы? — густым голасам адгукнулася дзяўчына, што прыйшла разам зь ёй.

— Ды я. Чаго баяцца? — пагадзіўся памогай і пытаньнем кульгавы з мыліцаю селянін і скрануў скрай дамавіны. — Нясем! Як жа гэтак? Нежывога хоць пашануйце!..

У царкве Міхась апынуўся побач жанчыны з двара. Яна, смутлівая, з застыглымі вачыма, нейкі час стаяла крыху адздзя ад Міхася. І яго сярод уразы ненадзвычайнага спатканьня

зь нябожчыкам усё-ткі прынуквала цікавасьць зірнуць на ейныя моўкна-рухлівыя вусны, што выдавалі шчырасьць апыненьня перад сьвятымі абразамі, прыгожа абвешанымі сялянскімі карункамі й тканінамі з рознымі чырвонымі й чарнаватымі на іх лукаткамі. Наўзбоччы ад яе, на падпорцы бэлькі, пацямнелы, але зь вельмі выразьлівымі аценьвамі, вісеў абраз нейкай сьвятой. І ў тым прыгожым аджытым і ў яшчэ існуючым вобразе была найбліжэйшая сапраўднасьць існасьці людзкое падобы. А гэта жывая і памерлая бытнасьць зьявілася Міхасю існай дапытлівасьцяй. З гэтым пачуцьцём ён прастаяў усё ранішняе набажэнства: скрадліва пазіраў на жанчыну з двара.

Яна адвярнулася на прокмець у бок Міхася, і іхныя позіркі сустрэліся. Ейныя белазорыя вялікія зрэнкі, абхопленыя жаўцістымі кружкамі, а затым стрыманыя зігтлівасьцяй белае эмалі самога вока, паволі, па-жаночаму хаваючыся ў сьціпласьці, аглядзелі яго. Нос лёгка ўзьняты, разьдзельваў справядліва шчокі, якія сумерна да ўсяе постаці крыху худзілі твар, але былі кранутыя карцівым сьценем здароўя, ад чаго яна рабілася — нат пры самым кароткім зірку — чароўнай і надоўга помненай.

Міхась уцеміў веданьне незвычайнага прызначэньня. Ён не закахаўся ёй, а толькі адчуў натхнёнасьць ад людзкога прыгаства, гэтую не прыгнаную ў такіх здарэньнях, нямотную чуткасьць бясхібнае веры ў вялікую ахову хараства й любасьці. «Бессупярэчлівае ў ёй», — падумаў ён… і падумаць далей не здарылася — падышла яна.

— Выбачайце, мо' ведаеце, хто ён?

— Аніяк.

Пахінам аблічча яна паказала на дамавіну. Спыталася:

— А ці магу папрасіць вашэцінай памогі паглядзець на яго?

— Так.

Міхася заманіла ейная роўная гладзіня лобу, што стугла лягла ад усьмеху й удзячнасьці, ейныя поўна-густыя бялясыя, закручаныя куклай валасы.

Міхась зьняў века дамавіны. Цярэм зводдальку шапнуў: «Ня рушце», — але яго не пачулі. Нябожчык быў апрануты ў вайсковыя нагавіцы і хатняга вырабу кашулю. Босы. Уся дамавіна ўсярэдзіне абабітая палатном. Міхасёва незнаёмка пачала прыладжваць на кашулі не ўсе зашпіленыя гузікі, і тады яна спасьцерагла: даўняя рана, ужо абмытая кімсьці, значылася на целе маладога чалавека.

— Застрэлены, — нагнуўшыся, сказаў Міхась, — …і блізу дзень таму, ня больш.

— Можа, знаеце яго?

— Ніяк.

Тады яна расхінула куртку і зьняла свой нагрудны крыжык. Папрасіла Міхася падняць галаву нябожчыка. Надзяючы крыжык, яны абое напаткалі пад асуненымі далонямі лісткі паперы й паміж іх невялікі квадрацік срабрыстае бляхі з выбітым нумарам і сымбалем савецкай авіяцыі.

...Ранішняе набажэнства канчалася. Сярод сьвятых і просьбных словаў стаяў нябожчык, як быццам нямотны сьведка чагосьці непазнанага ў жыцьці. Вадрыў мацней ладан і воск. Міхась расхінуў лісткі. Першая паперка была пераламаная й пацертая на кантах. Там называлася прозьвішча й імя забітага ды месца ягонага паходжаньня дзесьці з Магілёўскіх мясьцінаў. На другім лістку із сшытка былі напісаныя два стаўбцы словаў зь вельмі незразумелым разьвіцьцём мэты і зьместу. Магчыма, яны і былі ў простай сувязі з гэтым ужо закалелым чалавекам, бо там на пачатку першай абодкі была напісана зацемка: «Радкамі з твайго дзёньніка — багаслаўляем».

«Ці ёсьць здрада нявольнай нацыі перад кім-небудзь, хто пануе над ёй?.. А хоць бы тэрор, калі толькі гэтая рада патрабавалася ў змаганьні за незалежнасьць?»

У другой абодцы яшчэ больш супярэчлівая думка, але ў дакладнасьці і першыя, і другія радкі не разьвейвалі своеасаблівасьцяў напісанага: «...ён чуе, што яго б'юць, робяць болесьць, але ён затойвае сваю помсту да наступнай болесьці, наагул, хітруе: пакінь толькі жывым мяне, і я паспрабую зрабіць табе тое самае, а цяпер я кленчу, пераношу пакуту... Я толькі жаласьлівы прамежак перад табой. І ў ім я працягваю руку, каб змусіць цябе згледзець тваю асьлепленасьць, неадступнасьць у намеры, каб гэтым спыніць зьдзек зь мяне... А тады я абаранюся, о, абаранюся! Але інакш: прыйду помсьлівым і мо' лагодным бажком да цябе».

І дапісана, у вадступе пад выпісамі, цынічна й злачынна: «Ну, як ты думаеш, паміраючы: напэўна, сьмерць забірае цябе, а нікога іншага, а? Ты гэтак думаеш, або не? Накш, гідкі здрадніку, накш, ці не? Маўчыш? Гэта й было трэба табе: замоўкнуць і ляжаць падлай. Хто падбярэ цябе? А?..»

Міхась перадаў лісткі незнаёмай жанчыне. Ён пабачыў, як у часе чытаньня набеглі і згаціліся сьлёзы за ейнымі павекамі і як у іхнай празорасьці сьвяціліся маленькія махры сьвечак.

Людзі зноў пачалі гурміцца навакол дамавіны, некаторыя, больш баязкія, барзьдзілі пакінуць царкву.

— Я думаю, войча, усе дакумэнты выняць і пакінуць пад аховай царквы, бо яны-ы… тут усё што толькі захочаце чуць, — выказала свае меркаваньні незнаёмая жанчына зусім незразумела сьвятару і рэшце прысутных.

— Амін… Усёдна трэба пахаваць. Хто паможа мне? — папрасіў сьвятар.

— Я.

— І я.

Згадзіліся два хлапцы. Здаравенны хлапец, што згадзіўся першы памагчы, папрасіў перачытаць, што напісана ў лістках. Лісткі й сьведчаньні асабістасьці прачыталі ўсім.

— Дзякую вам, спадару, — на разьвітаньне сказала незнаёмая Міхасю, а тады: — Хадзем, Ганя, — паклікала дзяўчыну, зь якой прыйшла разам да царквы.

Ганя перахрысьцілася першай і скасіла вочы, каб бачыць, ці глядзяць за ёй, і выставіла жанчыне язык. Міхась убачыў ягоную цьвіласьць, падумаў: «Падлётак мае нястраўнасьць».

— Алена, як табе ня сорам прыкідвацца старой, праведнай манашкай?.. Я скажу ўсё Барысу, хай усё-ткі возьме цябе ў рукі! Сорам, Алена, сорам! Гэта ж абразок ня твой, а Барысаў падарунак… Навошта надзела на нейкага валацугу? — учарэплівалася Ганя ціхой сваркай, пакуль ішлі да надворку з царквы.

Яны былі родныя сёстры, родныя і вельмі, вельмі непадобныя. Алена не адказвала Гані. Яна ня радзьва праймалася ейнымі кпінамі, не заўважала яе каля сябе.

На панадворку ж, бы зналуску, Алена спаткала зусім іншае здарэньне. Пад самымі званамі з гільзаў стаяў сам Барыс-палкоўнік і, няведама дзеля чаго, падвесьліва на руцэ трымаў кашулю і шапку. Ганя, як заўсёды празірыстая, паказала яго Алене:

— Вунь і ён — рыхтуйся! — гардліва, ужо даўно знаёмай пагардай, урэзьвіла сястру, выклікаючы гэтым самым для свайго сэрца канечную спакусу падрастаючае жанчыны; а ў ім, у сэрцы, было зацікаўленьне бязь ліку ведамае Алене ў асабістым затайкаваным назірку. Ганя гэтаму пачуцьцю аддавалася чыста й справядліва, ані ня думаючы аб падозраньні разуменьня яе сястрою. Яна абсудлівым, бадай розумам дарослага даўмявала прылуку непагоднасьці паміж Аленай і палкоўнікам, таму зь вялікай задавольнасьцяй чакала ад усяго гэтага сабе карысных вынікаў.

— Што вы робіце тут? Я ж нешта ня бачыла вас у царкве, мо' прыйшлі сустрэць нас?

Палкоўнік прыгнетліва глядзеў на сёстраў, асабліва на Алену, бо Ганя ўсьміхнулася яму пры спатканьні і ўжо была занятая назіраньнем людзей, што памалу выходзілі з царквы.

— Алена...

І ён доўга ня мог дабраць патрэбнага слова да гэтага, бы згубленага, зваротка. Ён быў увесь у тую часіну ў адчуваньні прыяваў жыцьця, адна зь якіх прынуквала ягоісьці на згоду з Аленай.

— Алена, — ён зноў зьвярнуўся да яе, але з упэўненым голасам, — навошта я пакутую? Навошта?

Ганя ўчалопілася на яго з усёй прагнасьцяй пачуць неспадзяванку, аднак палкоўнік працягваў далей:

— Скажы: ты бачыш маё становішча, вось кагадзе, ці не? Скажы, Алена, скажы! Я гатовы зьнесьці ўсякі твой адказ...

Шчырая чырвань легла на Аленін твар, і Алена чула ейны цёплы выліў, а вочы, і так ужо адзеленыя выразьлівасьцяй, глядзелі цяпер на яго нязводнай і вялікай, хоць і зьбянтэжанай рашучасьцяй: даверліва і ўзбудрожана чакала душа чагосьці, не наводле ўсяго папярэдняга. Маўклівіла.

— Ня хочаш адказаць? Я цярплю, Алена, і магу цярпець яшчэ. Магу цярпець бясконца... Дакляруй толькі, што ня будзеш змушаць мяне на такія ўчынкі. Падакляруй, Алена.

— На якія гэтакія ўчынкі?

— Няўжо ты ня бачыш? Ты ж змусіла, паклікала мяне рабіць гэтак!.. — і палкоўнік патрос на руцэ рэчы. — Я прынёс аддаць іх бедным, а яны ніводзін не падышлі да мяне і не папрасілі... Я цалюткае раньне стаю тутака... Я ня здольны на гэта, ня здольны!.. Ах, Алена, Алена! Ці ж за гэта толькі думаеш кахаць?

— Хадзем, — усьміхнулася яна.

Алена вычувала надуманае палкоўнікам бясхібна.

Другі раз ад часу знаёмства ў Варшаве ўзяла яго пад руку. Яму спадабалася ейнае скаланеньне на абліччы: яно абяцала зусім спадзеўную асалоду, яно быццам забірала ўсё ягонае ліха і ня кідала ў перадчасны смутак. Такая лікоўная сутань спынілася ў яго сэрцы: жадалася ўзяць яе на рукі і несьці ажно да двара і крычэць на ўсіх, хто маніўся б не схіліцца перад ёй. Ён разумеў яе, маўляў, вернутае жыцьцё да цела памерлага, і цяперака глядзеў на яе ня так, як калісьці, а адкрытна: у ім адклікаліся пачуцьці найбольшага болю за штосьці вечна дарагое й любае. Яго запэўнівалі нават ейныя крокі. У іхным ступаньні побач зь ім, здавалася, была ня водгуль іх, а вялікая гаманкая

даверлівасьць адданасьці, адданасьці яму назаўсёды. Не сьцярпеў, загаварыў:

— Алюся, ты зрабіла зь мяне юнака... Няўжо ты не кахаеш мяне?

Алена не адказала. Палкоўнік узбудрожна сьціснуў мацней ейную далонь.

Ганя нецямлівая, але зусім зь іншым плёнам уражаньня, ішла адлегла за імі. Яна журліва глядзела на ўзбочныя дрэвы, што як выветраныя цягліцы зямлі і таксама разьдзеленыя адно ад аднаго ўздымаліся, голыя й галіністыя каля вуліцы.

5

Да самага двара палкоўнік і Алена ішлі бязгутарныя. Палкоўнік, увесь выкліканы, яшчэ там, каля сьвятыні, ня ведаў у здушнасьці шчасьця, як захоўвацца да яе. Ён вельмі добра ведаў ейную абурлівасьць пры кожным ягоным неасьцярожным спрабаваньні дабіцца ад яе чагосьці канчальнага, хоць бы і непажаданага адказу, але зыркага сярод узьніклых адносінаў паміж імі.

Палкоўнік закахаўся Аленай ад першага спатканьня зь ёй у Варшаве падчас нямецка-польскай вайны, калі ён, пераапрануты ў сялянскую вопратку, стомлены й зусім ня маючы спадзяваньня нейкага іншага звароту падзеяў на сьвеце, варачаўся да сваіх «крэсаў».

— Алюся, жыві як хочаш... але не пакідай мяне, не цурайся, не ўцякай адгэтуль!..

Пад узьдзеяй Аленінай ахвоты: ісьці разам зь ім ізь сьвятыні, нават маўклівай, — была празьмерная моц захапленьня выказацца, што ён зусім забыўся на палахлівасьць, якая знаходзілася ў ім ад мінулых намогаў дабіцца ад яе хоць бы невыносных патрабаваньняў ці абяцаньняў. Але апрача таго, што справіўся сказаць, ён ня здолеў больш гутарыць... Каля двара падхапіў Алену на ўлоньне, прыціснуў усю да грудзёў і панёс гэтак ажно да свайго габінэту.

Яна не супраціўлялася. Не выпускаючы яе, сеў на асунутую канапу, і тады яму спакмеціўся ў ейных вачох той, заўсёды азярысты й адоньлівы, спакой.

— Што жадаеш, Барыс?

У сьцягу даўгаватага жыцьця побач зь ёй упершыню пачуў ад яе сваё імя.

— Я памагла табе шмат чаго дабіцца, і, прынамсі, цяпер ёсьць патрэба гутарыць пра гэта, бо мяркую: скажаш — але!.. Ды я

ведаю, што пасьля таго як я зрабілася фольксдойчкай, каб вярнуць табе двор па памерлай мацеры, ты прагнеш цяпер ад мяне іншага… Я вельмі ўдзячна табе за гэта цярплівае каханьне. Я ведаю: ты закахаўся ў мяне тады, калі я, зь першым днём выбуху вайны з палякамі, была прагнаная з працы гаспадыняй-немкай, якая чамусьці прыехала зь Нямеччыны жыць у Варшаву. Пра крыўду, а яе было шмат, дужа шмат, я не сказала польскім уладам. Я мусіла… Ды што я кажу — мусіла… Нават хоць бы і ня быў ёю зроблены для мяне і Гані той гадкі ўчынак, я асталася б ёй удзячнай. Яна каля пяці год таму назад, калі мы прыйшлі ў Варшаву знайсьці астанкі памерлага ў польскай турме бацькі, узяла нас галодных, абарваных да сябе. Яна ўтрымоўвала нас і выхоўвала. І цяпер паверылі: немка! Лекары-немцы — ажно сьмех! — пацьвердзілі, што я гэтакая, а ня іншая. Ды пра гэта ты ўжо ведаеш. Я жадаю, Барыс, сказаць табе: тое, што ўтарыла кагадзе, усё дзеля таго, каб крыху пасарамаціць цябе, а мо' звычайна церабіла язык: бо ж трэба ў міжчасе надумацца, каб сказаць штосьці неабходнае… Трэба, Барыс, трэба — гэтая пара ўжо надышла! Пара, мой Барыська!.. Але пусьці мяне, сама магу сядзець…

Алена, як пяшчотнае дзіцяня, уставілася позіркам на палкоўніка. Ён, усё не выпускаючы яе з прыпольля, абхапіў дрыготнымі рукамі ейныя плечы і пачаў цалаваць на іх вопратку, а потым адной напругай, лёгка, ледзь-ледзь узьняўшы яе перад сабой, пасадзіў побач. Аленіна няўкора смуціла яго. Неставала мінулага раздольства жарсьлівага шэпту жанчыны ў самы твар.

Алена зноў загаварыла.

— Барыс, я ведаю, чаго ты хочаш ад мяне… ведаю. Вы, як мыш, скрабяцеся да нейкага здабытку, прагрызваеце кімсьці зробленую будоўлю над ім, каб задаволіць сваю патрэбу і ўнаднасьць. Але ня дай Бог, што вы пакідаеце потым! Вы можаце пакінуць зусім няўражлівую атоліну — смурод і шумецьце… Вось і ўсё! Не! Ня ўсё яшчэ! Тое, што я сказала, ня дзеля мяне ёсьцека. Гэта маё меркаваньне пра цябе на будучае. Ты перакаваесься ў ім і, напэўна, яшчэ больш укарэнісься ў ім. Ці цеміш, чаму ў Варшаве, калі ўсё палымнела ад бомбаў, я зачапіла цябе? Ведаеш ці не — скажы?

— Алюся, мне ляпей слухаць цябе, чымсьці адказваць…

— Ах, Барыс, даруй! Я радая тваім сёньняшнім учынкам, дык таму наказала шмат, шмат, і зусім ужо ня памятаю, пра што казала… Даруй, Барыс!

— Ты мышай зрабіла мяне.

— Ты ўсё-ткі прагнеш ведаць, што гэта значыць? Не, я не скажу! Некалісьці сам сябе ўбачыш… Барыс, шчырае дзякуй табе, што асталася тады, у пошуках гроша на кавалак хлеба, чыстая, незурочная, зь неабтрэсенай душой… Гэта ж тады я падышла да цябе прадацца, бо не адважылася прапанавацца якому-небудзь варшаўскаму Антэку. Надумалася: давай падхаплю вясковага цяляпая. Ажно, як памятаеш, ты і сам шукаў ратунку… Ды і пра гэта стане! Ты лепей скажы: памятаеш, як мяне і Ганю пасылаў на «ўсходнія крэсы», калі туды прыйшлі бальшавікі, ці мо' забыўся? А можа, памятаеш, як каля Лукаў, у лесе, паказваў нам бронзавую брошку і казаў: яна ўся залатая, і аддам яе вам, калі даведаецеся, што робіцца на маім хутары і дзе мая мама ёсьцека, — памятаеш?.. Але я бяз гэтага жадала прынесьці табе ўсякую помач, звычайна, без усялякіх аплатаў, бо мяне, бедную, галодную, цягнула тварыць нейкую дабрадзейнасьць людзям… Ты не саромся, Барыс, не хіні галавы… Я жадаю, Барыс, застацца мнішкай без манастыра! Старой мнішкай, як сяньня сказала мая родная сястра. Яна, бадай, адкапала пайсткі маіх грудзей. Ты мусіш з гэтым пагадзіцца… Паабяцай, дарагі, што будзеш згодзен… Паабяцай, любы!..

Невядомая ніколі раней урачыстасьць, што зьявілася да палкоўніка яшчэ там, каля царквы, зноў прапала. Узлакаціўшы твар над каленямі, сядзеў у раздумнасьці. Гутарка Аленіна яго, саракапяцігадовага мужчыну, ня вельмі сарамаціла. Ён пераважна ў тую кароткую часіну развагі наўмерваўся пахітрыць да Алены.

— Алюся, упершыню ты па-сапраўднаму адважылася гутарыць пра нашую ўзаемнасьць, але ты, мабыць, жартуеш зь мяне, скажы таксама, што гэтак, а не інакш. А калі так, дык, па-мойму, ты не сказала ўсё. Тут ёсьцека штосьці недакладнае…

— Усё дакладна, Барыс, — не дакладзеш і не аднімеш! Запісалася з табой, але быць жонкай тваёй не хачу, хачу быць мнішкай без манастыра!.. А ты думаў, што я неяк абаб'юся і буду з табой дзяцей лічыць?..

— Алюся, ты і так са мной, у маім двары.

— Але, Барыс, ён твой, а ня мой! Хаця зноў, любы, ці памятаеш, што я сказала табе аднойчы вечарам, здаецца, праз месяц, калі пачалі немцы вайну супраць саветаў і мы прыйшлі да твайго хутару, — напэўна, памятаеш? Дык вось тады я сказала: як фольксдойчка, я зьвярнуся з хадайнічаньнем да немцаў аб звароце табе двору каля Менску; прапанавала ўмоўны шлюб паміж намі, а па законе сапраўдны. Ты паабяцаў, што ня бу-

дзеш вымагаць ад мяне абавязку жонкі. А цяпер ты зусім няўрочнае вядзеш, мабыць, забыўся… Я ўсё рабіла дзеля цябе і дзеля знаходу нейкага спосабу памагаць іншым… Барыс, зразумей: памагаць — памагай і ты!

— Дурнасьць, — з утайкаванай злосьцяй адказаў палкоўнік.

— А я вось паважаю маю дурнасьць і буду імкнуцца да яе, — бяскрыўдна, аднак сьцюдзёна адказала Алена.

— Алюся, ты надакучыла сваёй гутаркай… Хаваеш мяне, праваслаўнага, бязь сьвечкі, вось і ўсё! Тваім прызвычаем кажу… Прад гэтым я жадаў ад цябе абы-што пачуць, абы-што, каб толькі ведаць сваё знаходжаньне каля цябе; дык цяпер я напагатове твае ногі цалаваць, прасіць прабачэньня за мае абразы; вымольваць у цябе, маладой, сваю долю, бо колькі яе падаравана чалавеку? Нават з каціным кіпцюром не параўнаеш тую долю… Кажу ўсё, прызнаюся табе, як прад сьвятаром у сьвятыні: я грашыў, вільгаў душой перад табой мо' які цэлы год ад часу спатканьня, і не кахаў цябе, і глядзеў на цябе, як на дурня, і не было ў мяне шкадаваньня да цябе і да твае сястры, хоць ты шкадавала мяне і рабіла ўсё добрае для майго дабра. Але ты не адыходзіла ад мяне, ты ўжо празьмерна пачала спыняцца ў маёй душы, і, як ні дзіўна было яно, я закахаўся табой. Алюся, табой!.. Я пакутна прагну спакою, капельку грошаў для старасьці маёй і для маіх нашчадкаў… болей нічога. І хто прагоніць гэтую смагу, Алюся? Ты! Толькі ты!..

— І хлусіш ты, палкоўнічак дарагі, найбагаслаўлены, нехаўтурны, гэтак хлусіш, як быццам у таго, хто слухае і слухаў, няма памяці, і таму можна яму вярзьці ўсё, усё, што падбяжыць… Апамятайся, бо магу зусім пакрыўдаваць. Ці ўпершыню ты кідаеш мяне ў крыўду? Ня першая ўжо!.. А пераканальная хлусьня — прыгаство! Ды ўсё-ткі ў затайкаванай карысьці ты ня здольны сплясьці яе ў адно. Я ведаю: ты закахаўся ў мяне ад часу спатканьня ў Варшаве, а не пасьля… Ха-ха-ха! Сьмяюся, мой добры палкоўнічак, і навошта ты надумаўся адмаўляць яго, падмалоджваць?.. Але ў жыцьці, палкоўнічак, ёсьць два адвеку-вечныя адчуваньні: радасьць і смутак… Навошта вярэдзіць балючае хлусьнёй?..

— Пашкадуй, Алюся! Пашкадуй мяне!..

Ён увомірг падсунуўся шчыльней да яе.

— Пашкадуй, не пагарджай мяне й мае ўчынкі. Абяцаю быць гэткім самым, як ты. Ды і ты, Алюся, яшчэ ня стала тэй, якой ты думаеш быць; ты толькі манісься рассуваць замёты нашага двору дзеля прыстанку дабра, дзеля нейкага піраваньня… Ах, Божа, Божа, навошта я спаткаўся з табой?!

Палкоўнік ашчапіў Алену і бязрухна застыг, прыціснуўшы галаву да ейных плечаў… Яна вышчапілася зь ягоных рук, устала, адышлася да стала. У ёй моўкла сьцюдзёнае, тое самае жаданьне знаходзіцца каля палкоўніка. Яно яшчэ больш чутней усукравалася ў сьведамасьць наўмернасьцяй. Наўмернасьцяй ніколі не кідаць яго, каб магчы ў такой дасязе браць усё зь яго собства для нейкай цёмнай, як яна сама часта абхрышчвала яе, «добрай волі».

Палкоўнік, застаўшыся сядзець на канапе, падумаў: «Я, мабыць, перацярплю твае дзіваты, я даб'юся цябе, хоць і кахаю, дужа кахаю цябе». З гэтымі перакананьнямі ён не змагаўся, бо яны ўжо азначыліся яму верай: мусіць адбыцца! Ім толькі чакаўся дзень даведваньня, калі яна павядоміць яго згодай.

— А ты глядзі на мяне як на служанку, а не як на жонку, нават і ня будучую, — быццам бы адгадваючы палкоўнікавы думкі, зьвярнулася Алена пасьля доўгай моўкнасьці.

— Згодзен, толькі не пакідай мяне! — асьцярожліва прапанаваў ён.

— А прынамсі, надумаюся кінуць, дык чаго расчульвацца ад такіх дзейкаў? Наогул, ты, палкоўнік, вайсковы чалавек, праўда? Дадумаесься, як са мной ваяваць…

— Ах, якія словы ты кажаш? — і дадаў, тайкуючы ўмела сваю ўзбудрожнасьць: — Я жадаю кахаць цябе…

— Ну дык чаго ж тады бегчы адгэтуль?.. А можа, паспрабаваць? Я калісьці зраблю так: буду хадзіць упрочкі да Менску… Недалёка, праўда?

Ува ўсім тым, што нагаварыла яна палкоўніку, было добрае й адданае асабістаму захапленьню… Папрасьціла да дзьвярэй, на выхад.

— Стане на сяньня. Палуднаваць зьбірайся.

Алена ўсьміхнулася.

Адчыненыя Аленай дзьверы нямоцна стукнуліся ў Ганю. Яна, напэўна, заклапочаная падслухоўваньнем размовы, не пачула Аленінага выйсьця з габінэту. Не зусім безуразьлівая Алена і ўсхваляваная Ганя захавалі паміж сабой вонкавую прабачлівасьць. Але як толькі Алена апынулася за дзьвярыма ядальні, Ганя блізу ўбегла ў габінэт.

— Барыс, кінь валаводзіцца зь ёй, кінь! Няхай будзе манашкай, няхай!

Ганя, бы ап'янелая сваім пачуцьцём, у нейкай адважнасьці, маўляў, абараняцца, спынілася перад палкоўнікам.

— Барыс, я кахаю цябе!.. Я ж ужо — дарослая!..

Ён некаторы ўрывак часу пазіраў на яе палымністасьць шчок, на яе дрыготкасьць вусьнінаў і рук, на яе просьбнасьць у вачох з позіркам, што яшчэ ня ўмеў глядзець упорыста на знарокі жыцьця, а тады, без аднаго слова, як родную дачку, вывеў яе за дзьверы.

Аднак палкоўнікава ўражаньне ад Ганінага захапленьня апынулася ў мінулым летуценьні, калі ён, будучы ў Варшаве, нягледзячы на даходнае і паважнае становішча, чамусьці абмінаўся каханьнем жанок.

— Каб ты, дзяўчаро, крыху раней да мяне — я адпомсьціў бы там маім асьмешнікам… Ах, як шкада! Адранцьвееш шчасьцем, калі ня трэба й няма каму пахваліцца ім, — голасна абвесьціў сабе палкоўнік, зь вясёлым настроем прычасаўся пры шыбіне падвойнага вакна, што адчынялася ўсярэдзіну габінэту, і пайшоў палуднаваць.

6

За вокнамі шасьцелі лісты дзікага хмелю, яны за лета справіліся ўзпаўсьці па шастку аж да шаламя хаты. Касматая і шасьлівая сьцень ад іх рухалася па шыбінах вакон. Была ноч. У распагоджаным небе начышчаны ветрам ледзянеў месяц. Вецер роўным подзьмухам прарываўся дзесьці з-за бору. Бор зацяжыстым і загусьцелым шумам адклікаўся ўсьлед яму. Сяліба палкоўнікава ад бору аддзельвалася невялікай засьцежай ніваў. Новая жыхарка Ганя, бадай, зь першага дня прыезду пачала жыць у ім неспакоем шаснаццацігадовага сэрца. У сваёй гасподзе пасьля кароткае гутаркі з палкоўнікам яна асталася аж да ночы сядзець каля вакна задуменная і дакорная. Ейная душа гутарыла. У нячутнай размове пачыналі ўжо завязвацца першыя чуткі хітрасьці, а ў іх яна пагаджалася дараваць палкоўніку.

«Я ўсё-ткі спытаюся: куды ты езьдзіў учора раніцай?»

Далей Ганя не сказала анічога. Як быццам яна й не казала гэтыя словы, угледзелася ў падзямельнасьць восеньскай ночы.

«Тая сьцежка мне так надакучыла, што я ўжо болей не жадаю хадзіць па ёй да лесу. Заўтра пойдзем з табой іншай. Там ёсьць другая, пад самымі елкамі, уся засыпаная апалай лісьцінёй. Мне вельмі падабаецца, што на ёй лісты заўсёды ўскапычаны казулямі, і іх кожны раз можна там напаткаць. Гэтая сьцежка прасьцігае ажно да ляснога возера; вада ў ім вельмі сьцюдзёная, мабыць, крынічная…»

«Але ж, Ганя, гэтак нам ня будзе кожны дзень. Трэба штосьці рабіць… Ды яшчэ, ты ж сама ведаеш: мы неяк дзіўна жывем».

Думала Ганя пра возера, пра гутаркі, пра лес, у якім нават не была, і ўяўна нахілілася да палкоўнікавага твару, правяла сваёй шчакой па ягонай. Палкоўнік, адчуўшы чароўнасьць каханай жанчыны, жартаўліва, бо пэўны ў захапленьні ім, паквяліўся каля ейных вуснаў пацалункам. Яна спрабавала атрымаць яго, але ніяк не магла злавіць палкоўнікавы вусны.

Ганя запэўнівала сябе: ён кахае яе.

«Барыс, ты будзеш мой!»

Але каханьне ён жадаў адхіліць надалей.

«Чаму гэтак робіш, Барыс? Няўжо зьбіраесься забыцца на той пацалунак мяне… каля вуха? Няўжо, Барыс?» — думала і пыталася Ганя, трымаючы ўявай палкоўніка ў абдымцы.

«Не!» — голасна адклікнуўся ён і палахліва глянуў на Ганю.

«Што здарылася, мой каханы?» — спытала яна, не хаваючыся ў падазроныя думкі.

«Часам, бывае, падыходзяць цяжкія развагі», — адказаў ён і пачаў хадзіць па пакоі.

Ганя па-ранейшаму сядзела каля вакна. У часінах, скволеных уявай, яна, здаецца, забывалася пра ўсё недарэчлівае. Ей толькі жадалася глядзець і глядзець на ночную сівізну. Ды не!

«Барыс, надысь, едучы сюды атрымаць зноў маёнтак, ты нешта пачынаў казаць мне і спыніўся».

«Ах, нічога асаблівага… Хадзі лепш сюды».

Ганя паглядзела праз месячны змрок пакою на ўвабразнага Барыса. Прайшлася па пакоі, а тады зноў села. Чулася стомленасьць ад думак.

«Каханы, я скажу табе ўсё. Усё, мой любы, і толькі цяпер, таму што я кахаю цябе і раблю гэта ў тваё імя… Ты зьдзіўляесься, Барыс?»

«Ганя, хіба ж гэтак? Мне прыемна паслухаць, што ты наўмерала сказаць…»

І яна сказала яму пра летуцелае раней. Закаханага, усхваляванага палкоўніка прымусіла хадзіць, а сябе ўсьлед за ім: прасіла прабачэньня за патурбаваньне нянатвым настроем.

Наймізэрныя шорахі ветру доўга ўсюдзіліся ў Ганіным пакоі, іншыя шорахі там не заглушвалі іх.

«Тады я, Барыс, астануся табе шчыра ўдзячнай за ўсё, што зрабіў для мяне…»

Ганя не даказала думку, правяла рукой па твары.

«Барыс, няўжо для нас немажліва маё?»

«Што ты сказала?»

Яна на цыпачках падбегла да ўяўленага палкоўніка, прысела на падлозе і пачала абнімаць ягоныя калені, церціся аб іх шчокамі.

«...ты не пачуеш больш маіх словаў, ты слухай мае ўздрыгі ў грудзях і шолах маіх далоняў... Я нямая цяпер».

«Чаму?»

«О не! Лепш пачуй адно: або я, або яна ня мусіць быць тут, тут пад гэтым дахам. Нават сяньня! Нават цяпер!..»

Барыс маўчаў. Ганя апранулася, пайшла на знадворак.

Подзьмухі ветру мацнелі. Невялікія кагорты хмараў плылі разьдзелена каля месяца. Ганя толькі жадала выйсьці з двара, як адзадзя пачула Аленін голас. Яна заўсёды праходзілася перад тым, як пайсьці спаць. Ганя, перапалоханая неспадзеўным урывам у меру ейных мрояў,ірванулася наўперад, прабегла некалькі крокаў, аглянулася, затуліла па-дзяцінаму вочы, спынілася й заплакала.

— Што з табой, Ганя? Ты, мабыць, хворая? Скажы, родная, што з табой?.. Чаму адмовілася есьці?.. Хадзем дахаты... Ня плач, родная, а то пачуе Бары-ы-с...

— Я ня плачу! Я перапалохалася цябе, — зласьліва адказала яна.

Ганя адкінула сястрыну руку, пайшла хадзіць сьцежкай пад таполямі навокал двара. Таполі, як падпоры ў пячоры, чорнымі ствваламі падпіралі неба й гальлё з шумам ад ветру.

7

Да сваёй хаты з царквы Цярэм і Міхась вярнуліся позна, бо Цярэм мусіў завітаць да старшыні воласьці за абяцанымі даведкамі на атрыманьне пашпарту для Міхася. Іх зьмест быў напісаны собскай рукой старшыні. Там побач із сьведчаньнем ляяльнасьці Міхасёвай да новых уладаў падавалася хлусьлівае тлумачэньне абставін нясвоечасовага атрыманьня пашпарту. Гэткай прычынай, паведамлялася, была зацяжная цяжкая хвароба. Зь Цярэмавых рук аплата за яе перапала старшыні воласьці зусім каштоўная: ён пазычыў у сяльчанаў дзьве кварты самагонкі і аднёс яму своечасна.

Міхась пра Цярэмавы рупнасьці ня думаў. Ён верыў у іх шчасьлівы вынік. У ім даўнавата, ад пачатку вайны, пасялілася пэўнасьць пра час, што прынесла вайна. Час, калі можна рабіць усё, што надумаесься і нават добра датаркнуцца цудоўнасьці ўсялякай валадарнасьці.

Міхась тымі часінамі адсутнасьці каля яго Цярэма паклапаціўся павандраваць па знаёмых мясьцінах навакол сяла і спат-

кацца ды паразмаўляць з аднасяльчанамі. У гутарцы зь імі ён слухаў не зусім зразумелы неспакой існасьці жывога чалавека, якога ўжо бадай што не палохалі гукі гармат і бомбаў. Усе яны чамусьці зьвязаныя мінулай сувязяй жыцьця: прызвычаем спаткацца выпіўшы, ці без таго, у чыёй-небудзь хаце або на выгане, абхапіўшы даланямі постаці жанок ці дзяўчат, як жменяй нарваныя краскі, вытанцоўваць драбнуху ці па некалькі разоў тупаць на адной падлозіне рытмічнага «Мікіту», — цяпер раптам закахаліся ў адзіноцтва, у неахвоту нават добрасумленна рабіць свае хатнія абавязкі.

Міхась даведаўся, што ўсе сяльчане, пакліканыя да арміі, вярнуліся дадому ледзь ня ў першыя дні вайны. Толькі ў адной сям'і неставала дома сына. Міхась меркаваў: сяляне мусілі глядзець на здарэньне веку інакш. Але ўсёнае хутка пакінулася ім безуразьліва, як штосьці немагчымае да азначэньня паміж набегу пачуцьцяў ад раптоўна напатканага і спакмечанага.

Наапошак ён пачакаў Цярэма на прысапе скрайняй хаты па дарозе да іхнай сялібы, і, калі той падышоў, накіраваліся разам дадому. Няцёплыя прамяні сонца рассыпаліся бражовым колерам сярод хвояў лесу, які дзяліў іхную сялібу зь сялом. Між іхных верхалінаў і сьценяў хавалася незачэпленая глухата восені. У сэрцы Міхасёвым было моцнае жаданьне даведацца ад Цярэма пра жанчыну, што памагала ўносіць дамавіну да царквы.

— Хто яна, тая памочніца, што памагла ўнесьці забітага? — спытаўся нарэшце ён.

— Напэўна, жонка Сконтаўта, — адказаў Цярэм. Яму ня вельмі да гутаркі пра чалавека, які адно сёньняшнім раньнем набіў яго.

— Даруйце, што турбую дзяцінымі пытаньнямі... А як справкі ад старшыні воласьці?

— А што яму? Даў. Ён неблагі чалавек. Крыўдна, што п'е ня ў меру.

— А чаму вы сумныя? Мoжа, хвалюецеся пра тога лётчыка?

— Аб усім, сынку...

— Навошта гэтак?

— Бо я ўжо не вярнуся сюды на белы сьвет маладым, таму кожнаму старому, пакуль захліпнецца апошняя часіна жыцьця, хочацца патурбавацца аб усім, што не пераждыў.

Цярэм, зачэплены Міхасёвым пытаньнем, тлумачыў і прыводзіў прыклады зь людзкой дабрадзейнасьці й несправядлівасьці. Па ягоным прыпушчэньні: справядлівасьць пакуль што ня знойдзена чалавекам. Але ён усё-ткі стаіць ужо ў адным кроку

перад ейным парогам. І прамежак паміж наступным ступкомнаўмерам — ён даводзіў — якраз ёсьць тая справядлівасьць, а гэта свабода. Быць свабодным у несвабодзе.

Цярэмавы довады апаноўвалі Міхася ў незнаёмых хваляваньнях, недармо што наводле іх ён ужо меў выпадак пераэжыць яшчэ пры сустрэчы немца-камэнданта й Ганевіча. Ён пераконваўся, што дзед усяго толькі ўзьвялічвае патрэбу ўвагі на зразумелую існасьць у жыцьці. Раптам чамусьці зазлаваўся Цярэм:

— І спадзейся на вас, інтэлігентаў! Спадзейся на душу, якая некалісьці абрасьце целам. Ды яна нават ходзе каля самага цела і ня ведае, як увайсьці ў яго ды там трымацца, учапіцца за што... Ты не распазнаеш свой дом. Мабыць, твае калені ўжо зарагавелі ад поўзаньня — ня чуеш болю. Поўзай, сын! Запэўняю цябе: ты малады будзеш прадчасна старым, калі будзеш блукацца эвангельскім блукнікам па нейкіх радзімах...

— Ня злуйцеся! Вы, старое пакаленьне, пажылі ўваскрашэньнем нашага народу й ня можаце адмовіцца ад гэтага, справядлівей, яно спынілася ў вас сьвятой верай. А я? Я толькі зьбірач падрыхтаванага вамі. Для нас, маладзейшых, наша айчына існуе й існавала, як усе іншыя. Ці варта гутарыць пра ейнае абнаўленьне ці ўваскрашэньне?

— Народжанае — нараджае, абнаўляецца! Тады, мой сын, і дурань памрэ ад гэткае размовы!..

І ён болей нічога не сказаў Міхасю. У настроі Цярэмавым тым днём жылі дзьве крыўды: крыўда ад палкоўніка, пра якую ня ведаў Міхась, і крыўда на Міхася — ягоную думку пра сваю нацыю.

«Чаму неспадзеўна?» — падумалася Міхасю.

## 8

Гэтаксама, як напярэдадні спатканьня зь Міхасём, дзед Цярэм ізноў кінуўся душой у парываньні благога неспакою. Здарэньне ў царкве, а найбольш словы ад немаведама за што забітага летуна і кароткая гутарка зь Міхасём па дарозе дахаты, якая блізу нічога й не давала яснага, усё-ткі кранала ягонае старое пачуцьцё, яно праніклівым голасам казала яму аб зусім адмоўнай зьяве сярод нахлыні сусьветных падзеяў.

Ягоны позірк найперш бачыў толькі сваё, а сьцяг іншага, чужацкага, разумеў як пабочнае. Апрача ўсяго, да настрою, напэўна, шмат спрычынялася й біцьцё ад палкоўніка. Але ён цярпеў гэта: не хацеў выдаць сябе Міхасю, каб той учыніўся помстай. Дый Міхась таксама неспадзеўна паказаўся расьцягнутым

і трухлявым у дацемленьні сваіх ручаньняў з паглядамі на закарэлы мярлог зь незадрымалымі мэтнасьцямі некаторае калькасьці валадарных нацыяў…

А Міхась, сваім парадкам, бадай што цешыўся Цярэмавай бязгутарнасьцяй: ён таксама думаў, але апынаўся між сваіх думак толькі ўв адным моманце дня — спатканьня ў царкве. Ды прохань усяму таму змрочнаму й смутнаму была пераважна тайніца жанчыны з двара. Ён і цяперака ў хаце, ахутанай восеньскай гушчэчай вечару, бачыў яе перад сабой. Штосьці незнарок цягнула яго даведацца пра яе больш. У ейных вачох і адвазе памагчы ўнесьці ў сьвятыню дамавіну Міхась знаходзіў невымоўны прывід добрага й вялікага захаваньня ў жыцьці. Але ў самым развоі думаньня пра незнаёмую Цярэм зьвярнуўся да яго, прапанаваў:

— Цягні страву зь печы, вячэрай.

— А чаму ж вы ня хочаце? — падазрона згадзіўся й спытаўся Міхась.

— Ат, ня хочацца — кладуся адпачываць… Надвор'е пераменіцца: баляць і ціснуць грудзі. Ды што зробіш — старасьць!

Міхась пачаў выцягваць страву зь печы. Ён, выгаладаны ў няволі, вельмі шмат думаў пра ежу, а дзед, надалей моўкны, распрануўся і лёг адпачываць на сваёй ляжанцы.

У іх, у аднаго і другога, уцякалі словы гутаркі, а тымі, што ўжо перамяніліся, — дык адно толькі, каб усьцерагчыся журнасьці непаразуменьня.

Пад шамаценьне Міхася каля печы, а тады каля стала за ежай зь яшчэ большай цепрасьцяй Цярэм пачаў ажыўляць чароўнае суквецьце думак. У кожнай зь іх знаходзілася магчымасьць перамогі над рознымі гмахамі й драбноткамі, якія не лагодзіліся або не падтасоўваліся да ўмовы здабыцьця свабоды ў жыцьці. У вацеве зачэпленых душой мрояў ім кранагася ўсялякая метульга дачыненьняў кожнага народа да свае незалежнасьці. Аднак у перакананьнях, у спадзяваньні нечаканасьцяў, у разнаякіх памаўзьлівасьцях выклікаць адзін уздых абнаўленьня нацыі спыніліся даўменьні, ад якіх ажно заціхала сэрца Цярэмава. «Мы прызвычаіліся калісьці жыць незалежнымі, і яно, незалежнасьць, зрабіла нас лядайкамі думаць пра нацыі-захопнікаў…» І адначасным забегам папярэдзіў Міхася другім клопатам:

— Ты ж і Мурзу дай есьці — чуеш, як гаўкае?

— Добра — я зараз, — адказаў Міхась.

За колькі часінаў развагаў Цярэм задрамаў, і ў сьне ён таксама думаў далей пра свой неспакой. Цярэмавы вусны ў сьцені

ляжанкі краталіся, шапталі штосьці незразумелае. Але ў далёкім кутку душы й розуму яны клаліся зразумелымі неаддзеленымі ад ягонай старэчай постаці.

Рыпнулі дзьверы ў трысьцені, і гэты нешта кажучы гук перарваў ягоную дрымоту.

Міхась вяртаўся з панадворку, занёсшы ежу сабаку.

— Што, ня чуеш? — дзіўным усклікам скрыкнуў Цярэм, і тады ён пры спатканьні зь цьмяным сьвятлом ліхтара ахамянуўся: — Ах, гэта я спрасонку!..

— Сьпеце, сьпеце. Я таксама іду спаць, хоць і ранавата яшчэ.

— Ага...

Цярэм заплюснуў павекі і, па-ранейшаму санлівы, стомлена апусьціўся на цьвёрдую пасьцелю. Зноў заблукалі словы з уявамі, што ня вельмі выразьліва спыняліся перад ім — яны ўсё беглі, круціліся, пераменьваліся выглядамі... Тая дамавіна зь няведамым летуном была быццам бясконцай дарогай, домам і небам з роўнымі, буравымі плямамі на месцы сукоў, ужо абгабляваных кружкамі-вокамі. Праз іх ён бачыў самога ды іншых стомленых, але яны, як пчолы ў шкляным карані, не сядзелі каля доньня, а паўзьлі ўсё да вяршаліны дужа крутое гары. Ён бачыў марудную мітусьню людзей з чырвонымі абліччамі, аблепленымі спацелым валосьсем; у іх кожнага ўваччу была няўмольная да напуханьня велізарная сьлёзіна, якая вось-вось азначвала напагатаванасьць скрапнуць і разьліцца.

Ажно да самае вяршаліны і па адхонах гары густа ляжалі патарчакі зь людзкіх касьцей. Іхную перашкоду ніхто не парушаў: жывыя людзі паўзьлі, працiскаліся паміж іхнымі невялікімі прасторамі. Шмат хто з жывых перамешваўся зь імі — прападаў.

— Што ты? Ідзі, ідзі! Ты ж юнак, чаго тут круцісься на дарозе? Няўжо я, стары, мушу цябе ўпрошваць?.. Пусьці тады — я сам!

— Куды?

— Як — куды? Ты хочаш у дамавіне застацца? Тлець хочацца?

— Не! Не! Я мусіў быць іншым!

Але Цярэм, заміж далей гутарыць, паглядзеў на расхрыстаную кашулю на грудзёх у летуна: чорна-чырвоная дзірачка ад кулі выкручвала з свае сярэдзіны лісткі паперы з зацемкамі.

— Навошта ты пісаў гэтыя словы, хто іх чуў і пачуе? Ты ж быў летуном-сокалам, у цябе ж была зброя заміж іх...

— Старэчы! Ты прагнеш змаганьня?

— Але! О, я люблю адшукваць і здабываць маё!

— Дык жа чым? Дзе ж у цябе хоць бы снасьціна старавечнага чалавека?

— Ланцуг адвяжу ад Мурзавай будкі — вось пабачыш…

— Ты дрывіш, старэчы… Ты, як той генэрал, што змагаецца супраць ворага і адначасна супраць ягоных дзяцей, жанок і старых бацькоў…

— Які ты няшчасны юнак! Ты сп’янеў ад сваіх словаў і цяпер стаіш перада мной бяздумны, зусім бяздумны… Ты запамятай: той генэрал неразумны, ён толькі жадае абвесьціцца пераможцам, пацерабіць сваю ўвабразу пыхай велічы. А ён, ён — звычайны караед, які ня цеміць, што ім падточанае дрэва хоць і ўсыхае, ды, пакуль зваліцца, можа стаяць доўга-доўга і яшчэ нават высьпельваць сваё насеньне…

— Чакай, старэчы! Я разумею цябе: у змаганьні няма няроўных, ёсьць толькі пераможцы й адоленыя. Ды вось валей адкажы мне на гэткае пытаньне: ці гэта злачынства, калі ёсьць абарона свае веры, мэты тым самым злачынствам, тым самым змушэньнем?

— Ты шмат гаворыш, юнача! Дазволь мне. Ты, мабыць, манісься зьнішчыць тых тым самым шляхам: сваёй несправядлівасьцяй — учынкам галоднай сьмерці й расстрэламі, га?

— На баку хутар, але ўбогі не палянуецца завярнуць да ягоных гаспадароў па ўбожыну!

— Дык як тады?

— Ты ж дамагаўся ад мяне гэтага слова… Ты, можа, чуў адну невялікую зваротку зь песьні?

— Я не люблю песьняў, не люблю, мой родны, мой няведамы Ісус: я ня ўмею падпраўляць людзей клічам песьні ці прамовай правадыра. Я… я ўмею пакутаваць!

— Ты?.. Ад парываньня твае кволасьці й старэчай агнявіцы нічога не народзіцца, а я… я… О, ледзь не забыўся на маю песьню:

Зноў у радасьці
глядзім на неба,
меч на дзязе.
Мне
ён
трэба…

— Якая даўгая — не сьпявай… Твая рана ад сьпеву робіцца большай, і там… там нешта жывое, жывое — не сьпявай!

— Раны ад ран, старэчы. Яны ад самага пачатку сьвету. Мусіць жа недзе нешта разарвацца, загінуць на целе, каб выйсьці стуль новай душы, што потым не ўкрыжуецца, не разойдзецца ад пацалункаў дабра і зла, яны — жыцьцё наступнаму: табе, камусьці іншаму… Сьмешна спрадвечнае?

— Мне?.. Дай агледжу цябе ўсяго, дазволь, мой хлапчук-Ісусік, дазволь… Мне хочацца пацалаваць цябе…

— Ты прагнеш, каб я быў нованароджаным дзеля пацалункаў?

— Не! Не, мой сынку, навошта! Ты ўжо навучыўся рухацца і здабываць умееш, ты адвык плакаць… хваляваціа ўмееш.

— Ад гэтакай гутаркі й дурань памрэ — здаецца, ты сказаў мне?

— Я не казаў гэтак!.. Міхась, Міхась, чаму ты перабраўся ў забітага?

— Хлусіш, родны! Я адно хацеў быць зразумелым. А быць зразумелым — зрабі непажаданае, нават неканечна ў тым неспадзеўнае, бо тое, непажаданае, і так для іх не сьвятое.

— Не кажы: хлушу. А калі так, дык жа я мушу падагнаць цябе ў жыцьці, ці толькі падумаць?.. Годзе, годзе вусьнявіць: барзьдзі, барзьдзі!.. Ах, як позна! Дзе людзі нашыя? Дзе? Ах, вунь, вунь, здаецца…

— Адляжа, дзед: ня позьніцца ноч, ня позьніцца й дзень — пажджы расказваць пра цэдзіва…

— Я? Я — цэдзіва — людзі нейкія?

Цярэм прачнуўся ад свайго скрыку, і Міхась таксама. Міхась, найперш запаліўшы лямпку, падышоў да яго й прыклаў адразу далонь на лоб. Цярэм быў спацеўшы. Ягоныя вочы глядзелі звар'яцела на Міхася. У памяці адным схопам застыглі перад ім прывіды сну — ён, нейкі час асьветлены лямпкай і рухамі блізасьці Міхася, яшчэ дрывіў іх.

— У вас гарачка, захварэлі.

Тады Цярэм уцямна пачуў і зразумеў Міхасёў гутар.

— Кладзіся, сынку, не хвалюйся: звычайна нейкі дзяцінец прысьніўся, і я крыху патросься. Не турбуйся.

Міхась не паверыў. Доўга трымаў далонь каля лобу Цярэмавага і колькі разоў паслухаў пульс.

Цярэм у сапраўднасьці і не хацеў, каб той барджэй адышоўся ад яго: ён невыказна, аслодна каяўся ў сваёй душы за кпіну Міхасю мінулым днём, ідучы дахаты ад старшыні воласьці. Цяпер у вялікай празьмернасьці адчуваньня Міхась разумеўся да сьмерці блізкім і неадступным, і гэтае пачуцьцё ў

тую часіну адкавалася адным неразрывам зьвязку — пад ягоным узьдзеяньнем ён ледзь не сказаў: «Міхась, будзь са мной, пакуль я жыву, ты — усё для мяне!» Яму не хацелася якой-небудзь іншай сутані, другой спакусы.

— Вы паспрабуйце ня памятаць пра сон, і гарачка ад хваляваньня міне.

— Дзякуй, Міхаську, дзякуй! Гасі агонь — сьпі… Каранаты дзядок я: са старасьцяй спрачаюся.

9

Міхась сярод ночы часта разбуджваўся й падыходзіў да Цярэмавай ляжанкі. Слухаў ягонае дыханьне, клаў далонь на лоб. Цярэм цэлую ноч пасьля таго, што гэтак дзіўна прысьнілася, ня зводзіў павекаў; кожны раз, як толькі падыходзіў Міхась глядзець за ім, прыкідваўся, што сьпіць, ня чуе. Ён у сусьцігу даўгаватага жыцьця мо' ўпершыню натрапіў на сэнс самога жыцьця — прынамсі, гэтак яму думалася і ачуньвалася ў тую восеньскую ноч на ляжанцы.

«Дзеля чаго пазбывацца пошчыку блізасьці роднага чалавека, каб потым хвалявацца аб ягоным жыцьці? Аддаць яму ўсе найлепшыя адчуваньні свайго жыцьця, а тады асабістай, бацькоўскай чысталюбасьцяй змусіць яго пакінуць цёплы куток толькі дзеля таго, каб здабыць неабходнае на захаваньне ў днях… навошта?» — разважаў пытліва Цярэм.

І ён зарокся ніколі ў будучыні не рабіць Міхасю благіх даветаў, праз якія той мог бы зноў пакінуць яго адзінотным сярод лесу і поля.

Назаўтра, раньнем, яны ўсталі адначасна. Міхась сказаў, што ён не наўважан адкладваць надоўга атрыманьне пашпарту, зьбіраецца ісьці ў Менск.

— Але ты, Міхась, будзь ласкавы ўзяць з сабой торбачку, — папрасіў Цярэм.

— Навошта?

— У такі час ня вельмі сорамна хадзіць з торбай.

— Я абыдуся бяз лусты…

— Луста — лустай, Міхась, а торба сама сабе гаспадар… Перад колькімі днямі, пакуль ты вярнуўся, я кожную раніцу з Мурзам хадзіў да Менску і заносіў расьсечаныя кускі дзічыны галодным і ўбогім. Там цяпер горш, чымсьці ў паўголадзе — блізу ўсе мянчане ўбогія. Вось таму і ты вазьмі занясі дзічыну для іх. Сяньня аддай яе калекам, што зьбіраюцца каля сьвятыні Пётры й Паўлы.

— З прыемнасьцяй зраблю, — пагадзіўся Міхась.

Яму жадалася як найхутчэй убачыць прынесеную вайной неспадзеўку роднай сталіцы. Сталіцы, ад якой гэтак шмат асталося ўспамінаў з маленства.

Сонца выплыла з-за вершалін лесу і, ня надта ўзьляцелае ўгару над імі, сьвяцілася восеньскай астыгласьцяй, бы расчыненая цемрадзь ночы. Ранішняя смуга расьсцілалася нізка. Вогкая, гладка даторквалася кожнага выступу над зьверхняй зямлі — прыносіла заўважнасьць цёплага дыханьня ў скронях камянёў, у плажме муравы. Дарога, праложаная па роўным узвышшы, адсьвечвала шэра-жоўтым кантам пяшчанага адхону. Міхась пайшоў да Менску наўпрасткі ад дарогі. Аж з прастору мурожнага сухадолу былі бачны дахі паўзгародных сяліб Менску, іх вырывала із смугі сонца — уцалелі ад вайны. Ад скраёў сталіцы Міхась азірнуўся на лес, за якім хавалася Цярэмава сяліба.

— Ён там чакаў мяне, — мімавольнай любасьцяй прагаманіў ён і пайшоў шпарчэй.

Ранішняга рэха ў сталіцы ня шмат. Толькі дзесьці замест яго ракацеў самалёт і адзінотна дыміў на паўдзённым баку невысокі комін заводу. Пасьля доўгага расстаньня і пад уразай Цярэмавага апавяданьня пра сталіцу, яна ўяўлялася Міхасю бадай пакінутай будкай садоўніка ў запусьцелым садзе. Яна спаткала яго наводлесьцяй ня ўявы, а вобразамі існасьці. Адразу за рэдкімі наўгароднімі будоўлямі перад вачыма Міхася разьбегліся шырызны развалін, яны слаліся ажно да самай Сьвіслачы. Уцалелы тэатр оперы і балету зь некалькімі адлеглымі ад яго камяніцамі высіўся над грудамі цаглін, бэлек і водаправодных трубаў. Вуліцы сярод руінаў ляжалі, быццам акамянелыя гіганцкія яшчаркі. Блізу да самага пляцу Волі Міхась не спаткаў людзей. Пацукі беспалохна бегалі па друзах і разбураных сьценах.

Пляц Волі, што калісьці раптоўна ўзвышаўся, нібы выпукласьць старавечнага шчыту, нібы насыпаны курган, плажміўся ў несуладу руін. Званіцы сьвятыняў, уцалелыя ад бамбардыроўкі, і вежа з абвіслымі стрэлкамі гадзіньніку тырчэлі над пляцам. Ад іхнай узгоні ўвышкі неба і не прабадала пачуцьцё людзкой душы, у скрайках якой пранізваецца тая гонкасьць якімсьці імём несумніўнай думкі ў сваё. Ад іх заўсёды пераможаным людзям увейваецца вера; ад іх часта зьяўляецца перамена ў імкненьнях; яны, узьнесеныя з абцёсаных камянёў, прынукваюць не забыцца велічна-роднага; яны выхопліваюць зь людзкога пачуцьця немагчымае і робяць яго магчыма-зьдзяйсьнё-

ным; яны незвычайнасьць роднага жыцьця і прысьвята чаму-небудзь неабходнаму ў змаганьні, чаму-небудзь злачыннаму супраць злачынства, ад якіх толькі тады ўздрыгнесься, калі пройдзеш пад прывітаньні народу каля гэтых сымбаляў у супакоі — яно здарылася і здабылася…

Песьня спрадвечнага разбурэньня! Ніхто ня ведае, дзе яе пачатак быў і калі пачнецца канчатак яе! Глыбы зруйнаваных дамоў, музэяў, тэатраў і лякарняў лажацца шарахатай апранай на зямлю й жыцьцё! Мірсьціць хаос імкненьняў і думак! Заплюшчваюцца вочы ў тупой звар'яцелай асалодзе існаваньня быцьця, і пад тупаценьнем брудных ваявых ботаў апыноўваецца, не на прокмець, пляма ад якога-небудзь народу! Захаваньне жыцьця сваёй нацыі ў сьмерці іншых нацыяў!

Каля Дома працы, які, можа, цудам застаўся цэлым, стаяла шмат аўтамашын. Уздоўж сьцяны над уваходам былі выведзеныя нямецкія словы, яны значылі прыладнасьць гэтае будоўлі да ўлады немцаў на акупаванай Беларусі.

У пачатку дзясятае гадзіны раніцы там часьцей зьяўляліся людзі, часьцей замітусілі немцы, апраненыя ў жоўтую вопратку, яны то прыяжджалі туды, то ад'яжджалі ў нізкіх чорных лімузінах або ў звычайных, сталёвага колеру, вайсковых машынах. Міхась паназіраў за асаблівасьцяй рухлівасьці немцаў і сваіх людзей. Ён ніколі ня мог потым адказаць сабе на ўсё тое, што тады падумалася й разважылася — яно засталося ў ім нямотным успамінам аб чымсьці нявырашаным у вякох цярпеньняў. Ён меркаваў: яно падасьпела яму ад часін спачуваньня разбуранай сталіцы, а можа, хоць і каротка пазнаў іх, ад пакутаў у палоне.

Той раніцай Міхась быў больш суровы і жорсны. У ягоным сэрцы зіхрылася нянавісьць ня толькі да немцаў, у ім знайшоў прыстанішча выклiч усяму людзтву, усяму таму, хто імкнецца панаваць, апыноўвацца ў слодычы шчасьця разбою над іншымі народамі.

У маладым парку перад Домам працы Міхась сеў на паўзломленую лаўку. Яму не жадалася барзьдзіць спытацца, дзе сьцьвердзіць сьведчаньне асабістасьці. На яго дзейнічала блізіня сталіцы: імкнула апынуцца ў прокмеці хіжака, — зьнішчай тых, хто зьнішчае! Ён нават палетуцеў пра волата-чалавека. Мроя заўсёды адчувальная ў бясьсільлі й вельмі неаблажлівая ў парываньнях.

Міхась не пайшоў атрымаць сьведчаньне — успомніў пра Цярэмаву торбачку, накіраваўся да манастыра, дзе зьбіраліся ўбогія, аддаць ім убожыну.

Манастыр з саборам ацалеў ад бамбардыроўкі. Ад вуліцы яго старанна адгарадзілі тонкімі пілёўкамі. На двары перад сьвятыняй не было нікога, але дзьверы ў сьвятыню былі адчыненыя нарасьцяж. Празь іх Міхась бачыў бражовае мірсьценьне лямпадак і сьветлую срабрынь асягоў сонца. Ён увайшоў туды. Каля самага алтара стаяла на каленях жанчына і пасьля кароткіх шэптаў хрысьцілася. Міхась ня бачыў яе твару, але разборліва чуў словы ейнай мальбы. Ён перахрысьціўся й пачаў азіраць даўно нябачаныя абразы сьвятых і апосталаў. Некаторыя зь іх вельмі прыгожа былі выкананыя і апраўленыя ў рамы. Але яму не прыйшлося доўга азіраць іх — жанчына ўстала і зьвярнулася да яго.

— Памажэце мне выйсьці.

Міхась не адразу адказаў ёй. Ён глянуў на вытыркненыя калені з-пад кароткай сукенкі, якія чырванеліся пасьля стаяньня на іх. Яна чакала, упершыся ў пустэчу сьвятыні чорнымі кружкамі тканіны на вачох. Яна была маладая.

— На знадворак?

— Але. Калі ласка!

Каля выхаду яна папрасіла Міхася падаць віялянчэль, якая стаяла ў кутку карыдору, пакіненая падчас мальбы. Ён запрапанаваў памогу паднесьці. На твары дзяўчыны прабег звычайны ўсьмех удзячнасьці, але смутны і церпны.

На ганку сьвятыні, папярэджваючы сьляпую аб наступнай усходцы, Міхась спакмеціў, што яна прыгожая дзяўчына. Нават чорныя навязкі не псавалі ейнага аблічча. Навошта чорныя навязкі?

— Калі ў царкве няма людзей, я выходжу сама.

Міхасю не хацелася пацьвярджаць існасьць няшчаснай, ён толькі міла глядзеў на яе.

— Пакіньце мяне каля ўваходу на царкоўны двор, я там заўсёды іграю — зарабляю мой хлеб і соль.

Яна зноў, павярнуўшыся да Міхася, усьміхнулася.

— Вы адны ці родзічаў маеце?

— Маму. Але яна хворая, вельмі хворая… Ня кожны дзень зарабляю ўбожыну — галадуе…

— А вы не іграйце сяньня — я дам вашай маме есьці… Мо' хопіць на тыдзень…

— Шчырае дзякуй вам!

— А доктар глядзеў вашу маму?

— Вашае падараваньне найлепшы доктар для яе… Якая я шчасьлівая! Перавядзіце мяне праз вуліцу, а там я ўжо сама па-

траплю. Я прызвычаілася знаходзіць свой дом... Я жыву з мамай у доме, хоць усюды, я думаю, руіны, руіны...

— Я давяду вас да дому і агледжу вашу маму — я доктар, — дазваляеце?

Сьляпая нічога не сказала Міхасю толькі, бы ў нязносным болю, сьціснула вусны, ашчапіла яго і заплакала, ён пацалаваў яе ў скронь.

У сьцежнай вуліцы да Дому працы іх спынілі жандары і латыскія добраахвотнікі. Па вуліцы, у ахове салдатаў СД, ішоў іхны начальнік Лібіц із спадаром Арэмчыкам. Лібіцу зажадалася азірнуць вялічча руінаў, натвораных розумам і рукамі ягонай нацыі. Ён меў звычайную цікавасьць: паглядзець. А для Арэмчыка ўсёнае зьяўлялася сапраўдным рэнэсансам, і ён ня думаў аб нейкіх іншых, пабочных адступах скрухі. Яму было ўцешна мастацтва зьнікненьня мінулага ў беларускай сталіцы...

На спатканьне Лібіцавай паходні з-за вугла, абапіраючыся на падстаўкі-дошчачкі, выпаўзла постаць калекі-абрубка.

Калека, аброслы і стрыманы ў позірку вачэй, не зьвярнуў увагі на затрыманьне жаўнера-латыша, пасігаў, перамахваючы тулава крокамі на падстаўках, насустрач Лібіцу. Латыш, мабыць, зьбянтэжаны ўпорстасьцяй чалавека зь недаконченым жыцьцём, пакрыкваў на яго:

— Цурык! Цурык! — прыгнуўшыся, трымаючы за плячо, ішоў таксама за ім. Калека натрапіў на Лібіца выпадкова, але ён ужо справіўся пазнаваць па ўніформе прычаснасьць да ачалу.

Лібіц і калека спыніліся на вузкай, не заваленай друзамі сьцежцы-вуліцы.

— Вас махтэн эр?

— Што вы жадаеце, чалавеча? — ператлумачыў Арэмчык.

— Сына арыштавалі... Сына адзінага! Дзіцяня яшчэ!.. Даруйце яму!.. Падумайце: якая віна — адбіваўся ад вашага... ды ваш салдат пакрыўдзіў яго першым... Не расстрэльвайце! Не расстрэльвайце! Майго сына!

«Не расстрэльвайце» калека ўторыў дзікім ускрыкам і ў надрыве руху тулава-абрубка замахнуўся дошчачкай-падпоркай на Лібіца, але ня кінуў яе. Лібіц захоўна адхіліўся, а тады выцягнуўся, без чаканьня помачы ад латыша жандара, з густым шыпеньнем у вуснах, легануў ботам калеку — людзкі пень так, як гэта робяць зь мячыкам у запале гульні спартсмэны. Калека ад удару паваліўся на адхон друзаў. Лібіц з усьледным за ім Арэмчыкам абышоў яго...

*

Сьляпая трымала моцна Міхасёву руку. Яна беспамылкова паказвала дарогу, лёгка абыходзіла перашкоды на пратаптанай сьцежцы паміж камянёў, цэглаў і розных мэталёвых патарчак. Моўкныя, кожны са сваёй думкай, дайшлі да месца, дзе жыла сьляпая са сваёй маці.

— Вось тут мы й жывем.

Сьцежка заварочвала на двор разбуранага дому. Падсечаная асколкамі бомбаў, скульптура на вадаліве сярод кветнікаў узьнімалася недарэчлівым астанкам, а сам дом зубрыўся вяршынкамі малой гары, ужо зрэдку абраслай палыном і лебядой.

Сьляпая прывяла Міхася да ўсходак, якія зыходзілі ў падвал памяшканьня. Яна адчыніла дзьверы. Апрача дзьвярэй там не было ні толькі вакна, а нават звычайнага празорцы. Падвал наводліў сабой вялікі жолаб у канюшнях. У другім канцы ад дзьвярэй ён быў засыпаны зьверхняй дому. Вадрыў смурод цьвілі й вогкасьці. Пакінутыя сьляпой адчыненыя дзьверы былі адзіным сьвятлом у падвале. Каля абсыпу на жалезным ложку ляжала жанчына.

— Мама, я доктара прывяла.

— Навошта клапацілася — усё роўна памру…

— Мама, доктар нам і есьці прынёс.

— Дзякую вам!

Сіпатым голасам, з васковым тварам, што ні разу не павярнуўся ў бок Міхася й дачкі, адказвала маці.

— Доктар, у мяне сухоты… перад вайной яшчэ… ужо крывёю кашляю… Ня трэба аглядаць мяне.

— Мама, ты мусіш жыць…

— Ты, дачухна, глядзі сябе, не турбуйся пра мяне — памерці хачу… Доктар, не падыходзьце да мяне.

Яна закашлялася глухім і даўгім кашлем, ад яго яна згіналася й выпроствалася. Нават пад коўдрай ейная постаць значылася шкілетам. Ручніком, што ўвесь час трымала ў руцэ, абцірала з вуснаў ліпкую і цягучую краску сьліны…

Калісьці, задоўга перад нямецка-савецкай вайной, яна мела двух сыноў. Іх, народжаных у адзін дзень і год, выхоўвала разам з сужэнцам нядоўга. На трэці год пасьля двайні нарадзілася дачка, якая й адна засталася пры ёй, а муж загінуў на працы. Адзін з сыноў, малады, рослы, з матчынымі бялясымі валасамі й абліччам у 1939 годзе загінуў у Фінляндыі, другога, яшчэ навучэнцам тэхнікума, зьвінавацілі ў крушэньні цягніка і выслалі ў

Сібір. Турбота выгадаваць іх дапоўнілася больш цяжкай і непапраўнай пакутай мацеры: згубіліся спадзяваньні й уцехі ад народжанага ўласным целам! Як мага яна пачала больш працаваць, каб сабраць мальгва грошаў на аплату праўніку за памогу сыну і дачцэ на вучобу ў кансерваторыі. Яна зарабляла 110 рублёў за месяц за прыбіраньне дому, у падвале якога цяпер зьбіралася памерці. Вельмі часта, нанач, моцная і здаровая, ішла да чыгуначнай станцыі працаваць выкладачкай торфу, за што зарабляла каля 120 рублёў за месяц. Па нядзелях знаходзіла час памыць бялізну ўрадоўцам. Яна бралася за кожную працу, каб толькі сабраць грошы для дачкі й сына. У пісьмах маліла сына цярпець, абяцала зрабіць усё неабходнае для яго будучага жыцьця пасьля зьняволеньня. За паўгода перад вайной, калі сын мусіў вызваліцца, атрымала ад яго неспадзеўную вестку. Ён паведамляў, што яму дабавілі яшчэ 10 год катаргі... Мацеры здароўе ня вытрымала — захварэла на сухоты.

Міхась даў некаторыя парады і пакінуў іхнае падзямельле. Стуль ён выйшаў больш сумны дый роспачны. Падумаў, ці браць пашпарт. У змаганьні пашпарт не патрэбен!

10

Алена прырыхтавала стол да вячэры. Ганя памагала ёй. На ўсе Аленіны пытаньні яна адказвала ў азначаным сэнсе словаў: «А што табе?»

Па ейнай нясловаахвотлівасьці можна было разумець неадпаведнасьць становішча. З аднаго боку, няяснасьць, чаму палкоўнік Барыс так аднёсься да яе? І з другога, яна ў тым выпадку апынулася ўшчэмленай, — тут дагадкі Аленіны і злосьць на яе. Ганя была, бы злоўлены і асуджаны злачынец, які мог без аднной застыгі справядлівасьці памсьліва пакараць чалавека, хто пасьмяяўся зь яго, зь ягонага няшчасьця.

Крыху пазьней у ядальню прыйшоў Барыс. Ён, як ужо прызвычаены, блізу ўсьцязе двух год жыцьця з Аленай, спытаўся агульным перакідам абыдзеннай гутаркі:

— Ну як адчуваеце?

Аленін адказ задавальняў Барыса. У яе адказе заўсёды было невядомае:

— Дзякую!

Пасьля гутаркі з Аленай у габінэце Барыс сьцярог сябе ва ўсім: ён не зьдзіўляўся, калі слухаў яе, хоць часам можна было зьдзіўляцца зь некаторых выказваньняў, бо яны знаходзілі ў ім зусім не асізаныя разуменьнем месцы. У ягоным характары ўжо

даўно заіснавала павага да людзей вышэйшых службова. На іхныя загады, прапановы і выдумкі ён паддаваўся без адмаўленьня. А цяпер раптам спаткалася Алена, бедная й бязмайная, але што жадае нейкага вобліку абавязнасьці людзей перад людзьмі, змусіла перамяніцца яго. Яна ня годзіцца з панучым, ня годзіцца зь ім, палкоўнікам, — чагосьці заўсёды хоча. Яна робіць нейкія запаветы сабе, прыціскае яго ўсялякай несумленнасьцяй, і здабытак ад усяго гэтага — лісіца з адсечаным хвастом.

Дамогшыся звароту двара, Барыс пачаў думаць пра Алену і па начох. Яна нават сьнілася яму ў тых вобразах, якіх ён дабіваўся і прагнуў ад яе. Некаторыя дні ён губляў спадзяваньні пра ейны адварот да папярэдніх «запаветаў». Але летуценьні хутка прыводзілі да мілага ад жанчыны, і ён адразу пачынаў жыць імі: цярпеў і чакаў. Дапамагалі й выручалі запомненыя незнарокам некалькі словаў з францускай кніжкі: «Жаночая лытка прымусіла шмат лідэраў рэвалюцыі забыцца пра народ». Хто яны, правадыры, якая рэвалюцыя адбылася тады, ён чамусьці ня памятаў, ды пра гэта ня надта клапаціўся ведаць — адно хацеў і ў сваёй дваровай рэспубліцы свайго зьдзяйсьненьня.

Праз вакно голыя галіны таполяў, асьвечаныя сонцам заходу, лажыліся чорнымі й крывымі сьценямі на падлогу, на бліскучую, з кафлі, кухонную плітку. Алена шорхала хатнімі пантофлямі па падлозе — яна налівала страву і падносіла на стол. У сьцісьненай цішыні ядальні Барыс прыслухоўваўся да гэтага шарахненьня, лавіў позіркам Аленін стан, абцягнены зеленаватай сукенкай. І сярод сьценяў ад таполяў сукенка і шорах абутку прыносілі яму асаблівую ўразу, калі мужчына толькі ў здоле думаць, але не карыстаць і адчуваць дабраславенства жарсьці.

Ганя першая села за стол. Насупленая, не пазіраючы на Барыса і Алену, пачала есьці. Яна выглядала, бы дзіцяня іхнае. На дварэ скрыпеў асьвер і пакрыквалі на жывёлу парабкі. Шмат зь іх былі ранейшыя працаўнікі савецкага саўгасу, што знаходзіўся ў гэтым двары перад вайной. Алена голасна заўважыла:

— Нешта ўжо другі дзень палкоўнік без свайго мундуру.

Барыс тупым позіркам азірнуў яе і, крыху памаўчаўшы, адказаў:

— Трэба яго каму-небудзь аддаць.

— Ужо даўно трэба. Аддай хлапцу, што ўцёк з палону і застаўся працаваць у нас.

— Якому хлапцу? Што за палон?.. З палону?

— Быў у палоне — і ўцёк з палону. А ісьці да сваіх мясьцін дзесьці за Гомелем баіцца.

— Ах, Божа мой! Алена, Алена!

— Я цемлю, палкоўнік, куды вы вернеце. Але не забывайся: уладарка двору — я!

Наколькі Барыс быў узбудрожаны самачыннасьцяй браць людзей на працу, настолькі хутка пад узьдзеяй двойчай падуладнасьці й залежнасьці ад Алены быў кінены ў беспрацiў ёй.

— Добра, можаш аддаць. Учора сабака нейкага старога аболтуса падзёр яго.

— Што вы кажаце? — па-сапраўднаму насьцярожылася Алена. — Чаму не сказалі ўчора?.. Але ж як яно магло здарыцца?

— Ехаў верхам на белым, на павароце дарогі на нівы зьлез, а сабака цап мяне — і падзёр мундур…

— Тады той сабака шалёны! Не дай Бог! Вы ж ашалець можаце! Я зараз пабягу і скажу работніку, няхай асядлае вашага белага і зараз жа, зараз жа да таго селяніна едзьце: даведайцеся, ці ашалеў сабака… Хутчэй! Пад’ясьцё потым, — усхвалявана распараджалася Алена.

Барыс кінуў есьці. Ягоныя вочы, шырокія ад палахлівасьці, сустрэліся зь зіхрыстым позіркам Гані, якая таксама кінула есьці й чакала, калі ён згодзіцца. Ганін позірк уцьвяліў Барыса — цяжкі, працяжны ўздых і выдых пацьвердзілі сілу ўзьдзеяньня адной і абрыдлівасьць, няведама чаму, да другой.

— Я сам, Алюся, — не бяжы да работніка.

Барыс шпарка праехаў сяло і толькі на канцы яго адумаўся: куды ён едзе? Ён ня ведае, дзе жыве той селянін. Паспрабаваў спытацца ў сяльчанаў скрайняй хаты, але там нікога не было дома. Завярнуўся назад да маёнтку, бо наўважаў памалу праехаць блізка каля кожнай сялібы і прывабіць увагу сабак, каб такім чынам пазнаць аднаго зь іх, а тады і ягонага гаспадара. Не ўдалося. Паехаў за ўзьлесак — адтуль чуўся сьпеў пеўня. За прамежкам бору ад сяла, на паляне зь нівамі, спакмеціў адзінотную хату. Сонца заходу ляжала скраем на верхалінах бору, ад ягоных даўгіх сьценяў несла вогкасьцяй. Барыс падагнаў каня. Цярэм якраз складаў у вярсту дровы. Мурза загаўкаў, кінуўся злосна на спатканьне Барысу. Цярэм зноў убачыў свайго крыўдцу, паклікаў Мурзу, прывязаў яго да будкі. Чакаў, што скажа палкоўнік. Падышоў бліжэй да калодкі з удзёўбнутай носам сякерай. Ён хваляваўся — яму меркавалася штосьці зноў

непрыемнае ад палкоўніка. Першым не прывітаўся, як тады, пры спатканьні за маёнткам. Чуўся прыплыў крыві да скроняў і стук сэрца. Палкоўнік таксама не прывітаўся. У процілегласьць Цярэмаваму настрою быў малым, прапоратым мяшком.

— Незнарокам знайшоў, — сказаў насуплена палкоўнік і спытаўся: — Твой сабака ашалеў ці не?

Цярэм абцёр пот з лобу. Часіна, якая разьдзяляла іх моўкнасьцяй, скончылася. Ён зразумеў несправядлівасьць сваёй барздлівасьці. Але калі б палкоўнік сказаў што-небудзь супраць і крыўднае, ён без папярэджаньня сякерай расшчаміў бы яму чэрап. Зь Цярэмавай душы адляцела прокмець, у якой было ўсё роўна, абы толькі ўпершыню ў жыцьці, ды яшчэ на схіле год, задаволіцца помстай за крыўду.

— Чаму вы пытаеце? Што, вам не падабаецца мой сабака?

— Дык жа ён укусіў мяне. Ён, мабыць, шалёны?.. Падумайце: я мушу памерці ад нікчэмнага сабакі.

— Мой Мурза не шалёны. А як ашалее, дык я й бяз вас ведаю, што рабіць зь ім, — усё-ткі злосна адказаў Цярэм. Сабака, пачуўшы ад Цярэма сваё імя, зноў загаўкаў, ірвануўся на ланцугу да палкоўніка. Палкоўнік забег за плечы Цярэма.

— Не палохайцеся… ня ўкусіць — ён прывязаны.

— Дык жа шалёны — праўда? — дамагаўся свайго палкоўнік.

— Не!.. Чалавеча, едзьце з Богам, адкуль прыехалі… Вы пра гэта і хацелі спытацца?

Цярэм зноў адчуў нераўнавагу свайго супакою. «Гідотнік, за плечы нават браўся».

— Ну, дык дзякую, кажу вам. Я таксама думаю, ён не шалёны, праўда?

На гэты раз Цярэм не адказаў — пачаў складаць паскіпаныя дровы да вярсты. Ён кідаў іх рашуча і хватка, зь сілай… Палкоўнік сеў на каня. Ад'ехаўшы пад уторнае гаўканьне Мурзы некалькі дзясяткаў мэтраў ад Цярэмавай сялібы, зьвярнуўся да яго зводдаль:

— Кожны дзень прыходзь да мяне з паведамленьнем, ці ашалеў сабака, чуеце?

— Чую, чую.

Цярэм ятра ўсьміхнуўся сам сабе. «Шыш табе ў горла!» Апошняе палена ён кінуў абы-як, рукой аб руку абцёр іржавую мязгу кары, накіраваўся да лугу, скуль нацянькі мусіў вяртацца дадому Міхась. Сонца зайшло. Падымаўся туман і пачынаў зырчэй блішчэць месяц. Цярэм перахрысьціўся: з сухога бугра

ўзьлеску каля лугу ён убачыў Міхася. Уся тая гардлівасьць, злосьць да палкоўніка, калі ўбачыў постаць свайго гадунца, перамянілася ў ім літасьцяй і адказам спагады да палкоўнікавых клопатаў.

— Чалавек! Чалавек — гэта чыстадумнасьць, — задаволена прагаманіў Цярэм.

11

Міхась шмат што перадумаў, ідучы зь Менску да Цярэмавай хаты. Ён ішоў туды, дзе яго чакаюць, накормяць і абагрэюць, дзе, пасьля здаровага сну, назаўтра, устане разам зь Цярэмам і пачне памагаць яму ў працы: дапаўняць ягоны скарб у гаспадарцы. Гэта — наканаваньне, пад якім нават лёгка змагацца з нахлыняй неспадзеўнага ў жыцьці. Яно — шчасьце! Але навошта шчасьце ў горычы дзён?

Ад журбы, што зьявілася да Міхася пры спатканьні з сталіцай, зрабіліся ягоныя думкі пераборнымі, мэханічнымі й безвыходнымі. Ён пабыў сярод разбурэньняў, бадай у залі суда, дзе засталася памятка вялікай расправы людзтва зь людзтвам, дзе трацьвее велікомасьць, што называюць сьвятлом цывілізацыі — вялікай справай вызваленьня... Міхасёвы думкі часта адступалі ў расказы з успамінаў яму знаёмых людзей. Яму помніўся расказ старога беларуса, няволенага пры цары ў Сібіры. Міхась яскрава ўвабражаў з тых успамінаў набажэнствы ў турме... Прыходзіў сьвятар у смурод падвалу. Праходзіў паўзь нявольнікаў да амвою. Ад яго веяла сьвежатой надвор'я і волі. Зьняволеныя глядзелі на яго больш, чымсьці на сьвятыя абразы. Ім не хацелася адчуць, што вось зараз скончыцца каля іх прысутнасьць вольнага, бясшкоднага чалавека. Шмат хто нават уяўлялі, як ён ходзіць на свабодзе з укрыжаваным Хрыстом на грудзях. Яго акаймляе прастор з высокім небам і сонцам — не падвал; яму дастаткова там месца, а ім тут...

— Амін! — кажа сьвятар.

— Амін! —цьвердзяць зьняволеныя.

Каля амвою рэдзенька чадзіць шызень дыму з кадзіла. Вадрыць стуль сухая яловая смала. Кайданы ў сьвятле ад некалькіх сьвечак блiскочуць тлуставатай срабрынёй ручая пад месяцам уночы; і з укленчаньнем «амін» яны ўторваюць па ўсім падзямельлі неразрыўнае дзінь-дзінь-дзінь-Амін!..

Але як ні было смутна ў Міхасёвым настроі, ён зусім не сьвятазорна знаходзіў асуджэньне ўсім здарам ягоных год. Адналькі

яму самому было задавольна, што шукае ў безвыходнасьці колькі стагод нялюдзкасьці, нейкую справеднасьць абавязку, усё-ткі да выйсьця з гэтай нялюдзкасьці.

— А як з пашпартам — атрымаў?

— Не. Блукаў па Менску — азіраў.

— О, там ёсьць што паглядзець! Зруйнавалі, паганцы!.. А пашпарт — нічога, атрымаеш другім разам... Ты нават сумны — што здарылася?.. А дзічыну аддаў убогім?

— Аддаў усю сьляпой. У яе хворая маці, памірае ад сухотаў.

— Яна грае каля ўваходу да царквы? Я ведаю яе. Бедная дзяўчына... Я часта гутару зь ёй... Ды вось забыўся сказаць пра адрас пашпартнага стала...

— Не турбуйцеся — знойдзем калі-небудзь.

Цярэм запаліў на прыпечку капцілку-лямпку, памыў рукі й пачаў налiваць у міску вячэру.

— Сяньня зноў быў у старасты воласьці — заносіў грошы за падатак і купіў новую беларускую газэту, «Менскай» называецца, пасьля вячэры пачытаем.

— О, гэта цікава — лепш цяпер!

Цярэм падаў газэту. Міхась, як дзіцяня, бухнуўся ў крэсла, разгарнуў шырокія балонкі газэты. Пакуль прачытаць які-небудзь артыкул, перачытаў назву кожнага загалоўка. На апошняй балонцы ён заўважыў змушлівае цікавасьцяй паведамленьне: «Шукаем колькі асобаў-лекараў». Прачытаўшы, Міхась задавольна хлопнуў па калене:

— Заўтра, мой дарагі, іду прапанаваць сябе на пасаду лекара. Нейкая Беларуская Самапомач шукае лекараў. Я думаю, што гэта не да немцаў.

— Гэта арганізацыя ў доме насупраць царквы, дзе ты быў сяньня.

— Неспадзяванка — трэба памагаць...

— А потым што? Дапамога рэч добрая, яна змалку мусіць быць у характары чалавека. Але ж помач нічога не дае, Міхась. Можа здарыцца так, што ня будзе ад каго чакаць гэтае багаслаўленай памогі. Няшчасьце ад веку было й будзе...

— Няшчасьце на сьвеце толькі таму, што чалавек ня ведае, колькі будзе жыць на зямлі. Калі б чалавек ведаў свой адмераны час жыцьця, дык, напэўна, ён здолеў бы зрабіць і адысьці ад яго ня гэтак, як было раней і цяперака ёсьць, а па-іншаму, па-іншаму...

— Па-іншаму й ня выйдзе! Сучаснаму чалавеку, здаецца, вы, лекары, сказалі, што век кожнага... ну, прыкладам 75 год,

ад жа няхай і парупіцца жыць добра!.. Я думаю, Міхасю, што ты сказаў, не апраўдвае сутань жыцьця. Ты крыху ад неспадзеўна вычытанага ў газэце, ад убачанага ў Менску кажаш гэтак. На мой старэчы крэмень: ці не імпэрыі ўсялякія з усялякімі падманкамі прыводзяць людзей у загоны гарэйшыя, чым для зьвяроў… Але жыцьцё — гэта чалавек!

— Мой дарагі, ня зьмешвайце ў адно і думкі, і пачуцьці пра жыцьцё…

— І гэта не пры чым, бо яно зусім на іншай пасьцелі сьпіць. Для чалавека няма розьніцы пражыць дзень і ноч!

— Я, можа, памыляюся. Мне здавалася, што я адгадваў наперад твой гутар.

— Не, Міхась! Я жадаю сказаць аб тым, што немец хоча жыць па-свойму, а я наадварот…

— Я разумею, куды ты цягнеш! Ды вось захопы, як змагацца зь імі? Наш народ падбіты змаганьнямі…

— Сядай за стол, каб ня стыла ежа — ясі. Ня будзем спрачацца пра недасягнутае паміж людзьмі… На сьвеце ёсьць адно магчымае — незалежнасьць кожнага народу. А калі захопы будуць, захопы ў імя нейкае ідэі, тады мусяць усе народы сьвету даць таму захопніку добрага тумака і не зьнішчаць саплявых, хіжацкіх праведнікаў тых ідэяў, а пакінуць іх пераможанымі, падбітымі ў сваёй мярлозе безь нічога. Няхай жывуць і сыцяцца сваёй мэтай, бо ж усё роўна праз колькі год яны самі зьдзівяцца собскаму ёлапству. Але нацыі дайце свабоду!

— Добрая абумоўленасьць, але бяз гузікаў — штаны зваляцца, — сказаў, пасьміхваючыся, Міхась. — Францыя калісьці, іншыя цяпер незалежныя, душылі й душаць сваіх людзей у Барталямэеўскіх ночах…

— Няўжо, па-твойму, чакаць, пакуль які-небудзь валадар над табой, як тая маці пасьля хлапака свайму дзіцяці, патурбуецца лагодай і кволай: «Мой бедненькі зайчык, дай буську дам!» — і скажа: «Надакучыла табе твая несвабода!»

— Праўда, родны! Бяз дробязяў няма сутнасьці — здаецца, злавіў мяне ў пастку.

## 12

Арэмчык разбудзіўся. Зь лядайскай прыемнасьцяй пацягнуўся ў ложку, шчасьліва й бесклапотна пазяхнуў, стрымоўваючы як надаўжэй шырока рот. Паглядзеў на заслонь туману ў вокнах — незапацелыя шыбы каламутна малачыліся ад знадворку.

Арэмчык быў старым у свае сорак пяць, сярэдняга росту з шатэністымі, на бок зачасанымі валасамі, з тварам, створаным з мужчынскага й жаночага, але найбольш у ім выгадвала жаночае аблічча. Ён шмат што пабачыў у жыцьці, шмат зь яго клапаціўся памятаць, шмат што патурбаваўся выкінуць у няпамятнасьць.

Арэмчык нарадзіўся дзесьці ў паўднёва-заходніх мясьцінах Беларусі, а як падрос, апынуўся ў Маскве на вучобе — там крыху вучыўся ўсяму. Падчас вучобы ні з кім не сябраваў, бо зь яго сьмяяліся расейскія студэнты за благую вымову расейскай мовы й называлі бульбянікам, таму ён ухіляўся іх.

У вельмі частых лістох да багатай бабулькі й бацькі маліў забраць яго дадому, але тыя нічога не адказвалі яму на просьбы і адно на Каляды пасылалі вітаньні «С Рождзеніям Гозпада Спасітеля» і на Вялікдзень — «С Возкросеньніям Газподнім».

Арэмчык з натуры — умеркаваны, замыкаўся пасьля слуханьня лекцыяў у чыстай кватэры і зубрыў «да крыві» вымову расейскіх словаў. Аднаго часу ён ажно не звальнявеціў ад гэтага, і толькі тады бацька пераслаў яму грошы й злосна прапанаваў ехаць служыць на Каўказ у полк яму знаёмага камандзіра. Арэмчык застаўся ўдзячным бацьку, хоць сэрцам да яго не застаўся прытульным.

Па дарозе на Каўказ з бацькавым лістом да таго камандзіра тайком ён усё-ткі завітаў да бацькоўскай сялібы й неспакметна для ўсіх палюбаваўся радзінным гняздом, пасумаваў за ростань зь ім, уночы падпаліў сялібу з канца, дзе стаялі стагі саломы.

Праз парог помсты Арэмчык уступаў у будучыню свайго жыцьця. Ён без аднае кропелькі журбы і асуджэньня асабістага ўчынку да бацькі пайшоў назад да чыгуначнае станцыі, каб працягваць сваё збочанае падарожжа на Каўказ. Ён адзінна азірнуўся на ўпэўненую полымень, якая нават досыць сьветла асьветлівала ў цемнаце ягоны прасьцінак да чыгункі. Радасны й задавольны, купіў білет і паехаў па бацькоўскім накіраваньні і рэкамэндацыях.

На Каўказе ён пераканаўся, што яго жыцьцё надалей ня можа цягнуцца ў напатканым становішчы. Нэрваваўся. Прыпамятоўваў сабе аб сумленнасьці да бацькі. Нават хацеў напісаць да яго ліст і прызнацца ў сваім злачынстве, але адвага прападала ў адным надта казытлівым пытаньні: «А хто ж тады прышле мне грошы?»

Зь цягам часу Арэмчык забыўся аб усім і паспрабаваў выявіць асабістую волю быць незалежным і выкрутлівым у жыцьці.

Самастойны паход у жыцьцё таксама ня вырваўся з загароджы ягоных мрой, а прыйшоў да яго із здарэньнем аднаго нечароўнага выпадку.

Аднойчы ў нядзельны дзень ён, прыбраны ў гарнітур вайсковага пісьмаведа, накіраваўся пахадзіць за наўгароднімі паселішчамі Тыфлісу. Першыя гадзіны вандраваньня па гарыстых сьцежках і каля прыляпіўшыхся да адхону гор сакляў мінулі ў хараcтве цікавасьці й настрою. Нагледзеўся на гандляроў рознымі бусамі, матэрыямі, мінеральнай вадой. Кожны зь іх прапаноўваў свой тавар, запрашаў толькі б паглядзець на яго, але Арэмчык незадаволена моршчыўся й ішоў далей.

За цэлы год жыцьця ў тых мясьцінах ён ніколі не выпраўляўся гэтак далёка на азіраньне. Сам горад Тыфліс ён ня ведаў дакладна, за выключэньнем вуліцы ад казармы да канцылярыі коннага палка.

Чым далей Арэмчык адыходзіў ад гораду, тым цікавейшыя і прыгажэйшыя спатыкаліся мясьціны, гурмы горцаў і караваны аслоў і мулаў, раздутыя накладзенымі цяжарамі. У той дзень адбываўся кірмаш. Гандляроў можна было сустрэць усюды. Уся дарога, якая праходзіла па адхоне невысокай гары, красілася ўсялячынай дзеля гандлю рэчамі. Сонца, сухое й палістае, здаецца, было падчэплена ў прамежку дзьвюх адлеглых гор. Гам і скрыкі ўсюдзіліся ў навакольлі. У далаве гор з выступам на ёй роўнядзі расьсьцілаўся луг. У адным, то ў другім месцы на ім выторкваліся застыглыя лбы гранітных глыбаў і пасьвілася статка. Паміж жывёлы бегалі гульлівыя дзеці: квялілі аслоў і казлоў.

Нарэшце Арэмчык завітаў да саклі з пабеленымі сьценамі. Над уваходам туды пад грузінскім тэкстам і малюнкам куска мяса было напісана па-расейску: шашлык, віно, вада. Арэмчык заказаў нарзан. Гаспадар ломанай расейскай мовай абвясьціў кошт нарзану, але Арэмчык, у дастатку наслухаўшыся расказаў пра гандаль Каўказу, адмовіўся заплаціць. Ні аднаго кроку на выхад з харчэўні не зрабіў Арэмчык. Гаспадар спрытна схапіў яго за горла й ледзь не прыдушанага насьмерць скінуў у глыбокую яму паміж сакляй і гарой. Ускрыкі Арэмчыка аб дапамозе ніхто не пачуў.

Назаўтра Арэмчыка знайшлі недалёка ад казармы з завязаным ротам. Грузіны не паленаваліся прывязаць яго галавой каля хваста худога, каростлівага каня і прывялі яго ў блізіню да расейскага фарпосту. Каб конь не адыходзіў, яму паставілі аўсу і спуталі заднія ногі. Арэмчык ня мог перанесьці гэтага асьмеху.

Пасьля пасьпешлівае ачысткі й прыбраньня сябе ўцёк таго дня з Каўказу, нават не паказаўшы свайму начальству той праклённай саклі.

Жыцьцё дасьледавала Арэмчыка. Паўжаночае аблічча Арэмчыка, падоўжанае рэдкім выбегам чарнаватых валасоў на барадзе, зьбянтэжанае і закопчанае дарожным пылам ды стомай, апынулася празь некалькі дзён і ночаў за варотамі Прагі. Грошы, сабраныя шчодрасьцяй і скупатой на працягу службы на Каўказе, дазвалялі знайсьці любыя мясьціны.

Арэмчык доўга блукаў па цесных вуліцах Прагі. Днём хвалькі журбы і ліха супакойвала цікавасьць азіраньня горада. Затое ўначы пад невялікімі купкамі сьвятла вулічных ліхтароў высокія муры з рознымі вылепінамі ўзвышаліся над ім у наводлесьці гор, а вуліцы выглядам горных праходаў. Ён уцякаў ад начной чароўнасьці старога места. Але на чацьвёртую ноч начлегу ў чыгуначнай гасьцініцы да яго на карыдоры, калі нёс медзяную конаўку з кавай, зьвярнулася жанчына, крыху старэйшая гадамі й выглядам.

— Я чула, вы з Масквы.

Арэмчык ад неспадзеву пачуць знаёмую мову адказаў не адразу. Жанчына падышла яшчэ бліжэй і супакойным, нязводным позіркам, як блізарукая, глядзела ў ягоныя вочы. Арэмчык усьміхнуўся. Жанчына спакмеціла бянтэжнасьць. Загаманіла зноў.

— Ад знаёмай чэшкі з буфету даведалася, што тут начуе рускі, што ня ўмее гутарыць па-чэску, і па-нямецку таксама ня вельмі… Можа, патрабуеце дапамогу?

Арэмчык зноў усьміхнуўся, няспрытна азірнуўся наўсьцяж бруднага калідору гасьцініцы, падумаў: «Хай бы лепш бульбянікам назвала». А тады падзякаваў за шчырасьць жанчыне, згадзіўся выкарыстаць ейную памогу.

Незнаёмая была першая жанчына, што зьявілася сама да яго: пазнаёмілася і пасуліла помач. Але Арэмчык палохаўся надта расчыняцца ротам перад ёй — яго і там палохала вымова расейскіх словаў. Клапаціўся толькі слухаць. Жанчына гутарыла шмат і шмат абяцала. А як інакш захоўвацца да чалавека, які гэтак мала гутарыць? Яна адчувала сябе шчасьлівай і вясёлай. Яна памятала размову з буфетчыцай гасьцініцы: «Паспрабуй пакапацца і на яго шуметніку, а можа? Ён нядрэнна апрануты, па-панску выгінаецца… А як толькі скнара — паспрабуй палагодзіць пяткі праз чаравікі».

— Я — немка, — выпіўшы гарэлкі ў начным рэстаране, прызналася яна Арэмчыку. — Жыла зь дзедам у вас.

— Дзе — у вас?

— Ну там, у Маскве.

— О, цяпер я ведаю! — радасна і гэтаксама шчасьліва ўспыхнуў Арэмчыкаў голас сярод п'янага шуму ў рэстаране. — Я не з Масквы — я вучыўся там...

— Вельмі добра!.. Вельмі міла пачуць пра гэта...

Жанчына неспадзеўна расхаталася. Ейны твар ад сьмеху рухаўся вахрыстымі складкамі; з паўпрыплюснутых павекаў, з доўгімі рэдкімі вейкамі, пабліскваліі вочы. Яна была п'яная. Арэмчык глядзеў на яе з хараством, што падыходзіць да мужчыны, калі ён дастаткова вып'е гарэлкі. Ад выгляду, калі жанчына ў сьмеху адкідвалася назад на сярэдзіну крэсла, выстаўляючы перад ягоным жарсьлівым зіркам поўныя ўздрыгі грудзі, яму жадалася падтрымоўваць ейныя адхілы, рухацца згодна зь імі і цалаваць яе. Ён ніколі і не цалаваў жанчын. Сярод накуранага папяроснага і кіслага цыгарнага дыму яна зіхцела Арэмчыкавай уяве часткай ягонага ўласнага цела...

Жанчына заціхла, але рэха сьмеху гучэла ў вушох Арэмчыка — сэрца поўнілася цеплынёй спатканьня з жанчынай. Ён закахаўся ёй... Прынесьлі ангельскі біфштэкс і пільзанскага піва — ярчыста жоўтае ад сьвятла лямпаў.

— Я біжэй да вас... Забудзьцеся пра сваё! Увесь сьвет адчувайце за сабой! Гуляйце! — вычытала лозунгі жанчына і бліжэй падсунула крэсла да Арэмчыка.

— Давай і гэта зьямо — я галаднаваты... Я ашчадзіў грошы калісьці, але цяпер: не! Напішу бацьку — прышле... я ўцёк сюды...

— Буфетчыца — добрая жанчына, маладая яшчэ, не туляйся за ёй — можа прылашчыцца.

Яна адпіла палову піва з шклянкі, пачала есьці.

— Добрае піва — піце, бо вычахне.

Пасьля некалькіх кусьняў біфштэксу Арэмчык адчуў рэзкую й пекатлівую боль у дзясьне. Неспакметна памацаў пальцам у роце. У дзясну ўрэзалася нешта мэталічнае. Салёная вільгаць крыві адчувалася на кончыку языка.

— Ежце! Піце!.. Зараз пойдзем — я пакажу вам кватэру за нішто. Там жыву я. Згодны?

На твары незнаёмай падчас гэтае гутаркі адсутнічала папярэдняя весялосьць, зьявілася негамонкая шапатлівасьць, прытрыманая дыханьнем.

— Добра... добра, — адказаў Арэмчык і, давераны знаёмству, не хаваючыся, пасунуў зноў палец у свой рот.

— Што, жылкі? Яны часта бываюць тут… Заўтра пакажу іншы рэстаран: танны і камфортны… Круціфікус на іх!

— Нешта гострае залезла — кроў, бачыш?

Арэмчык паказаў ёй канец пальца, зафарбаваны крывёй.

— Кроў? Хадзем да фае — пагляджу, — затурбавана прапанавала яна… Яна выцягнула зь ягонай дзясны невялікі, гостры кавалак косткі. А тады, пасьля гэтага, міла-падступна прыціснулася да Арэмчыка. Ён няскратна здрыгануўся. Усё, з чаго ён складаўся, аддалося звабе жанчыны. Шчасьце расло само! Пра яго ня думаеш тады, а слухаеш, быццам вечную сьпеўнасьць.

— Як клічуць цябе?

— Люцікам называюць.

— А мяне — Агнэса. Там, у Маскве, гэтак ахрысьціў мяне дзед.

— Чаго тут расшпіліліся? — увайшоўшы да фае, прыбіральшчык пажартаваў зь іх, паставіў у кутку венік і вядро для шумецьця, выйшаў.

— Люцік, я закахалася. Адгадай, у каго?

— Ня ведаю.

— У цябе, мой неспадзеўны, у цябе. Здаецца, там у вас кажуць «у цябе, мой цар», а тут хай будзе: у цябе, мой кароль дабраслаўны. Цяперака адгадаеш?

— Ну — ты! — з усёй той задухай шчасьця адказаў Арэмчык.

— Ты лепш скажы — Агнэса!

— Ну — Агнэса…

— А як жа ты, Люцік, даведаўся, што я — Агнэса?

— Сама сказала: Агнэсай называюць…

— Скажы, Люцік, ты кахаеш Агнэсу?

— Ня ведаю, — пахітрыў Арэмчык.

Яна перастала распытвацца, гульліва стрыгаць словамі, якімі апускала глыбей карэньні ахотлівасьці ў юнацкае цела Арэмчыка. Яна пачала больш зразумелым і даўмелым дасягам дзеля сябе.

— Вось толькі адмоўся кахаць мяне, — і Агнэса сваячна пагладзіла Арэмчыкаву руку, — я зраблю табе — о, ты ня цяміш, што я здолею зрабіць табе! У турму загнаць магу…

— Мяне? За што?

— Скажу, абрабаваць хацеў.

— Цябе?

Арэмчык ня быў у здолі гутарыць, ён толькі мог уторваць выхапы парожніх словаў з Агнэсінай размовы.

— Я так пакахала цябе!.. Хадзем адгэтуль… Хочаш быць маім?

Яна зноў прыціснулася да Арэмчыка. А яму? Яму па-ранейшаму асалодна ды шчасьліва. Жанчына першай закахалася ў яго. Як гэта зусім звычайна і даступна. Ён ганарыўся мужчынскай адвагай маладосьці.

З асьветленай ліхтарамі вуліцы, без агрэхвіны паміж іхнымі постацямі — стулены, яны завярнулі на цёмны завулак. Быў чутны няспынны гутар Агнэсы й водар падгнілай агародніны з падвалаў гандлярскіх дамоў. Потым невялікі прасьцяг яны прайшлі па ўзьбярэжжы Вэлтавы. Рэдка і слабым подзьмухам павейваў рачны лятняк, ствалы дрэваў на ўзьбярэжжы губляліся ў нязгаслым шасьценьні лісьцяў.

— Я жыву тут.

Агнэса адчыніла дзьверы ўсярэдзіну невялікага двухпавярховага дому. З вакон надверхніх паверхаў зырчэла сьвятло. Увайшлі.

— Дай пацалую цябе… Ах, які ты цудоўны! — прашаптала захопна яна ў цёмным калідоры, зачыніўшы ціхенька дзьверы.

Сьвятло ў Агнэсіных пакоях гарэла нядоўга. Яны абое не хацелі яго… На цэлы месяц Арэмчык заснуў у неспадзеўным шчасьці: «Я кахаю… і я таксама!» — перакідваў ён у думках два чутлівыя сказы.

Аднойчы раніцай, бы з прадчуваньнем чагосьці благога ад Арэмчыка, быццам у трывозе небясьпекі ад сваёй маруднасьці перад тым благім, Агнэса паклапацілася вырваць ягонае шчасьце з сваіх грудзей. Яна прагнала яго на вуліцу, зусім супакойна прамовіўшы:

— Вось і ўсё! Грошай ні ў цябе, ні ў мяне… Можаш зматвацць ад мяне — не трымаю, а то паклічу паліцыю.

Арэмчык плакаў, поўзаў каля Агнэсіных ног, але яна была неўпрашальная. Калі падпаўзаў на каленях да яе, адступала набок і сьмяялася, захліпным сьмехам сьмяялася.

— Зьлітуйся, Агнэса! — прасіў ён. — Я кахаю цябе! Знайдзі працу, і я буду працаваць, як вол… Зьлітуйся!

Арэмчык кахаў Агнэсу. Але яна, старая ружа ў ягоным садзе, не хацела расьцьвітаць. Арэмчыкавых грошай ня стала на другі месяц сумеснага жыцьця.

— Што рабіць?

Зусім недадумны, чаго хацела Агнэса, але надта перакананы, што, мабыць, перастала кахаць яго, Арэмчык пайшоў ад яе. На шырокім пляцы з вадалівам, з дамамі ў пярэнчынах на-

вакол ён прысеў у сьцені каштану. Стайкі галубоў, вуркочачы, хадзілі па ўсім пляцы. Там ён па-сапраўднаму падумаў пра жыцьцё, што гэтак прадчасна пачало сьцігаваць яго. Ён мо' й не пайшоў бы адразу ад Агнэсы, але палохаўся паліцыі. Прагоняць на радзіму, а там будуць тыцкаць пальцамі, насьміхацца за здаронае на Каўказе.

Зазванілі званы. У трыкутніку каля сьцяжы вуліцы да пляцу высоўвалася званіца сьвятыні. З-пад ейнага ўзгону шэсьць коней, накрытых запонамі, з падгнутымі шыямі, выцягнулі чорны катафалк. Яны адвозілі кагосьці да месца, дзе ён ня будзе болей пакутаваць і трымцець рознымі звабамі жыцьця. Арэмчык устаў і зьняў шапку. Катафалк і чорна-бела апранутая гурма людзей абмінулі яго. Пра сьмерць Арэмчык ня думаў. Ён разумеў яе ў юнацкім уяўленьні як адну з праяваў няшчасьця чалавеку, падобную да ягонага няшчасьця жывога. Але яно, безвымоўнае, падшапнула яму набожнае паслухмянства. Бывае ў жыцьці, калі ня трэба словы, дастаткова толькі аднаго шораху паўзка, і ты ўжо знаходзіш мо' і не справядлівы, але шлях да чагосьці выгаднага і пажаданага. І той думцы Арэмчык не зьбіраўся супраціўляцца… Пад палудзень сонца стала прыпякаць. Галубы на пляцы з апушчанымі крыламі ледзь краталіся. Шмат зь іх ад малой рухлівасьці там выцягвалі каляровую лапку і крыло, ляжалі на зямлі. Арэмчык хацеў есьці, але пра ежу ня вельмі думаў, ён думаў аглядзець сьвятыню і знайсьці памяшканьне сьвятара, каб зьвярнуцца да яго з просьбай помачы. Арэмчык наважыў пайсьці ў манастыр і быць мніхам. На ягонае шчасьце, там знаходзіўся манастыр, і не жаночы, а як і трэба — мужчынскі.

— Ад чысьціні сэрца скажы, чаму ты хочаш быць манахам? — дапытваўся ў Арэмчыка стары абрызлы мніх — абат манастыра.

— Я з Расеі. Я прыехаў сюды, каб знайсьці месца быць паслушнікам Госпада, сьвятых усіх… Яшчэ там, на айчыне, я чуў пра славу вашага Богу даставернага манастыра…

Арэмчык не дакончыў сваю сьвятую хлусьню. За словам «даставернага» ён ледзь ня вымавіў імя Агнэсы. Ён паваліўся да ног абата, пацалаваў іх і расплакаўся, як пакрыўджанае не за віну дзіця.

— Калі раб Боскі ў чыстай веры да нас, хай Госпад славіць цябе славай Ягонай! — нарэшце сказаў абат і папярэдзіў: — Зараз накормяць цябе, дадуць месца адпачыць, а заўтра буду зноў гутарыць з вамі.

Абат нахіліўся і прыклаў далонь на Арэмчыкаву дрыготную ад плачу галаву. Ён гутарыў зь ім стараславянскай мовай, якой Арэмчык навучыўся, будучы ў супакоі пешчаў суровай бабулькі.

Назаўтра той самы стары абрызлы абат манастыра абвясьціў сваю добрую згоду: Арэмчык мог увайсьці ў ціхамір манастырскіх укорнікаў... Кожная сьцяна манастырская прыпамятавала Арэмчыку не забыцца пра Агнэсу. У ранішняй ці вячорнай мальбе ён маліўся да сьцяны, а не да падвешаных абразоў на ёй. Яму здавалася, што сьцяна не глуміцца зь ягонай прыгожай мроі — каханьня. Ні адной супакойнай думкі не знаходзілася ў Арэмчыкавай галаве, штосьці ўсё прыгадвалася легендай, напалову пацьверджанай панурай сапраўднасьцяй. Ён, пакутны, засынаў і прачынаўся з гэтым самым штодня. Спамінаў Агнэсу і заставаўся ёй вельмі ўдзячны, што яна гутарыла калісьці зь ім зусім пра іншае і шмат пра што больш цікавейшае ды мілае. Ён нарэшце пачынаў разважаць пра сутнасьць свайго жыцьця і пра сілу зла на зямлі. Сьвет, па-ягоным меркаваньні, быў сустаняй ліха, а ліха заўсёды без дабра! «А раз ліха, рабі ліха!» — аднойчы шпурнуў ён гэтыя словы і з задавальненьнем, з узносьлівай ласкай учарэпіўся ў іх развагай.

Кончыўся першы год Арэмчыкавага жыцьця ў манастыры. Цэлы год у змроку муроў, як запаленая сьвечка, ён намагаўся асьвяціць цемнату свайго наканаваньня. Перад ім памалу адчынялася дамавіна таго, аж заманастырскага сьвету. «Там!» — ускрыкнуў ён, бадай у тое прадраньне, калі год даўчасу ступіў на абтаптаныя манастырскія пліткі. Зь нязьвіхным намерам пасьля ранішняга набажэнства Арэмчык зь сьлязьмі і сьвятой шчырасьцяй зноў падступіўся да абата:

— Сяньня ўночы мне прысьніўся сон. Я бачыў званіцу нашага сьвятога прыстанішча, а на ёй надпіс: «Ідзі! Ерасулім!». Багаслаўце мяне, дастойнік наш, у вандроўку... Я босым пайду да Ерасуліма.

Абату спадабалася Арэмчыкава шчырасьць і дадумнасьць ісьці босым да сьвятых мясьцін Палестыны. Ён пабагаславіў яго Богам і выдаў ахвяраваньні дарожныя з манастырскай скарбніцы...

Праз некалькі тыдняў Арэмчык, пераапрануты й вясёлы, з просьбай прабачэньня за блуканьні за мяжой стаяў перад бацькам. Бяззубая бабулька памерла ўжо, а асунены старасьцяй бацька яшчэ мог радавацца звароту сына дадому.

— Слава Богу! Слава Богу! — шапнуў дрыготнымі, сплюшчанымі вуснамі дзядуля-бацька і перахрысьціў Арэмчыка. — Як добра: свой насьледнік вярнуўся дадому.

## 13

Арэмчык заставаўся сядзець каля стала — пакалупваў зубы й пазіраў з паверху абсталяванай кватэры на руіны сталіцы. Служанка, бадай нічкам, падыходзіла да стала, прыбірала судзьдзе і, турбуючыся, каб яно не бразгала, стаўляла ў кутку каля кухоннае пліткі — зьбіралася мыць. Каб ня грукнуць уваходнымі дзьвярыма, ціхотна прынесла два вядры вады са студні.

Арэмчык працягваў успамінаць. Жыцьцё, разьдзеленае паміж гадоў, тым раньнем зноў сабралася на адзін прысяд да яго. Яно вярталася да яго ўрыўкамі мінулых прыгод і парываньняў і, ня надта зразумелае, разьмяжоўвалася ў бязморнасьці будучыні.

У тую раніцу, перад тым як сысьці ў свой службовы габінэт Самапомачы, пачаўшы яшчэ ў пасьцелі, ён успамінаў бацьку, зь якім пражыў сумесна пасьля звароту з Прагі ўсяго каля дзесяці дзён. Бацька памёр.

— А я зірк — і празь нядзелю па паховінах усё адбудаванае па пажары і пакінутае па запавеце мне сьвіснула й накрылася грашовымі паперачкамі… Жыві, Прага, Будапэшт, Агнэса!.. Шкада, што помнік не паставіў бацьку, — думаў Арэмчык, быццам кранутым мінулым і сумленьнем.

— Эй, хатняя кансыквэнцыя, пакліч дачку! — раптоўна пакінуўшы ўспаміны, зьвярнуўся Арэмчык да служанкі. Ён прывёз яе з сабой з Прагі, бо яна для яго па сьмерці жонкі была служанкай і нават бы другой сужэнкай.

— Вы заўсёды перашкаджаеце мне, — пакінуўшы ігру на раялі, абурана закрычэла дачка.

— Ты сьціхні, прарэх незашыты! Не тваім хлебам жыву!.. Наелася сабе, дыбіна стрыгнатая, закруціла калена на калена і на тым «не перашкаджай». А я перашкоджу табе — зьбіраюся сямнаццаць год да гэтага, але, мабыць, некалі адпушчуся, дык так, каб ідучы замуж, аглядалася і затульвала сваю духаўку!

— Што вы хочаце?

— А што казалася ўчора? Ня памятаеш? Бачыш, у чым апрануты я, ці не?

— У кашулю і штаны…

— Ты адважваесься насьміхацца зь мяне. Зачыні разіню, а то заляплю даланінай! Дзе кашуля вышываная?

Арэмчык адвярнуўся ад дачкі, нібы забыўшыся на гутарку зь ёй, працягваў гучную размову самотна:

— Скажуць: прыйшоў, як камісар. Адна бяда выйшла — прыйшла іншая з тым самым аршынам, з тым самым бязьменам!.. А гэты смаргун Зорыч кожны дзень у вышыванцы бела-

рускай ходзіць… Гых ты, лебяда падмерзлая! Не замарозілі тыя, дык можна цяперака! — і, не пазіраючы на дачку, спытаўся: — Чаго стаіш і слухаеш?

Але яе не было каля яго, яна, навучаная гэткімі сцэнамі й захаваньнямі бацькі, ня слухала доўга яго, а, даведаўшыся, што ён патрабуе, парупілася прынесьці вышываную кашулю.

— Дадумалася? — супакойна спытаўся Арэмчык. — Дай пацалую цябе… Ты мусіш мае думкі й навагі схопліваць бяз словаў. Прызвычайся, дачка!

— Добра. Наступны раз буду ведаць.

— Ты заўсёды абяцаеш: наступны, наступны, але пакуль не наступіш на блошыну, дык і ня трэсьне яна… Бацьку шануй — вайна цяперака!

— А навошта вышытую кашулю апранаеш — маму ўспомніў?

— Пры чым тут мама — на сьвітанку нябожчыцу спамінаць?.. Сяньня прыём буду рабіць, дык мушу нацыянальную вопратку мець, праўда ці не?.. Ах, яшчэ пытаюся ў смаргатай!

— Але ж кашуля з румынскімі ўзорамі. Мама як памятку з Румыніі прывезла.

— А што, ня ўсёдна: беларуская ці румынская?

— Ніколі. Няўжо ў Празе, бываючы ў беларусаў, не заўважыў іхныя нацыянальныя кашулі?

— Але ж гэтая, румынская, пашытая, як кашуля — ці андаракам?

Арэмчык цьвяліўся. У асаблівасьцях нацыянальнай вопраткі нічога ня ведаў ён. Але ведаў адно, што той, хто апранае вышытае, ёсьць у нейкай меры зьвязаны з сваім народам.

— Каб цябе разанка, дачухна, узяла! Праклён вам! Праклён!.. А ты, запрэлая, чаго там ляпаеш судзьдзем: мо' цябе не датычыцца гэтае? — закрычэў Арэмчык на служанку. З скрыўленым тварам падбег і прыгнуўся прад ёй, быццам у чаканьні адказу. — Сьмяесься? Вон заўтра пойдзеш!..

— Унізе чуваць — не крычэце, — лагодна папярэдзіла служанка.

— Ты чуеш яе: «не крычэце»? Хто пра вышыванкі мусіць турбавацца: я ці ты?

— І насапраўды: не крычэце — угаманецеся… Давай памяркуем, як выйсьці з усяго.

— Што меркаваць? Каб яно ў жорнах скруцілася! Глядзеў, як варона, і даглядзеўся! Ты ўяві сабе, — звычайна пачаў ён, — я з маёрам Лібіцам Менск азіралі, дык нейкі нечалавечы воб-

раз падпоўз да нас і давай крычэць: «Заб'ю фашыста!.. Заб'ю, як мыш! Чаго прыйшоў сюды?.. Я прысуд напісаў табе і сам яго выканаю!..» Ажно сьмех бярэ: бязногі, адсечаны, як гарбуз ад каліўя, а яшчэ пагражае… Вось тут і жыві. Яны ўсе — нацыяналістыя і нікога ня любяць чужога… Вось дык сьвет! Вось дык імпэты!

Падчас гутаркі Арэмчык заклаў назад рукі й прымасьціўся выгадней каля цёплае пліткі.

— Вы ж на працу не забудзьцеся.

— О, праўда! Каб ты спрахла! Дзе той цыбук? Зноў уцякла да піяніна. Прынясі кашулю пад гальштук — абыдуся й без вышыванкі…

— А ты не турбуйся гэтым.

— Дай пацалую цябе. Даўно з табою быў, — папярэджваючы іншым, прыгаманіў Арэмчык служанцы. Яна ў згоднай зразумеласьці прыплюснула левае вока, крывячы й падцягваючы ў гэтай міміцы левы скраек роту…

*

— Ці ня ён? — няголасна сказала машыністка, што сядзела недалёка ад дзьвярэй. Яна ды другі ўрадовец, ведаючы, пра што папярэдзілі, заняліся шчыра перабіраць розныя паперыцы і абмежнікі. Водгуль марудных крокаў з кватэры Арэмчыкавай прыбліжалася. Урадоўцы, ухмылістыя паміжсобку, уветліва азірнулі маладога мужчыну за асобым столікам, мабыць, іхнага кіраўніка.

— Дабрыдзень, спадары!.. Ах, і спадарыня, даруйце, ня ўбачыў вас!

— Дабрыдзень! Калі ласка! — ветліва адклікнулася машыністка.

— Ну як ідзе? Шмат паахвяравалі і абяцаюць для нас?..Хто гэтым апякуецца?

Машыністка паказала на Зорыча.

— А-а, спадар Зорыч займаецца гэтым… Мы ж ужо знаёмыя, спадару Зорычу, — вітальна Арэмчык падаў яму руку і падумаў: «Картаязыка — Хрыстосам робіцца, а нядаўна мо' кукарэкаў: усё для партыі!». Адвярнуўся і блізу з прамовай зьвярнуўся да ўсіх:

— Спадары, я таксама свой чалавек — беларус так званы, жыў на эміграцыі, у Празе, дабіўся ад немцаў накіраваньня сюды, ажно ў Менск. Можа, вы і безь мяне абышліся б тут, але вы ў такім нацыянальным парываньні, што можаце лёгка за-

быцца аб усім важнейшым у барацьбе за новую Эўропу… Дык вось будзем працаваць, памагаць вашым пакутным людзём.

Захліпна, бы ад сьліны, перарваў прамаўленьне.

— Спадару Зорычу, прашу да мяне ў габінэт… Спор Божа ў працы! — кончыў Арэмчык.

— Дзякуем! — адказалі машыністка і другі ўрадовец.

Нізкае сонца з ружовымі праменьнямі шпарка ляцела ў тумане. Туман узьняўся ад зямлі, і толькі ў паднябёсах пыліўся, зьбіваўся ў клубы, адлятаў дзесьці за разваліны сталіцы. У некаторых частках высі азярысты прастор неба вырываўся з туману, і тады ў вырве ярчыста ўзблісквала і змрачылася сонца. Арэмчык глядзеў праз вакно свайго габінэту на ўсё гэта, абы сабрацца з думкамі. Зорыч сеў і чакаў, пакуль ягоны кіраўнік адвернецца ад вакна. Не сьцярпеў:

— Хоць і рэдка, але ў нас таксама ёсьць туманы, як у Лёндане.

— О, я! Спадару Зорычу, я надумаўся даручыць вам іншую працу. Ад заўтра пачынайце арганізоўваць аддзел Самапомачы ў Менску і аставайцеся працаваць там… Пасьля абеду я прыму ад вас справы і маёмасьць. А я на вашых падмурках буду ўзначальваць кіраўніцтва над усімі аддзеламі Самапомачы ў Беларусі. У вас, спадару Зорычу, адно прызначэньне, а ў мяне другое… Адмовак я не цярплю. Мушу сказаць адразу: да працы, да працы!.. А цяпер паінфармуйце мяне пра зробленае вамі й намеры на будучае.

Зорыч не зьбіраўся адмаўляцца ад даручанай працы — яна тая самая. Ён малады, энэргічны чалавек.

— На якіх сто асобаў, напалову зь бядой, удалося збудаваць дом для сірот і згубленых дзяцей. Шукалі і шукаем лекараў. Патрэбна адчыніць лекарскі габінэт для насельніцтва Менску і аптэку…

— О, гэта вельмі добра! Справай аптэкі я займуся сам, нават у першую радоўку, пра гэта больш не клапаціцеся.

— Калі ласка!.. Вы можаце пагутарыць з фармацэўтам, якога я не пагадзіў яшчэ на ўмовы працы…

— Ніякіх умоў — працаваць мусіць, вось умовы.

— Але, я запрасіў да сіроцкага дома лекара — ён таксама ў пачакальні, пагутарыце зь ім, бо ж, думаю, апека сіротамі таксама пакінецца для вас…

— Ага! Дык тады адразу — не марнаваць часу!.. Вам, спадару Зорычу, шчырае дзякуй! Будзьце ласкавыя сказаць таму лекару завітаць да мяне… Яшчэ раз дзякую вам! Заўтра, я ду-

маю, спаткаемся зноў, найлепш раніцай, — і на разьвітаньне працягнуў руку. Зорыч вельмі бянтэжыўся ад спатканьня й гутаркі з новым начальнікам, але як быццам нічога не было, быццам упершыню сам спатыкаецца з гэтай ім пачатай працай, зьвярнуў увагу Арэмчыка: — А што, сяньня пасяджэньня не адбудзецца?

— Гух! Вот жа ба! Шархануў учора, як гарох па патэльні... А як жа! Па чацьвертай гадзіне, здаецца, так?

Зорыч кіўнуў галавой — пацьвердзіў.

— Але нічога — зараз зь лекарам пагутару.

Міхася запрасілі да Арэмчыка. Гэта той, што ўчора хадзіў зь немцам, — знаёма мільганула ў Міхася пры завітаньні ў Арэмчыкаў габінэт. Спыніўся недалёка ўваходу.

— Сядайце... Як вашае прозьвішча?

— Адамчык.

— Вы, значыць, лекар. А дыплём можаце паказаць?

— Але. З прыемнасьцяй.

Арэмчык хутка азірнуў бруднаваты, звалокнены на складках дыплём.

— Значыць, кончылі? Нават з добрымі посьпехамі?.. Я хачу ўзяць вас да дзецкага дому. Там, ох, я забыўся, здаецца, будзе каля сарака-пяцідзесяці сірот і згубленых дзяцей, сто не патрэбна, зашмат будзе... Пра аплату потым пагукаем, бо ня ведаю, колькі мы назьбіралі грошай... Гуд?

— Хай будзе — гуд. Пра аплату я ня вельмі цікаўлюся.

Арэмчык насьцярожыўся.

— Я, прызнацца, не паважаю нацыянальную ахвярнасьць. Я паважаю: рабі, як кажуць! Таму я, перад тым як перанімеце свае абавязкі, скажу вам: цяпер вайна, ня вельмі прымайце ўсё да сэрца... Вылечвайце дробязі нядугаў у дзяцей як фэльчар, а калі будзе немагчыма прагнаць благое, нездаровае, значыць — памёр, значыць — туды яму дарога! Для новай Эўропы патрэбны моцныя, здаровыя людзі. Чаму кажу гэтак? Бо ня маем шмат мэдыцынскіх сродкаў, і наагул я ня ведаю, ці маем іх... А можа, спадару Адамчыку, возьмецеся адшукваць мэдыкамэнты з былых аптэкаў?

— Не-е. Ня здольны да гэтага.

— Ну дык стане з вас. Пра аптэкі я пагутару з спэцыялістамі аптэчнымі, маем і такіх зубчакоў... Але папярэджваю вас: мэдыкамэнты ашчадзьце, як хлеб.

— Нічога не скажу, пакуль ня ўбачу дом для сірот, габінэт да працы і тыя мэдыкамэнты, — адказаў Адамчык зь невядо-

масьцяй: ці ён верыў у словы Арэмчыкавы, ці ён зьдзіўляўся зь іх — яны ўсё-ткі шархавата ўпіліся ў ягонае чутлівае сэрца.

— Зараз я пазнаёмлю вас з другім спадаром. Ён рабіў усё, пра што мы гутарылі... Ага, ледзь не забыўся: патурбуйцеся сяньня пасьля азіраньня месца працы на нашае пасяджэньне ў чацьвертай, а мо' пятай гадзіне... Прашу за мной!

Адамчыка зноў пазнаёмілі з Зорычам. Яшчэ пры першым спатканьні зь ім, раніцай, Адамчык прынік да яго пашанай: штосьці наводле было ў іх характарах.

— Яшчэ раз, як у песьні пяецца...

— Ня шкодзіць, — сьціснуўшы руку Адамчыка, прызнаўся з хаваным сарказмам Зорыч і сказаў Адамчыку пра іншага чалавека. — З вашае вёскі якраз. Спадар палкоўнік Скантаўт, я даведаўся, вы незнаёмыя яшчэ.

— На жаль, не, — адказаў палкоўнік і агледзеў Адамчыка.

— Я чуў пра вас ад майго дзеда...

— Вельмі ўдзячны, што вам давялося слухаць пра мяне, — з апрацаванай ласкай падзякаваў палкоўнік Адамчыку. — Нават неспадзеўна: гэта вы там, на ўскрайку вёскі, сярод поля жывяце сабе з старым?

— Але.

Пазнаёміўся з палкоўнікам і Арэмчык, але ён зараз жа пайшоў да свайго габінэту... Адамчык заўважыў раптоўную перамену на палкоўнікавым абліччы.

— Надта ўдачліва — я даверуся на вас, як на лекара: у мяне непрыемнасьць з вашым дзедам: ваш сабака ўкусіў мяне й падраў мундур... Скажэце, сабака не ашалеў яшчэ?

— Не.

— Прабачце, спадару Зорычу! Дробку словаў да доктара... Прысядзем, калі ласка! Я папрашу вас паглядзець за сваім сабакам: як толькі ашалее, паведаміце мне... бо ж, думаю, сабака здаровы ніколі ня кінецца на чалавека, а толькі шалёны...

— Напэўна, спадару Скантаўце, як-небудзь палагодзімся й патурбуемся.

Скантаўт паўшэптам зьвярнуўся да Адамчыка:

— Вы клічце мяне палкоўнікам, ведаеце, я ўжо прызвычаены да пашаны — стары жаўнер я... — і галасьней: — Вы, доктар, будзеце на пасяджэньні? Я таксама запрошаны.

— Мабыць. Але паглядзім, як тут што.

Палкоўнік пасьпешліва злавіў Адамчыка за плячо.

— Я на падводзе — адвязу да хаты, самы раз для вас... Два мяшкі капусты прывёз для Самапомачы. Я то не паважаю вала-

водзіцца з гэтым, але часам прыходзіцца, — і палкоўнік пагардна захіхікаў рассыпным сьмехам.

Зорыч з Адамчыкам доўга азіралі сіроцкі дом, лекарскі габінэт і на месцы адразу раіліся аб будучым у працы, выпадковым гутарам абхоплівалі палітычны стан на Беларусі. Зорыч паўторнай пытлівасьцяй, павярхоўна адклікаўся на прыезд новага кіраўніка Самапомачы, але Адамчык, нягледзячы на звычай паразмаўляць, нічога азначанага не выказваў з сваіх уражаньняў — ён жадаў увайсьці ў працу дабрадзейства без прадчаснай падозры.

— А паабедаць забыліся. Папраўдзе, спадар Адамчык, я ўжо выцерпеўся ад голаду, дык ня вельмі й думаю пра ежу.

— Мо' тады прысядзем у лекарскім габінэце ды зьямо маю лусту. У дарогу мой дзед не пускае безь яе.

— Шчыра дзякую! Па пасяджэньні завітаю да нашай харчэўні. Хадзем — за гадзіну пачынаецца яно.

А тады зноў спытаўся ў Адамчыка. Гэта было даражэй і мілей яму.

— Ну як, вы згаджаецеся прыняць кіраваньне лекарскім габінэтам і апекай над сіротамі, ці, можа, падумаеце?

— Так, я згаджаюся, гэта маё прызначэньне.

— Вельмі прыемна! Вось вам ключы ад габінэту. Плёну ў працы!.. Ніякіх актаў прыёму ня пішам — у нас усё на шчырасьць душы й сумленьня.

У пачатку чацьвертае гадзіны па поўдні яны вярнуліся да будынку Самапомачы. Зайшлі ў габінэт Арэмчыка, каб паведаміць канчальна аб згодзе Адамчыка і астацца там чакаць пачатку пасяджэньня. Адно толькі пры ўваходзе Арэмчык сустрэў іх пытаньнем:

— Дзе ж вы былі, спадару Зорычу? Што здарылася?

— На шчасьце, нічога кепскага. Паказваў спадару Адамчыку наш сіроцкі дом і лекарскі габінэт…

— Як, нічога? А на пасяджэньне чаму не прыйшлі?

— На чацьвертую гадзіну яно.

— Гэтакіх працаўнікоў трэба цурацца! Здаецца, цяпер я гаспадар тут, а ня вы. Таму я магу адмяніць свае распараджэньні… Мы скончылі пасяджэньне, а вам жадаецца, дык паседжвайце.

Зорыч зірнуў на Адамчыка. У ягоных вялікіх вачох зь неадважнай сіняй каля шэрані зрэнкаў зіхатнула ўраза і лёгкі адзіны плюск павек з густымі вейкамі на іх. Твар уяўна скалынуўся ў собскай спагадзе. У спагадзе таму, што ажыло пад яго рукамі й розумам і што намагалася дыхаць і жыць сваім. А кадзе ён,

быццам сажмаканы сумленьнем ад недарэчлівасьці свайго злачынства, мусіць стаяць перад Арэмчыкам і бадай прасіць вярнуць яго на справядлівы шлях жыцьця.

— Прабачце за турбаваньне! — і Зорыч выйшаў з габінэту. Ён вельмі здольна ўхіліўся часіны паказаць Арэмчыку сваю будрожнасьць. Адамчык застаўся.

— Пабачылі ўсё? — спытаўся непахісны ў собскай разьмяркоўнасьці навагаў і працы Арэмчык.

— Але. Нават усё спадабалася.

— Хваліце?

— А што казаць, калі бачыш — добра?

— Заўтра пачынайце працу… Ага! Які забыўлівы я: сяньня ў нас невялікая зачопка — завітайце…

Адамчык не даслухаў запросіны — адмовіўся.

Надвечар неба зноў пачало зацягвацца імклівымі хмарамі. Падзьмухваў вецер. Ён нёс з сабой сьцюжу, бразгаў у абвіслыя кавалкі бляхі на спаленых дамох, груз мяккай грэблівасьцяй у вопратцы прахажанаў. Сонца, жарыстае колерам, час ад часу вырывалася з хмараў на небакраі і зырчэла, як непатухлы вугаль сярод попелу. З Самапомачы Адамчык пайшоў наведаць сьляпую і яе маці. Пакуль ішоў туды, ён думаў пра працу й пра Арэмчыка. Успыхнуў асудлівым сумленьнем за даную згоду працаваць зь ім. Ад гэтае ўзьдзеі ён, бы хлапчук, наском чаравіка зьбіў ізь сьцежкі некалькі адломкаў цаглін. «Мо' пачакаць?» Але ў зразуменьні асягнутага, у адпусьце неспакмечанай стомы ад дня ўспомнілася сьляпая, да якой ішоў цяпер, і чаму зноў не атрымаў пашпарт.

«Было позна, — скажу дзеду. — Заўтра пайду».

Паміж развалін на двары, дзе жылі знаёмыя, Адамчык апамятаўся: ён забыўся, ідучы да іх, завітаць да жаночага манастыра і спаткацца там ізь сьляпой, каб разам ісьці да іхнага прытулку. Пастукаў у дзьверы. Прыслухаўся. Увайсьці не прасілі. Пастукаў уторна, пачакаў — і зноў тое самае. Не сьцярпеў — глянуў праз паўпрычыненыя дзьверы. У мораку падвалу ён убачыў матку сьляпой, якая ляжала на тым самым ложку і ў тым самым вугле — з адкіненай да сьцяны галавой. Цёмныя крывяныя палоскі маляваліся сьцёкам ад роту пад вушы і на шыю. Адамчык піхнуў нарасьцяж дзьверы. Пачаў асочваць пульс. Шыпучае дыханьне з клёкатам у грудзёх, рэдкае і захліпнае, адкліквалася з шырока расчыненага роту. Яна нічога не заўважала й ня чула — гэта была апошняя непрытомнасьць. Але ў

апошняй яна прабавала ачуняць, мабыць, дачакаць і ўбачыць дачку, што, магчыма, яшчэ стаяла на вуліцы перад сьвятыняй...

У дзівоснай напрузе ірванулася рука з рукі Адамчыка, і яна не данесла яе да горла, як тую левую, якая ляжала бліжэй каля падбародка, запэцканая крывёй. Ніжняя губа пляцнула, расьцягнула чорна-чырвоную цягучасьць крыві, прыліплую да яе. І тады рукі, што калісьці прыгожыліся здаровасьцяй, поўнасьцяй цягліц, якія шмат працавалі і рабіліся ад працы шархатымі, але калісьці гэтак лагодна адчуваныя ейнымі дзецьмі — абмяглі, асунуліся... Цяпер яны ня будуць накідваць шуплямі торф з вагонаў, падмятаць вялікія залі, сьпяшацца памыцца ў брудзе бялізны, палічыць сабраныя капейкі, каб іх стала на жыцьцё дзецям, з гэтым турботным, але шчасьлівым намаганьнем затуліць твар, па якім сплылі сьлёзы ад гора. І вось кадзе яны спыніліся, ужо даўно зрабіліся тонкія, абцягнутыя блякла-пасінелай скурай. Яны, бывала, падтрыманыя мрояй, праглі ашчапіць, узяцца за рукі дарослых сыноў і іх дзяцей — і прайсьціся ў цудзе старых гадоў шчасьлівай, сапраўдна шчасьлівай і радаснай. І не дачакаліся. Яны, бадай, выкінулі яе з жыцьця, нават з жыцьця спадзяваньнямі. Яны ў любові да жыцьця задушылі яе! Гэта яны цягнуліся да працы, каб стаміць, кончыць і ўкласьці яе ў падмурак чалавечай спрадвечнасьці, і так, каб яно, людзтва, мальгва забылася пра яе! Яно ж само і задыхваецца ў пылістасьці трупаў з тых, якія ня ведалі ў жыцьці ні радасьці, ні кароткае часіны шчасьця ці спакою!

Аблічча памерлай пачало сьвятлець — сама сьмерць зьнікала ў бялявасьці цела. Вочы, ледзь прыплюсьненыя, зацягнуліся шкляной каламутай... Шорахі ветру даносіліся знадворку. Кус неба ад водбліску вячорнага сонца бражавеў у прамежку расчыненых дзьвярэй падвала і ўрачыста асьвечваў аплыўшую на цэмэнтную падлогу вільгаць. На сярэдзіне падвалу кроплі віселі і на столі, цьмяністым скропваньнем цмокаліся аб грунь адолу...

Назаўтра Адамчык зноў завітаў у падвал. Выкапаў на двары яму і памог сьляпой перанесьці туды астанкі ейнай мацеры.

## 14

Палкоўнік Сконтаўт, як толькі даведаўся ад Арэмчыка пра баль, што мусіў адбыцца ў залі былой публічнай бібліятэкі, адразу, пачуўшы запросіны, парупіўся ехаць дадому. І пасяджэньня, зьбіранага Арэмчыкам, не чакаў. «Бо запрасілі мяне, куды ня трэба. Усё праз гэтую дурасьлівую Алену... памагай, навед-

вай. А сама каб жа паглядзела: я замацаваўся, як патрэбна і падходна чалавеку, ці мо' не?» — думаў ён і панукваў на старога Ахрэма:

— Паганяй! Паганяй! Не шкадуй — ня здохнуць. Стаяць кожны дзень!.. А прыедзеш, зараз жа перапражы коні, падмаж восі і айда назад, у Менск, каб не спазьніцца — сяньня вечарам баль... Ах, Ахрэм, стары ўжо ты — ня цеміш жарсьці маладога!

— Што вы кажаце, спадар?

— Ахрэм, запамятай: ня кліч мяне спадаром нейкім, а заўсёды кажы: пан палкоўнік... Тут людзі іншыя.

— Не забудуся, калі не забыўся дагэтуль... Але пан палкоўнік кажа: маладосьць не разумею — дык ці ж ты малады? Твая нябожчыца маці казала: «Барысочку дзесьці пад пяцьдзясят будзе...» Вось жа была памешчыца, а ня вы, кадзешныя!.. Потым вы кажаце: тут людзі іншыя. Дзе таму ліху паверыць і гукаць гэтак — усе яны, як мы: грэшныя, няшчасныя; вайна на ўсіх адной бядой цісьне. Мне толькі не падабаецца ў іх: занадта шмат любяць размаўляць і спрачацца. Адзін парабак учора, з пазволу табе паведаміць, нават агрызнуўся на мяне: «Мы вам у 1920 годзе кабыльны хвост паказалі. Паляк, дык і едзь назад! Няма чаго прыкідвацца беларусам!»

— Няўжо яны думаюць: мы — палякі?.. Ведаеш, Ахрэм, ты не даводзь, што мы беларусы, лепш цаляй хітрэй: замоўкні, бальшавік, мы немцы ёсьць! Ты разумееш мяне?

— Хітрасьць — мудрэй за мудрасьць, пане палкоўніку, але ці мне, старому чалавеку, зь імем наскім заступляваць сябе немцам, як вы зрабілі?

— Дурны ты, Ахрэм!.. Падганяй!

Ахрэм не супярэчыў палкоўніку. Сьцебануў коней і засьпяваў нейкую маркотную песьню з словамі яму аднаму чутнымі — ён перабіраў іх памяцяй.

На двор яны таксама ўехалі шпарка. Палкоўнік саскочыў яшчэ перад спынам цялегі і бадай пабег у памяшканьне. Алена ўбачыла яго, выйшла на ганак.

— Прынялі? Спадабалася ім?

— Ды ім спадабаецца і сам чорт — толькі валі з-за пляча, за дзякуй!

— Стане й табе!.. Палкоўнік Барыс, я не салдат, гавары са мной парадачна...

— Я прызвычаены да гэтага.

— Ужо час адцурацца твайго прызвычаю.

— Добра, Алюся. Чаго ты раптам у сварку із мной?

— Плоціцца, палкоўнік, як зарабляецца.

— Алюся, нешта скажу добрае. Сяньняшнім вечарам будзь із мной як жонка, няхай пазайздросьцяць мне… Сяньня на баль паедзем!

Алена зраўнаважылася: яна чакала канца размовы й жадала, паслухаўшы палкоўніка, накінуцца на яго з лаянкай, але якраз канчатак гутаркі абвясьціўся іншы. Тады яна, каб усё-ткі ня здацца, сказала:

— Вы, палкоўнічак, найперш спытайцеся, ці паеду я.

— Алюся, я ж прывёз запросіны. Уяві: запросіны ахвярадаўцу Самапомачы ў Менску… А потым, мы ж паедзем, а ня пойдзем.

— Хай па-твойму будзе. Але скажы Гані таксама зьбірацца.

— О, так, Алюся, як жа безь яе!

Алена вельмі паважала наведваць усялякія сходзіны, зачопы і баляваньні. Нягледзячы на яе характар насупленасьці, яна была цягатлівая, каб паказацца сваёй беззаганнай прыгажосьцяй сярод абсудлівых і гаманкіх жанчын. Аднойчы Ахрэм, пакрыўджаны на яе, сказаў палкоўніку: «Штосьці яна ў цябе, бы зарослае возера: ні касіць, ні рыбу лавіць!»

Алена для ўсіх у двары заставалася камянём — і перашкодным, і патрэбным.

— Ты ж, Алюся, патурбуйся хутчэй убрацца.

— Я зараз — падганяй Ганю.

— А што ж мне апрануць? Без мундура паехаць вельмі нікавата.

— Калі не пазнаюць цябе, што ты палкоўнікам быў, дык тады я патурбуюся сказаць усім: пан Сконтаўт з былым рангам вайсковым: палкоўнічак.

— Усё кпіны ды кпіны, Алюся! А можа, ты засьцягнеш якнебудзь тыя дзюрачкі на мундуры? І трэба было ж напаткаць тога ваўкалаку! Зробіш, Алюся?

— Папрасі Ганю.

— Які я бедны!.. Я зраблю сам… А можа, аддала яго парабку?

— Не яшчэ, але зьбіралася.

— Алюся, паабяцай хадзіць на балі са мной пад руку.

— Абяцаю! Абяцаю!

— Дзякую, Алюся! Мой паветраны пацалунак табе — бачыш? Паеду без мундура.

— Вельмі добра, ён жа польскі!

Алена, супакойная і не кранутая ягонай любасьцяй, пайшла да свайго пакою.

— Эй, Ахрэм, не расхаджвайся па двары, а падрыхтуй усё па-людзку!

— Добра, пане палкоўніку! Вы толькі не адчыняйце вокны перад зімой: рамы скасеюць тады.

— Не твая справа — гаспадар знайшоўся!

— Цяпер не мая, а як сапсуецца — паглядзі, Ахрэм.

Ахрэм, не жанаты, пад шэсьцьдзесят пяць год, яшчэ здаровы і пры сваім чалавек, быў увесь час на службе пры матцы палкоўніка ажно да ейнай сьмерці, а па сьмерці астаўся пры сыне-палкоўніку, які даручыў яму даглядаць за парадкам і быць пры патрэбе возьнікам. Але найлепш Ахрэм паважаў памерлую, а пра сына паміж працаўнікамі маёнтку без маруды, на другі дзень прыезду туды адклікнуўся зусім ня ветліва, распаўсюдзіў: «Ах, братцы, нейкі ахлысьцень ды ўсё!..»

Пасьля перакіды словамі праз вакно з палкоўнікам ён накіраваўся пад павець. Намазаў дзёгцем восі старой брычкі з палапленай над ёй будкай, перамяніў збрую на конях, выцер мурагом на іх пот, даў ім аўсу.

— Справяцца — ежце, — загугнявіў Ахрэм. Апошнімі гадамі ён любіў пагутарыць з сабой або з коньмі. — Бачыш яго — нешта хлыснулі там сярод развалінаў, і ўжо едзе… Ежце, бо на мяне забыліся — не паклікалі есьці. Праклёну няма на іх! Тая цытра, хто яе ведае, ці была калі паняй, сама ўсё скобліць, варыць, дзе ж даступіцца да яе. Уваліся ня ў час на кухню — о, не, Ахрэм, паклічу, пацярпі! І кліча! А як, браткі, жылося пры нябожчыцы — цароў зь ёй хаваць у адной капліцы — от дзе была жанчына! Даўней, калі памёр яе мужык на нейкіх курортах, — пакліча мяне ў каморачку, у тую, што ад лесу і ад вока людзкога, і скажа: «На, выпі, Ахрэме, — можа, укісла?» — пытаецца сабе, а я не па боскаму чмыхну перад ёй у нос: «Але, ваша зіхацельства, прыкісла і дзярэцца ў горле, як кляновы сядзёр». Ах, браткі, жыў! Жыў па-свойску — не крыўджуся. Яна, мабыць, была закаханая ў мяне. Яй Богу, не памыляюся — кахала! Сама не старая была, і я сам не стары яшчэ, цепрасьць чулі ў целе. Ды я ўсё-ткі чакаў, калі скажа мне: «Ахрэм, давай ажэнімся…» А яна, відаць, неадважнай нарадзілася — не сказала мне; састарэлася і памерла, а я, ліха на яе косьці, безь ніводнае прысваткі астаўся нежанатым. Бо ж навошта жаніцца на беднай, хоць бы і прыгожай, як вось цяперака ахлысьцень-палкоўнік. Ня той час!.. Называюць мяне возьнікам, даглядчыкам

двору, а шапку спэцыяльную ня купяць, каб бачылі: хто я і як зь ім гутарыць… Пакутныя — мы! Ежце, бо ж зноў паганю вас наўзавады, ня буду запрагаць другіх, бо няма як — яны ж з працы якраз.

Ахрэм хацеў пацалаваць белага каня, але Алена паклікала яго есьці.

— Апаматалася — баіцца, каб не зваліўся з праклёнага кукіша, што брычкай называе. На цыганскую будку пасьмешнік кажа: «Брычку падмаж!» Ежце, няшчасныя, дарога зноў!

У змроку першых часінаў ночы палкоўнікава залепленая лапінкамі брычка паказалася на вуліцы Менску. Адзіным жывым чалавекам, які яшчэ ішоў па вуліцы ў прасьцінку за горад і спаткаўся зь імі, быў Адамчык. Ён барзьлівымі крокамі сігаў па прасьцягу вуліцы да сваёй вёскі. Замарудзіўшы пры наведваньні сьляпой музыканткі, цяперака сьпяшаўся прадчасна пакінуць Менск, пакуль наступіць забаронены час хадзьбы ў горадзе. Палкоўнік здалёку пазнаў яго і, каб зноў ня бачыцца, адвярнуўся да Алены.

— Доктар пайшоў, — загаманіў ён да яе, калі Адамчык абмінаў іх. — Жыве на ўзьлесках з тым старым дурнем, што сабаку трымае, які ўкусіў мяне… Абяцаў яму ў Самапомачы да дому падвезьці, але я паехаў без адкладу, каб сказаць табе пра баль.

— Няўжо ён доктар? Ён жа як лесасек апрануты, — за ўвесь час язды да Менску загаманіла Ганя. Алена з прыглушаным захопам сьмеху і зьдзіўленьня глянула на сястру.

Брычка з грукатам імкнулася ў бясшумнасьці парожніх вуліцаў і развалін. Першыя рэдкія сьняжынкі, быццам палахлівыя, пачыналі прыліпаць да Ахрэмавага твару. Надыходзіла зіма.

— Пане палкоўніку, на санях прыйдзецца дадому варочацца.

— Ахрэм, падганяй, не разважай — яшчэ добры ўшчалопак ехаць.

— А мне пропуск не ўзялі — арыштуюць.

— Я атрымаю — не клапаціся.

— Вы ж атрымалі — а мне?

— Для цябе таксама… Пацісквай, Ахрэм, пацісквай. Да Самапомачы прастай.

— А дзе ж коні паставім?

— Ахрэм, падганяй, кажу. Там ёсьць брама і знадворак каля кладоўняў.

— Украдуць яшчэ. На мяса ўкрадуць.

— Ты ж будзеш у будцы спаць — ня ўкрадуць.

— О, дык песьні! Яны на вындрыгалы, у цёплым сабе… а я ледзяней.

— Падганяй, Ахрэм!

— Палкоўнічак, адчапецеся ад яго!

Арэмчык яшчэ быў дома, калі да яго пастукаўся палкоўнік разам з жанкамі. Той усё спрачаўся з дачкой: у што ляпей апрануцца, і злаваўся, што не прыпамятаў сакратарцы дзе-небудзь купіць або пазычыць вышываную беларускую кашулю. І вельмі зьдзівіўся з панібрацтва палкоўніка, зь якім адно толькі ранічай пазнаёміўся. Але, паважаючы ягоную мінулую вайсковую рангу й разьлік карыснасьці на будучае — нямецкага паходжаньня сям’я, прыняў гасьцей ветліва. Палкоўнік апраўдваў сваё завітаньне няведамкай, дзе знаходзіцца памяшканьне для балю.

— Па мяне ад Лібіца мусяць прыехаць… ня ведаю, як з вамі тады?

— Лібіц па прозьвішчы немец, а мы немцы таксама.

— Прабачце, гэр палкоўнік, фраў унд тохтар, я не пазнаёміўся з вамі — у гэтым вінен гэр палкоўнік… Можа, да гарбаткі падкія? Дык прашу. Без гарбаткі тут не абыдзесься — замoруць, але ўжо позна. Людцы, майн гэран, у Менску, як павучкі з павуціньнямі… Будзьце ласкавыя да столу.

— Не прасеце й не частуйце, гэр Арэмчык, — адказала за ўсіх Алена. Яна ўжо справілася ўвайсьці ў кірунак Арэмчыкавых вятроў. Мабыць, не дарма ў яе вачах сінь неба! А мо’ толькі ёй самой меркавалася, што яна ў здолі перамагаць адлегласьць да далёкай душы чалавека; маўляў, захапілася сьлепавата й ня хоча разьвітвацца з гэтай самаасабістай пераконай азначваць людзей, хоць ёй усяго дваццаць тры гады.

— І я, гэр Арэмчык, дзякую вам ад усяго сэрца… У мяне, гаспадара, ёсьць іншыя клопаты: як уехаць майму возьніку Ахрэму на занадворак Самапомачы? Там ён будзе чакаць нас.

— О, вы нават на файтоне?

— Але… — і палкоўнік падкусіў вусну над верхняй шарэнгай зубоў, падціснуў падбародач да горла.

— Чакайце, я зараз надзену кашулю… Ключы ад брамы ў мяне. Сяньня пасьля пасяджэньня забраў іх у гэтага Зорыча. Каб на яго рэдзька — такі несымпатычны ахлапень зь ямкамі на барадзе й на шчоках… нацыянальна-ідэйным называе сябе. Проста дакука, а не ідэя! Хутчэй куль саломы з гнілой страхі, чымсьці ідэалягіст!.. Ах, майн гэран, ня шмат часу маем, а трэба было б пагутарыць з вамі — кепскія ўражаньні ў мяне ад

менскіх пішчалікаў… А вось мае жанкі недзе запаўзьлі ў спальню й не вылазяць стуль. Прабачце, гэран!

— А як, пане Арэмчыку, з ключамі? — парупіўся палкоўнік напамінам.

— Я зараз — брама не за гарамі…

Неўзабаве з наступнага пакою пачулася Арэмчыкава лаянка.

— Спадзейся на вас, шэдых! Чаго прыціхлі, чумлівыя цыпачкі? Чаго? Заўтра адну й другую на вуліцу, дый хадзеце там!

— Чуеш, палкоўнічак? Ты ж вайсковы чалавек, — падышла бліжэй і шапнула яму Алена.

— А мне здаецца, ты шкадуеш мяне, калі дапікаеш.

— Ганя, калі чула гэтакае слова, наш палкоўнічак — стратэг.

— Адчапіся, сястра!..

Ганя не даказала надуманага. Яна была гатовая таксама сварыцца з Аленай. З пакою вяртаўся Арэмчык.

— Ведаеце, гэран, часам ваюю з дачкой і служанкай… Яшчэ не распакавалі дарожных клумкаў… Але будзе добра й гэтая кашуля,— улагодзіўся Арэмчык і спыніўся перад люстэркам. — Каб на іх пранцы напалі — іржавае люстэрка паставілі й думаюць — добра зрабілі!.. Паганцы тут, а ня людзі.

За хвілінаў пятнаццаць перад пачаткам балявання па Арэмчыка прыслалі легкавую машыну, забралі яго і, па ягонай просьбе, «сям'ю» палкоўніка Сконтаўта.

— А мае дык адмовіліся ехаць… Не апошні баль гуляем! Ключ ад брамы пакінуў дачцэ — адвязе вашага возьніка.

Пры ўваходзе ў публічную бібліятэку ў гасьцей забіралі запрашальныя карткі, надрукаваныя машынапісяй на гільзавай паперы, і давалі нумарок пакою і стала. На стале для кожнага госьця стаяла прырыхтаваная закуска зь дзьвюх скібак хлеба з прамежкам люмбэрскага сыру, сярэдняе вялікасьці бульбіна і памазаная слуцкім журавінным мармэлядам раскроеная булачка. Стоцьма паміж двух нумароў-месцаў высілася «сотачка» гарэлкі з савецкай маркай, захопленая ў менскіх кладоўнях.

У дзьвярох кожнага пакоя стаяла дзяўчына, забірала нумаркі й паказвала прызначанае месца. Усё было падрыхтавана ў нямецкі «рыхтык». У некаторых пакоях было гаворліва, але крыху ў куток, дзе знаходзіўся велікаваты пакой, было шумліва. Там жмудзіны, латышы й немцы, бадай усе маладыя і здаровыя, у нямецкай уніформе, выпівалі сваю долю; закусваў ня кожны, выходзілі й гурміліся на калідоры — чакалі сыгналу да танцаў.

Палкоўнік із сваёй «сям'ёй» таксама заняў месца, і калі прапанавалі наліць чаркі й выпіць за здароўе Гітлера й за будучую апеку нямецкага народу над эўрапейскімі народамі, Алена дазволіла яму зрабіць падрыхтоўчае — наліць у чаркі й абмачыць вусны, але выпіць не дазволіла.

— Паспрабуй выпіць — і я дадому ня еду з табой, чуеш?

— Добра, Алюся... Толькі сама не забывайся на абяцанае.

— Я не забылася... А дзе ж твой гэр Арэмчык? Уцёк?.. Ах ты, мой палкоўнічак.

Госьці несуладліва, перамешліва адклікнуліся на здароўе. Алена ў той час нахілілася да палкоўніка, пацалавала яго ў шчаку. Палкоўнік даторкнуўся вуснамі скрайка чаркі — ня выпіў. Аленіна пяшчотнасьць, падараваная яму на вачах незнаёмых людзей, шарахнулася праніклівай чуткасьцяй, ён зіхатнуў валогім позіркам на супроцьных за сталом гасьцей, паставіў чарку, далікатна крутануўшы яе пальцамі. Палкоўнік ня выдаў сябе — выцягнуў з кішэні хусьцінку — адмачыў вусны.

— Нешта, як з выцеклага вока, пацякло зь цябе?

— Алюся, не рабі зь мяне стрэльні — людзі тут... пашкадуй, — ледзь чутна адказаў ён.

— Нічога, палкоўнічак, можа, і я навучуся кахаць вас...

— Чаму вас?.. Але цішэй, Алюся, — ня будзем пра гэта.

— Яны ўсе заклапочаныя сваім — не пачуюць... А ты цяпер выпі. Давай разам, за нас, згодзен?.. А можа, за Арэмчыка, — крыкнем?

«Не рабі дурня зь мяне, — падумаў палкоўнік. — Абаб'есься... выцерплю дрызготку». І ў голас: — Чаго замоўкла, Ганя? Вып'ем, дружа.

— Безь мяне? Я ж першай прапанавала, а раптам вы да Гані... Давайце дзінькнем! Куды мне бяз вас? Прыярым дзяньніцу ў будынку.

— І насапраўды: куды безь цябе, — падтрымаў шчыра палкоўнік.

— Палкоўнічак, навошта скрыгацець, як камяні на млыне, іх можна падмачыць крыху — хай ціха будзе? Вып'ем за нас.

І яны трое выпілі.

Алена сваволіла.

— Нешта Ганюся надзьмулася на нас, ня гутарыць, закахалася, напэўна, — абсушваючы вусны хусьцінкай, прагаманіла Алена. Але Ганя надалей маўчала й назірала за гасьцямі.

Пасьля чаркі гарэлкі паміж некаторымі завязалася гутарка, знаёмства, паміж знаёмымі раней пачуліся тосты пажаданьняў.

Панавала настройная шчырасьць. Сям'я Сконтаўта не барзьдзіла знаёміцца з суседзямі па стале.

— Я вып'ю яшчэ, дазволь, Алюся. Ужо даўно, даўно было сьвята з гарэлкай.

— Я, палкоўнічак, жартавала. Сябрыня мой, нагбом, па самым дне келіх лізьні!

— Алюся, ты гаворыш, як той Арэмчык на сваіх. Не давай волю языку.

— Нічога, палкоўнічак, шчэ сяньня я пабаю табе, паслухаеш яшчэ!

«А можа, я і падобны на асьмешніка?» — падумалася зноў палкоўніку.

Ганя ў надару Алене сядзела маўклівая і прыслухоўвалася да ейнай гутарлівасьці. З сардэчнай журбой назірала за гасьцямі. Яна шукала сярод невядомых людзей прытульны ўшчалопак сваім мроям — закаханасьць у палкоўніка.

Неўзабаве ад некаторых гасьцей пачуліся гастраватыя й зусім дурнаватыя словы жартаў, што будрожылі сьмехам суседзяў і суседак. І аціхлі.

— Ахтунг! — аддалася галасная каманда, і шумлівых жмудзінаў, латышоў і дзясятак немцаў, што належалі да вайсковых адзінак СД, афіцэры ўшарагавалі ўсьцяж даўгога калідору. Зь верхняга паверху ў суправодзе ад'ютанта й Арэмчыка зыходзіў Лібіц. Лібіц памалу саступаў з кожнай усходкі. Госьці зь невялікіх пакояў з асьцярогай да шуму павыходзілі на калідор.

— Вось бы даверылі мне скамандаваць, ты б, Алюся, паглядзела, — шаптаў палкоўнік Алене й пазіраў на пашанотных гасьцей на ўсходках.

— Хайль Гітлер! — павіншаваўся Лібіц з салдатамі.

— Хайль! — адказалі яны аднолькавым вырывам скрыку.

Гэты ўскрык блізу ўсіх, хто прысутнічаў там, сплёў у агульную захопленасьць настрою. У кожнага і ў кожнай адгукнулася рэха мінулага юнацтва — прылучвалася меркаваньне зьдзяйсьненьня асабістай навагі ў будучыні. У той момант ня трэба было хадзіць заходамі сьцежак і цяньков — думкі прыводзілі да аднаго: або зь імі, або супраць іх, немцаў. А той, хто ведаў і пабяцаў свайму наканаваньню апынуцца супраць іх, адчуваўся мізэрным і ўсхваляваным, але захопным. Гэтакі найбольш назіраў за тымі, хто знаходзіўся побач яго, а не на ваякаў. Гэтакі вывучаў позіркі й захаваньні гурмы, прыгатаванай на ўсё ў розныя часіны штодзённага жыцьця. Гэтакія чуліся непакорна справядлівымі, няўхільнымі, як надыход дня пасьля начы.

Спатканьне Лібіца з салдатамі цягнулася не сьцягавата. Тады, калі ён і ягоны ад'ютант параўняліся з апошнім у шарэнзе, дзьверы вялікай залі бібліятэкі расчыніліся. Дзьве дзяўчыны, убраныя ў беларускую вопратку, шырока адвялі палоўкі дзьвярэй да сьцяны. У пралёце залі стаялі музыкі, і ўваход туды Лібіца яны сустрэлі фашысцкім гімнам. Ён і ад'ютант спыніліся перад музыкамі, як перад сьвятымі абразамі ў сьвятыні, суладна працягнулі ў пашане ўверх рукі.

— Я ня шмат часу тут, але вашых гасьцей таксама прывітаю, — сказаў Лібіц Арэмчыку.

— Усім будзе прыемна, гэр Лібіц, — пахвальна адказаў Арэмчык.

На калідоры зноў зашумела ад гутарак і сьмеху легіянэраў. Жанкі зноў барзьдзілі да залі. Адны былі апранутыя сьціпла, а некаторыя нават адпаведна на прырачоную ўрачыстасьць. Яны знаходзіліся ў прыкладзе асабістае волі, якая залежала ад іх прыгажосьці й спрыту, а не ад улады складак каштоўнай сукенкі, курты ці спадніцы. Адны згурміліся сюды на паказ і для заспакою цела, другія зь сьвядомасьцяй уласнае дасяжнасьці іхных мужоў. Гэтакім не было патрэбна пераконваць кагосьці прыгаством, яны лёгка пазнавалі вартасьць суседкі.

Алена, хоць і паабяцала палкоўніку хадзіць зь ім пад ручку, адмовілася ў апошнюю часіну. Пасьля пачастунку паміж імі адбылася заўсёдная, нягледзячы на абставіны й наветы, спрэчка.

— Ты ж, палкоўнічак, у галёшах — як ісьці з табой? Сорамна.

— Алюся, зіма маразамі пачалася, а ня летам... Ды яшчэ: падмётка адстае, ледзь ня хлюпае. Я не шавец — не падаб'ю...

— Ты ж нават не паглянцаваў іх.

— Я казаў Ахрэму, а ён не зрабіў...

— Ахрэм маладзец — свабадалюбец... Палкоўнічак, ідзі адзадзя мяне, але не за мной — чуеш?

— Ня трэба, Барыс... хадзем — я з табой! — наравіста прапанавала Ганя. Зьбялелая, з дрыготнымі вуснамі, уветлая й шчырая, як дачка бацьку, узяла палкоўніка за руку. — Хадзем, я не саромлюся!

А тады, калі ўсе сабраліся ў залі, Лібіц прамовіў:

— Прывітаньне беларусам!.. Я паважаю сказаць да тых, якія любяць мяне або ня робяць зло для нашае арміі... Мы — немцы, прыйшлі да вас, каб далучыць вашу Айчыну да будоўлі новай Эўропы пад кіраўніцтвам Адольфа Гітлера...

Плёскаты перарвалі прамову. Яны ж хутка і сьціхлі.

— Той, хто думае змагацца супраць нас, — сьмерць яму! Той, хто думае перашкаджаць нам, — таксама сьмерць!.. Вайна хутка скончыцца нашай перамогай і наш вялікі райх падумае над вашай будучыняй… Беларусы, падумайце пра новую Эўропу пад нашай апекай… Хайль Гітлер!

Кароткія, а зь некаторых далоняў, асабліва паміж легіянэраў, даўгія плёскаты хлысталі ў прастор залі згоду Лібіцу. Зорыч і Арэмчык адразу па прамове падышлі да яго й запрапанавалі ўдзячнасьць. Лібіц усьміхнуўся, махнуў вясёла галавой і азірнуў усяго Зорыча, ён пазіраў за ім і тады, калі той адыходзіў.

Сьвятло ў залі згасла, і на зьмену з-пад сьцяны на стаяках засьвяціліся лямпкі з жоўта-чырвоным сьвятлом. З гушчыні гасьцей дзынкнулі цымбалы, і ад боку, дзе сядзелі музыканты жандармскага аркестру ў Менску, адклікнулася піяніна. На прастор залі выбегла, бадай вырвалася з рук гасьцей, артыстка балету. Яна закруцілася ў клясычным вальсе. Ейная чароўна-мастацкая мітухня была размашыстая, пражорыстая і акрэсьлена-абавязковая для захапленьняў і пахвалаў. Муза руху магла знайсьці хараство і сярод галечы, і сярод разбураў і пагараў! Мужчыны выцягвалі шыі, жанкі насупліваліся, калі артыстка блізка круцілася каля іх. Вельмі ўторна вусны вузкага роту артысткі ружавеліся вясёласьцяй усьмеху. Прыгожае аблічча мільгацела, прападала ў агульным рытме постаці. І кончылася. Пад віхравей плёскатаў яна зноў зьнікла сярод гурмы гасьцей. Усе праводзілі, шукалі яе позіркам.

Шапатлівая шумятня, танец артысткі, музыка захоплівалі гасьцей усім зямным. Яно самым сычным спосабам набракала адчуваньнем існаваньня, і не находзілася ў ім нічога нікчэмнага.

Лібіц падзякаваў Арэмчыку і пакінуў гасьцей.

— Шмат музычнасьці й вясёласьці ў артысткі, але розуму, мабыць, з грош калёны… Цалёўка, выбітая з дашчанага замёту — яна! — выказала Алена свае меркаваньні палкоўніку. Ён стаяў за яе плячыма, трыманы за руку Ганяй. Музыкі зайгралі вальс.

— Ня ведаю, Алюся, — па-мойму, ты больш чымсьці на грош, хуліганіш…

— Барыс, жанкі запрашаюць танцаваць, — зьвярнулася Ганя.

— Сястра дарагая, скажы яму, няхай галёшы сьцягне — людзей не сьмяшыць!

— Плюесься, Алюся, на ўсіх — крыху ахамяніся! — папрасіў палкоўнік.

— Не крапай, палкоўнічак! Па-твойму, калі пчаліна носіць мёд, дык на яе й пляваць ня трэба? Гэта адно, палкоўнічак, а крыху пазьней я раскажу табе штокольвечы добрае. Будзеш слухаць?.. Ну ідзі танцуй, палюбуюся табой…

— Куды мне, Алюся, — азвычаіўся каля цябе… Ганя, пашукай другога, — зноў папрасіў палкоўнік.

Ганя пакінула іх. Яна жадала танцаваць, і хутка яе выцягнуты стан з пругім усхопам грудзей, з распушчанымі валасамі пад чорнай жычкай банту апынуўся ў крузе танцу.

— Алюся, — пачаў палкоўнік, — давай падыдзем да артысткі й скажам: вашай талярэнцыі пашана ад сям'і памешчыка Сконтаўта! Няхай ведае. Мо' калі да нас запросім, бо ж хутка ўладзімся на новым месцы…

— Ах, талярэнцыя ты, палкоўнічак! У Ібсана ёсьць сказ: «Ні гаротнасьці, ні спачуваньня, ні ўспамінаў не пакінуў ён». Ідзі, я пастаю тут, пагляджу збоку на маіх сяброў сям'і — усё да толку сяньняшнім вечарам, не мадзеюць… Ідзі!

— Алюся, я зьбіраюся клікаць цябе Арлеанскай дзеўкай — добра?

— А я жадаю быць Менскай! У нас Магілёвы да Менску збудаваліся… Ці жадаеш пачуць, палкоўнічак, хто ты й некаторыя тут, а-а?

— Кажы, будзе весялей стаяць з табой… Алюся, кахаю цябе, таму зношу твой зьдзек, прабачваю адразу.

— Палкоўнічак, ты ня ў тым ніту закрыпаўся!.. Лыжка вырэзваецца для стравы, а страва якая і колькі яе ў тэй лыжцы?

Алена ўзяла палкоўніка пад руку:

— Хадзем прыхілімся каля дзьвярэй, там ня гэтак цесна… А страва? Страва, палкоўнічак! Гістэрычкай хочацца быць і крычэць, і баіць! Ты бачыш, колькі сабралася нас і іх? Некаторыя пад'елі дома пад самы падбародач, некаторыя ледзь зацерушылі кішкі пацярухай — Лібіцавай спажывай. У гэтых парожнія страўнікі напэўна адгукваюцца рэхай танцу… І ў кожнага свая спрага ёсьць. Адны прыйшлі за здабыткам: будзем жыць, другія ад крыўдаў, але ў крыўдзе іхнай не было й няма цяперака свайго. Яны і астануцца крэтынамі, загнаныя ў клетку, або падлізакамі чужых пятак. Падлізакі таксама засумавалі па загонах-клетках, але загані ў сваю — навошта свабода?.. Латышом і жмудам — ня ведаю, што трэба. Малыя фігі заўсёды тыцкаюць каму-небудзь пад нос. А Арэмчык — галагуцкі пеўнік, люстэрка пераможцаў — яму патрэбна хітрыць, вадзіць крапі-

вой сваім каля голай сядалаўкі: гэтакая доля ягоная, каб упасьціся бяды на сваю галаву.

— Алюся, а ты хто?

— Я? Іх шмат!.. Мо' некалісьці й ты будзеш — людзі ў шчэлінках… вудкары!

— Паражнеча — ты!.. Хочаш быць Арлеанскай дзеўкай. Ты незнарок сказала: гістэрыка, гістэрычкай — талярэнтна не крыўдуй за гэта, бо ж крыўдзіш мяне без прабачэньня… Ах, Алюся, — найлепш ня будзем кратаць, што не пад нашу сілу й розум. Калі толькі дакучала гамазьня свая, паслухай маю. Я раскажу мой успамін з вайсковага жыцьця. Паходзім па калідоры — паслухай. Ня будзем пра палітыку — пакінь не жаночае!

— Вельмі цікавы дадатак! Але да выпадку — хадзем, паслухаю… Вальней, палкоўнічак, без падручак…

Палкоўнік ніколі ня мог адгадаць сваю Алюсю. Яму ляпей думалася, што яна паступова згаджаецца зь ім. Накіраваліся да змрочнага калідору.

— Аднойчы ў Варшаве, — пачаў даверліва палкоўнік, — да нас у полк прыехаў маршал Пілсудзкі. Я тады ня быў яшчэ палкоўнік. Прыезду ягонаму не спадзяваўся я, і маё начальства таксама. Але нічога, не бянтэжуся. Загадваю шэрангаваць салдат. Прыводзяць іх, дзе стаяў я і Пілсудзкі. Гутару, хвалююся. Ды раптам мне падшыбла ахвота скамандаваць самому, бо ж вельмі хлёстка выглядалі салдаты. Прашу прабачэньня ў маршала і ў яго ад'ютантаў… Я калісьці, павер, Алюся, мог камандаваць ня гэтак, як ты бачыла тут. Куды лепш, непараўнальна лепш! Калі цокну каманду, дык ажно дамы зыдрыгаюцца!.. «Направа вруць!» — скамандаваў я, адышоўшы на колькі крокаў ад маршала. Усе раз — і зрабілі. Але адзін недарэка, з тваіх шаноўных крэсаў, узяў ды кругом цок, і стрэльбу нават як да наступу цокнуў…

— Чакай, палкоўнічак, дазволь мне дакончыць. Я па-свойму скручу сьвісьцёлачку. І пачну таксама, як ты, з слова «аднойчы», — прапанавала Алена, як быццам ад яе патрабавалася рызыка для чагосьці велікома-добрага. Палкоўнік цягануў шыю ўверх, потым пакратаў ёй на бакі — ён такім шляхам паважаў папраўляць каўнер кашулі, каб не парушаць манэру захаваньня: ніколі ў грамадзе не бярыся за каўнер кашулі.

— Аднойчы ў Луках жыла бабулька… Не! Ня гэтак. Бабулька-палячка, адзінокая й бедная. Я ведала яе… Вось аднае раніцы на маё пытаньне да яе: «Як вам, пані, удаецца пры вялікай радоўцы атрымаць паёк першай?..» — яна павучыла мяне:

«Пані, калі бачыш шмат людзей у чародцы, дык пасмуродзь ім адзін дзень, на другі таксама, а на трэці скажуць: прапусьцеце гэтую сьмярдзюку без радоўкі, няхай не смуродзіць тут!..» Людзі вельмі хутка спраўляюцца не любіць цябе аднаго, а ня тых, хто ненавідзіць усіх…

— Алюся, якая ты цынічная! Да чаго ты вернеш? Ты не была гэткая. Што з табой?.. А-а, спадару Зорычу, мая пашана, будзьце знаёмыя з маёй паловай.

Зорыч, выйшаўшы з залы танцаў, накіроўваўся да дзьвярэй, на выхад.

— З шчырасьцяй, пане палкоўніку!

Пазнаёміліся. Зорыч загутарыў да Алены:

— Сяньня ў Самапомачы пан палкоўнік гаварыў пра вас… Я вельмі ўдзячны спадарыні, што вы парупіліся дапамагчы нам. І ў будучым будзьце добрымі не забывацца пра нас…

— Даруйце мне! — уветліва папрасіла Ганя. Яна падышла і зьвярнулася да палкоўніка: — Я зноў за табой — танцаваць хачу. Калі ласка, не адмаўляй цяпер… Той салдацік, зь якім танцавала, вельмі блажэнькі… Калі ласка, Барыс!

— Хадзем, Ганя, — цяперака не адмаўляю… Спадару Зорычу, пагутарыце з маёй каханай!..

— Дзякую, зь вялікай ахвотай!

Алена ўсьмешліва паглядзела ўсьлед палкоўніку.

— Барыс, сьцягні галёшы, — прапанавала Ганя, — і пастаў іх за дзьвярыма…

— О, праўда, Ганюся! Вось бы няхай і твая сястра сказала гэтак, дык не… — і палкоўнік патурбаваўся схаваць ад Гані ўсхваляванае аблічча.

Алена засталася з Зорычам на калідоры. Яна, як жанчына выходлівая й вельмі грамадзкая, пачала гутарку першай. Яе прыгаство, прызвычай такту з упершыню спатканым чалавекам заўжды выклікалі адчуваньне захопленасьці: глядзець, слухаць і паважаць яе. Бадай у кожным ейным руху і позірку спакмечвалася штосьці вяліка-прысутнае і скончанае ў знаходжаньні абавязковасьці да чагосьці добрага і справядлівага, але чарнабожна заўважалася кожная неасьцярога ўгнявіць яе. Ейны від смутнасьці, напэўна, прыносіўся наявай разьліку кагосьці пашкадаваць ці паспадзевіць, бо ёй заўсёды думалася, што сьвет увесь апанаваны журбой, і часіну радасьці можна здабыць толькі празь ненадзвычайную мужайнасьць чалавека. Яна сама стварыла ў сваёй душы празрыстае пачуцьцё любові й спагаднасьці; яна, прыгожая, смутлівая жанчына, жадала прыручыць неасвоеныя тайкі ходаньня за жыцьцё. Але ў сваіх гадох перад жыць-

цём яна была дзіцянё, насьледнасьць бацькоў, калісьці змагарных і прагнучых свайго, якія ж і сьціхлі ў безгалоснасьці таго магчымага, але недасягнутага ў іхным жыцьці.

Зорыч, малады, добра складзены станам мужчына, спадабаўся Алене яшчэ тады, калі яна ўпершыню пачула з кульгавай на выданьне газэты ягонае прозьвішча, даведалася пра ягоную працу ў Самапомачы, і кадзе пры спатканьні зь ім ён аб'явіўся ёй большым, чым пісалася ў газэце. Зорыч быў з тых, хто не абцяжваўся мальбой захопнасьці нацыянальным як ідэяй, яно жыло ў ім народжанай існасьцяй ад часу ягонага зьяўленьня на Боскі сьвет. Ён не адчуваўся вучнем, а працяжнікам справы свайго народу. Яно ўсё зь ім з маленства, разам з пачаткам разуменьня: ягоная краіна існавала дзяржавай, гісторыяй, культурай і нацыяй адналіту.

Пяшчотліва гучэла мэлёдыя танга. Шумятліва шасьцелі ступяні гасьцей у танцы і разборліва далятаді на калідор.

— Яшчэ няшмат, як я тут, каля Менску, пасялілася. А пакуль, спадар Зорыч, агледжуся ў сваім двары, буду дапамагаць пакрыху. Але можаце спадзявацца на маю памогу заўсёды. Там тое-сёе расло, пакуль прыехала туды.

— Вельмі ўдзячны вам!.. Але ад сяньняшняга вечара я ня буду кіраўніком Самапомачы, гэтую ачалу на цэлую Беларусь зойме Арэмчык.

— Я знаёмая зь ім… Да вашае даведы, Арэмчык не падабаецца мне.

— Ад заўтрага працую ў Самапомачы для сталіцы. Праца больш удзячная, але, можа, панурая.

— Я і жадаю дапамагаць мянчанам.

— Тады нагодліва асталося шчыра дзякаваць вам! — Зорыч, як саромлівы хлапчук, правёў кончыкамі пальцаў навакол вуха, барытоністы голас зрабіўся больш выразлівы ў картавасьці літары «р». — Мне ўдалося ўмовіцца з Арэмчыкам: кіраўніцтва дзіцячым домам пакінуць за мной. Люблю дзяцей, бо сам быў сірата. Сабраў іх шмат. Галадуюць маленькія!..

— Была й я бадай гэткай… Я памагу вам. Выхітру перад немцамі — наш Ахрэм прывязе мяса, — паабяцала Алена. — Я веру, вы ў здольнасьці захаваць таёмнасьць: я паахвярую мянчанам на мяса два маладых, сытных кані.

— Ня ведаю, што вам сказаць… аднак прабуйце, мо' немцы не даведаюцца.

— Ніхто ня будзе ведаць, спадар Зорыч. Наш Ахрэм прывязе іх на знадворак Самапомачы мясам — вось як! Коні немаль мае ўласныя. Гэта можна зрабіць нат сяньня… хаця ня будзе на

чым дахаты даехаць… А чаму ж вы не танцуеце — прабачце за цікавасьць? — Алена разумела неадпаведнасьць пытаньня, але хацела ведаць больш, хто перад ёй.

— Не люблю танцаваць, а раз не люблю, значыць — ня ўмею… Дадому іду… Я тут ні пры чым, бадай змусілі прыйсьці сюды… — няскратна адказаў Зорыч.

Музыка заціхла. У залі загаманілі, разьнёсься галасісты сьмех.

— Вось і мае ідуць! Натанцаваліся?.. Дарагія, на сяньня хопіць для вас, ужо час дадому зьбірацца.

— Гэта самае і я думаў… Замарыла Ганя! — і палкоўнік, спыніўшыся каля Алены й Зорыча, ціскануў і патрос Ганіну руку. Ганя, не смутлівая, а шчасьлівая ды вясёлая, расьсьмяялася ў адказ.

— Мне таксама не падабаецца тут, неяк, бы ў стадоле, мекшуцца, хахочуць… паехалі дамоў! Я тым часам з Арэмчыкам разьвітаюся, — прапанаваў палкоўнік.

— Куды табе? Арэмчык, Лібіц і тая артыстка на другі паверх пайшлі… Не круціся… Галёшы не забудзься ўзяць.

— Алюся, ты ўсё прыгледзіш, — паспрабавала Ганя абараняць палкоўніка й дадала: — Галёшы нехта ўкраў.

Выходзячы на знадворак, малады, прыгожы жмудзін у вопратцы нямецкага СД ветліва прытрымаў дзьверы, пайшоў таксама разам зь сям'ёй Сконтаўта й Зорычам. З захаваньнем вонкавай дасяжнасьці, безназоўны, як часьціна якога-небудзь дакладнага інструмэнту, салдацік вельмі часта ўторваў праходкі па калідоры паўзбоч Зорыча й Алены… Ён не абмінаў Сконтавых і Зорыча, памалу адзадзя моцна ступаў на кожную сходку шырокага ганку. Ганя, заўсёды дапытная, азірнулася на яго юнацкае зацёмленае аблічча. Ён умеркавана-напорыстым позіркам паглядзеў на яе. Вогкія, але больш часьцейшыя першуны-сьняжынкі спадалі з павалокі ночы. Зямля, нібы абсыпаная пялёсткамі белых красак, усё яшчэ выстаўляла з-пад іх свае чорныя плямы. Руіны, цямнейшыя за ноч, рабілі прастор цемрадзі цесным.

На вуліцы ад бібліятэкі жмудзін-салдацік зьвярнуўся да Зорыча:

— Зінд зі Зорыч?

— Іх вісан ніхт, — пажартаваў Зорыч.

— Іх вайс шон, — і жмудзін-салдацік, гэты худзенькі, блізу што перацісьнены дзягай, спакваля выцягнуў з кішэні пісталет і тады, калі Зорыч ахамянуўся й хацеў абараняцца, ён стрэліў яму пад грудзі і ў галаву.

15

Алена не магла зразумець, чаму наводле, як забойства Зорыча, глыбее на сьвеце ў аднолькавай моцы. Чаму людзтва супакойваецца ў гэтай фізычнай і маральнай абмежаванасьці — забойства, бы справядлівы суд аднаго над другім? Нават дэман не забівае, а толькі забаўляецца аскепкамі няўдалых пачуцьцяў у чалавека. Але Аленіна душа, схіленая браць да сябе ўсё ненадзвычайнае аддзельнасьцяй сьвядомасьці, усё-ткі была толькі жаночая лагода супроць чалавечае неразумнасьці й дзікацтва. У сваім яшчэ недаўгім жыцьці Алена справілася адчуць пакутлівую сьмерць бацькі ў засьценках польскае дэфэнзівы і прадчасную сьмерць мацеры, таму цяперака яна знаходзілася ў безабароннасьці перад ураженьнямі гвалту над жыцьцём Зорыча. Прызвычаеная да жалю і шкадаваньня іншых, яна магла толькі параўноўваць нядолю з сваёй асабістай, пакідаючы той нядолі быць незалежнай не ад яе, не ад тых, каго шкадавала. Яе душу гладзіла непрайменнасьць розуму, а сэрца, нібы дадатак да душы, адстуквала сумленнасьць у розуме…

Палкоўнік бачыў хваляваньні Аленіны, але спаткаўшыся пры абедзе, не адважыўся папрасіць у яе дазволу зайсьці да ейнай адпачывальні, каб пагутарыць у беспрысутнасьці Гані. Ён таксама аж да наступнага дню пасьля забойства не выходзіў на прастор сялібы. Увесь догляд за гаспадаркай даручыў Ахрэму, а сам усё часьцей і часьцей хадзіў па калідоры і, не спыняючыся, паўходам, зазіраў праз шчылінку ў дзьвярох да Аленінай адпачывальні. Ад нэрвовасьці суха чмыхаў у нос. Ён бачыў, што Алена ў начной накідцы сядзела ў ложку, акрыўшы ногі коўдрай, набірала коўдру ў жмуткі, а потым, зусім не назіраючы за гэтым, вызваляла іх з комку, або ўчалопліва глядзела праз вакно на знадворак. На знадворку сівер пакручваў негустыя сьняжынкі.

Ганя таксама ня сьцерплівала — выходзіла з свайго пакою, ішла наведаць Алену. На калідоры пры спатканьні з палкоўнікам, як і надашні, ейнае аблічча зноў і зноў загаралася нявыказам неспакою. У той дзень у Гані зьявілася прысутнасьць пачуцьця несьвядомай здольнасьці ахаваць сваю кволу пяшчоты да сястры ды палкоўніка. Яна, мабыць, ад наведанасьці гэтага адчуваньня некалькі разоў не абмінула пацалункам смутнага палкоўніка.

Забойства Зорыча ў Аленінай душы было мальбой-дакараньнем і ўявай: як спаткаюць гэтае здарэньне ўсе тыя, хто яго ве-

даў? У Гані толькі спагада сястры, якая ад перапалоху адчувае сябе нездаровай.

— Як Алене: ляпей ці горай? — пытаўся палкоўнік у Гані, як толькі яна выходзіла з адпачывальні. — За лекарам, можа, паслаць?.. Ды нарэшце, што кажа яна сама?

— Ах, Барыс, не хвалюйся — усё будзе добра!.. Яна нічога ня кажа і ня просіць. Перапалохалася, дык і захварэла.

— Гы-ы-м!.. А пыталася, чаму не пускае мяне да сябе, ці, можа, загаманіліся, сёстрачкі, — забылася?

— А як жа, Барыс! Але яна ні гуку ў адказ. Ці ж яно сёлета ад Алены?.. Прызнацца табе, ня дай Бог ліха, была б радая, каб яна крыху паляжала… Ах, што табе казаць, Барыс! Мне жадаецца хоць бы аднойчы адчуцца гаспадыняй і рабіць у хаце як уздумаецца… Калі б ты еў сухія скваркі й хрумстаў, я не злавалася б, і ніколі не спрачалася б з табой, і ня гнала б памагаць Ахрэму — няхай бы ён даглядаў за ўсім, а ня ты… Я была б ня гэтакая, як Алена, — выказалася Ганя з спакметным хвалянаньнем на вуснах і ў голасе. Ёй здалося, што напаткалася часіна, калі яна мусіла не стрымацца ад шчырасьці да палкоўніка.

— Ты, дзяўчаро, цішэй — сястра пачуе.

— Я жадаю, каб яна пачула — не асьцерагай мяне!

— Ганя, ідзі й прыбяры ў кухні — там шмат судзьдзя нямытага.

— Я? Прыбіраць у кухні?.. О не, мой каханы, я ня мнішка! На гэта ёсьць Ахрэм…

Палкоўнік крутануўся, чмыхнуў у нос, бакавата паглядзеў на дзьверы Аленінага пакою, пайшоў у свой габінэт і там адразу прылёг на скрыпучую канапу. Яму так жадалася наведаць Алену, каб пагутарыць і выказацца ёй у самых найлепшых словах спагадай і спадзяваньнямі здароўя, аднак аніяк не знаходзілася навету. У закаханасьці, а мо' часткова ад прызвычаенасьці, яму было самавіта слухаць кажнадзённыя Аленіны кпіны й насьмешкі, а тым днём ён якраз ня слухаў іх, таму й адчувалася, што чагосьці не дастае ды, бадай, зусім няма.

Надышла ноч, палкоўнік усё ляжаў на канапе. Яму не хацелася спаць. Ён ніколі не пакутаваў бяссоньнем, а цяпер яно натрапілася — сьцігавала яго ўсялякім цяперашнім ды мінулым жыцьцём.

— Як сапсута маё жыцьцё, — думаў ён. — Я адмовіўся ад яго дзеля яе. Яна чаруе мяне ахвотай чакаць і цярпець… А мо' я не кахаю яе? Можа, толькі жаданьне завалодаць ёй зрабіла

мяне нядбайным да сябе?.. Ах, Алена! Навошта цікавіць мяне сваімі вычмурамі-залётамі да чагосьці сьветлага ды магчымага? Што прынясе твая ахвярнасьць іншым?.. Алюся, кінь адчувацца вынаходніцай нейкай згоднасьці ў жыцьці, бо ж ці лёгка ў мякіньніку знайсьці ўсходлівае зерне, а калі хочаш гэткае: сыпні мякіну на зямлю, прарастуць — убачыш… Алюся, жыцьцё — кароткае! Прымі яго й любуйся ім! Ды яшчэ падумай пра мяне, пра шчасьце ў гурце сям'і… Як кадзе, я ніколі ня думаў — мабыць, гады пачалі палохаць мяне: не дваццаць ужо, а больш… Але ж ці скажаш ёй аб рэчах, на якія можна абаперціся ў жыцьці — яна ж напэўна агрызьнецца з цынічнай пяшчоткай: а-а, мой палкоўнічак, як ад цябе мерцьвяком тхне, лепш ня бай, замоўкні… Цяжка з табой, Алена! Некалісьці ў набытку навальнасьці ты, мая дачухна, апамятаесься, але будзе некаму прыгожа й шчасьліва, а не табе. Можа здарыцца, дзесьці бяз крыжу будзеш гніць… Ву ты, праклённая! Навучыўся шпурляць словы, як і яна… Чалавек я бывалы, а вылупіўся скіднем!

Устаў з канапы. Але не перастаў думаць пра сваё жыцьцё, што апынулася, бы ў нейкім гнязьдзе, дзе не спадзейся выпадку, дзе, як ні варочай развагамі, нічога не даможасься, нічога не агарнеш нат прокмецяй позірку.

— Ну, прыкладам, учапіцца за гэтую скакуху Ганю. Прынамсі, зрабіў. Дык немагчыма: я запісаў з Аленай шлюб… Ганя пекная дзяўчына, казаць нечага, але ж маладая. Праз год, глядзі, здрадзіць. Задаволіцца, агледзіцца, што ня ўсё са мной канчаецца, і скажа, расстаючыся: бывай, бяз добрага слова. І зноў пакутуй, зноў круціся, як сонца за хмарамі.

Перамешваліся, прыходзілі да палкоўніка ўсялякія думкі. Нават сярод іх упершыню, з агідай успомніў адну варшаўскую вулічніцу, зь якой блізу году жыў як з жонкай, якая прыходзіла да яго на спатканьне ў запляваную харчэўню, садзілася яму на калені й доўга яго цалавала. Штосьці, наводле таго мінулага, ён знаходзіў і ў юнацкай захопленасьці Гані да яго.

— І ты, дзяўчаро, прыгоднае толькі для гэтага. Ты, відаць, не нарадзілася з сэрцам сястры. Але калі разабрацца па-справядліваму: мо', падхапіўшы тваё жаданьне, я здолею вярнуць маё жыцьцё?.. Жыцьцё! Жыцьцё — таксама павучыўся торыць у Аленін сьлед — парожняе слова!

Ад бяссоньня рэзалася ўваччу.

— А можа і прыкінуцца за Ганяй? Алена ведае пра гэта й глядзіць на ўсё навочна дзеля свайго супакою… Вось надума-

нае прыйшло б заўтра, як я спраўлюся з Аленай? Бо ж куды ні кінься: запісаны зь ёй? А брацьразвод, дык тады двор не ўтрымаць — можа, аб'явіцца ейная хлусьня фольксдойцтва... Вось жа пакута! А можа, Алена каго-небудзь кахала й кахае? Нештачка ў наўках гэнае лісіцы затаёна, нешта бруніць пад яе скабкамі!.. Ах, Алена, якая ты наўда жыцьця!

Апошняе надуманае палкоўнікам пагаджалася зь ягонай развагай і не пагаджалася. Але ўрыў гэтага падозраньня авалодваў ім.

— Пайду і спытаюся — трэба настойным быць. Чаго валаводзіцца? — шапнуў палкоўнік. Апрануўся, накіраваўся да Аленінай адпачывальні. Пастукаў.

— Хто там?

— Я, Алюся.

— Чакайце, я засьвячу лямпу.

— Не турбуйся — добра і ў пацёмках.

— Я зараз... Пацёмкі ня кожнаму добра.

«Не, яна ня злосная... А мо' дарэмна пачынаць?» — ненаемна да нядаўніх наўмераў памеркавалася палкоўніку.

— Уваходзь.

— Як табе, Алюся?

— Нічога сабе... А чаго ж, паніч, шлэндаецца — спаць пара? — спыталася Алена з такой дарай абыякавасьці, што палкоўнік застыг у нерашучасьці. — Чаго ж маўчыш, палкоўнічак? Разматвай сваё ліха-ніткі... Што ж накарэла на тваёй душы?

— Алюся... я хачу спагадаць табе.

— Мне?.. Няўжо яно так патрэбна?.. Ах, мой палкоўнічак, навошта стамляцца гуканьнем — ідзі сьпі, адпачывай.

— Алюся, пераніцуйся. Чаму не жадаеш зразумець, што я... я...

— Што, палкоўнічак, што зразумець?

— ...што я кахаю цябе!

— Дык тады належыцца табе — кахай!

— Калі не каханьне, дык хоць павага...

— ...і целам належаць табе?

— Сьмяесься, Алюся?.. Сьмейся! Можа калі, як высахлы грыб, на каго-небудзь наніжасься, тады ўспомніш мяне, але позна будзе, вельмі позна!.. Тваім жаргонам тлумачуся табе...

— Лета прыйдзе — сваё цела кажухом будзе!.. Не вяшчуй, даражоны, майму жыцьцю страхі.

Алена крыху ўзьнялася на пасьцелі й шчыльней ахутала коўдрай ногі. Сплеценыя ў адну касу валасы, што абвісалі на грудзі, яна адным махам адкінула на плечы. Плечы і паўнаватыя грудзі паказаліся з-пад накідкі. Іхная гладзістая, пульхная прыгажосьць выставілася палкоўніку бадай сьвядомым здуменьнем для яго позірку, яму, мужчыну.

— Слухай, палкоўнічак, толькі не палохайся, што скажу табе.

— Я не палохаюся. Я не варона — тая ад сполаху падымецца й паляціць шукаць падлу… Твае словы ўторваю.

— Замудротна й не зусім адпаведна, сябёр: адляціцца й будзе чакаць, пакуль ты адыдзесься стуль… Але вы, палкоўнічак, можа, і не памыліліся: вы на сваім шляху ўгрузьлі, папаліся ў дрыгву…

— І ты думаеш: я захлынуся ў дрыгве?

— Не! Вам пакідаецца адно: пахрабрыцеся вызваліцца ад заляцаньняў да мяне — вось і ўсё. Зь мяне ня выцягнеш таго, што справіўся выцягнуць зь іншых. Скарабаціўся ты каля іх!

— Алюся, гэта і жадала сказаць мне?

— Не, палкоўнічак! Ідзі лепш спаць, а то напэўна паспрачаемся й ня будзе каму заўтра сьняданьня прыгатаваць… Пакінь мяне!

— Мы зашмат дзяцінімся, Алюся.

— Няхай, мой сябёр! Калі-небудзь пагутарым больш, і больш міла, а сяньня ноччу магу сказаць усё, і налета не астанецца чаго пабаіць табе…

— Ты і налета зьбіраесься муціць мяне?

— Не!.. Ідзі спаць. Спадзейся на добрае.

— Не жыцьцё, а пекла — спадзейся!..

— Дабранач, любы! Дабранач!.. Спадзяваньні — ня грэх!

Палкоўнік выйшаў, злосна стукнуўшы дзьвярыма Аленінай адпачывальні.

16

— Што будзеш рабіць зь некультурнай, чмяклівай жанчынай? З адным і тым гоманам! Ды ці магчыма знаходзіцца побач ейных адвольнасьцяў?.. Ці мо' пакінуць усё, што здарылася, як ёсьць і пачаць тое, што даецца лёгка, і будзе яно не знапраску? — быццам упершыню думаў пра гэта палкоўнік. Ён, будучы калісьці чалавекам з адказнасьцяй у паважнасьці вайсковай справы, мусіць рабіцца цяпер бы нейкім падмайстрам у сялянскай жанчыны. Не! Ні за што — ужо шмат адступаў! Няхай чаруе сваімі дзівоснымі складкамі цела, але не мяне, а некага

больш сшурпацелага ад бываласьці сярод гэткіх прыгожых! Палкоўнік не зьбіраецца быць пярэслам у сялянкі — апрыкла нарэшце!

Як сорамна, што прызнаўся ёй у каханьні!.. Але ж, папраўдзе, яна й давяла мяне да гэтага, хоць і трымаў на ўвеце іншае — цягнуўся да звычайнага, ды не туды папаўся. Сеў на чалесьнік — не варуся, не пякуся, — напэўна сказала б яна. Не! Няхай кончыцца тое, што нельга працягнуць ад пачатку аж да канца… Я ўсё-такі мужчына яшчэ залётны, бо ж чаго льне да мяне Ганя?.. О, пане палкоўніку! Якія нікчэмныя думкі ўсяліліся табе ад гэтае халопкі: чалесьнік, каслаўка, чапец, чаровец льняны — тор іх і чыншу ад дзяржавы не палохайся! Любі ейныя словы.

Лямпа, напоўненая шкіпідарам заместа газы, якой нельга было купіць, закапціла шкло й пачала смуродзіць нагарам. Палкоўнік паморшчыў нос, адчыніў вакно. Прыходзіцца самому выконваць такія абавязкі. А калісьці адзін гук: эй, Антэк!.. І табе зроблена ўсё.

Ад гэтага ўспаміну ён ажыў. Зь вялікай сьвядомасьцяй уцехі ўспомніў уяўна некалішнія часіны бесклапотнай будзённасьці. У той ашчадзе ўспамінаў можна было пажыць, наслухацца. Яны не поўнілі ягоную душу натхласьцяй, а толькі шкадаваліся ім, бо гэта апынулася каля яго не прычынай наканаваньня, а самай звычайнай мернасьцяй жыцьця й імкненьня. Яму ў жыцьці апрача мундзіра, хоць бы лесьніка, нічога ня трэба! Яму неабходна зямля, дзе ён здолеў бы кінуць свае сямёны на вырaст, і яшчэ: не меркаваць аб нейкіх прымусах звароту да кагосьці за чымсьці патрэбным для існаваньня. Разабраўшыся, палкоўнік ня быў цацкай з шнуркамі-цягункамі. Ён жыў чалавекам з усім даверам асаблівасьцяў жыцьця. Як у іншых людзей з рознымі парываньнямі й мэтамі, у яго маглі быць собскія спосабы перакананьня.

Палкоўнік абапёрся на падаконьнік. У расчыненае вакно ўлятала парожняя сьцюдзёная струмень холаду. Ён не заўважаў гэта — успамінаў аджылыя дні. Вось здараецца нешта нарсьцівае, і ты мусіш укорвацца яму, бо ведаеш: жадаю жыць! А жыцьцё — пустыр пустыром, нават чабор не расьце там!.. І зноў да прыгожага: прыгожае ўзрошчваюць і на пустырох-пясках… Цяжкая праца адольвае што-небудзь благое добрым. І ня гэта зьбіраўся абмеркаваць палкоўнік. Сярод неразборлівых раздвоеньняў ад цяперашчыны сярод абы-як запамятаных нейчых сьлёзаў, сярод чародкаў напатканых добрасумленнасьцяў ад

Алены ён, як сьвятар падчас маленьня, трымаўся аднаго звычаю набажэнства. Але той мо' адпраўляе набожную ўрачыстасьць без пачуцьця прыемнасьці — наймаверна зацікаўлены вонкавасьцяй прыкладу для агульнага радзеньня, затое палкоўнік тым мінулым хваляваўся і аддаваўся ўсёй чысьцінёй сэрца й розуму. Яму было дастаткова той пярэспы сярод прычасьцяў Аленінага цьвяленьня і ніякаватасьцяў. Але ж яно, здаецца, раздвоістае ў справядлівасьці, прынукала палкоўніка падумаць канчаткова пра зусім іншае. Замест уяўленьня, як ён праходжваўся па вуліцы Маршалкоўскай (і па яго пэўнасьці ўсё мусіла быць гэтак), што невядомыя людзі, праходзячы паўз, надта зайздросьцілі яму, і што калі разрахаваць добра, дык шмат хто з жыхароў забруджаных завулкаў Варшавы, напэўна, спрабавалі адгадаць: зь якой нагоды новы аўтамабіль з чалавекам высокага ачалу праскакаў па каўлыгах, бадай, кожнага крывога завулку. Павіхнулася стань разьвіхваньня значэньня слова «маё». Як слова і як рамяство да цемляньня ўласнасьці. Бо ж яно зьявілася на зямлі адразу з нараджэньнем жыцьця; яно зьявілася ў цёмнай норцы нямотнай мурашкі й пачулася ў рыканьні зьвера і піску зьвераняці; яно вымавілася ў грудзёх Адама і Эвы і чуецца ўсюды пры ўсялякіх здарэньнях. Бог сказаў «маё», і Люцыпар у супраціве агрызаецца яму: «о, не — і не тваё!..» Сіла, якая вырасла і здабылася праз «маё», шмат раней, чымсьці «чыё», — прынесла сусьвету няшчасьце й прыгнёт, хіжацтва й захоп. Аднак «маё» прынесла некаторую разьмяркоўнасьць розуму. «Маё» зрабіла дзяржавы й нацыі, іх гісторыю. «Маё» — улада панаваньня тых, хто верыў у тое, чаго яны дамагаліся!

Палкоўнік зачыніў вакно.

— І ты здольны мышэй лавіць, а ня справы людзкія — пратраціш! — справіўся пачуць ён з пацёмкаў знадворку. Гэта, хоць ужо позна было, з кімсьці спрачаўся Ахрэм. Ён сярод працаўнікоў двара ад першых дзён прыезду апынуўся сваім чалавекам. Яны апанавалі яго своеасаблівым наскокам пашаны, дастатковай доляй гарэлкі, якую ўкрадкі ад собсьнікаў двара гналі ўначы. Ды аб тым, што рабілася ў гаспадарцы, новыя ўладарцы нічога добра ня ведалі — ім натраплялася верыць Ахрэму. Свайму старому, адданаму і па-свойму натхнёнаму Ахрэму!

Палкоўнік паглядзеў на закапцелае шкло лямпы. Стрымгнуў па ім стрычкай. У гэтакі спосаб ён наўмерваў абабіць зь яго копаць, але шкло не ачысьцілася, а звалілася з кнотніцы й разьбілася. Зь лямпы пацягнулася смуродлівая валакніна дыму.

— Усё лякаецца мяне, — надцяла палкоўніка перакананьне. Пайшоў адчыніць вакно. Прыслухаўся. Ахрэмавага голасу не было чуваць, а то б паклікаў яго на дапамогу. — Нічога — дробязкі…

Нагнуўся пад ложак і выцягнуў стуль скураную вайсковую торбу, зь якой выняў аркушок паперы.

— Надалей я не зьбіраюся быць недаўмекам… Але, пані, пабачым, як адгукнецца маё табе! Пагалякаем на цябе, калі не ў гамонцы, дык у лісьце, прынамсі. Адно, што і засталося мне ў змаганьні з Аленай.

Пагладзіў левую скронь і патыліцу. Прымасьціўся да пісаньня; яшчэ раз паглядзеў на лёткае чарасло копаці зь лямпы.

«Дарагая Алюся!..»

— Не — ня гэтак!

Раздумліва нацягнуў рэдкую чупрыну на лоб. Адарваў палосачку аркуша з тымі недалётнымі словамі. Завастрыў лепш алавік.

«Мой смутак, маё каханьне, Алюся! Ты сьпіш ужо, а я дык не. Ці ж мне да сну пасьля тваёй гутаркі? Хіба ж мне магчыма?..»

— Абавязкова шматкроп'е пастаўлю — няхай казыча яе: а можа, як-небудзь адумаецца, — вырашыў палкоўнік.

«Не даесься гутарыць, дык пішу і думаю: узяла б мяне за руку… і на маіх вусьнінах у той час запалілася б уся соладач радасьці й шчасьця. А ўсё мінулае, што выцярпеў у маім сэрцы з пакутай і ахвярнасьцяй, вярнулася б да нябыту, дзеля будучага… Алюся, я паглядзеў сяньня на твае плечы і падумаў: яны найболей тлумачаць абавязак палагодзіцца нараджаць пакаленьні. А як інакш, Алюся? Разьбярыся: як? Ты жанчына, я — мужчына… Алюся, не далічысься пабожнага — вяшчаю я табе! Але як хочаш сабе. Я цягнуся да цябе за адным: не да «сьвятла» твайго, а за маім собскім, маміным — двор усё-ткі мой, а ня твой!.. Дык вось падумай і адкажы… І яшчэ дапісваю: нітаваць трэснутае я не старанны больш, з надзеяй Барыс».

Перагнуў роўна аркушок. Разуўся, каб не грукацець абуткам па падлозе, — босы, на дыбачках, пайшоў да Аленінай спальні і пад дзьверы прасунуў гэты — для яе — ліст.

## ЧАСТКА ДРУГАЯ

### 1

Як жыцьцё сурова ні было ў плыўнасьці спадзяваньняў, намаганьняў і плюскату рэдкіх здарэньняў-падзеяў, яно заўсёды аддзеліцца ад мінулага. Адно ў днёх не адлучваецца ад людзей, а прывучваецца да іх пайма як мушанае і як, можа, неабходнае ў выпадках скрухі духовай і звычайнай прыродна-непадступнай забясьпекі — гэта сьмерць. Але вежа сьмерці вельмі высачэзная і вельмі летуціва размаляваная ўсярэднімі пляцамі й садамі раю, што неадкладна зачэпліваеш патаень, калі толькі адважысься расказаць і пераканаць пра яе, як пра нагоду прыемнага спатканьня, як аб клічы: «Уваходзь, перад табой расчыненыя дзьверы!..»

Дык як ты ні жагацеў журбой жыцьця і як ты ні галасіў на гонях волі за дзьвярыма раю-сьмерці, усёдна ў людзей пакідаецца два праз два далягляды ўяўленьня аб адліку і прыліку жыцьця: ганьба таму, хто прыносіць сьмерць, і тут жа гэтаму напярэмкі — на трупах мы чытаем нашу перамогу…

Смутна існаваньне, цяжка і пакутна, але за закрутам вуліцы ці завулку, ці ў вогкім падвале, ці ў сухой ацяплёнай і прыбранай гасподзе (хай усяк уражваюць перашкоды) пачуеце супроцьнае іхнаму прызвычаю. Стуль кажуць: «У жыцьці ёсьцека паручэньні. Яны заводзяцца недалёка ад прадушынаў абыдзеннасьці, дзе заўжды: шуканьні, гнеўнасьць, незадавольнасьць». І яно, бадай, сымбалічна прагульвае сярод людзей. Таму і Алена, чульлівая ў шумятні навальнасьці, магла прадзейкваць сваю непаседлівасьць; мог і палкоўнік Сконтаўт; мог прадыхваць прывучанае Цярэмам і Адамчык; і праклінаць ды зьдзіўляцца ўсялячыне маладзенькая Ганя. Мабыць, практыкаваць пахісты жыцьця здольны кожны й кожная. Але па-свойму і ў сваіх магчымасьцях. Аднолькі перамога цішыні застою і цярпеньня — геній, для іх быў неабходны, а можа — і не? Ды хоць бы й ня геній, а прадслоўны нецярпун, які ўмеў клікаць, крыху паказваць, крыху журбіць і радавацца, крыху жадаць ненаводленасьці да пануючага, і тады, можа, Алена, Цярэм, Сконтаўт і Адамчык не завалокваліся ўласнымі звычаямі… А чым жа благія іхныя звычаі?

Цярэм вось, прыкладам, зрабіўся вельмі асаблівым за апошнія месяцы, калі зьвярнуўся дадому Міхась. Ён беспрамежна пачаў закончвацца ў сваёй прыкладнасьці мінулай і яшчэ не-

бывалай. Аднак тое небывалае мела азначаны ім час. Нешта, як зразумелы час у рэчы, якая сумесна з існаваньнем і днямі й начамі можа пракончыць нас і можа на некалькі ўтораў апынуць у шчасьці і ў сутнасьці справядлівасьці. Бо ж яна ёсьць усялякая: і каштоўная, і карнатая, і войстрая ў звычайным загрубелым кавалку, але яна — усяднолькавы спод вечных мэтаў — гэтыя нашыя векавістыя першуны клічу да чагосьці небывалага!

А што трэба Цярэму? Ён жа стары, не падлетак, каб ад яго патрабаваць чагосьці ненадзвычайнага да папярэдняга. Ды і тое папярэдняе — ня новае! Старое ў папярэднім з новым старым. І не зусім праўда. Новае зьяўляецца з ходаньня чалавека за чалавечнае, але ніколі няма новага ў тым, што зьбіралася й тварыла ходаньне за існаваньне. О, гэтае існаваньне! Самае гідкое ў сьвеце, падараванае намі самім сабе!

Цярэм — прапускальны дзядуля. Ён без прыпыткі натрапіў на неадпаведнае ягонаму нораву. Чаго Міхась гэтак зацятліва цікавіцца музыканткай? Ён жа жанаты. І навошта яна махлюе перад ахвярадаўцамі сваю сьлепавокасьць у той час, калі яна не сьляпая. А пасьля выманлівага іграньня на вуліцы прыходзіць да Міхасёвага габінэту, адвязвае чорную павязку з вачэй — і Бог ведае як празорвае імі Цярэмавага сына. Мабыць, яна праношаная дзяўчына, хоць і маладая. Ах ты, пракудніца! Брала ад Цярэма ўбожыну, падтрымоўвалася ягонымі спачуваньнямі, і цяперака — на: яна заляцаецца да жанатага чалавека, у якога дзесьці жонка й сын ёсьць. І Міхась таксама нешта прымёрз на тым, што здарылася падтаптаць і пераліць праз краі ягонага жыцьця. Чаму ён ухіляецца гутарак пра жонку й сына? Што за адмернасьць у чалавека?

І Цярэм самаагляднa распачаў дзейнічаць. Не забываўся паляваць дзічыну й разносіць яе мянчанам, і не забыўся папільнаваць за Міхасём. Без сумніву, гадаванец займаўся чымсьці нядобрым. Марудзіць нечага. Скраяк прыношваньня апекі над ім неабходны зноў.

Цярэм аднае суботы падвартаваў за сьляпой. Яму здалося, што ён не прарухнуўся на ейнай мэце і на сваёй асабістай дадумцы.

Сьляпая, калі ўвайшоў Цярэм да габінэту, сядзела прысваена на канапе без навязак на вачох. Яна штосьці гутарыла зь Міхасём, і нават зь вясёлым настроем.

«Праселіна няшкодная», — праімгнула ў дзеда.

Яна ж устала, прывіталася зь ім, як у сваім доме, прапанавала яму сесьці, сама ж асталася стаяць.

Сяньня Цярэм ёй нічога ня даў. Бо за што? Як карміць ды падтрымоўваць непрытульніцу, злую жанчыну?

— А нічога — сядайце, мне толькі праслачка прыткнуцца, — невыдайна, уветліва загаманіў Цярэм. — Як жа вы здаровыя… бяз мамы сумна? — І, бадай, наўпрасткі, праснавата, разгладзіўшы трыкутнікам пальцаў абвадрэлыя знадворку вусы, дадаў: — Дахаты зьбіраесься, Міхась?

— Але. Пара ўжо.

Мажліва, тым днём зьявіўшаяся ў Цярэма прыталіна несамавітасьці прапала б пад нявыхаднасьцяй абставіны, але ён убачыў віялянчэль. Добрыя шалькі да ўзважаньня!

«Я даведаюся ўсё ад цябе… порхаўка ты дажджавая!» — прасьцерлася ў ягоных думках мяжа непазьбежнасьці.

— Зьбіраецеся? Я паднясу ваша скрыпішча…

Наадварот, ён бы працьверазеў, калі б сказаў: «Тваё дупло з восамі!»

Пакуль «сьляпая» навязвала навязкі на вочы, а Міхась прыбіраў лекарскія прылады й лекі, Цярэм, быццам неспакмечваючы, што яны не прырыхтаваныя выходзіць, выйшаў першым зь віялянчэляй.

— Вы ідзяцё? — спытаўся ён хітра, не азіраючыся з паўпрычыненых дзьвярэй, і кінуў іх незачыненымі.

На вуліцы ён не чакаў сьляпую і Міхася. Адразу завярнуўся за вугол будынку і іншай вуліцай, другімі прасьцінкамі, пасігаў дахаты зь віялянчэляй. Яму прывабна ўяўляліся свае бацькоўскія ўражаньні: ён зробіць усё ў адзін раз.

«Прытаньваць мае некалішнія турботы аб табе я не дазволю. Ты ж мой сын і ты мусіш слухаць мяне», — вось што было правадольна шаноўна й абцяжарана ў Цярэмавым сэрцы.

— Я прачакаўся цябе… Слухай, Міхась, ты валаводзісься зь ёй, але мяне, старога, не адпраўляй насіць ейныя літаўры, — спаткаў гэтакім Цярэм Міхася, як толькі той вярнуўся дахаты. І Міхась паверыў старэчай прастадушнасьці — у прамоўку не ўступаў. Але спытаўся:

— Навошта браліся несьці? Яна й сама магла несьці.

Цярэм адразу пакрыўдзіўся на Міхася. Папусьціцца нельга.

— Я прызвычаіўся адносіцца да нешчасьлівых з усёй спагадай…

— А я, прыбраўшы лекарскія прылады, памог бы ёй, — адказаў Міхась.

Цярэм ня слухаў яго. Старанна налівае страву ў міскі.

— Можа прыбяліць поліўку?

Міхась зірнуў на віялянчэль у кутку.

— Яна хвалявалася за вас — дзе вы дзеліся, меркавала.

Цярэм, той самы — маўклівы, паставіў на стол страву. Ён зусім не ўважаў на прылуку спагады ад сьляпой. Зачаў:

— Ня вельмі цешуся ейнай уветлівасьцю... і спагады ад кагосьці да мяне, напэўна, добра ведаеш, не паважаю. Яна ўжо завельмі прыкараскалася да нас!

— А чаму не? Яна таленавітая. Засталася адна, смуціцца па мацеры. Усё-ткі як падумаеш — трагедыя сям'і.

— ...думаць ня трэба: трагедыя й будзе трагедыя, а ня шчасьцем. А я кажу, што яна ўжо зашчыльна прыкарэла да нас... А табе ці ёсьць вартым прыкачвацца да яе за тое толькі, што асталася адна й сумуе, сумуе... Я ня веру тваёй ахвоце спагадваць ёй.

— Вы запруга закручваеце, родны! Ня будзем пра прыкладнае — давай лепш пад'ямо.

Цярэм не прывучыўся да гэткага адказу, але вычакальна прыладзіўся на наступнае, большае. На старасьць год прыходзіцца прыдбаваць з сваіх мазгоў новую прокмець часінаў і прымаглёваць яе апраўдальнай агляднасьцяй перакананьня.

— У цябе ж жонка ёсьць — здаецца, пісаў у лістох, у цябе сын ёсьць — пісаў таксама? Пра іх ты ані слова ні сяньня, ні ўчора. Нават на пошукі не заявіў праз установу, куды ходзіш і дзе працуеш... Прыкладзіны абходзіш, а ня «прыкладнае», як ты казаў.

— А вы мяне, родны, і не прыпяклі гэтым!

— Міхась, ад цябе слухаць гэ-э-такае?..

— Вы заўсёды любіце прыпнуць мяне!.. Паслухайце яшчэ раз: я жаніўся сьперша, а потым разьвёўся — другое!

Цярэм яскрыста паглядзеў на Міхася.

— Зь дзецюка ў кавалеры перакуліўся — не спадзяваўся!

— А чаму ня гэтак? — без прыпынку на спасьцярогу далейшае гутаркі адказаў Міхась.

Нічога не пакінулася Цярэму. Цэлы вечар ён маўчаў і рана пайшоў спаць. Ягоная пашана да выхаванца крыху зрухнулася. «Вот жа прыпеўкі ў маёй хаце!» — зьдзекліва цікавала яго, пакуль заснуў на цёплай ляжанцы. За вокнамі прымоўна, наскокна на шыбіны дзьмухала завіруха. Прыпадкам ад яе павеі падзіньквала Мурзава навязь-ланцуг.

— А ў нас цёпла, — загаманіў Міхась...

Цярэм ня чуў, ён спаў моцным сном.

Гаротны Цярэм. Ведае лажыцца спаць на цёплай ляжанцы, а досьвіткам абуджвацца ды ісьці аглядаць настаўленыя пасткі на дзічыну: заносіць мяса дзічыны ўбогім людзям; думаць пра будучыню дарагога Міхася; скародзіць разважаньнямі агульны час, што даўно ажыўся ў сьвядомасьці; і, нарэшце, аддацца прыгнетнаму адчуваньню старога чалавека, у якім уявілася яму, што не знайшоў выйсьця да нечага небывалага. Ад учарайшага вечара прыйшлося думаць аб дзьвюх падзеях: пра Міхася і пра патрэбу працягваць сваю помач бедным людзям. Але ад важлівай Цярэмавай пярэчнасьці й жаданьняў ці магло што-небудзь залежаць? Ды нічога! Яму так сказаў Міхась на наступны дзень, як толькі абое, незаўважліва, злагодзілі мінулую непрыемнасьць. А потым, ці ж надта цікава гутарыць ды разьбірацца аб пасьледку Міхасёвага разводу? Міхась жа не бядуе пра гэта, значыць, і Цярэм — не!

Папраўдзе, Цярэм той раніцай крыху апынуўся ў цяжкаватым выйсьці. Завіруха не сьціхала, яна перашкаджала сходзіць у лес да пастак, таму сьціхавата, словам за словам яго прынуквала мацаць і махляваць сваю прысутнасьць каля Міхася. Цярэм, каб ведаў, што Міхась зусім не турбуецца пра сваю сям'ю, ён бы не пачынаў гутарку пра гэта… Але здарылася іншае, быццам зь юнацкай пахопнасьці, напаткалася ніякаватасьць. І ў тым выпадку, хоць Цярэм прызвычаены да ганарыстасьці і моцнасьці ў асабістых дзеях, прапаў не надзвычайна — падмяліў сябе, — і на чым? Зьвязаўся зь сьляпой і зь ейнай віялянчэляй. Як паглядзіць на музычнае «снадзіва», абапёртае ў кутку, ажно сорам бярэ. Цярпі маркотнае адчуваньне ў старой, высьпеленай душы!..

…І нарэшце пакінуў сарамаціць сябе, зьвярнуўся да Міхася:

— Заўтра пойдзеш на працу, і калі, мо' ранавата, убачыш яе, скажы: ідзі да нас і забяры сваю выману.

Міхась сядзеў каля каптурка й падкідваў смалякі ў вагонь. За ноч хата выветрылася, ён грэўся каля яго.

— Добра, але каб ведаў, што ейная рэч тутака, яй Богу, паклікаў бы яе да нас, хай бы крыху, пакуль маразы, пажыла з намі. Праўда, родны, ці не?

— Маладыя не ад сьцюжы дрыжаць! — незадаволена адказаў Цярэм, яшчэ складней моршчучы маршчукі на ілбе, гэтыя безбалесныя раны старасьці… Ах, Цярэм! Не ўсялякую шчылінку з прасьветамі зь ягонай душы можна ababіць чымсьці даведзеным ці неадведаным перад гэтым. Ня дзіва, што ў Менску нічога не адбылося і не перайменавалася ад ягоных масолянь-

няў людзей пасечанымі кусочкамі дзічыны. Аднолькі ён не маскаваўся — ён пачынаўся ў Боскім шуме бору, дзе паміж дрэвамі прасьвечваюцца дзюрачкі паднябёсаў, дзе прастор не рассоўваецца, не звальваецца разам з нашай сьмерцяй, а застаецца прыгодным падарункам усялякай жыцьцёвай вартасьці.

Міхась разумеў Цярэмаву старасьць, аднак Цярэмавай заўвагай цьвяліўся.

— Ну, няхай маладыя дрыжаць не ад сьцюжы, а ад чагонебудзь іншага… але ж мы, як людзі, што жывем у большай меры лепшага жыцьця, мусім памагчы блізкаму, ці не?

— Кінь, Міхась, пытаньне: ці не! — дзед Цярэм аджыў. Як змаўчаць? Тым болей, калі адышла ніякаватасьць зрэдку працэджваць словы. Цяперака ён жадае пагутарыць, наказаць усялячыны перад тым, як пайсьці ў царкву, хоць завіруха на знадворку не сьціхае. Міхась таксама не сьцярпеў, устаў, адышоўся ад каптурка.

— Ці не!.. Ня вельмі асьмейвай маё пытаньне… Вы ж прызвычаілі мяне аддаць апошняе няшчаснаму, ці наш сабака Мурза?

— Піхцер ты, Міхась!

— О не-е! Ня ўсё напханае вамі трымаецца ўва мне. Піхцер сплецены рэдка.

— А што зь яго высыпалася?

— Даруй мне — шмат вашай паражнечы!

— А ўсё-ткі якой?

Упарты дзед Цярэм. Ён ажно маладзеў падчас гэтакіх гутарак.

— Я сказаў надысь лекару Міхасю: што я, стары, мушу рабіць у маёй магчымасьці, а ты, малады, ня мусіш блукацца ў нітох сучаснасьці як папала. Памятаеш, я сказаў: калі тваю веру зьнішчаюць не тваёй праватой справядлівасьці й учынкамі, а галоднай сьмерцяй, высылкай і расстрэламі, дык тады адкажы тым самым. Падбай і ты знайсьці гэтакі спосаб, даўгі й, можа, собска-дасьмяротны…

— Пайшоў, мой родны, паехаў! Надумаўся за тыдзень — адчыняецца рай у грэшным! Я размаўляў пра няшчасьце са сьляпой, пра яе становішча, а не пра веру… А потым гэтыя словы належаць таму забітаму лётчыку, а ня вам, вы толькі пашыраеце іх.

— Міхась, я кажу пра веру нашай дасяжлівасьці ў цяперашчыне, — не ўступаў Цярэм. Ён дастаткова рухлівы і вынаходлі-

вы ў разважаньнях, і настрой адказваць суравей Міхасю гаспадарна захопліваў яго.

— Яна, сьляпая, здаровая, як калодка, чаму ёй убожыць за кавалкам хлеба, за капейкай, а не ісьці з сваімі талентамі прыгнечваць зло на ейнай зямлі? Скажы, чаму ня гэтак?

— Сьмешны ты, родны! Вельмі сьмешны! Сяньня ты асаблівы, хаўтурны перад тым мінулым... Што яна, дзяўчына, можа зрабіць супраць немцаў? Яна пра гэтакія рэчы і ня гутарыць, яна найбольш расказвае пра выдатлівыя выхапы жыцьця кампазытараў, музыкантаў: яна можа абараняць толькі музыку, яна летуціць граць добрыя творы — вось што яна ёсьць.

— Ня вельмі шкада, што я не вучыўся музычыць... Ды я, Міхась, ня супраць цябе й сябе. Я наўмерваўся сказаць пра бядноту, бо беднота, быццам нешта самае багатае ў сьвеце. Людзкая беднота — вялізная зыркасьць небывалага. Часам яна прыходзіць да нас празь мільёны ахвяраў, але потым застаецца ўсім чысталюбасьцяй і цудам... і зноў канчаецца новай беднотай духу ды волі, або нават самым мізэрным — турботай, каб хоць лішнюю скарынку хлеба мець. Беднота — раскладаньне чагосьці й нечага жыцьцёвага; злучэньне чымсьці й нечым вольным. О, як ты прыгожа, таемная жыцьцёвая лябараторыя!.. Кропелька вады для смаглых вуснаў — жыцьцё! І не праклённа беднота за адсутнасьць скарынкі хлеба!

— ...але ж жахліва, жахліва, калі ведаеш, што яно толькі ў цябе, а не ў тваіх суседзяў!.. Дарэмна, родны, молісься — не пераканаеш, не запамятаю твае філязофіі. Журбна ад яе, ды ўсё, — няўцешна дадаў Міхась.

Але Цярэм не сьціхаў. Ён працягваў дачытваць вусную заўважнасьць: падзіраць і голасна абвешчваць адчутае ў собскай душы шчырасьцяй жыцьця. Ах, Цярэм! Ад праклёну да спагады, ад спагады да патрабаваньняў! Аб'яўляецца ён! Каму?

— ... хочацца, Міхась, глядзець на галечу і бядноту!

— ... і есьці хлеб самому, — зьдзекаваўся ўветліва Міхась. — Ды яшчэ мягануць добры кукіш таму, хто будзе прасіць у цябе на адзін-адзінны кусень.

— О, не! Як на помнікі старасьветнасьці глядзець на гэта, і разумець, і адчуваць іх гэткімі, але не тварыць і ісьці за тым аджылым. Міхась, беднота — маладзенства! Яна можа нараджаць усё добрае й небывалае; у ёй — гімн духу, пяшчота шчасьця...

— ...і тая самая беднота, — прычасьліваў Міхась да Цярэмавага казаньня.

— Ня сьмейся! Яшчэ не зыстараўся — дацяміш!.. Векавістая ў цела ісьці — беднота!

— Значыць, беднота — правадыр усяго і зьнечага?

— Але! — прысудна пацвярдзіў Цярэм.

— Хай па-вашаму будзе. Але герой? Героі клічуць нас да чагосьці жыцьцёвага й даводзяць яго да канца, а беднота толькі ўмоўнасьць, часовасьць — і не герой!

— Міхась, ты скікаеш, як калека! І «даводзяць яго да канца» — кажаш?.. Але раз пра герояў, дык давай пра іх. Я ж адразу жадаю пераканаць цябе вось гэткай думкай: невядома, хто герой сярод геройскіх сьмерцяў...

— Ну, напэўна ж, не беднота, а чалавек, чалавек-герой.

— Ня вельмі безь яе героі слынуць.

Цярэм не паважаў слова «герой». Па-ягонаму, кожны будзе героем, хто імкнецца да большага, чымсьці пануе ў сучаснасьці. Наагул, тым раньнем Міхась і Цярэм шмат пра што гутарылі і нават зь некаторай зьменнасьцяй да пагодненьня паміж сабой. Яны па-свойску разважалі пра тое, як незалежнасьць краіны ахавана плоймай усялячыны: што ўсялякія хартыі-абяцанкі нацыям напісаны дзеля таго, каб ахаваць сваю ўладнасьць і панаваньне; што пра іх, хартыі, размаўляюць адно тады, калі яны гэтак неабходны, і ўспамінаюць як «дзівосны» мінулы момант, калі яны непатрэбныя й шкодныя, вельмі шкодныя таму, хто іх напісаў.

Цярэм аж крыкануў прароцтвам: па яго вяшчунстве, пасьля вайны зь немцамі будуць гаварыць больш пра гэтыя хартыі, але нізавошта пра сапраўдную свабоду нацыяў.

— Яны крышанком возьмуць адзін ад другога здабыткі панаваньня і патурбуюцца пераканаць сьвет, нас, вахлакоў, у сваіх «сьвятых» справядлівасьцях.

Так, дзед Цярэм знаходзіўся бліжэй да былога й будучага, чымсьці Міхась. Таму Цярэму варочацца ў нябыт, пад крыж сьмерці — пад знак перагароджанага шляху жыцьця, без памінкаў не жадалася. І ў той выключнасьці ён пакідаўся бездапаможным. Быццам ён не заслугоўваў свайго раю. Аднак ягоны рай, мабыць, быў толькі ў ягоным жыцьці, стуль аб ім ён здабываў шмат вестак.

Напасьледак бяседнікі сьціхлі — напэўна, утаміліся няжурбным для іх гуканьнем. Магчыма, яны б журбілі далей, пакуль зажадалі есьці, але якраз у малачавым подзьмуху завірухі на знадворку, як мэталічныя зярняты, задзінькала Мурзава навязь. Сабака выскачыў з будкі, загаўкаў. Праз напалову залепленыя

сьнегам шыбы Міхась і Цярэм убачылі Ганю, якая, бадай, мясіла сумёты сьнегу ў прасьцінку да іхнай сялібы. Затуліўшы аблічча каўняром паліто, што неадпускна прытрымоўвала рукой, яна другой трымалася за стрымно сядла. Побач зь ёй, верхам на кані, ехаў палкоўнік Сконтаўт.

— Што за крыжак? — насьмешліва спытаўся Міхась, хоць яны абое пазналі свайго знаёмага палкоўніка.

— Зараз даведаемся… — і Цярэм апрануў кажух, выйшаў на спатканьне.

Падарожныя ў хату не завіталі — спаткаўшы на дварэ Цярэма, даведаліся, ці дома Міхась, папрасілі празь яго, каб ён наведаў хворую Алену.

— Зайдзеце ў хату, — прапанаваў Цярэм. Але палкоўнік яшчэ чалавек у мінулай дзівасіле — не пажадаў адведаць утулу прысядлівай і адзінотнай хаты сярод паляны, з быццам вечным сьнегам. Што значыць людзі не вайсковыя! Які-небудзь вайсковец адразу б пазнаў уніформу ваякі высокага ачалу (нават бы і зношаную, без адзнакаў стану) і сказаў бы дзеяздольна: «Ёсьць, пане палкоўніку! Лекар Адамчык зьявіцца да Алены ў вашай гасподзе!»

І разьвіталіся.

У тым самым становішчы быў палкоўнік Сконтаўт, як і перад ім Цярэм, але Цярэм, нейкі засмолены дзягцяр і падатлівы на паслуху, не рабіў тое самае, як робіць палкоўнік для Алены. Ды і гэта не такое ўжо ліха! У палкоўніка часіна шляхотнай манеры адышла, часіна, у якой некалі знаходзілася толькі рослань дзірвану абыходжаньня, не падсечаная ў самае адчувальнае — у корань большага, чымсьці шляхотнасьць: у чэснасьць сэрца, у адносіну захаваньня для іншых. Аднолькі яно зьявілася да яго, уцэліла ў самое вочка, у самую кропку!

«Алюся, я кахаю цябе… Падзялі ўрочнае! Буду сабакам, навязаным каля цябе!» — вось куды папала.

І ён робіць, дзейнічае. Аднак усё — мроя. Нават ягонае варушэньне — мроя. А маладая Алена паводзіцца як чалавек з памерлай жарсьцяй, мабыць, кліча яго ня быць тым, чым была калісьці сама. Ды палкоўнік аб тым мінулым нічога ня ведае. Ён наадварот: «Дакуль будзе стрымнасьць?» — пытаўся ў глухамані сваёй душы і пераконваўся: «Ашчаднасьць у яе ёсьць, але дзеля каго, каму і навошта?»

Гэтыя думкі зноў вярнуліся да Сконтаўта. Ён чакаў адказу на ягоны ліст і адказу ад Алены не атрымаў. Таму ўсьціхамі-

рыўся ў Аленінай моўкнасьці — пачаў уторна раздумоўвацца над будучай магчымасьцяй ейнай зьбліжнасьці зь ім. Сваю ж барздлівую намогу абараніць валаданьне дворам асуджваў непамерна сурова. «Я дурань!.. Ах жа, натварыў! Дай Бог, каб яно ня ўспомнілася ёй… А можа, яна і не знайшла тую крапаніну? Прынамсі, каб знайшла, дык ужо б ня выцерпела — напэўна б сваячасна друзганула сваркай?» Усё як Алена размаўляе зь ім.

І палкоўнік асьцярожна, самапарадна, нешта наводле зачапіць прыгожую незнаёмку, спрабаваў дбайнай улагодай увайсьці да Аленінай паддатнасьці.

— Алюся, усё, што жадаеце, зраблю для вас!.. Мо' прынесьці ў бутэлечцы гарачай вады пад пяткі — дык я зараз?

І яна, Алена, нават улагодзілася — не здумляла сваёй жываеднасьцяй таго, што знаходзілася ўпобач яе, хворай, у ласцы і турбоце. Але ці магла існаваць на сьвеце жыватворнасьць міласьці, пачутае ад сэрца? Яна можа схіліць адну часіну прысутнасьці дабра для кагосьці. Але што потым? Яна любіць уторнасьць, інакш забудзецца, назаўсёды забудзецца пра ўсё добрае ёй.

— Алюся, я адважваюся сказаць табе: кінь задыхвацца захапленьнем спагады кожнаму няшчаснаму ў жыцьці…

Алена згодліва, зусім не жагнутая, як раней, расьцьвельнасьцяй ад неспадобнага да ейных меркаваньняў, папрасіла палкоўніка:

— Зьезьдзі на ўскраек лесу і папрасі доктара наведаць мяне. Сяньня нядзеля, ён дома, напэўна.

— Добра, Алюся, добра, любая! Якая ты — няшчасная!.. Я з Ганяй да доктара… Забадзяліся мы, Алюся… Ха-ха-ха — я ўжо навучыўся гутарыць як ты!

— Я ж казала, навучысься.

Палкоўнік парупіўся пакінуць Аленіну спальню — яго палохала наўдка прызвычаю: пяшчотная гамонка Алены вельмі часта заменьвалася гэткай незабаронай суворых словаў, ад якіх золатам ня збавісься і ракой не адгародзісься, — казаў ён потым Гані. Зь ёй ён таксама не пакідаў сувязяў. Агадваў на ўсялякі выпадак не адпасьці забрасьнелай пладзінёй! Вось жа ж людзі, набрылі адзін другога! Яны ўсе ўтраіх накінуліся на сваю асабістую сутнасьць на зямлі і намагаліся кожны па-свойму выкарыстаць яе. Яны закідваліся лаянкамі і ўступкамі; шкодзілі й шкадавалі адзін аднаго, але ўсе ўтраіх не зьбіраліся абвісаць над жыцьцём абы-чым і бязь нечага. Яны не загублівалі

патрэбнасьць запоўніць дваравую абыдзеннасьць чымсьці надзвычайным. Нельга ж пырхкаць зжаўцелым крысом армяка і падкасваць вопратку над тым, што і так ужо аголена да вызыўлівасьці — яны пачыналі спэкуляваць з дапамогай Ахрэма на менскіх кірмашах цялячым мясам. А палкоўнік раніцой блізу праз кожныя два тыдні паведамляў Гані — вось жа не шчасьлівіцца:

— Зноў пярэстая нарадзілася. Але нічога, на гадоўлю пакінем...

— А колькі аднолькавых маем? — пыталася Ганя.

— Чатыры. Пачакаем, шэсьць кароў яшчэ не ацялілася... Такую футру вышыем табе, што ажно Алена зьдзівіцца... усябрую — абяцаю!

Завіруха не сьціхала. Абвеяны сьнегам, неўзабаве прыйшоў Адамчык наведаць хворую Алену. За кароткі час знаходжаньня ў двары Алена паклапацілася абсталяваць ядальню, залю і кожнаму спальню. Ахрэм навыменьваў на мяса і хлеб дываноў, кілімаў, фіранак, крэслаў і сталоў. Яна ж сама наскуплявала шмат кніжак. За імі яна праводзіла ледзь ня цэлыя содні. Воку госьця кідалася ў гаспадах завіхлявасьць дбайнай гаспадыні. Алена, мабыць, не жадала думаць, каб нехта, пабыўшы там, борзда забываўся пра ўтульнасьць ейнай сялібы. Яна траціла каштоўныя грошы — кавалкі мяса — без ашчады і жалю, але з спакметлівасьцяй: каб не даведалася нямецкае кіраўніцтва. А калі й небясьпека — дык яна ж немка, неяк зь бяды выйдзе! Алене ня здраджвала сучаснасьць! У вялікай справядлівасьці яна магла абвясьціць усячутна: «Сучаснасьць мая — мае летуценьні, дзеяньні якіх зрабіліся адчувальнымі й назірнымі!» Аднак, што яны нежывыя, яна нізавошта ня скажа...

Адамчыка да Алены павяла Ганя. Ахрэму таксама жадалася выканаць гэткае паручэньне, але яму чамусьці не даручылі яго.

— Гэта я паклікала вас, доктар.

— Дзякую!

— Ганя, пакінь нас, пакуль доктар агледзіць мяне.

— Алюся, я й не зьбіраюся заставацца...

— Ах, тады прабач, сястра! — неяк апанавана адказала Алена, а калі Ганя зачыніла дзьверы спальні, зьвярнулася да Адамчыка: — Я, доктар, гэтак зьбервянела ў сваёй адпачывальні, што, шануючы згоду прыйсьці да мяне ў завіруху, мушу прасіць вашага выбачэньня... і дзякаваць вам.

— Нічога — з прыемнасьцяй!

— ...вы ахвотлівы, доктар — і я нездарма запрасіла вас да сябе. Я ўпершыню ў Менску ўбачыла вас і пазнала. Але вось тутака я жыву блізу паўгода, а запрасіць не адважвалася. І нарэшце, хварэючы, надумалася: давай і запрашу... Добра, доктар, ці не?

Алена папраўіла шаўковую накідку на каленях.

— ...у мяне хвароба толькі назваслоўя. Я ня хворая. Калісьці спалохалася падчас забойства Зорыча, але яно прайшло само... Прызнацца вам, доктар, я прыкідвалася хворай... Неяк у жыцьці ўсё нажованае, дык я думаю: давай і я пажую каго-небудзь, мо' які наедак камусьці прынясу...

— ...і найчасьцей ад гэтага нічога: найперш сябе пажуеце, — пажартаваў Адамчык.

— Вы, доктар, нават стрыманыя і асьцярожныя. — А тады з хлусьлівым усьмехам: — Мо' ў звычаі велікадушша спыталіся?

Алена жадала сказаць Адамчыку пра ейную нагоду махляваньня хворасьці перад палкоўнікам і Ганяй, каб часткова адпачыць ад усяго мінулага і каб перачытаць некаторыя кніжкі, сярод якіх яна гэтак заблыталася, што зрабілася тысячай рэвізіяў і рахубаў прохані жыцьця; і тысячнай, насьцярожлівай асокай за дасьледаваным і здабытым у яе гадох. І, бадай, яна пераканалася: сьвет увесь, і безь яе ўзбудрожанай, — прыгожы і недакорлівы! Яна быццам зьбіралася быць наддаткам у ім. Усёткі трэба ж было адчуваць сябе нечым, ну хоць бы кантрастам ад усяго таго, якое плача, сьмяецца, кахае, дамагаецца, ці не? Ды што ад гэтага ў яе сучаснасьці? Сучаснасьць усяго толькі безнадмера. Сучаснасьць — нічога! Звычайная турбота пра сваю абыдзённасьць; яна — кароткая, як «дабрыдзень», яна ж і нараджальніца мінулага й будучага, якім не пажывеш.

— А-а было! — скажуць калісьці. — Бярэце прыклад з таго, ці не бярэце! — дададуць некаторыя. Сучаснасьць — нічога, а нічога заўсёды і ніколі! Нічога — няспынная, даўгая часіна, як сьмерць!..

Алена ўсьміхнулася — яна навочна захоўвалася перад ім.

— Дазвольце: я ўспомню ўсё, усё зь бессумніўнай прычынай... Пачынаць ці канчаць, доктар?

І бліжэй падсунулася да Адамчыка, які ўсё стаяў каля ложку, і ў той момант, калі яна папрасіла прабачэньня за няветлівасьць і прапанавала яму ўзяць крэсла, памеркаваў: «Чым гэта скончыцца?»

— Усё ў наглядак папяю табе, і трэба заняць тое адным словам: шчасьліва кончылася.

Адамчык ціскануў плячыма, шчыра пахінуў галаву ў прыпаміне.

У Алены ажно асалода на твары.

— Не прыкідвайцеся наіўнымі — вы ж доктар, а не Алена…

Апошнімі гадамі ў яе зьявілася нешта падобнае да важнічаньня — ці ад сьвядомасьці прызначэньня здабытага самой, ці ад здарэньня — зьмены жыцьця: з кухаркі ў варшаўскай немкі да ўласьніцы двору або ад прастаты характару. А наагул, яна ведала асабістую торную мяжу і ўзьмежкі.

— Ня памятаеце? Шкада. Упершыню я спаткала вас за месяц перад савецка-нямецкай вайной, таму і сказала пра тое: шчасьліва кончылася… Я тады ня вельмі даўна яшчэ перайшла савецкую мяжу, каб даведацца пра мацер майго палкоўніка, а пагранічнікі натрапілі на мой сьлед — што рабіць? На неба ня ўзьлезеш. Чую: гудзе машына на шашы. Давай папрашуся, і якраз вы разабраліся: узялі мяне і падвезьлі. А гэтым самым памаглі ўцячы ад пагранічнай старожы вашай цяперашняй знаёмай Алене…

— …за колькі тыдняў перад вайной я быў пакліканы да службы ў вайсковы шпіталь на мяжы зь Нямеччынай, але пра спатканьне з вамі ня памятаю, — апавядаў незьбянтэжана Міхась — у сэрцы жыла вясёласьць.

— Доктар, не зусім праўда! Я ляпей дзьмухну з наступнага боку: а хто прыяжджаў да мяне на хутар і прывозіў бялізну мыць (хоць табе мылі яе ў шпіталі) і ўсё казаў: можа, павозімся ў аўтамашыне? А мне дзе там да язды, калі ў кішані тымчасовы пашпарт на імя старой мацеры палкоўніка. Вось жа неразумная была. Як успомню: на выпадак кантролю адразу б заарыштавалі. У пашпарце восемдзесят гадоў жанчыне, а тут вам дзяўчына дзяўчынай, як струк зялёны. І агледзелася на ўсё толькі тады, калі па ўсім пагранічны кароў пасьвілі, і надыйшло: гуляй, хто куды! І я ж, безумоўна, да свайго палкоўніка пайшла, пабегла ажно… Ну, цяперака памятаеце?

Адамчык, хоць і весяліўся ў душы ад гэтакай нетаемнай размовы, адхінуў крысо пінжака, пасьцебраў пальцамі па каленях, адказаў:

— Але, памятаю.

— Вы пра гэта й не забыліся, доктар. Яно яшчэ зелень зелёняй, як завязь, мой дарагі знаёмы!

Адамчык ціха засьмяўся. Без аднаго мітухня позірку глядзеў на яе. У ім Алена заўважыла выяўленую цярплівасьць найбольш слухаць, але не ахопліваньне здарэньня кону жыцьця ў прокмеці таго зьяўленьня. Але ня час, каб моўкнуць. Спыталася:

— А чаму вы не пачалі гутарку падчас спатканьня ў сьвятыні, калі разам азіралі забітага лётчыка?

— Ня ведаю, чаму. Мо' вы скажаце? Я толькі магу сказаць: азіраў вас як нешта старасьветнае…

— Ах, вось як раздзогваеце сваё! Дык што пры гэткай нагодзе сказаць мне? О не, я скажу: вельмі добра, што вы не прызналіся да мяне… вельмі добра!..

— Магчыма.

— І вы не лянуецеся адказаць: магчыма?.. А хто казаў: не палохайся, вазьмі ў тэй старой пашпарт і паедзем гуляць. На маю адказнасьць усё будзе — даводзіў мне?

— Але, было гэтак, я не адмаўляю. Парахуйце маю небясьпеку ў той час…

— Нарэшце вы разгутарыліся… О, мой незабыты, у тым жа і справа: разрахоўка, а не парахуйце!.. Абяцалі перавесьці празь мяжу? Абяцалі. Дамагаліся свайго? Дамагаліся — і яшчэ як! Каб не палкоўнікава нябожчыца, якраз мо' неспадзеўна прывезла б вам сына ці дачку, вам — вашу. Праўда ці не? Праўда, доктар! Вялікая праўда, як неба!.. Зашасьціліся адзін у аднаго пад носам і ня ведаем, хто госьць і хто ў госьця госьцем ёсьць!.. Вы нават, доктар, павучыліся на маёй цяперашняй лекцыі сказаць мне, справядлівей прывучыць мяне слухаць: «Я пакуль што не па вашай дарозе вандрую». А вы ўсё-ткі на маёй дарозе. Дарогі не абмінаюць рэк!

— А я ня веру вам…

— …паношаную вопратку не пазнаюць новай!

— Не — дазвольце сказаць: што я ня веру ў міт сына ці дачкі. І потым вы казалі: згубілі пашпарт, а не перайшлі мяжу, бо калі б я ведаў пра вашу замежнасьць, я адцураўся вас той жа часінай і можа нават арыштаваў бы вас…

— Будзьма цішэй гутарыць, — папярэдзіла Алена. — Міхась, доктар, о, бачыш, якая я: ужо даведалася пра ваша сапраўднае імя! Не лічы мяне размоўцай хлусьні. Мы некалісьці там хлусілі абое для сваёй карысьці, а цяперака навошта? Навошта яно?

Алена ўстала з пасьцелі. Заўсёдным прызвычаем адкінула назад валасы. Падышла да дзьвярэй — папрабавала, ці шчыльна зачыненыя, вярнулася зноў да Адамчыка. Стала перад ім.

— Глядзі — пазнавай! Гэта — я!

Ён маўчаў, але ўжо справіўся зьдзівіцца зь яе: як яна зьмянілася ў стане, у абліччы. Яна была празьмерна абдараваная жаночай прыгажосьцяй і кволасьцю ейнага хараства.

— Валей пра іншае скажу. Вы, доктар — разьнік! — не адыходзячыся перад ім, зьвярнулася не надзвычайна Алена. — Не, Міхась, даруйце! Я ня буду даводзіць, што вы — разьнік… Так і трэба мне. Я палохалася распачынаць кончанае, але ня здолела.

Алена села на скраёк пасьцелі. Яна не турбавалася пра ветлівасьць. Навошта яна? Яна толькі б крыўдзіла яго і яе.

— Што ж вы змоўклі? Вас клічуць Аленай, здаецца?

— …і Алюсяй таксама — ад палкоўніка слухаю! Міхась, я незамужняя, я запісалася зь ім, каб атрымаць гэты двор, што калісьці належаў ягонай мацеры. Але пра гэта потым…

Яна дрыготнай рукой узялася за плячо Адамчыка, ледзьледзь нахілілася.

— Хоць вы і пакрыўдзілі мяне, я кахаю вас… цябе, Міхась. Там, у Заходняй Беларусі, я пакахала цябе. І цяперака, — Алена нахінулася бліжэй да твару Міхася, — я напагатове прасіць цябе гэтага каханьня. Буду гэтак прасіць, як у мяне просіць яго палкоўнік… Буду, Міхась!

Пошчакна пашкуматала ягоную шчаку.

— Міхась, за вамі слова.

— …ты як і тады — чароўная, але ж палкоўнік?

Алена ашчапіла Міхася… На калідоры грукнулі дзьверы — нехта пайшоў на знадворак. Алена трымала Міхася ў пацалунках. Яна свавольна цалавала яго і торыла сказ:

— Я тваёй была і буду, Міхась!

Для Міхася ўсёнае асталося звычайнасьцяй. Тое, што надышло — адбываецца, нязбыўнае — прыходзіць, яго прыводзіць былое.

— Нічога празьмернага, — цьвердзілася яму, супраціўна Аленінаму: «Я тваёй была і буду».

Прычаснасьць да мінулага не адклікалася ў Міхасёвым сэрцы. Ды што ў ім? Уважлівасьць маладога чалавека, што абышлася і пакінулася з добрым успамінам аб днёх прыемнасьці. Няўжо ж будзе яна каму-небудзь аб тым апавядаць? А калі нават гэтак? Дык небясьпекі ўсёдна ніякай. «Яна закахалася ў мяне мо' балазе сьвядомасьці да майго становішча ў грамадзе. Шчасьлівая сялянка!» Вось як атрымоўвалася ў Міхасёвых меркаваньнях пра Алену. І яно, як не было разважанае, натхнёна ўпры-

гожвала ягоны намер. Намер жаніцца зь віялянчалісткай. Ён уяўляў а ні ледзь зацягнутым у інтарэсы ўскрэплай дзяўчыны-Алены, якая вельмі жадае ўляпіцца ў сустань адукаваных людзей. І цяперака яно не прысутнічала ў яе дабаўкай нязьдзейсьненай цікавасьці, а патрэбай зусім сапраўднай адпаведнасьці — яна ж валадарка двору!.. Гэтак разважалася Міхасю, можа, дзеля таго каб канча пераканаць сябе ў каханьні да музыканткі. Ён даведваўся асабістую справядлівасьць.

Але тым зімовым завірушным днём ён не апынуўся ў цяжкім бязвыхадзе, ён, бадай, як паміж сьценаў пячоры прайшоўся, бы пажартаваў із сваёй незакамянеласьці — усё лёгка даецца й давалася нядаўна.

Апаўдні завіруха яшчэ болей разьятрана й валацужліва ірвалася подзьмухам. Бор недалёка ад вёскі шумеў і трашчэў. Вецер дзьмуў якраз ад баравога боку, таму здавалася, гэтая чорная, махліва-гнуткая скруха дрэваў натугвалася адной моцай парыву кінуць сваё месца і ахутаць сабой увесь прасьцяг зямлі. Раскудлачаныя, але суцэльныя плоймай імкнуліся хмары. Міхась, перамагаючы подзьмухі завірухі з калючым сьцёбаньнем сьнежных скалак, ішоў з маёнтку да сяла па адзіных сьлядах, ужо шмат дзе загладжаных завірухай. Пад дахамі хатаў гудзела. За невялікім заваротам вуліцы ў захіне дзьвюх хатаў Міхась спаткаў палкоўніка. Ён з уцягнутай галавой у каўнер польскага шыняля ў летняй шапцы, нахлабучанай аж за вушы, патупваў там — грэўся.

— Доктар, — клікнуў ён. — На колькі словаў, будзьце ласкавыя!

Міхасёвы думкі пра Алену прапалі.

Як засьцюжанае дзіцянё, палкоўнік прыкорчваўся ў цеплыні сутульваньня. Каранатае пачуцьцё без развагі казала яму дрыжэць яшчэ больш, бо ў гэтым хваляваньні, здавалася, апушчаецца да чагосьці вольнага, прыемнага і, можа, лёгкага.

— Доктар…

Ён, бадай, уцягнуў Міхася ў захінак паміж дзьвюх хатаў.

— Доктар, я не сьцярпеў, калі ўбачыў, як яна цалуе вас… Яна будзе заўсёды гэткай. Калісьці, спаткаўшы мяне ў ліху вайны, турбавалася пра мяне… ды ейныя турботы застануцца турботамі. Яна паважае людзей гасьцямі быць, а не-е… Даруйце, доктар, вы, можа, не разумееце мяне. Я хоць палкоўнік, але ўжо адвык стрымана ды адпаведна гутарыць. Я, мабыць, ад яе навучыўся… Доктар, прабачце за некультурнасьць: падгледзеў праз шчылінку ў дзьвярох, як яна цалавала вас… і не сьцярпеў,

пайшоў спаткаць вас і папярэдзіць: Алена — руіна. Яна запісалася із мной, а сужэнкай маёй не жадае быць… Доктар, я ведаю, дзеля чаго яна паклікала вас: яна зьбіраецца адвесьці майго белага каня на мяса для мянчанаў. Я згадзіўся — няхай… Доктар, вазьмеце пяць нямецкіх марак для Самапомачы, гэта ж не рублі, а грошы сапраўдныя, нямецкія грошы, вазьмеце.

— Дзякую, але даруйце: я не падбірайла!

— Не адмаўляйце — вазьмеце! Дапамажэце мне. Я ведаю, што пасьля гэтага каня яна надумае адвесьці і другога, яна такая жанчына: паахвяруе, пацалуе, а адышоўшыся — плюнуць можа… Яна прыладжваецца да вас, каб вы апаведалі пра яе, каб вы стаўлялі ейныя дзеяньні ў прыклад. А яна ж, па-мойму, убачыўшы кропліну дажджу на вашых вейках, расплачацца, абдыме вас, пашкадуе, а ў прасонках не ўздыхне нават… Ах, яна-а!

— Я барджджу дадому — сьцюдзёна.

— Доктар, вазьмеце пяць марак. Як што зноў, дык скажэце Ахрэмчыку: двор Сконтаўта ўжо ахвяраваў грошы для Самапомачы, а ад жонкі наступным разам няхай. Скажэце гэтак — не адмоўце… Якая яна дзівацкая жанчына, працягваў палкоўнік, але Міхась падаў яму руку на разьвітаньне і тым змусіў спыніць гутарку.

— Бывайце, доктар… А як сабака — не ашалеў яшчэ?

— Не, пане палкоўніку, — усьміхнуўшыся, адказаў Міхась.

Палкоўнік расьцьвелена, джыгаючы нагамі ў каленях, шчыльней уцягнуўшы шыю ў каўнер шыняля, глядзеў усьлед Міхасю. Ён шмат што не забыўся выказаць з сваёй гаротнасьці, але шмат яе пакідалася зь ім.

## 2

Палкоўнік вярнуўся дадому і спаткаў Алену з Ганяй у сваім габінэце. Цяперака там усё было па-іншаму: падвялічана выглядам упрыгожы. Не супраціўляліся вытыркнутыя спругі з старой канапы, а атоньвалі мяккія аксаміты з маладым адсьветам каляровасьці на іх. Успаміны аб колішнім павуціньні на сьценах зьмянілі ў бронзавых рамах тры краявіды мастака Цьвіркі. Усё ў старым будынку Алена папраўляла старанна. Ёй ніхто ня мог перашкаджаць у тым звычайным заслоне жыцьця, дзе затульваліся ўмовы ейнай нечапанай мроі пра ўсё і нічога. Глумленьне якой-небудзь прокмеці жыцьця ёсьць навета захаваньня будучага шчасьця, або наадварот — велізарнае адгадваньне несумніўнасьці ў сумніву!

— Ах, як зноў бязьвінна й шчасьліва!

У ёй глыбей аседжваўся вобраз цікаванай цярплівасьці: пасьпешнасьць сустрэцца зь Міхасём…

У габінэце Алена мела крыху сумную й ненадзвычайную гутарку для Гані. Ганя найперша нават не паверыла ёй, бо мерквала паступовае ўваходжаньне Алены ў апавядальнасьць, падрыхтаванасьць да вядомага зьдзеку над ёй і палкоўнікам. Яна слухала ўважліва. Штосьці дарагое належала ёй у вясёлым настроі сястры.

— Не! Не, Алюся! Не паверу! — з уражлівасьцяй ускрыкнула Ганя. — Ты нарошні, сястра, растраўляеш мяне! Ты жадаеш нешта вызначыць мне!..

— Дзе і што? — жартаўліва спыталася Алена.

— Тут у двары! — быццам напагатаваная да плачу, адказала Ганя.

— Я не хачу цябе крыўдзіць. Я ад свайго шчасьця кажу табе ўсё мне вядомае. Ты ж мне сястра, сястра родная і дарагая даражоная…

Алена, па-дзіцячаму лёгкая, вельмі вольная і кволая ў сэрцы, дурона падбегла да Гані, якая сядзела ў крэсьле каля вакна, пяшчотліва абняла яе. Прылучвалася ўсё тое, што адбылося і ўспомнілася каля паўгадзіны даўчасу зь Міхасём. Яно зноў адчувалася ў Алене сапраўднасьцяй, а ня мроенай спакусай. Яна прысела на калені каля Гані, як каля дачкі, і захоплена ў непрамільгнулай сьціхасьці загаманіла:

— Даўней, калі былі малыя, за вячэрай хваліліся маме і тату пра ўсё натворанае за дзень. Мама спадцішна ўсьміхаецца ад нашых размоў, а тата ківае галавой, утаропліваецца незадаволеным ды кажа: «Ну, ну, сакатухі, пільнуйцеся — некалі хлапцы дадуць лазы, ой дадуць, сьцеражэцеся!» Мама абдыме нас, пацалуе: «Мае вы пліскі непаседлівыя», — скажа, таксама ўсьміхаючыся… Але навошта гэта ўспамінаць? — неяк званаскуску заканчвае Алена і ўскоквае з падлогі, абівае без патрэбы сукенку на каленях і па-людзку, дазволена, пабліскваe прылiплымі да веек сьлёзамі.

— Што ў чалавечым сэрцы ня ўтопліваецца? — поўнасьцю ня выкарыстана, дадае яна, бадай, для сябе, бадай, дзеля Гані.

Алена спыніла ахову таемнасьці Ганінага жыцьця. Яна прызналася ёй, што была ўзятая Аленіным бацькам зь дзіцячага прытулку ў Вільні, што яе бацькі былі вайсковыя лекары й памерлі дзесьці ад тыфу; што ёй, Гані, праз тры тыдні не сямнаццаты пойдзе год, а васямнаццаць будзе; што дзень нарадзін у

Аленінай сям'і для Гані лічыўся ад дня, калі яе прывезьлі ў сям'ю зь Вільні — ёй было тады два гады.

— У нас дачка падрослай нарадзілася, — калісьці люба жартаваў, здаецца, бы ўчора, Аленін бацька. Ад гэтае радасьці, закатаванаму польскімі жандарамі, дасталося толькі глядзець з таго сьвету на адсьвет свайго роду…

Якраз і палкоўнік увайшоў у габінэт.

— А я шукаю яе… Алюся, ледзь не праз год пакінула свой пакой! Вітаю цябе!.. Што сказаў доктар? Ты выглядаеш здаровай… Ганя, падтрымай мяне — безь якога-небудзь недахопу, — выказаўся палкоўнік.

— А дзе ж ты быў? — спытала Алена.

— Я ж, ведаеш, чалавек вайсковы — непаседа: пад завірухай пахадзіў, — запэўніў палкоўнік.

— Барыс…

— Нешта зноў прыходзіцца чуць маё імя, — вясёла заскочыў ён у Аленіну гутарку.

— Добра, палкоўнічак, тады я вярнуся да майго прызвычаенага, — папярэдзіла яна. — Пакуль ты прыйшоў сюды, я крыху, а можа, зусім да апошняга скрайку абвясьціла Гані некаторую тайніцу.

Палкоўнік не меркаваў пра Аленіну непрайменнасьць паказаць у самай засуканай волі поўную ягоную будучыню — месца пад дахам двору.

— Толькі не перашкаджай мне гутарыць, і ты хутчэй пачуеш маю згоду даць табе дарогу ў вячніну, у сваю радзімую, карысную ў цяперышчыне…

— …нешта ня цемлю, да чаго ты вернеш, — собілася палкоўніку насьцярожнасьць.

— Дык тады без уступаў, бо да вечару ня скончу…

— Праўда, Алюся, праўда! — з ашчаднай усьмешкай падтрымаў палкоўнік і паглядзеў на Ганю, паглядзела на яе і Алена.

— Не сумуй, Ганя. Яно балесна, але, бадай, не дармо!.. Я, палкоўнічак, пра твой ліст да мяне, памятаеш? Я таго часу, калі падкінуў яго, прачытала ўважліва…

— Кінь, Алюся — я забыўся пра тое. Навошта вярэдзіць спакой сэрцаў і ціхамірнасьць у хаце?.. Паглядзі, як дзьме на дварэ.

— Палкоўнічак, я жадаю пахваліць цябе: і нямудрае будзе мудрым, калі яно сказана сваёй мовай, надумана сваім розумам… Валадарнічай над сваім! Але ўсё-ткі дазваляй мне браць

маленькую жменю дабра з твайго маёнтку. Гэта ў вадмежку — адказ на твой ліст, і наступнае, для абаіх: калі толькі Ганя кахае цябе, дык можа кахаць і жаніцца з табой. Праз год я дамагуся ў нямецкім судзе разводу — па-пісанаму закону пасудзімся. Мадзець у непаладзе больш ня будзем. Варухнемся, сябры, так ці не?

— Вось дык казка, Алюся!

— Палкоўнічак, я не кахала й ня думала кахаць вас!

— Алюся, апамятайся! Навошта ізноў пачынаеш?

Алена засьмяялася.

— Алюся, я ад каханьня да цябе напісаў той ліст. Бяздумны — я! Даруй мне!

Палкоўнік уторна зірнуў на Ганю. Яна, па-ранейшаму ўзірлівая і ахопленая ўсім, што колькі часінаў да гэтага і дабаўленага кадзе пачула, пабялелая, уразьліва плюшчыла павекі.

— Ганя, сястра мая родная і даражоная, кахаеш — кахай! Але асьцерагайся аднаго: сьціхне вайна, апынесься сярод людзей, убачыш каханьня іншых — апамятаесься. Захочацца і табе іхнага каханьня, ды позна будзе. Позна, позна! Да сьмерці можаш застацца нашчай ад гэтага неадведанага…

Аленіны словы нарэшце даткнулі Ганю. Яна, уцьвеленая, шпарка ўстала з крэсла.

— Чым нашчая?

— Каханьнем! Будзеш у колькіх кроках ад яго і ня будзеш магчы прылучыць да сябе яго. Будзеш варочацца, займацца занятым!

— Сорам, сястра!..

— Ну і словы! Што з табой, Алюся? Ды ліха нам: мудрасьць адна й тая кажны дзень… і ты, Ганя, не спрачайся, ты ж ніколі не супярэчыла сястры. Няхай яна дакарае. Слухай, — умяшаўся палкоўнік паважна і настойліва.

Алена зноў засьмяялася.

— З чаго, сястра, сьмяесься? Дзеля чаго насьмехі? — спыталася Ганя і, ураўнаважаная ў цярплівасьці, крутанулася да палкоўніка.

— Барыс, я кахаю цябе!

Яна прыпала да палкоўніка ў шчырым пацалунку.

У той дзень у яе знайшлася на душы нашчэпка. Нашчэпка незалежная і неадхільная: вырашаць пра сябе самой.

Алене не засталося чаго рабіць там, у габінэце, яна мусіла прынукна паказаць сваю задаволенасьць усё тым самым усьмехам і, са сьціснянымі на вачох сьлязінамі, пайсьці адтуль.

3

Калі б не было завірухі з пранізьлівай сьцюжай і зь сьляпістым, калючым сьнегам, Цярэм ня вытрымаў бы адзіноцтва ў хаце (Міхась яшчэ не вярнуўся з наведаньня Сконтавых), самавітая наруга настрою выгнала б яго да бору. Там ён выздараўліваў, аджываў вялікай похацяй жыцьця, завалодваў зіхрынёй сілы розуму — прызначнасьцяй, што зьяўляюцца ня што іншае, як азначаная мяжа да зьдзяйсьненьня чаго-небудзь у нясконча-ных днёх. О, Цярэм! Стары задзірлівы дзед! Цярэм моцны й здаровы, але з колькасьцяй пeражытых год, пачынаў неспакметную хаду ў нябыт! Час здабываў яго, і каб пакінуць хоць ледзь памяць, перабіраў, абнімаў яго думкамі разважлівай асуднасьці ўсяго натваронага ў жыцьці. Таму Цярэма крыўдзіла Міхасёва неспадоба ягоных меркаваньняў. Ад чаго ў тым выпадку гублялася воля самапэўнасьці да наступнага разьвітку дзеяў, пакуль яшчэ магчымых. Але ж Цярэм не бянтэжыўся! У душу прынікала сьвядомасьць глухамані іншых людзей, ад якой заўсёды або часам можна знайсьці чалавека, роўнага сабе. Чалавек — чалавеку!

Што жадаў Цярэм? Няўжо ён зьбіраўся пакінуць малітву свайму народу? І якую? Гісторыя — Рым, Бабілён і вёрсты іншых земляў! А тут, дзе ён жыве, бы гляк парожні, напоўнены іхнымі астанкамі!.. Невядомы Цярэм! Ён ведаў свой Менск і Нямігу нявысахлую! Ён, стомлены бяскроўным змаганьнем, сьціплым казытаньнем душаў іншых, зьбіраецца сканаць у сьвятыні роднае волі. Нейкая па крыві водгуль давала яму даведнасьць пра свой Айчынны Бабілён і Рым. Калісьці даўно-даўно ягоныя папярэднікі крывічы, люцічы абараняліся ад захопнікаў, а ён, Цярэм, цяперака намагаецца здабыць здабытае — як гэта?.. Цякла ў ім адонлівая і бясконцая рака развагі, ад якой ён ня меў часу памерці. Цярэм уяўляў.

— Нас прышчэпліваюць, — казаў Цярэм Міхасю. — Перад намі пад носам круцяць і сьцелюць ідэямі або заклікамі рэлігіі. Круці ідэямі штучна, па-мастацку. Квялі імі чужыя падбітыя пачуцьці, каб зрабіць чалавека ахвотай пакоры, пашаны і згубай ахвотнасьці абараняцца, каб складаўся звычайным мэханізмам вытворнасьці багацьця, бяз позірку на свае сілы творнасьці дзеля не-сябе. Звычай да гэтае творнасьці яны нават патурбуюцца яшчэ глыбей укараніць, прыпомніць…

Міхась не згаджаецца. Перарывае.

— Справядлівасьць у захопнікаў да пакораных ці ў жыцьці незалежных дзяржаваў ёсьцека адпаведная зьява сьвядомасьці

захаваньня клікі, людзей да людзей у пэрыядах ейнай няўхільнасьці, валей іхнай патрэбы.

— Люгашка скокае абы-куды, бо ня бачыць з-за травы, што наўперадзе!.. Умеркавальнасьцяй пырхкаеш? Ды я не пра справядлівасьць размаўляю. Навошта мне нейчая справядлівасьць, калі справядлівасьць ляжыць і млее паміж нашымі людзьмі, паміж тэй ці іншай нацыяй. Бо кожны, хто будзе расьці і жыць у сваім собскім саюзе, у брацтве, той будзе адчуваць трагедыяй усе ўскрыкі нядолі чалавека ад свайго народу ці іншага.

— Вы, родны, у прапаведнікі ўбіраецеся.

— А сьціхні, Міхась, ты прасьцень неміласэрны — больш нічога…

Цярэм, уступіўшы ў гутарку, паважаў свае тлумачэньні выказваць бяз зробленых перад гэтым прадмоў, але не ўхіляўся заклічных цікавасьцяй уступаў-зачэпаў. І сваю развагу ён будаваў на пераскоках красамоўнасьці разнаякасна, прастуючы да аднае мэты. Цярэм яшчэ вятлей уяўляў.

— Я прапаведнік? — перапытаўся зацятліва. — Я? О не!.. Нахлебнік эпохаў ты! Бадай паэта надворны — ты! Чаму ж не аплачаш іх тысячамі сьлёзаў.

Міхась усьміхаецца ад Цярэмавай запальнасьці, але не адказвае на пытаньне.

— Сьмяесься, доктар — сьмейся. Але я пэўны, калі б ты быў і ў сапраўднасьці паэта, дык напісаў бы пра той вадаплаў, пра нас, што гінулі там: «Навошта плачуць вочы, калі пра ваш плач нельга сказаць у словах!» — вось як махануў бы па нашых вушах.

— Дарэмнае яно! — нарэшце адклікнууўся Міхась.

— Мы — дарэмныя? Бо змушаны глядзець, як нашыя калені ад укленчаньняў пакасавелі.

— А хто ж казаў: адкажы тым, чым прынукваюць і б’юць? — спытаўся ўразьліва, без насьмеху Міхась.

— Я. Ну дык што?

— А нічога. Голас з-за вакна, а не з сваёй хаты…

— Якраз з маёй хаты, з майго сэрца… Я памятаю ўсё, што кажу, — зусім асечана, але прысвоена паправіў Цярэм і бадай без захопнасьці кончыў, даказаў надуманае: — Я, Міхась, жадаў адгаварыць цябе ад спробы ісьці за імкненьнем дзяржаўных злучэньняў. Ты ж усё-ткі абмяркуй гэнае тыцканьне. Бо ўжо даўно вядома, што ні адзін у злучэньні ці ў саюзе ня жыў добра. Заўсёды знойдзецца каста вялікіх, якім насьледуй і слухайся.

— Выдумляеце — не маё! Я належу сам свайму, нашаму! — сьцьвердзіў Міхась.

Цярэм не задаволіўся гэтакім зваротам гутаркі. Гэтулькі часу надармо ён абсягаў размах думак, і не апошніх, і ня першых мо'. Ён імі, бы сякерай, высекваў латок для сваёй набожнасьці. Ён, стары, захліпаны чалавек, чакаў убачыць непагожае цяперашняму скачваньню. Жадаў стаяць каля манумэнта собскіх дзяржаўных пераменаў — вось які Цярэм! — што кратаўся і кратаецца далей у хаце пад самым лесам. Колькі раз ён уваскрасаў падобнымі летуценьнямі! Бы сонца па адным скрайку неба праходзіць адвечны паўкруг — і нізавошта на поўнач. Так і ён.

— Я хачу сказаць: навошта залызгвацца жыцьцём у засьценях жыцьця іншых?..

— Бясконцыя пытаньні. Бы сваяка напаткаў: зачэпіш, радасны гэнаму спатканьню, і агледзісься: дзе табе — чужы.

— …але сьлепісься ад гэтай памылкі: прыемна нават з чужым, блізу падобным да роднага, пагутарыць пра сваё дарагое, бо яно твая ўцеха і пераканаnьне, якое няўхільна пяройдзе ў веру. Яно ня будзе тады гаворкай і казачнасьцяй мроі ў справядлівасьць, а сьвядомасьцяй тваёй сапраўднай надыходы зьявіцца перад злом моцным, каб сабраць раскіданае гняздо Айчыны…

…Апошнімі гадамі Цярэму спадабалася захопнасьць восеньскімі днямі. У асобнасьці тымі днямі, калі восень губляецца ў першых зімовых сьняжынках. Калі без адзінай зялёнай хвалі пялёсткаў збаравелыя долы, бы мякка прылегшыя, расьсьцілаюцца навакол. Закалелыя ўспырскі зямлі — узгоркі чарнеюцца лямцам узаранае глебы. Цярэм спыняўся на ўскрайку бору, крыху наводдалі ўшчалопку нівaў з жытнёвай руняй, і аддаваўся харастве прыроды. Размашліва і глуха шумяць хвоі ў бары, на небе каля самага сонца, якое, бы дзесьці далёка падвешаны ліхтар, пралётваюць расплястаныя хмаркі. Іхны лёт хуткі і спакметны. Штораз іх больш і больш. Праз шчылінкі-прасьветы наўпрасткі паміж хвоямі кавалак небасхілу, скуль яны вылятaлі, пакрываўся суцэльнай чарнатой хмараў. Далёкі хвост бору чапляўся за іхную дымістую бахраму. Лунка вогкага паветра абвейвала налётам холаду, а зь ім, быццам жывыя істоты, пачыналі мітусіцца сьняжынкі.

Сьнег ідзе й ідзе. Зямля пухнее, пакрываецца сьнежным намістам. Быццам рэштка, на ашчаду, сьняжынкі ліпяць шчыльней на галіны дрэў. Галіны, яшчэ мокрыя ад дажджоў, ня стрым-

ліваюць іх, стрэсваюць на праталіны каля камлёў… У думках Цярэмавых сялілася сьвежасьць, у дыханьні здаровая прахалода. У маладзенстве ён гэтак ня думаў, але цяперака, на старасьці, лятункі магчымыя знайшлі ў ім прыпынак. Яму жадалася перад сьмерцяй убачыць свае летуценьні жывым назірным вобразам дзеі.

* * *

Нарэшце з дакторскага наведваньня вярнуўся Міхась. Цярэм найперш даведаўся, што здарылася ў маёнтку, а тады зноў пачаў сваё.

— Даруй старому! Я, ведаеш, пакуль ты адсутнічаў у хаце, раздумоўваў пра тваю службу ў Самапомачы…

— Ну і што надумаўся — нічога?

— А вось якраз дацеміў. Найлепш кінь працу там. Я вельмі страшна надумаўся. Палохаюся, каб ты не зрабіўся рэнэгатам для свайго народу…

— Ах ты, мой дарагі лотра! Ты лепш, каб ня мучыць мяне прыпушчэньнямі, запісвай іх у сшытак і давай потым перачытаць мне, — добра? — крыху жартаўліва павучыў Міхась.

— Сын, не лапачы крыламі ў клетцы! Ня льгай мяне! Залыгаеш, дык мае рукі й ногі будуць думаць, казаць. Я хачу думаць, бо я не забыўся на сваіх прашчураў, я ж меў іх да мяне.

— Не забыўся і я пра іх.

— Дык тады паслухай мяне. Немцы абмануць вас, бо ж самая найлепшая хітрасьць, каб абясшкодзіць ворага, значыць, нас, падтрымаць нашы намаганьні, а тады, калі пачнем зьдзяйсьняць іх у сапраўднасьць, яны, як ужо рабілі іншыя, праз рэнэгатаў патурбуюцца выклікаць няўпэўненасьць у нашу моц...

— Яй Богу, я захварэю! Захварэ-э-ю! Ласкочаш усё пра адно. Новая ляшчотка вы! — па-мяшчанску ўцятліва ўмяшаўся Міхась і недалікатна дзёўбнуўся ў Цярэмава мяккае скрыплівае крэсла.

— Дурань! — адгрызнуўся злосна Цярэм.

Тым днём ён ня ўсё сказаў доктару Міхасю. Ён быў змушаны пратраціць зь ім гутарку пра дзяржаву. Ён вось як казаў бы Міхасю:

— Дзяржава, — разважаў бы Цярэм, — ня толькі панаваньне пасланцаў ад бальшыні народу над меншынёй, а розьніца разьмежнасьці сацыяльнага ўстрою. Яна, дзяржава, у сваю радоўку, значыла б: вартасьць колькасных якасьцяў нацыянальнае духовасьці й маралі; зьменнасьці праўнаахоўнай хвалі-

стасьці над адзінкамі, над грамадой у іх арганізацыях і над сувязямі народу з тымі, што выбраны кіраваць ім. Дзяржава — залежнасьць аднаго ад другога, дзяржава — самастойная гісторыя ўсялякіх вякоў, змаганьне мудрасьці і адначасна імкненьне прадстаўнікоў гэтае мудрасьці ахаваць свае асабістыя ўзвышнасьці й маёмасьць; сродак забясьпечваньня пашаны, займае першую ролю ў іхным розуме; другое — хлусьлівая ўдзячнасьць людзям за давер ці павагу; і трэцяе — намаганьні даведацца на справе пра свае наўмеры і перакананьні — наагул пахваліцца.

Калі б ён сказаў усёнае Міхасю, той, напэўна, заўважыў бы яму:

— Чаго ты, родны, віхаесься на вядомай дарозе? Дзеля якой карысьці віскаць пра ўжо здранцьвелае, вядомае? А зграбаць гэтыя абвешчаныя перакананьні таксама няма патрэбы.

Але Цярэм не пакінуў бы занядбанымі Міхасёвы словы. Ён чамусьці падакляраваў сабе змагацца зь ягонымі супярэчкамі. Цярэм адказаў бы яму таксама:

— Не падабаецца? Ня ўрымсьцілі табе? Дык некалісьці замалюю іх новымі і нячутымі.

Ах, Цярэм! Якая дзіўная ў яго намога знайсьці на дзяржаўных копішчах нечапаныя месцы. Сучасная дзяржава з дыктатарамі і з партыйнымі хаўрусамі й з адной партыяй — застаецца іх уласнасьцяй. Сучасная дзяржава — мытар бязбожны і багаверны: я не крану цябе, пакуль не паведамлёна табе аб падатку; сучасная дзяржава зусім аддзялілася ад народу-грамады: пасобку жывуць, у недаверы ціскаюцца… Дзяржава зашмат адабрала ў людзей іхных звычаёвых правоў. Я ня супраць дзяржавы. Я жадаў, каб нашая дзяржава зрабілася зборнікам людзкіх імкненьняў да Дабра і Справядлівасьці. Вось тады мы й ня будзем жыць у сацыяльнай дыхавіцы…

…Тым днём Цярэм не напаткаў нагоды выказацца свайму Міхасю пра дзяржаву, павучыць, як круціць дылам на сьвецемлыне. Уявіў, калі б Міхась слухаў ягоныя развагі, дык, напэўна, перарваў гутарку адным замахам:

— Не падоўжыш, родны. Зарана нарадзіўся!

Распрануўся і палез на сваю заўсёдна цёплую ляжанку спаць. Пакуль засынаў, у павалоцы мрояў туманілася адно незабытае, каторае ня друзьлела скрухай і ня друзьлела, як ён, а вечна аджывала, а гэта было яно — жыцьцё.

4

Цярэм разумеў, пакуль чалавек не асунецца ў магілу, можа асаджаваць старасьцяй нездабытае ў маладосьці. Але якое і чым? Шкадаваць няшчасных і памагаць ім? Аднак гэта Цярэм, бадай, адхіліў, а рашуча наважаў трымацца асноўнасьці пазнаваць чалавека. Якому калі трэба дапамога — дай, зрабі, а ня трэба — вылай і прагані бяз жаласьці. Без прымусу — чалавек гультай!

Пра будучыя неабходнасьці памогі Цярэм разьмеркаваў адносна: мужчына, што паважае шкадаваць кожнага, — вельмі недарэчны, бо ён у той нагодзе робіцца няўпэўнены, а яму трэба быць пэўным ды ўвераным. Ён пачынае спрачацца ўсялякімі довадамі аб несправядлівым, і няверанаму зусім ня верыць, хоць і ёсьць у тым праўда...

Сьмешны Цярэм! Кожны дзень не наводле папярэдняга. І яшчэ ў дадатак намагаецца падагнаць Міхася прыстасавацца да ягоных аскомінаў-развагаў. О не! Мабыць, у сваім апушчэнстве да поду жыцьця Цярэм сам нямотна адчувае аджываньне. Ён жадае тысячным наступнікам-людзям давесьці сваю недарэмшчыну на сьвеце. Ён думаў пра гэта не тады, калі клаўся спаць, або разбуджаўся й ляжаў ураньні на цёплай ляжанцы, ён думаў пра гэта, бадай, кожную часіну...

У панядзелак, яшчэ перад усходам сонца, калі Міхась мусіць рана ўставаць і ісьці ў Менск да працы, Цярэм усё-ткі асвойваўся зь ім нанова. І то якім шляхам. У Цярэма больш не знаходзіліся іншыя выйсьці-шляхі.

— Я дык ня ведаю, Міхась, як трымаць цябе. Хоць пакапаўшыся ў галаве, я здолею знайсьці што-небудзь супрацьстрымнае твайму крывацёку...

— Няўжо, родны, у вас няма іншае гутаркі? І якую волю жадаеце накласьці на мяне? — спытаўся без прыемнасьці Міхась.

— Ты ж ня ведаеш, пра што я буду гаманіць.

— Напэўна ж не анэкдоты ці навіны.

— А можа і навіны, скуль ведаеш?

Цярэм скрадліва прысеў у сваё мяккае, рыплівае крэсла дый пачаў:

— Добра, Міхась, вось ты разьвёўся з жонкай і, мабыць, зноў шукаеш тых самых грахоў. Але я, як чалавек стары, параджу табе: круціся найбольш каля гэтай памешчыцы... Я мушу толькі сяньня сказаць табе адну тайніцу: некалькі дзён даўчасу,

калі ты быў на працы, яна наведала мяне. Прызналася, хто яна і дзе спаткала цябе...

Цярэм не дакончыў. Цішыня зімовага раньня ў ягонай хаце зашамацела хуткай хадой Міхася ад стала да кутка, дзе вісела вопратка. Міхась не даеў сьнеданьня, апрануўся й пайшоў да працы.

Цярэм сустрэўся з Аленай невыпадкова, і невыпадкова ён думаў паведаміць Міхасю пра тое, што было гутарана зь ёй, але Цярэм зьбіраўся атрымаць больш часу. Алена спадабалася яму сваімі жаданьнямі, што ні ледзь ня розьніліся ад ягоных. А гэта: памагаць бедным... Хто мог быць рухмяным на гэтай пахрышчанай дарозе? Безумоўна, Міхась і яна, Алена. А ён сам пакіне іржавець паляўнічыя пасткі і возьмецца пісаць «Лісты з дарогі на той сьвет».

— У мяне няма нічога падараваць у спадак Міхасю апрача перажытога, надуманага і назіранага... А можа, і перачытае мае лісты і будзе тады чалавекам непашкоджаным сярод полымя жыцьця.

Вось якія жаданьні спаткалі састарэлага, на некалькі дзён ці год пакінутага жыць Цярэма! І на Міхасёва абурэньне падчас сьнеданьня не зьвярнуў увагі: пойдзеш да Алены, нідзе ня дзенесься! Жаночая прытула маладых вабіць, — хмыліўся ў гутарнасьці дзед і пераконваўся.

А ўвечары як заўсёды вярнуўся Міхась з працы, але не адзін, а зь дзяўчынай. Няшчасны Цярэм! Няшчасны як ніколі! Міхась прывёў дадому музыкантку. Ён зноў не паслухаў Цярэма.

«Які ён непашанны чалавек!» — падумалася Цярэму. Аднак не вахнуўся: ветліва запрапанаваў ёй сесьці і прабачыць, што змушаны на хвіліну паклікаць Міхася, каб штосьці памагчы зрабіць у трысьцені.

У трысьцені Цярэм, нат добра не зачыніўшы дзьверы хаты, спытаўся ў Міхася:

— Нарэшце ажно зь ёй да мяне! У госьці прывёў?

Гэта быў першы пачатак самай несхаванай нядружнасьці да Міхася.

— Няхай бы прыйшла перад палуднем да нас і забрала сваю леру, або сам аднёс.

— Даруй, родны, непрыемна стаяць тутака і гутарыць. Некалькімі словамі ня вытлумачымся...

— Я ня слухаю цябе! Я хачу ўтлумачыць табе, што я не займаюся штучнымі практыкаваньнямі над тваімі захаваньнямі, але

папярэдзіць: навошта ты водзісься зь ёй? Навошта прывёў яе да нас? Цяперака вайна — нечыстота людзкой душы й сумленнасьці і нечыстота цела. Яна ж, напэўна, з плоймай вошаў ходзіць. А ты яшчэ нанач прывёў. Дзе ж паложым спаць яе, адкажы?

— Ня крыўдзі мяне й яе... Яна мая будачая сужэнка...

— Жэнісься! — усхвалявана вымавіў Цярэм. — Вашалоўка праклённая — прэч зь ёй!

Міхась узяўся за клямку, каб ісьці ўсярэдзіну хаты.

— Добра — я зараз скажу: забірай віялянчэль і ідзі туды, скуль прывёў, добра? — Не... не! Чакай, Міхась, — сорам рабіць гэтак: няхай начуе ў нас...

Цярэм не зьмяніўся ў спатканай драбніцы дня, але ад неспадзеўнага непярэчаньня Міхася схапіўся за хітрасьць, ён сьцярог больш важлівае, чымсьці музыкантка будзе спаць у ягонай хаце.

— Як гнаць чалавека насупраць начы. Шукаць ліха не памагай...

Міхась, каб канчальна ўлагодзіцца Цярэму, сказаў:

— Маразы цяпер. Падумай, як магчымець жыць у неацепленым, разбураным падвале. Аж дрыготкі бяруць, калі ўявіш спаць там.

І Цярэм ва ўсёй асабістай здольнасьці характару ўмець ахаваць няўлету настрою сэрца пераступіў зноў, за Міхасём, парог хаты. Ягоныя вочы спаткаліся з позіркам віялянчалісткі. Ёй адчувалася ніякавата сярод знаёмых двух мужчынаў.

— Вось і вы, — магла сказаць яна да іх, у іхняй хаце.

— Уцешна, што наведалі нас, — пахваліў Цярэм. Узяў крэсла і паставіў яго блізка каля яе. Сеў.

— Зіма сёлетняя выпетрыць усіх, — працягваў гутар Цярэм.

— Другі месяц без адлігі, — падтрымаў яго Міхась. Што ж, ён мусіў неяк прыляпіцца да Цярэмавага суладу! Жадалася собскай хлуснасьці, каб адчуць і прыняць задавольную будучыню ў згоднасьці й падтрымцы.

— Вы гаманеце сабе, а я тым часам падрыхтую вячэру, — перамяніў гутарку Міхась прапановай.

— Не інакш як гэтак, — падтрымаў Цярэм.

На двары віскаў Мурза, і Міхась для яго першага панёс есьці. А тады, калі ён выйшаў, Цярэм нахіліўся наўсупрацькі музыканткі, загаварыў паўшапотна.

— Я ганаруся, што вы зьбіраецеся жаніцца з маім сынам, але найлепш вы крыху пачакайце з гэтым: не цяперашнім сьветам каб вяселіць — вайна, любая... Ня гневайцеся на мяне — я не адганяю вас. Шкада, Міхась вяртаецца, а так бы вы згадзіліся з маімі словамі...

Аднак, калі вярнуўся Міхась у хату, бадай вінавата, Цярэм паправіўся зусім іншым.

— ...а павячэраўшы, калі ласка, да палкоўніка Сконтаўта ў госьці. Сяньня прадпалуднем завітала сама Сконтаўціха і запрасіла да іх.

Міхась паківаў галавой — адмаўляўся.

Кароткая, але дастаткова зразумелая перад гэтым Цярэмава гутарка, а тады прапанова пайсьці ў госьці, спыніла музыкантку перад ім і Міхасём не ў ніякаватасьці, у апыненьні, калі нават і не хвалюючыся, ня можаш даведацца адчуваньнем: ці гэта напаткалася прыемнасьць, ці гэта прокмець сну, якая не абы-што прарочыць.

— Навошта нам ісьці да іх? — усё-ткі ўсьмешліва і поўнасьцю сьвядома спытаўся Міхась.

— А раз просяць, чаму не пайсьці і пабыць даўгі вечар сярод знаёмых. Што будзем рабіць дома?

Міхась скрытна паглядзеў у Цярэмавы вочы.

— Тады хоць сам, але я пайду, — крыху ганарліва, з гэткім самым позіркам, як у Міхася, агледзеў яго Цярэм. — Не жадаеце — ня трэба, сядаем есьці. Калі ласка, прашу да стала, — запрасіў Цярэм музыкантку. — Прабачце, а як жа клікаць вас?

— Насьцяй.

— Прыгожае імя, — не адчэпліваўся Цярэм.

Стары Цярэм! Стары, як уежджаны брук. Насьця аднак вычувала ягоную нейкую няроўнасьць і яшчэ больш саромелася гэтых двух мужчынаў. І каб ня раньняя зімовая ноч, яна б жадала пайсьці адтуль да свайго сьцюдзёнага падвалу ў Менску.

## 5

Як Цярэм ні ўпрошваў Міхася пайсьці ў госьці да Сконтаўтаў, ён усё-ткі не згадзіўся...

Маладая і прыгожая Алена спадабалася Цярэму. Пасьля першага знаёмства і досыць даўгаватай гутаркі застаўся ў вялікай захопнасьці ёй. Паколькі Міхась «разжаніўся» з сваёй «выкрутасткай на абцасах», дык цяпер ёсьць другая нагода ажаніць яго — ажаніць з Аленай. Яна ж дзесьці каля нямецка-савецкай

мяжы спакушвала яго, спакушаў яе і ён. Яна абы-так не магла прыйсьці і апавядаць пра сваю мінулую спокмець жыцьця! І Цярэм, стары Цярэм, наважыўся сесьці там, дзе прыйшлося напаткаць месца.

Ах, Цярэм! Каб не прыйшла Насьця-музыкантка, ён перад тым, як сказаць ведамку пра запросіны Сконтавай, ахрысьціў бы Міхася новым пацалункам ягонай хатняй філязофіі. Ён так і ўяўляў, як будзе захоўвацца падчас гутаркі зь Міхасём і як будуць разьмеркаваны ўсе незнаёмыя дагэтуль думкі і дакоры. І ня здарылася, што наўмервалася. Неспадзявана ціхая, з пастаяннай усьмешкай, калі слухала Міхася або Цярэма, завітала да іхнай хаты Насьця. Усё гэта ахоплівалася ў зразумелую тайніцу адной ёй і іх абоіх. Але як ні было цяжка ад ліха вайны, ад няшчасьця зь ейнай мацерай, яна падрыхтавалася спаткаць іншыя надары жыцьця. Сваю будучыню і Міхасёва прызнаньне ў каханьні да яе, а потым прапанова быць ягонай жонкай, рассуджвала самай надзвычайнай зьявай у гадох. Для яе яно, што надышло, чулася такім зьяўна-прыродным, што нат не пакідалася мізэрнага зачэпу разважаць над ім дастаткова празорліва. Яна, смутлівая па памерлай мацеры, ад Міхасёвай прапановы аджыла, завіхрылася вясёласьцяй, якую зьдзейсьніш толькі тады, калі атрымаеш наводле таго, як адведаў ейную апрычонасьць у сваім сэрцы. Яна інстынктыўна адбывала павіннасьць жыцьця. Пра пырскі жыцьця, куды яны спадуць, ці думаць? Гэташняя просьбна-супакойная чароўнасьць зь цяжкімі веткамі тайніцаў забірае нашы дапушчэньні. Нешта наводле мальбы пустара яно — усё!

— Бо мы людзі на зямлі, быццам пад дахам неба... І дзіва! Сапраўднае дзіва: крапнутая дажджына на павуціньне не здаецца павуку спажывай!

Вось гэтак на той дзень зьбіраўся Цярэм усчоліць духам Міхася. А кончыць незадавольным вывадам і выглядам упорлівага каяньня Боскага і паганскага заклінаньня:

— Мне жадалася, каб не адна мая рука вітала Цябе тут на зямлі.

І даткнуць, хіба чорнымі словамі:

— Хрыстос, няўжо ты думаеш, мы кіненае тут джала?

О, Цярэм! І ён ня выказаным, адным-адзіным, накіраваўся да двору Сконтавых. Усё-ткі яму адчувалася б гаротна, калі б прапусьціў, пратэрмініў выпадак дасяжнасьці для гадаванца. Добрае ўмеркаванае месца — Алена!

Як ніколі Цярэм зрабіўся не адносным да сваіх меркаваньняў і надумак. У першую зіму другой сусьветнай вайны, калі за грукатам вайсковых машынаў і харматаў не зьвінела слова хоць бы якой большай праўды, заместа бясконцых апавяшчаньняў праз газэты і радыё тайніц нялюдзкасьці праціўнікаў, ён, Цярэм, абагрэты ляжанкай, атулены дахам хаты, зажадаў убачыць сябе, старога, выпетралага, як рачная пяшчаная ўзлонь, сьвятым. Небывалым сьвятым! І яно, уладная прыгожасьць мрояў, расквечвалася ў ім, нібы спакойная процьвень хрысьціянства, нібы прыманлівы грэх разрухі. Ён адчуваў сваю будучыню болесьцяй роднага цела. Вясёліўся да стомнасьці ў сваім думаньні аб усім і апыноўваўся, як кепскі артыст тэатру, перад... Перад кім жа? Вядома, перад Міхасём.

Цярэм належаў сьвету сваёй Айчыны. Ён ведаў, што яна ёсьць, але яна гульлівая — вось што! Кожны хадзіў па яе прасьцягох з напеўнымі песенькамі перамогі і кожны губляў іх — засыпаны пяском тых прасьцягоў. Здрадная жонка — яна! Але Міхась, аднойчы ўцьвелены ягонымі «дадзеньнямі», сказаў яму хвастліва і ўвабразна: «Ты ўжо, родная сябрыня, мабыць, не ўпершыню абсьвістваеш нялюбыя напевы здарэньняў на сваёй Радзіме і, мабыць, да самае сьмерці будзеш гэткім сьвістуном!..»

І Цярэм, незразумелы, прагнаны духова Міхасём, без супярэчак, а часам і зь імі, ішоў да лесу аглядаць пасткі паляўнічыя, або спаць на ляжанцы. Міхась усё больш пераконна, бязь зьмены адносіў Цярэма да пакорніка дакучлівых гамонак. Але здаралася, калі неспадзеўна ахінаў абы-які смутак, тады Міхась, хоць па-ранейшаму ўпорасты, апушчаны дзед у зямную кашулю, пачынаў тую ж самую Цярэмаву гутарку — знаходзілася радасьць пагутарыць пра хіжацтва паміж людзьмі, пра іхнае хісткое шчасьце. Аднак шчасьце людзкое ў Цярэмавых меркаваньнях не было штосьці блудлівае, а жыцьцё, абнятае дасьмяротным спакоем безьліхалецьця.

Цярэм гэтак зьмяшаўся зь зямнымі недарэчлівасьцямі, што на свеце знаходзіў іх больш, чымсьці дабра і справядлівасьці. Яны цьвялілі Цярэмаву душу сваім незнарокам. Сабраныя толькі звычайнай прыроднай памяцяй, яны жылі ў ім не прыкладнікамі прывідаў, а перамаўляліся ўсялякімі словамі ў дрымаце чалавека, які не жадае паміраць у жыцьці.

Цярэм і тады, калі ішоў да Сконтаўтаў, думаў пра свае насуды Міхасю. Моцны мароз, ціхі прастор засьнежаных ніваў пад недалёкім чарнаватым замётам бору цешылі спадзяваньнем улагоды Міхася з Аленай.

— Прастай! Прастай — якраз на час! — у прысадзе да дваровай сялібы Цярэм пачуў голас Ахрэма. Той здалёку, будучы каля стадолы, пазнаў яго.

Цярэм пасігаў на сустрэчу з Ахрэмам. Яны былі даўно-даўно знаёмыя. Прывіталіся.

— Захлёбваюцца, братка, — паведаміў Ахрэм няўцемную навіну.

— Хто? Мо' што здарылася? — спытаўся ўважліва Цярэм.

— Навошта пытацца здарылася — ты ж ведаеш, чаго ідзеш сюды, ці не?.. Ды нарэшце ажаніліся. Цяпер, братка, я разьбяруся, хто палкоўнікава жонка... А па-мойму, — і Ахрэм пашкуматаў Цярэма за рукаў, — ён дармо ганяўся за гэтай дзяўчарухай, што на цябе падобная: усё вечна з благім спрачаецца... А сказаць па шчырасьці: Алена — дзяжа бязь цеста! Палкоўнік разумна зрабіў, што жэніцца зь меншай.

Ахрэм прыплюшчыў вока пад зашарашэлай бровай, хлопнуў па-свойску Цярэма, пасігаў побач яго да памяшканьня. Стуль з-за ваканіцаў прарэзвалася сьвятло, яно было ва ўсіх пакоях. Густы дым, зьмешаны з пахам сьвежа-наваранай вячэры, расьсьцілаўся па двары і каля голых ліпаў. Наводдалі жыльля ў кароўніку рыкалі каровы й цяляты. У гэтай наўзбочнай сялібе панавала валода жыцьця нават і ў прыходзе ночы.

— Ат і бачыш, — загаманіў уторна Ахрэм, — мне старому вазі іх...

Цярэм заўважыў:

— Чую носам сваім — ты ўжо пачаставаны...

— А па-твойму, як?.. Пастаім — справісься туды... Ажаніліся — і вазіць іх, ня выпіўшы гарэлкі? Ім што, маладзёнам: прыцісьнуліся адзін да другога — цёпла, а мне аднаму ў перадку мерзьні, плюшчы павекі, каб камяк з-пад капытоў ня тахнуў па воку... Ах-ха-ха! Што размаўляць з табой — размазваць сьнег па лёдзе!.. Калі хочаш, найперш да мяне зайдзі — пачастую. Я тут таксама гаспадар: усе гандлі праз мае рукі ходзяць... Ты ж паглядзі, нават спэцыяльную шапку сшылі. Усе ведаюць, хто я, і чуесься незьбянтэжаны — усё-ткі аніформа, як жыць безь яе? Каб больш аніформаў апраналі — пашаны на сьвеце было б ня ў меру. І ты, Цярэмка, тады, напэўна, ня рэзаў свой стары язык нейкімі рагімозьнімі... А як памру, я пра іншае кажу, — уздыхнуў Ахрэм, — дык ня ведаю, каму грошы запаветаць. Кажны дзень скубану лішні грош.

— Для мяне пакінь — памятаць буду, пакуль сам не скалею, — папрасіў ненасьмешліва Цярэм.

— Ідзі да пакояў — грэйся... Я гэтак пачаў гутарыць, бо наглядзеўся на іх, закаханых, маладых, што ажно самому хочацца зноў быць маладым... Вязу сабе па серанку, па расчышчанаму гасьцініцу, думаю пра пакойніцу мацер палкоўнікаву, а яны пагамоняць, пагамоняць, засьмяюцца і плёх да пацалунку. Тады ажно горш старому. Неяк ад іхнага сам ня сам робісься — па каню сьцёбую, хоць і няма патрэбы падганяць яго...

— Далібог, Ахрэмка, не пабяжы босым па сьнезе!

— Цярэм, ня дзьміся навучоным — усёдна ў валёнках залапленых ходзіш, а я, ненавучоны, а хаджу, глядзі: у петравых нават!.. Але спрачацца з табой ня буду.

— Я ж і не спрачаюся.

— Сьціхні, Цярэм, я ведаю твае кепікі: так і цэліш грызануць за сядалаўку. А я ведаю адно: праз год, празь месяц ніхто не памяне Цярэма... Валей скажы: хочаш пачаставацца, дык калі ласка да майго катуха!

— Дзякую!

— Ідзі, ідзі расьпярэзвайся перад ёй, бо ж палкоўнік з Ганяй кадзе вярнуўся з пагулянкі, спаць пойдзе... — жанатым карціць.

— Няпраўда — яны баляваць будуць... Дабранач, Ахрэм!

— Добрай ці благой ночы мне ня помач, — з пагардай расстаўся Ахрэм на калідоры зь Цярэмам.

— А дзе ж твая гаспадыня месьціцца? — спытаўся похапна Цярэм.

— Наўпроцькі стаіш... Ідзі, ідзі... ракам упаўзі — паважней будзе, — цяперака зусім пакрыўджана й нясьціпла выказаўся Ахрэм. — Хвілязоп, а я маўляў сабака, дык і ня ведаю, што называюся сабакам! — з гэтым нараканьнем ён дайшоў да свайго пакою. І адразу не пайшоў усярэдзіну, а цыркнуў лёгка сьліну на сьцяну, узяўся за ручку дзьвярэй, чакаў, пакуль Цярэм увайшоў у Аленіну гасподу.

...Ейны пакой быў клапатліва абсталяваны. Ад уваходных дзьвярэй да пісьмоўца і туалетнага століка слалася квяцістапоўная сьцежка пэрсыдзкага ходніка. Ад яго да занавесу, які захінаў ад назіру Аленіну пасьцелю, расьсьцілаўся накрывам ашхабадзкі кілім. Два вялікія вакны ўзорыліся абвісяй празорыстай пеляны вэляну. Побач з туалетным столікам і люстэркам у аправе магілёўскіх разьбяроў стаяла зеленаватая канапа пад колер сьцен і занавесу каля ложку. Калі ўвайшоў Цярэм да пакою, Алена сядзела на канапе. Яна вельмі любіла праводзіць вячорны час у спальні-пакоі. Таму і паклапацілася прыбраць усё там у кволую ўтульнасьць, каб з прыемнасьцяй класьціся

спаць там і, устаўшы, сесьці на канапу і, бадай, ясьніста ацяжарвацца развальнасьцяй старасьветнай памешчыцы.

— О, як добра, што вы найперш да мяне! Сядайце.

З уражаньнем на абліччы борзда ўстала Алена з канапы і прапанавала Цярэму крэсла. З гасьціннай рупнасьцяй падтрымала Цярэма за руку, калі ён садзіўся.

— Як ня радавацца — нарэшце вы наведалі мяне, — з шчасьлівым усьмехам, бадай, у самае Цярэмава вуха гаманіла Алена. Аднак Цярэм апрача прывітаньня: «Добры вечар, спадарыня!» — нічога не адказваў на ейныя ўважнасьці. Ён таксама, не з малой прыемнасьцяй, усьміхнуўся, але зь неадступным хваляваньнем, якое найбольш зіхрылася на ягоным ваччу і выяўлялася ў намозе рук абаперціся на бакавыя пярэчыны крэсла. Скрытна зірнуў на Алену.

— Дзіця маё, — пачаў Цярэм, — а як інакш? Я адразу да вас, каб крыху пагутарыць...

— Хіба ж толькі?.. А што, Міхася ня будзе? — спыталася з пэўнай насьцярожнасьцяй Алена.

— Ён дома застаўся.

— Ах, як шкада! Я пайду сама і прывяду яго сюды. Няхай пабачыць, як буду жаніць палкоўнічка з Ганяй...

— Гэта з Сконтаўтам?

— Але, з Сконтаўтам — няхай будуць разам... Ах жа Міхась! Тут ягоны Арэмчык ёсьць... А ўсё-ткі я прывяду Міхася!

— Ён ня прыйдзе... мы ўдваіх аб чым-небудзь дамовімся.

— Вы нешта благое прынесьлі мне. Не трымайце — кажэце!

Алена не адыходзіла ад Цярэма. Ён узяў яе за руку і сам, чалавек нецярплівы, сказаў заўсёдным прызвычаем — беззадхільнай прасьціннасьцяй:

— Ён думае жаніцца.

Алена вярнулася да канапы, села зь неадступным пазіраньнем на Цярэма.

— Жэніцца?.. А ведаеце, Цярэм, каб вы маладым былі, дык напэўна б ажаніліся з мной, праўда ці не?

Нясьмешная ўсьмешка кранула Аленіна аблічча.

— Ну скажэце — прашу!

Цярэм ледзь-ледзь прысядліва зварухнуўся ў крэсьле і пачаў гутарку пра намер, што жадаў паведаміць ёй.

— ...валей дамовімся, якім прыманам адвярнуць Міхася ад жанімства з тэй паганкай, накш яе й не назаву.

Прынікнуты завіхнасьцяй запэўніваць ды пераконваць, Цярэм узьняўся з крэсла.

— ...з музыканткай вашывай надумаўся — доктар называецца.

— Навошта, мой старэнькі жаніх? Навошта сыцюдзяніць тое, што належыць ім?

— Спадарыня, я паважна хачу гутарыць пра гэта!..

— ...дзякую! Даруйце за недалікатнасьць!

— Я не сярдуюся за вашыя прокмеці. Я прапаную, як зрабіць немагчымае сваім. Аднюсенька ўважліва паслухайце мяне.

— Дзякую! Прашу! Я люблю прасіць...

Алена падбегла да Цярэма, абняла за шыю. Узбудрожана прыціснулася да ягонай шчакі. З душэўнай выразнасьцяй патрэбы агледзела аброслага барадой Цярэма. У яе знайшлося адразу зьдзіўленьне ад навіны, і больш яно не адрозьнівала якіх-небудзь іншых ураженьняў ці думак.

— Жэніцца? Няхай!.. Навошта парады мне вашыя?.. Але вам скажу: вы насапраўды мой сужэнец, што парупіўся састарэцца, — прашаптала яна, бадай, у зьдзеку зь Цярэма, бадай, у хваравлівым дрывеньні. Ёй не жадалася адыходзіцца ад сябе самой — завяліка была спрагнасьць да таго, што жадала.

— Не хвалюйцеся, — паспрабаваў упрошваць Цярэм, і ў гэты час пастукалі ў дзьверы пакою.

— Ах, Ганя, калі ласка!

— Алюся, у сталовай усё падрыхтавана. Пакінула дзьвюх жанок падносіць і прыбіраць. Ужо каля паўгадзіны да пачатку.

— Дзякую, Ганя!.. А жанкі тыя могуць дадому ісьці, бязь іх абыдземся...

— А-а, добры вечар вам! — нарэшце прывіталася Ганя зь Цярэмам, а тады, абыякавая пачуць Цярэмаў адказ, як птушка перад узьлётам — лапкай па крыле, шарахнула даланёй па сукенцы, пацікавілася ў Алены: — А як падабаецца мая сукенка? Барыс падараваў.

— Мая сястрыца, а я й не заўважыла!

Крыху адышлася ў сьцень сьвятла лямпы, каб аглядзець Ганю зводдальку.

— Вельмі прыгожая! Вельмі, сястрыца!..

Памалу вярнулася да яе, і яны пацалаваліся. Ганя зараз жа накіравалася да выхаду. Зачыняючы дзьверы, яна кароткім супакоем, недадумна: чаму ён тут, зірнула на Цярэма.

— Мы й безь Міхася абыдземся. Хутка з вамі шусьнём за стол, і ўся наша нярадасьць у келіху ўтопіцца! — як толькі выйшла сястра, зьвярнулася Алена да Цярэма. — Мо' як-небудзь там падробімся пад вясёласьць палкоўнікаву і сям'і Арэмчы-

ка — ён із сям'ёй у нас — забылася сказаць вам... Але Міхасю перадайце ад мяне: няхай сірот ня плодзіць...

— Якіх сірот? — схамянуўся Цярэм.

— Тых, пра якіх вы, мой згодны спагаднік, казалі...

— Даражоная, Міхасёвы непаладкі жыцьця я не хвалю, — заўважаў спакойна Цярэм, мабыць, абы адказаць бяседніцы на дапеклівы ўцем.

— Не крыўдуйце на гадунца свайго...

— Хай, па-вашаму, гадунец, але ён мой сын, з маіх рук пайшоў у людзі, і між людзьмі ня рак ашпараны, а тое-сёе значыць ім ды мне.

Цяпер ужо зусім авалодна адказаў Цярэм Алене, а тое, што зьбіраўся ўмовіцца зь ёй, прыпынілася. Ён затурбаваўся іншым. Заясьнілася небясьпека будучага знаходжаньня Міхася перад вачыма грамадзтва. Трэба пераканаць Алену аб ейнай несправядлівай узвазе Міхасёвай параднасьці.

— Мой сын — чалавек добры. Малады яшчэ, а маладыя, вы ўсе, наўднім днём не жывяцё...

— А я не ганьбую яго. Адно сказала: сірот няхай ня плодзіць! — сумна-шапотна ўторыла Алена ранейшыя словы, і Цярэму яны не спадабаліся непадзельна ды аканчальна.

— Я зразумеў вас, каб усё, што знаходзіцца каля вас, мусіла задавальняць вас? А вось спрыт спраставаў не туды, куды думалася: сірата зьявілася. І пра тую сірату вы ні адным гукам спагады, нат праз зубы, не спрабавалі выціснуць, а пакуль сірата дзесьці ў памяці існавала, каханьне да майго сына апынулася спадкам дзеля вас, хоць яно й ня ёсьць гэтак. Вы ўспомнілі сірот тады, калі зразумелі, што нейкую быццам волю мой сын адабраў у вашэці. Крыўда на яго бясчасная, яна — як жменя солі ў вочы...

— Мой шанованы, лепш скажэце: як палец у калясо! — перашкодзіла Алена Цярэму, быццам зьбянтэжана, быццам з ахвотай гутарна пагуляць або пазьдзекавацца зь яго, гэтак як рабіла з палкоўнікам. І Цярэм не прапусьціў міма. Яно запэўніла яго, што Алена насапраўды жадае знайсьці выказы, якія б абразілі яго й Міхася.

— Я прыйшоў з добрым намерам да вас, а вы-ы...

У дзьверы пастукалі. Цярэм заняўся з сваёй вушлатай шапкай — пакручаваў яе ў руках з захаваньнем маладога, сурова выхаванага хлапца, бо... Усё-ткі трэба ўхіліцца разрыву з Аленай. Настрой жанчыны, якая спадзявалася дакончыць недакон-

чанае шчасьце — быць каханай Міхасём, даўцяўся ім. А таму аставалася: як найбарджджэй пайсьці ад яе.

Алена адчыніла дзьверы. Ахрэм клікаў займаць месца разам з гасьцямі.

— Добра — я зараз.

З паўадчыненых дзьвярэй на калідоры пачулася некалькі ўрачыстых пахлопаў Аленінай далоні па шчацэ Ахрэмавай і вясёлы гутар Арэмчыка. З Арэмчыкавых вуснаў голасна пачулася:

— Нерухомасьці цяперака, пане палкоўніку, манастыр Боскі.

Размова і сьмех заглухлі — Алена зачыніла дзьверы. Ахрэм ад задавольнасьці адрывіста кашлянуў усьлед.

— Ну нічога — забудземся на ўсё... Час павяселіць! Адвясёлімся на іх вясельлі, а на маіх хаўтурах! — сказала яна зналусна-моцным голасам.

Цярэм адмовіўся.

— Нізашто. Я не патрэбен тут.

І Алена ня ўпрошвала яго астацца на гасьцяваньню. На ягонае пажаданьне — Дабры Божа! — яна не магла адказаць. Як толькі ён выйшаў з пакою, ізь сьцісьненых вуснаў разьбегліся галіністыя, кароткія складачкі па абліччы. Гэтая непраменная маланка душы судрыгнула ейны стан, пакутна прытуліла далоні да вочаў, і ўся прыгожа складзеная постаць абнялася хвалістымі зборачкамі сукенкі. Яна плакала.

6

Доўга балявалі Сконтаўты зь сям'ёй Арэмчыкаў. Адбывалася й зьдзяйсьнялася Аленіна навага, што абвесьцілася ў неспадзеўных абставінах для самой сябе: зноў спаткацца зь Міхасём. Яна прынесла яе ў сваю незалежнасьць асудку здары: дамаглася бачыць пакліканыя схопы рассудкаў і наветаў самымі аб'явістымі існасьцямі магчымасьці. Яна захапілася гэтым. Паклапацілася прынесьці палову ўжо зьдзейсьненага свайму імкненьню: настоіла, каб палкоўнік жаніўся з Ганяй. Разьлік быў зусім звычайны, але з двух разнайменьнікаў намеру. Тое, што палкоўнік тайна жыве з Ганяй, як з жонкай, пра гэта будзе ведаць толькі Міхась; і другое, больш канчальнае: яна зьвяртаецца да акупацыйнага нямецкага суду аб разводзе з палкоўнікам, пасьля чаго той можа абвясьціць шлюб з Ганяй.

І надуманае зрабілася сапраўднасьцяй.

Пра гэта Арэмчыкі ня ведалі, яны былі запрошаныя пагасьцяваць і крыху адпачыць уводдалі зруйнаваных камяніц сталі-

цы. Ды Арэмчык якраз ня той чалавек, каб гасьцяваць, растрачваць часіны жыцьця дарэмна. Ён шукаў у палкоўніка сяброўства вельмі добрага й адданага. Таму ён шчыра й няшчыра хваліў гасьціннасьць гаспадароў, захапляўся стравамі, распускаўся даўгімі размовамі пра сваю парадачнасьць і дбайнасьць, аб досягах у працы па ахове мянчанаў ад ліхалецьця вайны; тлумачыў вартасьць золата і самацветаў на пясьцях ягонай дачкі й дамаведкі; і, нахіліўшыся да Алены, з самапрыемнай усьмешкай даводзіў ёй:

— Я не мікроб, як вы сказалі, я — малекула матэрыі нашай эпохі.

Алена, не разлучаная аніледзь зь Цярэмавай навіной, з чаканьнем прыпыну ў Арэмчыкавай гутарцы, непрысутная ў сваёй задавольнасьці жанчына, адказвала Арэмчыку з выглядам мужчыны, які напатканага бяседніка ўжо даўно пагарджае дый ненавідзіць: «Па-мойму, тую матэрыю вы не мацуеце і ня творыце, а разьядаеце. Мікробік-малекула вы!»

Арэмчык сьмяяўся. Па прызвычаі гэтак захоўвацца да жанчын, вольна і ўласна, правёў рукой па Аленіным усьплеччы. Яны былі роўныя ў гутарцы.

— Жартуеце зь мяне бяз жалю… Даруйце, я крыху пазьней дакажу вашу памылку… Пане Сконтаўце, што вы прыліплі да маіх дзяўчат? — зьвярнуўся ён, вясёлы й не зьбянтэжаны Аленінай кпінай, спакметнай, як злая хвароба.

Палкоўнік у ціхаміры варшаўскай ветлівасьці — экстаз забыўлівасьці сябе, папрасіў прабачэньня ў Арэмчыкавых жанчын і Гані, пайшоў ад іх. Яны, пакуль Арэмчык гутарыў з Аленай, слухалі ігру Арэмчыкавай дачкі на піяніна. У дачкі адрасьлі вельмі каляныя пальцы для авалоданьня адзыўнасьцяй клявішаў піяніна, але бацька патрабаваў умець, і яна скаралася цярпеньню знаходзіцца кожны дзень, надвячоркам, музычыць. Дамаведка ж Арэмчыка нават паспрабавала выпеяць нейкую для яе ўразьлівую песьню і адмовілася, бо ня ведала зь яе ўсіх словаў. Гэта быў да сьмерці баравы шум шчасьця! Шчасьця, якое можна бачыць і выяўляцца ў ім.

Але бывалі дні, калі яна прынуквалася ў самай горшай натузе выканаць Арэмчыкавы даручэньні. Займацца адшуканьнем абшліфаваных і апрацаваных скарбаў зь зямлі — золата або дыямэнтаў. А таму яе можна было напаткаць на рынках паміж затулаў руінаў, у захонах брудных наўгародаў. Яна поўнасьцю зрабілася спрытлівай, находлівай куркай. У непадазронай здольнасьці выграблявала на ўсялякай дрывотні-шуметнітку

зярняткі зіхатлівага мэталу і цьвярдыя крупіны самакаляроў. А знайшоўшы, усё астатняе тады дакончваў сам Арэмчык. У Арэмчыка дзеля перамены на неспарахнелую спажыву-каштоўнасьці было дастаткова харчаваньня — аўсянага хлеба, пахвяраванага для мянчанаў. Ды зачастую ён спалучаў «калекцыянэрскія» выхадкі з больш наяўнымі фінансавымі рухлівасьцямі, ад якіх нават мусіў цьвяліцца й асьцерагацца — гэта называлася ім грашыма-чыстагонам. Бадай, геамэтрычнай укладнасьцяй чагосьці.

А тады, калі падышоў да яго палкоўнік, спытаўся:

— Ну што, пане палкоўніку, нагутарыліся, — і як быццам ня госьць, а гаспадар узяў за далонь палкоўніка дый падвёў бліжэй да сябе. Ціхім галаском ажно ўторны раз даведаўся пра здароўе, пра самаадчуваньне ў «далечыні ад натоўпу», падзячыў за добрыя настойкі й нарэшце прапанаваў паслухаць некаторыя вельмі важлівыя неабходнасьці.

Скупчаным абліччам з выразьлівай уяўнасьцяй жаночай асьцярожнасьці на ім азірнуўся на Алену.

— Пане палкоўніку, мне так жадалася завітаць да вас... Мне ўдалося, мо' сказаць здарылася, здабыць з разбураных аптэкаў і фармацэўтнага заводу шмат мэдыцынскіх лекаў. Перахоўваць іх у Менску не выпадае: вайна круціцца як чорт — могуць самалёты наляцець і збамбіць, могуць здарыцца і іншыя няшчасьці сярод галечы ды руінаў...

— О, гэта так! — раўнадушна пацьвердзіў палкоўнік недакончаную гутарку. І з падлоб'я глянуў на Алену. Іхныя позіркі сустрэліся. Яна таксама далучылася да жанок, якія моцна сьмяяліся ад анэкдота, апаведанага Арэмчыкавай дамаведкай.

Палкоўнікава ўстаўка задавольна падзейнічала на Арэмчыка.

— Прыемна чуць, што вы разумееце мяне, бо на мне спачывае цяжкі абавязак часу. Але трэба думаць і пра сябе, бо ж ня можа быць чалавек аднаго прычыну — трэ ўсебаковасьць. А калі яе няма — захлынаесься, увалісься, як казулька ў яму, і будзеш поўзаць там і ня ведаць, што ўваліўся туды.

Арэмчык папрасіў палкоўніка сесьці на канапе.

— Я веру, што ўмоўлюся з вамі, пане Сконтаўце... — і, быццам павучок на аддзельнай павуціне, павіснуў водзіркна на жанках. Ён чагосьці асьцерагаўся. За ім утаропіўся і палкоўнік, але позірк таго, у адмену Арэмчыкавай асьцярожлівасьці, быў зьдзіўлены: Алена найпершая перарывала агульную гасьціннасьць — жадала жанкам добрай ночы. І Арэмчык, калі пачуў, што яна адыходзіць, блізу ўскочыў. Не чакаючы Аленінай ласкі

разьвітаньня, пакрочыў да яе, каб пажадаць добрай ночы ды з паважнасьцяй сказаць свой заўсёдны, аблякаваны камплімэнцік:

— У сьне мы абсыхаем! Дабранач, спадарыня! Мне было прыемна з вамі!

Дамаведка і дачка ад гэтых словаў прарэзваліся застыглай усьмешкай, прырыхтаванай трымацца хоць бы да самай сьмерці. Арэмчык за іхную ўветлівасьць абавязкова паварочваўся да іх і даваў ім моўкны, ухмылісты позірк, значыць, ён кончыў.

— Прыгожую жонку напаткаў… вельмі прыгожую, — пахваліў Арэмчык Алену, як толькі яна выйшла зь ядальні. А тады чутней вярнуўся да ранейшай гутаркі.

— Я, пане палкоўніку, жадаю прасіць у вас месца ў склепе…

— Навошта ж гэта? — спытаўся палкоўнік, неахвотны працягваць гутарку. Ён губляўся ў іншай волі неспакойных думак. Пачынала акоймаваць яго Аленіна ўзьдзея, што кадзе прывяла да жаніўства з Ганяй, і адначасна зьяўлялася нараклівая шчымі-на асуджэньня асабістага захаваньня на будучае, ужо не з Аленай, а з Ганяй — з сапраўднай жонкай.

— …мэдыкамэнты перахоўваць буду. І, думаю, за ўсё будзе добры зыск, а на вашу долю рэнтныя пападуцца ня ў крыўду, а даходам. Згодны ўпусьціць?

— А чаму не — калі ласка… склеп пустуе.

Арэмчык удзячліва працягнуў руку палкоўніку.

— Паверце, пане палкоўніку, ад першае часіны знаёмства там, у Менску, я зразумеў вас сябрам і чалавекам каштоўнай якасьці… таму дзякую й цешуся вашай ахвярнасьцяй. Вы ж нямецкага паходжаньня.

— Ах, нічога! Чаму не адмілаваць на патрэбу?

— Даруйце, што падчас гасьцяваньня я парупіўся гаварыць пра мае клопаты. Мы людзі і ў нас кароткі час для жыцьця і для ўсяго.

Яны абое замоўклі, бо Арэмчык ад неспадзеўнай дамовы, бы калека ад багатай убожыны, разьлічана заглузьдзеў — уветліва глянуў на палкоўніка, на Ганю і на сваіх жанок, пачаў занята пашукваць у кішанях, прамаўляючы:

— Дзе ж гэта я паклаў?

Але ў сапраўднасьці ён нічога не шукаў у іх — ён проста хацеў задаўніць палкоўнікаву згоду. Як выпусьціць каштоўнасьць парожніх скляпеньняў пад маёнткам? Яны апынуцца ў надзейных руках, яны пад сталёвымі замкамі будуць паступова ўціскваць пладзіню Арэмчыкавага дабрадзейства. А што там

гэткага? Звычайныя валяр'янкі ды бэлядонны! Навошта, каб яны перашкаджалі сталіцы і так ужо скамянёнай і ўсім засмуроджанай. Невялікія шкляначкі і ўсялякія парашкі зусім безынтарэсна падбяруцца, паставяцца ў скляпеньні, а потым перашлюцца, ды хоць бы ў Прагу, у Бярэсьце, там яны будуць карыснасьць. Часам мізэрная гарашыніна, а накорміць! Паглядзець: шкляначка! Зьбіраеш гэткія нікчэмнасьці выключна для асабістай прыемнасьці, а прыгледзісься — заўважыш: яны і ў багароднасьць цябе ўнураць, — пацярпі толькі. Шкляначка не парожняя! Шкляначкі з мэдыцынай! Арэмчык будзе ратаваць імі людзей у ліхалецьці вайны ды адначасна клапаціцца пра сваё жыцьцё на будучае. Мусіць жа кожны пра сябе падумаць і вырашыць, да чагоісьці, да чаго прыперціся, дзе схіліцца, а перад чым устаяць і вытрываць! Ах, Бог, якіх пераменаў, заклікаў, адмоваў і захадаў ні напаткаеш у жыцьці!

— Але... але, — адклікнуўся палкоўнік, быццам здаўмелы моўкнасьцяй. Яго зусім агарнула ні то блуджэньне ў смутку, ні то дзівосныя ўрочыны пешчаў ад законнай, хоць і затаенай для сьвету, жонкі — ад Гані. Якая без хваляваньняў, шчасьлівая і вясёлая, закаханая і супакоеная ў ім, усё слухала Арэмчыкаву дамаведку: сьмяялася ад сьмешнага і падказвала ёй з прычаснасьцяй самастойнай, узапраўджанай жанчыны. Крытыкавала і захаплялася вечна-ўрачыстай зіхатлівасьцяй самакаляроў у залатых і плятынавых жуковінах на пальцах, на шыях гасьцей, але калі тыя спыталіся ў яе: навошта носіць шлюбны пярсьцень, схлусіла гасьцям:

— А нічога — дзеля любасьці нашу...

— Ах, вось як! — кратанулі цікаўна вусьніны Арэмчыкавы жанкі. Ім было дастаткова адказу — яна з адзіным, бедная перад іхнымі.

— Можа і нам падсесьці? — нарэшце, але па-ранейшаму зь містэрыяй абмацваньня кішанёў, прапанаваў Арэмчык. Палкоўнік згадзіўся і адначасна зацікавіў іншай прапановай:

— Ганя, госьці адпачыць жадаюць, не загамоньвай іх — сталіся аднак.

Ганя схамянулася.

— А дзе ж Ахрэм?.. Хаця што я кажу? Сама завяду вас да гаспадаў. Там ужо парыхтавана і ацеплена. У нас ня ў вас: спакой ды мілась'ць.

Яна абабіла лёгкім абтрэсам рукі прыседжаную сукенку. Усьміхнулася да палкоўніка. Яна кеміла сваю і ягоную парыўнасьць. Цяпер ён належыць ёй. Адмовіўся і перамог каханьне

да Алены, а яна, Ганя, назвала гэта сваім шчасьцем, прылукай дзён, жыць ахвотай прыгоднасьці аднаго дзеля другога.

Ганя — маладая жанчына, але яна зажадала кволіць сябе ў прадчаснасьці каханьня да палкоўніка. І гэта была таксама спакусная спадоба ўмацавацца, пакуль будзеш жыць тут, на зямлі. Яна спаткала ўлагоду сваёй сапраўднасьці.

Палкоўнік забыўся на мінулыя супрацівы сваёй душы Аленінаму сумленьню. Часам сумленьне — непатрэбная рэч, якую не шкада выкінуць на знадворак.

— ...і вось мы з табой, — прагаманіла Ганя, быццам было яшчэ патрэбным расьцерушыць стары сумлеў. Яна стаяла недалёка ад уваходу ў палкоўнікаў пакой — азірала. А ён вінавата, нават зь нейкай саромнінкай падлётка, глядзеў на яе:

— Мне здаецца, у цябе няўтульна, вельмі няўтульна, — жартаўліва, ківаючы галавой, з шчасьлівым усьмехам па ўсім абліччы, падбегла на цыпачках да палкоўніка. Яны абняліся даўгім пацалункам. А тады неадлучна блізенька, каля самага вуха, Ганя нешта шэптам спыталася ў палкоўніка, ад чаго зь ягоных грудзей вельмі незалежна, маўляў, яно існавала ў ім аддзельна ад усяго цела, адклікнулася жарсьлівае слова:

— Любая!..

І яно было аднолькавай моцнасьці з Ганіным шэптам. Мілы неспакой агарнуў палкоўніка. Як сялянскі хлапчук-ягня, ён падняў Ганю на ўлоньне — панёс да ложка.

## 7

Ганя дамаглася таго, чаго жадала, да чаго імкнулася. Адразу, бязь нейкай аглядлівай маруды, пацягнулася да свайго прызначэньня ў жыцьці і апынулася ў ім прынятай. Назіраньні за дзіваватым захаваньнем Алены да палкоўніка паступова прывучалі яе да існасьці своеўласнай сувязі зь іхнымі абставінамі. Донь блізу кажнадзённых пафасных, нейкіх неспакойных спрэчак паміж імі адстойвалі ў ейным розуме і сэрцы пасяродную ўмову асяганьня сьвядомасьці цьвяльлівай станьвы. Найперша сьціпла, а зь цягам часу сласнотна, падыходзіла да яе часіна, бы спагада палкоўніку, што потым скваплівa ператварылася ў сяброўскую прыгляднасьць да яго, і жарсьць адчуць гэтага дарослага чалавека ў юнацкім пачуцьці, не памарудзіла зьявіцца самым сапраўдным неспакоем: ня ўтраціць яго.

Раўнавага, парушаная Аленай, нарэшце падаравалася Гані. Алена зрабілася рахманай... аднак зразумелай аднастайнасьцяй: яна ня вельмі пэўна спадзявалася на Міхася, таму шмат думала

пра гэта і не жадала, каб нехта перашкаджаў ёй кволіць мройны супакой каханьня. Гэта была вялікая квола няскрытнасьці сябе перад сабой. І ў тым Алена знаходзіла прыкметы няўпэўнасьці мінулага каханца і собскую не адоленую кайнасьць: яна ўсё-ткі намагалася пераканаць сябе ў неразумнасьці ўчынку перад Міхасём — пасьля смутнага, ізь зьвярынай незнаёмасьцяй сустрэчы ў сьвятыні каля забітага лётчыка ня трэ было клікаць яго на спатканьне ў маёнтку. І прадчуваньні Алены ня схлусілі ёй. Міхась не вярнуўся да яе. Ужо ў часе спатканьня, калі была хворай, ясьніста ўбачыла ягонае захаваньне. Ён тады знаёмы, некалісьці аблашчаны ў ейнай людзкай, інтымнай пяшчоце, нарэшце сказаў ёй: «Я ня памятаю вас!»

Яна мусіла ўкорліва, бяз кропелькі пагарды, прыпамінаць яму ўсё былое, зусім нядаўняе, у чалавечым адчуваньні і часе, які нават ня справіўся адысьціся прывідам успаміну.

Алена не забывалася на тыя дні. Яны прынукалі яе ўзьнікнуць разважлівасьцяй над сваім жыцьцём, патрабавалі асьцярожных крокаў да мінулых захопнасьцяў. І кадзе, калі ў доме ўсе спалі пасьля гасьцяваньня, яна нераспранутая прылегла на пасьцель, каб зганьбіць сябе, асудзіць ды прыклясьці. Была магчымасьць сумленьня, якое не вярталася да яе, а яшчэ болей разбуджвалася ў сьвядомасьці асабістай журботнай волі да чагосьці імкнуцца. Цяперака сучасныя для яе імкненьні некалісьці таксама хісталіся ў задуменьні смутным і палахным уяўленьнем: бо яе найбольш палохала здара быць прыгнанай з Ганяй да кагорты людзей, што пры ўсёй здольнасьці працавітага і дбайнага працаўніка мусілі апыноўвацца на іншым шляху шуканьня штодзённага спажытку для існаваньня. І яно спаткала яе. Піхнула адчыніцца сьвету праз грэх з палкоўнікам у полымях Варшавы... і ня здарылася. А барацьба клічу да грэху дзеля кавалка хлеба і вечна разбуджаная памяць аб дрэнным жыцьці ў маленстве напоўнілі сэрца Аленіна спрагай любасьці будучае маці сям'і. Ёй жадалася сваіх родных дзяцей ня гэтакімі, як яна была сама, а мерай іхных нетурботных спадзяваньняў шчасьця й радасьці. Але адначасна ў ёй расла асалода грамадзкасьці, якую намагалася задаволіць у клопатах памогі людзям.

Алена мацней і мацней завязвалася ва ўспаміны. Незаплюснутымі вачыма глядзела ў цемень столі, быццам там перад імі пралётвалі чародкі аджытога й адчутага. Яна ўспамінала Міхася ў той дзень, калі ён узяў яе да аўтамашыны, і яна на яго пытаньне: «А дзе ж вы жывяце?» — адказала яму: «На хутары Лясанцы». Спахвацілася, бо ў сапраўднасьці ня ведала, дзе той

хутар, дзе да яго дарога. Але Міхась якраз ведаў і з ахвотай падвёз яе туды. Як яна палохалася выявіцца на выпадак зьдзіўленьня маці палкоўнікавай. Аднак Міхась падараваў ёй пушачку цукерак і на ўзгорку, недалёка ад хутару, прапанаваў пайсьці самой да дому. Яна ўзрадавалася гэтаму. Адчыніла хутка дзьверцы з аўтамашыны. «Ах жа спрытныя вы!» — усклікнуў расьсьмяяна Міхась. Алена спынілася паўзбоч ва ўдзячнасьці, а ён жартаўлівай вольнасьцяй паманіў яе пальцам.

— Прыеду заўтра да вас — павозімся. Добра?

— О, калі ласка! Толькі вечарам, бо працы шмат, — хлусьліва адказала Алена. Ён зноў засьмяяўся быццам даўно знаёмы.

— Я закахаўся ў вас, — не з прыкіднасьцяй сказаў ён ды старгануў тамавікі, шпарка пагнаў аўтамашыну з пагорку. Алена памахала рукой. А праз некалькі часінаў яна спаткалася з маці палкоўнікавай.

Сярод ніў, зарослых дзікай мядзянкай, побач з густымі кустамі лазы і ялінцу, стаяла хата замшэлая, як вялізны камень-валун. Маці абыякава, вузенькімі вачыма, падсьлепавата азірнула Алену і папярэдзіла:

— Паненачка, цяпер на працу не наймаю.

— ...а я ад сына да вас.

— Ад майго Барыса? — пабуджаным голасам спыталася яна і не давераная, што пачула, угледзелася на Алену.

— Але, — запэўніла Алена. І тады сумніў маці прапаў у сьвятыннай прыгнёці радасьці. Ейны позірк вочаў зарасіўся сьлязінамі. Зіхрыста-наплыўныя, з старых пабялелых павекаў, стрымнулі па аблічча, віхліста пацяклі па ўрэзістых маршчынах.

— Ахрэм! — быццам каля яе не знаходзілася Алена, клікнула яна ў бок старых з высахлымі вершалінамі грушаў, па камлёх якіх віліся сьцяністыя навіткі хмелю. Стуль моўкна, няборздымі крокамі, з ахапкам сухога хварасьціньня выйшаў таксама стары сябёр сялібы Ахрэм.

— Што? — зусім не зварачаючы ўвагі на Алену, паважліва спытаўся ён і замоўк мэханічнай мерай заводу чаканьня на тое, што яму скажуць наступнае.

— Барысок, мой даражоны сыночак знайшоўся, — усхліпна паведаміла маці, і тады Ахрэм неазначальным позіркам глянуў на госьцю. Адвёў рукой, быццам гэтая навіна прыносіла яму вельмі благі спадзеў у будучыні, сказаў: — Ну што ж, ня жарт яно! Сын!

— Любанькая, хадзем у хату... — папрасіла маці Алену. — Ахрэм, запрашвай! — Ахрэм рыньва кінуў хварасьцё, дзе ста-

яў, падышоў да сваёй аслабелай гаспадыні і памог ёй ісьці. Алена таксама пабарзьдзіла памагчы. Маці даверна, асвойтана ўсьміхнулася і нэрвова-ўдзячная, пацешаная, пагладзіла касьцялявай далоняй Аленіну руку. Пад ахонам бясхмарнага неба, прыроднай утулы зарослай і закіненай сялібы здавалася, адна маладая, а двое старых з аднолькавай магчымасьцяй зачараваліся астанкамі сваёй свабоды.

...Алена з усёй блізарукасьцяй успаміну ўглядалася ў собскія расказы зь мінулага, балюча адчуваныя ў тайніцы сэрца, а якія калісьці былі велікомай карцівасьцяй для Міхася. «О, доктар — разьнік ты!» — яшчэ не расходаваная, ад гэтага шапотнага ўсклічу, яна ўстала з пасьцелі, запаліла начную сьвечку на падстаўцы каля ложку і распранула сукенку. З жаночай сумніўнасьцяй сваёй прыгажосьці, аглядзела сябе ў люстэрку. «Дзеўка», — палкоўнік назваў мяне, і яно праўда, шчырая праўда, — падумала яна і пагасіла сьвечку. Села на канапу. «Не! Ня будзе!» — нясьцерпліва цягнуліся будрожныя думкі. «Ня будзе, доктар!.. Я, каб ён быў тут, сказала б яму: глядзі, я нават не хвалююся!..»

Сьціснула даланямі твар. «Ах, якая благасьць! Блазень — я! Да чаго я дайшла? Узвышалася... бадай зьдзекавалася з палкоўніка... спрабавала забрызгавацца навучэньнямі існасьцяў жаночых ідэйкаў... забывалася на іх... скручвалася і не скруцілася бярэсьцінай — жонкай зажадала быць... і я ж была».

Не адпускаючы даланей ад твару, з плачам павалілася на расьцяж канапы. Яна не магла забыцца жаданьняў кахаць Міхася. Калісьці яно, ня выраслае адразу, потым укарэнілася ў сэрца спрагай: захапіць гэтую цудоўнасьць і адчуць усёй чароўнасьцяй пачуцьця дазвольнай кволы і пяшчоты, бы злучыць усё прыгожае на зямлі, хоць яно й ня ёсьць падобнае да чалавека, і якое мо' адно толькі мімаходна дапоўніла б тое, што ня здолела выявіцца ў нястомнай божасьці закаханых. Алена ад жыцьцёвай някайнасьці пакутавала. Увесь сьвет, яе жыцьцё, яна сьцісквала ў напеўнасьць уласнага каханьня. Спрабавала ўсьвядоміцца ім. Пераконвалася, што Міхась можа адумацца, а дзеля гэтага як найхутчэй трэба пагутарыць зь Цярэмам, каб адгаманіў яго ад жаніўства з музыканткай; а з другога позірку, аднак, яе наўмер прастаў у пусьціню рэха: «Каханьне мінула мяне...»

Адзінокія, у цемнаце пакою, усхліпвалі нікім ня чутыя Аленіны ўсхліпы. Яна не магла супакоіцца. У зусім іншым вобразе прападала ейная будзённасьць — гардлівая і гострая, спадзеў-

ная і чароўная — не ад палкоўніка; настойлівая і ўзьдзейная на яго й на Ганю — цяпер існавала празорасьцяй бясьпечнасьці для іх... безудзельнасьцяй новых «споведзяў» Аленінага неўгамонлівага сэрца.

Яе неадхлынна наведвалі ўспаміны, ад якіх яшчэ гарэй плакала. Яна наіўна не магла дараваць сваю чалавечую блудзівасьць зь Міхасём каля вазёрца недалёка ад хутара палкоўнікавае маці. А яно здарылася якраз у першую нядзелю спатканьня. Міхась, як пчаліна каля краскі, неадлётна круціўся каля Алены, пакуль яна прылашчалася, пагадзілася расьцьвісьці ва ўсёй пыхаце перад ім. Гэта былі вечары адчуваньня ейнай маладосьці.

Аднойчы, купаючыся ў супакойнай гладзіні вазёрца, як адшліфаваная глыба граніту, спыталася, злавіўшы Міхася за руку: «Няўжо толькі гэтага і хацелася вам?»

І адказ было ня трэба спаганяць. «Не!» — адказаў Міхась. А тады падхапіў яе ў вадзе на ўлоньне, цалуючы, панёс да ўзьбярэжжа. Яны абое насьпелі самую любую асалоднасьць. Пад цёпласьцяй летніх ночаў, — Бог ведае, ці кахаў мяне, — яны апыноўваліся ва ўсе шчырасьці жыцьця.

Часта ў духаце жарсьці накрываліся мяккімі коўдрамі й падоўгу маўчалі ў прыемнай зморы, або цешыліся цалункамі й нагатой свайго цела. З вазёрца цягнула лагодная начная вогкасьць; узьбярэжны лазьняк, перамяшаны з алешынамі і бярозай, тварыў цемнату, якая йшчэ больш кідала ў стань адчуваньня жарсьці.

— Не! Яно — справядлівае! — праз плач абвясьціла Алена асуджэньне свайму ўчынку. — Жыцьцё й шчасьце яно... песьня, у якой самі сабе пяялі, — сьцьвердзіла яна. І зноў нэрвова, да болесьці, так што ў іхным прыціску асушыліся сьлёзы, сьціснула даланямі твар...

Устала і, не запальваючы сьвятло, апранулася ў зімовую вопратку. Ціханька паўадчыніла дзьверы сваёй гасподы і паглядзела ў густую цемрадзь калідору. У двары ўсе спалі. На цыпачках накіравалася да сталовай і кухні. Там зь вялікай асьцярожнасьцяй не шумець нешта пашукала ў цемнаце каля печы і ў кутку пад сходнікамі на столь. З рэчамі, што знайшла, яна прыслушліва, хутка палезла па сходках на столь. Адтуль вярнулася таксама з асьцярожнасьцяй. Вышмыгнула праз кухонныя дзьверы на знадворак. Зімовае неба пярэсьцілася зорамі. Шчыпястая абвалока марозу даткліва шугала й водгульна патрэсквала ў начным супакоі.

— Божа, даруй мне! — безь мізэрнага шапотку прыгаманіла Аленіна душа. Зноў асьцерагліва ўвайшла да кухні, адтуль з тым самым барджджэньнем, на цыпачках, да сваёй спальні. Чакала...

Цярпець і працаваць для таго, каб кахаць і быць каханай доктарам Міхасём Адамчыкам, болей няма патрэбы. Працаваць жа для ворага Айчыны, немца, каб потым па налогавых паведамленьнях, бадай што, усё аддаць для іх, таксама злачынна!

— «Дзеўка Арлеанская», — як казаў палкоўнічак, зьдзекаваліся зь яе словы Сконтаўта, аднак бязь нейкай датклівасьці, бо яна найбольш хвалявалася пра вынік сваёй дзеі, чымсьці адзерванелымі, абкрышанымі словамі. Што яны могуць зрабіць? Перашкодзяць? Аніледзь! Словы — вецер!

8

Цярэму не дакучала штодзённае дзёрганьне сябе жыцьцёвымі ўражаньнямі. Ён быў энэргічны ад іх. Але пры ўсёй шчырасьці ён не прынукваў кагосьці быць пакорнікам безасудным і нязьменным перад імі. Яны былі патрэбныя яму, каб жорсткасьцю, дзярмадайствам намераў знаходзіцца некаторым собсьнікам жыцьцёвага часу. Мо' тады досьведы, аскепкі ўсялякіх бытаваньняў падмацуюць перакананьні, што былі зь ім ад самага пачатку сьвядомасьці жыцьця.

Але вось каля яго знайшліся дзьве іншыя самалюбасьці, без сумніву ў права волі настрою і бачнасьці ягоных вынікаў не цеплынёй мрояў, а сутнасьцяй існаваньня ў гадох. Што ён прагне ад іх? Ён і сам ня мог добра вытлумачыць. Усё зблытвалася ў рашучасьці зь нерашучасьцяй, знаходзілася і гублялася, пераконвалася і адмаўлялася, і пакуль што яно не супакойвалася ў рэчаіснасьці раўнавагі духовай: звычайнага ўздыму ды заняпаду. Штодня зьяўляліся ўсялякія разнаякасьці, за якімі, не выпадкам, цяжка ўгнацца. А яны і ён не маглі азначыць прасьцяг для шматнасьці мэтаў ды намогаў або асяліць, хоць бы ў адным квадрацікі душы, задавольнасьць, называную і адчуваную.

Цярэмаў разгон вялікі! Ах, стары Цярэм! Яшчэ не скананы і быццам на сьвеце адзін жыве, а каля яго Міхась і палкоўнік з Аленай. Ён зборнік і заданьнік усялякіх адменнасьцяў чалавека на ўсьцяжы ад свае хаткі каля бору аж да зарослых стаўкоў каля сяла. Аднак у Цярэма нешта было і празьмернае — ён працягваў рукі, запушчаў увагі ды парады туды, куды ня трэба. Ды што ж рабіць, калі ён не жадаў «стаяць, як дрэва на сваіх

карэньнях, бо дрэва мае адну-адзіную страву, а чалавек спажывае ўсё, што створана Мной пад небам».

...А тады Цярэм пагладзіў ката, што любіў сядзець каля яго, прысунуў скрайней лямпку на стале, дастаў сшытак, што хаваўся за абразом сьвятой Афрасіньні Полацкае, прырыхтаваўся пісаць. У сшытку ён ужо даўно напісаў загаловак «Лісты з дарогі на той сьвет», аднак за тым невялікім слоўным замураваньнем пакуль што нічога не было напісана.

Нарэшце Цярэм надумаўся зьдзейсьніць наўмеранае. А гэта паказацца, выставіцца перад Міхасём з усім, што перажыў і нават пакінуць колькі запаветаў.

Адно зь Міхасёвых захаваньняў Цярэма цьвяліла. Чаму ён ідзе ў жыцьцё так, як яно вядзе яго? Чаму ён не аддзельвае струмень жыцьцёвага самацёку ад пасаднай цэласьці мэты? Быць не самаваладарнай прызначнасьцяй бытаваньня, бы тое, як лажыцца спаць, а раніцай уставаць і глядзець на неба. Але і ў такім вывадзе Цярэм бянтэжыўся — няпэўніўся ў Міхасёвай цікаўнасьці перачытаць ягоныя зацемкі.

— Беспрыйменна скажа: аскемяціна роднага... і не палянуецца пасьля сьмерці маёй выкінуць іх або няруіпна паложыць тлець на паліцы.

Пры ўяўленьні Міхасёвай непашаноты да важнасьці ягоных добрых намераў, выказаных на паперы, Цярэма ажно злавала.

Мінула шмат моўкнасьці, пакуль Цярэм пачаў пісаць. Ён, нават не крыху, а даволі падходна пашкадаваў пра сваю нявэтлівасьць зь вясковым настаўнікам, зь якім бы мог парадзіцца, як цікавей напісаць запаветныя лісты. А тут, на ліха ўжо, нат колькі год яны знаходзяцца паміж сабой бы ў спрэчцы, бы не ў далюбі. Цярэму аднойчы пры гутарцы з ім не спадабалася настаўніцкая пэўнасьць, гардлівая і насьмехлівая.

— Кіньце, — сказаў ён Цярэму, — разглядаць жыцьцё ў клетках, у пратаплазмах — ня трэба! Жыцьцё пыхціць вецьцямі кону — кон над усім!

Ды яшчэ асаблівасьць: настаўнік вельмі паважаў Гамэра, а нікога іншага. І ў цеплыні сваёй любасьці да яго сюдзіў пераканаьнне: «Чытайце, дзеду, Гамэра — вось і ўсё!.. Мне, каб дасталося ачаліць міністэрства асьветы, я ў школе навёў іншыя спалады: пачыналі б вучыцца з Гамэра і канчалі б ім. Вы зразумейце: Гамэр — скарб чалавека, якога нестае ўва ўсіх эпохах», — сьцьвердзіў ён Цярэму.

— А нашы казкі? А нашага Скарыну ня памятаць, па-вашаму?

— Дзеду, гэта нічога, што існавала!

— Шкада, настаўнік, што жывяцё тут, а там, у глебе, вас нестае! — адказаў яму Цярэм. Але настаўнік, выкрай інтэлігентнасьці на сяле, сьмяяўся зь Цярэмавых дапікаў і маўчаў ад жаданьня барджджэй расстацца з аброслым, з пахам магілкі дзедам. Ды і Цярэм ня вельмі рады быў аставацца зь ім у гутарцы. Ад чаго настаўнік не выцерпліваў. Яму ня ўдалася гожасьць зьдзекнага пасьміхаваньня, таму спраўляўся прамовіць усьлед Цярэму:

— У імя Гамэра: не дыміцеся, калі вас не падпальваюць!

А Цярэм:

— А вы й не адкашляліся: ахраку з ахракамі жыць!

Настаўнік расставіў правіцу, бы рагаўні ракавыя, цьвяліста выцадзіў праз зубы:

— Дурань стары!

І яны з таго часу, хоць гэта было калісьці, не вітаюцца й не спрабуюць палагодзіцца. Настаўнік ужо сам пачынаў абрастаць, старэць і вобразна гарбець. Сківіцы выцягнуліся наўперад, галава загастрылася ад вялікай лысіны з абвіслымі касмацінамі валасоў навакол. І Цярэм для собскае задаволы, сам сабе, прыклікаў настаўніка: Узгорак З Размытым Верхам.

...Але рашучасьць намеру падказала Цярэму, як пачаць пісаць «Лісты з дарогі на той сьвет» і як унадзіць Міхасёву цікавасьць да таго, што напіша. Першую балонку ў сшытку са сказам: «Міхась, ты ня цягнеш жыцьцё, а яно цягне цябе», — Цярэм выдраў з агулу сшытку і, вывеўшы ўсё-ткі той самы найменьнік для сваіх зацемак, пачаў пісаць, зрэдку ўяўна паглядаючы на Міхася.

«Ліст першы.

Прыгожая вачыма, з валасамі, што спадалі на плечы, ішла жанчына. На позірк можна было азначыць: ёй ня трыццаць яшчэ. Яна ішла босая і ўвесь час сьцераглася ісьці па роснай сьцежцы. У поступу адчувалася няпэўнасьць і насьцярожнасьць. Але, мабыць, яе не палохала адзіноцтва між гушчароў, і ёй не хлусіла дарога, па ёй не заблукаеш... Дарогі! Як прыгожы ў нас дарогі ўлетку!.. Яны першыя і прымаюць сьлязіну няшчаснага ў жыцьці, яны ж першыя, і толькі яны, ведаюць наўмер таго, хто крочыць па іхнай жарстве і калюжынах!

Прыгожая станам, прыгожая абліччам, з такімі ўзірнымі вачыма, з валасамі, што зрыньвалі на плечы, што абвешчвалі: яны па-жаночаму прыгожа складзеныя — ішла жанчына па лясной дарозе. Было вельмі рана, і лес дыхаў ранішняй вогкасьцю, і птушкі сьпеўна пераклікаліся...

Зара ўзьвівае неба. Узыходзіць сонца. Першыя промні заблукаліся паміж дрэвамі, на расістых ігліцах запалымнелі ўсялякімі калярамі... Яна, чароўная, шорахам сваіх крокаў вітала навакольнае і можа не аддавалася ў думках хараству зямному. Зямное — быццам парог! Кожны жадае пераступіць яго, каб хоць на часіну забыцца на ўсё абыдзённае!

Пачулася візганьне драўляных восяў цялегі. Званістае, шуглівае рэха іхнае лунала ў вогкасьці лесу. Нехта таксама кудысьці сьпяшаўся. І прыгожая станам, прыгожая абліччам жанчына пакрочыла хутчэй. Ёй не жадалася з кім-небудзь сустракацца.

Чароўная! Якая ты чароўная! Хто ты, прыгожая на зямлі нашай? Куды ідзеш чароўная?..»

— Чароўная, — шапнуў Цярэм і задумлена, непрыемна скрывіў вусны. Ягоная творчасьць паімкнула лягчэй і прасьцей.

— Да чаго я, убожнік, зьехаў? — «З глузду зьбіўся», — скажа абавязкова ён, як толькі прачытае гэта... Чалавек можа сам сябе выхаваць. Ці можна цягнуць, заміловаць вырасламу мужчыну, хаданьне за жыцьцё карысьцяй і выгодай? — спытаўся асуджальна Цярэм.

Першая асалода натхненьня пісаць лісты для Міхася мінула, але яна ўсё-ткі пакінула той заўсёды прызвычаены вывад собскай крыўды. Цярэм ня ведаў недахопу ва ўсім! І быццам стомлены чыноўнік або дэпутат парлямэнту чытаньнем дакучлівай просьбы ці наказу, аднак з вытлумачальнай паставай, што ён цікавіўся допісам на ягонае імя, вывеў зь дзіцячай свавольнасьцяй пад сваім творам:

«Той чалавекам ёсьцека, хто не разумее, што ён добрае творыць, але разумее зло і ўмее ведаць яго. Гэтакі чалавек аўтамат дабра ёсьць! Можа, мой Міхась ёсьцека гэткім, і будзе да скону... І нарэшце Цярэмкава аскоміна: бывай! Што і пацьвярджае ён сам: Цярэм з-пад Менску».

І зноў, уторна, не зрабілася магчымае, зноў прапала Цярэмава перакананьне, што ўвесь час зьяўлялася не інакш як зь ягонае сховіны адчуваньняў. Начная ціхінь хаты, чутна і адрыўіста, роўна парушаная Міхасёвым дыханьнем, нябачнай сымэтрычнасьцяй разьдзялілася ад шораху выдранага ліста з сшытку. Цярэм скомкаў яго і шпурнуў пад прыпечак. Гэта быў канец першага тварэнца зь «Лістоў».

На знадворку перарыўна гаўкаў і завываў Мурза. Цярэм падышоў да вакна і блізу тэй вокмецяй узіраньня ў цемянь знадвор'я пачаў пахукваць на незамерзлы шматок на шыбіне.

— Пажар у сяле! Уставай! — зьвярнуўся ён да Міхася, і Міхась ад галоснасьці разбудзіўся адразу.

Неўзабаве, узяўшы вядро і рыдлёўку, яны пабарзьдзілі да сяла. Полымя, нібы пялёстак палістай фарбы, уздымалася ў цемяні зімовага неба.

Па дарозе да месца пажару Цярэм не сьцярпеў, спытаўся ў Міхася:

— А дзе ж сваю красуху дзяваў?

— Да знаёмых у сяле завёў спаць — ты ж ейных вошаў палохаўся.

Цярэм змаўчаў. Яму было дастаткова. Навошта піхацца далей, калі і так адным словам даведы, маўляў собскімі рукамі, на аблаве, злавіў самога сябе!

«Я справядліва зрабіў, што перастаў пісаць «Лісты». Бо жыцьцё такое ненасытнае абставінамі, што іх ня справісься высьпельваць у рознасьці да аднаго смаку», — дадумаўся невясёла Цярэм пра ўсё змацнелае ў сумнівах неадведанага і ў цяперашчыне і ў будучым.

9

Міхась ішоў наўперадзе, Цярэм за ім. Сьцені хат выторкваліся з асьвятленьня пажарам.

— Мабыць, на ўскрайку гарыць? — спытаўся адзадзя задыхліва Цярэм.

— Здаецца, двор гарыць, — адказаў Міхась.

Цярэму памеркавалася: Міхась труніць над ім.

— А чаму не — двор можа гарэць таксама.

З стрэчнае сялібы, таксама абудзіўшыся, выбеглі сын з бацькам, стукаюць бляшанымі вёдрамі аб шулы варотаў, пытаюцца:

— Хто гарыць?

Яны прылучыліся да Міхася, паўбегам папрасталі да сьвітанку няшчасьця. Цярэм стары, хоць хадкі, астаўся далёка за імі.

Бляскатам медзі раскідваўся каля засьнежанай зямлі палымень пажару, асьветліваў будоўлі сяла, голыя віліны галінаў паўзвулічных дрэваў. Чыстай водгуляй разносіліся ў адным зборы з пошугам полымя гоман і ўскрыкі людзей.

Яшчэ перад некалькімі апошнімі хатамі ад ускрайку сяла Цярэм упэўніўся, што гарыць двор.

— Трасца табе! — няведамка дзеля чаго зласьліва адклікнуўся ён.

Гарэў Цярэмаў падмурак! Колькі цярплівасьці ён пасяліў за нядоўгі час знаёмства з Аленай, каб толькі небывала і ярчыста аббожыць свае жаданьні: каля яе ягоны Міхась, а ейны наста-

так — двор, зрабіць сваёй часьцінай апорышча, бы трэцяй рукой. З спрытам двух астатніх пясьцяў, але якія ня мелі шмат што ўзяць, гэта ж трэцяя пясьць была б ня мроя, а працоўня, напоўненая сыравінай да прадуктаваньня. Так жыцьцяліўся Цярэм! І, мабыць, таму яго старога, зусім увабражанага адыходам з Боскага сьвету, не забірала сьмерць. Ды як? Пасьля звароту Міхася дадому ён як ніколі рупіцца адабраць ад людзкога ўзьлеганьня на жыцьцё ўсё патрэбнае дзеля галаты гэтага жыцьця. Цярэма не разбураў канец. Наадварот, ён змагаўся зь ім. З казачнай існасьцяй, але безуважна, пэўніўся аб моцнай доні споду: ён ходзіць па зьверхні з лужынамі, з калюгамі з брудзінёй — аднак правалебнасьць: ён жадае дагнаць не беспасрэднасьць існаваньня, а ўмернасьць жыцьця, якое (няхай, падлікам, і ня ўмоўным успамінам гісторыі) супакоілася на ўсялякіх пераменах мільёнамі лепшых ажыцьцяўленьняў...

Будоўля двору зь некалькімі лукатамі сьценаў, стадола з жывёлай і побач яе сьвіран ужо былі напалову згарэлыя, калі засьпеў туды Цярэм. Сяльчане кідалі рыдлёўкамі сьнег на полымя, намагаліся выгнаць кароў з стадолы. Там была блізка студня — шточасіны паскрыпваў асьвер. Жанкі і мужчыны ў радоўку, падганяючы адзін другога, хутка налівалі вёдры вадой, беглі лінуць мізэрную кроплю валогі на незатух распалены агонь. Сілком выцягненыя каровы дзіка рыкалі і беглі ў поле. Алена заклапочана папярэджвала людзей асьцярогай:

— Уважайце!.. Асьцярожна будзьце — усёдна нічога не патушым!..

Бы маразяная сухамень, агонь сушыў дыханьне і шчыміў аблічча. Цярэм спыніўся на сярэдзіне двору, паглядзеў на ганак, дзе ён нядаўна, увечары, ступаў, а цяпер над ім высіўся сьціж полымя. Падступіцца, нават кінуць рыдлёўку сьнегу ўжо стала немагчымым. Ад стадолы пачалі адыходзіцца людзі. Яна, устропе напоўненая сенам, і паўзбоч, у праціўках, напластаваная саломай, гарэла хутчэй. Стуль час ад часу чуліся выбухі бэбухаў нявыгнанай жывёлы.

Сяльчане найбольш гурміліся каля адхоннай сьцяны дому, каля самых таполяў, што дзялілі сялібу з разгонам ніў. Яны, не ўважаючы на гарачыню, упорыста, адварачваючы абліччы ад полымя, падбягалі і лілі на вялікае вакно ваду і кідалі пухкія скупіны сьнегу.

Цярэм позіркам пашукаў Міхася і, ня ўбачыўшы яго, накіраваўся таксама туды. Спаткаўся з Аленай. Яна, бы зь цікавасьцяй, бы нічога ня здарылася, падышла памалу да яго.

— ...вы таксама?

— А як жа! — адказаў Цярэм.

— Я ўмею канчаць! — збляднелая раптоўна, але не без нагоды прапусьціць такую часіну, сказала яна негамонка. Што ж, ад няшчасьця можна сказаць усялячыну!

— Вады! Вады сюды! — закрычэў настойліва недалёкі ад вакна сяльчанін, закашляўся, але ад полымя не адступіў: захінуў аблічча крысом армяка, зналусна сагнуўся, згроб жменю растаенай зямлі, кінуў на агонь. Толькі два вядры вады паднясьлі ў час.

— Яшчэ жывы! — моцна, з чалавечым сполахам і зразумелым для ўсіх нехта крыкнуў з гурмы.

Алена пабегла да вакна.

— Уцякайце!.. Валяцца кро-о-квы! — закрычэлі зноў з гурмы.

Ясьва іскраў палілася ўвысь. Сьвятлей зашугала полымя, перамешанае з трэскатам кроквау і столі. Тое вакно, на якім спынілася ўся ўвага гасельшчыкаў, выткнулася з агністай сьцяны палымністым пошугам. Галавешкі пакаціліся аж пад ногі Алены, на адважлівага сяльчаніна. Алена не пабегла стуль у ратунку. Адвярнулася плячыма да гарачыні і атуліла даланямі аблічча — ейны звычай падчас праклёну — яго ведалі палкоўнік і Ганя. Цярэм, уцеміўшы, што яна перад процьмай небясьпекі, з старэчай барзьдзьлівасьцяй, разам зь іншымі, падбег да яе.

— ...мой дарагі Ахрэм — гэткую сьмерць напаткаць! — прагаманіла яна і грэбліва вызвалілася ад падпахаў ратаўнікоў. Цьвяльліва зьвярнулася да ўсіх: — Адыдзецеся, людзі добрыя, — не жартуйце жыцьцём!.. Годзе яго аднаго!.. Адыдзецеся, мае добрыя, — усёдна згарэла!..

— Там у полымі Ахрэм застаўся? — узрушліва спытаўся Цярэм і, не чакаючы ад каго-небудзь адказу, зразумелы няшчасьцем старога знаёмага, блізу сябра, пасігаў прэч ад Алены.

Пад паветкай, што знаходзілася шмат далей ад пажару, Цярэм напаткаў Міхася. Міхась ужо справіўся зьбегаць да бліжэйшай сялібы і папрасіць вопратку, каб апрануць Арэмчыка, бо ён у перапалоху выбег з-пад затулы дваравых сьценаў у бялізьне, босы, улез у вазок зь сенам (некалькі гадзінаў назад напоўнены мурагом старэнным Ахрэмам). А кадзе Ахрэма ня стала. Своечасна непабуджаны, ён намагаўся вырвацца з хопінаў полымя, але зьнік у ім назаўсёды, быццам нарошні, быццам віноўны ў спразе іншых да ахвоты бачыць і адчуваць сваё ня толькі жаданым, а неабходным... Арэмчык апрануўся ў армяк, застаўся ў вазку. Глядзеў панура на пажар.

Арэмчык, апранаючыся, унадліва крычэў на наймітку:

— Павешу! Павешу бязь літасьці! Собскай рукой павешу!.. Як рабіць гэтак!? Як? Дома ці што?.. Ды мне й непатрэбна твая гутарка — не расчыняй сваю мызу!.. Утаплю, дзе люгашка ніколі не завядзецца! Праклённая — ты!..

— Затое ты водзісься там! — наўмець, без асьцярогі для прыгоды іхных адносінаў, але гэтак, каб ён ахамянуўся, адказала наймітка. Каб Міхась не стрымаў яго, Арэмчык пачаў бы біць яе.

— Адыдзіся з воч!.. Прыб'ю! — яшчэ зласьней адклікнуўся Арэмчык. Размашыста стукнуў кулаком па грудзях. Цягліцы на шыі выцягнуліся кароткімі кнуцікамі цела.

— Рэдніца — ты! Я мог за яго купіць цэлую Прагу тваю!.. Прыдушы яе, доктар, прыдушы, паважаны! — зьвярнуўся нарэшце Арэмчык і да Міхася. — Учора купіў пярсьцёнак зь велікаватым дыямэнтам, а сяньня глядзі: забылася там — у агні загартоўваецца... паганскага бога цешыць... рэдніца ты бяззайчынная!

Апрануты ў армяк Арэмчык аставаўся стаяць на вазку. Быццам перад гэтым не сварыўся з найміткай. Глядзеў панура і злосна на пажар. Цярэм зь цікавасьцяй хлапчуковай азіраў чалавека, пра якога шмат чуў з газэтаў і ад людзей. Усё, што гнусіла яго і прынуквала да якога-небудзь клопату, разыходзілася ў ім няспыннай дзівасілай ажыцьцяўленьня.

Цярэм азірнуў Арэмчыка і адышоўся ад яго. Падумаў ісьці да сваёй хаты, бо што рабіць тут, дзе трачіна двору згарэла, а рэшта дагарвала? Хутка пошуг прападзе ў бясьсьледзьдзі неба, зачарнее галавешкамі пагар, а на ім падмурак з вышынёй, з шырынёй, з умоўным часам, што дзеліць ночы і дні.

Ад месца, дзе зьнік Ахрэм у агні, сяльчане не адыходзіліся. Да іх далучыўся і палкоўнік з Ганяй. Усе глядзелі туды, дзе гарэў нябачна Ахрэм. Некаторыя нават пераконвалі, што ён мо' каля вакна паваліўся дзеля таго, каб узламаць падлогу і апынуцца ў скляпеньні пад сялібай; другія ж з усёй упорыстасьцяй адмаўлялі недарэчлівыя дадумы.

— Не варажыце, людзі добрыя, — Ахрэм згарэў, і грэх за яго на двух ляжа!.. Гэта яны падпалілі, яны няўдзячныя і ў дадатак забойцы!..

Сяльчане прыслухаліся, памалу абступілі Алену. Нават Цярэм, адыходзячы да хаты, заўважыў цесную гурму, падышоў туды. Цярэм любіў паслухаць іншых, не прапусьціць іхную надзённасьць. У ім знаходзілася велізарная дароднасьць чалаве-

ка: належаць усяму людзкому. Таксама прызвычай. Мабыць! Але ж і ў Арэмчыка, і ў Алены, і ў палкоўніка з Ганяй таксама ёсьцька прызвычаі, жаданьні ды імкненьні, як зь імі? Яны належаць самім сабе і іншым мо'? Не! Яшчэ ня час, — і яны ў здольнасьці справіцца быць усялякімі! Аднак Алена за іх усіх наймацнейшая воляй.

Хто, прынамсі, апрача як не Алена пераканаў сяльчанаў і мясцовыя ўлады і Цярэма бессумніўнай існасьцяй праўды? Толькі яна. Яна расказала адну вялікую сапраўднасьць. За два дні перад пажарам зь ейнага двору ўцяклі два немясцовыя працаўнікі. Вось яны, не напэўна, а гэткімі былі, людзі зусім асобных прызначэньняў. Гэта тыя, якія падчас працы на ніве каля бору спаткалі лётчыка, што ўцёк з палону, забілі яго, а потым пад пагрозай сьмерці змусілі Аленінага заўсёднага працаўніка, што жыў у маленькай хатцы на ўскрайку двара, за таполямі, з васьмі дзецьмі, зрабіць паховіны лётчыка, як ім зажадалася.

— Вы ж, людзі добрыя, не забыліся пра лётчыка, што знайшлі мінулай восеняй каля царквы? — спыталася яна. — Не забыліся?..

— ...а як жа забыцца! — адказаў за ўсіх Цярэм. І на яго глянулі астатнія. Ах, гэты дакучлівы дзед — усюды торкаецца ён!

— Але... але... — торуць наапошак іншыя з гурмы.

— Дык вось яны і падпалілі двор... Ганьба ім! Праклён галаварэзам!

І Алене ўсюды паверылі.

...А палкоўніку наадварот, той прыпамінак пра лётчыка, пра царкву, асеўся балючым успамінам. Ах, гэтая царква! Ён жа некалісьці каля яе, у той дзень смутнага набажэнства, хадзіў зьдзейсьніць Аленіныя пракуды: «Дапамагай бедным!». Але дзіравую, зношаную кашулю і шапку аніхто не папрасіў у яго. Таму ён нездарма нахіліўся да Гані і, бы з такім самавітым спадзевам чагосьці пэўнага ў будучыні, прагаманіў:

— Ганя, а я зрабіў добра, што не прынёс футру ад краўца — табе будзе што апрануць... Не сумуй — неяк уладзімся...

Ейны твар, асьветлены дагаркамі сялібы, не зварухнуўся ўражаньнем ад нашэпту. Палкоўнік клапатліва-пяшчотна, ледзьледзь кранаючы, сабраў з Ганінай вопраткі нацярухі папялінкаў пажару.

* * *

Той самай ночай Цярэм, па звароце да свае хаты, усё-ткі не сьцярпеў перад спакусай уражаньня: дастаў з-за абраза сшытак з ахрышчаным назовам «Лісты з дарогі на той сьвет» і запісаў:

«Колькі ўтораў я пытаўся ў самога сябе, у свайго добра знаёмага: што гэтакае чалавек?

І вось адно кагадзе я пашкадаваў сябе і свайго знаёмага. Я турбаваў яго недарэчлівасьцяй і змушваў асабіста сябе доўга калець ды надзець на адным месцы думкі.

Няхай бы ты, мой знаёмы, адказаў мне гэтак:

— Калі б ты ведаў, чаму ты — чалавек, дык ты тады ведаў: чаму гэтакі, чаму захоўваесься ўсяляк, чаму творыш некарыснае. Тады ад гэтага веданьня ты б, напэўна, асяліўся на зямлі толькі кракадзілам, толькі ім, або больш іншым — гідрай вадзяной!

— Жыцьцё — тайніца! — «Старая гісторыя і мудрота», — скажа зноў Міхась на гэта. І няхай! Я ж не зьбіраюся торыць тваю «гісторыю» і «мудроту» ды прыпамінаць яе іншым. Я жадаю ўдзельнічаць у напраўе! А каго і што ведаю!.. Я думаю над адным: як можна прывучыць людзей да інстынкту добрасумленнасьці. І я, мой любы Міхась, пагражаю табе: дадумаюся. — «О, гэтыя інстынкты зьвяроў, пра якія ты мне часта апавядаў!» — ляпей не ўспамінай мне».

## ЧАСТКА ТРЭЦЯЯ

### 1

Падмарожаныя зарасты палыну і дзядоў чарнеліся па ўсёй сталіцы. Статкі галак мітусіліся над руінамі. Дзяркатае і частлівае пакрыкваньне іх яшчэ болей распаўсюджвала непрытульнасьць на зямлі. Вячорная астуда жызьнела плажнасьцяй блізасьці неба. Яно, падкопчанае на небакраі, празрыстае над галавой, паражнява й лёгка шугала ад зямлі.

— Чорт ведае, да чаго дайшоў, — абурыўся Арэмчык і зіркнуў на неба, выпрастаў каўнер, папрасьціў да Нямiскай вуліцы.

Аднак тое самае зноў, бы пра нейкую звабную і дарагую карысьць, нахлынула.

«Па-мойму, спадар Арэмчык, таму мамэнту можна даверыцца — бадай схапіць яго, як нешта жывое. Уявіце: сярод шчасьлівай часіны вянчаньня па ўсёй сьвятыні паміж людзьмі насьцярожныя шэпты: — На расстрэл павядуць… на расстрэл. — І аблонь, што ўвесь час стрымоўвалася ёй, распаўзлася. Цьфу, кадук рыжы, прыдумае: «аблонь распаўзлася», — асуджваў Арэмчык свайго сакратара Цьвіля і рабіў крок больш марудным.

«Яна, маладуха, дадумоўвалася, што за расстрэл. — Я зь ім! Толькі зь ім! — Падхапіла вэлян вянка й пабегла зь сьвятыні».

Арэмчык усьміхнуўся, але адначасна незадаволена зморшчыўся ды пляваў блізу на ўсю вузенькую шырынь Нямігі.

«Відзіш, вашанок жаночы: Толькі зь ім! — усклікнула… Надумалася ў вайну жаніцца… і вэлян на вянок прыдбала… І яна не памылілася: гэта быў ён, яе любы… Вось якія людзі на сьвеце ёсьціка, спадар Арэмчык. Адно толькі да пасьцелі сужэнскай: пасажок у рукі, бы пастар, і бегма за ім, за маім дарагім, каханым чалавекам! — Шыш табе, бадзяўка! Свайго не мінаваў каханы!» — сам сабе пацьверджваў Арэмчык і шчыльней засоўваў да кішэняў застудзянелыя пальцы.

«Хлапчук паказаў дзядулю, дзе ягоны сын. Якраз сустрэлі, калі на расстрэл вялі. — Мяне вазьміце! Мяне! Даруйце сыну! Сыну мой! Сыночак! Цябе гэтак бачыць!»

Цела дзядулі асунулася на зямлю… На яго ніхто не зьвярнуў увагі. Можа, толькі вецер восеньскі адшукаў яго і пачаў плутацца ў старой-старой, палапленай вопратцы, перабіраць космы сівых валасоў. Дабегла і яна, маладуха: « Я з табой! З табой!..» Кажуць: жанкі, што былі паміж сьмяротнікаў, а некаторыя нават зь немаўлятамі на руках, яшчэ галасьней заплакалі. Іхны плач ці скажаш словамі… Звычайны ўскрык маладухі будзіў іхныя спадзяваньні жыцьця, а хоць бы й не жыцьця, дык ён, ейны голас, разумеўся як абяцаньне спаміну пра іх або і помста… А сын калекі забыўся, куды вядуць, спыніўся і нават паспрабаваў рукамі разьвесьці. Бездапаможна паглядзеў на плечы — яны ж зьвязаныя, вяроўкі вайсковай эканоміі не належацца… Я думаю, сын разьвітальна ўсьміхнуўся. «Іхны плач ці скажаш словамі! От жа Цьвіль куды ўхіблёўвае! Не! Я ня вытрымаю!» — сьцьвердзіў гамонка Арэмчык і, каб ніхто не падслухаў, азірнуўся. На вуліцы нікога не было. Загаманіў ізноў:

— Не! Штосьці трэба рабіць, прадпрыняць… Але што, што яны жадаюць ад мяне? Зусім перамяніліся ўсе, і Лібіц нешта неахвотны да спатканьняў са мной, і нейкая рада народная бу-

дзе арганізоўвацца?.. Ах, дзейкі! Проста сам у куравень улез. Сам!.. Ды яшчэ ўсялякія дурніцы галаву ветруць: яго расстралялі, яна крычэла, ён скончыўся ад жалю. Ах, каб цябе, Цьвілю, налапам узяло! Ты, мой языкавень, асьцерагайся: собскімі зубамі можна язык адкусіць… адкусіць аж па самы гарляк!.. І навошта, дзеля якой патрэбы апавядае ён пра тое, што я заўсёды ведаю?..

Усёнае надарылася Арэмчыку чэсна і нармальна, бо была прычына. Нейкага невядомага юнака, удзельніка падпольнае грамады, асачылі гестапаўцы і расстрэлілі. Гэта ня выдумкі і не абы-якія выгады! Штосьці ўсё ўцемлівалася: бы сярод усялякіх расьцьвіўшых красак нельга аддаць усеагульную ўразнасьць аздобы адной якой-небудзь красцы. Арэмчык не пацешыўся настроем успаміну пра мінулыя здарэньні зь невядомымі людзьмі. Было зусім іншае, што сьцерагло шчодра ягоныя клопаты. Чалавек з усялякімі прызвычаямі больш лічыцца чалавекам, хоць некалісьці яго могуць назваць як каму зажадаецца…

Апошнімі тыднямі Арэмчыку ня шчасьціла. У працоўным габінэце ён натрапіў на пакладзеную паштоўку з гербам Вялікага Княства Літоўскага. Можна было лёгка памеркаваць на Цьвіля, але той якраз хворым быў і знаходзіўся ў бальніцы. Трэба спакмеціць і пахваліць адну студзёную і вытрыманую тактоўнасьць Арэмчыка: ён ухіліўся крыклівага абурэньня перад урадоўцамі — пакінуў зьмест паштоўкі асабістаму багацьцю памяці.

«Мы разумеем Свабоду, але нам патрэбен каталёг Свабоды — куды ж безь яго!» — і падпісаны: «Падпольшчыкі з-пад Менску».

— Божа мой, што тут робіцца сярод руінаў!.. О, праклённы Менск! Бы пушча нейкая! Грыбы, ягады, зьвяры, дрывасекі! Госпадзі, прыслухайся: ці ж мая істота тутака — неабмежаваная сутнасьць?.. Іх голад мучае менш, чымсьці мая дзяржаўная постань, — думаў Арэмчык пра сваё становішча сярод грамадзтваў. — Я ж чалавек, я ж мушу мець гонар дасяжнасьці ці не? Няўжо вам даказваць старую вядомку асновы жыцьця? Адумайцеся, скнарнікі! Усё можа быць выпадкова, і наадварот, яно спраўляецца не інакш, як гэтак… І зусім згодзен з вамі: найсьвяцейшая навага толькі з болесьці прыходзіць, з болесьці й маё. Падумайце людзкой галавой. Забудзьцеся, што яна злучаная з моцай шыі, адсуньце яе, зрабеце яе сродкам, які б не парушаў яшчэ жыцьцёвага пачуцьця. Няхай усьвядоміцца вам часіна скарэньня цярпеньню… О Божа мой, якая дзікая, некуль-

турная інтэлігенцыя ў падпольлі. На сваю работу глядзяць бы на прафэсію, бы на згоду быць сабакам. А ня кемяць аднаго, — Арэмчык ажно прыпыніўся й пачаў тыцкаць даланёй да засьнежанай зямлі з пазіраньнем на йскрыстую сьняжынку ад сонца. — Ня кемяць, што першабытнасьць не пазначала сваю будучую сутнасьць паступовасьці. Яна толькі ўспрыняла і прывучыла назаўсёды псыхалягічнае дзейкаваньне ды існаваньне ў страху залежнасьці ад Тварца. Жыцьцё ўсяго толькі сьвядомасьць існаваньня — забясьпечваньне спажывай, а абарона ад ворага… — о-о-о, вось на гэтым ці не ўтрымоўваюцца яны? Абаро-о-на! Абараняюцца?.. Яны напэўна ведаюць кошты людзкога пачуцьця. Добрыя пастушкі, добрыя, няма чаго казаць!..

Зазванілі ў царкве. Арэмчык азірнуўся на ўзгорак, дзе стаяла паміж руінаў уцалелая царква. Была нядзеля — Арэмчыкаў дзень адпачынку. Пачалі зьяўляцца па адным, удваіх прыхаджане. Яны ўсе барзьдзілі, абыходзілі Арэмчыка. Мінуўшы мост праз раку Сьвіслач, ён пасігаў ад мосту па ўзьбярэжжы. У шматных месцах рака, хоць і стаяў моцны мароз, яшчэ не замерзла — парылася зь вялікіх палонак струменьчыкамі імжы. Каля іх тонкая празорасьць лёду часта званіста трэскалася. Часіны агульнага супакою прыносілі ледзь чутны, шугліва-маразяны шум сусьвету і рэдкі рокат нямецкіх аўтамашынаў на галоўнай вуліцы. Зыркасьць сьняжын цьвяліла вочы. У луцэ ракі з акоймы лёду тырчэлі негустыя сьцёбы трысьця. Арэмчык любіў слухаць іхнае шасьценьне ў дні адлігі, калі падзьмухваў вагкаваты зімовы асьвей. Сяньня ж трысьцё не шасьцела, яно пышалася супакоем суровага росквіту шэрашы. Па мосьце, у наўцінку да тэатру опэр і балета, праімкнула водгульна фурманка. Чорны наровісты конь наўзавадзіста мчаў вазок, гучна б'ючы ў перадок падкапыцінамі сьнегу, моцна-ўторна пырхкаючы ноздрамі. Ездакі густа ачапілі нат і апочаны вазка. Несуладная песьня зацягвалася імі — гэта весяліліся жмудзякі. Адзін зь іх сьвіснуў да Арэмчыка, сябры падтрымалі яго сьмехам.

— Палітычныя парнаграфісты. Глядзеце на сваіх колішніх жыхароў Княства Літоўскага, — прапанаваў Арэмчык нябачным ворагам у падпольлі. — Хай люцыпар вас! Накась лясная на вас, хамулы з канюшняў, індэйцы дзікія!..

А тады ён зышоў з адхону ўзьбярэжжа да самага ўзрэчча. Пастукаў абцасам па лёдзе — не праламаўся, каўзануўся да каменя, што тырчэў шырокай глыбай над зьверхнасьцяй лёду, бы закалеўшы ў ім сваёй не абы-якой разорай, а цьвярдой і адольлявай. Маладосьць спатыкае жыцьцё, — можна было сказаць,

назіраючы за Арэмчыкам з захону. Ён стаў на камень, доўга аглядаў адтуль навакольле Сьвіслачы. Штосьці зіхрыла ў Арэмчыкавай душы духатворна і люба. І яно — тое, скрытное, сьцігавала ягоны настрой вялікай асьцярогай кволасьці й міласьці, нават і да благога. Цяперака ён гутарыў сам сабе, ён успамінаў. Ціхмой вачэй ашараваў трэшчыны на камені і стуль ботам зь вялікай цярплівасьцяй выбіваў сьнег, выскрабаў галіністыя замарозіны восеньскіх дажджын. Арэмчыку спаміналася. Успрыімнасьць казытлівасьці з былога ў жыцьці адчувалася новым уражаньнем, зусім новым прыгаством радасьці. Кагадзе мінуламу часу непатрэбны словы — яно захоплівала Арэмчыка кожнай дробязяй. Гэты, бы з далявы, шум мог цяперака Арэмчыкам пазнацца міласьцяй і, можа, нараканьнем на несулад ягоным вясёлым думкам. Сапраўднае адчуваньне, калі ня трэба знаходзіць фантазію ўяваў або нездароную скойму зьдзіўленьняў! Кожная кропля крыві поўніла цела будрожным голасам хараства спаміну.

...Ён з мамай і дамаведкай узыходзіць за іхнай сялібай на высокую гурбу сьнегу. Сонца дзесьці за борам, яно нізка над ім, у заслані ягоных узорлівых вершалінаў. Азяровасьць неба доньлівая і шчыпучая. Дамаведка, пасадзіўшы малога Арэмчыка ў саначкі, уважліва сьпіхвала іх з адхону, і тады яму (запомнілася тое назаўсёды) уражвалася: чыстая, бясхмарная выш абдымае яго і падымае ў свой нябачны подзьмух. Мама сьмяецца ўсьлед, а дамаведка, хмурная, цяжкім лядайскім пахонам зыходзіць да маленькага Арэмчыка, цягне саначкі зноў на гурбу. Выпадкам, здарыцца, яна пасьлізьнецца, засіранелы сьнег ляціць з-пад яе пылам, а разам з «ву-ух» ад ейнага расчыненага роту дыміць маразяная смуга. Ён сьмяецца ўсёй шчырасьцю сьмеху, мама таксама ўторвае яму. Ня сьцерплівае, пахлопваючы па галенах, крычыць асьцезьліва на дамаведку: «Хутчэй, хутчэй саначкі цягні!»

— Уцешысься! — адказвала дамаведка, спакваля ўзыходзячы на сьнежны ўзгорак.

— Чаму яна памалу? — скардзіўся Арэмчык маме.

— Ужо дахаты пара — хадзем, марозна.

Арэмчык злосьціць. Падбягае да мамы, тармасіць яе за футру, просіць, плачучы, крыху памарудзіць з зваротам дахаты, а тады, калі не згаджаецца зь ім, бяжыць ад яе ўцэла па сьнезе, атоньвае ў ім, паваліцца шмат разоў. Дамаведка не адразу апамятаецца: сьпярша недарэчна расставіць ногі, прысядзе, рас-

пусьціць рукі, быццам ён скорыцца ўзьдзеі рук і вернецца сам. Ды дзе там: ён бяжыць далей, прыпыніцца, плюецца на дамаведку і зноў далей, аж пад бор бяжыць. А маме якая справа? Праветрылася, памарозілася, пайшла адна да гасподы.

— Гусь нажыраваная! — наракае на тоўстую дамаведку.

А тая, нарэшце, зловіць Арэмчыка, ашчаперыць моцна. Ах, на яе, паганую, сьціскала не па-свойску! Ад таго сьціску малому Арэмчыку рабілася балюча. А тады ён толькі ведаў патрабаваць: «Нясі добра! Не прыцiскай!» — і расьцьвелена наровіў дзерканучь дамаведку па абліччы, садраць зь ейнае галавы хустку…

— А-а-а! Бачу, бачу! Я пазнаў вас!.. Дабрыслаў вас усе сьвятыя! — перарваў Арэмчыкаў успамін калека. Арэмчык ад неспадзеўкі схамянуўся: досыць порстка крутануўся ўбок, скуль данёсься да яго разьлівы зварот.

Арэмчык пазнаў калеку, гэтага абрубка людзкога, як некалі ён сказаў пра яго пасьля агледзінаў руін у Менску. Калека, перагушкваючы сваё тулава на руках, прастаў праз раку па лёдзе да Арэмчыка.

— Асьцерагайся — уваліcься! — парупіўся ён асьцярогай калеку.

— А-а-а! Дабрыслаў вас! Дабрыслаў! — адказаў той, не адрываючы позірку з Арэмчыка. — Задыхваюся… Я пазнаў вас!.. Як здаровіцца вам?

Падшытая скура замест ног пад тулавам, бы дзяркач, шоргалася па сьнезе і па ледзяністых тарчаках на рацэ.

— Асьцеражней! — Арэмчык ажно нахінуўся наўперад, калі калека зраўнаўся з палонкай-адухвінай.

— Ці палічылі, колькі дзён ня бачыліся? Пазнаю вас, маімі вачыма пазнаю, — і калека зышоў зь зьверхні ракі на ўзьбярэжную сьцежку.

— Ну, ну! — ухмыліўшыся, згадзіўся Арэмчык і таксама параўнаўся зь ім, зайшоў з каменя на ўзьбярэжжа.

— Будзьце там! Будзьце! Мне, каралю, — зямля, вам, княжычу майму, — вада, самая нашая вада зь Сьвіслачы!.. Вы бачылі яе блізу не замерзлай? Я думаю, ніколі! Не?.. О, вы будзеце ўдзячныя вельмі мне, калі пачуеце гэтак: яна, Сьвіслач, вечна маладая, здаецца, вечна вясновы нескончоны сплыў!..

— Ты, мабыць, грошы хочаш? Кажы, не перавахвайся на плашках. Грошы? — спытаў Арэмчык і глянуў парожняй, спакметнай вялічасьцю на калеку з шаравата-цьмянай азысьцяй каля вачэй.

— Будзе зашмат з вас, зашмат! Навошта мне вашыя грошы? Вось скажэце па-чэснаму: навошта? Я ж больш, чымсьці грошы, каштую! Ня верыш? Глядзі-купі: я жывая скульптура! Пастаў яе ў сваім доме… О, я ўжо ведаю, дзе твой дом!.. Думайце: раскопваючы абірак-Менск, знайшлі мяне, скульптуру абломленую… Даруйце, княжыч, не абурайцеся на караля свайго! Я ад радасьці, убачыўшы вас, згубіў развагу. Сьцеражэце яе: вартасьць скульптуры ўпадзе… Вы не ганецеся да сваёй цёплай гасподы, пабудзьце са мной… пабудзеце? Я раскажу вам усё, бо я люблю вас… Можа, хочаце да мяне, дык хадзем, знойдзем і маю гасподу…

Калека ямчэй паставіў тулава ў сьнег, адсунуў з лобу на патыліцу зімовую шапку, абцёр з даўгое барады і вусоў прамерзлыя скалкі льдзінак.

— Марозна!.. Ведаеце, тыдзень даўчасу немцы вызвалілі мяне, сказалі: гуд ман… У ваду сьцюдзёную сажалі… А сына, сыночка майго, няма! Праўда, няма? Дзе ён, дзе ён? — і калека, як пранікам падчас праньня бялізны на дашчанай кладцы, хлопнуў сваёй апорай-плашкай.

— Даруйце, ягамосьць, недалужлівай абяртне, я, напэўна, крыўджу пачуцьці вашае дасяжнасьці: навошта ж вам мае ўласныя ўразы — праўда?

Арэмчык слухаў, пасьміхаўся.

— Лыгні мне ў зубы — я ж каля самых тваіх ног, блізка. Я ўрочу сабе, што будзе чым пагардзіцца — новенькія, блішчастыя боты Арэмчыкавы лізганулі ў зубы мае. Я цемлю, хто будзе слухаць мяне, што гэта казка была… А боты добрыя, добрыя, кажу табе, а не каму іншаму!

Арэмчык зналусна глянуў на свой абутак; сунуў у кішэню руку і выцягнуў стуль адну нямецкую акупацыйную марку.

— Вазьмі й хадзі сваёй дарогай.

— Завошта вы? За добрыя словы мае? Я — багаты! Я — багацейшы за вас!.. Пастойце, не ідзеце, пагутарым яшчэ, я — добры чалавек, гуд ман, людзьвін наскі… О, дзякую, дзякую за ўбожыну, я так шаную вашу спагаднасьць мне!.. А грошыкі ня трэба, я ж шавец быў, я ж мог боты шыць…

Калека кінуў грошы. Арэмчык памалу зноў накіроўваўся па сьцежцы да Нямігі. Але калека не адставаў ад яго, перавахваўся за ім.

— Княжыч, ах мой даўні знаёмы, усё-ткі ня брыдзіцеся майго пачуцьця. Што яно? Лата да вашых дзяржаўных думак, аднак яно шчызьніць мне дзень і ноч…

— Ну, ну кажы, — жартаўлівіў Арэмчык, не азіраючыся на калеку.

— Дык прыпынецеся на часіну — паслухайце.

Арэмчык задабраволіў калеку.

— …знайдзеце сына майго… Што я? Што я? Яго даўно застрэлілі немцы.

— Ідзеце да немцаў — пры чым я? — адказаў Арэмчык.

— Праўда, княжыч… Вось тут, з пагорку, сын мой бегаў. Ён таксама абуваў боцікі. Я ж шавец, я ж мог пашыць яму найлепшыя… Аднойчы я нават змайстраваў такія боцікі, што, бегаючы па глыбокім сьнезе, ён не набіраў яго за галянішчы… А як у вас з ботамі? Я пашыю вам, жадаеце — зараз жа пашыю, тутака на вашым калене…

— Прэч, вар'ят, чуеш?

— Чаму? Я адно пра боты? Усё-ткі яны ж патрэбны чалавеку, куды бязь іх? Я і то падшываю пад мой пень падэшву, — і нарошні калека чутней шаргануў па серанку скураной падшывінай пад тулавам. Пачынаў часьцей дыхаць. — Я шыў абутак!.. Прызнацца, часам незаняты нашмат працай, я дазваляў самому сабе таемныя веданьні… Яны зусім сьціплыя. Не шпарчэце, княжыч, яшчэ дзень над намі, а ноч у руінах — страшная ноч! Яна цьмее, як вашы боты…

— Што ты хочаш, ідыёт? — непрыветна адклікнуўся Арэмчык і стаў насупраць калекі.

— І няпраўда! Клянуся Богам, няпраўда! Мне цеміцца, княжыч рэкнуў на мяне так сабе, без ацэвы. Валей не ганецеся. Дзе мне, калеку, усямянчыць за вамі? Але я рады, што магу паказацца вам, ісьці разам з вамі; вы ж разумнейшы за свайго караля… Калісьці, восеняй, я радзіў плашкай гэтай вам і таму немцу вандроўку ў кароценькую зь пясчанымі берагамі канаву. А вы? Вы ўсё-ткі прагныя да жыцьця: не забыліся нават на прошчу да ракі сталічнай; вы — княжыч! О, даруйце, вы ж нават доктар! Княжыч-доктар — ня крыўдна будзе?

— Што хочаш, ідыёт? — спытаўся зноў Арэмчык, астаючыся стаяць каля калекі. Ні аднаго прахажана, ні фурманкі. Ясьвілася ціхаць зімовага дню з рэдкім водгульным похканьнем марозу.

— Быдляга! — Арэмчык пайшоў. — Адступіся, кажу!

— Не ўхіблявайцеся, княжыч, злосьцяй. Хадзем памаленьку, вам хутка трэ палуднаваць… А па-мойму, вы не спасьцераглі трэшчынаў на сваіх ботах — яны цьвеляць мяне. Хром

лысьніцца хромам, марговым колерам, а тут наце: між прыгаства ліпяць чарвячыя віліны. Ох, як нялюба! А падумаць: калісьці гэная скура на цяляці была і, можа, на авечцы, тапырылася ад ветраку летняга, рухалася з кажнай цягліцай, калі падпрыгвала перад праглівым купцом. Пералічэце, княжыч, колькі праглівасьцяў жыцьця адклалася на вашых ботах…

Сьцежка кончылася. Узышлі на дорогу. Калека параўнаўся з Арэмчыкам, паравахваўся побач зь ім.

— …купец, мясьнік, гандляр, спажывец, моль, чарвяк і хто яшчэ? — падкажы, княжыч. Маўчыцё? Вам не да праглівасьцяў — вы ведаеце іх. Напэўна, мірсьціцё: чаму назвалі мяне асталопам, праўда?

Арэмчык загутарыў з калекам па-добраму і стрымна, прыгнуўся над ім і палажыў на ягонае плячо руку.

— Вуліца тут — людзей напаткаем — не выпадае мне цягнуцца з вамі, ідзеце сабе, куды надумаліся, а заўтра прыйдзеце да мяне, я дам вам хлеба. Добра?

— Некультурнае пытаньне, княжыч. На зьдзіўленьне, вы замарыліся, па-мойму. Да вас? Ха-ха-ха! У Самапомач! Вы хочаце скончыць сваё жыцьцё дапамагачом? От жа княжыч! Жыцьцё назначана, але патрабуй ад яго шмат!

— Прэч, быдляга, а то з мосту стурхну!

— Княжыч, я сябра і ахрысьцень вялікі, а вы? Што, манецеся баптыстам асьвянціць мяне… Каля гэтага мосту, мо' васямнаццаць, дваццаць год даўчасу мінула, я жанчыну з маленцам знайшоў. Драбнявая, невялікая, галодная, неаздобная, проста, як кропля вады за шыю… О доктар-княжыч, вам ня жыздрацца абыякавасьць да маіх расказаў! Вы быццам пагадзіліся з мной — інакш ня можна — бо ўсё сапраўднасьцяй было. Княжыч, сапраўднасьцяй! Жанчына-знаходыш праўдзівасьцяй дрывіла. Сваё жыцьцё яна бы чысьлінкамі разьдзяліла, ня шчодрыла словаў для кажнай зь іх. Я цэлую ноч слухаў яе гамонку. Чым толькі ні пабыла яна на сьвеце, пакуль пад атулу мосту зышла. Можаце наўцяць сабе: што яна, маўляў, сяньня апынулася пад мастом; пахінулася верай і разьвітаньнем з усім бывалым зь ёй і, напэўна, ахапілася плачам вялічавасьці няшчаснай, непашкадаванай. Пашкадуйце яе, княжыч! Пацалуйце яе. Паскрыпеце перад ёй сваімі ботамі і спытайцеся: — Ты плачаш? Да мяне хадзем, хадзем! Навошта пад мост? — Пасароміце яе. Яна мо' ўсклікне тады: «Я бачу вас! Хрышчэньнік душаў нашых, бачу вас!»

— О-о-о, які ты! — забаўнай пагардай ашкеліў Арэмчык.

— А што ж ёй сказаць? — працягваў ранейшае калека. — Што? Яна дала, балазе, свайму целу — дала? А вы, княжыч, зноў, зноў сваім чаранком, сваёй радоўкай цягнеце: — Хадзем, шчасьце наша! Хадзем адгэтуль. — Усе сьцежачкі заўсёды на ўзгорках… Абавязкова да грудзей прыхіні яе. Гардліва, як рыцар дзідай, сваёй дабраветнай даланёй ейнага маленца падымі і скажы яму, недаразумеламу: — Прыйдзі! — І ён, мабыць, адразу даведаецца, куды ісьці: у Самапомач!.. Ха-ха-ха! У Самапомач, княжыч!

Арэмчык таксама сьмяяўся з калекавай гамазьні, але нічога не пытаўся і не заўважаў яго. Ішлі далей удвух тым самым ходам.

— Вы, княжыч, не сярдуйце на мяне. Я люблю народную Самапомач, яшчэ як люблю! Але вось, па майму ідыёцкаму розуму, вы сваёй Самапомачай сапраўдны боль угамоньваеце. Угамоньваеце, пракулеўчык!.. А-а, чакайце, я крыху не туды, ці не па-свойску загутарыўся. Чамяшу адно, а думаю іншае. Я ж пра тую кабеціну кончу. Яна, ці тойчы, артысткай была…

— Куды ж ёй гэткай? Яна ж непрыгожай была, — жартнуў Арэмчык.

— Непрыгожая? Ха-ха — непрыгожая! Значыць, у яе быў жыцьцёвы страх — яна палохалася гэтага. Таму ўсюды лезла, дзе людзі кухціліся, — адказаў калека.

— …і спаўзла пад мост, — уторыў Арэмчык калеку. — Спаўзла пад мост.

— Па-мойму, адступіла, каб глянуць на іхныя аздобныя чарапы. Не дранцьвейце: я пашкадую вас, я падкажу вам, я чуў гэта ад нашага бая роднага, ён навучыў мяне: — Мы памыляемся ад жаданьняў… — Дзіўна? Га? Гузаваты татут?.. А артыстачка з-пад мосту ўсё-ткі аджыла ў маёй шавецкай майстэрні. Паннае каля сваіх худошчаў завіхляцца, падскубаць іх; сьмяецца над сваёй нядоляй, пра нядолю я любіў успомніць ёй!.. Бы лясная кузурка пад баравіком, валосікі ад гнідаў адчэсвае, праменьням сонечным паказвае іх. Седзячы ў працы над шкурамі, я ўсё часьцей касавуруся на яе; ня так забіваецца цьвік у падэшвіны. Асьцяронак я людзкі, але сэрца маё кладзецца каля яе, каля яе ж, княжыч… Яна ўжо ўторней і асвойтана на мяне паглядае і такую-сякую вясёлую благатню завядзе, ды вось калі прыляжа ў куточку цьмяным на жалезным, скрыўленым ложку, вочы ейныя ў столь ганунць доўга-доўга, маўляў, на павуці-

ньні наканаваньні адгадвае. Сыночак маленькі закавенчыць — яна да яго падыходзіць, бы сьцень месячная, быццам яно зусім незнаёмае ёй… Ведаеш, княжыч мой, — калека спыніўся, пахукаў на далоні, гучна потым пацёр і пахлопаў імі па сабе. Арэмчык азірнуўся, але не прыпыніўся.

— …празь некалькі тыдняў яна ўцякла ад мяне, — прагаманіў усьлед калека, паправіў шапку і барзьдзіў за Арэмчыкам.

— Тут людзі ходзяць, — Арэмчык прыпыніўся на рагу Няміскай вуліцы.

— Чаму? Чаму? Няхай глядзяць, які вы дбайны пра людзей, нават ягамосьць з калекамі за пана брата… «Вы людзкой дабраты прыхільнік!» — скажуць пра вас… А сыночка памажэце пашукаць. Гэта ж яна пакінула яго мне, — не сьціхаў калека і сьледкаваў за Арэмчыкам. — Колькі хлусьні я нарадзіў, каб упасьці яго пры мне. Я, ацяробак бязногі, жадаў даць яму іншы сьвет. Слухай, княжыч, я нават думаў, калі яна была знэнджанай і хворай: хай бы ляпей ты памерла. Дый мне, калісьці растаптанаму вайной афіцэрчыку, захапляцца цудам здаровага атожылку, атожылку ад майго пня…

— Ідыётык — адступіся, калі ласка!

— Вы, княжыч, вельмі ўважлівыя і ўветлыя. Запамятую: вы не адмовіліся ад брынчэньняў маіх.

Калека ня слухаў Арэмчыка. З асаблівым задавальненьнем і зь нязначным усьмехам пахільваўся перад ім.

— Хай будзе, спадарочку самапомачнаму, гожасьць паспытаць маю адданасьць, таксама і пашану няхай у гэтую маразяную часіну ўцеміць — паслухаць ад менскай кавялы-шаўца, ну прынамсі, апякунскую бязьмернасьць княжыча нашага… Віва Арэмчыку! Віва! Віва! — зусім па-іншаму каля радоўкі людзей перад ядальняй Самапомачы закрычэў калека. У радоўцы загаманілі. Арэмчык спыніўся. Шчокі і так чырвоныя ад марозу яшчэ больш ірдзеліся. Бляшчавы позірк бы ў прокмець злучыўся з вуснамі — Арэмчык плюнуў на калеку. Кагосьці з натоўпу ўразіла ягонае захаваньне, крычэў, не выступаючы зь людзкой гурмы: — У мызу яму клёпкай сваёй!

Калека сьмяяўся і гучна адказваў таму:

— Навошта — усёдна ня выплюне вясны! Ха-ха!

Арэмчык, разгневаны, бег да будынку Самапомачы. Ён у злосьці бясьсьведамка шаптаў: — Бандыты, бандыты!

Арэмчык убег у свой габінэт. Ён меў там тэлефон. Паклікаў на помач паліцыю. Але ёсьць часіны, калі задавольнасьці помс-

ты перашкаджаюць. Арэмчыкавай помсьце перашкодзілі зусім ня меншай справядлівасьцяй удзелу супраць права адказаць помстай-пакараньнем…Там быў Цярэм. Ах, старэнькі Цярэм! Ён кожны дзень наведвае Менск і напаткаў прылуку быць сьведкам спатканьня Арэмчыка з калекам. Гэта ён, калі ўбачыў, што ўсё добрым ня кончыцца, бадай, схапіў на рукі калеку і апынуўся зь ім у саборы Пётры й Паўлы. Захінуў яго ад Арэмчыкавага сьцігаваньня.

— І ты супраць мяне? — спытаўся ў Цярэма калека, а тады зачасьціў сьмехам уразьлівым ды беспрычынным.

— Схавайся — ня возьмуць адгэтуль. Не крычы, — павучаў Цярэм калеку, цягнучы яго да сабору, як пень на дрывотню.

— Дзяржаву новую знайшоў у саборы? Ха-ха-ха!.. Каго на хлебе княжычавым пакінуць хочаш?

— Пацярпі!..

— О-о, забыўся на справедніка нашага: пацярпі!.. Як здаровы, старэча? Ты зноў?.. Куды ж Арэмчыка назначыў?.. Слухай, справеднік: як болесьць адчуць пакутнікаў, калі ўсе пакутнікі на айчыне нашай?.. Ха-ха-ха! Болесьць! Балюча мне… і я не адзіны… Ха-ха-ха! Не адзіны!

З хахатаньнем тады, калі прыхінуўся сваім целам-абрубкам да абраза Хрыста, што чамусьці стаяў на адоле, каля сьцяны, калека адклікнуўся просьбным нашэптам:

— У руках Тваіх і ціхаць і ахвяра…

І адступіў крута.

— Няпраўда!.. Дарма бяры!

— Ты хворы — прастудзіўся, — хацеў наразуміць яго Цярэм, але калека, не адказваючы Цярэму, папрастаў да алтара. У саборы ад грукату ягоных плашак сходзілася гучна-роўнае рэха. Вялікомасьць сьвятога будынку — парожняя, з водарам воску й ладану мімавольна перамагала адчуваньне ўсялякага супраціву цярпеньню; глухаціла пачуцьцё, здабытае ад людзкай сапраўднасьці і добрай, і злой, але ўчэзьлівала сьвядомасьць сполаху: што гэтую, тваю сумленнасьць, ціхамірнасьць, зазіраньне ў собскую душу грэшніка, могуць зноў (блізу наўмецьнепакоры сваім ахвотам і парываньням) зьнячывіць, ня ўважыць. Адвечная гвалтоўнасьць!

— Ты ж маліцца прывёў — хадзі, хадзі, — спыніўшыся перад алтаром, паманіў калека Цярэма.

— Ты захварэў — прастудзіўся, — зноў папярэдзіў яго Цярэм.

— Маліся!.. А я пайду! Я званіць буду — хай людзі зьбіраюцца, хай слухаюць… Хай паспрабуюць, ці ня стане ім месца тут!..

Цярэм схапіў калеку за плячо.

— Куды мкнеш?

Калека рэзьліва засьмяяўся, скрывіў аблічча. Скаламучаны водбліск вачэй карціў нястрымную чуткасьць нэрвовай нераўнавагі.

— Тут пабудзь, я да япіскапаў схаджу, папрашу памагчы табе, — сказаў Цярэм, але калека, быццам да яго й не гаварылася гэта, прапанаваў Цярэму зусім іншае.

— Я на хоры пайду — засьпяваю… Маліся! Маліся!

— Я памалюся, абавязкова памалюся — толькі найперша да япіскапаў схаджу, — паспрабаваў Цярэм супакоіць і пераканаць калеку. — Цябе ахаваць папрашу іх.

— Цішэй, цішэй — нехта шэпчацца: на Сьвіслачы хвалі, мабыць… ужо кнігаўкі на купішчах крыламі паветра шамацяць… вясна аж плішчацца… Вясна! — скончыў ускрыкам калека і ўпрокмець зірку схаваўся за Цярэмам. Зь незвычайным перапалохам, з дрыгатлівым войканьнем ціснуўся да Цярэмавых ног, стукаў плашкамі аб падлогу.

У сабор увайшоў сьвятар Кіпік.

— Вясна! Вясна — чорная! В-у-у, чорная!

Калека, як перад гэтым, хаваючыся за Цярэмам, зноў спадзеўна вымкнуўся насустрач сьвятару, што ўсё зьдзіўлена стаяў недалёка ад уваходу і пазіраў.

— Што робіце тут? — нарэшце спытаўся ён, але бліжэй не падышоў.

— Маліцца! Маліцца! — ускрыкваў калека і папрастаў да сьвятара. Аблічча ірдзелася захапленьнем, той нападнай дзікасьцяй не пазнаць больш сваіх цярпеньняў.

— Прэч, рагаціна бязбожная! — скрыкнуў Кіпік на небывалых малельшчыкаў і, абыходзячы калеку, накіраваўся да Цярэма. Ён быў добра знаёмы зь ім. Неаднойчы кусок мяса дзічыны даставаўся і яму, хоць Кіпік ня вельмі патрабаваў яго — браў адно дзеля смакаваньня перамены хатніх страваў у ядальні япіскапаў і мітрапаліта.

Аднак Кіпікаў скрык прынёс новую зьмену. Калека таксама яшчэ гарэй, іншым голасам, адклікнуўся яму.

— Маліся! Маліся! — і бы ў яго адрасьлі адсечаныя ногі, і бы да яго прыхлынула невядомая ніколі ў жыцьці воля пагард-

насьці, але найперш, вітальна пахіліўшыся адзадзя Кіпіка, шпурнуў усьлед яму плашкай.

Цяперака ў саборы Пётры і Паўлы калека буяў вар'ятам.

— Маліся! Маліся! — усё торыў ён у саборы, і на вуліцы, пакуль везьлі яго да нямецкае жандармэрыі.

— Ойча Кіпік неблагі паліцыст, — зьдзекна, з здаровай пагардай, падышоўшы да сьвятара, сказаў Цярэм.

2

Цярэм упрасіўся да сялібы мітрапаліта і япіскапаў паскардзіцца ім на ўчынак сьвятара Кіпіка, і ён пачуў там зусім «свабодадумнае».

Яго спаткаў япіскап Філіцы. Ён прысеў за столікам з чорнага беларускага дубу. Цярэма пасадзіў наўсупраць. Зь вялікім супакоем слухаў Цярэмаву скаргу і абвінавачваньні. Час ад часу пакашляваў у далонь і трымаўся за крыж на сутане. Сьцены сьветлае гасподы ўбіралі абразы сьвятых укорнікаў і Хрыста.

— Чаму, спадару, так адчуваеце цяжар Кіпікавага захаваньня да вар'яты?

— Таму што гэта здарылася ў царкве, дзе я хаджу маліцца, дзе спадзяюся дасьмяротную ахову, дзе я магу замкнуць сябе пачуцьцём сумленьня, у тую самую, бадай, турму і збавіць грамадзтва ад маёй небясьпекі...

— Няўжо, спадару, думаецца: царква — месца духоўнай турмы, а не ратунак грэшнае душы?

— О, ваша правалебнасьць, мне хочацца адказаць вам адразу, не чакаючы іншых тлумачэньняў і пытаньняў: ужо даўно вядомы хрысьціянскія ідэалы!.. Правалебнасьць ваша, даруйце мне: нявартa паказваць на нашыя грахі, лепш дайце зразуменьне карысьці й патрэбы грэху, можа, сам грэх ужо ёсьць ратунак.

— Спадару, вы стары паляўнічы за асалодай грэху — вось хто вы...

Цярэм нецярплівіў.

— Не! Не асуджвайце мяне! Дазвольце палашчыць ваш слых адмоўным: я толькі ўсяго з тых, што не пагаджаюцца з патрэбай гэтак жыць і захоўвацца...

Філіцы ня даў дакончыць думку.

— ...вы пераконваеце мяне сваім каяньнем — і я багаслаўлю вас.

Цярэм зьбянтэжыўся. Што аставалася сказаць яму за сьціплыя, уветлівыя словы ўладыкі. Але япіскап ня замоўк на тым.

— Вы супакойцеся, адмоўцеся ад пагарды да чалавека, які толькі папрасіў паліцыю забраць зь сьвятога месца вар'ята.

— Але ж там застрэляць яго. Ён пакрыўдзіў Арэмчыка. Вы ж мусілі ахаваць яго!

— Вы кажаце праўду, вы адчуваеце спагаду чалавеку... я ўжо ведаю пра вас, мне калісьці апавядалі пра вашу дабрадзейнасьць... забудзьцеся пратэставаць. Арэмчык пацярпеў, пацерпіць няхай і калека. Цярпеньне тое самае ачышчэньне грахоў і кліч да сумленьня быць справядлівым... Лепш разьвітаемся... Цярпеньні — Боскае пакараньне!

— Уладыка гуляе з мной і надзіць, каб я асаромеўся сваіх учынкаў абароны чалавека. Хочаце зрабіць непарожняе пустэльнай... Мне верыцца: уладыка ненавідзіць мяне.

— Валей дакарыце сябе: што я лезу туды, куды ня трэба. Усялякае здарэньне — Боская воля... Разьвітаемся — часу няма — даруйце!

— Уладыка, ня шлеце ўсіх нас у ахвяру Боскае волі... Я скардзіўся на волю чалавека, жадаў уцешыцца хоць бы словам заступства за таго, хто стаўся напраўду грэшным, але няздольным заступіцца за сябе.

— Вайна цяперака — за ўсіх не заступісься... Чым вы церпіцё?

— Усім несправедным у маёй Айчыне!

— Ад абароны вар'ята перакінуліся ў агул усіх і ўсеякіх цярпеньняў... Я ж не аскет у чыне япіскапа, каб ісьці на ўсеякія патарчакі грамады, калоцца на іх і пакутаваць...

— Уладыка пагадзіўся з паляваньнем ільвоў, таму жыве ў сьвятліцы сытным і не прыдушаны імі...

— Прашу пайсьці ад мяне. Мне стане слухаць вас. Бачна — да чагосьці канчальнага не дамовімся.

Япіскап цьвяліўся. Цярэм на часіну замоўк, быццам палохаючыся наразіцца благім словам на непрыемнасьць, але рупіўся сказаць япіскапу штосьці больш ядкое і дапятлявае.

— Уладыка, ува ўсялякіх умовінах жыцьця, апыненьняў і адчуваньняў можна знаходзіць і знаходзіцца вера, прыгаство ды любасьці...

Філіцы ня сьцерпліваў. Цяпер ён манах, а не япіскап! Ці магчыма цярпець абразу, хоць бы праўдзівую, хоць бы й ня гэт-

кую, але якая трымае ў сабе зьмест нечага, што крыўдзіць цябе, згнушае тваю дасяжнасьць, тваю ўладу? Ён порстка ўстаў з-за стала і падышоў да Цярэма.

— Прэч адгэтуль! — і адчыніў сам дзьверы. — Я таксама магу помсьціцца, як і вы за вар'ята...

У гэты час, незнарок, з-за запоны ў ягонай гасподзе выбегла маладая жанчына. Яна, пакуль слухала, неспакметнай, Цярэмаву і япіскапаву размову, згубіла самаўладнасьць раней, чымсьці Філіцы. Ейны падбародак і вусны судрагаліся, як у маленькага дзіцяці, калі яно плача. Ад неспадзеву ейнага зьяўленьня нават і стары Цярэм старапеў, глядзеў на яе, бы на скіненую краску вою на парадзе з рукі чульлівае дзяўчыны.

— Гані яго! — закрычэла яна па-расейску, гледзячы проста ў япіскапава аблічча, вытарапіўшы пясьць у кірунку Цярэма.

— Шызая качачка, апусьці свае крылы! — заўцеміў Цярэм і пабарзьдзіў пакінуць япіскапаву гасподу.

— Замоўкнуць! — скрыкнуў япіскап на абаіх... і адумаўся. — О, не! — прагаманіў усхваляваны ён і пабег да дзьвярэй на знадворак.

— Пачакай! Часінку толькі! — клікнуў Філіцы. І Цярэм, прыклаўшы паўзгібам далонь да вуха, бы ці ня ўцемліваючы, што япіскап просіць адчыніць яму весьніцу на вуліцу, нагнуўся да клямкі, спытаўся:

— Вы клікалі мяне?

— Але!.. Я нават тваё імя памятаю... Хадзем яшчэ некалькі словаў скажу табе.

Філіцы ўзяў Цярэма пад руку... і хутка выпусьціў яе. Глянуў у Цярэмавы вочы, але той сігаў далей, як быццам япіскапа і не было побач.

— ...я з крыві твае. Я ж гэтакі, як і ты. Я хачу гутарыць з табой. Мяне не сароміць тое, што ты напаткаў у сьвятліцы. Мне ўсёдна тое... Не! Я пра іншае: сваю веру абвешчу табе, не называючы Цярэма братам адзінародным... Пра цябе чуў шмат, таму і прыклікаю Цярэма, я ж магу гэта, я ж духоўны старэйшына твой — амін! Значыць: чалавек створы, паслухаўшы сваіх духоўнікаў!

Філіцы змоўк. Моўкнуў і Цярэм. Водгуль іхнае хады чутліва скалынала вусьціш парожняе вуліцы з разбуранымі будынкамі наўсьцяж. Некалькі часінаў яны ішлі бязгутарныя, у нэрвовым, бадай, у спалохным адзіноцтве. Шырокая япіскапава апраньня шасьцела асьцярожлівым шорахам малых істотаў у гусьціне травы.

— Моўкнеш, Цярэм?

— Моўкну, вяліцтва духоўнае.

— А, можа, уторыцеся справедніцтвам сваім? Я, можа, перараканаюся ім і тады пайду за вамі ўсюды...

— Прымеркнеце ад чаканьня на яго.

І яны змоўклі зноў. Філіцы не адступаў ад Цярэма. Выйшлі на Савецкую вуліцу. Тут было людней і шумней ад нямецкіх аўтамашынаў. Некалькі чалавек гакамі і капніцамі секлі на сярэдзіне вуліцы лёд у замерзлых лужынах і скідвалі на ўскраі засьнежаных ходнікаў. Крыклівыя галкі лёталі каля дрэў і спаленых камяніц. Іхныя дзіркатыя ўскрыкі і ўзьвівы ў паветра аддзельвалі ўвагу ад замерзлае існасьці руінаў, блізілі да некаторае ацевасьці рухлівасьці ў думках і настроі.

— Вы ці ня хочаце нешта? — спытаўся Цярэм, ахоўваючы ў голасе спакой і ветлівасьць.

— Ад вас?

— Але. Ад мяне.

— Я за вамі, Цярэм, — хачу сказаць. У мяне яшчэ сіла не адбывае — я маладзейшы за вас.

— Малады і я — яшчэ як! І здаравейшы за вас целам і душой, наша правалебнасьць духоўная.

— О, Цярэм, даруй мне! Нарэшце я скажу табе ўсё — адважваюся. Нак жа думай: я не ад уражаньня забясьпечыць мой гонар і чэсьць япіскапа... Цярэм, калісьці я быў манахам, сьвятаром, і стаўся япіскапам, на то вайна ёсьць. Вайна робіць герояў, вайна прыносіць рай. Калі ўцеміць добра ўсё на зямлі, як дадаць — дадатнае, як адняць — адмоўнае. А фізыкі кажуць — мінусы і плюсы электрычныя працягваюцца паміж собску. Страла воіна — мінус, крыж наш — плюс! Ад іхнае зьбліжнасьці: сьветнасьць нашая, і сьмерць нашая ўсёдна надыходзіць... Добра ўторыў твае віхравеі душы і павучэньні, ці не?.. А потым яшчэ, ты ўсё веціш: бяскрыльле наша разьвяжацца. Радасьцяй карнісься, калі што-небудзь апыноўваецца на алтары тваёй бацькаўшчыны. Быццам плыні ліхога трупікамі людзкімі засыпяцца, спадкам тваім станецца і пакаленьню твайму; ад натугаў тваіх твае старыя цяглiцы моцай і рухлівасьцяй робяцца, а розум нават жарснасьцяй надзіць; і кажную рэч у жывым чалавеку знаходзіш, а не, дык параўноўваеш людзкія ўсчолы і ахвоты раўназначнай вартасьцяй: усё свайму пахожае; ці то: усё гісторыя ёсьць, калі яно дадае значэньне мінуласьці, калі яно ўжо ў сваёй задуме, а ня толькі: зьдзейсьні — апыноўваецца наканаванасьцяй гістарычнай. А потым яшчэ: усё ў цябе не ахвотнае да

кволасьцяў, нават не да духоўнае, нават не да фізычнае... хаця — не. Ня хочаш быць у духу сумленьняў, а ў болі ад боляў прыходзяць... Ах, Цярэм! Я ня супраць цябе, я і ня Боскія або япіскапаўскія спагаднасьці тваім блукнасьцям выказаць жадаю. Я, можа, з табой пагаджуся... Я з манаха ў япіскапа перамяніўся. Але праўды і крыўды я не шукаю. Я праваслаўны толькі. Мне валей — «амін» казаць дый любіць. «Амін» пакідае шмат што для веры, а «аман», «амэн» — наадварот; пасьля мальбы сьвятой: «ман», «мэн» — чалавек, багаслаўляю цябе чалавекам, хоць бы потым ты зьвяром будзеш. У цемрадзі касьцёлу расьцьвіцеш краскай, на знадворак выйдзеш: золатам і шоўкам насілкі зіхцяць перад табой. Багасловяць цябе ўкорнасьцяй, а ты пяеш гімны — славіш правадыра свайго. Будзь векавіста дасьмяротная авечка! Адыдзесься — у роднай гасподзе ўжо другі бацька і правадыр чакае — дай і яму хвалу ды абавязак, кроў і жыцьцё, і думай, як ён, і хадзі, як ён, і не спакмечвай, што ад ягонае дабрадзейнасьці дзяржаўнае адно смуродзь кадзіць, і кажная ўтаропнасьць ягоная дзеля людзей — бясконцая цярплівасьць і пакута ёсьць. Але думай: на ягоных вейках вечныя расінкі дагоднасьці ясьвеюць, а сэрца туліць спагады і журотнасьць усенародную... Ці ўсё ўторыў тваё і сваё? — бы прыкідна, спытаўся япіскап і прыніклівым зіркам, як і раней, глянуў у Цярэмавы вочы. Цярэм глядзеў на япіскапа.

— Вашы перажываньні, мабыць, ня кончыліся — канчайце іх. Ваша вяліцтва, гэтак мы і да майго сяла хутка дойдзем.

— Я крыўды і праўды не шукаю і не загаварваю тое, што бачыў ты ў гасподзе маёй. Я навучаю вас умяркоўнасьці. Я жыцьцё таксама ведаю і таксама ведаю, як браць яго, — гаратліва сказаў япіскап і не супакоіўся. Затаёнае адчуваньне ўразьлівасьці ад напатканага Цярэмам у ягонай гасподзе кранала яго — прынуквала паступова быццам ураўнаважвацца нечым зусім лагодным і як трэба згладжаным у настроі.

— Гэта вы сяньня ці ўчора пачалі ведаць пра жыцьцё? — спытаўся Цярэм больш зьдзіўленым голасам і больш рашучым, што да самага сэнсу спытацца ды падумаць не інакш.

— І сяньня і ўчора. Я даўно жыву вобмацкам маіх перакананьняў. І дзеля таго рыньвлю мае пачуцьці прызнацца гэтым. Дзеля таго каб Цярэмава сэрца ведала месца на зямлі, ну, прынамсі: што я ня блазан які-небудзь, і што ў мяне няма адчувальнасьці карціва-сапраўднаму да будучага жыцьця.

— ...тады ягонай вялікасьці, — перарваў Цярэм, — не было б патрэбы зварачацца да мяне ці да кагосьці з сваімі празь-

мерна пакутнымі наўмерамі і шмыгаць сабе пацуком паміж будучым ды паміж мінулым.

— Як твае словы ўцемліваць: як гастрату — толькі б уразіць, ці можа як насьмех?

Цярэм неспакметна ўцягваўся ў датклівую гутарку. Адказваў:

— Рыбінкай у твані ўявеце.

— О-о, як! А ўсё-ткі ад цябе паразумнееш.

Філіцы засьмяяўся. Ён паверыў і верыць сваёй моцы дароднасці, хоць добра бачыў, Цярэм ідзе побач яго з тэй самай дастатковай старэчай цярплівасьцяй абыякава слухаць.

Зноў некаторую сьцяж вуліцы яны ішлі моўкныя. Япіскап не пакідаў Цярэма. Сігаў разам зь ім з аднэй і тэй самапэўнасьцяй і наўмернасьцяй.

— Што ты любіў, Цярэм, і любіш цяперака? — загаманіў Філіцы зь непрайменнасьцяй, зь некаторай асьцярогай, каб як быццам ён жадае гутарыць аб гэтым не зь якім фіглёрствам, а зь любазнаўствам ды ўважнасьцяй.

Цярэм не адказаў яму. Яны зьвярнулі на другую вуліцу. Там кожны ступень можна было назваць і вуліцай, і камяністым полем сярод гор. Камяніцы ляжалі выступамі засьнежанае скалы, і толькі дзесьці, пад самай Сьляпянкай, карчанелі нізкія драўляныя хаты, зырчэючы шыбінамі ад праменьня сонца. Праходзячы паўз высокіх друзаў калісьці шматпавярховага дому, напаткалі некалькі мужчын і жанок. Яны весяліліся. Пакуль ня ўбачылі япіскапа зь Цярэмам, некаторыя мужчыны завіхаючыся каля жанок, агадвалі песенькі або чадрылі непрыстойнасьці. Цярэм азірнуўся на іх.

— Не азірайцеся... не журыцеся за іх — гэта блізу патрэбная сцэнка: я праймуся найбольш тым, чым наджуся і адчуваю...

— Ці ня час, уладыка, разьвітацца нам.

— Не вытрымліваеце? А цярпеньня, старэчы, трэба мець. Вы ж прарокам жадаеце быць і нат Салямонам у дзяржаве сваёй стацца...

— Уладыка нягодны чалавек.

— А мне і тваё — нічога! Праўдзівую сувязь з сваімі падданымі трымай — цярплівым будзь! Навучай даступленьня любіць цябе: «У бясконцай нашчадзе пакутаў яны ніколі ня ўспомняць цябе». Або зусім лірычна: «Чаму вы па-свойму наровіце? Уявеце, хоць бы пылінкай, паглядзець, як між галінаў, угары, на дрэве, расчыняюць птушаняты дзюбы, бы тыя пелясткі красак вецер!» Чые ж гэта «няўхільныя прохані жыцьця», мае ці твае?

Безумоўна, адкажаш: уладыка, маё, а як інакш?.. Дык вось пачуў мае навукі, ці не?

— Але. Чую, уладыка! І нават бачу: над вамі аб'яўляецца карона нараджэнца спакону.

— І народзіцца! — усклікнуў япіскап.

— Самы найдурнейшы ўскрык!

— Не падзейнічала на мяне і гэта!.. Слухай, старэчы, я прызнаюся табе: ненавіджу цябе, не таму, што саракоміш цяперака супроць мяне, а таму, што я хвалююся, калі пачуў пра твае «воблікі ўсярэдняга жыцьця». У людзей ёсьць імпэты роўнасьці ва ўсім, ня толькі ў сацыяльным, але ў духовым, але ў кажнадзённым. «Кажны хоча зразумець свой час», — тваімі словамі падмацоўвую. Вось гэтак прагну я. У цябе ёсьць сьведамасьць ненадзвычайнай помсты бы або ўзьдзеі і рухлівасьці ў старасьці за тое, што нешта «сваё роднае» ня зьдзейсьнілася пры быцьці тваім. Я шмат пра цябе чуў, таму і гутару ў твой сулад.

— ...а ў мяне, значыць: у нас, як рачная лілея атоньвае яно — ускрасае і цвіце — жыцьцё вусьнявіць! — спакойна перарваў Цярэм япіскапаву гутарку. У старым голасе, у кожным слове трымалася штосьці ягонае бесьсьмяротнае і запаветнае.

— Дазволь мне! Дазволь дакончыць сказаць... перад табой я ведаю, дый кажуць усе: камень ад немані сваёй завые... Хвалю цябе, бы ня ворага майго!..

— ...уладыка казаў: крыўды і праўды не шукае, дык навошта з мной надзіцца і турбаваць мяне? Разьвітаемся і паверым, як добра ёсьць, калі маеш ворагаў гэтакіх, як ты сам сабе бываеш ня сябрам.

— Я згодзен з вамі, згодзен да вынікаў нават. Старэчы, праўды і крыўды не шукай. Навошта? Бо ж навучана: у самім Дабры так шмат зла, а ў Зле так шмат дабра, што можна не памыляцца, маліцца аднолькава ці богу Дабра, ці то Злу.

— Вашу няпраўду і несправядлівасьць я пагарджаю маёй любасьцяй, бо мая любасьць да гэтага вашага ёсьць часьлінка маёй, сумеснай, непраўдзівасьці і несправядлівасьці... Уладыка, кінем нашу наўдань... Бывайце!

— Не, старэчы! Штосьці іншае паслухай. Улады хочацца мне. Кажнаю часіну я магу кінуць духавенскі чын... Вайна аб'явілася, мяне з манаха нікчэмнага ў япіскапы выцягнулі. Вайна пакуль ідзе, я вышэй пацягнуся: я ўлады прагну, я прагну жыцьця вялікага. У мяне зайздрасьці жыцьцёвыя асяліліся. Я мала-ды яшчэ. Пачуўшы пра вас, зьненавідзеў вас. Дзядуля з дамавіны над жыцьцём сьмяецца і ўсё вабіць для роднага — Айчыны.

А я праваслаўны. Хачу ўвесь сьвет праваслаўным зрабіць — вось гэта ёсьць маё роднае, хоць і далёкае. Мой сьвет увесь! А за вамі што?

— Уладыка, не памру тады. Па знаёмству — тваім раднікам буду.

— Сьмяецца апошні — старымі словамі кажу табе!..

Япіскап ня выцерпеў Цярэмавага насьмеху. Адчуваньне непакорнасьці яму — паслухаць яго, сьціснула сэрца немалой жарсьцяй абурэньня. Заскочыў Цярэму наўперад, схапіў за рукі, спыніў.

— Ну, добра — паслухаю. Мо' ад вялікіх жаданьняў і парываньняў вашых не адранцьвею, — згадзіўся Цярэм. На ягоным абліччы ясьвілі праўдзівая пакорлівасьць і спакой.

— Ногі мае баляць. Зойдзем на магіліцы — прыперціся дзе будзе.

Яны якраз дайшлі да Вайсковых магіліцаў. Прыпыніліся каля капліцы. У япіскапа неспакойнасьць і ўцеўлівасьць ажывала асаблівай неабходнасьцяй. Часіна, у якой пачынаецца жыцьцё вольным, лёгкім і дзеля сябе векавістым быцьцём. Нават не прысутнічаюць уцемы аніякіх жыцьцёвых перашкодаў. Ёсьць толькі імкненьне ўзьляцець лятою спрадвечнага мятліка і дыхаць небывалым здароўем ды радасьцяй дагэтуль невядомай моцы. А ўсялякае, што калісьці турбавала цябе, даць камусьці адгаднасьцяй агульнае веры: як добра, што яно ёсьць і сталася гэтак!

— Я манахам быў, ужо казаў табе, — пачаў Філіцы. — Але і манахам зрабіўся ад зайздрасьці таксама. У часе Польскае вайны, у 1920 годзе, у маім сяле заложнікаў расстрэльваць зьбіраліся, бо нехта «жаўнежа варшаўскего» за ногі да дубу падвесіў, гэтак і сканаў бядак падвешаным. Заложнікаў не расстралялі. Але з васямнаццацігадовым хлапцом палякі расправіліся. «Я прыкончыў яго!» — сказаў ён, выступіўшы зь сялянскае гурмы, і аддаўся катам. Яго ж тут і расстрэлілі, блізу ў тую прокмець, калі ён абвесьціўся перад імі. Аднасяльчане ведалі, што ня ён загубіў «жаўнежа». Хлапца пахавалі тут жа на месцы крыві собскай і жыцьця недажытага. Кажны сяльчанін, малы і дарослы, жменямі пясок на яго сыпалі і маліліся, і звычай нат застаўся: хто праходзіць паўзь ягонай магілы, жменю пяску ўдзячнасьці сыпне. Курган насыпалі над ім... Жменямі.

— ...малюся за яго, схінаюся перад Хрыстосам айчынным! — адступіўшы на крок ад Філіцыя, перахрысьціўся Цярэм і пахінуўся ў пашане.

— Хрысьціся, старэчы, хрысьціся! Яшчэ адна постань, лішняя, пацярэбіць спагадай тваё сэрца — усё на алтар Цярэмавай бацькаўшчыны... А мне тады зажадалася зьвярнуць увагу на сябе: у манахі пайсьці задумаў. Мне думалася, маім учынкам жывуць, захапляюцца. Праз колькі год пераканаўся: гэта не жыцьцё і ня ўчынак, а, бадай што, нічога або аб'яўнасьць прысутнічаць на зямлі або пад зямлёй.

— Уладыка, напэўна, адгадаў само жыцьцё, калі б дадумаўся, што само жыцьцё ёсьць тварыць жыцьцё, перамагаць яго ня трэба, а наканаваць няўхільнае — пакідаючы адначасна зь сьляпцамі для спамінаў: б ы л о сьмяротнікаў і нараджальнікаў — б у д з е!

— Ён зноў... куды? Мне спрыкла тваё, спрыкла, як ты! Нарэшце дазвольце собіць маё. Тваё старэнькае ўжо. Яно да аднаго прыгінаецца: пабагаславіць цябе і самому сабе агадаць — плюнуць на ваша!..

— ...чалавек, што робіць і ўсё, што ўторвае да яго тваронае ўжо, заўсёды пераконваецца, што ён першым у сьвеце распачаў гэта, — ня сьцерпліваў Цярэм сваімі выказамі. Бы адкуль з прытайку кідаў іх япіскапу.

А япіскап Філіцы болей не прасіў: «даруйце», «дазволь». Хоць разумеў Цярэма нават ня проста звычайным чалавекам, а нікчэмным і на якога ня толькі можна плюнуць — нават мезенцам паказаць ня вартым было, япіскап аднак найперш, сказаўшы: — Псыхолягам ужо нуртавіш? — як хлапчук у задорнасьці запалу набіць слабейшага равесьніка, прыгразіў Цярэму: — Калі хочаш, дык зараз усё-ё абвесьціцца...

...I здарылася зусім неспадзеўнае і для япіскапа, і для Цярэма. Пасьля чаго, цяжка адгадаць. Зрабілася: у капліцы на магіліцах пачуўся людзкі стогн і драпаньне. Япіскап, адбегшыся ад магіліц і Цярэма далекавата, прыпыніўся ў даўцемі. Ягоная постаць, апранутая ў чорную сутану, сярод засьнежаных пусткоў стаяла, як абгарэлы пень.

— Мы разьвітаемся. Ня можна ўсіх зрабіць ксяндзамі і сьвятарамі. У сумленнасьці ў сьвянтынях сабе яны ўсе аднолькавыя...

...У Беларусі пачынаўся тэрор. Наехалі зь Югаславіі расейскія саладарысіты, панаходзіла ў нямецкай уніформе прыбалтаў атрымаць больш тэрыторыі ад беларускіх земляў.

3

Штосьці ўсё было ня гэтак, як жадалася Арэмчыку. Усялякія праклямацыі незалежнасьці Беларусі, усялякія насьмехі ці то неспадзеўкі калекі ды нават, бадай, выяўныя пагрозы ягонаму жыцьцю, пачалі радзьвей і радзьвей апыноўвацца перад ім. Усе гэтыя падрыхтаваньні дзесьці рабіліся пад пэўным наглядам і настырлівасьцю. Кімсьці нагодзілася гэтак, каб усё таемнае, сваямэтнае было вядома ў краіне ўсім людзям і ўсім, як ён, Арэмчыкам. Таму Арэмчык старожаўся і таксама ціхотна рупіўся не аставацца ў разбураным Менску без змаганьня, без навалы на сваіх сапраўдных і несапраўдных ворагаў.

У Менску Арэмчык не адразу знайшоў сабе сяброў і аднадумцаў. Некаторыя дружыліся зь ім, але незадоўга, пасьля знаёмства, выказвалі яму вельмі нялюбыя патрабаваньні і меркаваньні пра немцаў, і пра будучыню Беларускай Айчыны. Гэтакіх ён ня ўцельваў, ён ухіляўся іх. Здавалася, Арэмчык адчыняў брамы сталіцы для сваіх незьлічоных ворагаў: упускаў іх на пляцы, вуліцы і кірмашы; спатыкаў іх пераконамі: ахвотай сытна жыць на аўсяным хлебе; спрабаваў удачыць іх новай, своеўласнай карысьцяй мэты жыцьця і, нарэшце, збаўляўся іх, як збаўляюцца ворага дзе-небудзь на фронце ці на варце ад рабаўнікоў. Ён ухіляўся іх, былі больш спадручныя.

Ужо мінула два тыдні, як калека пакрыўдзіў Арэмчыка, але забыцца пра тое было нялёгка: прыкрасьць клікала да помсты. Як задаволіцца ёй? Як пазнаць людзей, калеку, а ўсялякае — яно ў змаганьні бязь ліку.

Арэмчык пачынаў радзіцца з Саболікам, з тоўсьценькім, апратлівым чалавекам. Саболік жыве ў сталіцы нядаўна. Ён не любіў людзей, што кураць, і заўсёды ўторваў, што напагатове паказаць абкрываўленую кашулю з закатаванага беларускага селяніна, і нат абяцаў напісаць дзьве кніжкі ўспамінаў. Спатыкаючыся з Арэмчыкам, ён любіў гутарыць расейскай мовай і прадчасна папярэджваў яго праз ганца праветрыць гасподы ад табачнага дыму ды паху, бо ён жадае завітаць.

Аднойчы зімовым раньнем Саболік завітаў да Арэмчыка.

— Ну, як вам спалася? — спытаўся ён і адразу зьвярнуўся да Арэмчыкавай дамаведкі і дачкі: — Пакіньце нас, абыдземся бяз вас.

Арэмчык падсунуў Саболіку крэсла, ён зрабіў гэтую ветлівасьць хутка, што пасьля ня мог успомніць, пра што пытаўся ў яго Саболік і што казаў ён жанкам.

Жанчыны пакінулі іх. Яны прызвычаіліся да абразьлівых захаваньняў і, бы людзі за штосьці пакараныя, не спрабавалі спрачацца зь імі.

— Апрача сьвятых апостальскіх пісьмаў ёсьцека Аль-кітаб. Ты ня думай, што мне хочацца прыпомніць табе пра маё азіяцкае паходжаньне, а павучыць розьніцы ў нашым падыходзе да яснасьцяў справаў... Я надумаўся тое-сёе зрабіць. Усіх пісакаў, што жывуць у сталіцы, мы назавем братамі. Ты разумей: мы зробім іх удзячнасьцяй падзяліцца з намі сваімі загадкавымі мроямі і прароцтвамі. Гэтыя людзі люцыпарскія! Іхнае захаваньне да ўлады выдайлівае, што, маўляў, узьлезеш на вежу і стуль назіраеш усялякую прысутнасьць. Ці то: сама зямля ўздымае цябе і паказвае сябе... Праўда?.. Праўда ці не? Кеміш мае казаньні?

— Не зусім яшчэ, — адказаў Арэмчык.

— Вы жартуеце зь мяне — мабыць таму, што я прыйшоў сюды сам? Толькі таму, што ўбачылі: я не шкадую свайго часу, і ад першага спатканьня даверыўся вам душой і целам. Вы думаеце, я так захоплен вашымі скрухамі, што палічу ваш спад маёй друзготай становішча і мо' пачуцьця?

Саболік зазлаваўся. Але Арэмчык не бянтэжыўся. Проста была выпадковасьць: іхныя думкі зьбегліся адным знарокам. Найбарджджэй у іх ці не жыла ледзь ня братняя прывязнасьць, якая згуртоўвае агульнай вартасьцяй адчуваньне адначаснага сэнсу будзённасьці.

Арэмчык тлумачыў Саболіку:

— Дзякую за добрыя словы твае! А вось да парады: склікаць усіх пісакаў на літаратурныя сходзіны — вы напэўна думалі пра гэта, — дык скажу: я ўжо паклапаціўся сам... сяньня а 3-й гадзіне прыходзьце да клюбу, паслухаем іх.

Саболік адтутурыў вусны. Значыць, тое, што пачуў ён ад Арэмчыка, яго зьдзівіла ды яшчэ больш уцьвяліла, аднак моўкнасьць не выдавала ягонага хваляваньня — яму трэба чакаць. Арэмчык таксама моўкнуў, мо' ад таго, як зразумець Саболікаву варухлівасьць — гідка адтутурваць вусны.

— ...ужо час зрабіць сходзіны. Больш зырка выявіцца, дзе ўсё-ткі карналіны супраціву маім намаганьням, звычайна маім асабістым, ад якіх, вядома, можа азначвацца цэлая аснова палітыкі ў краіне. Я зусім ня думаю пра рэформы па вайне, ці падчас яе. Дазвольце ўторыцца: я думаю то спакойна, то ненавісна супраць усяго, што ёсьць супраць майго зацікаўленьня! Мне жадаецца сказаць, што мы не аджывем тутака. Штодня пера-

конваюся: народ у імпэце да свайго роднага. Ім страхам сьмерці забаранілі казаць пра айчыннае, таму яны шэпчуцца, і ніледзь не сумуюць. Па-свойму адгрызаюцца, гінуць... Ці можна ўтрымаць іх? А ўтрымаць суцежнасьць — будзе загінуць ад іх!.. Мы мусім адступаць, чым здолеем заашчадзіць сваю дабралетнасьць жыцьця. Адысьці без змаганьня, як вы аднойчы сказалі, таксама няможна, мы будзем тады толькі пясчынка ў віхравею. Мы, як інтылігенты, адступім з супрацівам... Ах, якія цяжкія перашкоды! Таму добра ведаць: што вось стаіць стоўб, а ў ім ёсьцека трэшчыны — пісьменьнікі пакажуць, паэты выцяўпуць іх у эпапеях... Гоняцца за табой — ты ўкраў залатнік; будзеш бачыць: зловяць цябе, уткнеш у трэшчыны гэты грош — і я, і ні я, — што хочаце? Дробязі маюць сэнс для вельмі шматных асаблівасьцяў... Яны выкажуцца!..

— Што, яшчэ ня скончыў? — не сьцярпеў Саболік і ўзьняўся з крэсла. — Вы апавядаеце пра нейкія зайздрасьці паміж суседзямі, пра іхныя роспачы, забываючыся пра мур за намі... яны абаронцы... немцы... а ты — дурань, самы сапраўдны асталапень не без выключэньня зрабіцца валацугай з шараманкай, толькі ад таго, што ўявіў сябе разумнейшым за ўсіх... Чаму не спытаўся, не парадзіўся з мной?..

— Пра што чаломіш, скажы? — ятра спытаўся Арэмчык, падступіўшы да Саболіка.

Саболік прытліва адышоўся да дзьвярэй гасподы. Але адразу не пайшоў адтуль. Прыпыніўся. Аблічча ясьвілася будрожнасьцяй, якая, нават пакуль ён пачаў гутарку, казала несхаваную зырлівасьць пагарды да Арэмчыка.

— О-о, матухна! — памалу, злосна ўсклікнуў Саболік, усё пазіраючы на Арэмчыка, які змоўкна-прыплюшчанай нянавісьцяй уважліва пазіраў на свайго бяседніка.

— Я не памыляўся, калі падумаў: вы адурнелі ад табакі! Ваш розум закапцеўся ёй!..

Саболік адчыніў дзьверы, але з-за іх, паўпрычыненых, працягваў гутар.

— Я пра тваю асабістасьць успомню... Я напішу ўсё ў мэмуарах!.. Я не баюся цябе!

Хлопнуў моцна дзьвярыма.

— Бэбух! — гняўліва прагаманіў Арэмчык. І зноў прылёг на канапу. Аднак ахвота прылегчы і нават заснуць, мабыць, зьявілася ад слабасьці — кажнадзённыя напружнасьці, што патрабавалі развагаў над усім, што тварылася супраць яго. Ён не

выступаў, не ўрываўся ў вялікую нацыянальную будзённасьць тайніцай дзяржаўнае кумірнасьці, а зьявіўся ў віры змаганьня і жыцьця рэспублікі, як прывезены адкуль-небудзь камень, які можна кінуць у падмосьціны вуліцы, укласьці ў падваліны, або кінуць ім камусьці ўсьлед, або нават апрацаваць у хараство чэснасьці чужаком. О, ён быў чэсьнінкі! Народнае ня ўнасьцьвіла яго! Ягоны розум і здольнасьці не намагалі ўправіцца з собскім падыходам да жыцьця цэлае нацыі. Але ён дужа добра мог нагоджвацца з сваімі болесьцямі — забясьпечваньня існаваньня. Ён ведаў: у незалежным дзяржаўным геніі Арэмчык толькі клочча пены на вадзяных хвалях, толькі ўсяго пыха конюха з каралеўскае канюшні.

З свайго пакою выйшла дамаведка. Арэмчык заплюснуў вочы — яму не жадалася паказваць ёй меру будрожнага адчуваньня. Ляжаць, прыплюснуўшы вочы, у сваёй хлусьлівай цемрадзі супакайней: усе хваляваньні асудзіш і як трэба апануеш іх бяз лучнасьці з звычайнай вонкавасьцяй.

Дамаведка ціхма прайшла каля яго. Па шораху пантофляў чуў: яна пайшла да кухні. І вось у гэтым зьверхаваным пачуцьці гневу на Саболіка Арэмчыку зналусна прыхлынула часіна яскравасьці. Ён успомніў першую сустрэчу з дамаведкай пасьля сьмерці жонкі. Мінулае дрэмле безь ніякіх прыяваў наўдняў. Але аднаго дня яно адклікнецца незнарочным успамінам і ўсчоліць дастатковасьцяй уражаньня. Адны — абураюць, іншыя — вядуць у засень сунегі і міласьці; трэція — удзячуць ды спадзяваюць, як першы пошчак пешчаў — выйгрыш часу, што паможа мінуць ненаўмеранае.

Арэмчыку аб'яўлялася. Некалісьці, чакаючы ейнага завітаньня да ягонае гасподы, ён прыбраў там як ляпей і аздабней. Малую дачку прагнаў пабегаць у садовым сьцяжы. Лёг на канапу. Яму было суцешна, што нарэшце ўсё прыйшло да свайго канца і, здаецца, ужо стане думаць пра памерлую жонку. Ён чакаў новага каханьня... Цярплівая ціхасьць Арэмчыкавай кватэры напоўнілася рэхай радаснага сьмеху, і тое, што сьцераглося, тайкавалася ў парываньні цепрасьці, здарылася любай шчырасьцяй, быццам дагэтуль яно ня ведала іхнага мілага цярпеньня.

Потым уторныя спатканьні пераканалі Арэмчыка прызвычайнасьцяй: інакш няможна — пакінуў дамаведкай — захінёнай праўдзівасьцяй дзеля абаіх.

Арэмчык ня зморваўся жыцьцём! Ён бы раскусваў парожнія гарэхі жыцьця!.. Адвярнуўся да сьцяны. Па-нэронаўску паза-

баўляўся калярыста-сьвяцістымі расінкамі каштоўных самацветаў на пярсьцёнках. Паглядзеў на гадзіньнік. Да пачатку сходзінаў яшчэ каля паўтары гадзіны. І зноў заплюшчыў вочы. Сьвет усялякіх вобразаў, думак паласьніўся пад павекамі. Пачаў атаяўляць уяву парадку спатканьня зь пісьменьнікамі і паэтамі. Безумоўна, нешта найбольшае паходзіць ад іх, зь іхнае чуткае душы... Ён не дазваляе зыслабець гардліваму наўмеру, які нарадзіўся ў ім і што шэпчацца зь ім, падобай ягонага настрою.

Лёг дагары. Паглядзеў у столь. Цяперака ў галаве было паражнява, як і там, пад столяй. Неўзабаве з кухні выйшла дамаведка, яна зноў жадала ціхма абысьці паўз Арэмчыка... Яна ўздрыгнулася, сьціснула даланямі шаматлівую сукенку, прыпынілася ды прыслухалася. Ад асьцярогі не пацьвяліць супакой Арэмчыка яна не зразумела: ці ён клікнуў яе, ці мо' толькі аслухалася ёй.

— Эй, хадзі сюды! — уторыўся Арэмчык. І яна пабарзьдзіла да яго. — Што, аглухла? — дакарыў ён і ўзьняўся з канапы. — Скажы дачцэ не ўваходзіць сюды — агляджу цябе.

Дамаведка папярэдзіла дачку. Зь вялікай выразьлівасьцяй шчасьця азірнула сябе ў люстэрку, што стаяла наўпроцькі канапы.

— Бліжэй хадзі.

Яна ахамянулася. Яна добра ўсьвядомлівала Арэмчыкаву нелагоднасьць, ад якой заўсёды бывала шкодна і нечароўна ёй. Падышла блізка да яго.

— Распранусцца?

— Ня трэба — задзірай лахі! — груба сказаў Арэмчык і размашна сам падняў сукню дамаведкі.

— Трымай падол.

Ён пачаў ціскаць ейны жывот.

— Колькі месяцаў па-твойму?

— Можа пяць, можа шэсьць будзе.

— Будзе... будзе... Чаму раней не казала?

— Я даўно кажу табе пра гэта.

— Сьціхні! Дзесьці прыдбала... Прэч пайшла!.. Ты запісала, а каторай гадзіне мне трэба ісьці?

— Пра сяньняшні дзень? Не! Я нічога ня чула ад цябе...

Арэмчык ускокнуў з канапы. Бы рабіў гэта ўва сьне, а не ў сапраўднасьці, калі ад гэтага ўсяго можаш пазбавіцца гутаркі і нават на некаторую прокмець адчуваньне свайго жыцьця.

— Не казаў! Не казаў! — перадражніў Арэмчык дзікаватым голасам.

Дамаведка адразу ахамянулася.

— Цяпер я ведаю, ты сказаў.

— Дык памятай: я ёсьць, — зраўнаваўся Арэмчык.

4

Спрэчка з Саболікам не бянтэжыла Арэмчыка. Быццам нічога і ня здарылася, ён заўсёды пасьля гэткага бяздумнага заханьня зь іншымі людзьмі чуўся паўсонным. Ён зноў лёг на канапу. Паглядзеў на гадзіньнік. Да літаратурных сходзінаў заставалася гадзіна. На адоле чулася частае рыпеньне дзьвярэй, неразборлівы гоман і лязганьне судзьдзем.

Арэмчык думаў, спамінаў прырыхтаваную прамову-ўступ. Прамову выдумаў кароткую, бо ж прывітаць прычыну гэткае нагоды было нялёгка: усё ў варушэньні паўзбоч яго, ня вельмі сьцяжыла зразумеласьцю. Ён проста апыноўваўся ў інтуіцыі супраціву дзеля ўласнай абароны. Але свайго бясьсільля, як іншыя зь ім, роўныя, не адчуваў. Затое быў чутлівы да драбноткаў. Варта хоць бы невялікай няўважнасьці да яго, да ягонай пасады; адважся пасупярэчыць ягонай пляскатай мудрасьці ці доваду, ужо будзе дастаткова яму ненавідзець.

— Добра, — лежачы на канапе, як перад гэтым утаропіўшыся ў столь вачыма, сказаў ён, быццам хтосьці змусіў яго праз колькі цяжкіх ваганьняў згадзіцца з чымсьці надзвычайна важлівым...

На адоле ўжо часьцейшы гоман і хаджэньне. Смачны пах з кухні-клюбу Самапомачы сюдзіўся і да ягонай гасподы. За вокнамі, што кадзе прасьвечваліся сонцам і азеравелі небам, пачынала дзьмуць. Узьвершы руінаў у блізасьці будынку Самапомачы абцягваліся цьмянлівым адсьветам пралётнага холаду. Ад таго, што ў Арэмчыкавай кватэры было цёпла, знадворная шарахлівасьць паветра яшчэ больш сьціжыла іхную ўтульнасьць і здаровасьць. Адчувалася лагоднасьць, жывая, але нябачная, ахутвае дабратой жыцьця.

Узімку глядзець праз вакно Арэмчык не любіў. А калі прыходзілася, дык яму ўспамінаўся бацька. О, ён ніколі не забудзе бацьку! Можа, тое мінулае і зрабіла Арэмчыка жаданьнем прылучыцца да жыцьця бацькоўскай няўмольнасьцяй і ўчарэплівасьцяй.

Бацька на Палесьсі гадаваў коні для татараў і, каб выгадней іх прадаць, загнаўшы маладога каня ў вузкае стойла з дубо-

вымі пярэчынамі, торкаў яму ў бакі лясінавым кійком. Конь прыгаў, біўся ў цеснай загародзі, але вырвацца ня мог. Усьпенены і па-жывёльнаму ўцьвелены, уздымаўся на дыбкі, іржаў. Гэтак уторвалася колькі дзён, пакуль конь ад дотарку, нават далоні, ня мог спакойна стаяць, ірваўся на прывязі, прыгожа-дзікавата наравіў наўзвады, уздымаўся, разьвіваючы доўгі хвост, падгінаў дугой падстрыжаную грыву — добрым выглядаў. Маленькі Арэмчык перша палохаўся, а потым прызвычаіўся — памагаў бацьку. Дзіцячыя вочы глядзелі натрасьцяй зьдзеку. Зводдалі, дакуль мог дастаць доўгім пугаўём, торкаў каню ў паджыватніцу. Аднойчы, марознай раніцай, конь на прадажу вырваўся з рук парабкаў, бегаў па шырокім дзядзінцы, спрабаваў пераскочыць замёт, не даваўся злавіцца. Бацька злаваўся, крычэў на парабкаў, а тады не сьцярпеў, прыбег да свайго пакою, узяў паляўнічую стрэльбу, застрэліў каня. Арэмчык-дзіцё радаваўся, пазіраючы, падскокваў на падваконьніцы, выціснуў шыбіну нават. Бацька спакмеціў гэта, разьятраны, падбег да вакна і стрэліў над галавою Арэмчыка. Не задаволіўся, прыбег у хату, перапалоханага да непрытомнасьці сына падняў за валасы, шпурнуў на падлогу… Арэмчыку памятаецца — гэтага ад яго не забярэш! Яно ж мо' і прывучыла яму некаторы асабісты сэнс жыцьця.

Устаў з канапы. Дамаведку і дачку не паклікаў памагчы прыбрацца — усё зрабіў сам. Завязаў гальштук, абклаў каўнер, надзеў на правіцу яшчэ адзін каштоўны пярсьцёнак і ўпэўніўся перад люстэркам у прыгастве постаці. Ён ведаў: на сходзінах ён мусіць паказацца. Нават добра чулася, што дамаведкі і дачкі не было побач. Яму жадалася зьвярынай ціхасьці, інакш ён бы не скарыўся будрожнасьці пачуцьця задаволіцца надуманым — літаратурнымі сходзінамі.

Пайшоў на адол. Зь ім барзьдзілі прывітацца. Бы рэдкі і родны госьць у вялікай сям'і, ён апынуўся сярод знаёмых і блізкіх прыхільнікаў. На абліччах шмат у каго зь іх была своеасаблівая ўражлівасьць чэсьці і дасяжлівасьці чыноў. Але па маршчынах можна было дадумацца пра іхнае гора нат у днёх, якія яны чакалі ды жадалі скарыстаць. Блізу так выглядала, што перамена, прынесеная вайной, яшчэ аніяк не магла дапамагчы ім, аніяк ня можа дацаніцца іх. Яны верылі сваім прыхільнікам і самім сабе, быццам палохаліся, каб, пакуль жывуць, іх не мінулі, а спакмецілі. Таму Арэмчык прыплыў ці ня першым караблём наземным, каб уратаваць, падабраць іх у менскім моры руінаў. Роспач мінула. Яны адольвалі існую смуту: пэўніліся ў зьдзяйсьненьні сваіх парываньняў.

— Здрасьце! — падышла да Арэмчыка старая жанчына. Працягнула яму руку. — Ах, ізьвініце! — раптоўна склікнула яна. Зь вялікай, чорнага ворсу, муфты адваліўся ласкуцень шкуры. — Это не майму васьпітанію! — жанчына ледзь ня ўсхліпнула. Але Арэмчык і не заўважыў ейную турботу — здароваўся зь іншымі гасьцямі. Дзеля нагоды быць сярод грамадзтва не паленаваўся вычытаць наўрочны афарызм. Гэтае, узвышонае і быццам апрычонае, некаторыя пачулі ўжо ад яго. Ён казаў: «Калі ня сьмерць, ты б нічога і не зрабіў у жыцьці. Сьмерць падганяе нас!»

А старэчая жанчына не адставала. Яна радая бачыць Арэмчыка, яшчэ раз падзякаваць за запросіны, хоць ёй давялося спаткацца і быць прынятай Арэмчыкам па жаночых справах усяго аднойчы. Яна апавядала:

— Очэнь благародны, васьпітаны чалавек. Удастоіў узнаць мой адрас і запісаць дажэ…

Старэча нібы лютавала маладосьцяй. Паказаўшы дыплём, яна казала:

— Толькі з вашай міласьці мы адкроем в Мінске інстытут благародных дзевіц.

І прасіла не абы-як, што, як будучая дырэктарша, яна ўваскросіць усё ранейшае, толькі дайце ёй сродкі і памяшканьне.

— Дзякую, дзякую! — радаваўся ўдзячна Арэмчык і прасіў прабачыць яму, бо сьпяшаецца паглядзець на кухні, як там прырыхтаваны пачастункі. Ён гэтак заняўся літаратурнымі сходзінамі, што нават наказаў не варыць жытнёвую зацірку для менскіх урадоўцаў.

— Очэнь благародны чалавек! Будушчы князь Севера-Западнага краю. Такавых лічнасьцей яво вялічаству нікак не абысьці! — натхнёна выказвалася старэнькая дзяўчына, былая інстытутка, і падаравала Арэмчыку рэвэранс, быццам штосьці адважала на ручных вагах.

— Ацю, чартуха! Не адна жылачка ня трэснула, — пажартаваў Травянец, мастак і таксама не інакш дзядок-дзядком на выгляд.

— А-а, добрым часам! Рдзі цяправы ў градзі атракавіцаў! — прывітаў мастак вядомага журналіста. Яны дружылі і ведаліся перад вайной. — Мяне не запрасілі…

— Уцісьнемся, — адказаў журналіст ды, глыбей уцягнуўшы шыю ў шалік, запрапанаваў: — Хадзем. Арэмчык запрашае мяне на сходзіны. Там і даведаемся, ці есьці дасьць, а ня дасьць — не прывыкаць…

Мастак злаваўся, казаў усялякія праклённыя словы на імя Арэмчыка. Апрача ядкаваньня ды напатканай у рэвэрансе інстытуткі, мастак уціхамоўваўся шаптаць яму іншыя ятрасьці.

— Пакутаваць буду, калі пайду або выганяць адгэтуль, — нашэптваў ён. — Згаджуся на двух гарах сядзець: і на палітыцы, і на мастацтве. Я мерзну, чакаю жытнёвую паліваку — цэлатворную контарнасьць нашу, а тут… тут!.. Я цэлы год ня еў мяса — паглядзі, колькі настаўлена яго на сталох…

Мастак паціраў рукі.

— Я сам глытаю сьлінкі, — сказаў журналіст.

— Мы на скраі прысядзем, вось там, на лаўцы, каля ўваходу, як што, дык уцячы будзе лепей, — прапаноўваў мастак.

— Але — не інакш — ты ж не запрошаны, — згадзіўся журналіст, вітаючыся зь некаторымі знаёмымі і знаёмячы іх з мастаком. Мастака Травянца, хоць і вайна, ведалі. Ягоных некалькі малявідаў, нешта ў стылі беларускага арнамэнту, купіла ў камісійным магазыне фраў Сконтаўт. Завяліся грошы. А перад вайной улады не прызнавалі яго, нават пасадзілі ў турму за нацыянальнае дэкадэнцтва. Ён калісьці намаляваў адну-адзіную карціну «Гультай, справядлівасьць і магіліцы». Усё там было скамбіравана разгонам драматычнай паўтоннасьці, згубленымі сьценямі на выступнасьцях аб'екту кампазыцыі. Разумныя менскія крытыкі прарочылі яму будучыню, але ўлады арыштавалі яго. Шмат год не прыйшлося яму хадзіць свабодным на па-свойму любыя магіліцы, цешыцца «лясными хмарамі» — лясными вазёрамі. Толькі падчас вайны ён вызваліўся з турмы. Ён ізноў пасяліўся ў Менску каля Перакопскай вуліцы, у разбураным доме знайшоў невялікі кут, абглядзеў яго і абсталяваў на зімку. «Бульдогава будка» — прыклікаў ён свой затулак. Замест замка, выходзячы стуль, падвешваў маліновую стужку, зьвязаную трыма вузлакамі-лёсткамі. Зробленыя грошы за працу раздаў на вуліцы, а астатнія дараваў дзіцячаму прытулку пры менскай Самапомачы. Ён цьвярдзіў:

— Хто як ня дзеці ў вялікім горадзе распаўсюдзяць тваю славу! Трэба толькі, каб яны ведалі цябе… Фу вам! Ідзеш па вуліцы, на якой жывеш або часта ходзіш, — маленцы падрослыя і смаргатыя: «Дабрыдзень, спадар!» — і калі з бацькамі ідуць, скажуць: «Гэты дзядзька грошы дае, ён, мабыць, багаты». Бацькі не прапусьцяць даведацца, хто ёсьць, што робіш… Слава, юнакам!.. Фу на вас — вы нічым не рызыкуеце старымі быць! А перад гэтым нас, атрокаў сівенькіх, праславіце. А вашай памяці астаюцца дні мінулага расстаньня з намі — бяскон-

ца гэтак ідзе!.. Фу там! Ці не прызвычайваюся да сваёй любові: загаманіцца!.. Завітайце — пакажу недаконачаную карціну. Можа, пачастую: учора пірог хлеба зарабіў за партрэт. Ай жа, ды немка! Рубенсаў драцявень такі! Гаворыць, гаворыць, усьміхаецца нават і хлеб кладзе на падваконьніцу дзіравую, а я толькі белямэ — па-свойму дзякую ёй, кажу: прызвычайся да нашага... Фу на вас! Бывайце — затлумачуся з вамі! — заканчваў мастак і барзьдзіў ці да ядальні, ці да камісійнага магазына пагутарыць з фраў Сконтаўт, а ў міжчасе даведацца ад яе пра заказы на партрэты. Радзьва завітваў і да журналіста. Журналіст паважаў ягоную творчасьць, вельмі ахвоціў нарэшце выказаць на палатне ідэю, якую ён расказаў яму, прахаджваючыся па вуліцах зруйнаванай сталіцы. Журналіст называў сталіцу «Горад сьлёзаў». Шукаў нагоду напісаць начырк на гэтую тэму. Мастак супярэчыў яму.

— Фу ты, чарцяк! Як ты знойдзеш і скажаш у кроплях слоў такую вялікую трагедыю? Вось, прынамсі, мазкамі фарбаў можна выкласьці тысячу словаў, тысячу думак. Прыкладам, некалькі тонаў і паўтонаў у рэзкай дынамічнасьці лініяў скажуць вам пра вецер ці то ўздых зямлі, што быццам дзесьці ў царкве сьвяты «Амін!», або ў неадоленай сьмеласьці анёлаў — нашыя ўздыхі, што спадзяюцца ступіць у сьцін радасьці змаганьня. Ворагі іхныя, людзі таксама, ня ведаюць, як спаткаюць дзень наканаваньня, бо ж мы ўсе любім сьмерць ворага. Але сярод атораў змагарскіх я пакажу церпуна сваіх пакутаў, што ўжо даўно закаваўся ў спадзяваньні дахвальнасьці. Аднак — фу на яго! У кажным ягоным руху будзе няпозны дзень перамогі, ці то інакш: несьмяротны вобраз!.. Ако сьцезі — скончу маляваць, прынясу паглядзець! Пакуль што не адвона ідзе, а можа здарыцца — зб'юся... Фу, мантач я! Пра часапіс як там, скажы?.. Калі толькі немцы не дазволяць выдаваць часапіс мастацтва, я закладу патаемны, я найду грошы, з дапамогай фраў Сконтаўт прадам мае найлепшыя карціны, а калі не мае, дык перамалёвы з выдатных мастакоў нараблю — грошы таксама...

— Усё гэта, Травянец, мітусьня. Існасьць ад усякай мітусьні! Няма ў саміх — не атрымаеш ад чужых!.. Падчас вайны мастак не мастак, а куля, што забівае або заклікае забіць.

— Фу на цябе карэннага! Кожны дзень ясьвіш біблійную мудрасьць — дылетантшчыну: пажывем — пабачым! Не палкоўнік, а ведаеш: гарматы страляюць — пячы жаўнярук па сваіх і чужых да апошняга дыхту... Няхай па-твойму будзе. Бывай!

Здаралася, мастак, сказаўшы «бывай», не адразу адыходзіў ад журналіста, і журналіст находзіў цярплівасьць апраўдаць сваё: пажывём — пабачым.

— У эпоху найвышшага разьвіцьця тэхнікі, у эпоху жарсьлівых войнаў якраз найчасьцейшына вельмі ўрочвае чалавека, ці то ён харобры змагар, ці то ён трус, — казаў ён мастаку і абасноўваў: — Псыхалягічны мамэнт сьвядомасьці кароткасьці жыцьця пануе найбольш у людзкой душы. Таму ён неспакметна дае ведаць сваю моц, калі можа рынуцца ў ходаньня за дабро жыцьця.

Гаварыў журналіст і пра тое, што кожны індывідуўм ёсьць схільны да прасторнасьці і разгулу ці ў сваёй айчыне, ці назвонках яе; маўляў, наогул, чалавек — ціхая падточная крыніца: усё-ткі панаваць. Але пры сутнасьці ўсясьветнай агульнай роўнасьці народаў і іхнай незалежнасьці ахвота разбойства, прасторнасьці, разгульнасьці зьнікне — залянуецца ў нацыянальна-сацыяльным варушэньні. Кожны мусіць заняцца собскай гульнёй… — і заканчваў: — На сьвеце няма ідэальнага анічога!

— Фу, ако сьцезі твае! — быццам недаверліва, быццам ня маючы часу слухаць журналіста, упэўніваўся мастак, яшчэ раз разьвітваўся — адыходзіў.

І цяперака на сходзінах ён таксама хацеў напомніць пра часапіс, але не адважыўся: ці ж пра гэта гутарыць тут, сярод невядомых людзей, між гэтакіх сытных страваў? А ўсе стравы былі навараны па смаку самога Арэмчыка. Ён смакаваў кожную падліўку, булён і як пахнуць прыправы. Ён доўга не выходзіў з кухні: распараджаўся, спрабаваў. Быў мілы. Маладую кухарку прасіў абцерці яму запатнелае аблічча, і калі яна рабіла гэта, ён цеправа пазіраў на яе, люба шкуматаў ейны бок каля поўных дзявочых грудзей. На падносчыцаў страваў таксама бочыў позірк. Падцісквваючы вочы пад падлоб'е, пытаўся ў іх:

— Ну як, сталы красуюцца? — і адказваў сам: — Я думаю, красуюцца! А-а?

Ад занятасьці нават не заўважаў гоману гасьцей у залі, уторны грукат уваходных дзьвярэй — госьці яшчэ прыходзілі.

Арэмчык, бадай, забыўся пра свае наўмеры паслухаць паэтаў і пісьменьнікаў. Раўняў кавалкі мяса, радзіў, як лепей падчэрпваць бульбяную кашу. Кухарцы ўдавалася ёмка, ён памахваў галавой і штосьці нават ціхотна папеяваў.

Неўзабаве адна з падносчыцаў сказала:

— Семдзесят занесьлі — месца няма.

— Семдзесят? — уцешыўся Арэмчык і не мінуў кароткім стрымком пальцаў папесьціць падносчыцу па шчацэ; паглядзеў у кацёл, там заставалася яшчэ шмат кускоў мяса.

— Пара ўжо самім падкусіць, — прапанаваў ён кухарцы і незанятым падносчыцам. Адышоўся да падвальнага вакна. Запацелыя шыбы залаціліся, зрэдку за імі, на вуліцы, мільгалі ногі прахажан або праяжджалі нямецкія вайсковыя машыны. Арэмчык чакаў. Умовіўся зь літаратурным крытыкам Пацеем: пасадзіўшы гасьцей за стол, той пакліча яго.

Блізу ўсе, каго запрасілі, прыйшлі. Кожны, хто спаткаў сваіх ранейшых знаёмых ці супрацоўнікаў, прылучваўся да іх і сьцярогся трымацца гэтае групы. Зала была нацеплена. Даўгія сталы расстаўлены літарай «П», бы ў сэнсе: парадак, пашанота ды падступнасьць. На правай сьцяне ад уваходу вісеў плякат-малюнак. На ім тырчэў плуг, і мужчына, ні то селянін, расставіўшы рукі, прасіў: «Мы хочам зямлі».

Мастак Травянец доўга азіраў плякат, а тады нахіліўся да журналіста, шапнуў яму:

— Фу ты, спакменная! Скрытны подзьмух ветру, і «Хочам зямлі» ўцячэ.

Журналіст згадзіўся зь ім, але маўчаў, галавой толькі кіўнуў.

Нарэшце прыйшоў Арэмчык. Уздымам рукі прывітаўся з гасьцямі. Яны глядзелі на яго, аплядыравалі яму. Некаторым, добра знаёмым, Арэмчык памахваў галавой. Адчуваньне, што зьявілася раптоўна, яшчэ пакуль быў на кухні й чакаў кліканьня прывітаць гасьцей, завалодала ягоным сэрцам поўнасьцю. Усё, што думалася пагардна і ненавісна, усё, што некалісьці знаходзіў у іншых людзей праціўнае яму, прынімалася, спаткаўшыся ізь зьдзейсьненым надумам, сапраўднасьцяй. Яе было ня мала, а наадварот — шмат. Арэмчыку сталася сорамна перад гасьцямі. Яны гэтаксама існавалі дзеля яго, як ён для іх. Яны таксама бязь нейкай будучыні. Ён зразумеў самога сябе!.. Кім быць сярод гасьцей? Ён атупеў. Зьбянтэжаны, быццам узьнесены плёскатам далоняў, ён ішоў да свайго месца за сталом. Мімавольна зморшчыўся ад променя сонца, што зналусна, накаротка, зіхнула праз вакно ў залю.

— Пачынай. Я ня буду выступаць, — шапнуў Арэмчык крытыку Пацею і сеў у сваё крэсла. Махам галавы падзякаваў гасьцям за ветлівасьць. Воплескі аціхлі.

— Я цэлыя дні радаваўся, — загаварыў крытык, — калі прышлося пачуць просьбу зрабіць невялікі даклад пра нашую

літаратуру. Так, дарагія спадарыні й спадары, нам належыць тое, што мусіць належацца. Мы не крыўдуем, а ўцяшаемся наяўнасьцяй прагрэсіўных моваў расейскага і нямецкага народаў. У дадзеным выпадку: іхная літаратура…

Прамовай Пацея госьці захапляліся, яму аплядыравалі.

— Хоць Скарына беларускі для Ўсходняе Эўропы, тая самая эпоха італьянскага Адраджэньня, аднак, ці ёсьць карысна беларускаму народу, кажучы расейскім словам, «прекланяць» рускіх і ўкраінцаў, і іншыя славянскія нацыі перад ім, перад ягонай велікомасьцяй? Я адказваю: не. Толькі таму, спадары, што гісторыя — сьмешная рэч і вельмі неахайная ў выніках. Крывічы нарадзілі расейцаў, ірляндцы брытаў. Сыны народжаныя сталіся перад жыцьцём больш імпэтныя, чымсьці іхныя бацькі, больш занятыя зьместам дбайнасьці пра сябе. Яны забыліся, ад каго паходзяць, яны жадаюць уладарыць, панаваць. Ціхі супакой дзяржаўнай мудрасьці нараджальнікаў апынуўся ў волі воінасьці, у сіле прасторнасьці… Так, так, спадары. Я зашмат да гісторыі ўкараскаўся, пра літаратуру нашу забыўся… А між іншым, жадаю сказаць, вось тут якраз гаспадзін Злоеў ёсьць, ён ад пажару ўратаваў у Полацку старыя дакумэнты, і мы зьбіраемся разам напісаць зь іх кніжку пра Скарыну.

Пацей скончыў прамову. Яму зноў аплядыравалі.

— Фу ты, сылюэ! — брумкнуў сам сабе мастак Травянец і лёгка, дзеля прылікі, нячутна, таксама склаў воплескам далоні.

— Падымем келіхі за нашу літаратуру, — прапанаваў Арэмчык.

Салідарыст Траяконяў моцна засьмяяўся. Шмат хто ў блізасьці яго падтрымалі сьмех. Яго ведалі ў Менску. Ён хадзіў ва ўніформе гестапаўца з расейскіх карных кагортаў або ў звычайнай цывільнай вопратцы. Любіў блізу кожнага дня «паіграцца з картафлянікамі», як казаў ён. Завітваў да каго-небудзь у хату або на кватэру і, калі напаткалася сустрэць там юнака ці дзяўчыну, прасіў выйсьці зь ім, паказаць дарогу ў лес за Менск. Пасьля таго бацькі не спатыкалі свайго малога сына ці дачку жывымі, праз колькі дзён знаходзілі толькі труп з прастрэленай галавой.

— А вот в обшчастве інстытутак такое павядзеніе непрылічным будзет. Это некультурна з аднэй і другой стороны, — сказала былая інстытутка сваёй суседцы, артыстцы і каханцы япіскапа Філіцыя.

— Это прекрасны рускій задор!

Вусны артысткі, адказаўшы старэнькай інстытутцы, зрухнуліся роўным пераборам цельца вусініцы — выказалася ейная гордасьць.

— О, да! — пабарзьдзіла ўлагодзіць інстытутка. — Не іначы: наш рускій!

Яна хацела сказаць штосьці больш. Яна любіла пагутарыць… Але загаварыў Арэмчык, ён прапанаваў:

— Цяперака нас прывітае як чытач нашай прэсы і як прадстаўнік сялянства спадар Цярэм Адамчык. Прашу.

Бедны Цярэм! Заімшэлы пень ачысьцілі, выкарысталі на ім сесьці, то адно! Ён прыйшоў на запросіны, аднак пра гэты неспадзевак і пашанотнасьць ня ведаў… Аднак была нагода. Выйшаў на сярэдзіну гасьціннага пагосту. Яму аплядыравалі ня ўсе.

— Каб ведалася мне, быццам каралю сялянскаму, я мо' сваіх пашчонкаў прывёў сюды паздаровіць ды прывітаць вас вялікай шчырасьцяй нашай мужыцкай, а то якраз ня ведаў пра вашу шчырасьць, таму і ня ведаю, што набаіць вам, чым дзякаваць вам. Дзеля нагоды балазе мне ды ім трэ было ў лапцікі лычаныя абуцца і вышыванкі апрануць… Таму сам за сябе і за тое пабарджджу і падзякую ўсім вам, спасібо-дзякую!

Ён пайшоў да свайго месца. Госьці абы-як захлопалі воплескі, засьмяяліся. Артыстка, у якой заўсёды чутнасьць уражаньня азначвалася на вуснах, пагардліва пакрывіла іх. У вачох бліскотных, вадзяніста-парожніх унадзіўся прыпамін: яна дзесьці бачыла Цярэма.

— О, пёс старый! — успомніла яна, ён быў у япіскавых гасподах.

— Он і мяня смушчает!.. Вобшчэ, как в інтылігентнае обшчества кресьціян валакці. Проста ужас! — уздыхнула інстытутка і глыбей усунула рукі ў сваю чорную, зношаную муфту.

— Фу ты — аўтарытэт які! — ціха, ён меў на ўвеце Цярэма, шапнуў мастак журналісту. Неспакметна даланёй абцёр рот. Завіхна даядаў мяса.

— Ды што ім аўтарытэт?.. Уся іхная велікомасьць і дзейнасьць на зачопах і баляваньнях, — таксама нахінуўшыся над талеркай, нашэптна загаманіў журналіст. — Чужацкі аўтарытэт для іх — Бог, а свайго яны не парупяцца ўзьняць. Яны напаскудзяць яму, патурбуюцца пусьціць яго паўзьці капусным жучком…

— Фу ты — яны ж любяць цябе! — запярэчыў мастак. Чытача сялянскага паказалі табе і іншым…

— Вечнае: фу ты, фу ты — кіньма валей! Апошнія часы з табой цяжка гутарыць: усё адвона разумееш, усё цягнесься вагляваць мяне і маё…

— Праўда заўсёды — праўдзівая, — адказаў мастак і зноў затульней нахіліўся над сталом, каб выцерці настольнікам затлушчаныя мясам вусны.

— Фу ты! У прыгастве шмат прыгожага адцьвітаньня: я сваё зьеў.

Журналіст глянуў на ягоную талерку.

— Я раней за цябе.

— Фу ты, котурны дзядок! Яго варта намаляваць.

І мастак пачаў узірацца на Цярэма, дадумоўваць, якімі фарбамі ён мог расказаць трывогу і стронь душы гэтага чалавека. Мастак не памыляўся ў Цярэмавым становішчы. Ён уявіў яго бы знарочасьць расчыненых дзьвярэй, за якімі былі першыя вёсны імкненнасьці да спадзеву радасьці жыцьця, была вера і зьнявер, а цяпер ён усяго — прыпынак: час аглядзець пражытое ўчора ці даўнейшае.

На паўдарозе да свайго месца за сталом Міхась спаткаў Цярэма. Ён ня ведаў пра запросіны Цярэма на літаратурныя сходзіны. Апошнія тыдні яму не прыходзілася начаваць дома. Былі моцныя маразы і завірухі. У сірацінскім прытулку хварэлі дзеці. Некаторыя вельмі цяжка. Двое памерлі ад запаленьня лёгкіх. Міхась мусіў апекавацца імі. З помачай Аленінай ён атрымаў ад немцаў крыху мэдыкамэнтаў. Алену, як немку, ніхто не запрашаў на Арэмчыкаву гасьціннасьць, разам з сабой яе прывёў туды Міхась. Пасьля мінулай нязгоды ён зноў сустракаўся зь ёй.

Алена ціха:

— «Жыве!» — ускрыкну вам! — спаткала Цярэма Алена. — Які мілы ты! Паміж цынікаў трэба па-цынічнаму захоўвацца — я гэтак зразумела вас… Ах, мой вялікі кароль сялянскі!.. Паміж намі сядайце… Няхай яны слухаюць, мы ж пагутарым. Як даўно мы ня бачыліся. Ці здаровыя вы?

Аднак Цярэму было не да Аленіных захопнасьцяў.

— Мне, Міхась, — зьвярнуўся адразу да яго, — асталося толькі пасьмяяцца над сабой… Дурань я!

Цярэм глянуў на Алену з пэўным недаверам. А ёй здалася Цярэмава захоўнасьць нейкай блізкай і нядаўняй, якраз той самай, як некалі там, у двары, калі ён прыйшоў пагутарыць пра Міхася. Яна, уважлівая пачуцьцю радасьці ды любасьці, нахінулася і пацалавала яго. Цярэм мусіў штосьці сказаць.

— У жоўтую вопратку ўбраліся… нібы салдатам нямецкім выглядаеце.

Яна засьмяялася, патрэсла Цярэмаву руку.

— Надоечы ў пушчы лася прыстукнуў і, бадай, усяго ў Самапомач перанёс, каб дзяцей у сірацінцу карміць. Думаю: Міхась будзе радавацца… Папрасіў Арэмчыка не казаць, што мяса ад мяне… А мяска тое вось тут на стале кадзее, жыруецца. А дзецям?..

— Не было. Галадуюць, — адказаў Міхась, — перахапілі.

У Алены пырснулі сьлёзы.

Арэмчык прапанаваў паслухаць прозу пісьменьніцы Вольгі Стаполі. Пісьменьніца пачала чытаць пафасна, з даўгімі паўзамі, расьцягнутым выгаварам словаў.

— Ахтунг! — скрыкнуў Арэмчык, і госьці ўскалынуліся. У залю ўваходзіў Саболік. Зьняўшы шапку, ён вітаў ейным узмахам гасьцей. Лунявы чэрап ласьніўся. Скрайкі валасоў каля лысіны былі нагладка збрытыя. Апошнія месяцы ён больш апратвіўся і растаўсьцеў. Невялікі жывот, але выпуклы, выторкваўся наўперад, навісаў над нагамі. На ягоным твары заўсёды находзілася наўмысная сьцень суровасьці чалавека, што ведаў сваю вартасьць, якой ён ніколі ня здраджваў — разумеў ейную патрэбнасьць. — «Я ёсьць і я паважаю сябе!»

— Вельмі ўдзячны!.. Павер, я забыўся пра нашу спрэчку, — неспакметна ўсім сказаў Арэмчык.

— А сам прамаўляў? — спытаўся нецярпліва Саболік і расшпіліў паліто, сеў у крэсла каля Арэмчыка.

— Не. Навошта?

— Як навошта? Ты ж паклікаў іх, значыць: ты пан іх!

— Мне сорамна сталася ад маіх собскіх дзеяў. Усе госьці знаёмыя — што ад іх пачуеш?

— Ты мусіў у прамове папярэдзіць іх: Беларусь была і астанецца правінцыяй... Ды што казаць? Дзівак нарадзіўся — дзіваком і памрэ! Прапануй тады, няхай заплоцяць за стравы.

— Даруй. — Арэмчык успомніў: — Спадарыня Стаполя, чытайце далей.

Пісьменьніца ветліва аставалася на сваім месцы і чакала, пакуль ёй скажуць працягваць чытаньне.

«Мілы мой, далёкі мой, дзе ты? Над сталіцай нашай гудуць варожыя самалёты...»

Арэмчык прыпыніў яе.

— Шаноўныя госьці, прашу выпіваць, закусваць, прынясуць больш, прасеце падносчыкаў. А потым, у імя дарагога госьця, нашага дзеяча спадара Саболіка, прашу перастаць курыць...

— ...навошта смуродзіць? Ня стойла тут! — падтрымаў Саболік і ўстаў, парукаўся з Арэмчыкам. А тады селі бліжэй, бы прыслухоўваючыся голасу пісьменьніцы, ціха загутарылі.

Мастак зноў уцешыўся.

— Фу ты — калыханая! Паядзім, братка Травянец, на дваіх закажу.

І ён паманіў падносчыцу.

— Дзьве падвойныя — калі ласка.

Падносчыца не згадзілася зь ім:

— Адну падвойную магу.

— І то добра — нясеце. Дзякую!

А пісьменьніца чытала. Яна скардзілася на пакрыўдаваную дасяжнасьць жанчыны.

«Куды, пад чые крылы ратунку і пешчы затулюся? Мілы мой, далёкі мой! Я ў нацельнай кашулі выбягаю з дому. Над мной сьветлы вінаград фосфарных лямпаў. Бягу ў зямлянку на нашым двары. Тут вогка. Хлапчукі з нашага дому, гуляючы днём, днём сонечным і спакойным, днём далёкім, далёкім ад фронту, набрудзілі тут. Але люба мне. Некалісьці мой будучы сынок будзе гэткім... А цябе няма. Гарматы страляюць, выбухаюць бомбы, а мне здаецца, ты бяжыш схавацца побач мяне. О, мой незабытны! Колькі радасьці ты даў мне! Вярніся. Я напагатове ў цялегу запрагчыся, салямонавай кабылай быць, каб везьці цябе да дому нашага. Я калісьці ад шчасьця, падараванага табой, ледзь не памерла. Я хачу памерці... Мілы, вярніся! Няма. Гарматы страляюць і грымотна бухаюць бомбы. Над уваходам сховішча азарыта. Гэта пажарыць наш дом... Дзе ты, любы, незабытны! Якая зара ў сэрцы тваім? Я не адмоўлюся ад сховішча — яно спадак мой. Я мрою ўпрыгожыць яго. Засьцялю краскамі — будзе водар лесу і ніў побач нас... Дзе ты? Няма супакойнасьці жарсьці маёй! Што сказаць мне? А ведаю: усё-ткі ты недалёка ад мяне... Памятаеш — як ня сорам табе? Ласкатаў маё цела сваімі сунежнымі, распалёнымі далонямі. Яны часьлінкі тваіго сэрца — вырваліся спаткацца з постацяй маёй. А тады прывёў у свой студэнцкі барак і сказаў: — Спрагу нашу вадой праганяем, калі п’ем з пажарнае бочкі, што ў канцы калідору стаіць.

— Без кружкі? — спыталася я

— Але. Калі шчыра кахаеш — нагніся, папі, — адказаў ты.

І я піла. Твой жарт быў мне каханьнем... У вашым бараку таксама брыдкія хлапчукі жылі: мышэй у той бочцы тапілі. Я піла той бруд. Гэта мая кляцьба была: кахаю цябе! Утольвала

спрагу ад тваёй жарснасьці. Мне асалодна ўспомніць смак вады тэй!.. Вярніся... Няма!»

— Фу ты, беспасажная! — падумаў мастак, памалу жуючы ласінае мяса, падбіраючы кожную крошку хлеба. Ён адшукваў іх на стале, скачваў кулькай, клаў у рот. Яго нават зьдзіўляла, што ня ўсе ядуць, што недаедзенае забяруць ды аднясуць да кухні.

— Фу на вас — аднаклеткавыя! Ужо нажараваліся пад пуп, — шапнуў сам сабе чутна мастак.

Пісьменьніца кончыла. Ёй доўга апляпдыравалі. Шмат хто з гасьцей яе ведаў. Ведалі пра ейнае няшчаснае каханьне да маладога паэты, што любіў пісаць баёвыя маршы. Але нядаўна ён зусім перамяніўся — пайшоў у лес, у партызаны. А старая сяброўка, былая інстытутка, пазлавалася. Ёй дагадвалася: ці не пра яго чыталася?

— Ву нашай васкрэшшай імпэрыі такавога сапляка ня нужна імець. Ведзь он проціў нас. Ведзь он нацыяналь!

І яна, хоць упершыню, сустрэлася зь япіскапавай каханкай, сказала ёй:

— Но пісацельніца нічаво. Что падзелаеш? Я точна, как она, кагда-то была влюблена в аднаго кадета. Паршівы мальчышка был... А па сікрэту вам: пісацельніца сейчас немца любіць. Прэкрасны человек. Фольксдойч з Пазнані. І между прочім ана тоже немецкаго проісхожденія, о чем і мэтрыку імеіць.

— Это хорошо. Но почему она пішет по-беларускі? — спыталася артыстка.

— Вы хатіте сказаць: пачему не па-рускі? Тада вы правы — нехарашо!.. Но ана здесь раділася, патому і знает беларускій...

— Да. Но-о это непріятно!

Інстытутка сказала, што нічога ня зробіш: прыроджанае, роднае цяжка перамяніць, але яна апавядала артыстцы: ёсьціка ў Стаполі надзея ня ведаць беларускую мову. Хутка будзе гутарыць і пісаць толькі па-нямецку, ведзь будучы муж-немец у сваім часе таксама цікавіўся журналістыкай і пісаў кароткія апавяданьні для дзяцей. Ён вельмі заботны і спачувальны чалавек — пасьля вайны зьбіраецца пабудаваць у Кёнігсбэргу мадэрную друкарню дзеля патрэб Ост-Эўропы.

— Тада выходзіт — она лоўкая женшчына?

— Окола этага... Ды ведзь эта очэнь проста!

— Пусьць крутіць мужчінамі — я за яё!

— Вы прекрасная женшчіна! Будем знакомые. Восьпітаніца імператарскаго ліцэю благародных дзевіц, Праскоўя Сьміглoвіч, з Мінску.

— Я належна: Алачка, артыстка із этава беларускага театра.

— Цеперічы я пазнаю вас! Голас ваш пазнаю... Прасьціце за нескромнасьць: ведзь вас яво преасьвешченство япіскоп Філіцій уважает?

Артыстка адразу адказала:

— Это не ваше дело!

— Я согласна... Ізо располажітельносьці к вам спрасіла об этом.

— Это вас не касается! — злосна адказала артыстка і адвярнулася ад інстытуткі.

Да гасьцей зьвярнуўся Арэмчык.

— Як шчасьліва было паслухаць нам твор спадарыні Стапюлі... а цяпер, калі ласка, крыху адпачнем — аб'яўляю перапынак на некалькі часінаў.

Госьці адыходзіліся ад сталоў. У кожнай грамадцы загаманілі. Траяконяў, нягледзячы на Арэмчыкаву просьбу не курыць у гонар Саболіка, закурыў нямецкую цыгару. Ён разумеў, што робіць гэта наршні. Арэмчык астаўся сядзець, часта гладзячы пясьцей валасы, гутарыў з Саболікам, які нешта шчыра даводзіў ды тлумачыў яму. І ён не супярэчыў Саболіку. Душа цярпела раўнаважнасьць, хоць можна было ўспалымнець незадавольнасьцяй і сваркай. Саболік гаварыў яму голасам, бы з дубовага дупла воркут лясных удотаў.

— Усе яны — нішто... Пажыві, загруней грошыкамі залатымі і ўступі месца мне.

— Добра, я згодзен, але пачакай, пакуль я папярэджу цябе.

Саболік настарожыўся.

— А як доўга — пачакай?.. Аднак, Божа мой, каб мы ды не згадзіліся.

Арэмчык зірнуў на шырыню залі — ледзь перамог сваю зьдзеклівую задавольнасьць: яму хацелася засьмяяцца. Ад Саболікавай шчырасьці ў ягоным сэрцы завясёліла.

— Словаў сваіх не цураюся, — паабяцаў Арэмчык.

— Старая апасьцень ідзе... скажы ёй: не турбуй, — папярэдзіў Саболік.

Да іх падышла інстытутка. Зь ёй прывіталіся, і Арэмчык папярэдзіў яе, як прасіў Саболік.

— Мы вельмі занятыя — заўтра ўбачымся.

Яна адышлася. Прылучылася да іншых гасьцей: трох маладзёнаў, яны, бадай разам, працягнулі ёй далоні, абступілі яе, скрытна падмігваліся міжсобку. Двое нават пачалі падтрымоўваць яе пад локці, бы кволую, старую вазу.

Саболік парадзіў Арэмчыку зусім іншае.

— Па-мойму, твая чэшка ці ня водзіцца з чэхамі ў войску Тод... Гані яе!

— Няпраўда!.. Я ажанюся зь ёй — прывык, роднай ужо сталася...

Саболік недалікатна захіхкаў.

— ...і дурань жа — ты! З кім надумаў жаніцца... Навошта табе жонка?

— Балазе, тваім парадам, я можа ляпей падумаю.

— А як жа? Падумай і разваж на кажным пальцы...

Арэмчык зносіў яго:

— Ня варта гаварыць пра гэта. Жанчына — ня так сабе занятак, а палова майго жыцьця.

Адказваючы на Саболікаву гутарку, Арэмчык у міжчасе думаў пра гады, што пражыў калісьці, і пра дні, што напаткаў вайною ў Менску. Яны былі нядробязнымі прыгодамі. Усялякая абыдзённасьць ня кожнага кідае захопнасьцяй парывацца за ёй сьлепавока. Ёсьць часіны, калі ў жыцьці трэба выбраць нешта сярэдняе, каб потым ня быць чужаком свайму цяперашняму дый мінуламу. Ганяцца, як паляўнічая сабака, з аднаго гушчара ў другі за жыцьцёвым існаваньнем, могуць толькі людзі, што нарадзіліся прадчасна прад якой-небудзь новай эпохай, або звычайна аб'явіліся, бы павелічэньня колькасьці насельніцтва ў якой-небудзь мясцовасьці... Гэтыя развагі Арэмчыку зьявіліся яшчэ там, калі памагаў кухарцы на кухні. Яму сталася прыемна быць і слухаць людзей. «Чорт вас рэж — абы я ня горшым жыў!» — мільгнула яму сапраўдна і пэўна. Ён заспрагнуў жыцьцёвай радасьці, што роўная зь людзьмі, роўная ў большасьці іх, большасьць, якая можа здабываць і тварыць сваю гісторыю.

— Шкада — хутка скончым, — сказаў ён Саболіку. — Яшчэ паэт Зноцік і ўсё. Пісьменьнік Цяглавец не прыйшоў.

— Гэта той, што носам чмыхае?

— Можа і ён. Высокі такі.

— А-а, сьціхні пра яго — ведаю. Біржа працы прыслала яго да мяне сакратаром працаваць... праз тыдзень я выгнаў яго. Ён жа нацыяналіст.

— ...здаецца: ён пакінуў вас, а не прагналі.

— Не пад'яжджай — забудзьцеся на яго... Я пакажу яму...

— Хай будзе добра — навошта шкодзіць чалавеку?

— Ты нешта зьмяніўся... ня ўгонісься за тваімі настроямі: сяньня — хай будзе добра; заўтра — лупі яго, а празь месяц: жанюся з дамаведкай, хі-хі — зь дзеўкай жэніцца!

— Не дапікай мяне... Я вярнуся зараз. Вось той дзядуля разьвітваецца, хачу падзякаваць яму за мяса...

— Сядзі! — і Саболік стрымаў Арэмчыка, не пусьціў адысьціся. — Не рабі пасьмеху зь сябе. Ён жа госьць, а ня ты... Лепш прапануй выбраць спадарыню Стаполю каралеўнай Прыемнасьцяў — будзе вясёла.

Арэмчык пагадзіўся зь ім. Ён аддаваўся нахлыні сваёй незнаёмай перамены. Саболіку не пярэчыў. Несьвядомая раўнадушнасьць да самаго сябе ахоплівала і валодала ім. Ён, можа, па-іншаму пержыў той дзень, калі аставаўся адзінотным у гасподзе ляжаць на канапе і разглядаць зіхценьне самацветаў на пярсьцёнках, а захацеўшы пешчаў дамаведкі, быў бы сам любы ды прывабны.

На ім лягла пярэсьціна — сутнасьць ягоных дзён!

— Шаноўныя госьці, — зьвярнуўся Арэмчык, — я прапаную вам ведаць насяньня спадарычню Стаполю каралеўнай Прыемнасьці. Вітайце яе-е!

— Ура! — скрыкнуў салідарыст Траяконяў.

Госьці апладыравалі захоплена. Саболік сьмяяўся. На ягоным увеце быў Арэмчык...

Цярэм пакінуў залю — «Ноеў каўчэг», як ужо назваў ён, Міхасю і Алене, літаратурныя сходзіны. Ён выйшаў уцьвелены. Яго гняціла ўсё: і паступак Арэмчыкаў зь ягоным падарункам мяса для сірацінскага прытулку, і Аленіны сьлёзы, якія толькі сьлёзы. Жанчына ўздрыгвае хрысьціянствам! І руіны, што каля іх ішоў да сваёй хаты, і званіцы на пляцы Волі. У душы было панура ды неразборліва. Але найбольш злаваўся на сваю старасьць. Гэтая пакутная думка, неперараможаная існасьць, адолела Цярэма зусім. Аставалася, бадай, адно-адзінае: мо' ці не «хрысьціяніць», як і тая Алена? А ўсё іншае, большае, чымсьці ягоная старасьць, — жыцьцё народу — зробяць без старэчаў. Яго хвалявала, што заўтра або праз год ён памрэ. Ён ненавідзеў сьмерць, яна нічога яму ня скажа, ад яе нічога не даведаесься. Яму ўспомніўся забіты лётчык. Калі б ты быў жывым, я, ведаеш, папытаўся б у цябе, як мусіла выглядаць па-твойму зьмененае на новы лад: — Я прыйду мо' помсным, мо' няпомсным? — Ты цярпеў сваю праўду і справядлівасьць: — Зуб за зуб, — але ты гнявіўся дзеля таго, каб астатнія, з табой роўныя, адмовіліся жыць пакутамі, ці толькі, каб усчоліліся духам жыцьцёвае моцы?

Цярэм памеркаваў свае пытаньні і адказы лётчыку:

Цярэм: Убогія духам — гінуць.

Лётчык: Пра ўбогіх не гавораць — ім даюць.

Цярэм: Бо ж убогія любяць, каб ім давалі, а не гаварылі пра іх.

Лётчык: Калі ласка — убож іх убожынай.

Цярэм: Але. Інакш яны б ня ведалі, што ўбогамі ёсьць.

Лётчык: Ты і сам — убогі з убогіх. Вышэйшага за існціну чалавека няма.

Цярэм: Бо, прылучыўшыся да вас, хадзіў у вашай кагорце. Ды я адыдуся ад вас, буду ўбожыць самотна, і тады я пабагацею — стануся табой, якім ты абазваўся: помсным, суровым.

Гаратлівая парыўнасьць старога Цярэма думаць усяляк пра жыцьцёвыя далягліваcьці рабіла яго нашмат дзён нестарым. Думкі знаходзіліся! Ніколі недараванае — злачынства за злачынства; і ціхамірная няправеднасьць справядлівасьці; спагадныя — паколькі і самі былі неспагаднікамі перад неспагаднікамі.

Жыцьцёвая болесьць адчуваецца асабліва, калі прыйшоў да жыцьця з імём цяпершчыны, з імём старой, вялікай мінуўшчыны ад прашчураў. Цярэм быццам выпрошваў у свайго цела і душы помачы: пакінуць ягонае жыцьцё надоўга; даць яму моц і волю прыгнеціць або зьнішчыць тое, што яму ня люба. У летуценьнях узносілася патрэба падзяліць сьвет пакутаў спосабамі ратунку. А гэта не даецца яму: дадзенае, як нейкая непатрэбная патаемнасьць... Вышэйшы за душу інтэлект!

Праходзячы каля Вайсковых магіліцаў, Цярэм наўмераў схадзіць да капліцы, скуль некалькі дзён даўчасу, будучы зь япіскапам, пачуў слабы людзкі скрык, неўторны, але распачлівы. Ён адразу не пайшоў туды, абапёрся на чыгуначную агароджу над самым стрымністым скрайку магіліцаў. З усьцяжу спаленага наўзгародзьдзя Менску дзьмуў зімовы віхравей, уздымаў сьнежныя пылінкі. Мэталёвы замёт скалынаўся даўгім гудзеньнем ды шаранеў замалёвай завірухі. Вадрыла акіянам сьцюжы.

Капліца была паўпрычыненай. Праз парог, у сярэдзіну, убягаў вузкім клінам сувей сьнегу. Ад подзьмуху дзьверы ледзьледзь адчыняліся і зачыняліся, пырскалі на знадворак сьняжынамі. Дрэвы надрывіста шумелі. Цярэм турхнуў дзьверы наўшыркі, увайшоў у капліцу... Ён зараз жа выйшаў адтуль.

— Зуб за зуб! — бясьсьведамка прагаманілі ягоныя вусны. Сэрца зашчыміла. У галаве апынуўся зыркі, застылы від, нібы нарошні ўкладзены туды яўнасьцяй расчуленай будрожнасьці. Цярэм пайшоў ад капліцы наўскразкі засьнежаных крыжоў і

магілаў... Аднак, апынуўшыся на прасьцягох спаленага наўгародзьдзя, апамятаўся. Яму вярнулася болесьць, якая кожны дзень была вядомая.

Цярэм заплакаў сьлязьмі пакутніка... У Беларусі распачынаўся тэрор. Захопніцкая грэблівасьць пераходзіла ў адступеннасьць свае справядлівасьці ў забойствах. Калі ня справісься з усім народам, пачынай нішчыць яго паадзінотна. У капліцы Цярэм напаткаў скрэплы лядзінкамі крыві, набрунялы ад марозу труп жанчыны. Нямецкі багнэт, увагнаны ў грудзі аж па самы дзяржак, тырчэў над целам забітай. Цярэм дадумоўваўся: яе, мабыць, замардавалі тады, калі ён спрачаўся зь япіскапам каля магіліцаў, яны ж абое пачулі ейны апошні скрык...

А ў залі Самапомачы перапынак на некалькі часінаў зацягнуўся. Госьці вялі бяседы. У грамадцы старой інстытуткі казалі:

— Лучшым женшчынам — салют!

Сама ж інстытутка апавядала:

— Всё перамянілася ў маім жаночым пачуўстві, кагда на 14-м гаду ўзросту даведалася, навошта жэнюцца, навошта патыкаюцца мужчыны з жанчынамі...

— Да здраўствует женская страсьць! — дасьведна, з шырокімі ноздрамі, ап'янелы і пародзісты жарабок сярод свайго статку, гарластым гутарам прапанаваў салідарыст Траяконяў.

На сходзінах быў і палкоўнік Сконтаўт. Яму надакучыла адклікацца на «пане палкоўніку», а наровіў і прывучаў знаёмых да новага:

— Калі ласка, гэр обэрст — я ж фольксдойч, панове!

Як адшуканага немца, хоць зь беларускай крывёю, нямецкі вайсковы ўчастак паклікаў яго на службу, аднак зноў з Аленінай помачай яго прылічылі няздольным да службы ў дзейнай арміі, прылічылі старшым ганцом у мясцовай камэндатуры. Яго крыху абдолілі ў афіцэрскай ступені: з палкоўніка асадзілі ў звычайныя лейтэнанты. Але ён не шманаў. Чаму ня быць палкоўніку лейтэнантам?

— Як падабаецца табе новы генэрал? — спыталася Алена ў Адамчыка, зірнуўшы на Сконтаўта, ён якраз праходжаваўся па залі з Ганяй, трымаючы руку наўперадзе, за падпругай дзягі, часам, заварочваючыся, здрыгваў правай нагой, быццам у ёй была ўстаўлена спруга. Гэта, мабыць, давала яму ўласную чуткасьць параднасьці на вачох іншых, што напэўна пазіралі на яго і на прыгожую Ганю... Апошнія тыдні ён надумаўся напісаць

новы вайсковы статут для беларускіх вайскавікоў. Ён спытаўся ў Гані:

— Як думаеш, сардэчная, патрэбна беларусам у маршы сьпяваць ці не?

— А як жа? Мусяць! Я так люблю, калі салдаты сьпяваюць, здаецца: сама грукаю цяжкімі абцасамі і звахам рук выпушчаю песьню з глыбіні грудзей...

— А-а-а — хадуром хадзіла б! — пакваліўся Сконтаўт і нахмурыўся: — Я не Алена табе, я ўмею думаць...

— Я ведаю, Барысочак, ты ўмееш думаць.

Ганю не пакідала каханьне да Сконтаўта. Яна была цярплівая і нават рупная да ўсялякіх ягоных надумаў і выказваньняў.

— А я напішу ў статуце: беларусам у маршы не сьпяваць, бо ж, — Сконтаўт ажно ступіў Гані наўперад, — немцы ня будуць разумець, пра што яны сьпяваюць.

— Праўда, Барысачок, — ня будуць.

Але, падумаўшы, парадзіла:

— А ты прыдумай: адно слова беларускае, а другое нямецкае, а трэцяе рускае — будзе ўсім зразумела... — і больш дасьціпней: — Няўжо немцы і застануцца ў Беларусі?

— Ах, Ганя! — Сконтаўт разьвёў рукамі. — З табой цяжка гутарыць. Ты як тая Алена робісься: добра — ня добра, будуць — ня будуць. А я напішу: беларусам не сьпява-а-ць!

— Ня злуйся, любы! Я ж ведаю: ты дадумаесься.

— Гонарам афіцэрскім цьвярджу: я надумаўся ўжо!

Сконтаўт зноў памалу закрочыў па залі, Ганя без жаночай хітрасьці, без аніякай трывогі, так сабе, даведалася, спытаўшыся ў яго.

— Барысочак, навошта патрабаваў ад доктара і падбухтораваў мяне парадзіць ім, каб табой у бальніцы апекаваліся прыгожыя сёстры? Ты ж немец, ты ж мог у нямецкі шпіталь легчы?

— З скуламі ў нямецкі шпіталь лажыцца? Яны скажуць: у нас раненым франтавікам месца няма.

— Хаця праўда, — Ганя задаволілася Сконтавым адказам, але ён растлумачыў ёй, чаму гэтак хацеў захоўвацца ў шпіталі, як звычайны чалавек.

— Па-першае: я афіцэр высокага ачалу, а па-другое, мне смутна было б. Ты ж не магла ўвесь час быць каля мяне, а хвораму прыгожае ёсьць найлепшы лек. Прыгожае — лечыць!

— Я ня ведала пра гэта. Я шмат ад цябе навучылася.

А тады, праходзячы паўзь пісьменьніцы Стаполі, ён шапотна павучыў Ганю:

— На такіх сходзінах будзь арыстакратычная... падыдзі да пісьменьніцы і скажы: спадарыня, вы большыя чымсьці Багдановіч або Янка Купала... Сям'я Сконтавых шчыра вам дзякуе за прынесеную прыемнасьць на сяньняшні дзень.

Пісьменьніца Стаполя ня ведала сям'ю Сконтавых, але павералася, што яна ведае іх даўно. Яна, жанчына з ужо апанаваным становішчам сярод грамадзтва, не магла ня ўцешыцца пашанотай да яе ад незнаёмых Сконтаўтаў. Яна прытка агледзела прыгожую Ганю, якая сьціпла, зьбіваючыся, пахваліла яе, прынесла павінную таленту пісьменьніцы. Стаполю прывітаньне зачаравала. Ад яшчэ аднэй лішняй радасьці яна ў поўнай сэнтымэнтальнай бянтэжнасьці абняла Ганю і пацалавала яе.

— Я радая, што вы любіце мяне!

Сконтаўт, не падыходзячы, укланіўся ёй і з тэй самай папярэдняй важнасьцяй афіцэра высокага ачалу ўзяў пад руку Ганю, зноў пайшоў хадзіць па залі.

За сталом, недалёка ўваходных дзьвярэй, яны спаткалі мастака Травянца. Прывіталіся зь ім. Ганя прысела каля яго, ёй адчулася вальней у блізіні з мастаком. Яе не прынуквала паводзіцца зь ім «арыстакратычна», «культурна».

— Фу, люцыпары! А партрэт ваш ніяк не намалюю — сьцюдзёна ў маёй будцы, фарбы замярзаюць.

Падабраў каля Ганінага локця крошкі хлеба і з-пад кідка кінуў іх у рот.

— Матэрыя з дробных атамаў — скарыстаем іх...

— А вы прыходзьце маляваць у магазын сястры, — парадзіла Ганя.

— Фу ты — няскрытная! Няблага было б. Мяне кажны мог бачыць там — заробак пабольшаўся.

Балазе што Ганя знаходзілася не адна каля мастака, Сконтаўт нагнуўся да яе, шапотна пазлаваўся.

— Прэч ад яго — ён жа брудны.

І Ганя адышлася, усьміхнулася, дурона турзанула Травянца за вуха. Ён злавіў ейную далонь — пацалаваў. Ганя міласьцівіла яму. — Бы бацька мой, — сказала яна.

— Фу ты, праява маладая! — хацеў сказаць журналісту, але той перасеў на наступнае крэсла, гутарыў з жонкай паэта Зноціка.

Аднойчы ў даўчасе, перад літаратурнымі сходзінамі, у беларускай газэце быў надрукаваны ўсяго ў палове зьместу таленавіты артыкул пра імажынізм і сымбалізм. Рэшту артыкулу

смаўжлівы палячок Сківаца з генэральнага камісарыяту ў Вайструтэніан забараніў друкаваць. — Цяпер пра вайну пішуць, а не пра сымбалізмы, — наўвеціў ён рэдакцыі. І Травянец бы дамагаўся да яго:

— Фу, братка, як сказаць інакш?.. Добра, што да пагоншчыны не дапісаўся... Усюды дзьверы... усюды ўваходы ёсьць, нават у самай моцнай цытадэлі. Ламіся да іх!

Аднак журналіст любіў лавіць падазронасьці ці то сапраўдныя, ці то і бязь іх. Ён падумаў: «Куды вернеш, старэча?»

Мастак бы дагадаўся ягоную турботу, сказаў:

— Усё нова ў артыкуле, усё неспадзеўна і для літаратуравედаў... Вось паглядзі, — мастак выняў з-пад зналіцы свайго паліто паўаркушовік-газэту. — Незалежнікі хваляць мяне, а як доўга, ня ведаюць.

Журналіст не паглядзеў у газэту, ён або ведаў рэцэнзію ў падпольнай газэце, або, можа, палохаўся, каб хто ня ўбачыў забароненую газэту, а зь ёй «языкавеня», забулдыгу-мастака.

— Схавай, — парупіў ён, усьміхаючыся парожнім сьмехам. — Ня ўсё на руку ідзе...

— Фу ты, лотра! Птушкі кладуць гнёзды на галінах і на адоле!

— Валей асьцеражней, спадар Травянец.

— Праўда. Праўда ўсюды працэдзіцца!.. Беларусь як кірмаш — пагандлюй.

Зноў засунуў патаемную газэту пад зналіцу. Закурыў люльку, пайшоў ад журналіста. Спаткаўшыся калісьці, яны гутарылі пра ўсё: пра апошнія навіны ў Менску, пра палітыку, пра мастацтва і заўсёды разыходзіліся адзін другім незадаволеныя, і да наступных, бы не назначаных, спатканьняў рыхтаваліся сустрэцца зноў. Пасьля гутаркі мастак знаходзіў што-небудзь у гутарках журналіста спрэчнае або прадзірлівае, а журналіст — у мастака. Яны былі занятыя самі сабой.

У забароненым артыкуле журналіст пісаў порстка, даводзіў значэньне першых пайсткоў імажынізму і сымбалізму.

«Эўропа, не спакмечваючы духовай кражы з Азіі, — пісаў ён, — рынулася ў акультаваную, па-эўрапейску стылізаваную эпоху сымбалізму і імажынізму. Перанесла тысячагадовую азіяцкую сымболіку ў эўрапейскую ўрбаністыку ці сацыяліку. Падбіла ёй па-азіяцку хрысьціянства і падправіла дэмакратыю, але перахапіла меру: адчулася адсутнасьць або нестваронасьць у гэтым похапку сымболікай ды вобразнасьцяй веры ў тое, што стварылася і што магло тварыцца неадабранай часткай жыцьця».

Далей журналіст успомніў захопнасьць сымбалістыкай на Беларусі.

«У беларускім мастацтве сымболіка вельмі адбілася ў паэзіі. Паэт У. Жылка заклікаў каханую быць дасьмяротна прыгожай перад Ім, Хрыстосам, каб у чымсьці жыцьцёва цяжкім, у непрыгожым хай, адчуваць ды тварыць добрае дзеля твайго прыгаства. А найвялікі Пушча, як паэт і найбольшы адзінотнік на Беларусі, казаў у адзіноцтве, што пачуцьцё радасьці жыцьця — палітыка. Яно — бы сьведамасьць жыцьця».

І зноў пачалося чытаньне. Рабілася незразумела: ці паэта рэалісты чыстае рэальнасьці, ці сымбалісты, імпрэсіяністы ці імажыністы. Зноцікам журналіст захапляўся, велікоміў яго і пры кажнай нагодзе, дзе ён быў або прыходзілася спрычыніцца ўрачыстасьцяй, даваў дэклямаваць Зноцікавы вершы. Ён піхаў іх людзям сілком, быццам дзяржаўны падатак. Часам ён і сам дэклямаваў зь яго:

> Пад дзіравымі стрэхамі хатаў, как всегда,
> дзіравыя ветразі
> праменьняў сонечных.
> А я ў подзьмуху сьвігавіцаў сутоню... і г.д.

Журналіст наўцемна параўноўваў Зноцікавы вершы з лепшымі здабыткамі ўзьбецкай літаратуры. Калісьці яны пісалі:

> Як востры нож — ручай
> уперся ў раку...

«Дзесьці там, у Азіі, зьявілася, а цяперака праз колькі соткі год адбілася па-новаму, па-эўрапейску, у нашага Зноціка», — цьвярдзіў журналіст.

Але Зноцікава сужэнка, якая таксама лічыла сябе прычаснай да літаратуры — дэклямавала нямецкія вершы, крыўдзілася на журналіста. Яна спыталася ў яго, бы ў чалавека, што падмануўшы яе, ахінуўся шчырасьцяй сумленьня:

— Навошта пісалі: «у нашага Зноціка», а чаму было не напісаць: «у нашага вялікага, народнага паэта спадара Зноціка»?.. Вы ня ведаеце, як ён пакутуе! Ня шчасьціць яму ў жыцьці. Себра-Сумач, ягоны сябра, праслаўлены, а муж мой біўся тут, як сонца празь сьцяну, і нічога ня выйшла. Прыехаў сюды, вывучыў беларускую мову, хоць усё беларускае для нас толькі спорт, звычайны спорт, аднак вы ж, беларусы, мусіце астацца ўдзячныя за нашыя пачуцьці да вас... А зь ім у Беларусі захоўваюцца гэтак, як у Маскве; ня хочаце ўцеміць, што я і ён вельмі зразу-

мелі значэньне рытму і рыфмы. Ня кожнаму дастаюцца гэтакія здольнасьці. Паэту Зноціку ў народныя паэты пара!.. Ах, як мне шкада яго! Ён сужэнец мне, значыць: мы разам за існаваньне б'емся! Зразумейце!

Журналіст адказаў заўсёдным прызвычаем адказваць.

— Згодзен і ня згодзен з вамі, бо на сьвеце нічога няма ідэальнага... але ж прычым я тут? Мы ж акупаваныя. У нас цяпер няма Акадэміі навук, няма ўраду. Я зьдзіўляюся, чаму не ўдалося яму стацца народным? Я памятаю, якія добрыя вершы ён пісаў:

Таварыш Берыя,
Ты, як сонца на поўначы далёкай,
дзень і ноч гарыш,
і паліш з нашае душы злачынствы!..

Прыгожа, вобразна і, галоўна, чуецца спрадвечнасьць дагэтуль нязлоўленай прыгажосьці.

— Прызнацца вам, каб не вайна, мой мужычок быў бы народны паэта... Ах, як не ахвота пачынаць усё нанова! А ўжо хочацца жыць, нічога не рабіць — на курортах бываць толькі... Ну, скажэце: мае жаданьні благія ці добрыя?

— А ніяк! — сумленна пагадзіўся журналіст. — Толькі д о б р ы я!

Ейная кампанія была люба яму, хоць у глыбіні душы тайкавала ўцешнасьць чалавека, што ведаў сваю вартасьць — без якога шмат хто ня можа абысьціся.

Жонка Зноціка села на стол. Яна загаварыла пра іншае.

— Заўтра прынясу вам пераклад расейскага апавяданьня. Якое цікавае яно! Б'е поўным рамантызмам ад першага да апошняга сказа!

Яна ўсьміхнулася і ціха запяяла беларускую марсэльезу. Журналіст пачаў прытопваць нагой у злад напеву, памахваў згодна галавой, усьміхаўся, калі касавурыў вачыма на сужэнку паэты Зноціка...

Яна загаварыла зноў.

— Ах, мой няшчасны! Ён ужо лысее, бядача.

А тады валога-ірдзістымі вачыма пазіраючы на журналіста, шапотна апавесьціла яму:

— А ну іх чорту ўсіх — ты найлепшы мужчына!

Журналіст зноў вытрымана ведаў, што сказаць:

— Прыходзь заўтра і прынось пераклад, — парадзіў цёпра ва ён.

— Фу ты! Споведзь заракλі! — прагаманіў нячутна Травянец ды адсунуўся ад іх, крыху далей. У мімавольным слуханьні гутаркі журналіста з Зноцікавай жонкай мастак азіраў Арэмчыка з Саболікам, што ўсё гутарылі паміж сабой, то прыхінаючыся постацямі, то адхінаючыся, усёдна, бы цыркавыя маржы, што запамяталі гэтакую дрэсіроўку. Саболік, мабыць, увапрэў ад гарачыні ў залі, часта махаў хусьцінкай на аблічча і адхукваўся.

— Фу ты! Наўзадай паглядны чалавечак! — падумаў мастак і выцягнуў кішанковы блакноцік, захінаючы даланёй яго, зрабіў шпарка замалёўку з Саболіка.

Арэмчык устаў, загаварыў.

— Прашу цішыні. Мы засядзеліся, а ўжо час паслухаць нашага будучага народнага паэта спадара Зноціка. Калі ласка, спадар Зноцік, чытайце!

Зноцік спаквольна ўзьняўся з свайго крэсла, найперш папрасіўшы жонку раскласьці астатнія вершы парадкам (яна борзда вярнулася да яго ад журналіста), загаварыў да гасьцей.

— Я вытрымаў сваё слова, данае спадару Арэмчыку, прачытаць некалькі твораў для вас... Мой творчы шлях даўгі, я пэўны — вы знаёмы зь ім і, думаю, любіце мяне. Я хутка выдам зборку зусім новых вершаў. Некаторыя зь іх хачу прачытаць вам на сяньня.

Журналіст нахіліўся да мастака.

— Услухайся — якая вытрыманая готыка вершу.

— Чаму ж не сказаў: вялікія апалонавы карценьні?

— Травянец, вы не разумееце паэзіі. Верш — сьпеў словаў...

— Фу ты, журналісцік! Гутарыце з мной, як з сынам... Не забывайцеся, я пад'еў ужо — сытны, магу сьпеў выбраць сытнаму целу і духу латвы... моц зьявілася.

— Гэта вечнае! Фу ты, фу ты! А па-мойму: за не сваё не бярыся!

— Але, але, журналісцік: фу ты — ня вёрсты! Але вобразікі паэтычныя ўкрадзеныя! Ад беларусаў украдзены, з крыві наскай!

Журналіст адсунуўся ад Травянца, слухаў паэта. А Травянец, адшукаўшы крошкі хлеба, нэрвова скочваў у дробныя кулькі і перакачваў іх па стале паміж расстаўленымі даланямі, а тады паманіў пальцам падносчыцу, папрасіў:

— Прынясі, сястрыца, вады папіць.

Напіўшыся, ён спытаўся ў журналіста.

— Можа, пойдзем адгэтуль — пакажу дарогу! Уцям: не паленаваўся нагнуцца да вашэці — адсеў недалёка, здаецца, дарога таксамая.

— Патраплю безь цябе.

— Фу ты! Ну, дык бывай! Дзякую, што прывёў сюды!

— Калі ласка — хадзі сабе!

Травянец на цыпачках выйшаў з залі. Каля ўсходкаў да Арэмчыкавых гаспадаў ён прыпыніўся, хутка выцягнуў з падпахі паліто лістоўкі і палажыў іх на ўсходкі.

— Фу ты, спаведная — марозіць як! — адклікнуўся ён.

Здалося, нехта таксама выходзіць з залі. Аднак нікога не было.

Выйшаў на вуліцу. Куды ісьці? У «бульдогавай будцы» сьцюдзёна. Яго агарнуў смутак адзінотнага чалавека... У разбураных будынках і гмахах пакорчаная бляха з даховак званіста ляпала. Груды цаглінаў выбіваліся з-пад сьнегу буграмі, веялі ад подзьмуху вострыстым сьнежным пылам. Водар тарфянага паліва не адлятаў разам з подзьмухам, зацягваўся рэзкім пахам каля адолу. З падвалаў з выбітымі вокнамі, ашчэранымі цемрасьцяй, як уваходы ў пячоры, выбіваўся смуродны пар ад скіненага туды бруду і шумецьця. Зрэдку ў воддалі хрыплівым рокатам гудзелі аўтамашыны.

Ад сьцюжы Травянец бадай увесь утуліўся ў сваё дрэньненькае паліто. Пайшоў па больш захінёнай вуліцы ў зусім іншы бок, як ісьці да ягонай «будкі». Ніколі раней, як тады, ён адчуваў сваё адзіноцтва, адзіноцтва чалавека, якому астаецца толькі чагосьці спадзявацца або жыць ілюзіямі жыцьцёвых сноў ці мо' ўпрыгожваць самога сябе мрояй выпуклай і магчымай. У словах мрояў няма формы, але ёсьць будучыня, што возьме ад іх своеформнае, — праўдзівая сапраўднасьць у душэўным хароме чалавека, безь якой блудзіў бы або поўзаў, як чарвяк у падзямельлі.

Усё, што напаткалася Травянцу на сходзінах, не было навіной. Ён ужо справіўся бачыць, не ўпершыню перажыць людзей абмежаваных, што жывуць жыцьцём існаваньня ў ім і бяруць існаваньне так, як яно даецца валадарам над імі. І яны, пашчонкі валадароў, гэтак падточуць ды разьядуць штодзённае жыцьцё, што потым можа астацца толькі распачлівасьць. Яны добра разумеюць розьніцу паміж уладарцамі і імі, але іх найбольш палохае блізкасьць таго, каго яны прыгнечваюць у імя ўладаць. Іх кожную часіну могуць задушыць, зьнішчыць;

але яны часта робяць нялюдзкія намаганьні ўсьцерагчы саміх ды валадароў ад згіноты. Вось тады яны заклікаюцца да брацтва, да ўзаемнай дапамогі, да ратунку адзін другога, каб уціхамірыць сябе звыкламу: чаго ты жадаеш — ты ж жывеш! У розуме ёсьць адно-адзінотнае: быцьцё, значыць — ты, а ўсё астатняе, роднае, — разьлік, права быць з намі, гандляваць сваім, родным.

Травянец дайшоў аж да пляцу Волі, пасігаў празь яго да вуліцы паўз стары манастыр. З вузкай вуліцы пляц Волі з аголеным брукам выглядаў пад завейным подзьмухам плывістым узвышшам парожняга кірмашовага месца. На схоністай вуліцы вузкай, як човен, выцягнуты зь Сьвіслачы, што тут побач працякала, хадзілі з нахлабучанымі башлыкамі жандары, яны ахоўвалі свой будынак і нагнаных туды людзей да працы ў Нямеччыне. Каля сотні мужчын і юнакоў, жанчын і дзяўчат, як увечары на лугавых вярхоўях загнаны статак, гурміліся пад павецяй каля будынку. Травянец прометна глянуў на іх, адоленых... Успомніліся свае дні арышту і катаргі, свае мінулыя спадзевы вызваленьня хоць бы праз каго. А цяпер, калі ён ходзіць вольным, хоць з умовінамі жыцьця бяздомнага сабакі, толькі цяпер надышла думка: у тых мінулых плачах, у пакутах людзей было шмат чагосьці самому сабе несказанага; у тым хавалася: толькі свабоды хачу, а назаўтра, здабыўшы яе, ня ведаеш, як захоўвацца з собскім рабом жаданьнем. Яно шмат каго апаноўвала жывым, рухлівым характарам, пра які зусім ня думалася і ня мроілася.

Травянец кожным днём рабіўся палітыкам балагорным, дамарошчаным. Яму думалася, што ўсё можна перамагчы, адолець, нават ня будучы таленавітым у спосабах змаганьня.

— Фу на вас — ламанецеся і ўсё струшчайце!.. Душэце паўварыятаў!

Яму было нясьмешна з свайго настрою, што так ажыўся ў ягоным сэрцы самым надзвычайным посьпехам.

Зьвярнуўшы з Манастырскай вуліцы на Сьвіслацкую, ён блізу забыўся на свае ранейшыя, самалюбівыя і простыя развагі. Сюды ён прыходзіў радзьва. Шукаў для будучае карціны новых уяўленьняў і сьценяў на невялікім ушчалопку паміж разбураных дамоў. Тут калісьці цэмэнтовыя жалабы з краскамі аддзельвалі вуліцу ад будоўляў. Усходкі на паверхі ўздымаліся адразу з ушчалопку, што, здаецца, увасоблівалі яму часіну пачуцьця: адзінна свабодная асталася кожнаму чалавеку на сьвеце працавітасьць дзеля дабрабыту. А цяпер тут камяніцы раз-

бураныя і пляц-ушчалопак напалову завалены друзгамі, быццам крушні вырасьлі зь зямлі.

— Сяргей! — клікнула жанчына, і Травянец схамянуўся, ён ужо даўно-даўно ведаў гэты голас. Ён азірнуўся спаквольна. Жанчына з саначкамі, накладаванымі пашчанкамі, назьбіранымі ў руінах на дровы, нярослая і старэнькая, хуталася ў ваўняны шалік, моршчылася ад маразянага подзьмуху, уторыста захінаючы аблічча рукавіцай.

— Што робіш тут? — спыталася яна.

Травянец незадавольна махнуў рукой, яшчэ раз, без асаблівай патрэбы, зірнуў на руіны-сюжэт для будучага малюнка, пайшоў да жанчыны.

— І дзень сяньня! Цэлы дзень вайсковая рамантыка! — ідучы да жанчыны, прагаманіў ён злосна. Яна ж радасна і шчасьліва, адвярнуўшыся плячыма насупраць подзьмуху, глядзела на Травянца. У старых, але па-жаночаму чыстых вачох, глядзелася лагодная праўдзівасьць любасьці да чалавека, зь якім у мінуласьці шмат што перажылося і адчулася.

— Чаму ж ізноў не прыходзіш?.. У гэту нядзелю наш Віктар жэніцца — прыходзь.

— Фу ты! — усьміхнуўся Травянец. — Сяньня не магу — ужо ў Самапомачы наслухаўся пра каханьне...

Але яна быццам не пачула яго, працягвала гаварыць.

— Віктару ўдалося ў немцаў працу атрымаць — інжынэрам працуе ў іх. Ты ж ведаеш, ён інжынэр... Прыходзь, Сяргей! Будзь бацькам! Не цурайся нас!..

Ейны голас сыдрыгнуўся. У ейнай душы зноў, як і раней, ачуняў боль. Яна не магла ўтайкаваць сьлёзы, скрозь іх глядзела на аброслага, бы жорсткага, неахайнага Травянца.

— Хадзем — пабудзь хоць часіну з намі.

Яна ўзяла яго за руку — гэтак была велікома жаласьлівасьць і любасьць да мужчыны, што ўхіляўся яе і сына. Ён моўкнуў, пазіраў бяздумна на засьнежаную Сьвіслач. Ён быў ня ў здолі супраціўляцца, не знаходзіў рашучасьці зналусна адмовіць усё тое, што яму не падабаецца. Наогул ён не любіў лішніх цярпеньняў і перажываньняў, што апрыкла апыноўвалі яго ў ліку нейкіх, незалежных і дзікаватых, людзей. Аднак ніколі не спрынукваў кагосьці да ахвярнасьці дзеля яго. Жыў завельмі справядлівым да сябе, а таксама да іншых. Гонар жыцьцёвае рыньвы засьцінаўся прапановамі самаволі асобы ў агульным абавязку да грамады. Трохі выглядала, як пераканальны гонар мастака ў мастацтве.

— Сын рос безь мяне — пры чым я? Я ж катаргу гадаваў...

— Хадзем да нас... Сын любіць цябе.

Яна лёгка, па-юнацку паспрабавала павесьці мастака, а другой рукой стурзанула наскладаваныя саначкі. Яму сталася сорамна: трэба хоць памагчы цягнуць саначкі, хоць бы, прынамсі, да ганку іхнага дому.

— Хадзем — я памагу табе, — прапанаваў ён.

Аддала вяровачку. І тэй часінай у баязкасьці зноў ня бачыць дарагога старэчу і бацьку сына, яна сказала:

— Кінь усё тут, толькі хадзем да нас! Кінь!..

Ён ятрыста цягануў саначкі.

— Фу ты — марозіць як!

Подзьмух зімовага ветру рабіў адчуваньне далёкасьці сусьвету, атрэпляваў іхную вопратку. Яны ішлі па вуліцы, цягнучы саначкі, як паміж сьнежных далоняў.

— Небывалая сьцюжа, — сказала яна з трывожным, прыгнечаным позіркам.

Калісьці ў яе жылі пэўныя намеры: жаніцца з таленавітым мужчынам. Яна верыла ў сужэнскую прывязанасьць, што ейная жарсьць прычыніцца шмат чым прыгодным у жыцьці з чалавекам, зь якім будзе за розум нікаць свой век. Яна бралася за жыцьцё будучае, як спадкаемец пераймае па кімсьці спадак. Аднак памылілася. Мастак прызнаўся ёй:

— Я потым скажу, ці варта з табой аж да сьмерці жыць...

Яна пазнала тады першыя няшчасьці — няпэўнасьць у жыцьці. Мастак ніяк ня мог адвыкнуць ад моды вольнага каханьня. Ён час ухіляўся яе, бы хітры майстра ад умовы.

Аднойчы, у нядзельны дзень, яна пазьдзекавалася зь яго. Яна спыталася ў яго:

— Чалавеча, чаго прыйшоў сюды?.. Кажуць, вы мастак? Дык, калі ласка, разьбярэцеся, што прыгожае ў маім непрыгастве ёсьць?..

Кепліва сьмяялася, надзіла неадступна, як цыганка ў танцы, крутанулася перад ім, глядзець у ягоныя вочы, захоўвалася гэтак, быццам мацярынская прывабнасьць у жынчыне сталася аб'яўная і па-свойму жывуча-рухлівая.

— Фу ты — вясёлая ўдава!..

— Так, так, дарагі сужэнец, інакш ня можна — мо' перажэнімся?

— Перажэнімся... абавязкова перажэнімся!

І яна верыла, а Травянцу надалей аставалася зразумела: ён поўнасьцю не ўнікаў у пачуцьцё сужэнкі, у пачуцьцё, якое неспадзеўна жадала ягоных пешчаў і наўветнасьцяў.

Некаторае прыйсьце да хаты яны апынуліся сярод двух натоўпаў: з аднаго боку вуліцы ішлі да гета жыды, з другога — з артылерыяй коннай рухаліся на фронт вайсковыя аддзелы немцаў. Водар жыдоўскае грамады, пырхканьне стомленых коняў, скрыкі жаўнераў на незразумелай мове, рыпеньне і лязгат ворчакаў урываліся ў зімовы подзьмух ашчарэпліваcьцяй людзкога буяньня. Здавалася, усе, пераможцы і пераможныя, уцякалі, адыходзілі ад бывалых мясьцінаў спакою ды радасьцяў, цяперака яны нікому не патрэбныя — ім люба небясьпека.

— Як добра, што наш сын не на вайне, — мінуўшы людзкую гурму, сказала жонка Травянцу шчасьлівым выказам.

— Вельмі добра, — адказаў Травянец, з абавязкам толькі адказаць ёй.

Яна працягвала гутарку. У яе была зайздрасьць мацеры: усё дзеля сына.

— Як хутка мінаюць гады. Учора дзіцянё быў, а сяньня глядзі — ужо жэніцца... Які добры і мілы ён!.. Сяргей, ён любіць цябе, ён заўсёды спамінаў цябе... калі ты ў першы дзень зьявіўся дадому, а ўвечары дзесьці зьнік, зьбіраўся шукаць цябе... Як шчасьліва — ты зноў знайшоўся!

— Але ж марозіць! — няўступна адказаў Травянец.

У хаце апрача двух акварэлевых эцюдаў, намаляваных Травянцом, усё было незнаёма. Кніжная паліца стаяла ў кухні... Усё ня так цяперака. Вушакі ваконьньняў патрэскаліся і пачарнелі. Травянец аглядзеў пакоі, абышоў іх, як добры гаспадар.

— А тут будзе сын з жонкай жыць. Чым магла і прышлося абставіла іхную гасподу.

— Слава Богу — хай жыве! — сказаў Травянец, але ў сынаў пакой не ўвайшоў.

— Сяргей, даруй яму. Ён гэтак сказаў тады таму, што ня ведаў цябе, ён жа, калі выслалі цябе на катаргу, горкім дзіцём быў...

— Няўжо ты падчас маёй адсутнасьці нічога не гаварыла пра мяне, не прывучала любіць свайго бацьку?

— Гаварыла, Сяргей, шмат гаварыла! Успамінала... праўда, як падрос, я рэдка спамінала цябе, бо ж ня ведала, ці жывеш на сьвеце... Ды і час не такі быў, каб журыць юнака благім... Ці варта пра гэта ўспамінаць? Ягонаму посьпеху ў службе і ў вучобе магло перашкаджаць...

— Можа... можа, — адказаў Травянец, быццам пагаджаючыся з жончынымі меркаваньнямі.

Тое, што здарылася з Травянцом, мінула, а цяперака, аж да сьмерці, ёй хацелася разам зь ім думаць, захапляцца сынам. Якія

клопаты ды рупнасьці, пастараўшыся, яна магла адшукваць у жыцьці? Ужо адышлі дні, што некалісьці непрадбачна яе, маладую, апыноўвалі ў розных похапках шчасьця і смутку. Яна сама выгадавала сына. Часам зьдзіўлялася, як кожная адзінотная жанчына, пакінутая з маленцам: ейны сын стаўся выраслым ды мужайным мужчынам. Яе крыўдавала, што ён жэніцца, што ён не маленькі ўжо. Божа мой, ён зусім іншы! Кахае жанчыны, будзе называць чужую жанчыну дарагой!

Травянец сеў.

— Распранайся, Сяргей, — дамоў прыйшоў.

Яна шчыра ўсьміхнулася.

— Хутка і сын з працы прыйдзе. Ён больш ніколі ня скажа: гляджу на вас, як доктар на хворых у бальніцы. Я думаю, ты за гэта не пагневаўся?.. Я зраблю ўсё добра...

— А чаму ж і не пагневацца за гэта? Сустрэць гэткімі словамі роднага бацьку?

— Даруй, Сяргей! Ты ж бацька ягоны. Ты мусіш хоць з мной астацца... Ён жа жэніцца...

Яна ўсхліпнула... Накіравалася да кухні.

— Я зараз вячэру прырыхтую вам, — адклікнулася яна стуль і, нашчапаўшы лучыны, запаліла ў пліце дровы перамешаныя з кускамі торфу.

Неўзбаве зноў вярнулася да Травянца.

— Распранайся!.. Падумай: толькі мы адны і ёсьць твае. Ты састарэўся, старая і я, куды нам бяз помачы сына?

Травянец глянуў на яе. Якая недарэчная яна! Ногі, бы не ступаюць, а сунуцца, падстаўляюцца пад ейную прыгнутую постаць. Яго зачэпліваў эгаізм эстэта, вечнага юнака, адвечна ўражлівага. Але ў жончынай гутарцы, у зваротах захоўнасьці яшчэ жыло шмат мінулага: пачатнае, узьніклае разам з азначаным характарам быць адзінакавым аж да сьмерці.

— Распранайся, — зноў папрасіла яна і падышла памагчы распрануцца. — Я прынясу твой касьцюм — ты ж у ім вянчаўся...

— Дай мне агледзецца... справіцца з самім сабой... не турбуйся ўспамінамі.

— Добра, Сяргей — я пачакаю... Ах, як хутка мінула маладосьць! Глядзі: наш сын жэніцца... Памятаеш, як ты насьміхаўся зь мяне, калі цяжарная была? Напэўна, не забыўся? Я ўсім паказвалася, бесьперастанна чытала кніжку «Наказы цяжарнай жанчыне», бо ж ты ведаеш, а можа дагадваесься, чаму я гардзілася гэтым — ты ж іншых кахаў... А сын вырас, жэніцца...

Яна перарвала размову, пабарзьдзіла да кухні. Там закіпела страва, выбегала на плітку, шыпела.

Травянцу падумалася без дакоры сумленнасьці ягонаму мінуламу жыцьцю сужэнца:

— Фу ты, бястронная — а ніяк свайго падданага не забудзе!

У ім абуджаўся ўсё больш і больш эгаізм мастака. Рабілася ў сэрцы ня натва. Як магла яна сказаць: і ты ўжо стары, а сын будзе нам помач?

— Не! — прагаманіў ён і пайшоў таксама да кухні.

Яму ўверылася: жонка і сын у здоле даваць толькі спагаднасьць, але прывязнасьці паміж імі ніколі ня будзе. Некаторага дня жонка можа зноў сказаць яму: «Начорта мне твае стылі, шуканьні! Малюй, каб людзі купляць маглі, а ў нас грошы вадзіліся».

Ім завалодала адольлівая цьва: дагнаць тое, што не па ягонай віннасьці прапусьцілася ў жыцьці. Ён ясьвіў сваё існаваньне існасьці, тае існасьці, што неспадзеўна духатворыць табе, цеміць пачуцьцё неабходнасьцяў сьвядомасьці азначыць жыцьцё людзтваў у абразох малюнку гэтак, як жадалася, гэтак, як летуцелася. Ён ахінуўся спалукай адзінства душы і цела — моцай і воляй тварэньня.

— Сын любіць мае стравы, будзеш і ты любіць. Мы цяпер яшчэ больш бяскемныя.

Яна прынятна мяшала ў чугунку страву, падсыпала соль і прыправы.

Травянец загаварыў пра іншае:

— Каб міла ўспаміналася пра мяне, успамінай адно — наша мінулае сумеснае жыцьцё. Усё астатняе лішняе, зусім непатрэбнае... Жывеце, а я хачу адзіноцтва... Бывай! Прывітаньне сыну. Пацыент прыйшоў і адышоў, скажэце яму!

Апошнія словы Травянец казаў на хаду, прастуючы да дзьвярэй. Жонка зьбянтэнжылася, толькі пазірала ўсьлед яму... Апамятаўшыся, яна ўбачыла на часіну на рагу вуліцы Травянцову постаць, усю ўтуленую ў старое, злахмочанае паліто. Яна не адышлася ад вакна. Парожняй глыбінёй вачэй глядзела ў адно і тое месца, скуль завярнуўся на другую вуліцу Травянец, ейны муж. На знадворку подзьмух аціхаў. Заходні небакрай пачынаў ясьніцца перадвячорнай шугнасьцяй. Неўзабаве яна ўбачыла сына. У галаве ад прыліву крыві зазьвінела. Ейныя думкі сабраліся.

— А можа, лепш, што ён пакінуў нас, — падумала яна пра Травянца.

Убачыўшы сына, дарагога і любага, спадзеўнага для ейных старых год дажыць спакойна побач яго, ёй зразумелася, што Травянец усяго толькі як памятнасьць пра знаёмага чалавека. Яна ведала, што калісьці першыя падступы зачараваць яго былі матэрыяльныя, а каханьне, што зьявілася пазьней, ці не перажываньне шчасьця і радасьці жыцьця — сумленнасьць астацца ўдзячнай.

Праз паўгода пасьля ссылкі Травянца на катаргу яна жыла з другім, які за месяц перад вайной памёр і пра якога Травянец нават ня ведаў. Жыцьцём з другім ёй жадалася помсьціцца Травянцу за мінулую няўважнасьць да яе, за сужэнскую здраду; цеміць яго бясьсільным, мізэрным чалавекам, што ня здолеў абараніць сваю работу, свае мастацкія стылі, а дайшоўся быць катаржнікам...

Зноцік у адмен пісьменьніцы Стаполі чытаў доўга. У сваіх творах ён сумаваў па вясьне ў горадзе, як зьняволены ў турме сумуе па свабодзе. А калі ж хацелася даць тон вастраты думкі ці мудрасьці абавязку, у яго выходзіла:

Што я зрабіць магу,
Што вам сказаць пра іх?
Я ведаю, шкада мне іх.

Гаворачы пра сваё «я», Зноцік не губляў спадзеў пажыць паўнатой жыцьця. Ён бы не рабіў промахаў. Яму падабалася сваё. Яму апладыравалі. Журналіст пачынаў першым, задавольна пазіраючы на Зноцікаву жонку. Гэтакая лёсьць на іхных абліччах можа быць толькі ў людзей, што памагаюць адзін другому!

— Журналіст ажно цьвіце, — шапнула Алена Адамчыку, яна была знаёмая з журналістам. Ён пісаў да розных выданьняў у беларускай мове падчас акупацыі немцамі, а раней у савецкіх перад вайной.

— Кажнаму сваё, — адказаў Адамчык. — Я ня ведаю яго.

Алена зноў да Адамчыка:

— А дзе ж Травянец?

— Не відаць — мабыць, пайшоў.

— Хадзем і мы адгэтуль. Чаго сядзець тут?.. І скуль у Беларусі набраліся нацмены? Куросаньне знайшлі ў нас і свае і чужыя...

— Не разумею цябе.

— Хадзем — я потым растлумачу. Хадзем адгэтуль.

— Можаш і цяпер сказаць.

— У нашай літаратуры нацмены аселі.
— Дзякую! — так сабе адказаў Адамчык.

Заапладыравалі зноў. Зноцік скончыў дэклямаваць і чытаць. Але яму бы мала было собскіх уражаньняў, падумалася, што праслуханае могуць не зусім дацаніць. Каб ляпей успрынялося яно, ён зьявіўся да гасьцей:

— Дарагія, ужо колькі год мінула ад часу майго прыезду ў Беларусь, але з кажным днём усё больш і болей ня хочацца пісаць па-беларуску. Над маімі вялікімі натхненьнямі зьдзекаваюцца беларусы. Дам вам адзін горкі прыклад: тут у Менску жыве і жыў раней мастак Травянец, пра яго, хоць і вайна, ідзе слава, яго ці ня кожны мянчанін ведае толькі за тое, што ён вельмі кранае сваімі малюнкамі нацыянальнае пачуцьцё беларусаў. Дык вось, ён аднойчы сказаў мне: каб быць чужынцу ў славе сярод нас, трэба з поўнай шчырасьцяй ажыцца з нашым народам, трэба аж да сьмерці думаць па-нашаму... Шкада, што ўжо пашол адсюда...

— Ганьба, смаргачу! — усхапіўся Саболік і, уцьвелены пачутым, зноў сеў на крэсла, шырока растуляючы ногі.

— Дзякую за памогу, — адудзячыў Зноцік Саболіку і працягваў: — Час зьмяніўся. Калі няма маёй славы ў Беларусі, мая слава будет у будучай Расеі. Час мяняецца, гаспада! Я шкадую, што Травянец не пабыў тут да канца сходзінаў. Я ў прысутнасьці вас сказаў бы яму: час мяняецца, гаспадзін мастак — вось какой мой залог!

Зноцікава нараканьне згубіла эфэкт, бо якраз, калі ён жадаў скончыць зварот да гасьцей вершам Пушкіна «Да Чаадаева», Арэмчык, таксама порстка ўзьняўшыся, абвясьціў:

— Спадары, Травянца я не запрашаў сюды, аднак ягонае імя чуў, дзякую фраў Сконтаў, купіў у ейным магазыне два Травянцовых палатны алеем...

— Убіць гадаўку! — умяшаўся салідарыст Траяконяў нямоцна. Яму адпавядалі ягоныя правілы захаваньня. Ён ведаў, чаму ён тут знаходзіцца. А Зноцік, наадварот, у яго быў свой інтарэс.

— Удзячан, спадары! Бывайце, беларусы! Задавальняйцеся сваімі нацыянальнымі пачуцьцямі!.. Я пісаў дзеля вас... Я з маёй дарагой таварышкай жыцьця галадую, а вы нават не падумалі памагчы нам... дзякую!

Зноцік, прытрымоўваючыся за стол, сеў. Па ягоным усхваляваным абліччы сьлізгануў пот — аб'яўнасьць незадавальненьня, што было ў яго даўно. Цяжкая часіна! У ім яшчэ жыло юнац-

кае парываньне да славы. Колькі перажылося гэтых дзівосных, адчувальных вёснаў! А ўсё тое самае: нерасьцвіцелая, непрызнаная творчасьць! Калі толькі ёсьць Прывіднасьць, то пачаць яго можа здарэньне або выпадак. А тады вынік залежыць ад тваёй здольнасьці здабываць іншыя выпадкі і нагоды папоўніць прызначнасьць ці то асабістымі дзеямі, ці то спрытным розумам падтурхоўваць іншых дзеля тваёй славы. І некаторае калісьці рабілася і робіцца цяпер, аднак усё па-ранейшаму: старое, непрыхільнае ягонаму наканаваньню.

— Якія беспасрэдныя людзі беларусы, — пераканаўся Зноцік. Але, бяседуючы з жонкай і аднадумцамі, ён сьмяяўся з тых, што падобныя, як Травянец, хацелі ад яго такту паважлівасьці да людзей іншае Айчыны. Калі імкнуцца да славы на чужацкай краіне, дык трэба навучыцца адчуваньню зьместу жыцьця няроднага народу, прыйсьці бязьвінным і сарамлівым у захапленьні любовяй гісторыяй гэтага народу, карцець іхнымі імкненьнямі ды спадзевамі. А собская, родная тады павінна стацца як страх брутальнасьці.

— Гэткім Міцкевіч, гэткім Касьцюшка пайшоў да палякоў, — сказаў калісьці яму Травянец.

Зноцікава кроў успалымнілася — уцешыўся нагодзе, хоць Травянца не было ў залі.

— Калі хочаце ведаць, спадар мастак, я большы, чымсьці ваш Міцкевіч! — натхнёна адказаў ён.

— Фу ты, генэрал бяз зоркі!

— Вы мізэрнік! — пакрыўдзіўся Зноцік. — І папрашу больш не здаровацца, а калі надыдзе патрэба сюжэту дзеля новае карціны, запазычвацца з маіх вершаў.

На літаратурных сходзінах Арэмчыку сталася шкада Зноціка.

— Прашу пісаць і пісаць!.. Мы ўсе, разам падпісаныя, прышлем вам пэтыцыю: тварыць! Для нас тварыць!

Журналіст прыценька ўстаў, пабарзьдзіў да Зноціка.

— Перамогі вам! Зь перамогай, спадар Зноцік! — вітаў ён, шчыра цiснучы паэтаву руку, а тады павярнуўся да ягонай жонкі і таксама пaздаровіў яе.

Гасьцей захапіла захаваньне журналіста. Яны падыходзілі вітаць паэта і жонку. Яму скалыналі далонь і казалі словы ўдзячнасьці ды пажаданьні, а жонцы цалавалі руку і вокметна, зірнуўшы ў ейныя шэрыя вочы, усьміхаліся. Яна гардаўліва памахвала галавой, сама падымала руку да цалунку, а пакуль падыходзіў

наступны зь вітаньнем, можа, ад будрожнасьці, можа, ад даўнятлівасьці: толькі гэтак люблю — стукала пальцам па брыжу стала.

Арэмчык сказаў Саболіку:

— Вось дык прыняліся — трэба перарваць.

— Няхай! Я таксама за яго...

— Але ж час зацягваецца.

— Кінь дурніць! Дай наглядзецца мне. Ты ж ведаеш, ад гэтакіх неспадзевак я плакаць магу, я чутлівы чалавек... Хадзем і мы прывітаем... Абвясьці перапынак.

Арэмчык абвясьціў перапынак. Сярод шумлівасьці яго ня вельмі слухалі. А між іншым ён паведаміў гасьцям:

— Яго прэасьвяшчэнства япіскап Філіцы пажадаў прывітаць нас хлапчукоўскім хорам. Дзеці ўжо чакаюць на калідоры. Прашу не разыходзіцца.

Усьлед за Саболікам ён пайшоў вітаць паэта і неўзабаве шапнуў Зноцікавай жонцы:

— Хутчэй ідзіце да яе, бо часу няшмат.

Яна пайшла да Алены. На хаду з кішані касьцюму выцягнула старанна складзены ліст паперы. У кароткай часіне, ідучы да Алены, яна адчула зноў жаданьне вялікомым і нязьменна-праўдзівым. На абліччы прыемная мяккасьць настрою.

— Вельмі буду ўдзячная вам за ахвоту пагутарыць з мной, — знаёмячыся, хлусіла Алена. Яна скрытна хвалявалася. Была прычына. Міхась адмовіўся пакінуць раней сходзіны. І толькі пакорлівасьць каханьню да яго паталілі ейную цярплівасьць аставацца тут надалей зь ім. Зрабіць штосьці благое, нават звычайнае апрыканьне, яна зразумела, што было б найбольш болесна ёй самой, чымсьці яму. Яна спадзявалася дамагчыся ад Міхася каханьня, прыгожага і гарманічнага.

Зноцікава жонка паказала ліст паперы, увесь счырканы лініямі, надпісамі па іх імёнаў ды прозьвішчаў. Яна патлумачыла:

— Гэта наша родавае дрэва. Мы ж, паглядзеце на гэтае апошняе прозьвішча, паходзім ад нямецкага пакону. Мы хочым быць немцамі... Навошта нам галадаваць! Вось цяперака, упершыню за час вайны, пад'еўшы добра, гляджу на мужа, на паэта і не разумею, чаму я блізкая яму, навошта жыву ягонай жонкай?.. Мы ўспрынялі рытм, ажывіліся рыфмамі, і наце вам: трэба яшчэ думаць пра хлеб. Навошта? Мы ж — немцы, мы мусім есьці, як яны... Памажэце, калі ласка: парадзьце, як хутчэй дайсьціся нашай нямецкасьці...

— Мне так вясёла тут, так вясёла, што нават ня цемлю, што адказаць вам... я дужа спагадная вам!.. Спадарыня Зноцік, прыйдзеце заўтра ў Дом працы да пакою нумар 20, там якраз турбуюцца пра немцаў, шукаюць іх на Беларусі — добра?

— О, дзякую! Заўтра раненька прыбягу туды. Бо ж дзіўна жыць, як жывем, усё, чым займаецца муж і я — толькі сьмех сапраўдны... сапраўдны сьмех!.. Мы ж не беларусы. Мы ад рускіх — немцы.

— Я разумею вас, спадарыня Зноцік, згаджаюся з вамі: вам ужо надакучала Беларусіка, праўда?

— О-о так! Зусім — так! Як спортам займаемся ўсім беларускім.

Алена ўсьміхнулася, адвярнулася ад яе, села зноў каля Міхася. Ён чуў гутарку.

— Цяпер я разумею твае словы «нацмены беларускія пазыходзіліся».

— У тым ліку і я разам зь імі...

Зноцікава жонка не адышлася. Яна заваражылася сваімі прыхапкамі: быць немкай. Нахілілася над Аленай. Ейныя грудзі ўздымаліся ад добрага настрою, чорныя бровы бы ёрзаліся па лбе, скрозь скрэзьлівы сьмешак уторыла адценіста зьдзеклівыя словы:

— Як спортам... Хі-хі! Як спортам, паверце, займаемся ўсім беларускім!

Ужо толькі адзінотная гутарка з Аленай пра нямецкую спаконнасьць перанесла яе ў сьвет новага жыцьця, у сьвет новага таленту існаваньня. Яна ажно зьбянтэжылася. Госьці гамоняць, ходзяць па зямлі паўзь яе, але ні адзін ня ведае, не падумае пра тую, якая вышэйшая за іх у жыцьці і чысьцейшая крывёй... Яна аддалася сваёй цягаце, забылася, што стаіць упобач Алена, якая нават больш не гаворыць зь ёй. А зводдальку міргаў Арэмчык — прасіў канчаць.

— Прабачце! Я радая за вашую параду. Дзякую!

Яна цісканула Аленіны ўсплеччы, пабарзьдзіла адысьціся да свайго месца. Арэмчык махнуў у бок дзьвераў.

— Упускайце іх!

У залю ўваходзілі дзеці. Ужо даўно перапалоханыя і прызвычаеныя да ўсялякае паслухі, найперша загурміліся каля ўваходу пярэстым статкам. Іхныя маленькія далоні пачалі неспакметна лавіцца паміж сабой, адна за другую. На іхных худых, жоўтых тварыках, скрэпшых ад марознае сьцюжы, зіхнелі толькі вочы — няўлоўна зіркалі на вясёлую гурму гасьцей. Яны

былі апранутыя ў розныя вопраткі: добрыя і паношаныя, але найбольш не па іхнай постаці — велікаватыя.

Іх прывялі сюды ажно дваццаць. Сярод іх хлапчукі і дзяўчаты. Імі апекаваўся сам япіскап Філіцы. Вучыў сьпяваць царкоўныя песьні і дзьве расейскія песьні «Зьляці да нас, вячорная зара» і «Куплю сабе сарафан». Некаторага дня ён даручаў вучобу свайму харысту. Тады ім было вальней і па-дзяцiннаму весялей. Ён вучыў іх гуляць у беларускія дзяціныя гульні, а разьвітваючыся, папярэджваў:

— Калі бацюшка спытаецца, што вы рабілі, адкажэце «Ойча наш» сьпявалі.

Бывала, япіскапу Філіцыю рабілася сумна, тады ён пасылаў сьвятара Кіпіка ў прытулак прывесьці дзяцей да сьвятыні. Яны мусілі некалькі разоў прасьпяваць яму «Зьляці, вячорная зара» і кончыць кароткай царкоўнай песьняй. Сам жа ў гэты час садзіўся наўпроць царскіх варотаў алтара, слухаючы, перабіраў на каленях сутану або стрыкаў пазногцямі, чамусьці часта нюхаў іх.

Дзяцей на літаратурныя сходзіны прывёў кіраўнік хору. Ён расстаўляў іх, каб сьпяваць усю тую «Зару». З маленскай паслухмянасьцяй яны станавіліся, дзе патрэбна, рупна па наказу папярэджвалі адзін другога, асабліва дзяўчынкі, пра парадак.

Кіраўнік зьвярнуўся да гасьцей:

— Яго прасьвяшчэнства япіскап Філіцы жадае найлепшых посьпехаў у творчай працы нашых пісьменьнікаў і паэтаў і жадае прывітаць усіх гасьцей, шаноўнага спадара Арэмчыка сьпевам дзяцінага хору.

— Шчыра дзякую! — адказаў Арэмчык.

Шырокім вахам рукі кіраўнік ціха адлічыў адзін, два, тры. Імпэтна выпрасьціў постаць, яму ў адказ з адтутураных дзяціных вуснаў, як рот у рыбіны, адгукнулася песьня. Дбайліва падабраныя галасы сьпявалі суладна-прыгожа... Праз вакно ўрываліся апошнія дзённыя косьвы сонца, кідалі сьцень дзяцей аж да сталоў, да гасьцей, быццам песьня зрабілася чарнявасьцяй, папаўзла да іхных вачэй і рук. Некаторыя слухалі з дурнаватай самазадавольнасьцяй, некаторыя зрабіліся адзінотнымі, не спакмечвалі сваіх суседзяў — у сэрцах сабраныя галасы ў адзін напеў, гучэлі цемлівай блізкасьцяй любові, бацькоўскай спагадай.

— Не-е! Не! — у самую сярэдзіну песьні вырваўся з Алениных грудзей усклік, уцьвелены і моцны. Яна падбегла да дзяцей, адштурхнула кіраўніка і, колькі магчыма было абняць ру-

камі, абняла дзяцей. Некаторыя зь іх замоўклі, некаторыя працягвалі сьпяваць раздробненымі галасамі.

— Дзеткі мае! Любыя мае! Есьці вам!.. Есьці дайце ім! — наапошак зьвярнулася яна да ўсіх у залі.

Яна выкарыстала сваю «нямецкасьць».

— Я — немка! Я забараняю сьпяваць!.. Дайце есьці ім тое, што асталося... не пажорлі!

Сьлёзы, зіхрастыя на шчоках, здаецца, торалі тыя самыя словы, словы ейнага сэрца.

Салідарыст Траяконяў, прызвычаены да гэтакіх неспадзяванак, падышоў да Алены. Ён павучыў яе:

— Навошта шкадаваць усялякі спадак ад беларускага зброду? На мароз іх выгнаць!..

— Прэч! — скрыкнула яна.

У гэтага чалавека была адвага супроць падняволеных, але ніколі супраціўнай волі ягонаму пану. Ён падбег да Арэмчыка.

— Пацьвердзіце, я ж за немцаў змагаюся! Пацьвердзіце! — прасіў Траяконяў і цягнуў яго за крысо да Алены. Самаўладная неабходнасьць! — уладарныя выступілі супроць яго! Ён жа ў іх кругу існаваньня!

— Ня трэба лезьці, куды ня трэба... лепш уцякай адгэтуль, — асіпла, па-прасьцяку парадзіў Арэмчык. Але Траяконяў заставаўся ў залі.

Госьці пачалі ціхенька зьбірацца адысьці з залі. Саболік замітусіўся ў натоўпе, пакінуў Арэмчыка, цярпліва назіраў ды павучаў іншых:

— Што ж, яна — немка: супярэчыць ёй ня можна...

Але калі б у той час там прысутнічаў Цярэм, ён усёдна сказаў бы пра яе: «Дзяўчына хрысьціяніць, і ня менш і ня больш!»

Адамчык паспрабаваў угаварыць Алену крыху спакволіцца. І каб падмацаваць станьву здаронага, гаварыў да яе па-нямецку. Аднак яна ня слухала яго, толькі міжчасна сказала яму:

— Ня ўтруджвай прозай. Гутар па-нашаму — не наўмень на зямлі сваёй.

Схватна ўзяла за руку, павяла да стала.

— Хлеб бяры, мяса, доктар, і кажы ім есьці. Беражы дзяцей! Прэвэнтыўную мэдыцыну прадэманструй.

А тады мільгнула да Траяконява, нават аставалася каля яго, пакуль набраў скібкі хлеба і панёс да дзяцей.

Алена не задавольвалася. Мабыць, ад асабістае чутнасьці, мешчаная ў жыцьці, падмаўляла тварыць спагаду. Яе слухаліся. Сіла паводлевасьці асабістасьці ў неспадзеўным прымуша-

ла навакол людзей слухацца справядлівасьцяй; ці ў наадвароце: прынукваньне можа апанавацца ўдзячнасьцяй уладарнаму арганізатару. Яно ў некаторым усьцяжы часу не адасоблівае супрацiў так не рабіць. Нават свавольныя апыноўваюцца слухаць аб'яўлены распарадак.

Каля выхаду абвясьцілася трывога. Тыя, што хацелі ў мітусьні неспакметна пакінуць сходзіны, вярталіся зноў у залу. Насьцярожліва гурміліся і не зварачалі ўвагі на Алену.

На знадворку страшнела. Саболік самаахвотна пабарзьдзіў памагаць Алене завіхацца каля дзяцей.

Выстралы, бы трэсканьне сьцен, аддаваліся за вокнамі. Палкоўнік Сконтаўт разумеў, што на знадворку нешта творыцца благое. Ён без заміну выйшаў. Госьці адышліся на сярэдзіну залы. Ім пазбаўлялася скончыць дзень спакойна. Быў нячутны гнеў. Не спрыялася пашане, дзеля якой зышліся сюды лікоўна сустрэцца.

Палкоўнік Сконтаўт на вуліцы быў нядоўга.

— Жмудзіны зь немцамі разам ці не заложнікаў вешаюць… на маіх вачох двух хаджанаў на стаўбе падвесілі, — паведаміў ён Гані і Алене ды накіраваўся сказаць Арэмчыку замкнуць дзьверы ў Самапомач.

У залі суздрылася ціхань. Дзеці забыліся на голад. Перасталі есьці. Насьцярожанымі вачыма пазіралі на дарослых, што стаялі каля сьценаў, далей ад вакон. Дзеці неаднойчы бачылі, як да іх прыходзілі жмудзіны ды забіралі з сабой хлапчука ці дзяўчыну або некалькі, заціскалі далоняй рот, несьлі да аўтамабіля — расстраляць каля Перакопскай вуліцы. А калі прыходзілі немцы, яны выбіралі дзяцей, не грубілі зь імі, адвозілі ў Нямеччыну на мэдыцынскія досьледы ці, можа, на што-небудзь іншае.

У ціхату залі Самапомачы даносіліся з вуліцы багатлівая шугата жаўнераў, разборлівыя каманды афіцэраў і перадсьмяротныя скрыкі людзей. Час ад часу ехала зь цяжкім мэталічным скрыгатам панцырная машына; цокалі ядрана капыты коннага разьезду. Жмудзінскія дабравольцы ўскрыквалі на сваёй мове. Хахотна сьмяяліся. Нехта зь іх стукнуў багнэтам у шыбу вакна Самапомачы. Госьці стрыўна шарахнуліся ў куток залы. Старэнькая інстытутка піскнула, звалілася каля шкляных друзаў.

Алена ўпобач з Сконтаўтам, Адамчыкам і Ганяй стаяла на сярэдзіне залі. У нядаўную вясёласьць і радасьць і ў Аленіну незадавольнасьць усьцярожвалася неспадзеўная ціхата паха-

вальні. Дзеці трымаліся разам. Азіраліся, пазіралі на дарослых. Ведалі і разумелі, што каля іх гуляе вельмі перадышнае ў сваім часе быцьцё.

— Што скажаце, палкоўнічкі, дактары? — загаманіла Алена, быццам яна не жадала слухаць ні палкоўніка, ні Адамчыка, ні Ганю.

— Хадзем на вуліцу, — зьвярнулася да Сконтаўта. — Ты ва ўніформе, ты ж і немец... нацмен беларускі.

Сконтаўт не сьцярпеў. Ён быў чутлівы. У ім абвесьціўся здаровы абавязак уцемнасьці — рассудак.

— Алюся, ня дурні! — злосна адказаў ён. — Дзеля чаго ісьці на вуліцу?

— А вось хадзем, — настоіла Алена. — З мною сьведчаньне: немка ёсьць.

У дзялянцы, недалёка ад будынку Самапомачы, жмудзінскія аддзелы сьмерці пакінулі страхотную памяць. На электрычных і трамвайных слупох з наскорліва прыбітымі пярэнчынамі, і нават да дзьвярэй разбураных камяніц, віселі людзі з падвескамі: «Павешаны за мардаваньне немцаў».

Прыбалтыцкія суседзі стараліся. Ім абяцалі беларускую зямлю. Людзі з узьбярэжжаў шумлівае, хвалістае Балтыкі сноўдаліся навакольным разгонам нечалавечае хвалі. Павешаныя жанчыны — падрэзаныя газоны, віселі акрываўленымі лахманамі зь людзкога цела. Перад сьмерцяй маладых жанчын гвалцілі. Задавальнялася родавая жарсьць жаўнераў. Калі хто-небудзь астанецца жывым, як потым будзе глядзець на сваіх народжаных дзяцей?

Каля вогнішча, дзе, мабыць, грэліся жаўнеры, ляжаў расстрэлены юнак папярок дзяўчыны, таксама забітае. Ейны ўзадраны куляй чэрап шчэрыўся ў водбліску вогнішча бялявасьцяй. На аголены ейны жывот былі насыпаны палючыя вуглі. Смуродзіла печаным людзкім мясам. Як падкошаныя ўсялякія краскі на сенажаці, недалёка ад дзяўчыны і юнака ляжалі двое растаптаных танкам дзяцей... Жмудзіны — нацыя маленькая, весьціла сваю хроніку ў разбоі.

Калі выходзілі палкоўнік і Алена, за імі вымкнуў з будынку Самапомачы і салідарыст Траяконяў.

— Меня ждёт долг! Я за вас, немцы! — падцягнуў рэвальвэр наўперад жывата. Ён трымаўся свайго. Ён выглядаў лікоўным. Была пэўнасьць. Яго паважаюць і будуць паважаць гэтыя двое знаёмыя немцы: Алена і палкоўнік Сконтаўт.

Ганя прысела каля дзяцей. Адамчык астаўся сядзець у воддалі. Яму думалася: дзеля чаго ён укараскаўся сувязяй з Аленай. Усё, што яна творыць, ніхто ня ведае. І ці будзе вядомае пахвалай, апрача яго ды іншых сабраных каля Самапомачы?

Ацішэла. На сьценах руінаў салдат у чорнай уніформе, напэўна зь мясцовых, беларускіх, прыклейваў адозву да насельніцтва сталіцы слухаць немцаў. Паведамлялася, што будзе расстрэлена або павешана больш беларусаў за супрацiў нямецкім уладам.

— Вернемся. Ужо позна. Хадзем да дзяцей, — парадзіў Сконтаўт. Алена ахамянулася. Узяла яго за руку з асаблівай нарсьцівасьцяй штосьці больш пачуць ад яго.

Ён сказаў:

— Мы паможам ім. Хто захоча, няхай начуе ў Самапомачы, а хто да дому надумаецца ісьці — адвядзем, — мы ж немцы.

— Які ты добры — дзякую!..

— Паганая вайна, — адказаў палкоўнік.

— Пакажыся ты, чалавек, — прамовіла ціха Алена і дзіка хлыснула абаруч паўсплеч палкоўніка.

У залі Самапомачы Арэмчык памог ужо ачуняцца старой інстытутцы. Ён зьбегаў на паверх сваёй кватэры. Прынёс валяр’янкі. Яна жаласьліва ўздыхнула. З падлогі, устаючы, пракарэзіла сваё вядомае:

— Гаспадзін Арэмчык, прадсказваю вам: будете князям Севера-Западнага краю.

Ах, гэта інстытутка! З заўсёды ўтаропістымі вачыма, з абліччам, абшарпаным маршчакамі, не бянтэжылася. Працягвала гутарыць:

— Добры грэх — добры адпачынак цела.

І тады Арэмчык, нават і ня думаў гэтак зрабіць, падхапіў яе пад рукі, моцна здрыгануў ейную старавую постаць. Пасадзіў на крэсла каля таго самага разьбітага вакна.

— Замоўкні! — злосна шапнуў ёй.

Япіскап Філіцы, у поўнай апране, пастукаў да замкнёных дзьвераў; прасунуўся з паўпрычыненых Арэмчыкам і, спакмеціўшы сваю любую артыстку, паманіў яе пальцам. Яна пабарзьдзіла да яго.

— Что, мае чувства пробаваеце, васьпітаваете?.. Наканец-то вспомніў!.. Это ужас! — паскардзілася на япіскапа артыстка.

Ён паклаў абое далоні на ейныя ўсплечы, крыху пахінуўшы абліччa, прыліпна паглядзеў у вочы.

— Навошта хваляваццa? Нам жа нічога... будзь мілая.

Яны абое зь людзкой дрожнасьцяй абмінулі стоўп з двума павешанымі. Увайшлі ў сваю гасподу — у дом мітрапаліта ўсяе Беларусі.

Вісельцы зьвісалі якраз насупраць япіскапавай адпачывальні. Ад подзьмуху зімніка пакратваліся на дратах. Падгнутыя галовы з пачарнелымі абліччамі быццам шукалі, дзе лепш спрыгнуць на адол і зноў пайсьці жывымі.

— Божа мой! — адклікнулася артыстка, уздыхаючы парожнім, прыстойным спакоем.

— Усё прыходзіць і адыходзіць. Амін! — прагаманіў япіскап Філіцы. Зірнуў прытка на артыстку. На ёй была новая сукенка з шырокай выемкай на грудзях; зіхатлівыя пацеркі-бусы на шыі. Ня думаў пахваліць яе, як заўсёды рабіў, а ўспомніў Цярэма: «Чаму ён скратлява адышоўся ад яго — ні слова — калі пачуў ускрык у капліцы на магіліцах?»

У залі Самапомачы ўсе госьці асталіся начаваць. Асталіся і дзеці. Яны ня мелі шчырага значаньня для дарослых. Адно Алена клапацілася з Ганяй каля дзяцей. Падмаўлялі есьці, не палохацца. Палкоўніку дасталося адвесьці журналіста дадому, які адсюль недалёка жыў.

— Гэтым сурова, крытычна я не прынімаюся. Бо што можам зрабіць? Адны і другія твораць, што ім неабходна падчас вайны. Але нам трэба намагацца астацца жыць. Я толькі магу напісаць у сваёй газэце: людзі свае, будзьце прадсьцярожлівыя...

— Спадару, не палохайцеся мяне ў вайсковай уніформе... У вас ёсьць штосьці іншае сказаць?.. Прыймеце, гэта ня быў непрадбачаны выпадак, а наўмыснае забойства, — наўвеціў палкоўнік Сконтаўт і шпарка пайшоў ад яго ў Самапомач. — Вось вашая гаспода! Не разьвіталіся па-джэнтльмэнску.

* * *

Арэмчык запрасіў Саболіка начаваць у ягоных гасподах. Тым днём разам зь ім ён напаткаў іншую непрыемнасьць. На ўсходках да кватэры прыйшлося падняць лістоўку «За сьценамі Менску», бы прызвычайся глядзець на гадзіньнік.

— Зноў да мяне... зьядаюць жыўцом, — паскардзіўся Арэмчык. Гэты раз пачытай і ты... Вось жа здобель ім я!

Саболік — леляк целам і розумам, не адразу зьвярнуў увагу на Арэмчыкаву гутарку.

— Пачытай! — зноў зьвярнуўся Арэмчык. — Аджа, харубы водзяць: ня тое мы!.. А я чалавек зямельны... паступова стрымліваю сябе...

— Пра што гаворыш?.. А-а, «За сьценамі Менску»? Выданьне вызвольнага камітэту на Беларусі?.. Кінь, кінь у печ! Што казаць: кармі гнасьць... Хто напісаў: камуністы ці тутэйшыя незалежнікі?

— Пачытай! Госьці за нас. Нехта іншыя падклалі.

— А я па-свойску вяду: сярод гасьцей нехта нам чужым ёсьць... Каб я сам пераглядзеў ліст тваіх знаёмых і гасьцей, я, можа, хутчэй знайшоў мульлё. Прынамсі, хто такі Адамчык — доктар снуецца каля беларускай немкі?

— Хоць і дрэнна зроблена і пачата мной, але ўсё-такі штосьці пачата, працягваецца... Ня ведаю, а доктар патрэбен нам... Згаджайся з існаваньнем. Годзе думаць блага! Будзь чалавекам. Калісьці Арыстотэль казаў, калі не памыляюся: «Усе погляды неабходны, але яны мінаюць і зноў зьяўляюцца. І самі сабе адмаўляюць...» Я пачынаю зьмяняцца, лінаць, каб узьвялічыць сваю вартасьць адзінотніка. У ходаньні вялікіх дзяржаваў я і ты — адзінотнікі. Вось як трэба думаць... Ты чуў, на поўначы Беларусі пачынаюць арганізоўваць нацыянальную партызанку?

Саболік усьміхнуўся, падгнуў падбародач. Яго ахінула вядомае. Унарсьціся з мной, бо я заўсёды дадумны. На сходзінах пабачылі ды зацемілі ўсё ці не?

— А нічога не пабачылі і нічога не зацемілі. Паслухалі людзей з сваёй кагорты. Кагло!

Саболік паглядзеў на Арэмчыка, бы на які замёт, што агараджваў выйсьце, атульваў нейкае собства патаемнасьці. Ён праймаўся верай.

— Усе камуністы і нацыянальныя партызаны для мяне толькі рэлігійныя ярэтыкі... Яны не мяркуюць, што зь імі здарыцца, — усплечна адхінуўся ў крэсьле: — Я арганізую, зьбяру беларускую самаабарону...

— Палкай-стрэльбачкай праз плячук абароніш нацыю?

— Але пакажам сваё. Ня ўмешвайся ў маю дзейнасьць-справу... Вось скажы: як здароўе жонкі... не патурбую цябе пытаньнем?

Арэмчык неспадзеўна, зусім нядаўна перажыў моцнае ўражаньне ад сустрэчы з калекам каля Сьвіслачы-ракі, зусім нядаўнія сходзіны ў Самапомачы, і тут няўгода гутарыць пра глусьлівасьць напатканую жыцьця ў Менску — пра жонку... Час не купляецца. Ты мусіш быць у ім дастойным чалавекам у посьпехах і няўдачах. Арэмчык яшчэ больш захваляваўся. Паклікаў дамаведку-жонку, папрасіў даць валяр'янавых кропляў. Пяшчотна абняў ды пацалаваў яе. — Дзякую! Ты надзвычайная!

У ім аб’явілася зайздрасьць да жыцьця. Пакінуць пасьля сябе сьляды, якія спазьніліся працівіцца ў ранейшым жыцьці любовяй да дамаведкі-жонкі. Цяпер яно не дэкарацыя захаваньня, а знаёмае ад прыроды. Яна чакае ад яго дзіця. Самая сапраўднаяісьціна! Адмаўляць? Будзе хлусьня, няўцьверджаная вартасьць асабістасьці. «Я адкінуў словы неахайнасьці да яе», — прыхібала яснасьць паводзінаў да жонкі-дамаведкі.

Саболік пазіраў на іх, а тады спратна заявіў: — Людзі, што доўга сьпяць, ня ўмеюць думаць... я іду ўніз, да дзяцей. З табой не ўгаваруся.

* * *

Палкоўнік Сконтаўт вярнуўся да Самапомачы. Вяртаньня ягонага туды не спадзяваліся. Усе спалохліва глядзелі на яго. Нічога не пыталіся. Саболік спакойна, спадлоб’я, згрунела зірнуў на палкоўніка. Ён на ўскраі стала, каля ўваходу, ужо забаўляўся з кастлявым хлапчуком. Пасоўваў па стале паміж талерак і крошкамі еміны расстаўленую далонь у кірунку да хлапчука і нямоцна ўторваў:

— Букі... букі... расьці вялікім.

Хлапчук моўкна глядзеў на ягоную далонь і больш даверліва пазіраў на іншых упобач дзяцей. Саболіка ахінула праўдзівая цярплівасьць быць разам зь дзецьмі на вачох дарослых людзей, што ўжо ад самага пачатку вайны пачалі адчуваць і спатыкаць суровы лёс існаваньня між іхнага імкненьня знайсьці, бадай, купіць час наканаваньня, які патрабаваў узьдзеяньняў ад іх залежных.

* * *

Палкоўнік пасігаў да Алены, Гані і Адамчыка і адразу зьвярнуўся да ўсіх у залі:

— Прабачце нам — мы таксама пойдзем ад вас... не палохайцеся. Я, можа, зноў завітаю да вас... а цяпер адвяду сваю сям’ю дадому.

— Дзеткі, не палохайцеся, — раптоўна ўмяшалася Алена. — З вамі вялікі начальнік астаецца...

Саболік нават не паглядзеў, калі сям’я Сконтаўта, а зь імі разам Адамчык пакідалі залю.

Пачалі спадаць рэдкія сьцюдзёныя сьняжынкі. Дакучлівая шуглівасьць скразьняку між разбураных будынкаў час ад часу зьдзьмухвала мёрзлую пухкасьць сьняжын у аблічча. Абцасы патрулёў вайсковых чутнеліся то ў адным, то ў другім прасьця-

гу вуліцаў, што прасталі да пляцу Волі. Зусім блізка, гэтак было панура і насьцярожліва ў сталіцы, пачуўся дзяціны скрык: «Мама!». Распачліваму скрыку ніхто не адказаў. Уводдальках — рэха асобнай або чароднай стральбы.

Палкоўнік ішоў побач з Ганяй наўперадзе. Хоць ведаў, што зімна-маразьліва на знадворку, быў апрануты ў вайсковы мундзір. На дзязе шчыльна вісеў падвязаны наган. Не любіў дзеля параднасьці перад невайсковымі людзьмі хадзіць у шынялі… Усьледна палкоўніка і Гані ішлі Алена і Адамчык. Ганя часам падхоплівала палкоўніка пад руку, прыціскала да абмарошчанай сьняжынкамі шубы. Уладзілася пры хадзьбе некалькі разоў пацалаваць яго. Відовішча, нават хадзьба Гані і палкоўніка, цьвяліла Адамчыка. Ён балюча, апрача гэтага, неакавіта праймаўся сутнасьцяй у Самапомачы і дзікім здарэньнем у сталіцы. Спакойнага, раздумлівага не на імгненьне яшчэ больш лавіла, спыняла раздарожжа. Раздарожанае з дадзеным жыцьцём чалавеку, ня можаш знайсьці прыстанку-выйсьця да добрай чалавечай дзейнасьці. Было панятліва, да зарэзу панятліва: паміж вялікіх дзяржаў з пэўнай моцнай палітычнай філязофяй, а цяпер занятых міжсобку вайной, не знаходзіцца месца азначыць самастойнае месца для Беларусі…

— Як добра было б і люба, каб пайшоў дадому зь Цярэмам... што магу сказаць яму потым?.. ці пакінуцца якія-небудзь спадзевы памагчы няшчасным у Менску?

Калі б Алена размаўляла зь ім, Адамчык, можа, не прыводзіў сябе да доказаў так разважаць. Яна ішла побач яго з прыглядным абліччам на адол, бы штосьці шукала запамятаць пройдзенае на адоле. Мажліва, у ейным маўчаньні спакусьлівыя недагляды да ўласнага жыцьця ў мінулым або сучасным? Прапушчанае дагнаць здольнай умеласьцяй і хітрасьцяй, а можа ў яе ўсёнае адбываецца без цяжкасьцяў?

— Мы ідзем за імі, бы не ведаем мясцовасьці, — нарэшце Алена ціха сказала Адамчыку і ня глянула на яго.

Палкоўнік — вайсковы чалавек. Вушы прызвычаіліся да слыху. Пачуў іх.

Дарога ад Самапомачы да кватэраў для цывільных немцаў некароткая. Палкоўнік прапаноўваў пайсьці бліжэйшай вуліцай. У міжсуполку некалькіх уцалелых будынкаў месьціўся будынак Усебеларускага мітрапаліта. Дайшлі. Сьняжынкі барздзявілі яшчэ большай гусьцінёй. Чуліся выстралы. Нямоцны вецер скразьніў між развалінӑў.

— Гэта ж Травянец вісіць!.. — скрыкнула Алена і пабегла да слупа ў блізасьці гасподы мітрапаліта.

— Куды ты? Вярніся! — паклікала Ганя, астаючыся стаяць каля палкоўніка.

Да Алены першым падышоў Адамчык. Яму адчувалася, быццам ідзе голым, быццам выткнуўся да натоўпу паказацца, як ёсьць складзеная ягоная постаць. У вакне мітрапалітавага дому спакмеціў артыстку. Яна праз адхіны занавесак назірала за імі. Была цікавасьць: немка падышла да вісельца.

Палкоўнік блізу арытмэтычным вайсковым крокам падышоў таксама. Ганя шмагнула ніжэй рукаў футры. Залацісты брасьлет асунуўся на шчыкалатку далоні. Пaглядзела на яго. Падсунула глыбей пад рукаў. Толькі гэтым абагулялася, асэнсоўвалася ёй напатканае. Не падышла да вісельца.

Неспадзеўна з-за рогу вуліцы выйшлі два салдаты-жмудзіны зь перавешанымі праз плечы цяжкімі савецкімі вінтоўкамі. Палкоўнік спакмеціў іх. Злосна скамандаваў нямецкай мовай: «Раўс!» і нават прыклаўся да рэвальвэра. Жаўнеры цокна аддалі пашану, зноў адышліся за рог цёмнае вуліцы.

З уздоймы слупа зьвісаў Травянец. Яго, мабыць, спаткалі жмудзіны, калі ён выйшаў з дому пасьля спатканьня з сваёй сужэнкай, і павесілі як заложніка. Ён вісеў як самагубец, бы помста ўсяму таму, што не справіўся адолець у агульным жыцьці свайго народу — мастацтвам.

Алена абняла яго абвіслую нагу, заплакала.

— Вялікі ты-ы, — скрозь плач прагаманіла яна.

Доктар Адамчык і палкоўнік адвялі Алену ад нежывога Травянца. Яна паслухалася. Крыху адышоўшы зь імі, скрывіла прыгожае аблічча, з вачыма бы аднольва ўцісьненымі паміж ілбу і шчокаў, пазьдзекавалася дзіка, не па-людзку з Гані, Адамчыка і палкоўніка.

— Дайце мне наган!.. Калі б я была палкоўнік Скантаўт, я магла б застрэліць любога жмудзіна ці немца… Ах, што з вамі гутарыць! Вы ўсе хаджэньнікі наканаваньня!

Прыпынілася міжзруч Адамчыка і палкоўніка, азірнулася на вісельца. Позірк спаткаўся з паўадчыненымі вуснамі Травянца. Яны чарнеліся чарней, чымсьці зімовы ночны сутанак.

*1952 г.*

## ЗЬМЕСТ

*Вітаўт Кіпель.* Горад чытае .......... 3

АНТОН АДАМОВІЧ

Тут не Масква *(Да ўсяго, што сягоньня і ўчора)* .......... 7
Менску *(На ўгодкі вялікае пажогі)* .......... 12
Чорная бель .......... 15
Каханы горад *(Завязка раману)* .......... 21

ЛЯВОН САВЁНАК

Запіскі эміграната .......... 71

ЯНКА ЮХНАВЕЦ

Яно .......... 149
Частка першая .......... 151
Частка другая .......... 242
Частка трэцяя .......... 297

На вокладцы — рэпрадукцыя з малюнка
Юрыя Якавенкі (г. Гродна)

*Літаратурна-мастацкае выданьне*

Бібліятэка Бацькаўшчыны
Кніга 9

# Каханы горад

*Зборнік эміграцыйнае ваеннае прозы*

Адказны за выпуск *Г. Вінярскі*
Кампутарная вёрстка *Л. Ваўчок*
Карэктар *Г. Пазюк*

Падпісана да друку 8.02.2006 г. Фармат 84x108 1/32. Друк на рызографе.
Папера афсэтная. Гарнітура Times. Ум. друк. 19,53 арк.
Ул.-выд. 18,67 арк. Наклад 200 ас. Зак. 186.

МГА «Беларускі кнігазбор». ЛВ № 02330/0056929 ад 1.04.04.
220034, Мінск, вул. Фрунзэ, 5. **Тэл./факс 200-70-27.**

Надрукавана з арыгінал-макета заказчыка
ў друкарні ПУП «Ходр» ГА «БелТІЗ». ЛП № 02330/0056661 ад 29.03.04.
220004, г. Мінск, вул. Вызваленьня, 9.

**Міжнароднае грамадзкае аб'яднаньне**
**«Згуртаваньне беларусаў сьвету «Бацькаўшчына»**
з 2004 году выдае «Бібліятэку Бацькаўшчыны».

**У сэрыі пабачылі сьвет кнігі:**

• «Месца выданьня — Парыж»:
Выбраныя старонкі часопіса «Моладзь» (1948—1954)

• «Беларусы ў бітве за Монтэ-Касіна»:
Артыкулы, дакумэнты, аповесьць

• Н. Гардзіенка. «Беларусы ў Аўстраліі»:
Да гісторыі дыяспары

• Л. Юрэвіч. «Мэмуары на эміграцыі»:
Крыніцазнаўчае дасьледаваньне

• І. Варабей. «Там, дзе сэрца маё»:
Публіцыстыка, пераклады, апавяданьні

• М. Ганько. «Каб сьведчылі пра Беларусь»:
Жыцьцё й дзейнасьць Міколы Ганька

• «Эквівалент»:
Зборнік эміграцыйнай прозы
(укладальнік Лявон Юрэвіч)

• Лявон Юрэвіч. «Летапісны звод сусьвету
Чалавека Сьведамага»:
Гісторыя газэтаў «Бацькаўшчына» й «Беларус»
(1947—2000)

**Рыхтуецца да друку кніга:**

• Б. Рагуля «Беларускае студэнцтва на чужыне»:
Выданьне другое, выпраўленае й дапоўненае

ISBN 985-504-038-4
9 789855 040386

ББ

Каханы горад